

Kroniki białoruskich więźniów politycznych

Хронікі беларускіх палітвязьняў

Palitviazni.info

Kroniki białoruskich więźniów politycznych

Хронікі беларускіх палітвязьняў

FRID

Publikacja wyraża wyłącznie poglądy autora i nie może być utożsamiana
z oficjalnym stanowiskiem Ministerstwa Spraw Zagranicznych RP.

*Гэтае выданьне выказвае погляды аўтара і ня можа атаясамлівацца
з афіцыйнай пазыцыяй Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Польшча.*

Redakcja i edycja *Рэдактура*
Palitviazni.info

Tłumaczenie *Пераклад*
Palitviazni.info

Wydawca *Выдавец*
Fundacja Rozwoju Inicjatyw Demokratycznych
Фонд разьвіцьця дэмактарычных ініцыятываў

Korekta *Карэктура*
Jacek Obrębowski

Projekt graficzny okładki *Дызайн вокладкі*
Michał Dziadkowiec

Projekt typograficzny i skład *Вёрстка і набор*
EMENEM studio | www.emenem.pl

Publikacja współfinansowana w ramach programu polskiej współpracy rozwojowej
Ministerstwa Spraw Zagranicznych RP, Program „Wsparcie Demokracji"

*Выданьне дафінансавана ў рамках польскай праграмы супрацы ў мэтах разьвіцьця
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Польшча, праграма «Падтрымка Дэмакратыі»*

Katowice 2013 *Катавіцы 2013*

SPIS TREŚCI

ЗЬМЕСТ

WSTĘP

Książka, którą trzymają Państwo w ręce, powstała, aby pokazać ponad 20 lat niepodległej Białorusi, na podstawie losów ponad stu więźniów politycznych. Publikacja została wydana w dwóch wariantach językowych: w języku białoruskim i polskim oraz angielskim i polskim, zawiera ona informacje o prześladowaniach w Republice Białoruś 187 opozycjonistów, przedstawicieli niezależnych organizacji, działaczy społecznych. Dane zostały zebrane w ciągu ostatnich 24 lat – od 1989 roku, kiedy Republika Białoruś jeszcze nie była niepodległym krajem, aż do obecnych czasów.

Prześladowania osób, o których informacje zamieszczono na łamach książki, zostały uznane przez białoruskie i międzynarodowe organizacje polityczne broniące praw człowieka. Część spraw karnych była sfałszowana (jak na przykład sprawy związane z protestem przeciwko fałszowaniu wyników wyborów prezydenckich z 19 grudnia 2010 roku, a także sprawa liderów „Młodego Frontu" Daszkiewicza i Loboua, aresztowanych dzień przed wyborami prezydenckimi). Inni zostali pociągnięci do odpowiedzialności karnej za naruszenie prawa białoruskiego, które jest sprzeczne z międzynarodowymi porozumieniami, podpisanymi przez Białoruś. Na przykład sprawy działaczy Młodego Frontu, którzy zostali pociągnięci do odpowiedzialności karnej na podstawie artykułu 193, pkt 1 za działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji społecznej. Artykuł ten jest sprzeczny z artykułem 22 Międzynarodowego Paktu Praw Obywatelskich i Politycznych, którego Białoruś jest sygnatariuszem.

Każdy etap najnowszej historii Białorusi charakteryzuje się typowymi sprawami karnymi przeciwko działaczom kultury, ruchu społecznego, politykom. W 1989 r. znany malarz Aleś Puszkin został skazany na dwa lata pozbawienia wolności w zawieszeniu, za wystawę i udział w marszu w Dniu Wolności – 25 marca, w pierwszą rocznicę powstania Białoruskiej Republiki Ludowej. W 1990 r. wszczęto śledztwo przeciwko Walerijowi Siedowowi za to, że 7 listopada (rocznica rewolucji), na znak protestu przeciwko represjom, których dokonał reżim komunistyczny przeciw dziesiątkom milionów ludzi, powiesił na pomniku Lenina na centralnym placu Mińska krzyż obwiązany drutem kolczastym, który symbolizował cierpienia więźniów Gułagu (stalinowskich obozów koncentracyjnych). W więzieniu Walerij ogłosił strajk głodowy, który trwał 32 dni.

Po uzyskaniu przez Białoruś niepodległości, politycznie umotywowane sprawy karne nie były wytaczane aż do roku 1995, kiedy to wybrany rok wcześniej prezydent Łukaszenka, zaczął wprowadzać swoje autorytarne rządy. W tym roku deputowany do Rady Najwyższej Siarhiej Antończyk został skazany na potężną grzywnę za publikację antykorupcyjnego raportu, w którym wśród skorumpowanych urzędników wymieniał szefa administracji Iwana Titeńkowa. Sprawozdanie Antończyka zyskało szeroki rozgłos, ale wszystkie państwowe gazety, w których miał być opublikowany raport, na rozkaz ówczesnego przewodniczącego komitetu informacji, Aleksandra Fieduty, zostały ocenzurowane i ukazały się z białymi plamami.

Rok 1996 został zapamiętany jako rok nasilenia represji – dyktatura rosła w siłę, a politycznie umotywowanych spraw karnych było już znacznie więcej – za organizację protestów ulicznych wiosną 1996 r. do więzienia trafili członkowie kierownictwa partii Białoruski Front Ludowy (BFL) Jurij Chadyka i Wiaczesław Siwczyk, którzy na znak protestu przez 23 dni prowadzili strajk głodowy w areszcie śledczym Wołodarka w Mińsku. W kwietniu został osadzony w areszcie poeta Sławomir Adamowicz za napisanie

wiersza, w którym skrytykował rządy prezydenta (spędził w areszcie 10 miesięcy). Za aktywny udział w akcjach protestu zostało skazanych pięciu obywateli Ukrainy.

Dalszy wzrost liczby spraw karnych nastąpił w 1999 roku, gdy termin kadencji Łukaszenki dobiegał końca i Wiktor Gonczar (przewodniczący Centralnej Komisji Wyborczej, którego nielegalnie zwolnił ze stanowiska prezydent Łukaszenka) zorganizował alternatywne wybory prezydenckie. W dniu wyborów zatrzymano członków wszystkich komisji wyborczych, a we wrześniu 1999 r. Wiktor Gonczar wraz z Anatolijem Krasowskim zostali zatrzymani przez tzw. „Szwadrony śmierci”. Przeciwko kandydatowi na prezydenta w alternatywnych wyborach, byłemu premierowi Michaiłowi Czigirowi, wytoczono sfabrykowane oskarżenie. W dniu, gdy kończyła się kadencja Łukaszenki, artysta Aleś Puszkin przywiózł do jego rezydencji taczkę z obornikiem, do którego wetknął widłami portret prezydenta i banknoty wprowadzone do obrotu w okresie jego panowania. Za ten performance Aleś Puszkin dostał 2 lata więzienia w zawieszeniu. W październiku 1999 r. odbył się pierwszy Marsz Wolności, podczas którego miały miejsce starcia demonstrantów z milicją. Wielu uczestnikom wytoczono sprawy karne, w tym deputowanemu do Rady Najwyższej XIII Kadencji Walerijemu Szczukinowi.

W 2006 r. w Kodeksie Karnym Republiki Białoruś pojawił się artykuł 193, pkt 1 – „Działalność w imieniu niezarejestrowanego stowarzyszenia, fundacji lub organizacji religijnej”. Pierwsza sprawa karna na podstawie tego artykułu to sprawa związana z działalnością organizacji społecznej „Partnerstwo”, która monitorowała przebieg wyborów prezydenckich w 2006 r. Aleksander Szałajko, Mikoła Astrejka, Enira Bronicka, Cimafiej Dranczuk zostali skazani na kary pozbawienia wolności.

Następną sprawą karną z tego samego artykułu była sprawa „Młodego Frontu”. Na przestrzeni lat 2006–2008 doszło do wielu procesów działaczy „Młodego Frontu” – na półtora roku więzienia został skazany przewodniczący organizacji Dzmitrij Daszkiewicz, karę grzywny otrzymali Alieksiej Januszewski, Borys Goriecki, Dzmitrij Chwedoruk, Katarina Salaujowa, Nastazja Azarka, upomnienia otrzymali Iwan Shyla i Nasta Pałażanka (Daszkiewicz).

Przykładem rozpaczliwych prób obrony własnych praw stała się „Sprawa czternastu”[1]. 10 stycznia 2008 r. skazano 14 osób, głównie działaczy młodzieżowych, na karę grzywny, prac społecznych lub pozbawienia wolności za aktywny udział w proteście przeciwko wprowadzeniu aktów prawnych ograniczających przedsiębiorcom możliwości zawierania umów o pracę.

Osobno należy wspomnieć o prześladowaniu dziennikarzy za rzekome zniesławienie i obrazę głowy państwa. We wrześniu 2002 r. zostali aresztowani, a następnie skazani na pozbawienie wolności (2 i 2,5 roku) Paweł Mażejka i Mikoła Markiewicz. Sprawa przeciwko nim dotyczyła artykułu w gazecie „Pogoń”, w którym zniesławiono prezydenta. A w kwietniu 2011 r. wszczęto sprawy karne o obrazę prezydenta przeciwko dziennikarzowi Andrzejowi Poczobutowi, zastępcy przewodniczącego Związku Polaków na Białorusi. Od kwietnia 2011 r. do końca procesu, który odbył się w czerwcu i lipcu tego roku, Poczobut przebywał w grodzieńskim areszcie śledczym. Ostatecznie Poczobut został skazany na 3 lata więzienia w zawieszeniu na okres 2 lat. Za przestępstwo uznano fakt, że w artykułach opublikowanych na łamach „Gazety Wyborczej” dziennikarz nazwał Łukaszenkę „dyktatorem”. Następnie w sprawie Poczobuta podjęto próby wszczęcia jeszcze jednej sprawy karnej.

1. „Sprawa czternastu” to sprawa karna na podstawie art. 342 Kodeksu Karnego Republiki Białoruś, wszczęta 10 stycznia 2008 r. przeciwko młodzieżowym aktywistom, uczestnikom pokojowego protestu w Mińsku. Protest ten był akcją solidarności z przedsiębiorcami.

Apogeum fabrykowania oskarżeń przypada na lata 2010–2011, gdy w dzień wyborów prezydenckich, 19 grudnia 2010 r., do pokojowej akcji protestu przyłączyły się setki ludzi, ale mityng został brutalnie rozpędzony przez Specnaz. Uczestników aresztowano i w rezultacie rozpoczęła się tzw. „sprawa o masowych zamieszkach 19 grudnia 2010 roku”. Oskarżono wówczas kilkadziesiąt osób, m.in. sześciu kandydatów na prezydenta.

W chwili wydawania tej książki 9 osób było pozbawionych wolności ze względów politycznych, ale nie świadczy to o tym, że sytuacja więźniów politycznych poprawiła się w porównaniu z latami 2010–2011, gdy w niewoli znajdowało się ponad sześćdziesięciu więźniów politycznych, a w noc po wyborach 19.12.2010 r. do aresztu śledczego KGB trafiła większość (siedmiu spośród dziewięciu) niezależnych kandydatów na prezydenta. Pod presją międzynarodowej opinii publicznej zwolniono niektórych więźniów politycznych, ale do tej pory ich nie zrehabilitowano. Większość z nich nadal podlega pewnym ograniczeniom (32 osoby wg wspólnego raportu Centrum Praw Człowieka „Wiasna” i FIDH). Przede wszystkim nie mogą oni kandydować w wyborach. Jeden z kandydatów na prezydenta – Mykoła Statkiewicz, przewodniczący Białoruskiej Partii Socjaldemokratycznej (Narodnaja Hramada) – do tej pory znajduje się w więzieniu nr 4 w Mohylewie. W Kolonii Karnej nr 2 w Bobrujsku przebywa przewodniczący Centrum Praw Człowieka „Wiasna” i wiceprezes FIDH, Aleś Bialacki, skazany na 4,5 roku pozbawienia wolności za działalność na rzecz praw człowieka.

Prosimy wszystkich, którzy mają w ręku tę książkę, o dołożenie wszelkich starań, aby dziewięciu więźniów politycznych, którzy obecnie znajdują się w niewoli, jak najszybciej odzyskało wolność, aby lista więźniów politycznych na Białorusi nie zwiększała się już nigdy więcej.

Informacje zawarte w tej książce, dostępne są na stronie internetowej www.palitviazni.info.

УВОДЗІНЫ

Кніга, якую вы трымаеце ў руках, выдадзеная для распаўсюду інфармацыі ў Беларусі і па-за яе межамі аб сытуацыі з палітычнымі зьняволенымі ў Рэспубліцы Беларусь. З мэтай зручнасьці карыстаньня выданьне існуе ў двух моўных варыянтах – на беларускай і польскай мовах, а таксама на польскай і ангельскай. Выданьне ўтрымлівае інфармацыю аб крымінальным перасьледзе ў Рэспубліцы Беларусь 187-мі грамадзка-палітычных дзеячоў. Дадзеныя сабраныя за апошнія 24 гады – ад 1989 году, калі Рэспубліка Беларусь яшчэ ня была незалежнай, і да цяперашняга часу.

Крымінальны перасьлед асобаў, інфармацыя пра якіх зьмешчаная на старонках, беларускімі і міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі быў прызнаны палітычна матываваным. Частка справаў была папросту сфальсыфікаваная (напрыклад, справа «Плошчы» – пратэсты супраць падробкі вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў 19 сьнежня 2010 году, а таксама справа Зьмітра Дашкевіча і Эдуарда Лобава, арыштаваных за дзень да тых прэзыдэнцкіх выбараў). Іншыя асобы былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці за парушэньне беларускага заканадаўства, якое супярэчыць міжнародным пагадненьням падпісаным Рэспублікай Беларусь (напрыклад, справа «Партнэрства», справа «Маладога Фронту» – людзі былі прыцягнутыя да адказнасьці па артыкуле 193.1 Крымінальнага Кодэксу Рэспублікі Беларусь за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі, але дадзены артыкул супярэчыць артыкулу 22 Міжнароднага Пакта аб Грамадзянскіх і Палітычных Правах, які сярод іншых краінаў падпісала і Беларусь).

Кожны гістарычны этап Беларусі акрэслены характэрнымі крымінальнымі справамі супраць дзеячоў культуры і грамадзкага руху, палітыкаў. У 1989 годзе вядомы мастак Алесь Пушкін быў асуджаны да двух гадоў пазбаўленьня волі ўмоўна за выставу і шэсьце на Дзень Волі, гадавіну абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. У 1990 годзе за ўдзел у антыкамуністычным мітынгу крымінальная справа была заведзеная супраць Валера Сядова, які ў гадавіну рэвалюцыі, у знак пратэсту рэпрэсіям, якія ўчыніў камуністычны рэжым дзясяткам мільёнаў людзей, вывесіў на помніку Леніна на цэнтральнай плошчы Менску абвязаны калючым дротам крыж з ватнікам, які сымбалізаваў пакуты вязьняў ГУЛАГу. Схоплены і зьмешчыны ў вязьніцу Валер абвясьціў галадоўку, якую трымаў 32 дні.

Пасьля атрыманьня незалежнасьці палітычна справы не ўзбуджаліся да 1995 году, калі абраны годам раней першы прэзыдэнт Беларусі Лукашэнка пачаў усталёўваць свой аўтарытарны рэжым, тады дэпутат Вярхоўнага Савету Сяргей Антончык быў асуджаны да буйнога штрафу за публікацыю антыкарупцыйнага дакладу, які сярод іншых карупцыянэраў згадваў старшыню адміністрацыі прэзыдэнта Івана Ціцянкова. Даклад Антончыка набыў шырокі грамадзкі рэзананс, але ўсе дзяржаўныя газэты, у якіх мусіў быць апублікаваны даклад, па загадзе тагачаснага старшыні камітэту інфармацыі Аляксандра Фядуты былі падвергнутыя цэнзуры і выйшлі зь белымі плямамі.

У наступным 1996 годзе, які быў адзначаны ўзмацьненьнем супрацьстаяньня дэмакратычных сілаў і набіраўшай моц дыктатуры, палітычна матываваных справаў было ўжо значна больш. Так за арганізацыю вулічных пратэстаў вясны 1996 году ў вязьніцу трапілі сябры Сойму Партыі БНФ Юры Хадыка і Вячаслаў Сіўчык, якія 23 дні трымалі галадоўку пратэсту ў сьледчым ізалятары

на «Валадарцы». У красавіку быў узяты пад варту паэт Славамір Адамовіч за напісаньне верша, які крытыкаваў прэзыдэнцкую ўладу (паэт правёў у вязьніцы 10 месяцаў). За актыўны ўдзел у акцыях пратэсту былі асуджаныя пяцёра грамадзянаў Украіны.

Далейшае значнае павелічэньне колькасьці крымінальных справаў адбылося ў 1999 годзе, калі ў Лукашэнкі скончваўся легітымны прэзыдэнцкі тэрмін і Віктар Ганчар, Старшыня Цэнтральнай Выбарчай Камісіі, незаконна адхілены ад пасады Лукашэнкам, арганізаваў альтэрнатыўныя прэзыдэнцкія выбары. У дзень галасаваньня былі арыштаваныя сябры ўсіх выбарчых камісіяў, а ў верасьні 1999 Віктар Ганчар разам з Анатолем Красоўскім былі выкрадзеныя так званым «Эскадронам сьмерці». Супраць кандыдата ў прэзыдэнты на альтэрнатыўных выбарах, былога прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра была сфабрыкаваная крымінальная справа. У дзень, калі скончваўся легітымны тэрмін Лукашэнкі, да яго рэзыдэнцыі мастак Алесь Пушкін вываліў вазок гною, прыткнушы віламі партрэт прэзыдэнта і грашовыя купюры, якія былі ўведзеныя за тэрмін праўленьня Лукашэнкі. У кастрычніку 1999 году адбыўся першы «Марш Свабоды», падчас якога ўзьніклі сутычкі зь міліцыяй. На шэраг удзельнікаў была заведзеная крымінальная справа, у тым ліку на дэпутата Вярхоўнага Савета 13 скліканьня Валерыя Шчукіна.

У 2006 годзе ў Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь зьявіўся артыкул 193.1 «Арганізацыя дзейнасьці аб'яднаньня, фонду ці рэлігійнай арганізацыі, якая не прайшла дзяржаўнай рэгістрацыі, ці ўдзел у ёй". Першая крымінальная справа па гэтым артыкуле – справа «Партнэрства», грамадзкай арганізацыі якая праводзіла назіраньне за ходам прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году. Былі асуджаныя на розныя тэрміны зьняволеньня Аляксандар Шалайка, Мікола Астрэйка, Эніра Браніцкая, Цімох Дранчук. Наступнай па гэтым артыкуле была заведзеная справа супраць дзейнасьці «Маладога Фронту». На працягу 2006–2008 гадоў адбыўся шэраг працэсаў па справах актывістаў МФ, да палутара гадоў зьняволеньня быў асуджаны старшыня арганізацыі Зьміцер Дашкевіч, атрымалі штрафы Аляксей Янушэўскі, Барыс Гарэцкі, Зьміцер Хведарук, Кацярына Салаўёва, Настасься Азарка, папярэджаньні атрымалі Іван Шыла, Наста Палажанка.

Прыкладам адчайных спробаў абараніць свае правы з боку прадпрымальнікаў стала справа «Чатырнаццаці». За актыўны ўдзел у акцыі пратэсту супраць увядзеньня заканадаўства, якое абмяжоўвала магчымасьці прадпрымальнікам заключаць працоўныя дамовы, 10 студзеня 2008 году да штрафаў, выпраўленчых працаў, зьняволеньня асуджаныя 14 чалавек, у асноўным моладзевыя актывісты.

Асобна трэба адзначыць крымінальны перасьлед журналістаў за нібыта паклёп і абразу кіраўніка дзяржавы. У верасьні 2002 году былі арыштаваныя, а пазьней асуджаныя да абмежаваньня волі на два і два з паловай гады Павал Мажэйка і Мікола Маркевіч. Справа была ўзбуджаная за нататку ў газэце «Пагоня», у якой нібыта зьмяшчаўся паклёп на прэзыдэнта. У сакавіку 2011 году за абразу прэзыдэнта ўзбудзілі крымінальную справу супраць журналіста Андрэя Пачобута, намесьніка старшыні Саюзу палякаў на Беларусі. Ад красавіка 2011 году да канца суду, які адбыўся ў чэрвені-ліпені, Андрэй утрымліваўся ў сьледчым ізалятары Гарадзенскай турмы. У выніку Пачобут быў асуджаны да 3-х гадоў зьняволеньня з адтэрміноўкай прысуду на 2 гады. Крыміналам палічылі тое, што ў артыкулах у «Gazeta Wyborcza» журналіст назваў Лукашэнку «дыктатарам». У далейшым у дачыненьні да Пачобута былі спробы ўзбуджэння яшчэ адной падобнай крымінальнай справы.

Апагеем фабрыкаваньня палітычна матываваных крымінальных справаў сталі 2010–2011 гады, калі ў дзень галасаваньня на прэзыдэнцкіх выбарах 19 сьнежня 2010 году на мірную акцыю пратэста выйшлі дзясяткі тысяч людзей, але мітынг быў жорстка разагнаны спэцназам. Сотні людзей былі затрыманыя і ў выніку зьявілася крымінальная справа «Плошчы» (так званая «справа аб масавых беспарадках 19 снежня 2010 году»), па якой былі абвінавачаныя некалькі дзясяткаў чалавек, у тым ліку 6 кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта.

На момант падрыхтоўкі матэрыялаў да друку ў месцах зьняволеньня знаходзяцца 9 палітычных вязьняў, але гэта ня сьведчыць аб тым, што сытуацыя з палітычнымі зьняволенымі палепшала ў параўнаньні з 2010–2011 гадамі, калі за кратамі знаходзілася больш за 60 чалавек, а ў СІЗА КДБ у ноч пасьля выбараў 2010 году трапіла большасьць незалежных кандыдатаў на прэзыдэнта (7 з 9).

Некаторыя палітвязьні былі выпушчаныя з-пад варты пад ціскам міжнароднай дэмакратычнай грамадзянскай супольнасці, але людзі дагэтуль не рэабілітаваныя, большасьць зь іх мае пэўныя абмежаваньні (згодна з сумесным дакладам Праваабарончага Цэнтру «Вясна» і FIDH – 32 чалавекі), у прыватнасьці ня могуць балятавацца ў якасьці кандыдатаў на выбарах. Адзін з кандыдатаў у прэзыдэнты – старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч – да гэтага часу знаходзіцца ў турме ў Магілёве. У выпраўчай калёніі № 2 у Бабруйску знаходзіцца старшыня Рады Праваабарончага Цэнтру «Вясна», віцэ-прэзыдэнт FIDH Алесь Бяляцкі, асуджаны за праваабарончую дзейнасьць на 4,5 гады зьняволеньня.

Просім Вас, тых хто чытае гэтую кнігу, прыкласьці ўсе намаганьні, каб 9 палітвязьняў, якія цяпер знаходзяцца ў зьняволеньні, як мага хутчэй выйшлі на волю і сьпіс палітвязьняў у Беларусі ў далейшым не павялічваўся.

Інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў дадзенай кнізе, разьмешчаная ў глябальнай сетцы Internet на сайце www.palitviazni.info.

DZMITRIJ ABAUDOUSKI

Dzmitrij Abaudouski jest synem Siarhieja Abaudouskiego, znanego obrońcy praw człowieka z Mohylewa. Represje wobec Abaudouskiego rozpoczęły się na krótko przed 20 lipca 1999 r. – datą zakończenia rządów prezydenta Łukaszenki zgodnie z Konstytucją 1996 r. Wtedy też, opozycja zaczęła planować organizację akcji protestu. Przyczyną prześladowań Dzmitrija Abaudouskiego stała się działalność jego ojca.

KRONIKA REPRESJI

10 lipca 1999 r. Dzmitrij Abaudouski został zatrzymany i umieszczony w mohylewskim areszcie śledczym. Początkowo oskarżono go o dwie kradzieże. Rewizje, które przeprowadzono w jego sprawie były bardzo dziwne. Odbyły się one nie w jego mieszkaniu, a w domu jego ojca. Przypomnijmy, że w tym kluczowym dla kraju momencie Siarhiej Abaudouski prowadził monitoring sytuacji praw człowieka, w tym również monitoring przypadków łamania prawa podczas wyborów prezydenckich w 1999 r., zainicjowanych przez zastępcę przewodniczącego Rady Najwyższej Wiktora Ganczara (który zaginął 2 miesiące później, we wrześniu 1999 r.).

W lipcu 1999 Abaudouskiemu przedstawiono kolejny zarzut, oskarżono go o gwałt. Sprawa karna wydawała się sfabrykowana, tym bardziej, że sama poszkodowana nie rozpoznała „napastnika" i wskazała zupełnie innego mężczyznę. Podczas śledztwa Dzmitrij Abaudouski czterokrotnie ogłaszał w więzieniu protest głodowy przeciwko bezprawiu, prześladowaniom i represjom stosowanym wobec niego i jego rodziny. Głodował przez 55 dni, z czego przez 18 dni prowadził suchy protest głodowy. Po jednej z głodówek Abaudouski w ciężkim stanie trafił do szpitala, gdzie go reanimowano.

Sprawa Abaudouskiego była kilkakrotnie rozpatrywana. Za pierwszym razem skazano go na 6 lat pozbawienia wolności za rzekomą kradzież butów. W sprawie drugiego przypadku kradzieży w pełni oczyszczono go z zarzutów – miał on alibi, w momencie popełnienia przestępstwa nie było go w mieście. Potem wyrok ten został zaskarżony, mohylewski sąd rejonowy skierował sprawę do kolejnego rozpatrzenia. W wyniku tego przeprowadzono dodatkowe śledztwo.

Obrońcy praw człowieka podkreślali wtedy, że Abaudouski mimo wszystko pozostawał w areszcie, nie zastosowano wobec niego innego środku zapobiegawczego, mimo, że w tym przypadku, prawo dawało taką możliwość. Zgodnie z nowym Kodeksem Karnym, który wszedł w życie 1 stycznia 2001 r., niedopuszczalne było przetrzymywanie więźnia w areszcie śledczym dłużej niż 18 miesięcy. Dzmitrij Abaudouski spędził w więzieniu ponad 2 lata.

Nie była to pierwsza próba władz wpłynięcia na Siarhieja Abaudouskiego poprzez prześladowanie jego syna. W 1998 roku jego drugi syn, Janka, był zmuszony do tego, by starać się o status uchodźcy politycznego w Polsce, kiedy władze zaczęły go prześladować za udział w akcjach opozycji.

23 marca 2003 r. Siarhiej Abaudouski zmarł przedwcześnie. Miał 53 lata.

ЗЬМІЦЕР АБАДОЎСКІ

Зьміцер Абадоўскі – сын Сяргея Абадоўскага, вядомага праваабаронцы з г. Магілёву. Незадоўга да 20 ліпеня 1999 году – сканчэньня тэрміну кіраваньня прэзыдэнта А.Г. Лукашэнкі паводле Канстытуцыі 1996 г., калі апазыцыя мела намер ладзіць акцыі пратэсту – яго пачалі перасьледаваць. Прычынай стала праваабарончая дзейнасьць бацькі Зьмітра.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

10 ліпеня 1999 г. Зьміцер Абадоўскі быў затрыманы і зьмешчаны ў магілёўскі сьледчы ізалятар. Яго абвінавацілі спачатку ў двух крадзяжах.Ператрусы па справе Зьмітра Абадоўскага выглядалі дзіўна. Пошукі «скрадзенага» вяліся чамусьці не на кватэры абвінавачваемага, а ў хаце яго бацькі-праваабаронцы. Нагадаем, Сяргей Абадоўскі ў той вызначальны для краіны момант займаўся маніторынгам парушэньняў правоў чалавека, у тым ліку ў часе неафіцыйных выбараў прэзыдэнта ўлетку 1999 г., ініцыяваных намесьнікам старшыні Вярхоўнага Савету Віктарам Ганчаром (зьнік праз два месяцы, у верасьні 1999 г.).

У ліпені 1999 г. зьявілася яшчэ і абвінавачаньне ў згвалтаваньні. Крымінальная справа выглядала сфабрыкаванай, тым больш што нават сама «пацярпелая» не пазнала на сьледчым апазнаньні «гвалтаўніка», паказаўшы на зусім іншага чалавека.

За час сьледзтва Зьміцер Абадоўскі 4 разы трымаў у турме галадоўкі пратэсту супраць прававога безьмежжа ў дачыненьні да яго і ягонай сям'і. Усяго ён галадаў 55 дзён, зь якіх агулам 18 дзён двойчы трымаў сухія галадоўкі. Пасьля другой зь іх Зьміцер трапіў у цяжкім стане ў рэанімацыю.

Справа Зьмітра Абадоўскага разглядалася ў судзе некалькі разоў. Першы разгляд скончыўся яго асуджэньнем да 6 гадоў пазбаўленьня волі нібыта за крадзеж абутку. Па другім эпізодзе крадзяжу Зьміцер быў цалкам апраўданы, бо меў поўнае алібі – на момант ўчыненьня злачынства адсутнічаў у горадзе. Пасьля прысуд быў адменены Магілёўскім абласным судом, які накіраваў справу на паўторны разгляд. Вынікам другога суду стала накіраваньне справы на дадатковае расьсьледаваньне. Праваабаронцы тады адзначалі, што Зьміцер Абадоўскі застаўся ў СІЗА, а ня быў выпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе, што дазваляў зрабіць закон у дадзеным выпадку. У адпаведнасьці з новым Крымінальна-працэсуальным кодэксам, які ўступіў у сілу зь 1 студзеня 2001 г. не дапускалася знаходжаньне ў СІЗА даўжэй за 18 месяцаў.

Зьміцер Абадоўскі правёў у вязьніцы больш за 2 гады.

Гэта была ўжо ня першая спроба судовых органаў паўплываць на Сяргея Абадоўскага празь ягоных сыноў. У 1998 годзе пасьля крымінальнага перасьледу за ўдзел у акцыях апазыцыі быў вымушаны прасіць палітычнага прытулку ў Польшчы другі ягоны сын – Янка.

23 сакавіка 2003 году бацька палітвязьня, праваабаронца Сяргей Абадоўскі, раптоўна памёр на 53-м годзе жыцьця.


FOT. ANDREJ ABOZAU

ANDREJ ABOZAU

Andrej Abozau jest aktualnie administratorem strony internetowej inicjatywy społecznej „Trzecia droga".

KRONIKA REPRESJI

Andrej Abozau był oskarżony w sprawie karnej, wszczętej w sierpniu 2005 r. przez Prokuraturę w Mińsku w sprawie rozpowszechniania w Internecie kreskówek „krytykujących honor i godność prezydenta Białorusi" (art. 367, pkt 1).

W ramach tego postępowania karnego, przesłuchiwany w charakterze świadka był również koordynator projektu Paweł Morozow. Pracownicy KGB przeprowadzili w ich mieszkaniach rewizje, zabierając sprzęt komputerowy.

Zaraz po przesłuchaniach i rewizjach Andrej Abozau opuścił Białoruś.

Inni podejrzani w sprawie kreskówek – Paweł Morozow i Oleg Minicz – również wyjechali za granice Białorusi.

АНДРЭЙ АБОЗАЎ

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Андрэй Абозаў – фігурант крымінальнай справы, заведзенай у жніўні 2005 г. пракуратурай г. Менску па факце распаўсюду ў інтэрнэце мультфільмаў, якія «зьневажаюць гонар і годнасьць прэзыдэнта Беларусі» (арт. 367 ч. 1). Нагодай для завядзеньня справы сталі мультфільмы сатырычнага характару, якія зьявіліся ў інтэрнэце.

На той момант Андрэй Абозаў зьяўляўся адміністратарам сайту грамадзкай ініцыятывы «Трэці шлях». У межах дадзенай крымінальнай справы ён, а таксама каардынатар праекту Павал Марозаў былі дапытаныя ў якасьці сьведак. Супрацоўнікі КДБ правялі ў іх кватэрахператрусы, забраўшы кампутарную тэхніку.

У хуткім часе пасьля допытаў і вобыскаў Андрэй Абозаў пакінуў Беларусь. Зараз пражывае ў Паўночнай Эўропе.

Іншыя падазраваныя па справе аб мульціках – Павал Марозаў і Алег Мініч – таксама зьехалі за межы Беларусі.

FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

SŁAWAMIR ADAMOWICZ

Sławamir Adamowicz to legendarny białoruski poeta i działacz społeczny, autor kilku tomików wierszy. W połowie lat 90. był liderem organizacji „Prawe przymierze", które zrzeszało głównie twórców kultury, sympatyków białoruskiej historii i współczesnej białoruskiej sztuki nowoczesnej. Organizacja ta nie stała się jednak realną siłą polityczną i została rozwiązana.

Adamowicz urodził się 8 marca 1962 r. w rejonie oneskim obwodu archangielskiego. Później jego rodzina wyjechała do ojczyzny przodków i zamieszkała na Białorusi.

Adamowicz ukończył średnią Szkołę Zawodową nr 17 w Swirsku. Pracował w Kazachstanie, w sowchozie „Budsławski", w białoruskich kolejach, a także w Fabryce Maszyn im. Kirowa w Mińsku. W 1992 roku ukończył Wydział Filologii Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku. W latach 1991–1995 pracował w „Gazecie Nauczycielskiej". Był jednym z dziennikarzy „Naszej Niwy".

KRONIKA REPRESJI

W listopadzie 1995 r. Sławamir Adamowicz napisał wiersz „Zabij prezydenta!", który opublikowano w witebskiej gazecie „Wybór wierszy", i za który 6 kwietnia 1996 r. został aresztowany. W więzieniu KGB ogłosił „suchą głodówkę". Oficjalne zarzuty obejmowały „nawoływanie do zmiany lub obalenia ustroju państwa, bezprawne przekroczenie granicy i bezprawne noszenie broni białej". Po dziesięciu miesiącach zatrzymania – w lutym 1997 r. – został zwolniony, otrzymał jednak zakaz opuszczania miasta.

W sierpniu 1997 r. na jednej z demonstracji publicznie „zaszył" sobie usta na znak protestu przeciwko łamaniu wolności słowa na Białorusi. Kilkakrotnie był zatrzymywany podczas masowych akcji opozycji. W 2000 r. w Dzień Woli Adamowicz został brutalnie zatrzymany wraz z kilkudziesięcioma innymi dziennikarzami w centrum Mińska. Kilka godzin spędził w hangarze wojskowej części ulicy Majakowskiego.

W 2000 r. Sławamir Adamowicz przebywał w USA, pracował na budowach w Nowym Jorku. We wrześniu 2002 r. wyjechał do pracy do Norwegii, tam otrzymał status uchodźcy. Ostatecznie powrócił na Białoruś.

СЛАВАМІР АДАМОВІЧ

Славамір Адамовіч – легендарны беларускі паэт і грамадзкі дзяяч, аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў. У сярэдзіне 1990-х – лідэр арганізацыі «Правы рэванш», якая аб'ядноўвала ў асноўным творчых людзей, прыхільнікаў беларускай гісторыі і эпатажнага сучаснага беларускага мастацтва. Рэальнай палітычнай сілай арганізацыя ня стала і пазьней самаліквідавалася.

Нарадзіўся 8 сакавіка 1962 году на станцыі Унежма Анежскага раёну Архангельскай вобласьці. Пазьней сям'я пераехала на радзіму продкаў у Беларусь. Скончыў Сьвірскую СПТВ № 17. Працаваў у Казахстане, у саўгасе «Будслаўскі», на Беларускай чыгунцы, на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава ў Менску.

У 1992 г. скончыў філялягічны факультэт БДУ. З 1991 па 1995 гады працаваў у «Настаўніцкай газэце». Быў адным з аўтараў газэты «Наша Ніва».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У лістападзе 1995 г. Славамір Адамовіч напісаў верш «Убей президента!», за што быў арыштаваны 6 красавіка 1996 г. У турме КДБ трымаў сухую галадоўку. Яго абвінавачвалі ў закліках да зьвяржэньня або зьмены дзяржаўнага ладу, незаконным перасячэньні мяжы і незаконным нашэньні халоднай зброі.

Празь дзесяць месяцаў зьняволеньня – 7 лютага 1997 г. – адпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе. Пакараньне, да якога прыгаварыў Славаміра суд, фактычна абмяжоўвалася тым тэрмінам, які ён ужо адбыў у зьняволеньні.

У жніўні 1997 г. на адным зь мітынгаў публічна «зашыў» сабе рот на знак пратэсту супраць парушэньня свабоды слова ў Беларусі.

Некалькі разоў затрымліваўся падчас масавых акцыяў апазыцыі. Напрыклад, у 2000 г. на Дзень Волі яго гвалтоўна затрымалі ў ліку дзясяткаў журналістаў у цэнтры Менску, і некалькі гадзінаў Славамір правёў разам зь імі ў ангары вайсковай часткі па вуліцы Маякоўскага.

У 2000 г. Славамір Адамовіч знаходзіўся ў ЗША, працаваў на будоўлях Нью-Ёрку. У верасьні 2002 г. паехаў працаваць у Нарвэгію, дзе папрасіў палітычны прытулак. Пасьля атрыманьня прытулку некалькі гадоў жыў і працаваў у Нарвэгіі. У 2009 г. вярнуўся ў Беларусь і пасяліўся ў г. Мар'іна Горка (Менская вобласьць).

IHOR ALINIEWICZ

Urodził się 24 września 1984 r. Ukończył Uniwersytet Informatyki i Radioelektroniki, zdobywając tytuł inżyniera elektronika. Brał udział w pracach nad budową rosyjsko-białoruskiego satelity. W czasie nauki zrobił sobie rok przerwy, by popracować na statku wycieczkowym na morzu Karaibskim. Dzięki tej przygodzie udało mu się zobaczyć inne kraje i podszkolić znajomość języków obcych. Od lat szkolnych interesował się historią, szczególnie zaś historią ruchu anarchistycznego, czytał prace, studiował działalność założycieli, teoretyków i praktyków tego ruchu: Bakunina, Kropotkina, Niestora, Machno i innych. Znajomi Ihora Aliniewicza mówią o nim – intelektualista i niezwykle interesująca osoba. On sam uważa się za anarchistę i oświadczył podczas procesu, że nie wypiera się swoich poglądów.

KRONIKA REPRESJI

28 listopada 2010 r. w Moskwie Aliniewicz został zatrzymany przez funkcjonariuszy siłowych w cywilu i wywieziony przez nich w nieznanym kierunku. Dopiero po upływie doby okazało się, że przebywa on w areszcie KGB w Mińsku. 27 maja 2011 r. sąd obwodu Zawodskiego w Mińsku skazał Ihora na 8 lat pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 339, pkt 2 KK RB – „Chuligaństwo" oraz z artykułu 218, pkt 2 i 3 – „Uszkodzenie mienia". Początkowo oskarżano go o „złośliwe chuligaństwo" (artykuł 339, pkt 2 KK) oraz o próbę podpalenia rosyjskiej ambasady w Mińsku w nocy z 30 na 31 sierpnia 2010 r., a także o udział w akcji przed budynkiem Sztabu Generalnego Sił Zbrojnych Białorusi, która miała miejsce 19 września 2009 r. Później oskarżenia wobec Aliniewicza zostały rozszerzone: oskarżono go o próbę podpalenia mińskiego kasyna „Szangri-la", oddziału banku „Mińsk-Moskwa" 31 maja 2010 r., atak na ambasadę rosyjską 30 sierpnia 2010 r. i próbę podpalenia jednego z aresztów w Mińsku (Okrestiny) 6 września 2010 r.

Zatrzymaniu Aliniewicza w Moskwie i przewiezieniu go do aresztu KGB w Mińsku towarzyszyły liczne naruszenia przyjętych procedur, w tym procedur ekstradycji obywateli białoruskich z terytorium Federacji Rosyjskiej. Podczas zatrzymania Aliniewicz był pozbawiony możliwości otrzymania pomocy adwokata, i w ten sposób, był pozbawiony możliwości zaskarżenia zatrzymania.

Podczas pobytu w areszcie śledczym KGB Aliniewicz był poddawany torturom i brutalnemu traktowaniu. Zanim przeniesiono go do aresztu na ulicy Wołodarskiego w Mińsku, proponowano mu współpracę z władzami w charakterze hakera. Aliniewicz kategorycznie odmówił. Zdaniem matki Ihora Aliniewicza, jej syn już trzykrotnie odmówił współpracy z KGB, i właśnie za to został pociągnięty do odpowiedzialności karnej.

Obecnie odbywa on karę w kolonii karnej w Nowopołocku (obwód witebski).

ІГАР АЛІНЕВІЧ

Нарадзіўся 24 верасьня 1983 году. Пасьля сярэдняй школы скончыў унівэрсытэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Па спэцыяльнасьці інжынэр-электроншчык. Удзельнічаў у працы над расейска-беларускім спадарожнікам. Падчас вучобы зрабіў перапынак на год, каб папрацаваць на круізным лайнэры ў Карыбскім моры, што дапамагло пабачыць іншыя краіны і ўдасканаліць веды ў замежных мовах. Са школьных гадоў цікавіўся гісторыяй, асабліва анархісцкага руху, чытаў працы і вывучаў жыцьцё ягоных заснавальнікаў, тэарэтыкаў і практыкаў: Бакуніна, Крапоткіна, Нестара Махно ды іншых. Знаёмыя Ігара называюць яго інтэлектуалам і надзвычай цікавым чалавекам. Сам ён лічыць сябе анархістам і заявіў на судзе, што не адмаўляецца ад сваіх поглядаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы сілавікамі ў цывільным 28 лістапада ў 2010 году ў Маскве, Ігар Аліневіч быў вывезены імі ў невядомым накірунку, і толькі праз суткі стала вядома пра яго знаходжаньне ў СІЗА КДБ у Менску.

27 траўня 2011 году суд Заводзкага раёну Менску пакараў Ігара 8 гадамі пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Ён быў абвінавачаны паводле часткі 2 артыкулу 339 КК РБ (хуліганства, зьдзейсьненае групай асобаў) і частак 2 і 3 артыкулу 218 КК (пашкоджаньне маёмасьці агульнанебясьпечным спосабам і ў асабліва буйным памеры).

Першапачаткова яго абвінавачвалі ў злосным хуліганстве (ч. 2 арт. 339 КК) па эпізодах нападу на расейскую амбасаду ў ноч з 30 на 31 жніўня 2010 году, а таксама за ўдзел у акцыі каля Генштабу Ўзброеных сілаў Беларусі 19 верасьня 2009 году. Затым абвінавачаньне было пашыранае: акрамя эпізоду па Генштабе, Аліневічу інкрымінавалі напады на казіно «Шангры Ла», на офіс банку «Масква-Менск» 31 траўня 2010 году, на расейскую амбасаду 30 жніўня 2010 году і на Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў (ЦІП) на Акрэсьціна 6 верасьня 2010 году.

Праваабарончыя арганізацыі адзначаюць, што суд над Ігарам Аліневічам і іншымі фігурантамі справы адбываўся з шэрагам парушэньняў, і таму зьняволеных па гэтай справе нельга лічыць законна асуджанымі. Так, затрыманьне Ігара Аліневіча ў Маскве і далейшая перавозка яго ў СІЗА КДБ у Менск адбываліся з парушэньнем устаноўленых працэдураў, у тым ліку працэдуры экстрадыцыі беларускіх грамадзянаў з Расейскай Фэдэрацыі. Пры затрыманьні ён быў пазбаўлены магчымасьці атрымаць дапамогу з боку адваката і, такім чынам, магчымасьці абскардзіць затрыманьне. Цягам папярэдняга сьледзтва да абвінавачаных ужываліся псыхалягічны ціск і катаваньні. Падчас судовага разьбіральніцтва не выконваўся прынцып роўнасьці бакоў датычна прадстаўленьня доказаў. Судом часьцяком не задавальняліся абгрунтаваныя хадайніцтвы абароны, у тым ліку адносна допыту сьведак, і гэта ўплывала на аб'ектыўнасьць разгляду справы, сьведчыла пра абвінаваўчы ўхіл судовага працэсу ў цэлым.

Падчас знаходжаньня ў СІЗА КДБ разам зь іншымі вязьнямі Ігар зазнаў катаваньні. Перад тым, як яго перавялі ў іншы СІЗА – па вул. Валадарскага ў Менску – маладому чалавеку прапаноўвалі працаваць на ўлады ў якасьці хакера, ад чаго той катэгарычна адмовіўся. Па словах маці Ігара, ён адмаўляўся ад супрацоўніцтва з КДБ тройчы, і менавіта за гэта на самой справе і трапіў пад крымінальны перасьлед.

Зараз адбывае пакараньне ў папраўчай калёніі г. Наваполацку (Віцебская вобласьць).



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

SIARHIEJ ANTOŃCZYK

Siarhiej Antończyk – deputowany do Rady Najwyższej XII Kadencji, jeden z organizatorów i liderów białoruskiego ruchu robotniczego.

Urodzony 1 kwietnia 1956 r. w miasteczku Pleszczenice w rejonie łogojskim okręgu Mińsk. Syn byłego więźnia politycznego, który spędził 17 lat w stalinowskich łagrach.

Po szkole pracował w gospodarstwie leśnym i służył w wojsku, po czym ożenił się i wyjechał do Mińska. Kontynuował pracę w różnych zawodach w Mińskich Zakładach Produkcyjnych im. Lenina (obecnie zakład „Belwar"). W 1989 r. wstąpił do partii BNF (Konserwatywno-Chrześcijańska Partia Białoruski Front Ludowy). Aktywista i współzałożyciel ruchu robotniczego w kwietniu 1991 r.

W latach 1990–1995 został delegatem do Rady Najwyższej Republiki Białoruś i Rady Miasta Mińska. W parlamencie reprezentował opozycyjną frakcję BNF. Współuczestniczył w proklamacji niepodległości Republiki Białoruś. W roku 1992 został jednym z inicjatorów referendum w sprawie przedterminowego rozwiązania Rady Najwyższej.

Uczestniczył w pracach sławnej komisji antykorupcyjnej parlamentu, na czele której stał przyszły prezydent Aleksander Łukaszenka. Po wyborze tego ostatniego na szefa państwa, wystąpił w Radzie Najwyższej ze sławnym raportem o korupcji otoczenia prezydenta (20 grudnia 1994 r.). Gazety, które miały opublikować raport Antończyka, dostały oficjalny zakaz publikacji.

KRONIKA REPRESJI

Na przełomie lat 1994 i 1995 przeciwko Siarhiejowi Antończykowi wszczęto postępowanie karne. Było to spowodowane pozwem sądowym wniesionym przeciwko Antończykowi przez ówczesnego pełnomocnika prezydenta Iwana Titenkowa, który poczuł się dotknięty umieszczeniem swojego nazwiska w raporcie o korupcji na szczytach władzy. Antończyk został oskarżony o zniesławienie. Wyrokiem sądu został skazany na karę grzywny, równą ok. 20 tysięcy dolarów. Majątek Siarhieja Antończyka został częściowo skonfiskowany.

W kwietniu 1995 Siarhiej Antończyk został pobity wraz z innymi posłami z BNF w trakcie głodówki protestacyjnej w gmachu parlamentu.

W sierpniu 1995 r., nie bacząc na immunitet parlamentarny, Antończyk został zatrzymany w trakcie strajku robotników mińskiego metra. Był przetrzymywany kilka dni wraz z liderem związku zawodowego G. Bykowem w hangarze oddziału specjalnego jednostki wojskowej. Była to pierwsza próba porwania liderów opozycji w najnowszej historii kraju.

W roku 2001 Siarhiej Antończyk został kandydatem na prezydenta, ustąpił jednak na rzecz Michaiła Marynina. Pracował nad utworzeniem związków zawodowych, m.in. Samopomocy Robotniczej. Był zatrzymywany przez milicję i służby specjalne ponad 40 razy. Dwukrotnie wszczynano przeciw niemu sprawy karne.

СЯРГЕЙ АНТОНЧЫК

Сяргей Антончык – дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня, адзін з арганізатараў і лідэраў рабочага руху Беларусі.

Нарадзіўся 1 красавіка 1956 году ў мястэчку Плешчаніцы Лагойскага раёну Менскай вобласьці. Сын былога палітвязьня, які 17 гадоў правёў у сталінскіх лягерах.

Пасьля школы спачатку працаваў у леспрамгасе і служыў у войску, потым ажаніўся і пераехаў на радзіму жонкі ў Менск. Працягнуў працу па розных рабочых спэцыяльнасьцях на Менскім вытворчым аб'яднаньні імя Леніна (цяпер – завод «Белвар»).

У 1989 г. уступіў у суполку БНФ. Актывіст і адзін са стваральнікаў рабочага руху. Актыўны ўдзельнік страйку працоўных у красавіку 1991 г.

У 1990–1995 гг. быў дэпутатам Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь і Менскага гарсавету. У парлямэнце ўваходзіў у апазыцыйную фракцыю БНФ. Пры ўдзеле Сяргея Антончыка была абвешчаная незалежнасьць Рэспублікі Беларусь. У 1992 г. ён таксама быз адным зь ініцыятараў правядзеньня рэфэрэндуму па пытаньні датэрміновага роспуску Вярхоўнага Савету.

Працаваў у знакамітай антыкарупцыйнай камісыі парлямэнту, якую ўзначальваў будучы прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка. Пасьля абраньня апошняга кіраўніком – выступіў у Вярхоўным Савеце са знакамітым дакладам аб карупцыі ў атачэньні прэзыдэнта (20 сьнежня 1994 г.). На наступны дзень усе газэты, якія меліся надрукаваць даклад Антончыка, выйшлі зь «белымі плямамі» на старонках: у друкарнях тэкст быў зьняты па загадзе «зьверху».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У канцы 1994 – пачатку 1995 гг. супраць Сяргея Антончыка была распачатая крымінальная справа. Гэта стала вынікам таго, што тагачасны кіраўнік справамі прэзыдэнта Іван Ціцянкоў падаў на дэпутата Антончыка ў суд, будучы незадаволены згадкай пра сябе ў антыкарупцыйным дакладзе. Антончыка абвінавацілі ў паклёпе. Рашэньнем суда апазыцыйны дэпутат быў аштрафаваны на суму, эквівалентную прыкладна 20 тысячам даляраў. Была часткова канфіскаваная маёмасьць Сяргея Антончыка.

У красавіку 1995 г. Сяргей Антончык быў зьбіты разам зь іншымі дэпутатамі ад БНФ падчас галадоўкі пратэсту ў залі парлямэнту.

У жніўні 1995 г., нягледзячы на дэпутацкі імунітэт, Антончык быў затрыманы ў часе страйку працаўнікоў Менскага мэтрапалітэну. Некалькі сутак яго, а таксама лідэра Свабоднага прафсаюзу Генадзя Быкава, пратрымалі ў ангары на тэрыторыі спэцыяльнай часткі ўнутраных войскаў, не паведамляючы родным пра яго месцазнаходжаньне. Гэта была першая ў найноўшай гісторыі краіны спроба выкраданьня лідэраў пратэстаў.

У 2001 г. Сяргей Антончык вылучаўся кандыдатам у прэзыдэнты, але зьняў сваю кандыдатуру на карысьць Міхаіла Марыніча. Займаўся стварэньнем незалежных прафсаюзаў, у прыватнасьці, «Рабочай Самадапамогі». Агулам затрымліваўся міліцыяй і спэцслужбамі больш за 40 разоў. Двойчы супраць яго ўзбуджаліся крымінальныя справы.

ALEKSANDER ARASTOWICZ

Urodził się 9 grudnia 1952 r. w Słucku. W 1975 r. ukończył Białoruski Instytut Politechniczny. Zrobił doktorat w Czechosłowacji, obronił pracę i został docentem. 27 lat wykładał na rodzimym uniwersytecie, w katedrze mechaniki budowniczej. Problemy ze zdrowiem zmusiły go do opuszczenia uczelni.

Obecnie pracuje w prywatnej firmie.

W latach 1992–2005 był członkiem Białoruskiej Socjaldemokratycznej Partii „Narodna Hramada". W 2010 r. został wybrany na pierwszego zastępcę przewodniczącego komitetu organizacyjnego, którego celem było stworzenie odrodzonej partii „Narodna Hramada" pod przywództwem Mykoły Statkiewicza. W czasie wyborów prezydenckich 2010 r. był mężem zaufania kandydata na prezydenta, Mykoły Statkiewicza.

KRONIKA REPRESJI

Arastowicz został zatrzymany wieczorem 19 grudnia 2010 r. razem z Mykołą Statkiewiczem (taksówka, którą jechali z dworca po pacyfikacji demonstracji na Placu Niepodległości, została zablokowana przez milicję w pobliżu Poczty Głównej). Został umieszczony w areszcie śledczym KGB. 15 lutego 2011 r. zwolniono go, otrzymał jednak zakaz opuszczania miasta.

Oskarżono go o „masowe zamieszki" (artykuł 293 KK). 25 sierpnia 2011 r. Arastowicz dowiedział się, że jego sprawa karna została zamknięta, a zarzuty wobec niego umorzono.

АЛЯКСАНДАР АРАСТОВІЧ

Нарадзіўся 9 сьнежня 1952 году ў Слуцку. У 1975 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (цяпер БНТУ). Вучыўся ў асьпірантуры ў Чэхаславаччыне, абараніў дысэртацыю і стаў дацэнтам. На працягу 27 гадоў выкладаў у роднай ВНУ на катэдры будаўнічай мэханікі. Быў вымушаны сысьці адтуль з-за праблемаў са здароўем. Адзін час працаваў майстрам у будаўнічым трэсьце. Зараз працуе ў прыватнай фірме.

З 1992 па 2005 гг. – сябра БСДП. У 2010 г. абраны першым намесьнікам старшыні аргкамітэту па стварэньні адроджанай БСДП «Народная грамада» пад лідэрствам Міколы Статкевіча. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. быў даверанай асобай кандыдата ў прэзыдэнты Міколы Статкевіча.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы ўвечары 19 сьнежня разам зь Міколам Статкевічам (таксоўку, на якой яны ехалі з вакзалу пасьля разгону Плошчы, заблякавала міліцыя каля Галоўпаштамта).

Знаходзіўся ў СІЗА КДБ. 15 лютага 2011 г. быў вызвалены пад падпіску аб нявыезьдзе. Прад'яўлена абвінавачаньне па арт. 293 КК – «Масавыя беспарадкі». 25 жніўня 2011 г. даведаўся пра тое, што крымінальная справа супраць яго спыненая, абвінавачаньне зьнятае.

JAUHIEN ASINSKI

Jauhien Asinski urodził się w 1979 r. Jest działaczem kampanii obywatelskiej Europejska Białoruś. Mieszka w Mińsku.

KRONIKA REPRESJI

Zatrzymano go 27 lipca 1999 r. po akcji opozycji i oskarżono o „chuligaństwo" (artykuł 201, pkt 2 KK RB) za to, że rzekomo uderzył milicjanta.

Podczas śledztwa artykuł ten zmieniono na 2 inne – art. 186, pkt 3 – „Aktywny udział w grupowych działaniach, naruszających porządek publiczny" i art. 189, pkt 2 – „Groźby lub przemoc w stosunku do funkcjonariusza milicji na służbie". W areszcie śledczym Asinski był przetrzymywany 38 dni, po czym zwolniono go, zakazując jednocześnie opuszczania miasta.

18 stycznia 2000 r. w budynku mińskiego sądu zapadł wyrok w sprawie Asinskiego. Sędzia Walerij Komissarow nie zgodził się z kwalifikacją przestępstwa, jaką zaproponowali śledczy. Sąd zakwalifikował działania Asinskiego jako „stawianie oporu wobec funkcjonariusza milicji na służbie" (art. 187, pkt 1 KK RB). Asinski został skazany na 2 lata robót przymusowych. W maju 2011 r. wraz z innymi członkami Europejskiej Białorusi był kilkakrotnie wzywany na przesłuchania w związku ze sprawą podpalenia w Mińsku.

ЯЎГЕН АСІНСКІ

Яўген Асінскі нарадзіўся ў 1979 г. Актывіст кампаніі «Эўрапейская Беларусь». Жыве ў Менску.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы 27 ліпеня 1999 году пасьля акцыі апазыцыі і абвінавачаны па арт. 201 ч. 2 Крымінальнага кодэксу РБ – «злоснае хуліганства» за тое, што быццам бы ўдарыў міліцыянта. У ходзе сьледзтва артыкул абвінавачаньня быў зьменены на два новых: 186.3 – «актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія парушаюць грамадзкі парадак» і 189 ч. 2 – «пагроза ці гвалт у адносінах да супрацоўніка міліцыі… у сувязі з выкананьнем ім службовых абавязкаў». У СІЗА Яўгена Асінскага пратрымалі 38 дзён і выпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе.

18 студзеня 2000 г. у будынку Менскага гарадзкога суду быў вынесены прысуд па крымінальнай справе Яўгена Асінскага. Судзьдзя Валеры Камісараў у вынесеным прысудзе не пагадзіўся з прапанаванай сьледзтвам кваліфікацыяй злачынства, у якім абвінавачвалі Я. Асінскага. У выніку дзеяньні Я. Асінскага былі ізноў пераквартфікаваныя, цяпер ужо судом: ч. 2 арт. 201 на ч. 2 арт. 187.1 КК РБ (аказаньне супраціву супрацоўніку міліцыі ў сувязі з выкананьнем ім службовых абавязкаў). Па арт. 186.3 КК РБ суд Я. Асінскага апраўдаў, паколькі не знайшоў складу злачынства ў ягоных дзеяньнях па дадзеным артыкуле КК РБ. Яўген Асінскі асуджаны да двух гадоў папраўчых работ па месцы асноўнай працы з утрыманьнем дваццаці адсоткаў заробку.

У траўні 2011 г. выклікаўся на допыты па справе падпалу менскага Дома правасудзьдзя ў шэрагу іншых актывістаў грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь».

MIKOŁA ASTREJKA

Mikoła Astrejka urodził się 11 listopada 1980 r. w Mińsku. Ukończył Liceum Humanistyczne im. Jakuba Kołasy, a potem Białoruski Uniwersytet Państwowy, uzyskując specjalność „politolog – prawnik".

KRONIKA REPRESJI

W październiku 2005 r. próbował zarejestrować organizację społeczną, która miała zajmować się niezależną obserwacją wyborów, jednak władze nie wyraziły na to zgody.

Astrejka wraz ze swymi kolegami został skazany na 15 dni aresztu administracyjnego. 21 lutego 2006 r., w przededniu wyborów prezydenckich Mikoła Astrejka został aresztowany i umieszczony w areszcie śledczym KGB. Jemu oraz Enirze Bronickiej, Aleksandrowi Szałajko i Cimafiejowi Dranczukowi przedstawiono zarzuty działalności w imieniu niezarejestrowanej organizacji – stowarzyszenia „Partnerstwo".

4 sierpnia 2006 r. Mikoła Astrejka został skazany przez Centralny Sąd w Mińsku na 2 lata pozbawienia wolności w kolonii karnej. Karę odbywał w kolonii w Szkłowie. 17 listopada 2006 r. karę zmieniono na roboty przymusowe.

Uwolniono go 17 listopada 2006 r.

МІКОЛА АСТРЭЙКА

Мікола Астрэйка нарадзіўся 11 лістапада 1980 г. у Менску. Скончыў Нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа, затым – Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт па спэцыяльнасьці «палітоляг-юрыст».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У кастрычніку 2005 г. спрабаваў зарэгістраваць грамадзкую арганізацыю, якая мусіла займацца незалежным назіраньнем за прэзыдэнцкімі выбарамі, але ўлады не далі на гэта свайго дазволу. Астрэйку разам з паплечнікамі асудзілі да 15 сутак адміністрацыйнага арышту.

21 лютага 2006 г. напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, Мікола Астрэйка быў арыштаваны і зьмешчаны ў сьледчы ізалятар КДБ. Яму разам з Энірай Браніцкай, Аляксандрам Шалайкам і Цімафеем Дранчуком выставілі абвінавачаньне ў дзейнасьці ад імя незаконнай арганізацыі – незарэгістраванага грамадзкага аб'яднаньня «Партнэрства».

4 жніўня 2006 г. Мікола Астрэйка быў асуджаны судом Цэнтральнага раёну Менску да двух гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі агульнага рэжыму. Адбываў пакараньне ў шклоўскай папраўчай калёніі.

17 лістапада 2006 г. зьняволеньне Міколу Астрэйку было замененае на папраўчыя працы.

Вызвалены 17 лістапада 2006 г.

ALEKSANDER ATROSZCZENKO

Urodził się 22 marca 1981 r. w Mińsku. Studiował stosunki międzynarodowe na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. Został jednak stamtąd relegowany z powodu swojej działalności politycznej. Obecnie studiuje prawo międzynarodowe na Europejskim Uniwersytecie Państwowym w Wilnie.

W latach 2001–2006 był członkiem organizacji Żubr, brał udział w akcjach, kilkakrotnie był zatrzymywany przez funkcjonariuszy milicji. W 2000 roku podczas Dnia Woli (był to dzień, kiedy OMON dopuścił się masowych zatrzymań dziennikarzy), niedaleko Placu Jakuba Kołasy, złapali go ludzie w maskach, wrzucili do samochodu milicyjnego, potem do autobusu i 40 minut jechali z nim, „żartując", że wiozą go do Kuropat na rozstrzelenie. Wyrzucono go 15 km od miasta, w zaspę śnieżną.

Atroszczenko 10 lat pracował jako korespondent portalu charter97.org. Po założeniu obywatelskiej kampanii Europejska Białoruś został jej rzecznikiem prasowym. Podczas wyborów prezydenckich w 2010 roku był rzecznikiem prasowym sztabu Andreja Sannikaua.


FOT. JULIA DARASHKEVICH

KRONIKA REPRESJI

Atroszczenko został zatrzymany 20 grudnia 2010 r. we własnym domu. Umieszczono go w areszcie śledczym KGB, przedstawiono mu zarzut popełnienia przestępstwa z artykułu 293 KK RB. 2 marca 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 4 lata kolonii o zaostrzonym rygorze. Od 25 marca 2011 r. karę odbywał w kolonii karnej „Witba-3" w obwodzie witebskim. 14 września 2011 r. został ułaskawiony przez Łukaszenkę.

АЛЯКСАНДАР АТРОШЧАНКАЎ

Нарадзіўся 22 сакавіка 1981 г. у Менску. Вучыўся на факультэце міжнародных адносінаў БДУ, адкуль быў выключаны за палітычную дзейнасьць. Вучыцца ў ЭГУ (Вільня) па спэцыяльнасьці «міжнароднае права».

У 2001–2006 гг. быў сябрам арганізацыі «Зубр», браў удзел у акцыях, затрымліваўся за сваю палітычную дзейнасьць міліцыяй, а таксама невядомымі ў цывільным. Так, у 2000 годзе падчас сьвяткаваньня Дня Волі (гэта быў дзень масавага захопу журналістаў АМАПам) яго схапілі людзі ў масках ў раёне плошчы Якуба Коласа, запхнулі ў міліцэйскую машыну, потым у аўтазак, і каля 40 хвілінаў вазілі, «жартуючы», што вязуць у Курапаты на расстрэл. Хлопца выкінулі ў сьнег у 15 км ад гораду.

Аляксандар 10 гадоў працаваў карэспандэнтам сайту charter97.org. Пасьля стварэньня грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь» быў яе прэс-сакратаром. На выбарах-2010 – прэс-сакратаром штаба Андрэя Саньнікава.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 20 сьнежня 2010 г. у сябе дома. Зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Абвінавачаны па артыкуле 293 Крымінальнага кодэксу РБ.

2 сакавіка 2011 г. асуджаны ў Фрунзенскім судзе Менску на 4 гады зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. З 25 сакавіка 2011 г. адбываў тэрмін пакараньня ў папраўчай калёніі «Віцьба-3» у Віцебскім раёне.

Памілаваны Лукашэнкам і вызвалены 14 верасьня 2011 г.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

MIKOŁA AUTUCHOWICZ

Mikoła Autuchowicz to weteran wojny w Afganistanie, odnoszący sukcesy przedsiębiorca i działacz demokratyczny z Wołkowyska. Urodził się 7 stycznia 1963 r. w Wołkowysku. Ukończył Szkołę Zawodową nr 37 w sąsiedniej wsi Balszaja Briestowica, został mechanikiem samochodowym. Od 1981 r. służył w armii jako kierowca w strategicznych wojskach rakietowych Federacji Rosyjskiej (w obwodzie saratowskim).

Później ukończył szkołę chorążych i poprosił o przeniesienie do Afganistanu. Za obronę mostu pod Kandaharem i udział w innych operacjach został nagrodzony orderem Czerwonej Gwiazdy (Krasnaja Zwiezda), medalami „Za odwagę" i „Za zasługi w boju". Opuścił armię w 1991 r., w stopniu starszego chorążego i zaczął zajmować się własnym biznesem w Wołkowysku.

KRONIKA REPRESJI

15 października 2005 r. Mikoła Autuchowicz trafił do aresztu śledczego Kolonii nr 1 w Mińsku. 7 lipca 2006 r. został skazany na 3 lata i 6 miesięcy pozbawienia wolności z konfiskatą majątku. Sąd uznał go winnym uchylania się od płacenia podatków i spowodowania strat w budżecie w dużej wysokości, a także oskarżono go o prowadzenie działalności bez rejestracji i licencji.

Rozprawa dotycząca konfiskaty mienia odbyła się pod koniec 2007 r. Pozostawiono mu dom, bazę samochodową, połowę taksówek i jeden oddzielny budynek. Skonfiskowano 13 taksówek, mieszkanie i 2 magazyny. Do windykacji wyznaczona była kwota ponad 350 milionów rubli białoruskich.

Autuchowicz był jednym z sześciu więźniów politycznych, którzy zostali uwolnieni w wyniku surowych sankcji nałożonych na Białoruś przez Stany Zjednoczone i Unię Europejską, jednak już 8 lutego 2009 r. został ponownie zatrzymany i oskarżono go o rzekome przechowywanie broni. W tym czasie stan zdrowia Autuchowicza był poważny, jego organizm był wyczerpany długotrwałym protestem głodowym i brakiem odpowiedniej opieki medycznej.

W 2010 r. skazano go na 5 lat i 2 miesiące pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze za rzekomo bezprawne przewożenie pięciu naboi do broni myśliwskiej (art. 295, pkt 2 – „Bezprawne użycie broni palnej, amunicji i materiałów wybuchowych").

Karę odbywał w Kolonii Karnej nr 5 w mieście Iwancewicze (obwód brzeski). W grudniu 2011 r. został na miesiąc przeniesiony do izolatki. 17 stycznia 2012 r. wyrokiem sądu został przeniesiony do zamkniętego więzienia w Grodnie w którym obecnie przebywa.

МІКАЛАЙ АЎТУХОВІЧ

Мікалай Аўтуховіч – вэтэран аўганскай кампаніі, пасьпяховы прадпрымальнік і дэмакратычны актывіст з Ваўкавыску. Нарадзіўся 7 студзеня 1963 г. у Ваўкавыску. Пасьля школы скончыў СПТВ-37 у суседняй Вялікай Бераставіцы, стаў мэханікам па рамонце аўтамабіляў. З 1981 году служыў у войску ў Саратаўскай вобласьці Расеі кіроўцам у ракетных войсках стратэгічнага прызначэньня. Пазьней скончыў школу прапаршчыкаў, папрасіўся служыць у Аўганістан. За ахову маста пад Кандагарам і ўдзел у іншых апэрацыях узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума мэдалямі – «За адвагу» і «За баявыя заслугі». Звольніўся з войска ў 1991 годзе ў Ваўкавыску старшым прапаршчыкам, стаў займацца бізнэсам.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў зьняволены 7 ліпеня 2006 г. на 3 гады і 6 месяцаў з канфіскацыяй маёмасьці. Суд прызнаў яго вінаватым ва ўхіленьні ад выплаты падаткаў са стратамі для бюджэту ў асабліва буйным памеры, а таксама ў ажыцьцяўленьні прадпрымальніцкай дзейнасьці без рэгістрацыі і атрыманьня ліцэнзіі. Тэрмін зьняволеньня яму адлічваўся ад 15 кастрычніка 2005 году, калі яго пасадзілі ў сьледчы ізалятар у калёніі № 1 у Менску.

Суд па канфіскацыі маёмасьці адбыўся пры канцы 2007 году. Мікалаю Аўтуховічу пакінулі дом, у зьняволенага засталася таксама аўтабаза, палова ягоных таксовак і адзін асобны будынак. Тым часам былі сканфіскаваныя 13 таксовак, кватэра і два склады. Да спагнаньня была прызначаная сума больш як на 350 мільёнаў рублёў.

Ён быў адным з шасьці палітзьняволеных, вызваленых у выніку жорсткіх санкцый ЗША і ЭЗ, аднак 8 лютага 2009 г. яго зноў затрымалі і ў 2010 г. асудзілі нібыта за захоўваньне зброі. Здароўе Аўтуховіча тады было сур'ёзна падарванае сэрыяй доўгіх галадовак пратэсту і недахопам неабходнай мэдычнай дапамогі.

Мікалай Аўтуховіч асуджаны на 5 гадоў зьняволеньня паводле артыкулу 295 частка 3 – «Незаконныя дзеяньні адносна агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў». Дадаткова Аўтуховіча асудзілі яшчэ на 2 месяцы зьняволеньня, матывававўшы тым, што быццам бы новае злачынства ён учыніў, не адбыўшы 2 месяцы з папярэдняга пакараньня. Такім чынам, цяпер Мікалай Аўтуховіч асуджаны на 5 гадоў і 2 месяцы зьняволеньня ва ўмовах строгага рэжыму, без канфіскацыі маёмасьці.

Адбываў пракараньне ў папраўчай калёніі № 5 у г. Івацэвічы (Берасьцейская вобласьць). У сьнежні 2011 г. на месяц быў зьмешчаны ў ПКТ – памяшканьне камэрнага тыпу. Рашэньнем суду, які адбыўся 17 студзеня 2012 г., быў пераведзены ў турму Гародні.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

NASTAZJA AZARKA

Nastazja Azarka, białoruska poetka i działaczka społeczna, była jedną z oskarżonych w sprawie „Młodego Frontu". W 2004 r. uznana przez Amnesty International za więźnia sumienia. W 2007 r. Azarkę sądzono w jej rodzinnym mieście, Nieświeżu.

Urodziła się 4 grudnia 1981 r. we wsi Kwacze w rejonie nieświeskim obwodu mińskiego Białoruskiej SRR. Skończyła Szkołę Średnią nr 4 w Nieświeżu oraz Nieświeski Państwowy Koledż Pedagogiczny im. Jakuba Kołasy, zdobywając zawód nauczyciela klas początkowych i specjalność edukacji zawodowej. Była przewodniczącą nieświeskiego oddziału „Młodego Frontu". Pracowała w wiejskiej szkole podstawowej we wsi Sugwazdy. Od dzieciństwa pisała wiersze, była członkiem stowarzyszenia literackiego „Waloszki" w Nieświeżu. Wydała kilka tomików wierszy.

KRONIKA REPRESJI

Pierwszy areszt administracyjny (5 dni) Azarka otrzymała za udział w akcji 21 czerwca 2004 r., drugi (10 dni) za udział w protestach, które odbyły się po referendum 2004 r. W 2006 roku śledczy D.M. Miechow z Komitetu Wykonawczego obwodu mińskiego wszczął przeciwko Azarce sprawę karną z artykułu 193.1 KK RB – „Działalność w imieniu niezarejestrowanego stowarzyszenia, fundacji lub organizacji religijnej". Sprawa ta została zawieszona z powodu braku dowodów, ale już 5 marca 2007 r. wznowiono ją decyzją śledczego z prokuratury obwodu mińskiego W. A. Alieksiejewa.

Nastazja Azarka była podejrzana o to, że „razem z innymi osobami w okresie od października 1998 r. brała aktywny udział w nielegalnej działalności organizacji społecznej „Młody Front", która nie przeszła rejestracji państwowej w ustanowionym porządku. Przy tym rozpowszechniała materiały z wezwaniami do walki z istniejącym porządkiem społecznym i rządzącą władzą państwową w Republice Białoruś, brała aktywny udział w organizacji i przeprowadzaniu niesankcjonowanych mityngów, działalności agitacyjnej i innej, która nastawiona była na osiągnięcie celów wskazanej organizacji.

4 września 2007 r. sędzia sądu rejonu nieświeskiego, obwodu mińskiego, Maria Dunajewa, uznała Azarkę winną zarzucanego jej czynu i skazała ją na grzywnę w wysokości 40 płac minimalnych.

Jesienią 2008 r. Azarka przyłączyła się do młodzieżowego ruchu „Młoda Białoruś". W lipcu 2010 r. grożono jej wszczęciem sprawy karnej za wywieszenie narodowych, biało-czerwono-białych flag w Nieświeżu, w rocznicę uzyskania niezależności przez Republikę Białoruś.

Obecnie Nastazja Azarka wychowuje małe dziecko.

НАСТАСЬСЯ АЗАРКА

Беларуская паэтка і грамадзкая актывістка. Адна з асуджаных па «справе Маладога Фронту» у 2007 г. Насту Азарку судзілі асобна ад іншых маладафронтаўцаў – у родным горадзе Нясьвіжы.

Нарадзілася 4 сьнежня 1981 г. у вёсцы Квачы Нясьвіскага раёну Менскай вобласьці, у 1999 г. скончыла сярэднюю школу №4 г. Нясьвіжа. У 1999–2000 гг. навучалася ў ПТВ г. Ганцавічы Берасьцейскай вобласьці, у 2000–2003 гг. – у Нясьвіскім дзяржаўным пэдагагічным каледжы імя Якуба Коласа па прафэсіі настаўнік пачатковых клясаў. Кіравала нясьвіскай суполкай «МФ», пакуль у 2003 г. не адбыўся яе самароспуск. Працавала ў базавай школе вёскі Сугвазды Валожынскага раёну Менскай вобласьці, на ільнозаводзе ў мястэчку Гарадзея Нясьвіскага раёну. Зь дзяцінства піша вершы, бярэ ўдзел у літаратурным аб'яднаньні «Валошкі» у Нясьвіжы. Выдала некалькі паэтычных зборнікаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЛЕДУ

Першы адміністратыўны арышт у 5 сутак атрымала за ўдзел у акцыі 21 ліпеня 2004 г. Другі (10 сутак) – за ўдзел у пратэстах пасьля рэфэрэндуму ў тым жа 2004 г.

У 2006 г. сьледчым Д.М. Мехавым ва УУС Менаблвыканкаму была распачатая крымінальная справа па артыкуле 193.1 КК РБ (арганізацыя дзейнасьці аб'яднаньня, фонду ці рэлігійнай арганізацыі, якая не прайшла дзяржаўнай рэгістрацыі ці ўдзел у ёй), якую прыпынілі «за адсутнасьцю доказаў». Аднак крымінальная справа была аднаўленая 5 сакавіка 2007 г. паводле пастановы сьледчага пракуратуры Менскай вобласьці В.А. Аляксеева.

Наста Азарка падазравалася ў тым, што «сумесна зь іншымі асобамі ў пэрыяд з кастрычніка 1998 да гэтага часу прымала актыўны ўдзел у незаконнай дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня «Малады Фронт», якое не прайшло ва ўстаноўленым парадку дзяржаўнай рэгістрацыі. Пры гэтым распаўсюджвала друкаваную прадукцыю з заклікамі да барацьбы зь існуючым грамадзкім ладам і дзеючай дзяржаўнай уладай у Рэспубліцы Беларусь, прымала актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзеньні несанкцыянаваных мітынгаў, агітацыйнай і іншай дзейнасьці, скіраванай на дасягненьне мэтаў указанага аб'яднаньня».

4 верасьня 2007 г. судзьдзя Марыя Дунаева суду Нясьвіскага раёну Менскай вобласьці прызнала Насту Азарку вінаватай ва ўчыненьні інкрымінуемага ёй злачынства і прызначыла ёй пакараньне ў выглядзе штрафу памерам 40 базавых велічыняў.

З восені 2008 году далучылася да маладзевага руху «Маладая Беларусь». У ліпені 2010 г. ёй пагражалі завесьці крымінальную справу за вывешваньне нацыянальных бел-чырвона-белых сьцягоў у Нясьвіжы ў гонар гадавіны незалежнасьці Рэспублікі Беларусь.

Зараз Наста гадуе маленькае дзіця.


FOT. JULIA DARASHKEVICH

DZMITRIJ BANDARENKA

Dzmitrij Bandarenka to białoruski działacz społeczny i polityczny, obrońca praw człowieka, dziennikarz, członek Białoruskiego Stowarzyszenia Dziennikarzy, koordynator kampanii obywatelskiej „Europejska Białoruś".

Urodził się 28 września 1963 r. w Mińsku. W 1984 r. ukończył Akademię Wychowania Fizycznego. W latach 1995–1997 był dyrektorem jedynego niezależnego radia „101,2 FM", które transmitowało programy w języku białoruskim. W 1997 r., po zamknięciu radiostacji, na Białorusi rozpoczęła się fala masowych represji wobec niezależnych mediów.

Dzmitrij Bandarenka jest również jednym z założycieli portalu informacyjnego i obywatelskiej inicjatywy „Karta 97" (www.charter97.org). Od 1998 r. Dzmitrij Bandarenka był członkiem Rady Koordynacyjnej Demokratycznych Sił Białorusi. Był on organizatorem znanych marszów protestacyjnych „Tak nie da się żyć!", „Za lepsze życie", Marszów Wolności oraz akcji protestacyjnych przeciwko fałszowaniu wyników wyborów w latach 2001, 2004, 2006, 2008. Za swoją działalność polityczną i obywatelską postawę Dzmitrij Bandarenka był wielokrotnie zatrzymywany i aresztowany, bity i prześladowany przez białoruski reżim.

W 2004 r. zainicjował, a następnie aktywnie uczestniczył w pracach koalicji stowarzyszeń społecznych „Svobodnaja Bielarus" i organizował kilkudniowe akcje protestacyjne przeciwko fałszowaniu wyników wyborów parlamentarnych.

W 2008 r. Dzmitrij Bandarenka był jednym z założycieli obywatelskiej kampanii Europejska Białoruś (www.europeanbelarus.org), która za cel stawia sobie wstąpienie Białorusi do Unii Europejskiej.

KRONIKA REPRESJI

W kampanii wyborczej 2010 r. Bandarenka był mężem zaufania kandydata na prezydenta, Andreja Sannikaua. 19 grudnia 2010 r. brał udział w pokojowej manifestacji przeciwko sfałszowaniu wyników wyborów prezydenckich. Został aresztowany i zamknięty w areszcie śledczym KGB, gdzie poddawany był przemocy fizycznej i psychicznej oraz torturowany.

26 kwietnia 2011 Dzmitrij Bandarenka został skazany na 2 lata kolonii karnej.

W trakcie pobytu w więzieniu przeszedł skomplikowaną operację kręgosłupa, po której nie miał możliwości odbycia właściwej rekonwalescencji, przez co jego stan zdrowia znacznie się pogorszył. Po aresztowaniu zdiagnozowano u niego zmiażdżenie dysków i naruszenie nerwów rdzenia kręgowego. 25 lipca 2011 r. Dzmitrija Bandarenkę przeniesiono z więziennego szpitala przy ul. Wołodarskiego do Szpitala nr 5 w Mińsku, gdzie następnego dnia zrobiono mu operację. 17 sierpnia 2011 więzień polityczny został przeniesiony ze Szpitala nr 5 z powrotem do więziennego szpitala, znajdującego się na terenie aresztu śledczego przy ul. Wołodarskiego. 1 września 2011 ujawniono, że Bandarenkę przeniesiono z „wołodarki" do Kolonii Karnej nr 15 w Mohylewie. W więzieniu jego stan zdrowia znacznie się pogorszył. Przez pewien okres Dzmitrij miał trudności z chodzeniem, nawet przy pomocy laski.

Na mocy dekretu Łukaszenki został ułaskawiony 15 kwietnia 2012 r.

ЗЬМІЦЕР БАНДАРЭНКА

Грамадзкі актывіст, сябра ГА «БАЖ». Нарадзіўся 28 верасьня 1963 году ў Менску. У 1984 г. скончыў Інстытут фізычнай культуры. У 1995–1996 гг. працаваў на незалежным Радыё 101,2 FM, пазьней зачыненым уладамі. Адзін з заснавальнікаў грамадзянскай ініцыятывы «Хартыя-97», каардынатар грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь». Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2010 быў актывістам штабу кандыдата на прэзыдэнта Андрэя Саньнікава.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў арыштаваны 20 сьнежня 2010 г. ва ўласнай кватэры і зьмешчаны ў СІЗА КДБ. У канцы сьнежня 2010 г. яму прад'яўленае абвінавачаньне па крымінальнай справе, узбуджанай сьледчым упраўленьнем папярэдняга расьследаваньня ГУУС Менгарвыканкаму па чч. 1 і 2 арт. 293 КК (арганізацыя масавых беспарадкаў і ўдзел у іх). 4 красавіка 2011 г. абвінавачваньне перакваліфікаванае на ч. 1 арт. 342 (арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, альбо ўдзел у іх).

26 красавіка 2011 г. асуджаны на 2 гады калёніі ўзмоцненага рэжыму.

Падчас зьняволеньня перанёс складаную апэрацыю на пазваночніку, пасьля якой ня змог належным чынам аднавіць сілы, стан яго здароўя моцна пагоршыўся. У палітыка пасьля арышту дыягнаставалі некалькі грыжаў дыскаў хрыбетніку і ўшчамленьне сьпіннамазгавых нэрваў. 25 ліпеня 2011 г. Зьмітра Бандарэнку даставілі з Рэспубліканскай турэмнай бальніцы на вуліцы Валадарскага ў 5-ю бальніцу Менску, дзе на наступны дзень зрабілі апэрацыю. 17 жніўня 2011 г. палітвязень быў пераведзены з 5-й клінічнай бальніцы Менску назад у Рэспубліканскую турэмную бальніцу, якая месьціцца на тэрыторыі СІЗА па вул. Валадарскага. 1 верасьня 2011 г. стала вядома пра тое, што Бандарэнку этапавалі з «валадаркі» у калёнію № 15 ў г. Магілёў.

29 студзеня 2012 г. стала вядома пра пагаршэньне ўмоваў утрыманьня Зьмітра ў калёніі. Напрыклад, з 30 студзеня ў яго канфіскавалі мыліцы і артапэдычны абутак. Нейкі час Зьміцер ня мог хадзіць і зь цяжкасьцю рухаўся толькі з дапамогай кійка.

15 красавіка 2012 г. вызвалены паводле ўказу аб памілаваньні.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

JURIJ BANDAŻEWSKIJ

Jurij Bandażewskij, były rektor Państwowego Instytutu Medycznego w Homlu, znany uczony, jeden z lepszych specjalistów ds. radiologii, członek Białoruskiej Akademii Nauk Medycznych, autor książek o wpływie radiacji na organizm człowieka, urodził się 9 stycznia 1957 r. w mieście Raduń, rejon woronowski, obwód grodzieński.

Ukończył Grodzieński Medyczny Instytut Państwowy (1980). Doktor nauk medycznych (1988), profesor (1991), członek-korespondent Białoruskiej Akademii Nauk Medycznych, członek Akademii Nauk w Nowym Jorku, honorowy członek Polskiej Akademii Nauk Medycznych. Pracował jako stażysta kliniczny, badacz, kierownik centralnego laboratorium badawczego Zakładu Patologii Grodzieńskiego Instytutu Medycznego (1980–1990), był rektorem Państwowego Instytutu Medycznego w Homlu (1990–1999).

KRONIKA REPRESJI

13 lipca 1999 r. Jurij Bandażewskij został zatrzymany i umieszczony w areszcie tymczasowym. 4 sierpnia przedstawiono mu zarzuty z artykułu 169, pkt 3 – „Przyjęcie korzyści majątkowej". Oskarżenie to przedstawiono rektorowi na podstawie dowodów przedstawionych przez prorektora Władimira Rewkowa, zatrzymanego 12 lipca. Są powody, by myśleć, że w stosunku do Rewkowa zostały użyte środki psychotropowe, dlatego że już pod koniec lipca Rewkow skierował do prokuratury obwodu homelskiego oświadczenie, w którym zrzekł się wcześniejszych zeznań.

Przeciwko Bandażewskiemu i Rewkowowi została wszczęta sprawa karna. Obaj zostali oskarżeni o to, że pomagali w dostaniu się na studia niektórym kandydatom, za co otrzymywali spore łapówki.

27 grudnia 1999 r. Jurij Bandażewskij został zwolniony z więzienia. Otrzymał zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Decyzja o zmianie środka zapobiegawczego została podjęta w związku ze stanem zdrowia więźnia. Centrum Praw Człowieka „Wiasna" oceniło, że prześladowanie rektora Instytutu Medycznego, profesora Bandażewskiego, było bezpośrednio związane z jego stanowczą postawą dotyczącą problemu radiacyjnej ochrony ludności, która ucierpiała podczas katastrofy w elektrowni w Czarnobylu.

18 czerwca 2001 r. Bandażewskij został skazany na 8 lat pozbawienia wolności. Śledztwo trwało ponad półtora roku (według obrońców praw człowieka, naukowca skazano za działalność naukową). Na podstawie badań wpływu małych dawek promieniowania na organizm ludzki, Bandażewskij doszedł do wniosków, że przebywanie na terytorium skażonym (czarnobylskim) jest śmiertelnie groźne. Opinia ta przeczy oficjalnej wersji głoszącej możliwość osiedlenia się ludności na opuszczonym terenie.

Unia Europejska jeszcze przed orzeczeniem wyroku, wydała Bandażewskiemu Paszport Wolności, uznając go tym samym, za więźnia sumienia. 5 sierpnia 2005 r. został zwolniony. W sprawie Bandażewskiego nie ma bezpośrednich dowodów. Istnieją podejrzenia, że zatrzymanie Bandażewskiego było wcześniej zaplanowaną operacją.

Od 2006 r. Bandażewskij mieszka we francuskim mieście Clermont-Ferrand, gdzie stara się kontynuować swoje badania naukowe. Stał się 25-tym człowiekiem na świecie, który otrzymał Paszport Wolności, który daje możliwość mieszkania na terytorium dowolnego kraju UE. Jest honorowym mieszkańcem piętnastu miast we Francji, w tym Paryża.

Jurij Bandażewskij wysłał list do Aleksandra Łukaszenki, w którym opisał konflikt homelskiego instytutu z Ministerstwem Zdrowia RB, które połączył on z „faktami niezamierzonego używania czarnobylskich materiałów przez Instytut Radiologiczny Ministerstwa Zdrowia RB". Wniosek ten profesor Jurij Bandażewskij wysnuł na podstawie swoich doświadczeń podczas pracy w komisji analizującej efektywność badań realizowanych przez Radiologiczny i Endokrynologiczny Instytut Badań Klinicznych, angażujących budżet ponad 17 mld rubli. Raport profesora wykazał, że jedynie kilka z prac, które pochłonęły 1,1 mld rubli „może okazać się pożytecznymi z naukowego i praktycznego punktu widzenia", a pozostałe 16 mld rubli to zmarnowane pieniądze. W taki sposób Jurij Bandażewskij, uzbrojony w sensacyjne wyniki badań, niejednokrotnie wzywał białoruskie władze do troski o zdrowie ludzi, a gdy poruszył temat finansów, zaczęto stwarzać mu problemy, zakończone aresztowaniem. Jurij Bandażewskij niejednokrotnie informował o niewystarczających działaniach służących ochronie zdrowia ludzkiego w strefie czarnobylskiej.

ЮРЫЙ БАНДАЖЭЎСКІ

Юры Бандажэўскі – былы рэктар Гомельскага дзяржаўнага мэдычнага інстытуту, доктар мэдычных навук. Вядомы навуковец, адзін з найбуйнейшых спэцыялістаў у галіне мэдычнай радыялёгіі, сябра Беларускай акадэміі мэдычных навук, аўтар кніг пра ўплыў радыяцыі на арганізм чалавека.

Нарадзіўся 9 студзеня 1957 г. у мястэчку Радунь Воранаўскага раёну Гарадзенскай вобласьці.

Скончыў Гарадзенскі дзяржаўны мэдычны інстытут (1980 г.). Доктар мэдычных навук (1988 г.), прафэсар (1991 г.), член-карэспандэнт Беларускай акадэміі мэдычных навук, акадэмік Беларускай інжынэрнай акадэміі, правадзейны сябра Нью-Ёркскай акадэміі навук, ганаровы акадэмік Польскай акадэміі мэдычных навук.

Працаваў клінічным ардынатарам, навуковым супрацоўнікам, загадчыкам цэнтральнай навукова-дасьледчай лябараторыі катэдры паталягічнай анатоміі Гарадзенскага мэдычнага інстытуту (1980–1990 гг.), рэктарам Гомельскага дзяржаўнага мэдычнага інстытуту (1990–1999 гг.).

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

13 ліпеня 1999 году Юрый Бандажэўскі быў затрыманы і зьмешчаны ў ізалятар часовага ўтрыманьня. 4 жніўня яму было прад'яўленае абвінавачаньне па арт. 169 ч. 3: «атрыманьне хабару, зьдзейсьненае службовай асобай, якая займае адказную пасаду, альбо асобай, якая раней была асуджаная за атрыманьне хабару, альбо атрыманьне хабару ў асабліва вялікіх памерах». Абвінавачаньне было прад'яўленае рэктару паводле паказаньняў прарэктара гэтай жа ўстановы Ўладзімера Раўкова, затрыманага 12 ліпеня. Ёсьць меркаваньні, што да Ўл. Раўкова ўжываліся псыхатропныя сродкі, бо ўжо ў канцы ліпеня прарэктар накіраваў заяву пракурору Гомельскай вобласьці, у якой адмовіўся ад дадзеных раней паказаньняў. На Ю. Бандажэўскага і Ўл. Раўкова заведзеная крымінальная справа па вышэйназваным артыкуле, што азначае, што абодва кіраўнікі падазраюцца ў тым, што па папярэдняй змове садзейнічалі паступленьню ў ВНУ асобных абітурыентаў, за што атрымлівалі хабар у вялікіх памерах.

27 сьнежня 1999 г. Юры Бандажэўскі быў вызвалены з-пад варты пад падпіску аб

нявыезьдзе. Рашэньне аб зьмяненьні меры стрыманьня было прынятае сьледзтвам у сувязі са станам здароўя Ю. Бандажэўскага. ПЦ «Вясна» лічыць, што перасьлед рэктара Гомельскага дзяржаўнага мэдычнага інстытуту прафэсара Ю. Бандажэўскага зьвязаны зь яго няўгоднай уладам прынцыповай пазыцыяй адносна праблемы радыяцыйнай абароны насельніцтва, якое пацярпела ад аварыі на ЧАЭС, выкладзенай ім на самым высокім узроўні.

Па абвінавачваньні ў атрыманьні хабараў у буйных памерах 18 чэрвеня 2001 г. асуджаны да васьмі гадоў пазбаўленьня волі. Сьледзтва вялося амаль паўтара года (на думку праваабаронцаў і замежных калегаў, вучонага судзілі за навуковую дзейнасьць). Пры вывучэньні ўплыву малых дозаў радыяцыі на арганізм чалавека ён прыйшоў да высновы, што жыцьцё на забруджаных (чарнобыльскіх) тэрыторыях сьмяротна небясьпечнае. Гэта ідзе насуперак з афіцыйным курсам на вяртаньне людзей у апусьцелыя раёны.

Эўразьвяз напярэдадні суду выдаў Бандажэўскаму пашпарт свабоды, тым самым прызнаўшы вучонага вязьнем сумленьня. З 2006 году Юрый Бандажэўскі пражывае ў францускім горадзе Клермон-Фэран, дзе «спрабуе працягнуць свае навуковыя дасьледаваньні, усталёўваючы кантакты з калегамі». Ён стаў 25-м чалавекам у сьвеце, якія атрымаў Пашпарт свабоды, што дае права жыць на тэрыторыі любой краіны Эўразьвязу. Ганаровы грамадзянін 15 францускіх гарадоў, у тым ліку Парыжу. Ганаровы доктар Марсэльскага ўнівэрсытэту.

5 жніўня 2005 г. быў вызвалены.

У справе Ю. Бандажэўскага адсутнічаюць прамыя доказы. Існуе меркаваньне, што затрыманьне прафэсара было загадзя сплянаванай апэрацыяй. Нейкі час перад гэтым Ю. Бандажэўскі накіраваў ліст да А. Лукашэнкі, у якім распавёў пра неспрыяльныя адносіны Гомельскага мэдінстытуту зь Міністэрствам аховы здароўя РБ, якія ён зьвязваў з выяўленымі ім «фактамі нямэтавага выкарыстоўваньня чарнобыльскіх сродкаў Інстытутам радыяцыйнай мэдыцыны Міністэрства аховы здароўя РБ». Такую выснову прафэсар Ю. Бандажэўскі зрабіў пасьля працы ў спэцыяльнай камісыі, якая прааналізавала эфэктыўнасьць вынікаў дасьледваньняў па трох тэмах, праведзеных Навукова-дасьледчым клінічным інстытутам радыяцыйнай мэдыцыны і эндакрыналёгіі, з агульным аб'ёмам фінансаваньня больш за 17 млрд. рублёў. У справаздачы прафэсара сказана, што толькі некалькі працаў, на якія патрачана 1,1 млрд. рублёў, «могуць быць карыснымі з навуковага і практычнага пункту гледжаньня», а астатнія 16 млрд. руб. патрачаныя дарэмна. Такім чынам, калі Ю. Бандажэўскі, узброіўшыся сэнсацыйнымі вынікамі дасьледваньняў, неаднаразова заклікаў «вярхі» клапаціцца пра здароўе людзей і калі ён закрануў тэму грошай – у яго пачаліся непрыемнасьці, а затым і арышт. Падкрэсьлім і асаблівую важнасьць таго, што Ю. Бандажэўскі неаднаразова казаў пра недастатковасьць тых захадаў, якія прымаліся ўрадам па ахове здароўя людзей у чарнобыльскай зоне.

Узнагароды: прэмія Ленінскага камсамолу Беларусі (1990 г.), залаты мэдаль Альбэрта Швайцэра (1998 г.). Працы: больш за 240 навуковых працаў, у тым ліку: Імунная рэгуляцыя онтагенэзу. Гомель, 1994; Клініка-экспэрымэнтальныя аспэкты ўплыву інкарпараваных радыёнуклідаў на арганізм. Гомель, 1995 (у суаўтарстве); 5 вынаходзтваў.

SWIATASLAU BARANOWICZ


FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

Urodzony 18 kwietnia 1986 r. w guberni wilejskiej powiatu mińskiego. Do czasu aresztowania mieszkał w Mińsku, pracował jako budowlaniec.

KRONIKA REPRESJI

Uczestnik akcji protestacyjnych w Mińsku przeciw sfałszowanym wyborom 19 grudnia 2010 r. Został aresztowany i oskarżony o „udział w masowych zamieszkach", co jednak nie nastąpiło w pierwszych dniach bądź tygodniach od zdarzenia, a dopiero 15 czerwca 2011 r. Swiataslau Baranowicz został umieszczony w Areszcie Śledczym nr 1 przy ul. Wołodarskiego. 21 czerwca został oskarżony o udział w masowych zamieszkach. 29 sierpnia 2011 r., w pierwszym dniu procesu sądowego, środki zapobiegawcze zostały zamienione na areszt domowy.

12 października 2011 r. Sąd Okręgu Moskiewskiego w Mińsku, któremu przewodniczyła sędzia Elena Rudnicka, skazał go na 3 lata ograniczenia wolności bez skierowania do zakładu karnego. W odniesieniu do Swiataslaua sąd zastosował art. 70 KK RB, zaznaczając, że można nałożyć karę mniejszą od minimalnych limitów określonych w pkt 2 art. 293 KK. Tłumaczy to obecność okoliczności łagodzących – niepełnoletność Baranowicza oraz posiadanie stałego miejsca pracy.

СЬВЯТАСЛАЎ БАРАНОВІЧ

Нарадзіўся 18 красавіка 1986 году ў Вілейскім раёне Менскай вобласьці. Да свайго арышту жыў у Менску, працаваў будаўніком.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Удзельнік акцыі пратэсту супраць фальсыфікацыі вынікаў выбараў 19 сьнежня 2010 г. у Менску. Затрыманы па крымінальнай справе аб «масавых беспарадках», аднак гэта здарылася ня ў першыя дні альбо тыдні, а ажно 15 чэрвеня 2011 г. Фактычна на той час крымінальная справа была ўжо зачыненая і па ёй прайшлі дзясяткі судоў.

Сьвятаслаў Барановіч быў зьмешчаны пад варту ў менскі СІЗА № 1 па вуліцы Валадарскага. 21 чэрвеня 2011 г. ён быў абвінавачаны ва ўдзеле ў масавых беспарадках. 29 жніўня 2011 г., у першы дзень судовага працэсу па ягонай справе, мера стрыманьня была зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе.

12 кастрычніка 2011 г. суд Маскоўскага раёну Менску пад старшынствам судзьдзі Алены Рудніцкай прыгаварыў яго да 3 гадоў абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстанову адкрытага тыпу. Суд ужыў у дачыненьні да Сьвятаслава Барановіча арт. 70 КК Рэспублікі Беларусь і палічыў магчымым вынесьці прысуд, меншы за мінімальны, прадугледжаны ч. 2 арт. 293 КК Рэспублікі Беларусь, патлумачыўшы гэта наяўнасьцю зьмякчаючых абставінаў – маладога ўзросту Барановіча і наяўнасьці ў яго месца працы.

SIARHIEJ BASZARYMAU

Siarhiej Baszarymau mieszka w Mińsku. Pracował w agencji nieruchomości, zajmował się wynajmem mieszkań. Skończył Białoruski Instytut Prawoznawstwa. Pasjonuje się sportem. Nigdy nie zajmował się polityką. Został aresztowany i umieszczony w areszcie śledczym KGB w Mińsku za to, że wiosną 2012 r. wynajął mieszkanie obywatelom Szwecji, którzy wzięli udział w tzw. „pluszowym desancie".

KRONIKA REPRESJI

4 lipca dwójka obywateli Szwecji przekroczyła awionetką litewsko-białoruską granicę i rozrzuciła nad pałacem prezydenckim w Mińsku setki pluszowych misiów. Do zabawek dołączone były hasła wspierające wolność słowa na Białorusi.

Przed swoim kolejnym przyjazdem na Białoruś Szwedzi znowu chcieli wynająć mieszkanie od Baszarymaua, zmienili jednak zdanie, o czym poinformowali go sms-em. O akcji „pluszowego desantu", zdaniem Szwedów, nic nie wiedział i nie mógł wiedzieć żaden z obywateli Białorusi, w tym i Baszarymau.

Został on zatrzymany w drugiej połowie dnia 6 lipca 2012 r. Po 10 dniach przedstawiono mu zarzuty pomocy w nielegalnym przekroczeniu granicy Republiki Białoruś. Taką informację przekazała dziewczyna Baszarymaua, Irina Łogojko. 8 sierpnia 2012 r. KGB oficjalnie poinformowało o aresztowaniu i zarzutach wobec Siarhieja Baszarymaua.

17 sierpnia 2012 Siarhiej Baszarymau, wraz z drugim oskarżonym w tej sprawie, Antonem Surapinem, został uwolniony z aresztu KGB, pod nakazem nie opuszczania kraju. 28 czerwca 2013 r. KGB ogłosiło zamknięcie dochodzenia w sprawie „pluszowego desantu".

СЯРГЕЙ БАШАРЫМАЎ

Сяргей Башарымаў нарадзіўся 13 жніўня 1984 г. Жыхар Менску. Працаваў у агентцтве нерухомасьці, займаўся пасутачнай арэндай кватэраў. Скончыў Беларускі інстытут правазнаўства. Захапляецца спортам. Палітыкай ніколі не займаўся.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Арыштаваны і зьмешчаны ў СІЗА КДБ у Менску за тое, што ўвесну 2012 г. здаваў кватэру грамадзянам Швэцыі, адзін зь якіх пазьней, ужо ў ліпені, дапамагаў сваім суайчыньнікам скінуць з самалёту над Беларусьсю цацкі з заклікамі да свабоды слова.

Напярэдадні свайго другога прыезду ў Беларусь швэды дамовіліся зь Сяргеем аб арэндзе кватэры, але неўзабаве перадумалі, пра што папярэдзілі яго смс-паведамленьнем. Пра акцыю зь «мядзьвежым дэсантам», па словах яе арганізатараў, ня ведаў і ня мог ведаць ніводзін жыхар Беларусі – у тым ліку і рыэлтар Башарымаў.

Сяргей быў затрыманы ў другой палове дня 6 ліпеня 2012 г. Праз 10 дзён яму было прад'яўленае абвінавачаньне ў спрыяньні незаконнаму перасячэньню дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь.

Пра ўсё гэта стала вядома са словаў дзяўчыны Сяргея – Ірыны Лагойкі – толькі пасьля 10 дзён ягонага арышту.

8 жніўня 2012 году пра арышт і абвінавачваньне рыэлтара Сяргея Башарымава афіцыйна паведаміў КДБ.

17 жніўня Сяргей Башарымаў, як і іншы абвінавачаны па дадзенай крымінальнай справе Антон Сурапін, быў вызвалены зь СІЗА КДБ пад падпіску аб нявыезьдзе.

28 чэрвеня 2013 г. крымінальная справа аб «плюшавым дэсанце» зачыненая.

ALEŚ BIALACKI



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Aleksander Bialacki urodził się 25 września 1962 r. w osadzie Wiartsilia, w Karelskiej Autonomicznej Socjalistycznej Republice Radzieckiej.

W 1964 r. rodzina otrzymała możliwość powrotu na Białoruś w związku z zapotrzebowaniem na robotników. Rodzina Bialackich postanowiła zamieszkać w Swietłahorsku. Aleś ukończył Szkołę Średnią nr 5 w Swietłahorsku.

W 1979 r. rozpoczął studia na Wydziale Historyczno-Filologicznym Uniwersytetu Państwowego w Homlu. W 1984 r. ukończył studia filologiczne. Pracował jako nauczyciel w regionie homelskim. Rozpoczął studia podyplomowe w Instytucie Literatury Akademii Nauk Białoruskiej SRR. W 1984 został wcielony do Armii Radzieckiej. Po powrocie z wojska kontynuował studia podyplomowe, podczas których zaangażował się w działalność naukową, literacką i społeczną. Aleś Bialacki był współzałożycielem, a w latach 1986–1989 przewodniczącym Towarzystwa Młodych Literatów „Tutejszyja".

Był współzałożycielem Białoruskiego Społecznego Towarzystwa Historyczno-Oświatowego „Martyrałoh Biełarusi". Był członkiem komitetu organizacyjnego Białoruskiego Frontu Ludowego „Odrodzenie" (BFL). Pełnił funkcję sekretarza zarządu BFL (1996–1999) oraz zastępcy przewodniczącego (1999–2001). W 1990 r. był jednym z założycieli Białoruskiej Katolickiej Hramady.

W roku 1989 był pracownikiem naukowym Muzeum Historii Literatury Białoruskiej i w tymże roku został dyrektorem Muzeum Literackiego Maksyma Bahdanowicza. Na tym stanowisku pracował do 1998 roku. W latach 1992–1996 był deputowanym do Mińskiej Miejskiej Rady Deputowanych.

Jest członkiem Związku Białoruskich Pisarzy i członkiem Białoruskiego PEN Centrum. W czerwcu 2000 r. został kierownikiem Grupy Roboczej Zgromadzenia Demokratycznych Organizacji Pozarządowych. Pełni funkcję wiceprzewodniczącego Międzynarodowej Federacji Praw Człowieka.

W 1996 r. Aleś Bialacki został przewodniczącym nowo utworzonego Centrum Praw Człowieka „Wiosna 96" (obecnie „Wiosna"). Władze białoruskie odmówiły zarejestrowania organizacji. Członkowie „Wiosny" próbowali w 2007 r. i dwukrotnie w 2009 r. zarejestrować organizację w Ministerstwie Sprawiedliwości Republiki Białorusi. Niestety bezskutecznie.

W 2006 r. otrzymał Nagrodę Homo Homini za działalność na rzecz obrony praw człowieka. W 2007 r. Bialacki został wiceszefem Międzynarodowej Federacji Praw Człowieka FIDH. W 2010 r. otrzymał honorowe obywatelstwo miasta Genua. Był dwukrotnie nominowany do Nagrody Nobla w latach 2006–2007. Po raz trzeci nominowano go już po jego aresztowaniu, w 2011 r. W tym też roku otrzymał nagrodę Human Rights Defenders przyznawaną przez Departament Stanu USA.

KRONIKA REPRESJI

4 sierpnia 2011 r., Bialacki został aresztowany pod zarzutem przestępstwa podatkowego na podstawie artykułu 243, pkt 2. Podstawą do aresztowania były informacje o kontach bankowych, które przekazały Białorusi litewskie Ministerstwo Sprawiedliwości oraz polska Prokuratura Generalna. Zarówno przedstawiciele Litwy jak i Polski wyrazili ubolewanie oraz wystosowali oficjalne przeprosiny. Oba kraje zawiesiły też bezterminowo współpracę prawną z Białorusią.

Aresztowanie Bialackiego zostało potępione przez białoruskie i międzynarodowe organizacje praw człowieka, przywódców Unii Europejskiej, USA oraz wielu innych demokratycznych krajów.

24 listopada 2011 r. Aleś Bialacki został skazany przez sąd na 4,5 roku kolonii o zaostrzonym rygorze oraz na konfiskatę mienia.

17 lutego 2012 r. media poinformowały, że Bialackiego przeniesiono z aresztu w Żodino do kolonii karnej w Bobrujsku, a później, że do 28 lutego przetrzymywano go na Wołodarce. Obecnie odbywa karę w kolonii karnej w Bobrujsku.

W czerwcu 2012 r. pojawiły się doniesienia o naciskach, jakie są wywierane przez władze kolonii na Alesia Bialackiego. W okresie marzec-czerwiec 2012, Bialacki otrzymał 3 nagany, z czego jedna doprowadziła do tego, że Bialackiemu zakazano widzeń z rodziną. Wskutek otrzymania kolejnej nagany, a co za tym idzie statusu więźnia uporczywie naruszającego porządek, Bialacki stracił szanse na objęcie go amnestią przez prezydenta Łukaszenkę. Represje wobec Bialackiego nie ustają.

АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ

Аляксандар (Алесь) Віктаравіч Бяляцкі нарадзіўся 25 верасьня 1962 годзе.

Будучы праваабаронца вучыўся на гісторыка-філялягічным факультэце Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, у 1984 1989 гг. зь перапынкам на службу ў савецкім войску ў асьпірантуры Інстытуту літаратуры Акадэміі Навук БССР.

Алесь Бяляцкі займаўся навуковай, літаратурнай і грамадзкай дзейнасьцю. Ён адзін з стваральнікаў, а ў 1986–1989 гг. старшыня Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя», адзін з заснавальнікаў таварыства «Мартыралёг Беларусі». Бяляцкі быў сябрам Арганізацыйнага камітэту Беларускага народнага фронту «Адраджэньне», сакратар Управы (1996–1999 гг.), намесьнік старшыні (1999–2001 гг.) БНФ «Адраджэньне», зьяўляўся заяўляльнікам адной зь першых масавых акцый «Дзяды». У 1990 годзе выступіў адным з арганізатараў Беларускай Каталіцкай Грамады. У 1989 1998 гг. Алесь Віктаравіч працаваў дырэктарам Літаратурнага музэю Максіма Багдановіча.

У 1991–1995 гг. быў дэпутатам Менскага гарадзкога савету. У 2000–2004 гадах – старшыня Працоўнай групы Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў Беларусі, з 2004 г. па сёньняшні час – намесьнік старшыні.

Алесь Бяляцкі дзейны сябра «Саюзу беларускіх пісьменьнікаў», Беларускага Пэн-цэнтру, БАЖ. У 2006 годзе выдаў кнігу нарысаў і эсэ «Прабежкі па беразе Жэнеўскага возера».

Ад 1996 г. зьяўляеца старшынём Праваабарончага цэнтру «Вясна», які ў 2003 г. быў пазбаўлены дзяржаўнай рэгістрацыі рашэньнем Вярхоўнага Суду.

Партнэрамі «Вясны» сёньня зьяўляюцца больш за 15 міжнародных і замежных праваабарончых арганізацый, а сам праваабарончы цэнтар прыняты ў два міжнародныя аб'яднаньні: «Міжнародная фэдэрацыя правоў чалавека» (The International Federation for Human Rights – FIDH) і «Эўрапейская сетка арганізацыі па назіраньню за выбарамі» (ENEMO).

У 2007 г. Алесь Бяляцкі быў абраны віцэпрэзыдэнтам FIDH. У 2010 г. атрымаў званьне «ганаровага грамадзяніна Генуі». Алесь Віктаравіч тройчы вылучаўся на Нобэлеўскую прэмію міру.

Мужная і пасьлядоўная пазыцыя Алеся Бяляцкага па адстойваньні правоў чалавека ў Беларусі і ва ўсім сьвеце адзначалася многімі міжнароднымі ўзнагародамі. Так, у 2006 годзе ён быў узнагароджаны Швэдзкай прэміяй імя Пэра Ангэра, Прэміяй Свабоды імя Андрэя Сахарава (Нарвэскі Хэльсынкскі камітэт), Прэміяй Homo Homini арганізацыі People in Need (арганізацыя «Чалавек у бядзе»).

У 2011 годзе ПЦ «Вясна» пад кіраўніцтвам Алеся Бяляцкага ўганараваны Прэміяй Свабоды Атлянтычнай Рады ЗША.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Алесь Бяляцкі арыштаваны 4 жніўня 2011 г. па абвінавачваньні на падставе ч. 2 арт. 243 КК РБ – «утойваньне прыбыткаў у асабліва буйным памеры». Фармальнай падставай для перасьледу праваабаронцы стала інфармацыя пра ягоныя рахункі ў замежных банках, перададзеная ўладам Беларусі Міністэрствам юстыцыі Літвы ды Гэнпракуратурай Польшчы.

Утрымліваўся ў менскім СІЗА. 24 лістапада 2011 г. асуджаны Першамайскім судом Менску на 4,5 гады калёніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці. 1 сьнежня пераведзены ў Жодзінскую турму № 8.

17 лютага 2012 г. стала вядома аб пераводзе Бяляцкага з Жодзіна ў папраўчую калёнію г. Бабруйску, этап праходзіў праз менскую «Валадарку». Зараз Алесь адбывае пакараньне ў Бабруйскай калёніі.

У чэрвені 2012 г. зьявіліся зьвесткі пра кампанію маральна-псыхалягічнага ціску супраць Бяляцкага з боку адміністрацыі калёніі. З сакавіка па чэрвень 2012 г. Алесь Бяляцкі атрымаў тры вымовы, адна зь якіх прывяла да страты права наведваньня яго сваякамі. У чэрвені 2012 г., пасьля трох вымоваў, праваабаронца быў названы «злосным парушальнікам», што прывяло да пазбаўленьня яго права на амністыю 2012 году. У жніўні 2012 г. ён атрымаў яшчэ дзьве вымовы за парушэньні рэжыму і быў часова пазбаўлены права атрымліваць перадачы з волі. У выніку накладзеных спагнаньняў забарона на харчовыя перадачы дзейнічала 8 месяцаў і палітвязень быў пазбаўлены доўгатэрміновага і кароткатэрміновага спатканьняў зь сям'ёй.

ANATOL BLIZNIECOW

Anatol Blizniecow, mieszkaniec Połocka w okręgu witebskim, jest jednym z trzech oskarżonych w procesie karnym z roku 1999 w Połocku o zrywanie flag państwowych.

KRONIKA REPRESJI

Anatol Blizniecow został aresztowany 10 marca 1999 r., wraz z Siarhiejem Lawiejkinem i Olegiem Kajdowem.

Wszyscy trzej zostali pobici i oskarżeni z paragrafu karnego za „umyślny wandalizm" (w procesie, obrona wnioskowała o przekwalifikowanie czynu na „zbezczeszczenie symboli narodowych").

Tych trzech obywateli Połocka przez kilka lat, na znak protestu zdejmowało z dachów budynków miejscowych władz czerwono-zielone flagi. Akcje te również kończyły się zatrzymaniami, a wcześniej jednak milicjanci darowywali im winę. Sprawę rozpatrywał sąd wojskowy w Witebsku, w związku z profesją jednego z oskarżonych – Lawiejkina. Anatol Blizniecow, jak również Oleg Kajdow, byli studentami Uniwersytetu Połockiego.

Wszyscy oskarżeni wyjaśniali, że flagi zdejmowali ze względu na fakt, iż barwy te nie odpowiadały prawdzie historycznej, jako że autentyczne barwy Białorusi są biało-czerwono-białe, zatem był to akt protestu przeciw ich zmianie.

8 lipca 1999 r. wszyscy trzej oskarżeni zostali uznani winnymi bezczeszczenia symboli narodowych i ukarani grzywną. Anatol Blizniecow, określony przez sąd jako współsprawca, został obciążony grzywną w wysokości 200 milionów rubli (równowartość 450 dolarów USA).

АНАТОЛЬ БЛІЗЬНЯЦОЎ

Жыхар г. Полацку Віцебскай вобласьці. Адзін з трох фігурантаў крымінальнай справы, заведзенай у 1999 годзе за зрываньне ў Полацку дзяржаўных сьцягоў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 10 сакавіка 1999 г. разам зь Сяргеем Лавейкіным і Алегам Кайдавым. Усе трое былі зьбітыя і абвінавачаныя па крымінальным артыкуле «Злоснае хуліганства» (падчас суду абарона настаяла на перакваліфікаваньні абвінавачаньня на артыкул «апаганьваньне дзяржаўных сымбаляў». Некалькі гадоў трое палачан здымалі з дахаў будынкаў мясцовай улады чырвона-зялёныя сьцягі на знак пратэсту, пасьля такіх акцый здараліся затрыманьні, але міліцыянты адпускалі іх.

Справа разглядалася вайсковым судом у Віцебску з прычыны прафэсыйнай прыналежнасьці аднаго з абвінавачаных – С. Лавейкіна.

А. Блізьняцоў, як і А. Кайдаў, былі студэнтамі Полацкага ўнівэрсытэту.

Усе абвінавачаныя тлумачылі, што зрывалі дзяржаўны сьцяг таму, што ён не адпавядае гістарычнай праўдзе і справядлівасьці, бо сымбалем Беларусі зьяўляецца бел-чырвона-белы сьцяг, супраць адмены якога маладзёны і выказалі свой пратэст.

8 ліпеня 1999 г. усе трое прызнаныя вінаватымі ў ганьбаваньні дзяржсымбаляў і пакараныя штрафамі. Анатоль Блізьняцоў, якога суд вызначыў як саўдзельніка, быў прысуджаны да штрафу ў 200 мільёнаў рублёў (450 даляраў ЗША).

ALIEKSIEJ BONDAR


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Alieksiej Bondar jest jednym ze skazanych w „Sprawie czternastu" w 2008 r. Urodził się 14 maja 1981 r. w rodzinie wojskowego w mieście Popczeł w obwodzie briańskim w Rosji, skąd pochodziła jego matka. Po roku rodzina przeprowadziła się na Białoruś, do ojczyzny jego ojca. W 2003 r. ukończył Białoruski Instytut Prawa, otrzymał dyplom prawnika ze specjalizacją „Prawo podatkowe i bankowe". Pracował w różnych firmach prywatnych, był prawnikiem i dyrektorem handlowym. Od 1996 r. był aktywnym członkiem ulicznych akcji opozycji, w 1999 r. został członkiem Zrzeszenia Białoruskich Studentów. Od wiosny 2006 r. był działaczem młodzieżowej organizacji „Inicjatywa" która powstała na fali akcji młodzieżowych (tzw. *flashmobów)* po protestach na Placu Kalinowskiego i masowych aresztowaniach.

KRONIKA REPRESJI

W 2008 r. Alieksiej Bondar został aresztowany na 5 dni za udział w akcji przedsiębiorców 21 stycznia, po czym przedstawiono Bondarowi zarzuty z art. 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w akcjach grupowych, poważnie naruszających porządek publiczny". 22 kwietnia sędzia sądu w Mińsku, Jeliena Ilina, uznała Bondara winnym zarzucanego mu czynu i skazała go na ograniczenie wolności na 2 lata.

АЛЯКСЕЙ БОНДАР

Аляксей Бондар – адзін з асуджаных па «справе 14-ці» ў 2008 годзе. Нарадзіўся 14 траўня 1981 году ў сям'і вайскоўца ў горадзе Почапе Бранскай вобласьці Расеі, адкуль родам ягоная маці. Праз год сям'я пераехала ў Беларусь, на радзіму бацькі.

У 2003 годзе скончыў Беларускі інстытут правазнаўства, атрымаў дыплём юрыста са спэцыялізацыяй «Падатковае і банкаўскае права». Працаваў у розных прыватных фірмах, быў юрыстам, камэрцыйным дырэктарам.

З 1996 году – актыўны ўдзельнік вулічных акцый апазыцыі, у 1999 г. быў сябрам Задзіночаньня беларускіх студэнтаў (ЗБС). Зь вясны 2006 г. – актывіст моладзевай арганізацыі «Ініцыятыва», якая ўзьнікла стыхійна на хвалі моладзевых акцыяў – флэш-мобаў пасьля пратэстаў на Плошчы Каліноўскага і масавых арыштаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2008 г. Аляксей быў арыштаваны на 5 сутак за ўдзел у акцыі прадпрымальнікаў 21 студзеня. Пасьля адбыцьця арышту Аляксею Бондару прад'яўлена абвінавачваньне па ч. 1 арт. 342 КК РБ – «арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак».

22 красавіка судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Алена Ільіна прызнала Аляксея Бондара вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ і вынесла пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі тэрмінам на два гады без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.

ALEŚ BONDARIEW

Aleś Bondariew, mieszkaniec Mińska, z wykształcenia fizyk, jeden z pierwszych więźniów politycznych w najnowszej historii Białorusi, został skazany za udział w Dniu Woli 23 marca 1997 r. Podczas akcji Dnia Woli doszło do starć demonstrantów z milicją.

KRONIKA REPRESJI

1 kwietnia 1997 r. Aleś Bondariew został zatrzymany i oskarżony o chuligaństwo. W sprawie „Dnia Woli 97" oskarżonych było 5 osób. Proces odbywał się w sądzie w Mińsku od 30 października do połowy listopada 1997 r.

Aleś Bondariew został skazany na roboty przymusowe z przekazaniem 20 procent zarobku na rzecz państwa. Na 2 lata tzw. „domowej chemii[2]" zostali skazani – Anatol Sorokin i Aleś Kowal. Dwaj pozostali oskarżeni w tej sprawie – Ryhor Kijko i Uladzimir Łysko – zostali skazani na 2 lata przymusowych robót w miejscu zatrzymania. W tym czasie były to jedne z pierwszych wyroków motywowanych politycznie i wydawały się bardzo surowe.

2. Kara tzw. „chemii" wiąże się z ograniczeniem wolności i obowiązkiem wykonywania prac przymusowych.

АЛЕСЬ БОНДАРАЎ

Алесь Бондараў – жыхар Менску, фізык па адукацыі, адзін зь першых палітвязьняў у найноўшай гісторыі Беларусі. Быў асуджаны за ўдзел у сьвяткаваньні Дня Волі 23 сакавіка 1997 году, падчас якога ў Менску адбыліся сутыкненьні дэманстрантаў з міліцыяй.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

1 красавіка 1997 г. Алесь Бондараў быў затрыманы і абвінавачаны ў хуліганстве. Усяго па крымінальнай справе аб Дні Волі-97 праходзілі 5 удзельнікаў акцыі.

Судовы працэс адбываўся ў Менскім гарадзкім судзе з 30 кастрычніка да сярэдзіны лістападу 1997 году.

Алесь Бондараў быў асуджаны да папраўчых працаў безь зьмяшчэньня ў месцы зьняволеньня з утрыманьнем 20 працэнтаў заробку на карысьць дзяржавы.

На 2-гадовую «хатнюю хімію» без адрыву ад месцы працы таксама былі асуджаныя Анатоль Сарокін і Алесь Коваль. Два іншыя фігуранты справы – Рыгор Кійко і Ўладзімір Лыско – атрымалі па 2 гады папраўчых работ з утрыманьнем у месцах зьняволеньня. На той час гэта былі адныя зь першых палітычных прысудаў, і выракі выглядалі тады вельмі суровымі.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

ALEKSANDER BOROZIENKO

Urodził się 9 maja 1988 r. w Pińsku, w obwodzie brzeskim. Studiował na Uniwersytecie Wrocławskim w Polsce oraz na uniwersytecie w Petersburgu. Jest niezależnym dziennikarzem. Mieszka i pracuje w Mińsku.

KRONIKA REPRESJI

Będąc studentem Uniwersytetu Wrocławskiego, jeszcze w 2008 r. Borozienko miał status oskarżonego w tak zwanej „Sprawie czternastu". Sprawa karna za udział w akcji solidarności z przedsiębiorcami została wszczęta z artykułu 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja masowych akcji w poważny sposób naruszających porządek społeczny" – oraz z art. 339, pkt 2 – „Chuligaństwo". Status podejrzanego, a potem oskarżonego w tej sprawie miało 14 osób: Michaś Paszkiewicz, Tatiana Tyszkiewicz, Michaś Subacz, Aleś Czernyszew, Aleksander Strielcow, Paweł Winogradau, Aleksiej Bondar, Aleksander Borozienko, Maksim Daszuk, Artiom Dubski, Uladzimir Siarhiejeu, Michaił Krywau, Anton Kojpisz i Andrej Kim.

Podczas procesu sądowego Borozienko przebywał w Polsce. W związku z tym, że „uchylał się od kontaktu ze śledczym", 12 maja 2008 r. wydano decyzję o jego areszcie i wydano za nim list gończy.

27 października razem z adwokatem dobrowolnie spotkał się ze śledczym i został przeniesiony do aresztu. Prowadził głodówkę.

Proces w sprawie Borozienki rozpoczął się 8 grudnia. Został on skazany na rok ograniczenia wolności.

АЛЯКСАНДАР БАРАЗЕНКА

Вучыўся ва Ўроцлаўскім унівэрсытэце (Польшча) і ва ўнівэрсытэце ў Санкт-Пецярбургу, незалежны журналіст. Нарадзіўся 9 траўня 1988 году ў Пінску Берасьцейскай вобласьці. Жыве і працуе ў Менску.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Будучы студэнтам Уроцлаўскага ўнівэрсытэту, Аляксандар Баразенка праходзіў у якасьці абвінавачванага па «справе 14-ці» яшчэ на пачатку 2008 году. Крымінальная справа за ўдзел у акцыі ў падтрымку прадпрымальнікаў была ўзбуджаная адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: па ч. 1 арт. 342 КК РБ – «Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак», і ч. 2 арт. 339 – «Хуліганства, учыненае групай асобаў альбо зьвязанае з супрацівам». Статус падазраванага, а пасьля і абвінавачанага, па дадзенай крымінальнай справе атрымалі 14 моладзевых актывістаў: Пашкевіч Міхась, Цішкевіч Тацяна, Субач Міхась, Чарнышоў Алесь, Стральцоў Алесь, Вінаградаў Павал, Бондар Аляксей, Баразенка Аляксандар, Дашук Максім, Дубскі Арцём, Сяргееў Уладзімер, Крываў Міхась, Антон Койпіш і арыштаваны Кім Андрэй. Большасьць гэтых актывістаў былі прыцягнутыя да адміністрацыйнага арышту тэрмінам да 15 сутак за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў, а Тацяна Цішкевіч правяла за кратамі ажно 20 сутак. Па колькасьці абвінавачаных крымінальная справа атрымала назву «працэс 14-ці» (альбо «справа 14-ці») і расьцягнулася амаль на год.

Падчас судовага працэсу над астатнімі абвінавачванымі Баразенка знаходзіўся ў Польшчы, у сувязі з чым за «ўхіленьне ад яўкі да сьледчага» 12 траўня 2008 г. адносна яго была прынятая пастанова аб узяцьці пад варту, і ён быў абвешчаны ў вышук.

27 кастрычніка Баразенка разам з адвакатам добраахвотна зьявіўся да сьледчага, дзе быў затрыманы і накіраваны ў сьледчы ізалятар. Трымаў галадоўку.

Эўракамісар Фэрэра-Вальднэр заклікала беларускія ўлады вызваліць Аляксандра Баразенку, зазначыўшы, што «важна, каб Беларусь заставалася краінай без палітычных зьняволеных і паважала свабоду выказваньняў, аб'яднаньняў і сходаў». Нягледзячы на міжнародную рэакцыю, Баразенка паўтара месяца да суду знаходзіўся пад вартай.


Суд над Баразенкам пачаўся 8 сьнежня. Моладзевы актывіст быў асуджаны да аднаго году абмежаваньня свабоды без накіраваньня ў папраўчую ўстанову.

ARTIOM BREUS

Artiom Breus, obywatel Federacji Rosyjskiej, urodził się 5 sierpnia 1983 r. w Mińsku. Dzieciństwo spędził w Estonii, ukończył gimnazjum w Tallinie i Talliński Uniwersytet Europejski o specjalności „projektant". Do czasu aresztu mieszkał i pracował w Mińsku – w mieście swego ojca, znanego reżysera telewizyjnego. Nie zajmował się polityką.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany podczas akcji protestu na Placu Niepodległości w Mińsku 19 grudnia 2010 r. Aresztowano go na 15 dni i uwolniono 29 grudnia wraz z innymi obywatelami Rosji. Jednak tego samego dnia aresztowano go ponownie – teraz już w ramach sprawy karnej o masowe zamieszki. 5 stycznia 2011 r. Artiomowi Breusowi przedstawiono zarzuty. Przebywał w areszcie śledczym nr 1 na Wołodarce. 10 marca 2011 r. wraz z innym obywatelem Rosji, Iwanem Gaponowem, został skazany przez miński sąd na karę grzywny w wysokości 300 płac minimalnych (10,5 miliona białoruskich rubli).



FOT. JULIA DARASHKEVICH

АРЦЁМ БРЭЎС

Грамадзянін Расеі. Нарадзіўся 5 жніўня 1983 году ў Менску. Дзяцінства правёў у Эстоніі, дзе скончыў гімназію ў Таліне і Талінскі эўрапейскі ўнівэрсытэт па спэцыяльнасьці «дызайнэр». Да свайго арышту жыў і працаваў у Менску – на радзіме свайго бацькі, вядомага тэлевізійнага рэжысэра. Палітыкай не займаўся.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы падчас акцыі пратэсту на Плошчы Незалежнасьці ў Менску 19 сьнежня 2010 г. Быў арыштаваны на 15 сутак і вызвалены 29 сьнежня разам зь іншымі расейцамі. Аднак у той самы дзень быў затрыманы зноў – ужо ў межах крымінальнай справы аб масавых беспарадках. 5 студзеня 2011 г. Арцёму было прад'яўленае абвінавачаньне. Знаходзіўся пад вартай у СІЗА № 1 на вул. Валадарскага ў Менску.

10 сакавіка 2011 г. разам зь іншым грамадзянінам Расеі Іванам Гапонавым судом Маскоўскага раёну Менску быў пакараны штрафам у 300 базавых велічынь (10,5 мільёна беларускіх рублёў).



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ENIRA BRONICKA

Enira Bronicka urodziła się 31 sierpnia 1981 r. w Mińsku. Ukończyła z wyróżnieniem prawo na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym (BUP), dostała się na studia doktoranckie. W czasie studiów była mistrzynią uniwersytetu w judo w swojej kategorii wagowej. W latach 2004–2005 prowadziła na BUP zajęcia „Ideologia państwa białoruskiego". Brała udział w pracach organizacji społecznych, pracowała jako wolontariusz na obozie dziecięcym w Irlandii (2002), w domu opieki we Francji (2003), była organizatorką projektu pomocy dla pozarządowej dobroczynnej organizacji „Białoruskie hospicjum dziecięce" w Mińsku (2004).

KRONIKA REPRESJI

21 lutego 2006 r., prawie miesiąc przed wyborami prezydenckimi na Białorusi, Enira Bronicka została aresztowana wraz z Mikołą Astriejką, Cimafiejem Dranczukiem i Aleksandrem Szałajko. Oskarżono ją o działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji. Chodziło o społeczne stowarzyszenie obserwatorów wyborów „Partnerstwo". Enira Bronicka najpierw przetrzymywana była w areszcie śledczym KGB, a potem w areszcie na Wołodarce. 4 sierpnia 2006 r. miński sąd uznał Bronicką winną złamania artykułu 193.1 i skazał ją na 6 miesięcy pozbawienia wolności.

21 sierpnia 2006 r. Bronicka została uwolniona.

ЭНІРА БРАНІЦКАЯ

Эніра Браніцкая нарадзілася 31 жніўня 1981 г. у Менску. Скончыла з адзнакай юрыдычны факультэт БДУ, паступіла ў асьпірантуру. Падчас навучаньня ў БДУ была чэмпіёнкай унівэрсытэту па дзюдо ў сваёй вагавай катэгорыі. У 2004–2005 гг. чытала ў БДУ курс «Ідэалёгія беларускай дзяржавы».

Брала ўдзел у працы гуманітарных грамадзкіх арганізацыяў: працавала валянтэркай у дзіцячым лягеры ў Ірляндыі (2002), у доме інвалідаў у Францыі (2003), была арганізаткай праекту аказаньня дапамогі недзяржаўнай дабрачыннай арганізацыі «Беларускі дзіцячы хосьпіс» у Менску (2004).

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

21 лютага 2006 г. амаль за месяц да прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі, Эніра Браніцкая была арыштаваная і разам зь Міколам Астрэйкам, Цімафеем Дранчуком і Аляксандрам Шалайкам абвінавачана ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Мелася на ўвазе грамадзкае аб'яднаньне назіральнікаў за выбарамі «Партнэрства». Эніра знаходзілася пад вартай спачатку ў сьледчым ізалятары КДБ, потым – у СІЗА на вуліцы Валадарскага.

4 жніўня 2006 г. суд Цэнтральнага раёну Менску прызнаў Эніру Браніцкую вінаватай у парушэньні крымінальнага арт. 193.1 і асудзіў яе да шасьці месяцаў зьняволеньня.

21 жніўня 2006 г. Эніра была вызвалена.

ANATOL BUKACZEW

Anatol Bukaczew jest członkiem konserwatywno-chrześcijańskiej partii Białoruski Front Ludowy z Witebska.

KRONIKA REPRESJI

Anatol Bukaczew został skazany 28 lutego 2000 r. przez sąd w Witebsku. Oskarżono go o to, że w lipcu 1998 r., w przededniu festiwalu „Słowiański bazar", napisał list w imieniu nieistniejącej organizacji „Wolna Białoruś" (Swobodnaya Biełaruś), w którym wyraził protest przeciwko wydawaniu środków publicznych na organizację pompatycznych prorosyjskich imprez. W liście żądano wydrukowania jego treści na łamach gazety „Witbichi". List został wysłany do redakcji, a jej dziennikarze przekazali go KGB.

Jesienią 1999 r. w mieszkaniu Bukaczewa została przeprowadzona rewizja, sam on zaś został wezwany do KGB. Rozprawa Bukaczewa była wyznaczona na 24 lutego, odbyła się jednak dzień później.

Anatol Bukaczew został uznany winnym popełnienia przestępstwa, o którym mowa w artykule 201.1, pkt 1 KK RB – „Złośliwe chuligaństwo". Skazano go na grzywnę w wysokości 50 płac minimalnych (115 dolarów USA).

W mowie końcowej Bukaczew powiedział o tym, że jego działania miały wyłącznie charakter polityczny.

АНАТОЛЬ БУКАЧОЎ

Анатоль Букачоў – сябра Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ зь Віцебску.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Асуджаны 28 лютага 2000 г. судом Кастрычніцкага раёну г. Віцебску.

А. Букачоў абвінавачваўся ў тым, што ў ліпені 1998 году, напярэдадні правядзеньня афіцыёзнага фэстывалю «Славянскі базар», ён друкаванымі літарамі напісаў ліст ад імя неіснуючай арганізацыі «Вольная Беларусь», у якім выказаў пратэст супраць разбазарваньня дзяржаўных сродкаў на арганізацыю пампэзных прарасейскіх сьвятаў. У лісьце выказвалася патрабаваньне спыніць фэстываль. Ліст быў дасланы ў газэту «Віцьбічы» з патрабаваньнем надрукаваць яго. Рэдакцыя газэты перадала ліст у КДБ.

Увосень 1999 году ў кватэры Анатоля Букачова быў праведзеныператрус, а сам ён выкліканы ў КДБ.

Судовае пасяджэньне па справе А. Букачова было першапачаткова прызначанае на 24 лютага, але было перанесенае і адбылося 25 лютага.

А. Букачоў быў прызнаны вінаватым у зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага арт. 201.1 ч. 1 КК РБ (злоснае хуліганства), нягледзячы на тое, што ягоная віна пацьвярджалася толькі ягонымі ўласнымі паказаньнямі.

Анатоль Букачоў быў пакараны штрафам памерам у 50 мінімальных заробкаў (115 даляраў ЗША). У заключным слове А. Букачоў заявіў пра выключна палітычныя матывы свайго ўчынку.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

ANATOL BUKAS

Anatol Bukas, przedsiębiorca, redaktor i wydawca regionalnej społeczno-politycznej gazety „Borisowkie nowosti", urodził się w 1956 r. Był działaczem Białoruskiej Socjaldemokratycznej Partii (Narodnaja Hramada).

KRONIKA REPRESJI

27 stycznia 2005 r. Anatolowi Bukasowi przedstawiono zarzuty z artykułu 188, pkt 2 KK – „Pomówienie w wystąpieniu publicznym lub w mediach" oraz z artykułu 189, pkt 2 – „Umyślne poniżenie honoru i godności osoby, wyrażone w sposób nieprzyzwoity".

Powodem wszczęcia sprawy karnej stał się artykuł Bukasa opublikowany w „Borisowskich nowostiach" w kwietniu 2004 r., w którym dziennikarz krytykował redaktora oficjalnej gazety Borysowskiego miejskiego komitetu wykonawczego „Jedność" („Jedinstvo"), Wierę Protasiewicz.

Zdaniem Anatola Bukasa, w swoim artykule odpowiedział on na trzy publikacje Protasiewicz, w których nazwała go „źle wychowanym wydawcą". 16 czerwca 2005 r. sąd uznał Anatolija Bukasa winnym wszystkim stawianym mu zarzutom i skazał go na karę grzywny w wysokości 40 płac minimalnych i 3 milionów rubli rekompensaty szkody moralnej jakiej doznała Wiera Protasiewicz.

АНАТОЛЬ БУКАС

Анатоль Букас – прадпрымальнік, рэдактар і выдавец рэгіянальнай грамадзка-палітычнай газэты «Борисовские новости». Нарадзіўся ў 1956 годзе. Быў актывістам БСДП (Народнай грамады).

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

27 студзеня 2005 году галоўнаму рэдактару штотыднёвіка «Борисовские новости» Анатолю Букасу прад'явілі абвінавачаньне па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: арт. 188 ч. 2 (паклёп, які ўтрымліваецца ў публічным выступленьні альбо ў СМІ), і арт. 189 ч. 2 (наўмыснае прыніжэньне гонару і годнасьці асобы, выказанае ў непрыстойнай форме).

Падставай для ўзбуджэньня крымінальнай справы стаў артыкул А. Букаса «Звезданутый пострел везде поспел, или Молчание ягнят», які быў надрукаваны ў «Борисовских новостях» у красавіку 2004 г. У матэрыяле крытыкавалася рэдактарка афіцыйнай газэты Барысаўскага гарвыканкаму «Адзінства» Вера Пратасевіч. Па словах Анатоля Букаса, сваім артыкулам ён адказаў на тры публікацыі В. Пратасевіч, у якіх яна назвала яго «дурно воспитанным издателем».

16 чэрвеня 2005 г. суд прызнаў Анатоля Букаса вінаватым па ўсіх пунктах абвінавачаньня і асудзіў яго да штрафу ў памеры 40 базавых велічыняў і 3 мільёнаў рублёў у якасьці кампэнсацыі маральных стратаў рэдактаркі мясцовай дзяржаўнай газэты.



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

DZMITRIJ BUŁANOW

Dzmitrij Bułanow urodził się w Mińsku 25 sierpnia 1984 r. Ukończył Kolegium Medyczne nr 2, 2 lata pracował jako pielęgniarz w szpitalu zakaźnym, zajmował się ciężko chorymi pacjentami, w tym i chorymi na AIDS. Interesował się muzyką, zebrał nawet kilkoro muzyków by stworzyć własną grupę. Studiował w Instytucie Wiedzy Współczesnej, na kierunku Sztuka. Nie zajmował się polityką, nigdy nie był członkiem partii politycznej ani żadnego ruchu politycznego.

KRONIKA REPRESJI

Zatrzymano go i pobito podczas pacyfikacji pokojowej akcji protestu 19 grudnia, miał rozciętą głowę. Został skazany na 10 dniu aresztu. Jednak po uwolnieniu go z aresztu na Okrestinie, 12 stycznia 2011 r., został kolejny raz zatrzymany, tylko za to, że odmówił pójścia na przesłuchanie bez oficjalnego wezwania.

Funkcjonariusze milicji przyjechali do jego domu i oświadczyli mu, że skoro nie pojawił się na przesłuchaniu – jest winny. Kilka godzin czekał na śledczego w areszcie na ulicy Sapierow, ale doczekał się jedynie postanowienia o nadaniu mu statusu podejrzanego w sprawie o masowych zamieszkach.

Początkowo Dzmitrija Bułanowa zatrzymano na 3 dni, 2 dni przebywał na Okrestinie, po czym przeniesiono go do aresztu na Wołodarce. Tam, z powodu warunków sanitarnych panujących w areszcie, zaostrzyły się u niego objawy alergii (astma, ataki duszności) oraz reumatyzmu, co stwarzało zagrożenie nie tylko dla jego zdrowia, ale i życia. W mediach pojawiały się niepokojące informacje, że więzień nie jest w stanie nawet wstawać z łóżka.

26 maja Sąd Leniński w Mińsku skazał go na 3 lata kolonii o zaostrzonym rygorze. 11 czerwca 2011 r. został przeniesiony do Kolonii nr 15 w Mohylewie. 14 września 2011 r. Bułanow został uwolniony na mocy dekretu Łukaszenki o ułaskawieniu.

ЗЬМІЦЕР БУЛАНАЎ

Нарадзіўся ў Менску 25 жніўня 1984 году. Скончыў менскі мэдычны каледж № 2, два гады працаваў у інфэкцыйнай лякарні, лякуючы цяжка хворых, у тым ліку і на СНІД. Сур'ёзна захапляецца музыкай, незадоўга да арышту сабраў музыкаў для стварэньня гурту. Вучыўся ў Інстытуце сучасных ведаў на факультэце мастацтваў, вывучаў выканаўчае майстэрства. Палітыкай не займаўся, ніколі ня быў сябрам палітычных партыяў і рухаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы і зьбіты падчас разгону мірнай акцыі 19 сьнежня, пры гэтым Зьмітру расьсеклі галаву. Асуджаны на 10 сутак арышту. Але пасьля вызваленьня зь ізалятара на Акрэсьціна быў затрыманы паўторна 12 студзеня 2011 г. – толькі за тое, што адмовіўся ісьці на допыт без афіцыйнай позвы. Супрацоўнікі міліцыі прыехалі да яго дадому і заявілі: не зьявіўся па іхнім званку – значыць, вінаваты. Некалькі гадзінаў чакаў сьледчага ў сьледчай управе на вуліцы Сапёраў, але дачакаўся толькі пастановы пра статус падазраванага па справе аб масавых беспарадках.

Спачатку Зьмітра затрымалі на 3 дні, два зь якіх ён ізноў правёў у турме на Акрэсьціна. Затым быў пераведзены ў СІЗА па вул. Валадарскага. Там перажыў небясьпеку для жыцьця з-за абвастрэньня алергіі (з прыкметамі астмы і прыступамі ўдушша) і рэўматызму. Прыходзілі трывожныя навіны пра тое, што вязень ня ў стане нават устаць з нараў.

26 траўня 2011 г. у Ленінскім судзе Менску быў асуджаны да 3 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму. 11 чэрвеня 2011 г. для адбыцьця тэрміну пакараньня яго перавялі ў калёнію № 15 г. Магілёву.

14 верасьня 2011 г. вызвалены з магілёўскай калёніі на падставе ўказу кіраўніка дзяржавы А. Лукашэнкі аб памілаваньні.

ANDREJ BURŁAKA

Andrej Burłaka, obywatel Ukrainy, uczestnik „Czarnobylskiego Szlaku"[3] w 1996 r., oskarżony w sprawie „UNA-UNSO"[4], urodził się w 1985 r. Na Ukrainie próbował wstąpić do seminarium duchownego, gdyż chciał zostać księdzem. Kiedy został aresztowany, był studentem 4. roku Ukraińskiego Uniwersytetu Państwowego im. Tarasa Szewczenki. Oprócz języka rosyjskiego i ukraińskiego zna jeszcze polski i uczył się tureckiego.

KRONIKA REPRESJI

Burłaka zatrzymany został przez funkcjonariuszy milicji w cywilu, w centrum Mińska, 26 kwietnia 1996 r. w czasie rozpędzania akcji „Czarnobylski Szlak". Podczas marszu milicja nie dawała ludziom przejść po głównej ulicy białoruskiej stolicy, przez co kilkakrotnie dochodziło do przepychanek między uczestnikami akcji a funkcjonariuszami.

Przebywał w mińskim areszcie śledczym na Wołodarce. Burłaka podczas procesu powiedział, że do Mińska przyjechał po to, by zobaczyć Białoruś, dlatego że zawsze interesował się architekturą starych budynków i cerkwiami. Powiedział również, że 10 rocznica awarii w Czarnobylu jest dniem wspólnego nieszczęścia Białorusi i Ukrainy.

Wydarzenia z 26 kwietnia w Mińsku zaskoczyły go. Z jego relacji wynikało, że po aresztowaniu śledczy grozili mu, że wyrzucą go przez okno, jeśli nie podpisze dokumentów i nie przyzna się, że brał udział w akcji. Jego matce śledczy nie przekazali żadnych informacji. O miejscu przebywania syna dowiedziała się przypadkowo od ukraińskich dziennikarzy, którzy relacjonowali wydarzenia w Mińsku. Burłaka nie przyznał się do winy. Pod koniec sierpnia 1996 r. miński sąd skazał go na rok pozbawienia wolności w kolonii karnej. Wyrok wydał sędzia Grigorij Kozyrickij, prokuratorem w procesie był Siergiej Teleżewicz.

Uwolniono go w grudniu 1996 r. po amnestii, wraz z kilkoma innymi obywatelami Ukrainy, którzy byli skazani w związku z tą samą sprawą.

W więzieniu pozostali jedynie Siergiej Potapow i Andrej Szeptycki, którzy uwolnieni zostali dopiero w 1997 r.

---

3. Czarnobylski Szlak (biał. Чарнобыльскі шлях) – coroczny marsz opozycji białoruskiej, który odbywa się 26 kwietnia, w rocznicę katastrofy elektrowni jądrowej w Czarnobylu. Po raz pierwszy odbył się w roku 1989.

4. UNA-UNSO (ukr. Українська Національна Асамблея – Українська Національна Самооборона, УНА-УНСО) – Ukraińskie Zgromadzenie Narodowe – Ukraińska Samoobrona Narodowa

АНДРЭЙ БУРЛАКА

Грамадзянін Украіны, удзельнік «Чарнобыльскага Шляху» 1996 году. Фігурант «справы УНА-УНСО».

Нарадзіўся ў 1985 годзе. На Радзіме спрабаваў паступаць у духоўную сэмінарыю, бо марыў стаць сьвятаром. На час арышту зьяўляўся студэнтам 4-га курсу Ўкраінскага дзяржаўнага нацыянальнага ўнівэрсытэту імя Тараса Шаўчэнкі. Акрамя ўкраінскай і расейскай моваў, на момант суду валодаў польскай і вывучаў турэцкую.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы супрацоўнікамі міліцыі ў цывільным у цэнтры Менску 26 красавіка 1996 г. падчас разгону акцыі «Чарнобыльскі Шлях». У час шэсьця міліцыя не давала людзям прайсьці па галоўным праспэкце беларускай сталіцы, з-за чаго некалькі разоў распачыналіся сутычкі паміж удзельнікамі шэсьця і праваахоўнымі органамі.

Утрымліваўся ў менскім СІЗА «Валадарка». Як заявіла падчас суда ягоная маці, з-за траўмы ў дзяцінстве хварэў на эпілепсію, і калі яму не дапамагчы ў час, хлопец «можа прапасьці».

Андрэй Бурлака сказаў у судзе, што у Менск прыехаў для таго, каб паглядзець Беларусь, бо заўсёды цікавіўся архітэктурай старажытных будынкаў і цэрквамі, што «10-годзьдзе Чарнобыля – гэта дзень агульнай бяды для Беларусі і Ўкраіны». Але падзеі 26 красавіка ў Менску яго шакавалі. Паводле ягоных паказаньняў, пасьля арышту сьледчыя пагражалі выкінуць яго з вакна, калі не падпіша дакумэнты аб удзеле ў акцыі. Ягонай маці сьледчыя не паведамілі аб месцы знаходжаньня сына, даведалася яна аб гэтым выпадкова ад украінскіх журналістаў, што асьвятлялі падзеі ў Менску 26 красавіка.

Вінаватым сябе не прызнаў.

Асуджаны ў канцы жніўня 1996 г. Менскім гарадзкім судом на 1 год зьняволеньня ў калёніі агульнага рэжыму. Прысуд вынес судзьдзя Рыгор Казырыцкі, пракурор у працэсе – Сяргей Целяжэвіч.

Вызвалены ў сьнежні 1996 г. напярэдадні каталіцкіх Калядаў паводле амністыі разам зь некалькімі іншымі ўкраінскімі грамадзянамі, асуджанымі па гэтай справе. За кратамі зь іх засталіся толькі Сяргей Патапаў і Андрэй Шапціцкі, якіх вызвалілі ў ліпені 1997 г.

JURIJ CHADYKA



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Znany polityk i uczony, jeden z pierwszych więźniów politycznych niepodległej Białorusi, urodził się 23 czerwca 1938 r. w Mińsku. Z wyróżnieniem ukończył Szkołę Średnią nr 4 w Mińsku. W 1960 r. ukończył studia na Wydziale Fizyki na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. Pracował w Instytucie Fizyki na Akademii Nauk Białorusi. Zajmował się zagadnieniami obliczeń trajektorii pocisków. W 1975 r. stanął na czele sekcji elektrooptycznej, która miała przewidzieć rozwój broni w ciągu 15 lat. W lutym 1965 r. obronił doktorat z fizyki aerodynamicznej. W 1976 r. otrzymał tytuł profesora nauk fizycznych i matematycznych (temat pracy: „Optyczne nawroty rakiet balistycznych”).

Dwukrotnie, w 1967 i 1969 r., otrzymał propozycję wstąpienia do partii komunistycznej. Jesienią 1969 r. zorganizował w Akademii Nauk Białorusi wykład dotyczący sztuki starobiałoruskiej. 30 kwietnia 1988 r. wziął udział w „Dziadach”. Na uczelni zorganizował grupę wsparcia Komitetu Organizacyjnego Białoruskiego Frontu Ludowego. Udało mu się zebrać ok. 70 osób. W 1989 r. został zastępcą przewodniczącego Białoruskiego Frontu Ludowego „Odrodzenie”. Funkcję tę pełnił do grudnia 2007 r. W latach 1996–2000 był członkiem Rady Nadzorczej Białoruskiego Komitetu Helsińskiego. W 1997 r. został mianowany rektorem Uniwersytetu Ludowego a w 1998 r. został członkiem redakcji czasopisma „Otkrytoje obszczestwo”. Był przewodniczącym rady nadzorczej Niezależnego Instytutu Badań Społeczno-Ekonomiczno-Politycznych. Jest autorem ponad 150 prac naukowych w dziedzinie fizyki, 200 referatów naukowych i technicznych, 40 publikacji na temat sztuki białoruskiej jak również ponad 350 publikacji medialnych o bieżących problemach politycznych.

KRONIKA REPRESJI

W 1996 r., po „gorącej wiośnie”, Jurij Chadyka wraz ze swym współpracownikiem, Wiaczysławem Siwczykiem, zostali aresztowani za udział w mityngu. Pod naciskiem opinii międzynarodowej, więźniów uwolniono, gdy ogłosili głodówkę. W obronie profesora powstał ruch solidarnościowy, który zajmował się organizacją protestów, pisaniem podań oraz przekazywaniem prokuraturze i profesorowi korespondencji zagranicznej. Z uwolnieniem więźniów wiąże się następująca historia: przywódca rosyjskiej partii „Jabloko”, Grigorij Jawlinski, zwrócił się do prezydenta Borysa Jelcyna o pomoc w uwolnieniu więźniów. Ten zadzwonił do Łukaszenki po czym więźniowie zostali wypuszczeni.

Jurij Chadyka został uwolniony 21 maja 1996 r. za kaucją. Wyczerpany 23-dniową głodówką od razu trafił do szpitala. Zarzuty jednak wciąż nie zostały oddalone. Stało się to dopiero kilka lat później, tuż przed rozpadem Białoruskiego Frontu Ludowego. Jurij Chadyka jest jednym z założycieli nowego „Ruchu Białorusi”, w skład którego weszli byli działacze „Białoruskiego Frontu Ludowego”.

ЮРЫЙ ХАДЫКА

Юрый Хадыка – вядомы палітык і навуковец, адзін зь першых палітвязьняў незалежнай Беларусі.

Нарадзіўся 23 чэрвеня 1938 г. у Менску. Скончыў з залатым мэдалём менскую школу № 60. У 1960 г. скончыў фізычны факультэт БДУ і стаў працаваць у Інстытуце фізікі Акадэміі навук Беларусі, займаўся пытаньнямі разьлікаў траекторыі ракетаў ва Ўсесаюзнай каапэрацыі па стварэньні касьмічнай сыстэмы раньняга папярэджаньня пра ракетны напад.

У 1975 г. узначаліў сэкцыю оптыка-электронных сродкаў выведкі ў камісыі АН СССР па распрацоўцы прагнозу разьвіцьця ўзбраеньняў на 15 гадоў. У лютым 1965-га абараніў кандыдацкую дысэртацыю па фізычнай аэрадынаміцы, а ў 1976-м стаў доктарам фізыка-матэматычных навук, прафэсарам. Тэма дысэртацыі: «Аптычныя характарыстыкі факелаў балістычных ракетаў».

Увосень 1969 г. арганізаваў у Акадэміі навук БССР сэмінар па вывучэньні старажытнабеларускага мастацтва, прымаў удзел у зборы матэрыялаў (экспэдыцыі) і напісаньні «Зводу помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». Юрый Хадыка належыць да арганізатараў і тэарэтыкаў Беларускага Адраджэньня канца XX стагодзьдзя.

30 красавіка 1988 г. адбыліся сумна вядомыя «Дзяды», і Хадыка пачаў ствараць у сваім інстытуце групу падтрымкі толькі сфармаванага аргкамітэту БНФ. За кароткі тэрмін у яго групу ўвайшлі каля 70 чалавек. З кампартыі па асабістым жаданьні Юрый Віктаравіч выйшаў у лютым 1990-га. У 1989 г. быў абраны намесьнікам старшыні БНФ «Адраджэньне». З гэтай пасады сыйшоў толькі ў сьнежні 2007 году.

З 1996 па 2000 гг. уваходзіў уназіральную раду Беларускага Хэльсынкскага камітэту, у 1997-м быў прызначаны прарэктарам Народнага ўнівэрсытэту – найбуйнейшай праграмы Грамадзкага навукова-аналітычнага цэнтру «Беларуская пэрспэктыва» – і рэдактарам бюлетэня Народнага ўнівэрсытэту. У 1998 г. стаў сябрам рэдакцыйнага савету часопісу «Адкрытае грамадзтва». Быў намесьнікам старшыні назіральнага савету Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў. Аўтар каля 150 навуковых працаў па фізыцы, каля 200 навукова-тэхнічных справаздачаў і блізу 40 публікацый па гісторыі беларускага мастацтва, а таксама больш як 350 публікацый у СМІ на злабадзённыя палітычныя тэмы.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Пасьля «гарачай» вясны 1996 году Юрый Хадыка і яго паплечнік па БНФ Вячаслаў Сіўчык апынуліся за кратамі. Яны былі арыштаваныя адразу пасьля мітынгу 26 красавіка 1996 г. і зьмешчаныя пад варту ў менскі СІЗА па вул. Валадарскага. 28 красавіка 1996 г. абодва вязьні абвясьцілі бестэрміновую галадоўку. Іх вызваленьне адбылося пад ціскам беларускай і міжнароднай супольнасьці. У абарону прафэсара, вучонага і палітыка разгарнуўся моцны рух салідарнасьці. З маніфэстацыямі на «Валадарскага», з патокам лістоў пратэсту, у тым ліку з-за мяжы – ня толькі ад палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў, але і ад навукоўцаў.

Юрыя Хадыку вызвалілі пад падпіску аб нявыезьдзе 21 траўня 1996 г. і адразу даставілі ў шпіталь, зьнясіленага галадоўкай, якая працягнулася 23 дні.

Але абвінавачаньне з Хадыкі яшчэ не было зьнятае. Яго па-ранейшаму вінавацілі ў арганізацыі дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак. Крымінальная справа супраць яго была закрытая толькі праз некалькі гадоў, незадоўга да расколу Партыі БНФ.

Зараз Юрась Хадыка – адзін са стваральнікаў новага «Беларускага Руху», у аргкамітэт якога ўвайшлі некалькі дзясяткаў былых сяброў Партыі БНФ, што пакінулі яе праз 2 месяцы пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2010 году.

IRINA CHALIP


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Irina Chalip, urodzona 12 listopada 1967 r. w Mińsku, jest korespondentem rosyjskiej „Nowej Gazety" na Białorusi. Pracowała jako zastępca redaktora naczelnego „BDG" i redaktor naczelny tygodnika „Imja", który przestał istnieć. Wielokrotnie otrzymywała zawiadomienia z prokuratury o wszczętych postępowaniach karnych związanych z jej działalnością zawodową.

W kwietniu 1997 r., wraz z ojcem, dramaturgiem i reżyserem filmów dokumentalnych Władimirem Chalipem, zostali dotkliwie pobici podczas wiecu ulicznego. Pod koniec 2009 r. otrzymała anonimowe pogróżki.

Laureatka nagrody im. Dzmitrija Zawadzkiego (2003), nagrody im. Henri Nanena (2005), nagrody „Bohater Europy" (2005), otrzymała również nagrodę „za odwagę w dziennikarstwie" (2009). Jest żoną polityka Andreja Sannikaua, który również został oskarżony o udział w zamieszkach publicznych, i wnuczką słynnego białoruskiego kompozytora, Jurija Belzatskiego.

KRONIKA REPRESJI

19 grudnia 2010 r., w dzień wyborów prezydenckich, Irina Chalip została zatrzymana w drodze na Plac Niepodległości i umieszczona w więzieniu KGB. Pod koniec grudnia 2010 r. została oskarżona na podstawie art. 293 KK – „Masowe zamieszki". Podczas pobytu Iriny w więzieniu władza próbowała zabrać z domu jej trzyletniego syna, Danika Sannikaua.

29 stycznia 2011 r. wypuszczono ją z więzienia i objęto aresztem domowym. W lutym 2011 r. została ponownie aresztowana. W czasie pobytu w więzieniu otrzymała nagrodę dziennikarską „Złote Pióro Rosji".

4 kwietnia 2011 r. zmieniono oskarżenie na podstawie art. 342 KK – „Organizacja lub udział w działalności naruszających porządek publiczny".

16 maja 2011 sąd w Zawodskim skazał ją na 2 lata więzienia z dwuletnim okresem karencji. 19 lipca 2013 r., wyrokiem sądu Regionu Partyzanckiego, oskarżenie wobec Chalip zostało wycofane.

ІРЫНА ХАЛІП

Вядомая беларуская журналістка. Нарадзілася 12 лістапада 1967 г. у Менску. Уласны карэспандэнт расейскай «Новой газеты» ў Беларусі. Працавала намесьніцай галоўнага рэдактара «Белорусской деловой газеты» і галоўным рэдактарам штотыднёвіка «Имя», якія спынілі выхад. Неаднаразова падвяргалася крымінальнаму перасьледу за сваю прафэсійную дзейнасьць, атрымлівала папярэджаньні ад пракуратуры.

У красавіку 1997 году разам з бацькам, драматургам і кінадакумэнталістам Уладзімерам Халіпам, была жорстка зьбітая ў часе вулічнага мітынгу 2 красавіка. У канцы 2009 году ёй пагражалі забойствам невядомыя.

Ляўрэатка прэміі Дзьмітрыя Завадзкага (2003 г.), прэміі Хэнры Нанэна (2005 г.), прэміі «Герой Эўропы» ў намінацыі «Мужнае сэрца» (2005 г.), прэміі «За мужнасьць у журналістыцы» (2009 г.).

Жонка палітыка Андрэя Саньнікава, які таксама быў абвінавачаны па справе аб масавых беспарадках і асуджаны. Унучка вядомага беларускага кампазытара Юрыя Бяльзацкага.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

19 сьнежня 2010 году, у дзень прэзыдэнцкіх выбараў, падвергласся сілавому затрыманьню па дарозе з плошчы Незалежнасьці і была зьмешчаная ў СІЗА КДБ. Пры канцы сьнежня 2010 г. Ірыне было прад'яўленае абвінавачаньне па крымінальнай справе, узбуджанай сьледчым упраўленьнем папярэдняга расьсьледаваньня ГУУС Менгарвыканкаму па чч. 1 і 2 арт. 293 КК (масавыя беспарадкі).

Падчас знаходжаньня Ірыны ў СІЗА КДБ яе сям'я зазнала выключны ціск. Улады спрабавалі забраць зь сям'і ў дзіцячы дом трохгадовага сына журналісткі – Даніка Саньнікава.

29 студзеня 2011 г. мера стрыманьня зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе з хатнім арыштам.

У лютым 2011 г., ужо пад арыштам, Ірына Халіп атрымала журналісцкую прэмію «Залатое пяро Расеі».

4 красавіка 2011 г. абвінавачаньне было перакваліфікаванае на арт. 342 (дзеяньні, якія груба парушаюць грамадзкі парадак).

16 траўня 2011 г. у судзе Заводскага раёну Менску Ірына была асуджаная на 2 гады зьняволеньня з 2-гадовай адтэрміноўкай.

19 ліпеня 2013 г. судом Партызанскага раёну пакараньне зь Ірыны Халіп было зьнятае.

ULADZIMIR CHOMICZENKO

Urodził się w 1986 r. Wychowywał się w domu dziecka w Starych Dorogach i w szkole-internacie w Rudeńsku. Kiedy miał 4 lata, jego rodzice zostali pozbawieni praw rodzicielskich. W 2004 r. ukończył liceum rolnicze w Słucku. Miał problemy z nauką.

Nie miał żadnego związku z polityką. Mieszkał w Mińsku i w obwodzie witebskim, ponad 15 razy był pociągany do odpowiedzialności administracyjnej. Pracował na budowie. Dwukrotnie był sądzony w sprawie karnej (w tym raz za próbę kradzieży). 6 grudnia 2010 r., 13 dni przed Płoszczą 2010, Władimir Chomiczenko został warunkowo zwolniony.

KRONIKA REPRESJI

Chomiczenko został zatrzymany podczas pacyfikacji akcji na Placu Niepodległości 19 grudnia 2010 r., skazano go na 15 dni aresztu. Po tym czasie przeniesiono go do aresztu śledczego na Wołodarce i oskarżono o udział w masowych zamieszkach. 5 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 3 lata pozbawienia wolności. Wyrok odbywał w Kolonii nr 19 w Mohylewie. 11 sierpnia 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Łukaszenki.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

УЛАДЗІМЕР ХАМІЧЭНКА

Нарадзіўся ў 1986 годзе. Выхоўваўся ў дзіцячым доме ў Старых Дарогах і школе-інтэрнаце ў Рудзенску. Калі яму было 4 гады, бацькоў пазбавілі бацькоўскіх правоў.

У 2004 г. скончыў сельскагаспадарчы ліцэй у Слуцку. Яго выхаваньнем і ўладкаваньнем побыту займаліся пэдагогі, якія вельмі шкадавалі хлопчыка. Вучоба яму давалася цяжка.

Да палітыкі дачыненьня ня мае. Жыў у Менску і Віцебскай вобласьці, больш за 15 разоў прыцягваўся да адміністратыўнай адказнасьці. Па некаторых зьвестках, адзін час працаваў на будоўлі адзьдзелачнікам.

Двойчы судзімы па крымінальных справах, адзін з прысудаў – на тэрыторыі Беларусі за спробу крадзяжу.

6 сьнежня 2010 г., за 13 дзён да Плошчы-2010, Уладзімер быў датэрмінова вызвалены зь месцаў зьняволеньня.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы пасьля разгону акцыі на плошчы Незалежнасьці 19 сьнежня 2010 г., асуджаны на 15 сутак. Пасьля іх адбыцьця быў пераведзены пад варту ў СІЗА па вул. Валадарскага ў Менску і абвінавачаны ва ўдзеле ў масавых беспарадках.

5 траўня 2011 г. у судзе Кастрычніцкага раёну Менска быў асуджаны на 3 гады зьняволеньня. Тэрмін адбываў у калёніі № 19 каля г. Магілёву.

11 жніўня 2011 г. быў памілаваны Лукашэнкам і выйшаў на волю.



DZMITRIJ CHWEDORUK

Dzmitrij Chwedoruk był oskarżony w sprawie „Młodego Frontu" wraz z Nastą Pałażanką-Daszkiewicz, Alieksiejem Januszewskim, Olegiem Korbanem i Borysem Gorieckim. Urodził się 5 marca 1988 r. Ukończył Gimnazjum nr 11 w Mińsku. Grał zawodowo w piłkę nożną w klubach „Darida" i „Tarktir". Interesował się białoruską historią i kulturą. Aktywnie uczestniczył w akcjach opozycji.

KRONIKA REPRESJI

Był wielokrotnie zatrzymywany przez funkcjonariuszy KGB, milicji i służb specjalnych. Kilkakrotnie odbywał kary aresztu administracyjnego za udział w masowych akcjach protestu, 3 dni był przetrzymywany w więzieniu KGB. Jest protestantem.

Sprawa karna przeciwko działaczom „Młodego Frontu" została wszczęta 4 lutego 2007 r. przez kierownictwo KGB w Mińsku z artykułu 193.1 – „Działalność w imieniu organizacji niezarejestrowanej przez Ministerstwo Sprawiedliwości". Tego dnia doszło do masowych zatrzymań członków zebrania Rady Centralnej „Młodego Frontu", które miało miejsce w prywatnym mieszkaniu w Mińsku.

Po kilku dniach zwolniono kilkudziesięciu zatrzymanych działaczy. Dzmitrij Chwedoruk i Oleg Korban zostali umieszczeni w areszcie śledczym KGB, gdzie spędzili 3 dni jako podejrzani w sprawie karnej. Później status podejrzanych otrzymali również Borys Goriecki, Alieksiej Januszewski i niepełnoletnia wtedy Nasta Pałażanka.

Oskarżenie opierało się na skonfiskowanych podczas rewizji materiałach informacyjnych, a także na nagraniach rozmów telefonicznych i zapisach zebrań członków organizacji, które odbyły się 29 września 2006 r., a także 25 i 29 stycznia oraz 1 i 4 lutego 2007 r. Chwedoruka oskarżono o to, że kierował pierwszomajową radą „Młodego Frontu". Celem działalności organizacji, według oskarżenia, było przejęcie władzy poprzez organizacje masowych akcji. Proces rozpoczął się 28 maja 2007 r. w sądzie w Mińsku.

Prokurator Michońska zażądała dla Chwedoruka kary grzywny w wysokości 500 płac minimalnych. Sędzia Rusłan Aniśkiewicz uznał działaczy za winnych, Dzmitrij Chwedoruk został ukarany grzywną w wysokości 40 płac minimalnych (1 mln 240 tys. rubli).

ЗЬМІЦЕР ХВЕДАРУК

Зьміцер Хведарук быў адным з абвінавачаных па крымінальнай справе супраць некалькіх актывістаў «Маладога Фронту» – разам зь ім судзілі Насту Палажанку, Аляксея Янушэўскага, Алега Корбана, Барыса Гарэцкага.

Нарадзіўся 5 сакавіка 1988 г. Скончыў гімназію № 11 г. Менску. Прафэсійна займаўся футболам. Граў за дублюючы склад футбольнага клюбу «Дарыда», а таксама «Трактар» (сёньняшні «МТЗ-РІПА»). Цікавіцца беларускай гісторыяй і культурай. Актыўны ўдзельнік вулічных акцыяў апазыцыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Неаднаразова затрымліваўся супрацоўнікамі КДБ, міліцыі і байцамі спэцназу. Шмат разоў адбываў адміністратыўныя арышты за ўдзел у масавых акцыях. Трое сутак знаходзіўся ў турме КДБ. Пратэстант.

Крымінальная справа супраць «МФ» была ўзбуджаная 4 лютага 2007 году ўпраўленьнем КДБ па Менску па арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу – «арганізацыя дзейнасьці аб'яднаньня, фонду ці рэлігійнай арганізацыі, якая не прайшла дзяржаўнай рэгістрацыі, ці ўдзел у ёй». У гэты дзень адбылося масавае затрыманьне ўдзельнікаў паседжаньня Цэнтральнай Рады незарэгістраванай арганізацыі «Малады Фронт», якое праводзілася ў прыватнай кватэры ў Менску. Некалькі дзясяткаў затрыманых моладзевых актывістаў праз пэўны час былі вызваленыя. Зьміцер Хведарук і Алег Корбан – зьмешчаныя ў СІЗА КДБ, дзе правялі трое сутак у якасьці падазраваных па ўзбуджанай крымінальнай справе. Пазьней у якасьці падазраваных па гэтай справе былі прыцягнутыя Барыс Гарэцкі, Аляксей Янушэўскі і непаўнагадовая на той час Наста Палажанка.

Абвінавачаньне грунтавалася на канфіскаваных падчас ператрусаў на кватэрах маладафронтаўцаў друкаваных матэрыялах, а таксама на раздрукоўках тэлефонных размоваў і аўдыёзапісе сходаў 29 верасьня 2006 г., 25, 29 студзеня, 1, 4 лютага 2007 году.

Зьмітра Хведарука абвінавачвалі ў тым, што ён кіраваў Першамайскай радай «Маладога Фронту». Мэтай дзейнасьці «Маладога Фронту», на думку абвінавачаньня, зьяўляўся захоп улады шляхам масавых вулічных акцыяў.

Судовыя слуханьні па справе праходзілі 28–29 траўня 2007 г. ў судзе Савецкага раёну Менску.

Дзяржабвінаваўца Міхонская прапанавала пакараць Зьмітра Хведарука штрафам у памеры 500 базавых велічыняў. Судзьдзя Руслан Аніскевіч прызнаў моладзевых актывістаў вінаватымі. Зьміцер Хведарук быў аштрафаваны на 40 базавых велічыняў (1 млн. 240 тыс. руб.).



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ALEŚ CZERNYSZEW

Aleś Czernyszew był jednym z działaczy skazanych w „Sprawie czternastu", działaczem kampanii „Europejska Białoruś" i młodzieżowego ruchu „JEANS – za wolność!" w czasie wyborów prezydenckich 2006 r.

KRONIKA REPRESJI

Aleś Czernyszew był jednym z setki uczestników akcji solidarności z przedsiębiorcami i protestu przeciwko dekretowi prezydenta, który został wydany 10 stycznia 2008 r. Po akcji Aleś Czernyszew został zatrzymany. Następnego dnia, 11 stycznia, skazano go na 15 dni aresztu administracyjnego.

Po odbyciu kary Czernyszew został oskarżony z artykułu 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w grupowych działaniach, w poważny sposób naruszających porządek społeczny".

22 kwietnia 2008 r. w „Sprawie czternastu" został wydany wyrok. Aleksander Czernyszew został skazany na 2 lata ograniczenia wolności bez skierowania do zakładu poprawczego. Dostał zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. W czerwcu 2009 r. karę zmieniono na roboty przymusowe, ale pozostawiono zakaz opuszczania miejsca zamieszkania.

15 stycznia 2010 r. Czernyszew został wezwany na posterunek milicji, gdzie poinformowano go o amnestii i zamknięciu sprawy.

АЛЕСЬ ЧАРНЫШОЎ

Алесь Чарнышоў – адзін з асуджаных па крымінальнай «справе 14-ці», актывіст кампаніі «Эўрапейская Беларусь» і моладзевага руху «JEANS – за Свабоду!» падчас выбараў прэзыдэнта 2006 году.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Алесь быў адным з удзельнікаў акцыі ў падтрымку прадпрымальнікаў і пратэсту супраць рабаўнічага ўказу кіраўніка дзяржавы, якая адбылася 10 студзеня 2008 г. ў Менску. Пасьля акцыі Алеся Чарнышова затрымалі. На наступны дзень, 11 студзеня, ён быў асуджаны на 15 сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел у акцыі прадпрымальнікаў.

Пасьля адбыцьця гэтага пакараньня маладому чалавеку было прад'яўленае абвінавачваньне па па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь – «арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак».

22 красавіка 2008 г. па «справе 14-ці» быў вынесены прысуд. Алесь Чарнышоў быў асуджаны на 2 гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў калёнію адкрытага тыпу. Ён застаўся пасьля суду на такі ж тэрмін пад падпіскай аб нявыезьдзе. У чэрвені 2009 г. пакараньне было заменена на папраўчыя працы, але статус невыязнога застаўся.

15 студзеня 2010 г. Алеся выклікалі ў міліцэйскую ўправу Цэнтральнага раёну Менску, дзе паведамілі пра амністыю і закрыцьцё справы супраць яго.

ALEKSANDER CZIGIR

Aleksander Czigir jest młodszym synem byłego premiera Białorusi, Michaiła Czigira. Sprawa Aleksandra Czigira od samego początku była uważana za polityczną. Zdaniem ekspertów, celem było zaatakowanie Michaiła Czigira, który w 1996 r. zrezygnował ze stanowiska premiera, bowiem nie zgadzał się z polityką prowadzoną przez Łukaszenkę. Michaił Czigir w roku 1999 spędził 8 miesięcy w areszcie.

KRONIKA REPRESJI

Aleksander Czigir był trzykrotnie sądzony. Po raz pierwszy spędził za kratami 3 lata z siedmiu, które mu zasądzono. Był oskarżony o kradzież samochodów i sprzedaż ich części zapasowych. Władze wykorzystały fakt, że Czigir bardzo lubił samochody, znał się na nich i sam zajmował się naprawą, pomagał w tym również przyjaciołom.

W 1999 r., po uwolnieniu Aleksandra, wszczęto nową sprawę karną dotyczącą starego oskarżenia, do tego dodano jeszcze oskarżenie o „nielegalną działalność gospodarczą". 20 lutego 2001 r. przedstawiono mu zarzuty z artykułu 205, pkt 4 KK RB – „Kradzież mienia, dokonana po raz kolejny przez grupę osób".

Od lutego 2001 r. Aleksander Czigir był przetrzymywany w areszcie śledczym. W tym czasie władze kolonii nie zgodziły się na żadne widzenie z rodziną, a jego adwokat został brutalnie pobity przez nieznanych sprawców.

6 marca 2002 r. sąd skazał Aleksandra na 7 lat pozbawienia wolności. Razem z nim na kary więzienia skazani zostali Dzmitrij Juskiewicz i Anton Jaszyn (sprawa była oparta na zeznaniach, które młodzi ludzie złożyli 19 lutego 2001 r. – podczas procesu stwierdzili, że wcześniejsze zeznania złożyli w rezultacie brutalnego traktowania i tortur).

Aleksander Czigir odbywał karę w kolonii w Iwacewiczach. W grudniu 2002 r. przeniesiono go do Mińska, gdzie przedstawiono mu zarzut nielegalnej działalności gospodarczej.

16 maja 2003 r. w sądzie w Mińsku rozpoczął się drugi w ciągu zaledwie 2 lat proces syna byłego premiera. Zdaniem śledczych, na zamówienie Aleksandra 15 razy kradziono samochody zagranicznych marek, po czym dostarczano mu je, by ten mógł sprzedawać części zapasowe. Nie znaleziono jednak żadnej osoby, która mogła uczestniczyć w tym procederze. W związku z tym sprawę umorzono.

АЛЯКСАНДАР ЧЫГІР

Малодшы сын былога прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Чыгіра.

Справу Аляксандра Чыгіра з самага пачатку называлі палітычнай. На думку экспэртаў, яна была скіраваная на Міхаіла Чыгіра, які ў 1996 годзе пакінуў пасаду кіраўніка беларускага ўраду з-за нязгоды з палітыкай Аляксандра Лукашэнкі. Чыгір-старэйшы правёў за кратамі 8 месяцаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Аляксандра Чыгіра судзілі аж тройчы. Першы раз ён правёў за кратамі 3 гады з тых 7, да якіх ён быў прыгавораны. Яму інкрымінавалі крадзеж аўтамабіляў і перапродаж іх запчастак. Уладамі было скарыстана тое, што малады чалавек сапраўды зь юнацкіх гадоў любіў машыны, добра разьбіраўся ў іх, самастойна займаўся рамонтам і дапамагаў рабіць гэта сябрам.

Пасьля вызваленьня Аляксандра ў 1999 г. на яго завялі новую справу па старым абвінавачаньні, да якога яшчэ дадалася «незаконная прадпрымальніцкая дзейнасьць». 20 лютага 2001 г. было вылучанае абвінавачаньне па арт. 205 ч. 4 Крымінальнага кодэксу РБ: «Таемны крадзеж маёмасьці, учынены паўторна групай асобаў у асабліва буйных памерах». Маці Аляксандра Юлія Чыгір тады заявіла, што пакуль ня пройдуць прэзыдэнцкія выбары, адным з кандыдатаў на якіх мяркуе быць М. Чыгір, сына будуць трымаць пад вартай і абвінавачваць ва ўсіх дзяржаўных СМІ Беларусі, каб цень падаў найперш на бацьку.

З канца лютага 2001 г. Аляксандар Чыгір знаходзіўся ў сьледчым ізалятары. За гэты час ён ня меў ніводнага спатканьня са сваякамі, а яго адвакат Аляксандар Пыльчанка быў жорстка зьбіты невядомымі.

6 сакавіка 2002 г. суд Ленінскага раёну Менску асудзіў Аляксандра Чыгіра на 7 гадоў пазбаўленьня волі, прызнаўшы яго вінаватым у пасобніцтве ўчыненьню сэрыі крадзяжоў мікрааўтобусаў «Форд-Транзыт». Разам зь ім да парацяглых тэрмінаў зьняволеньня прыгавораныя таксама Дзьмітрый Юскевіч і Антон Яшын (уся справа будавалася на тым, што 19 лютага 2001 г. яны зьявіліся ў міліцыю з павіннай; на судзе заявілі, што паказаньні зь іх выбілі катаваньнямі).

Аляксандар Чыгір адбываў тэрмін зьняволеньня ў Івацэвіцкай калёніі. У сьнежні 2002 г. быў дастаўлены ў Менск, дзе яму прад'явілі яшчэ адно абвінавачаньне – у незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці.

16 траўня 2003 г. ў Ленінскім судзе Менску пачаўся другі за два гады працэс над сынам былога прэм'ер-міністра. На думку сьледзтва, нібыта 15 разоў на заяўку Чыгірамалодшага ў Менску выкрадалі іншамаркі і прыганялі яму для таго, каб разьбіраць на запчасткі і прадаваць. Аднак не было знойдзена ніводнага з саўдзельнікаў, якія ўчынялі выкраданьні. Тэрмін пакараньня новая справа не зьмяняла.

JULIA CZIGIR

Julia Czigir jest żoną więźnia politycznego, Michaiła Czigira, byłego premiera RB i matką Aleksandra Czigira, sądzonego również w sprawie motywowanej politycznie. Jako prawnik broniła męża w sądzie.

KRONIKA REPRESJI

W 2000 r., sąd w Mińsku uznał Julię Czigir winną popełnienia przestępstwa z artykułu 363, pkt 2 kk – „Stawianie oporu funkcjonariuszom milicji". Sprawa dotyczyła incydentu z 19 maja 2000 r., zanim przedstawiono zarzuty jej mężowi, Michaiłowi Czigirowi. Tego dnia przed sądem w Mińsku, gdzie odbywał się proces przeciwko byłemu premierowi Republiki Białoruś, kordon omonowców nie wpuszczał do budynku osób, które chciały wyrazić swoją solidarność i wsparcie dla Michaiła Czigira i jego bliskich. Do sądu nie wpuszczano nawet krewnych polityka, a kilka osób zatrzymano. Julia Czigir została wyciągnięta z tłumu przez funkcjonariuszy milicji. Jak oświadczyła potem podczas konferencji prasowej 17 czerwca 2000 r., dzień przed tym, jak została wezwana do prokuratury, ból który zadał jej milicjant, był tak silny, że machinalnie ugryzła ona człowieka, który uderzył ją w rękę. Na ręce było wiele siniaków i krwiaków.

Sąd w Mińsku skazał Julię Czigir na 2 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu na rok. Sąd odmówił przejrzenia materiału wideo z 19 maja 2000 r. Po wydaniu wyroku, Julia Czigir oświadczyła, że w kraju nie ma sprawiedliwości, a jej sprawa i sprawa jej rodziny motywowana jest politycznie.

ЮЛІЯ ЧЫГІР

Юлія Чыгір – жонка палітвязьня Міхаіла Чыгіра, былога прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, і маці Аляксандра Чыгіра, асуджанага па справе, зьвязанай з палітыкай. Юрыст паводле адукацыі, Юлія Чыгір абараняла ў судзе свайго мужа.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2000 г. Фрунзэнскі суд Менску прызнаў Юлію Чыгір вінаватай па ч. 2 арт. 363 КК РБ – «супраціў міліцыі». Гаворка ішла пра інцыдэнт 19 траўня 2000 г. перад абвяшчэньнем прысуду яе мужу. У той дзень у будынак Менскага гарадзкога суду, дзе ішоў працэс над экс-кіраўніком ураду, амапаўцы не пускалі сваякоў і тых, хто прыйшоў выказаць падтрымку Міхаілу Чыгіру і ягоным блізкім. Некалькі чалавек тады былі затрыманыя.

Падчас спробаў прарвацца ў будынак суду ўзьнікла цісканіна і некалькі жанчын атрымалі траўмы. Юлія Чыгір была да крывападцёкаў схопленая за руку міліцыянтам. Напярэдадні свайго выкліку ў пракуратуру 17 ліпеня 2000 г., Юлія Чыгір заявіла, што прычынены боль быў настолькі моцным, што яна машынальна ўкусіла таго, хто пацягнуў яе за руку.

Менскі гарадзкі суд пакінуў бязь зьменаў прысуд Ю. Чыгір – два гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на адзін год. Юлія Чыгір заявіла, што вынесенае рашэньне дэманструе адсутнасьць справядлівасьці ў краіне, і пацьвердзіла палітычны пераслед усёй сям'і Чыгіроў.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

MICHAIŁ CZIGIR

Drugi premier niepodległej Białorusi i pierwszy szef rządu prezydenta Aleksandra Łukaszenki urodził się 24 maja 1948 r. w miejscowości Usowo. W 1983 r. rozpoczął pracę jako szef moskiewskiego oddziału Banku Państwowego ZSRR w Mińsku. Awansował na stanowisko zastępcy dyrektora „Agroprombank". W latach 1991–1994 był prezesem zarządu „Belagroprombank". Od czerwca 1994 do listopada 1996 r. był premierem Republiki Białoruś. Zrezygnował z funkcji premiera na znak protestu przeciw referendum z 1996 r. oraz nowej polityki ekonomicznej prezydenta Aleksandra Łukaszenki. W 1999 r. był kandydatem na prezydenta.

KRONIKA REPRESJI

Dwa miesiące po ogłoszeniu przez Michaiła Czigira kandydatury w wyborach prezydenckich powstała specjalna komisja, której celem było sprawdzenie działań banku pod kierownictwem Michaiła Czigira. Odkryto jedynie 6 naruszeń spłaty kredytów przez klientów.

W trakcie śledztwa wszystkie rozliczenia z tamtego okresu zostały uregulowane, tak więc Michaił Czigir nie usłyszał żadnego zarzutu. Po niecałym miesiącu media zaczęły rozpowszechniać bezpodstawne zarzuty wobec Czigira, według których szef rządu był rzekomo odpowiedzialny za niespłacone wielomilionowe kredyty. Medialna kampania przeciwko Czigirowi rozpoczęła się tuż po tym, jak kandydat zebrał 120 tys. podpisów popierających jego kandydaturę. Wieczorem 28 marca 1999 r. narodowa telewizja zakomunikowała, że Michaił Czigir ukradł milion dolarów po czym opuścił kraj. Trzy dni później jego kandydatura została zarejestrowana – tuż po jego aresztowaniu (w więzieniu spędził wtedy 8 miesięcy). 30 listopada 1999 r. został zwolniony za kaucją. Rozprawa, która była zaplanowana na 27 grudnia, została przełożona na rok 2000. Czigir został oskarżony nie jako polityk, lecz ekonomista na postawie art. 91, pkt 4 KK – „Cesja majątku na dużą skalę" i art. 166 KK – „Nadużycie władzy lub sytuacji". 19 maja 2000 r. został skazany przez miński sąd na trzy lata pozbawienia wolności, w zawieszeniu na 2 lata. Adwokatem w czasie procesu była jego żona, Julia. 5 grudnia sąd najwyższy uchylił wyrok. W listopadzie 2000 r. wystartował w wyborach do Izby Reprezentantów Zgromadzenia Narodowego Republiki Białoruś. W 2001 r. wziął udział w kampanii prezydenckiej, nie zebrał jednak wymaganej ilości podpisów.

23 lipca 2002 r. został skazany na kolejne 3 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu na 2 lata oraz został pozbawiony prawa do zajmowania się jakąkolwiek działalnością gospodarczą lub administracyjną na 5 lat. Tym razem został oskarżony o oszustwa podatkowe. Uwzględniwszy odsetki, jest on rzekomo winien państwu 8 057 355 rubli. Michaił Czigir zobowiązał się spłacić wszelkie należności.

МІХАІЛ ЧЫГІР

Міхаіл Чыгір – другі прэм'ер-міністар незалежнай Рэспублікі Беларусь (пасьля Вячаслава Кебіча) і першы кіраўнік ураду пасьля абраньня прэзыдэнтам А. Лукашэнкі.

Нарадзіўся 24 траўня 1948 г. Скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі, спэцфакультэт па міжнародных эканамічных адносінах пры Маскоўскім фінансавым інстытуце. Вянком сваёй кар'еры банкіра М. Чыгір лічыць пасаду старшыні праўленьня «Белаграпрамбанку» (1991–1994 гг.).

З 1994 па 1996 г. – прэм'ер-міністар Рэспублікі Беларусь. Пакінуў пасаду на знак пратэсту супраць рэфэрэндуму 1996 г. і эканамічнага курсу краіны, абранага А. Лукашэнкам.

Удзельнік прэзыдэнцкіх выбараў 1999 г., якія праводзіў тагачасны старшыня ЦВК Віктар Ганчар.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Перасьлед Міхаіла Чыгіра пачаўся пасьля збору ім 120 тыс. подпісаў грамадзянаў у сваю падтрымку. Спэцыяльнастворaная камісыя правярала работу банка, якім ён кіраваў, за перыяд 1991–1995 гг. Хоць прэтэнзыяў да Чыгіра не ўзьнікла, празь месяц СМІ беспадстаўна абвінавацілі М.Чыгіра ў невяртаньні ў раней кіраваны ім банк шматмільённых крэдытаў. Па нацыянальным тэлебачаньні прагучала, што Чыгір скраў мільён даляраў і эміграваў з краіны. 30 сакавіка 1999 г., за дзень да рэгістрацыі яго кандыдатам у прэзыдэнты, ён быў арыштаваны і зьмешчаны ў СІЗА, дзе правёў 8 месяцаў.

Міхаілу Чыгіру былі прад'яўленыя эканамічныя абвінавачваньні: па арт. 91 ч. 4 КК РБ – «прысвойваньне маёмасьці ў асабліва буйных памерах» і арт. 166 – «злоўжываньне ўладай або службовым становішчам». Аднак карныя дзеяньні супраць экс-прэм'ера сьведчаць пра палітычны характар яго справы.

19 траўня 2000 г. Менскі гарадзкі суд асудзіў Міхаіла Чыгіра на 3 гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на 2 гады, гэтае рашэньне пазьней было адмененае Вярхоўным судом.

У 2000 г. Міхаіл Чыгір браў удзел у выбарах у Палату прадстаўнікоў Народнага сходу Рэспублікі Беларусь, і ў прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г., але не набраў дастатковай колькасьці подпісаў выбаршчыкаў.

23 ліпеня 2002 г. суд Фрунзенскага раёну Менску вынес у дачыненьні да Чыгіра новы прысуд: 3 гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на 2 гады, а таксама пазбаўленьне на 5 гадоў права займаць пасады, зьвязаныя з гаспадарча-распарадчай дзейнасьцю. На гэты раз ён быў прызнаны вінаватым ва ўтойваньні падаткаў і ўхіленьні ад падаваньня падатковых дэкляарацый, што прычыніла дзяржаве шкоду ў асабліва буйным памеры. Падпіска аб нявыезьдзе была пакінутая ў сіле. Па другім пункце абвінавачваньня – службовая халатнасьць (у сувязі з выплатай авансавага плацяжу на суму звыш 1 млн. даляраў ЗША канадзкай фірме для будаўніцтва новага будынку «Белаграпрамбанку») – суд палічыў вінаватасьць М. Чыгіра даказанай. Аднак у сувязі з заканчэньнем тэрміну даўнасьці спыніў працэс.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

DZMITRIJ DASZKIEWICZ

Urodził się 20 lipca 1981 r. we wsi Kuszniery w obwodzie brzeskim. Do 5. roku życia mieszkał w Rosji na Dalekim Wschodzie, we wsi Jagodne w obwodzie magadańskim, później – na Białorusi w mieście o nazwie Stare Dorohi. Tam ukończył szkołę średnią. Uczył się w Instytucie Rolniczym w Grodnie.

W 2001 r. przyłączył się do narodowego ruchu młodzieżowego „Młody Front". Jesienią 2001 r. był jednym z obrońców miejsca masowych egzekucji dokonywanych przez NKWD w Kuropatach[5]. Później wstąpił na Wileński Uniwersytet Pedagogiczny, gdzie studiował slawistykę. Został wybrany na przywódcę organizacji „Młody Front" w Mińsku.

5. Kuropaty – miejsce pochówku ofiar stalinizmu pod Mińskiem.

KRONIKA REPRESJI

Daszkiewicz jest aktywnym uczestnikiem i organizatorem wielu akcji opozycyjnych. Za działalność polityczną niejednokrotnie pociągano go do odpowiedzialności administracyjnej. W 2004 r. wziął udział w proteście przeciwko wynikom referendum dotyczącym trzeciej kadencji Łukaszenki. W 2004 r. został wybrany na przewodniczącego „Młodego Frontu". W czasie wyborów prezydenckich 2006 r. pracował w sztabie wyborczym Aleksandra Milinkiewicza, został jednym z organizatorów masowych akcji protestacyjnych, a także stanął na czele miasteczka namiotowego na Placu Październikowym. We wrześniu 2006 r. został aresztowany za „działalność na rzecz niezarejestrowanej organizacji". Skazano go na półtora roku więzienia. Po roku wszczęto kolejne postępowanie karne, tym razem za odmowę składania zeznań przeciwko aktywiście „Młodego Frontu", Iwanowi Shyli. Pod naciskiem opinii międzynarodowej wymierzono mu jedynie karę finansową w wysokości 1 860 000 rubli białoruskich.

Zatrzymano go dzień przed wyborami prezydenckimi, 18 grudnia 2010 r. razem z Eduardem Lobauem na jednej z ulic Mińska. Obaj zostali oskarżeni o chuligaństwo.

24 marca 2011 r. sąd rejonu moskiewskiego skazał go na dwa lata kolonii karnej. 28 sierpnia 2012 r. został skazany na dodatkowy rok więzienia za rzekome naruszenie regulaminu więziennego. W grudniu 2012, w kolonii karnej, wziął ślub z Nastą Pałażanką.

Daszkiewicz wyszedł na wolność 28 sierpnia 2013. W więzieniu spędził 986 dni.

ЗЬМІЦЕР ДАШКЕВІЧ

Нарадзіўся 20 ліпеня 1981 г. У 2001 годзе далучыўся да моладзевага нацыянальнага руху «Малады Фронт», з 2004 г. – лідэр арганізацыі.

Актыўны ўдзельнік і арганізатар шматлікіх масавых акцыяў і мерапрыемстваў дэмакратычных сілаў Беларусі. За сваю адкрытую палітычную пазыцыю і дэмакратычную дзейнасьць неаднаразова прыцягваўся да адміністратыўнай адказнасьці паводле незаконных палітычных артыкулаў, быў караны арыштамі і велізарнымі штрафамі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Асуджэньне Зьмітра Дашкевіча ў 2011 г. было ня першым эпізодам ягонага крымінальнага перасьледу ўладамі. Так, 15 верасьня 2006 г. ён быў абвінавачаны ў "дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі» паводле антыканстытуцыйнага артыкулу 193.1 КК РБ, адмыслова прынятага напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году. Дашкевіч быў асуджаны на 1,5 гады зьняволеньня.

У верасьні 2007 г. палітвязень быў абвінавачаны ў адмове сьведчыць супраць актывіста «МФ» Івана Шылы. За гэта была заведзеная новая крымінальная справа, паводле якой Дашкевічу пагражала яшчэ 6 месяцаў арышту ў дадатак да тэрміну, на які ён быў асуджаны, але Зьмітра пакаралі штрафам.

Пад ціскам міжнароднай супольнасьці Зьміцер Дашкевіч быў вызвалены датэрмінова 23 студзеня 2008 г. і працягнуў сваю палітычную дзейнасьць у «МФ».

18 сьнежня 2010 г. лідэр «Маладога Фронту» быў затрыманы ў Менску. Паводле інфармацыі ГУУС Менгарвыканкаму, яны разам з Эдуардам Лобавым нібыта зьбілі грамадзянаў К. Савіцкага і А. Малышава. Затрыманьне Дашкевіча і Лобава было прэвэнтыўнай мерай міліцыі напярэдадні выбараў прэзыдэнта. 24 сакавіка 2011 г. Зьміцер быў асуджаны на 2 гады зьняволеньня ў калёніі агульнага рэжыму.

Да суду ён утрымліваўся ў менскай «Валадарцы», дзе за адмову супрацоўнічаць са сьледзтвам яму пагражалі максымальным тэрмінам пакараньня і адбыцьцём яго ў карцары. Пасьля вынясеньня прысуду – каля 2 месяцаў знаходзіўся ў Жодзінскім СІЗА, адкуль быў этапаваны ў калёнію № 9 г. Горкі, дзе Зьміцер тройчы запар зьмяшчаўся ў штрафны ізалятар і працяглы час быў ізаляваны нават ад свайго адваката. Былі падставы меркаваць, што ў дачыненьні да яго прымяняліся ціск і гвалт. Пасьля кампаній грамадзкасьці Дашкевіч патрапіў у СІЗА Магілёву, затым – Віцебску. 27 верасьня 2011 г. яго перавялі ў калёнію № 13 г. Глыбокае на Віцебшчыне, якая лічыцца адной з найбольш суворых папраўчых установаў Беларусі. Там палітвязень быў зьмешчаны ў камэру-адзіночку. Улады перашкаджалі яму ўзяць шлюб: пашпарт Зьмітра трымаў у сябе КДБ.

28 жніўня 2012 г., проста ў Глыбоцкай калёніі, ізноў асуджаны – за «злоснае непадпарадкаваньне патрабаваньням адміністрацыі калёніі» на яшчэ адзін год.

У ноч на 4 верасьня 2012 г. этапаваны з Глыбоцкай калёніі ў СІЗА г. Віцебску.

20 верасьня стала вядома пра знаходжаньне Зьмітра Дашкевіча ў калёніі № 20 г. Мазыра, этап адбыўся таемна.

30 кастрычніка 2012 г. за непадпарадкаваньне і парушэньне рэжыму рашэньнем вызнога суду быў пераведзены з Мазырскай калёніі ў крытую турму ў Гародню. У канцы сьнежня ў турэмных умовах адбылося вясельле Зьмітра Дашкевіча з Настай Палажанкай.

28 жніўня 2013 году Зьміцер Дашкевіч быў вызвалены.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

NASTA DASZKIEWICZ

Nasta Daszkiewicz (Pałażanka), żona Dzmitrija Daszkiewicza, wiceprzewodnicząca „Młodego Frontu", charyzmatyczna liderka narodowo zorientowanej młodzieży demokratycznej, urodziła się 2 sierpnia 1990 r. w Mińsku. W latach 1997–2008 uczęszczała do Szkoły Podstawowej nr 37 w Mińsku (z rozszerzonym językiem niemieckim). Od 2008 r. studiuje na Europejskim Uniwersytecie Humanistycznym, na wydziale filozofii i polityki.

W wieku 14 lat wstąpiła do „Młodego Frontu". Od początku była represjonowana przez władze. Bardzo szybko stała się liderem młodofrontowej młodzieży. W 2007 r. została oskarżona na podstawie art. 193 KK – „Działanie w szeregach niezarejestrowanej organizacji". Sąd wydał wówczas pouczenie.

Nasta brała udział w wielu akcjach i kampaniach organizowanych przez „Młody Front", za co często była zatrzymywana przez milicję. Zaraz po ukończeniu 18 lat, pełnoletnia już Nasta została aresztowana. 7 listopada 2008 r. aresztowano ją za udział w pikiecie antykomunistycznej.

W czasie 6. Sejmu „Młodego Frontu" została wiceprzewodniczącą organizacji.

KRONIKA REPRESJI

W czasie kampanii prezydenckiej w 2010 r. wraz ze swymi przyjaciółmi była poddawana presji ze strony władz. 9 grudnia 2010 r., 10 dni przed wydarzeniami na Placu Niepodległości, wraz z innymi członkami „Młodego Frontu" Dzmitrijem Daszkiewiczem, Nikolajem Demidenko i Władimirem Jeremenko, została zatrzymana. Milicja oświadczyła, że grupa młodzieży jechała kradzionym samochodem. Zostali zatrzymani na parę godzin.

Nasta został aresztowana, po wiecu na Placu Niepodległości 20 grudnia, o 3:20 rano w swoim domu. 20-letnia dziewczyna została przetransportowana w eskorcie piętnastu funkcjonariuszy KGB. Nasta została oskarżona o organizację i udział w zamieszkach. Umieszczono ją w areszcie śledczym KGB.

17 lutego 2011 r. zwolniono ją za kaucją. 8 marca 2011 r. została pierwszą białoruską kobietą, której przyznano Międzynarodową Nagrodę za Odwagę. Nagrodę tę wręczyła jej Hillary Clinton, sekretarz stanu USA.

30 marca zmieniono zarzuty na podstawie art. 342 KK – „Organizacja lub udział w działaniach naruszających porządek publiczny" i 20 maja 2011 r. skazano ją na rok pozbawienia wolności w zawieszeniu.

НАСТА ДАШКЕВІЧ

Намесьніца старшыні «Маладога Фронту», харызматычны лідэр нацыянальна арыентаванай дэмакратычнай моладзі. Наста Дашкевіч (у дзявоцтве – Палажанка) нарадзілася 2 жніўня 1990 году ў Менску. З 1997 па 2008 гг. вучылася ў 73-й менскай школе (з паглыбленым вывучэньнем нямецкай мовы) і ў 37-й школе (з эстэтычным ухілам). З 2008 г. – студэнтка факультэта філязофіі і палітычных навук Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту.

У «Малады Фронт» Наста прыйшла ў 2004 годзе, ва ўзросьце 14 гадоў. Яна амаль адразу зазнала ціск з боку ўладаў, але і хутка зрабілася сапраўдным лідэрам моладзі.

Наста Палажанка брала ўдзел у многіх акцыях і кампаніях «Маладога Фронту», з-за гэтага дзясяткі разоў затрымлівалася міліцыяй. Амаль адразу пасьля дасягненьня 18 гадоў цяпер ужо паўнагадовую Насту пачалі арыштоўваць. Так, 7 лістапада 2008 г. за ўдзел у антыкамуністычным пікеце каля будынку КДБ яна была арыштаваная на 3 сутак.

На VI Сойме «Маладога Фронту» 9 сакавіка 2008 году Наста была абраная намесьніцай старшыні арганізацыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2007 годзе Наста ў ліку іншых маладафронтаўцаў была асуджаная па артыкуле 193.1 Крымінальнага кодэксу (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). У якасьці пакараньня суд абраў папярэджаньне.

Падчас выбарчай кампаніі 2010 году на Насту Палажанку і яе таварышаў пастаянна ўзмацняўся ціск. 9 сьнежня 2010 г., за 10 дзён да падзей на Плошчы-2010, Насту разам з маладафронтаўцамі Зьмітром Дашкевічам, Міколам Дземідзенкам і Ўладзімерам Яроменкам затрымала міліцыя, заявіўшы, што яны едуць на крадзенай машыне. Некалькі гадзінаў іх пратрымалі ў пастарунку і адпусьцілі.

Пасьля акцыі на Плошчы Насту арыштавалі дома ў 3:20 ночы на 20 сьнежня. Захоп 20-гадовай дзяўчыны ажыцьцяўляўся сіламі пятнаццаці супрацоўнікаў КДБ. Наста абвінавачвалася ў арганізацыі і ўдзеле ў масавых беспарадках. Утрымлівалася ў СІЗА КДБ.

17 лютага 2011 г. увечары была адпушчаная пад падпіску аб нявыезьдзе. 8 сакавіка 2011 г. стала першай беларускай, узнагароджанай Міжнароднай жаночай прэміяй за мужнасьць, якую ўручала дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан.

30 сакавіка абвінавачваньне перафармуляванае на ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак, ці ўдзел у іх).

20 траўня 2011 г. у судзе Фрунзенскага раёну Менску асуджаная на 1 год пазбаўленьня волі ўмоўна.

27 ліпеня 2012 г. даведалася аб зьняцьці зь міліцэйскага ўліку і сканчэньні ўмоўнага тэрміну.

Напрыканцы сьнежня 2012 году ў гарадзенскай турме пабралася шлюбам са сваім нарачоным – аднадумцам па «Маладым Фронце» Зьмітром Дашкевічам.

MAKSIM DASZUK

Maksim Daszuk jest działaczem ze wsi Krasnoje.

KRONIKA REPRESJI

10 stycznia 2008 r. Daszuk został zatrzymany w Mińsku podczas protestu przedsiębiorców. Był wtedy niepełnoletni, miał zaledwie 16 lat. Jego sprawa została skierowana do komisji ds. niepełnoletnich. Po tym zdarzeniu Daszuka oskarżono z artykułu 342, pkt 1 KK – „Organizacja lub udział w działalności naruszających porządek publiczny".

27 maja 2008 r. sędzia centralnego sądu rejonowego w Mińsku, Walerij Jesman, uznał Daszuka winnym zarzucanych mu czynów i skazał na 1,5 roku ograniczenia wolności, bez skierowania go do więzienia. Później przeciwko Daszukowi wszczęto kolejną sprawę karną z artykułu 415 KK RB – „Uchylanie się od odbywania kary w postaci ograniczenia wolności". 23 lutego 2009 r., w dniu, w którym przedstawiono mu zarzuty, Daszuk został umieszczony w areszcie śledczym. Już następnego dnia prokurator zmienił mu środek zapobiegawczy na zakaz opuszczania miejsca zamieszkania.

15 czerwca 2009 r. sędzia Kuzniecowa wydała nowy wyrok – 1 rok i 3 miesiące ograniczenia wolności bez skierowania do zakładu poprawczego. W 2006 roku, kiedy Maksim Daszuk był jeszcze uczniem 8. klasy jednej z mińskich szkół, „zaproponowano" mu przeniesienie dokumentów do innej szkoły za wywieszenie biało-czerwono-białej flagi. Przez trzy miesiące Maksim Daszuk uczył się we wsi Krasnoje, a w 9. klasie znowu przeniósł się do Mińska, jednak naukę podjął już w innej szkole. Po jej ukończeniu pracował przy montażu mebli.

МАКСІМ ДАШУК

Максім Дашук – актывіст зь мястэчка Краснае.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Будучы яшчэ непаўнагадовым (16 гадоў), быў затрыманы 10 студзеня 2008 году ў Менску падчас акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Ягоная справа была накіраваная ў адміністратыўную камісыю па справах непаўнагадовых. Пасьля гэтага Максіма абвінавацілі па крымінальным артыкуле – ч. 1 арт. 342 КК РБ («арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак»).


27 траўня 2008 г. судзьдзя Цэнтральнага раённага суду Менску Валеры Есьман прызнаў Максіма Дашука вінаватым і вынес пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі тэрмінам на паўтары гады без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.

Пазьней супраць Максіма была ўзбуджаная яшчэ адна крымінальная справа – па артыкуле 415 КК РБ («ухіленьне ад адбыцьця пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі»). У дзень прад'яўленьня абвінавачваньня, 23 лютага 2009 г., Максім Дашук быў зьмешчаны ў менскае СІЗА, але на наступны дзень пракурор зьмяніў меру стрыманьня на падпіску аб нявыезьдзе.

15 чэрвеня 2009 г. судзьдзя Маскоўскага раёну Кузьняцова агучыла новы прысуд: адзін год і тры месяцы абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстановы адкрытага тыпу.

У 2006 г., калі Максім яшчэ быў вучнем 8-й клясы адной зь менскіх школ, яму прапанавалі забраць дакумэнты са школы за бел-чырвона-белы сьцяг. Правучыўшыся тры месяцы ў Красным, у 9-ы клас ізноў пайшоў у Менску, толькі ў іншую школу. Пасьля школы працаваў майстрам па зборцы мэблі, асвоіў спэцыяльнасьць самастойна.

DENIS DENISOW



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Denis Denisow – jeden z organizatorów i uczestników miasteczka namiotowego – akcji protestu przeciwko fałszerstwom podczas wyborów prezydenckich w 2006 r. Akcja ta miała miejsce na Placu Październikowym w Mińsku („Plac Kalinowskiego"), trwała ponad 3 dni i zakończyła się aresztowaniem wszystkich jej uczestników. Trzy miesiące po tej akcji część jej uczestników zrzeszyła się i stworzyła w Wilnie ruch protestu „Bunt", który z czasem został zlikwidowany przez samych członków.

KRONIKA REPRESJI

Sprawa karna przeciwko działaczom młodzieżowym Denisowi Denisowowi i Tatianie Jełowej, została wszczęta z artykułu 14, pkt 1 oraz 342, pkt 1 KK – „Organizacja i przygotowanie działań w poważny sposób naruszających porządek publiczny, bądź aktywny w nich udział". Zdaniem naczelnika oddziału ds. nadzoru nad śledztwem, W.A. Zabawskiego „D.W. Denisow razem z ponad 25 osobami, mającymi przy sobie ponad 1000 ulotek, 17 czerwca 2006 r. został zatrzymany przez funkcjonariuszy milicji podczas próby przeprowadzenia nielegalnej akcji «Bunt» w Letnim Amfiteatrze w Witebsku".

19 czerwca 2006 roku w związku z tymi wydarzeniami wszczęto sprawę karną, a w październiku wydano postanowienie o nadaniu Denisowowi i Jełowej statusu oskarżonych. Wobec Denisa Denisowa nakazano zastosować środek zapobiegawczy w postaci aresztu. Ścigano go listem gończym, gdyż się ukrywał. W związku z tym, że nie udało się ustalić miejsca pobytu Denisowa, 19 października 2006 r. sprawa karna została zamknięta.

16 lutego 2007 r. sprawę wznowiono – Denisowa zatrzymano w pociągu do Homla. Początkowo przetrzymywano go w homelskim areszcie śledczym, potem przeniesiono go do aresztu śledczego nr 2 w Witebsku, gdzie spędził 2 miesiące. 11 kwietnia 2007 r. Denisow został zwolniony z aresztu po wpłaceniu kaucji w wysokości 500 płac minimalnych (ponad 15,5 miliona rubli). Kaucja została zebrana przez przedstawicieli społeczności białoruskiej. 30 maja 2007 r. sprawa karna przeciwko Denisowowi i Jełowej została zamknięta z powodu braku znamion przestępstwa.

ДЗЯНІС ДЗЯНІСАЎ

Дзяніс Дзянісаў – адзін з арганізатараў і ўдзельнікаў намётавага мястэчка пратэсту супраць фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году, які больш за трое сутак, да арышту ўсіх удзельнікаў, праходзіў на Кастрычніцкай плошчы Менску «Плошча Каліноўскага». Праз 3 месяцы пасьля гэтай акцыі частка яе ўдзельнікаў аб'ядналася і ўтварыла ў Вільні рух супраціву «Бунт», які потым самаліквідаваўся.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Крымінальная справа супраць моладзевых актывістаў Дзяніса Дзянісава і Тацяны Елавой была ўзбуджаная па ч. 1 арт. 14, ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх).

Паводле начальніка аддзелу па наглядзе за сьледзтвам у органах унутраных справаў пракуратуры Віцебскай вобласьці, дарадцы юстыцыі В. А. Забаўскага, «Дзянісаў Д. В. сумесна зь іншымі асобамі ў колькасьці ня менш за 25 чалавек, якія мелі пры сабе больш за 1000 улётак, 17.06.2006 г. у вячэрні час быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі пры замаху на правядзеньне незаконнай акцыі «БУНТ» у Летнім амфітэатры ў г. Віцебску».

19 чэрвеня 2006 году была ўзбуджаная крымінальная справа па гэтых падзеях, а ў кастрычніку вынесеная пастанова аб прызнаньні Дз. Дзянісава і Т. Елавой абвінавачваемымі.

У адносінах да Дзяніса Дзянісава была абраная мера стрыманьня ў выглядзе заключэньня пад варту, ён быў абвешчаны ў вышук, паколькі хаваўся ад сьледзтва. У сувязі зь неўстанаўленьнем месцазнаходжаньня абвінавачваемага 19 кастрычніка 2006 году вытворчасьць па крымінальнай справе была спыненая, аднак 16 лютага 2007 году ўзноўленая – моладзевы актывіст быў затрыманы ў цягніку, які ехаў у Гомель. Спачатку Дз. Дзянісава ўтрымлівалі ў Гомельскім сьледчым ізалятары, потым перавезьлі ў Віцебскі сьледчы ізалятар № 2, дзе ён правёў два месяцы.

З-пад варты Дзяніс Дзянісаў быў адпушчаны 11 красавіка 2007 г. пад грашовы заклад памерам 500 базавых велічыняў (больш за 15 з паловай мільёнаў рублёў), сабраны прадстаўнікамі беларускай грамадзкасьці.

30 траўня 2007 г. крымінальная справа супраць Дзяніса Дзянісава і Тацяны Елавой была спыненая з-за адсутнасьці складу крымінальнага злачынства.

GLEB DOGIL

Gleb Dogil jest jednym z czworga młodych ludzi oskarżonych o aktywny udział w dużym, opozycyjnym „Marszu Wolności", który odbył się 17 października 1999 r. w Mińsku. W czasie marszu doszło do starć demonstrantów z milicją i wojskami wewnętrznymi. Apogeum wydarzeń miało miejsce w parku im. M. Gorkiego i na terytorium wokół niego, kiedy podczas prób zablokowania i pacyfikacji marszu, jego uczestnicy stawili opór. Czterech działaczy oskarżono o rzucanie kamieniami w stronę funkcjonariuszy.

W chwili aresztowania Gleb Dogil miał 20 lat i był studentem 4. roku historii na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym.

KRONIKA REPRESJI

Gleb Dogil został zatrzymany wraz z Hermanem Suszkiewiczem (jego kuzynem) i Andriejem Balabujewem niedaleko stacji metra „Plac Zwycięstwa" (Ploszczad Pobiedy). Całą trójkę przewieziono na posterunek milicji, skąd Dogil został przeniesiony do aresztu tymczasowego. Tam spędził 3 dni i przeniesiono go do aresztu śledczego na Wołodarce. 27 października przedstawiono mu zarzuty z artykułu 186.3 KK RB i wyznaczono środek zapobiegawczy – areszt, który później zmieniono na zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Groziło mu od 1 roku do 5 lat pozbawienia wolności.

Niedługo potem Dogil, tak jak jego koledzy oskarżeni w tej samej sprawie, został uchodźcą politycznym i otrzymał azyl polityczny w Polsce.

Proces w sprawie Dogila i innych uczestników „Marszu Wolności 99" rozpoczął się 12 grudnia 2001 r. i, zdaniem przedstawicieli opozycji, jego celem było zastraszenie młodzieży przed organizacją w Mińsku akcji „Marsz wolności 2". 2 stycznia 2002 r. miński sąd uznał Dogila winnym zarzucanych mu czynów i wymierzył mu karę grzywny w wysokości 50 płac minimalnych.

ГЛЕБ ДОГІЛЬ

Глеб Догіль – асуджаны за ўдзел у «Маршы Свабоды», вялікага апазыцыйнага шэсьця ў Менску 17 кастрычніка 1999 г. У той дзень у розных месцах маршруту шэсьця адбыліся сутычкі зь міліцыяй і часткамі ўнутраных войскаў. Апагеем падзеяў стаў выпадак у парку імя Горкага і тэрыторыі каля яго, калі пры спробе разгону шэсьця яго ўдзельнікі аказалі супраціў. Чацьвёра юнакоў былі абвінавачаныя ў кіданьні камянёў у ахоўнікаў правапарадку.

На момант арышту Глеб Догіль быў 20-гадовым студэнтам гістарычнага факультэту БДУ.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Глеба затрымалі разам зь Германам Сушкевічам і Андрэем Валабуевым у пераходзе станцыі метро «Плошча Перамогі». Усіх трох даставілі ў Савецкі РАУС, адкуль Г. Догіль быў спачатку перавезены ў ізалятар часовага ўтрыманьня, пасьля ў СІЗА на вуліцы Валадарскага.

Абвінавачаньне было прад'яўленае 27 кастрычніка (арт. 186.3 КК РБ) і абвешчаная мера стрыманьня – знаходжаньне пад арыштам, зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе. Глебу Догілю пагражала ад 1 да 5 гадоў зьняволеньня. Неўзабаве малады чалавек атрымаў палітычны прытулак у Польшчы, дзе паступіў ва ўнівэрсытэт. Суд над Глебам і іншымі ўдзельнікамі «Маршу Свабоды-1999» пачаўся толькі 12 сьнежня 2001 г. і быў скіраваны на запалохваньне моладзі напярэдадні акцыі «Марш Свабоды-2».

2 студзеня 2002 г. Менскі гарадзкі суд прызнаў Глеба Догіля вінаватым ва ўчыненьні хуліганства і аштрафаваў на суму, роўную 50 тагачасным мінімальным заробкам.

DZMITRIJ DORONIN

Dzmitrij Doronin jest mieszkańcem Mińska. Urodził się 19 kwietnia 1982 r. Ukończył szkołę zawodową, interesował się informatyką. Pracował jako ślusarz w mińskim zakładzie samochodowym. Wychowywał się w wielodzietnej rodzinie, w której było ośmioro dzieci (połowa z nich w latach 2010–2011 była małoletnia). Ojciec Dzmitrija miał pierwszą grupę inwalidzką, w związku z czym Dzmitrij był jednym z głównych żywicieli rodziny i pomagał matce w wychowywaniu rodzeństwa. Nie zajmował się polityką, nie miał na to czasu.

KRONIKA REPRESJI

Dzmitrij Doronin został zatrzymany 14 marca 2011 r., w miejscu pracy. Umieszczono go w areszcie śledczym na Okrestinie w Mińsku. 22 marca 2011 r. przedstawiono mu zarzuty z artykułu 293 KK – „Masowe zamieszki". Wtedy przeniesiono go do mińskiego aresztu śledczego na Wołodarce. 12 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 3,5 roku pozbawienia wolności w kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. Wyrok odbywał w kolonii karnej „Witba-3" niedaleko Witebska. Kiedy wyrok nabrał mocy prawnej, Doronina zwolniono z zakładu, w którym pracował. 1 września 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Aleksandra Łukaszenki.

ЗЬМІЦЕР ДАРОНІН

Жыхар Менску. Нарадзіўся 19 красавіка 1982 г. Скончыў ПТВ, захапляўся кампутарамі. Да арышту працаваў сьлесарам на МАЗе. Гадаваўся ў шматдзетнай сям'і, у якой васьмёра дзяцей, палова зь якіх у 2010–2011 гг. былі малалетнімі. Паколькі бацька зьяўляецца інвалідам першай групы, Зьміцер быў адным з асноўных кармільцаў у сям'і і дапамагаў маці гадаваць малодшых дзяцей. Палітыкай ён зусім не займаўся – на яе нават не было часу.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Зьміцер Даронін быў затрыманы 14 сакавіка 2011 г. проста на працы і зьмешчаны пад варту ў ізалятар часовага ўтрыманьня ў завулку Акрэсьціна ў Менску. 22 сакавіка 2011 г. яму прад'яўленае абвінавачаньне па арт. 293 Крымінальнага кодэксу (масавыя беспарадкі). Тады ж малады чалавек быў пераведзены ў менскі СІЗА, вядомы як «Валадарка».

12 траўня 2011 г. у судзе Маскоўскага раёну Менску Зьміцер быў асуджаны на 3,5 гады зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываў тэрмін у папраўчай установе «Віцьба-3» каля Віцебску. Пасьля ўступленьня прысуду ў законную сілу быў зволнены з заводу, на якім працаваў.

1 верасьня 2011 г. памілаваны дзеючым кіраўніком дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам і вызвалены.

CIMAFIEJ DRANCZUK



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Cimafiej Dranczuk to lider niezarejestrowanego Białoruskiego Komitetu Obrony Praw Więźniów „Ponad Barierą". Urodził się 5 sierpnia 1981 r. w Zasławiu, w obwodzie mińskim. W latach 1996–1997 uczył się w Białoruskim Liceum Humanistycznym (Narodowe Liceum im. Jakuba Kołasy). W 1998 r. eksternistycznie ukończył Szkołę Średnią nr 33, a w 1999 r. został studentem Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego, skąd został relegowany za aktywną działalność polityczną.

Od 1996 do 2000 r. pracował w gazecie „Puszcza Białowieska". Jednocześnie w latach 1997–1998 pracował jako rzecznik prasowy Miejskiego Związku Zawodowego Przedsiębiorców „Społeczność" pod kierownictwem Arnolda Pieczerskiego. Od 2000 r. brał aktywny udział w działalności organizacji „Młody Front". Był redaktorem „Młodzieżowego dziennika" („Mołodiożnyj wiestnik") – niezarejestrowanego biuletynu „Młodego Frontu". W 1999 r. brał aktywny udział w organizowanych przez demokratyczną opozycję alternatywnych wyborach prezydenta Białorusi, był rzecznikiem prasowym Michaiła Czigira.

W latach 2000–2001 Dranczuk był przewodniczącym młodzieżowej organizacji „Młodzieżowa solidarność", a w latach 2001–2004 koordynował pracę opozycyjnego ruchu „Żubr".

W 2004 r. Dranczuk został aktywnym działaczem nowo utworzonego ruchu Andreja Klimowa, był jednym z organizatorów akcji „Rewolucja!" 25 marca 2005 r. Współpracował z inicjatywą obywatelską „Partnerstwo".

W 2005 roku Cimafiej Dranczuk rozpoczął naukę na Europejskim Uniwersytecie Humanistycznym (który przez białoruskie władze został zlikwidowany w Mińsku i otwarty w Wilnie) na Wydziale Prawa Międzynarodowego.

KRONIKA REPRESJI

21 lutego 2006 r. Dranczuka wraz z kolegami aresztowano za działalność inicjatywy „Partnerstwo". Wraz z nim aresztowani zostali Mikoła Astrejka, Enira Bronicka i Aleksander Szałajko. Wszyscy zostali umieszczeni w areszcie śledczym KGB, gdzie przedstawiono im zarzuty z artykułu 193, pkt 2 KK RB. 4 sierpnia 2006 r. Dranczuk został skazany na rok pozbawienia wolności. Kiedy przebywał w więzieniu, urodził mu się syn, ale mógł go zobaczyć dopiero po roku. Proces był niejawny. Na salę wpuszczono tylko uczestników procesu, najbliższą rodzinę i zagranicznych ambasadorów.

26 grudnia 2006 r. warunkowo zwolniono go z Kolonii nr 1 w Mińsku. 22 maja 2007 r., razem z byłym więźniem politycznym Dzmitrijem Kaspierowiczem i innymi działaczami społecznymi, ogłosił założenie komitetu „Ponad Barierą". 28 września 2008 r. Cimafiej Dranczuk razem z Arturem Finkiewiczem i Dzmitrijem Kaspierowiczem ogłosił założenie ruchu młodzieżowego „Młoda Białoruś".

ЦІМОХ ДРАНЧУК

Лідэр незарэгістраванага Беларускага камітэту ў абарону правоў зьняволеных «Над Бар'ерам». Нарадзіўся 5 жніўня 1981 году ў г. Заслаўе Менскай вобласьці.

У 1996–1997 гадах вучыўся ў Беларускім гуманітарным ліцэі (Нацыянальным ліцэі імя Якуба Коласа). У 1998 годзе экстэрнам скончыў сярэднюю школу № 33, а ў 1999 годзе стаў студэнтам факультэту журналістыкі БДУ, адкуль быў выключаны ў 2001 годзе за актыўную палітычную дзейнасьць.

З 1996 да 2000 году Цімох Дранчук займаўся камунікатыўным забесьпячэньнем газэты «Белавежская пушча», паралельна ў 1997–1998 гадах працаваў прэсавым сакратаром гарадзкога прафсаюзу прадпрымальнікаў «Садружнасьць» пад кіраўніцтвам Арнольда Пячэрскага, а таксама да 2000 году прымаў актыўны ўдзел у дзейнасьці «Маладога Фронту». Быў рэдактарам незарэгістраванага бюлетэню «Маладога Фронту» «Маладзёвы весьнік».

У 1999 годзе прымаў актыўны ўдзел у арганізаваных дэмакратычнай апазыцыяй альтэрнатыўных выбарах прэзыдэнта Беларусі, быў прэсавым сакратаром Міхаіла Чыгіра.

У 2000–2001 гадах Дранчук зьяўляўся старшынём моладзевай арганізацыі «Маладзёжная салідарнасьць», а з 2001 да 2004 году каардынаваў працу руху супраціву «Зубр» – быў адным з каардынатараў руху па горадзе Менску.

З 2004 году Цімох Дранчук стаў актыўным удзельнікам новастворанага Руху Андрэя Клімава, быў адным з арганізатараў акцыі «Рэвалюцыя!» 25 сакавіка 2005 году. Супрацоўнічаў з грамадзянскай ініцыятывай «Партнэрства».

У 2005 годзе Цімох паступіў у Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт, ліквідаваны беларускімі ўладамі ў Менску і адкрыты ў Вільні, на факультэт міжнароднага права.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

21 лютага 2006 году быў арыштаваны разам з калегамі па дзейнасьці ГІ «Партнэрства» Мікалаем Астрэйкам, Энірай Браніцкай і Аляксандрам Шалайкам і зьмешчаны ў сьледчы ізалятар КДБ. Дранчуку, Астрэйку, Браніцкай і Шалайку было прад'яўленае абвінавачваньне па артыкуле 193 ч. 2 КК РБ.

Арганізацыяй «Міжнародная амністыя» абвешчаны вязьнем сумленьня. Падчас зьняволеньня ў яго нарадзіўся сын Платон, якога ён не мог убачыць амаль год.

4 жніўня 2006 г. асуджаны Цэнтральным судом Менску на 1 год пазбаўленьня волі. Судовы працэс быў закрытым. У залю прапусьцілі толькі ўдзельнікаў працэсу, бліжэйшых сваякоў і замежных амбасадараў.

26 сьнежня 2006 году быў вызвалены ўмоўна-датэрмінова з калёніі № 1 г. Менску.

22 траўня 2007 году сумесна з былым палітзьняволеным Зьмітром Касьпяровічам і іншымі грамадзкімі актывістамі абвясьціў аб стварэньні БКАПЗ «Над Бар'ерам».

28 верасьня 2008 году Цімох Дранчук сумесна з Артурам Фінькевічам і Зьмітром Касьпяровічам абвясьцілі аб стварэньні шырокага моладзевага руху «Маладая Беларусь» «з мэтай аб'яднаць усе дзейсныя моладзевыя структуры і арганізацыі Беларусі дзеля перамогі дэмакратычнага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах 2011 году».

DZMITRIJ DROZD

Dzmitrij Drozd urodził się 26 marca 1973 r. we wsi Drozdy, która w 1976 r. stała się częścią Mińska. W 1992 r. ukończył mińskie technikum technologiczne o specjalności fototechnika, a w 2005 r. – historię na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym (specjalność „Muzealnictwo i ochrona dziedzictwa kulturalnego i historycznego"). Pracował jako fotograf, pasjonował się nauką, badał archiwa. W 2010 r. wydano jego pracę „Właściciele ziemscy guberni mińskiej. 1861–1900". Pracował nad kolejną książką, poświęconą historii fotografii i losom fotografów XX wieku. Chociaż nie zajmował się polityką, podczas kampanii wyborczej w 2010 r. został członkiem sztabu Andreja Sannikaua.

KRONIKA REPRESJI

Za udział w „Płoszczy 2010" Drozd został skazany na 10 dni aresztu. Po uwolnieniu, został aresztowany po raz kolejny: 1 lutego 2011 r. aresztowano go na 3 dni jako podejrzanego w sprawie z artykułu 293, pkt 2 KK. Przedstawiono mu zarzut udziału w masowych zamieszkach. Był przetrzymywany w areszcie śledczym na Wołodarce. 5 maja 2011 r. skazano go na 3 lata pozbawienia wolności. Wyrok odbywał w kolonii karnej w Bobrujsku. Drozd został ułaskawiony 11 sierpnia 2011 na mocy dekretu Łukaszenki.

ЗЬМІЦЕР ДРОЗД

Нарадзіўся 26 сакавіка 1973 году ў вёсцы Дразды (у 1976 г. увайшла ў склад гораду Менску), дзе на працягу стагодзьдзя жылі яго продкі. У 1992 г. скончыў Менскі тэхналягічны тэхнікум па спэцыяльнасьці «Фотатэхніка», у 2005 г. – гістарычны факультэт БДУ (спэцыяльнасьць – «Музэйная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»).

Працаваў фатографам, захапляўся навукай, дасьледаваў архівы. У 2010 годзе выйшла яго вялікая праца – кніга «Землеўладальнікі Менскай губерні. 1861–1900». Працаваў над другой кнігай, прысьвечанай гісторыі фатаграфіі і лёсам фатографаў XX стагодзьдзя. Хоць палітыкай і не займаўся, у часе выбарчай кампаніі 2010 г. стаў сябрам ініцыятыўнай групы Андрэя Саньнікава.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

За ўдзел у Плошчы-2010 Зьміцер быў асуджаны і адбыў 10-суткавы арышт. Пасьля вызваленьня зноў арыштаваны: 1 лютага 2011 г. быў узяты пад варту на 3 сутак як падазраваны па ч. 2 арт. 293 КК. Яму было прад'яўлена абвінавачаньне ва ўдзеле ў масавых беспарадках.

Утрымліваўся ў СІЗА № 1 г. Менску на вул. Валадарскага.

5 траўня 2011 г. асуджаны на 3 гады зьняволеньня, якое адбываў у калёніі ў г. Бабруйску.

Вызвалены 11 жніўня 2011 г. пасьля памілаваньня кіраўніком дзяржавы.

ANDREJ DRYHAJLA

Andrej Dryhajla to obywatel Ukrainy. Uczył się w technikum handlowym. 26 kwietnia 1996 r. brał udział w „Czarnobylskim Szlaku" w Mińsku.

KRONIKA REPRESJI

Andrej Dryhajla został aresztowany podczas pacyfikacji przez białoruskie władze „Czarnobylskiego Szlaku 96". Podczas akcji wielokrotnie dochodziło do starć między uczestnikami demonstracji a funkcjonariuszami milicji. Do rozprawy był przetrzymywany w areszcie na Wołodarce. Pod koniec sierpnia 1996 r. sędzia Grigorij Korzyckij skazał Dryhajla na 1,5 roku pozbawienia wolności w kolonii karnej. Uwolniono go na mocy amnestii 24 grudnia 1996 r. Wielką rolę odegrała tutaj ukraińska dyplomacja. Nie zdążono nawet przewieźć Dryhajla z aresztu do kolonii – wieczorem, przed katolickim Bożym Narodzeniem, wraz z ukraińskim deputowanym Iljasewiczem i czwórką innych ukraińskich więźniów politycznych Dryhajla opuścił Białoruś.

АНДРЭЙ ДРЫГАЙЛА

Грамадзянін Украіны. Вучыўся ў гандлёвым тэхнікуме. 26 красавіка 1996 году браў удзел у масавым шматтысячным «Чарнобыльскім Шляху» ў Менску разам з іншымі ўкраінцамі. Фігурант «справы УНСО».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Андрэй Дрыгайла быў арыштаваны падчас разгону «Чарнобыльскага Шляху-96» беларускімі ўладамі. Акцыя праходзіла са шматлікімі сутычкамі ўдзельнікаў з супрацоўнікамі праваахоўных органаў.

Да суду ўтрымліваўся ў менскім СІЗА (на вул. Валадарскага).

Напрыканцы жніўня 1996 году судзьдзём Менскага гарадзкога суду Рыгорам Казарыцкім пры ўдзеле дзяржабвінаваўцы Сяргея Целяжэвіча быў асуджаны на 1 год і 6 месяцаў калёніі агульнага рэжыму.

Вызвалены паводле амністыі 24 сьнежня 1996 г., у чым адыграла вялікую ролю ўкраінская дыпляматыя. У калёнію Андрэя з «валадаркі» перавесьці так і не пасьпелі – з украінскай амбасады ўвечары перад каталіцкімі Калядамі разам з народным дэпутатам Ілясевічам і чатырма іншымі вызваленымі ўкраінскімі палітвязьнямі ён пакінуў Беларусь.

ARTIOM DUBSKI



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Artiom Dubski to działacz „Młodego Frontu" z miejscowości Osipowicze. W styczniu 2008 r. został aresztowany na 15 dni za udział w akcji przedsiębiorców, która 10 stycznia odbyła się w centrum Mińska.

KRONIKA REPRESJI

Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w grupowych działaniach w poważny sposób naruszających porządek społeczny".

22 kwietnia sędzia Centralnego Sądu Rejonowego w Mińsku, Jeliena Ilina, uznała Artioma Dubskiego winnym zarzucanego mu czynu i wydała wyrok 2 lat pozbawienia wolności bez skierowania go do zakładu poprawczego. W październiku 2008 r. Artiom Dubski wyjechał na Ukrainę, gdyż pojawiło się zagrożenie wszczęcia przeciwko niemu nowej sprawy karnej. Otrzymał wówczas 3 ostrzeżenia w sprawie naruszenia reżimu odbywania kary.

Jednak po 4 miesiącach Dubski wrócił do ojczyzny, by wziąć udział w ulicznej akcji z okazji dnia Świętego Walentego. 13 lutego zatrzymano go w pociągu do Homla, a stamtąd został przeniesiony do aresztu śledczego. W międzyczasie została wszczęta przeciwko niemu sprawa karna z artykułu 216, pkt 1 KK RB – „Uszkodzenie mienia" za to, że rzekomo korzystał z cudzej karty SIM i wyrządził szkodę firmie Velcom. W czasie procesu, 3 marca, odbyło się pojednanie stron, sprawa zakończyła się dla Dubskiego karą grzywny. Mimo tych okoliczności, działacz pozostał w areszcie – przedstawiono mu nowe zarzuty z artykułu 415 KK RB – „Uchylanie się od odbywania kary w postaci ograniczenia wolności".

Późnym wieczorem 15 kwietnia Artiom Dubski został zwolniony z aresztu śledczego w Bobrujsku, otrzymał jednak zakaz opuszczania miejsca zamieszkania.

7 lipca 2009 r. sąd w Osipowiczach skazał działacza młodzieżowego, Artioma Dubskiego, na rok pozbawienia wolności w kolonii karnej. Zaraz po ogłoszeniu wyroku Dubski został umieszczony w areszcie śledczym. Karę odbywał w Kolonii Karnej nr 19 w Mohylewie. 25 maja 2010 r. wyszedł na wolność. Po „Płoszczy 2010", 21 grudnia, Artiom Dubski został zatrzymany w Mińsku. W ten sposób starano się nie dopuścić do tego, by działacz wziął udział w akcji solidarności z zatrzymanymi 19 grudnia podczas pacyfikacji demonstracji na Placu Niepodległości.

АРЦЁМ ДУБСКІ

Арцём Дубскі – актывіст «Маладога Фронту» з Асіповічаў. У студзені 2008 году быў арыштаваны на 15 сутак за ўдзел у акцыі прадпрымальнікаў, якая прайшла ў цэнтры Менску 10 студзеня.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Арцёму было прад'яўленае абвінавачаньне па па ч. 1 арт. 342 КК РБ – «арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак».

22 красавіка судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Алена Ільіна прызнала моладзевага актывіста Арцёма Дубскага вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак) і вынесла пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі тэрмінам на два гады без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.

У кастрычніку 2008 году Арцём Дубскі зьехаў ва Украіну ў выніку пагрозы ўзбуджэньня ў дачыненьні да яго новай крымінальнай справы, бо на той момант яму былі вынесены 3 папярэджаньні за парушэньне рэжыму адбыцьця пакараньня. Аднак праз 4 месяцы нечакана для іншых Арцём вяртаецца на радзіму, каб прыняць удзел ў вулічнай акцыі на Дзень Сьвятога Валянціна. 13 лютага 2009 г. ён быў зьняты зь цягніка ў Гомелі, а адтуль адпраўлены ў сьледчы ізалятар. Новая крымінальная справа была ўзбуджаная паводле арт. 216 ч. 1 КК РБ (нанясеньне маёмаснай шкоды без прыкметаў крадзяжу) за нібыта карыстаньне чужой сімкартай і нанясеньне стратаў кампаніі Velcom. Падчас судовага працэсу з сакавіка адбылося прымірэньне бакоў, справа завяршылася для Арцёма штрафам. Нягледзячы на гэтыя абставіны, актывіста пакінулі за кратамі, абвінавацiўшы ўжо па арт. 415 КК РБ (ухіленьне ад адбыцьця пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі).

Позна ўвечары 15 красавіка Арцёма Дубскага вызвалілі з Бабруйскага сьледчага ізалятару пад падпіску аб нявыезьдзе – да новага суду.

7 ліпеня 2009 г. суд Асіповіцкага раёну прысудзіў моладзевага актывіста Арцёма Дубскага да году пазбаўленьня волі ў папраўчай калёніі агульнага рэжыму. Адразу пасьля абвяшчэньня прысуду Арцём быў узяты пад варту і зьмешчаны ў СІЗА.

Адбываў пакараньне ў калёніі №19 г. Магілёва. 25 траўня 2010 г. выйшаў на волю.

Пасьля Плошчы-2010, 21 сьнежня 2010 г., Арцёма затрымалі ў Менску, каб ня даць яму ўзяць удзел у акцыі салідарнасьці з затрыманымі 19 сьнежня падчас брутальнага разгону акцыі на плошчы Незалежнасьці.

MIKOŁA DZIADOK



FOT. MIKALAY DZIADOK

Mikoła Dziadok urodził się 23 sierpnia 1988 r. w mieście Bragine na Homelszczyźnie. Ukończył prawo w college'u Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Pracował w firmie windykacyjnej. W chwili zatrzymania był studentem drugiego roku politologii i badań europejskich na Europejskim Uniwersytecie Humanistycznym w trybie zaocznym. Po zatrzymaniu we wrześniu 2010 r. Mykołę Dziadoka trzymano 3 dni w areszcie, po czym kolejny raz zatrzymano, oskarżając go o inne czyny – chuligaństwo, a nawet kradzież. Oficjalne oskarżenie przedstawiono mu dopiero w październiku.

KRONIKA REPRESJI

Mikoła Dziadok został zatrzymany 3 września 2010 r. pod zarzutem ataku na ambasadę Rosji w nocy z 30 na 31 sierpnia 2010 r. Aresztowano go na 3 dni, a nie zebrawszy odpowiedniej ilości dowodów, które potwierdziły by udział Dziadoka w tej sprawie, wydłużono mu czas pobytu w areszcie, oskarżając o inne czyny (napaść na Dom Związków Zawodowych). Tutaj też nie znaleziono podstaw dla takiego oskarżenia, więc po raz trzeci zatrzymano go jako podejrzanego w sprawie o „napad na oddział Bielarusbanku".

Po tym, jak wykorzystane zostały już wszystkie możliwości przedstawienia mu różnych powodów zatrzymania, władze zaczęły przypisywać Dziadokowi inne czyny niezgodne z prawem, w szczególności kradzież i chuligaństwo.

24 stycznia 2010 roku, po odbyciu 20-dniowego aresztu, Mikoła Dziadok został oskarżony o udział w akcji przed budynkiem Sztabu Generalnego Białorusi, a 1 października oficjalnie przedstawiono mu oskarżenie z artykułu 339, pkt 2 – „Chuligaństwo".

27 maja 2011 r. w Zawodskim Sądzie Rejonowym w Mińsku sędzia Żanna Hwojnickaja wydała wyrok – Dziadok został skazany na 4,5 roku pozbawienia wolności (jest to tzw. „sprawa anarchistów"). Do tego czasu Dziadok ponad 8 miesięcy przebywał w areszcie.

Obecnie Dziadok odbywa karę w Kolonii nr 17 w Mohylewie.

Pod koniec maja 2012 r. decyzją naczelnika Kolonii nr 7 w Szkłowie Dziadok został przeniesiony na pół roku do izolatki. Niejednokrotnie zmuszano go do podpisania prośby o ułaskawienie. Pozbawiono go możliwości dłuższego widzenia z matką i żoną, wbrew zgodzie na te widzenia wydanej w czerwcu. Podczas pobytu w koloniach w Szkłowie i Bobrujsku Mikoła Dziadok otrzymał ponad 10 nagan z rozmaitych wymyślonych powodów. Władze chciały mu w ten sposób nadać status „więźnia złośliwie naruszającego reżim kolonii", by nie podlegał amnestii.

МІКАЛАЙ ДЗЯДОК

Мікалай Дзядок нарадзіўся 23 жніўня 1988 году ў г. Брагіне на Гомельшчыне. Пасьля школы скончыў юрыдычны каледж БДУ. Працаваў у калектарскай фірме. На момант арышту быў студэнтам 2-га курсу завочнага аддзяленьня праграмы «Паліталёгія і эўрапейскія дасьледаваньні» Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Пасьля затрыманьня ў верасьні 2010 году Мікалая трымалі ў ізалятары па 3 дні, а пасьля «перазатрымлівалі» па новых справах: аб хуліганстве, нават крадзяжы – але абвінавачаньне не прад'яўлялі да кастрычніка.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Мікалай Дзядок быў затрыманы 3 верасьня 2010 году ў якасьці падазраванага па справе аб «нападзе на амбасаду Расейскай Фэдэрацыі» у ноч на 31 жніўня ў Менску. Праваахоўныя органы Беларусі арыштавалі маладога чалавека на трое сутак і зьмясьцілі ў ізалятар часовага ўтрыманьня.

Не сабраўшы дастатковай колькасьці доказаў, якія б пацьвярджалі дачыненьне Мікалая да вышэйназванай справы, праваахоўныя органы працягнулі тэрмін яго ўтрыманьня ў ізалятары часовага ўтрыманьня, але гэтым разам па абсалютна іншай справе («аб нападзе на Дом прафсаюзаў»).

Аднак калі абвінавачаньне ў яго дачыненьні ізноў не набыло належнай падставы, Мікалай ужо трэцім разам быў затрыманы як падазроны па справе «аб нападзе на аддзяленьне «Беларусбанку».

Пасьля таго, як усе магчымасьці да прад'яўленьня ўцямных нагодаў да затрыманьняў былі вычарпаныя, Мікалаю сталі прыпісваць іншыя супрацьпраўныя дзеяньні, у прыватнасьці, крадзяжы і хуліганства.

24 верасьня 2010 г., фактычна адбыўшы больш за 20 сутак пад арыштам, Мікалай Дзядок быў абвінавачаны ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі каля Генштабу Беларусі, і 1 кастрычніка яму было прад'яўленае абвінавачаньне па артыкуле 339 ч. 2 – «хуліганства».

27 траўня 2011 г. у Заводзкім судзе гораду Менску судзьдзя Жанна Хвайніцкая вынесла Мікалаю прысуд – 4,5 гады пазбаўленьня волі (г.зв. «справа анархістаў»). Да гэтага моманту Мікалай Дзядок ужо больш за 8 месяцаў знаходзіўся пад арыштам.

Зараз адбывае пакараньне ў Магілёўскай калёніі № 17.

У канцы траўня 2012 г. паводле рашэньня начальніка Шклоўскай калёніі № 7 Мікалай Дзядок быў пераведзены ў памяшканьне камэрнага тыпу, так званы «БУР» («адзіночку»), на паўгода. Да гэтага яго неаднаразова прымушалі пісаць прашэньні аб памілаваньні. Мікалай таксама пазбаўлены доўгатэрміновага спатканьня з маці і жонкай, якое раней было дазволенае ў чэрвені. За час знаходжаньня ў Бабруйскай і Шклоўскай калёніях Мікалай атрымаў больш за 10 спагнаньняў за розныя надуманыя парушэньні, кшталту «няправільна адрэагаваў на заўвагу», і ня змог трапіць пад амністыю.

4 сьнежня 2012 г. стала вядома, што адмысловая камісыя калёніі прыняла рашэньне аб пераводзе Мікалая Дзядка ў крытую турму. Прычынай абвешчаныя шматлікія спагнаньні за парушэньне дысцыпліны, якіх палітвязьню прад'яўлена ажно 22.

ANDREJ DZMITRYJEU



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Andrej Dzmitryjeu urodził się 12 maja 1981 r. w Mińsku. Uczył się na Europejskim Uniwersytecie Humanistycznym, na wydziale filozofii. W latach 2000–2001 służył w wojsku. Od 2001 r. jest członkiem Zjednoczonej Partii Obywatelskiej.

Począwszy od 1999 roku, brał udział we wszystkich kampaniach wyborczych, zaczynając jako wolontariusz i dochodząc do stanowiska szefa sztabu wyborczego.

W latach 2005–2009 prowadził własny biznes, był dyrektorem firmy konsultingowej. Sam zdecydował o jej zamknięciu, by uniknąć niepotrzebnych starć z władzą (wtedy już planował pracę w sztabie wyborczym Uladzimira Niaklajeua).

KRONIKA REPRESJI

Za działalność polityczną był wielokrotnie zatrzymywany przez milicję. W 2007 r. aresztowano go. 18 maja 2010 r. wraz z innymi aktywistami został zatrzymany w czasie kampanii obywatelskiej „Mów prawdę" w chwili, gdy władza starała się ją rozproszyć.

W czasie wyborów w 2010 r. kierował sztabem wyborczym kandydata na prezydenta, Uladzimira Niaklajeua. Został zatrzymany w nocy z 19 na 20 grudnia 2010 r. po masowej akcji protestów w centrum Mińska. Został oskarżony na podstawie artykułu 293 KK – „Masowe zamieszki". 3 maja 2011 r. został zwolniony za kaucją z aresztu śledczego KGB. 30 marca 2011 jego oskarżenie zostało sformułowane na podstawie pkt 1 art. 342 KK – „Organizacja lub udział w działalności naruszającej porządek publiczny". 20 maja 2011 r. powiatowy sąd w Mińsku, okręg Frunze, skazał Dzmitryjeua na karę 2 lat pozbawienia wolności w zawieszeniu.

АНДРЭЙ ДЗЬМІТРЫЕЎ

Нарадзіўся 12 траўня 1981 г. у Менску. Вучыўся ў ЭГУ на факультэце філязофіі. У 2000–2001 гг. служыў у войску. З 2001 г. – сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

Пачынаючы з 1999 г., браў удзел ва ўсіх выбарчых кампаніях на розных узроўнях, ад валянтэра да кіраўніка выбарчага штабу.

У 2005–2009 гг. зьяўляўся дырэктарам кансалтынгавай кампаніі, але вырашыў закрыць яе, каб ня мець непрыемнасьцяў з уладамі – на той момант Андрэй зьбіраўся ўдзельнічаць у прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі і працаваць у штабе Ўладзімера Някляева.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

За палітычную дзейнасьць затрымліваўся міліцыяй, адбываў адміністратыўны арышт у 2007 г. Быў затрыманы сярод іншых актывістаў і 18 траўня 2010 г. калі ўлады спрабавалі разагнаць грамадзянскую кампанію «Гавары праўду!», у якой Андрэй браў удзел.

Падчас выбараў 2010 г. кіраваў штабам кандыдата ў прэзыдэнты Ўл. Някляева. Быў затрыманы ў ноч з 19 на 20 сьнежня 2010 г. пасьля масавай акцыі пратэсту ў цэнтры Менску. Абвінавачаны па арт. 293 КК РБ – «масавыя беспарадкі».

3 студзеня 2011 г. быў выпушчаны зь СІЗА КДБ пад падпіску аб нявыезьдзе. 30 сакавіка ягонае абвінавачваньне было перафармуляванае на ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя дзеяньняў, што груба парушаюць гарамадзкі парадак, ці ўдзел у іх).

20 траўня 2011 г. судом Фрунзенскага раёну Менску асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі ўмоўна.



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

ALEH FEDARKIEWICZ

Aleh Fedarkiewicz urodził się w 1961 roku. Ma wykształcenie średnie, jest budowlańcem. Pracował w jednym z przedsiębiorstw budowlanych w swoim rodzinnym mieście. W latach 90. był przez pewien czas członkiem Białoruskiego Frontu Ludowego.

KRONIKA REPRESJI

Brał udział w akcjach protestu w Mińsku 19 grudnia 2010 r. Podczas brutalnej pacyfikacji pokojowej demonstracji został zatrzymany i umieszczony w Areszcie Śledczym nr 1 w Mińsku przy ulicy Wołodarskiej. Oskarżono go o udział w masowych zamieszkach. 12 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 3,5 roku pozbawienia wolności w kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. Karę odbywał w Kolonii Karnej nr 19 w Mohylewie. 14 września 2011 r. został uwolniony na mocy amnestii.

АЛЕГ ФЕДАРКЕВІЧ

Нарадзіўся ў 1961 годзе. Жыхар Менску. Мае сярэднюю адукацыю, па прафэсіі будаўнік. Працаваў на адным з будаўнічых прадпрыемстваў роднага гораду. У 1990-я гады некаторы час быў сябрам БНФ.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Браў удзел у акцыі пратэсту ў Менску 19 сьнежня 2010 г. Быў затрыманы падчас жорсткага разгону мірнай акцыі і зьмешчаны пад варту ў сьледчы ізялатар № 1 Менску па вул. Валадарскага. Абвінавачаны ва ўдзеле ў масавых беспарадках.

12 траўня 2011 г. ў Маскоўскім судзе Менску асуджаны да 3,5 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываў пакараньне ў папраўчай калёніі № 19 г. Магілёву.

14 верасьня 2011 году вызвалены пасьля ўказу аб памілаваньні, падпісанага дзеючым кіраўніком дзяржавы.

ALEKSANDER FIEDUTA



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Białoruski komentator polityczny, analityk, publicysta i krytyk literacki urodził się 3 listopada 1964 r. w Grodnie.

Ukończył studia na Wydziale Filologii Rosyjskiej Uniwersytetu Państwowego im. Janki Kupały w Grodnie (1986). W latach 1986–1991 pracował jako nauczyciel języka rosyjskiego i literatury rosyjskiej w Szkole nr 20 w Grodnie. W 1991 r. zdecydował się pracować w Komsomole, był sekretarzem Komitetu Centralnego Komunistycznej Ligi Młodych Leninowskich Studentów, pierwszym sekretarzem Białoruskiego Związku Młodzieży. Był członkiem KPZR (1991), Republikańskiej Partii Pracy i Sprawiedliwości (1993), Białoruskiego Stowarzyszenia „Jabloko" (1997), a od 2000 r. członkiem jego Rady Politycznej. Lubi literaturę, teatr, kino. Jest żonaty.

Był bardzo aktywny w czasie prezydenckiej kampanii wyborczej Aleksandra Łukaszenki (1994). Po jego zwycięstwie w wyborach został mianowany (lipiec 1994) szefem wydziału społecznego, politycznego, informacyjnego administracji prezydenta. W grudniu 1994 r. wziął na siebie odpowiedzialność za pojawienie się w gazetach „białych plam", które ukazywały cenzurę polityczną na Białorusi.

Pracował w redakcjach głównych gazet opozycji: od marca 1995 r. – w „Belaruskaja delowaja gazeta" i „Imja", od 2000 r. – w gazecie „Narodowa Wola". Od czerwca 1998 r. był korespondentem gazety „Moskowskie nowosti" na Białorusi. Jeden z wybitnych białoruskich obserwatorów politycznych i analityków. Od 1999 jest prezesem organizacji pozarządowej „Technologie społeczne".

KRONIKA REPRESJI

Podczas wyborów prezydenckich w 2010 r. pracował w sztabie wyborczym kandydata na prezydenta Uladzimira Niaklajeua. 20 grudnia 2010 r. został aresztowany w swoim mieszkaniu i umieszczony w więzieniu KGB. Pod koniec grudnia oskarżono go o udział w masowych zamieszkach. Podstawą tego oskarżenia był art. 293 KK.

8 kwietnia 2011 r. został zwolniony za kaucją, a 20 maja skazany na karę dwóch lat pozbawienia wolności w zawieszeniu.

АЛЯКСАНДАР ФЯДУТА

Нарадзіўся 3 лістапада 1964 г. у Гародні. Беларускі палітычны аглядальнік і аналітык, літаратуразнаўца.

Скончыў расейскае аддзяленьне філялягічнага факультэту Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы (1986 г.). У 1986–1991 гг. працаваў настаўнікам расейскай мовы і літаратуры ў гарадзенскай школе № 20. У 1991 перайшоў на камсамольскую работу, быў сакратаром ЦК ЛКСМБ па пытаньнях студэнцкай моладзі, першым сакратаром ЦК Саюзу моладзі Беларусі. Кандыдат філялягічных навук (1997 г.), тэма дысэртацыі: «Читатель в творческом сознании А.С. Пушкина». Быў сябрам КПСС (1991 г.), Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасьці (1993 г.). Сябра Беларускага аб'яднаньня «Яблоко» (з 1997 г.), сябра яго палітсавету (з 2000 г.). Захапляецца літаратурай, тэатрам, кіно, гульнёй ў нарды. Жанаты.

Быў актывістам прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі А.Р. Лукашэнкі (1994 г.). Пасьля перамогі А. Лукашэнкі на выбарах быў прызначаны (у ліпені 1994 г.) начальнікам упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта. У сьнежні 1994 г. узяў на сябе адказнасьць за зьяўленьне ў газэтах «белых плямаў», якія сьведчылі пра ўвядзеньне ў Беларусі палітычнай цэнзуры, і сыйшоў у адстаўку.

Працаваў у асноўных апазыцыйных выданьнях: з сакавіка 1995 году – у «Белорусской деловой газете» і газэце «Имя», з 2000 г. – у газэце «Народная воля». З чэрвеня 1998 году – уласны карэспандэнт газэты «Московские новости» ў Беларусі. Адзін зь вядомых беларускіх палітычных аглядальнікаў і аналітыкаў. Спэцыялізуецца ў жанры палітычнага партрэту. Шырокі рэзананс атрымалі яго цыклы «Личное дело» (газета «Имя») і «Политбюро» («Белорусская деловая газета»). Сустаршыня Грамадзкага навукова-аналітычнага Цэнтру «Беларуская пэрспэктыва» (1995–1998 гг.). З 1999 году – прэзыдэнт грамадзкага аб'яднаньня «Сацыяльныя тэхналёгіі».

Ляўрэат прэміі камсамолу Гарадзеншчыны за пэдагагічную дзейнасьць (1989 г.). Узнагароджаны «Знакам Гайдара» з фармулёўкай «за верность детям» (1991 г.).

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У часе прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. працаваў у штабе кандыдата на прэзыдэнта Ўладзімера Някляева. Быў арыштаваны 20 сьнежня 2010 г. ва ўласнай кватэры і зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Пры канцы сьнежня яму прад'яўленае абвінавачаньне па крымінальнай справе, узбуджанай сьледчым упраўленьнем папярэдняга рассьледаваньня ГУУС Менгарвыканкаму па чч. 1 і 2 арт. 293 КК (масавыя беспарадкі). 30 сакавіка 2011 г. абвінавачваньне перафармуляванае на ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя дзеяньняў, што груба парушаюць гарамадзкі парадак, ці ўдзел у іх). 8 красавіка 2011 г. адпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе.

20 траўня 2011 г. судом Фрунзенскага раёну Менску асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі ўмоўна.

ARTUR FINKIEWICZ


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Artur Finkiewicz urodził się 8 lutego 1985 r. w Mińsku. Ukończył mińską Państwową Szkołę Techniczną nr 38, rozpoczął studia w Instytucie Parlamentaryzmu i Przedsiębiorczości. Uczył się tam tylko 2 lata, dlatego że nie udało mu się w terminie zdać sesji, gdyż odbywał areszt administracyjny na Okrestinie. Przed aresztowaniem marzył o tym, by studiować filologię białoruską na uniwersytecie w Wilnie. Od 2001 r. działał w „Młodym Froncie", w latach 2002–2004 kierował regionalną filią tej organizacji. Z powodu różnicy zdań z szefostwem organizacji porzucił „Młody Front" i został liderem organizacji „Młoda Białoruś".

KRONIKA REPRESJI

8 grudnia 2005 r., dzień przez wyborami prezydenckimi, Artur Finkiewicz został aresztowany za graffiti o treści politycznej. Do procesu był przetrzymywany na Wołodarce.

10 maja 2006 r. sąd w Mińsku skazał Artura Finkiewicza na 2 lata ograniczenia wolności. Wyrok odbywał w mohylewskiej komendanturze nr 43.

26 października 2007 r. przeciwko Finkiewiczowi wszczęto nową sprawę karną z artykułu 415 KK – „Uchylanie się od odbywania kary w postaci ograniczenia wolności". Przeniesiono go do zamkniętego więzienia nr 4 w Mohylewie. Finkiewiczowi zarzucano systematyczne naruszanie porządku odbywania kary, administracja komendantury dała mu 5 nagan. Finkiewicz skarżył się na presję i groźby ze strony administracji. 21 grudnia sąd w Mohylewie uznał Finkiewicza winnym, sędzia Natalia Kraszkina skazała go na rok i 6 miesięcy pozbawienia wolności w kolonii karnej.

5 lutego 2008 r. kolegium mohylewksiego sądu podjęło decyzję o jego uwolnieniu.

АРТУР ФІНЬКЕВІЧ

Артур Фінькевіч нарадзіўся ў Менску 8 лютага 1985 г. Скончыў менскую ПТВ № 38, вучыўся ў Міжнародным Гуманітарна-Эканамічным Інстытуце, але праз два гады быў выключаны. Зараз студэнт Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту па спэцыяльнасьці «Паліталёгія. Эўрапейскія дасьледваньні». Выпускнік «Усходнеэўрапейскай школы палітычных дасьледваньняў».

З 2001 па 2008 гг. быў сябрам «Маладога фронту», а таксама намесьнікам старшыні. У 2003–2005 гг. быў каардынатарам аргкамітэту па стварэньні незалежнага прафсаюзу студэнтаў (БПСНА), у 2004 г. быў каардынатарам штабу перадвыбарчага блёку «Маладая Беларусь». Зь верасьня 2008 г. – заснавальнік і лідэр руху «Маладая Беларусь». Вылучаўся кандыдатам ў дэпутаты на Мясцовых выбарах 2010 г. і Парлямэнцкіх выбарах 2012 г.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

31 студзеня 2006. Артура Фінькевіча арыштавалі за графіці палітычнага зьместу напярэдадні выбараў прэзыдэнта РБ. Да суду яго ўтрымлівалі ў сьледчым ізалятары на вул. Валадарскага ў Менску.

10 траўня 2006 г. Першамайскі суд Менску прызначыў Артуру Фінькевічу пакараньне – два гады абмежаваньня волі. Адбываў пакараньне ў магілёўскай спэцкамэндатуры № 43.

26 кастрычніка 2007 г. на Артура Фінькевіча завялі крымінальную справу па арт. 415 КК – «ухіленьне ад адбыцьця пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі». Яго самога перавялі ў магілёўскую сьледчую турму № 4. Маладзеваму актывісту інкрымінаваліся сыстэматычныя парушэньні рэжыму ўтрыманьня ў спэцкамэндатуры, у сувязі з чым адміністрацыяй установы на яго было накладзена пяць дысцыплінарных спагнаньняў. Пры гэтым Артур Фінькевіч неаднаразова скардзіўся на пагрозы і ціск, які аказваўся на яго з боку адміністрацыі спэцкамэндатуры. 21 сьнежня суд Кастрычніцкага раёну Магілёву прызнаў Артура Фінькевіча вінаватым, судзьдзя Наталя Крашкіна прысудзіла яго да 1 году і 6 месяцаў пазбаўленьня волі ў калёніі агульнага рэжыму.

5 лютага 2008 г. калегія Магілёўскага абласнога суду пастанавіла яго вызваліць.

ALEKSANDER FRANCKIEWICZ

Aleksander Franckiewicz urodził się 6 maja 1990 r. w Nowopołocku na Witebszczyźnie. Po ukończeniu liceum pracował jako programista. Później wyjechał do Mińska, gdzie rozpoczął pracę. Interesował się historią partii politycznych. W swoim mieście przyłączył się do ruchu antyfaszystowskiego. W stolicy poznał się z anarchistami, ich poglądy stały się dla niego bliskie i zaczął im pomagać.


FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

KRONIKA REPRESJI

20 września 2010 r. Aleksandrowi Franckiewiczowi przedstawiono zarzuty z artykułu 339, pkt 2 kk. Oskarżono go o to, że nagrywał wideo z ataku na budynek milicji w Soligorsku. 14 lutego przedstawiono mu nowe zarzuty i oskarżono o atak na siedzibę związków zawodowych oraz napad w Soligorsku (art. 218, pkt 3 oraz 339, pkt 2 kk). Szkoda została wyceniona na 1 mln 900 tyś. rubli białoruskich.

Był przetrzymywany w areszcie śledczym na Wołodarce. Mimo jego problemów ze zdrowiem – ma jedną nerkę – nie został zwolniony przed procesem, nie zmieniono mu środka zapobiegawczego. Warto zauważyć, że podczas śledztwa jego adwokat, Paweł Sapiełka, został pozbawiony licencji za to, że aktywnie bronił więźniów politycznych po 19 grudnia 2010 r.

24 maja 2011 r. Aleksander Franckiewicz został skazany na 3 lata pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Wyrok odbywał w Kolonii nr 22 w Iwacewiczach (obwód brzeski).

Wolność odzyskał 3 września 2013 r.

АЛЯКСАНДАР ФРАНЦКЕВІЧ

Аляксандар Францкевіч нарадзіўся 6 траўня 1990 г. у Наваполацку. Пасьля сканчэньня ліцэю працаваў праграмістам. Пазьней пераехаў жыць і працаваць у Менск. Цікавіўся гісторыяй палітычных партыяў. У родным горадзе далучыўся да антыфашыстоўскага руху, у сталіцы пасябраваў з анархістамі, погляды якіх былі яму блізкія, і стаў дапамагаць ім. Знаходзіўся пад вартай з 3 верасьня 2010 году.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

20 верасьня Аляксандру Францкевічу прад'явілі абвінавачаньне па ч. 2 арт. 339 КК РБ, ён здымаў на відэа напад на апорны пункт міліцыі ў Салігорску (будынак належыць ДУПП «ЖКГ «Комплекс»). 14 лютага яму прад'явілі новае абвінавачаньне, паводле якога яго вінавацілі ў салігорскім нападзе і нападзе на прафсаюзы па ч. 3 арт. 218 і па ч. 2 арт. 339 КК РБ, а таксама ў акцыі пад Генштабам па ч. 2 арт. 339 КК РБ. Матэрыяльная шкода гэтых дзеяньняў была ацэненая ў 1 мільён 900 тысячаў бел. рублёў.

У чаканьні суду ўтрымліваўся ў менскім СІЗА на вул. Валадарскага. Нягледзячы на праблемы са здароўем, ня быў вызвалены да суду. Варта адзначыць, што падчас сьледства ягоны адвакат Павал Сапелка быў пазбаўлены ліцэнзіі за актыўную абарону палітычных вязьняў пасьля падзеяў 19 сьнежня 2010 году.

24 траўня 2011 году Аляксандар Францкевіч быў асуджаны Заводзкім судом Менску на 3 гады пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму.

Адбываў прысуд у калёніі № 22 каля г. Івацэвічы «Ваўчыныя норы».

Вызвалены 3 верасьня 2013 году.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

IWAN GAPONOW

Iwan Gaponow urodził się 27 kwietnia 1988 r. w Soczi. Będąc obywatelem Rosji, miał pozwolenie na pobyt na Białorusi, mieszkał tam od 1995 roku. Ukończył szkołę na Białorusi, dobrze zna język białoruski. Matka Gaponowa, Sabira Atakiszijewa, pochodzi z Kirgistanu, a ojciec jest Rosjaninem. Gaponow studiował na uniwersytecie w Odessie. Pasjonuje się literaturą, próbował własnych sił w tworzeniu utworów literackich. Przed zatrzymaniem pracował w pracowni ceramicznej w klasztorze św. Elżbiety (Свято-Елизаветинский монастырь) na obrzeżach Mińska. Współpracownicy Gaponowa z pracowni ceramiki oraz siostry zakonne podczas procesu bardzo wspierali jego rodzinę.

KRONIKA REPRESJI

Zatrzymano go 19 grudnia 2010 r. za udział w akcji protestu i skazano go na 10 dni aresztu. Gaponow został uwolniony 29 grudnia wraz z innymi obywatelami Rosji. Jednak po godzinie od powrotu do domu został aresztowany ponownie – tym razem jako oskarżony w sprawie karnej. 5 stycznia 2011 r. przedstawiono mu zarzuty udziału w masowych zamieszkach. Przetrzymywano go w Areszcie Śledczym nr 1 na Wołodarce. 10 marca 2011 r. Moskiewski Sąd Rejonowy Mińska skazał Iwana (wraz z innym obywatelem Rosji, Artiomem Breusem) na karę grzywny w wysokości 300 płac minimalnych (10,5 miliona białoruskich rubli, prawie 3 tysiące dolarów).

ІВАН ГАПОНАЎ

Нарадзіўся 27 красавіка 1988 году ў Сочы. Грамадзянін Расеі, мае від на жыхарства ў Беларусі і жыве тут з 1995 году (на момант падзеяў – у пасёлку Сьвіслач Пухавіцкага раёну Магілёўскай вобласьці). Скончыў школу ў Беларусі, добра валодае беларускай мовай. Маці Сабіра Атакішыева родам з Кіргізіі, а бацька – з Расеі. Вучыўся ў Адэскім унівэрсытэце. Захапляецца літаратурай, спрабуе свае сілы ў напісаньні твораў. Перад арыштам працаваў у керамічнай майстэрні ў Сьвята-Елізавецінскім манастыры на ўскраіне Менску. Супрацоўнікі майстэрні і матушкі манастыра ў час судовага працэсу выказалі сям'і сваю падтрымку.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 19 сьнежня 2010 г. і за ўдзел у акцыі пратэсту асуджаны на 10-суткавы арышт. Вызвалены 29 сьнежня разам зь іншымі расейцамі, якраз калі тэрмін арышту скончыўся. Але праз гадзіну пасьля вяртаньня дахаты быў арыштаваны дома ізноў – цяпер ужо як фігурант крымінальнай справы. Абвінавачаньне ва ўдзеле ў масавых беспарадках было прад'яўленае Івану 5 студзеня 2011 г. Ён утрымліваўся пад вартай у СІЗА № 1 на вул. Валадарскага ў Менску.

10 сакавіка 2011 г. у Маскоўскім райсудзе Менску разам зь іншым грамадзянінам Расеі Арцёмам Брэўсам быў пакараны штрафам у 300 базавых велічынь (10,5 мільёнаў беларускіх рублёў – амаль 3 тысячы даляраў).

ANDREJ GILIEWICZ

Andrej Giliewicz urodził się w 1980 roku. Po ukończeniu szkoły średniej rozpoczął studia na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym Informatyki i Radioelektroniki. 28 lutego 1998 r. Andrej Giliewicz wraz ze swoimi przyjaciółmi, Alesiem Muchinem i Pawłem Muraszką, wracając z koncertu białoruskiej grupy rockowej „NRM", napisali na murach domów i płotach przy ulicy Orłowskiej hasło „Żywie Biełarus" (Niech żyje Białoruś), „Wolność dla więźniów politycznych" oraz hasło dotyczące białoruskiego prezydenta – „Łuku na muku" (Łukę «Łukaszenkę» na mąkę). Obok haseł narysowali narodowe biało-czerwono-białe flagi.

KRONIKA REPRESJI

Wszystkich trzech studentów zatrzymał milicyjny patrol zaraz po wykonaniu graffiti i doprowadził na posterunek milicji, gdzie do rana odbywały się przesłuchania. Wszczęto sprawę karną z trzech artykułów KK RB: 201, pkt 2 – „Złośliwe chuligaństwo", 96 – „Uszkodzenie mienia" i 205 – „Wciągnięcie osób niepełnoletnich do działań przestępczych" (Paweł Muraszka miał wtedy 17 lat, Andrej Giliewicz i Aleś Muchin – po 18).

8 maja 1998 r. sąd w Mińsku rozpatrzył sprawę i uznał całą trójkę winną zarzucanych im czynów. Andrej Giliewicz został skazany na rok pozbawienia wolności w zawieszeniu. Jeszcze podczas śledztwa, 23 marca 1998 r., Giliewicz został relegowany z uniwersytetu. Oficjalną przyczyną było „naruszenie norm zachowania w miejscach publicznych".

АНДРЭЙ ГІЛЕВІЧ

Андрэй Гілевіч нарадзіўся ў 1980 годзе. Пасьля школы паступіў у БДУІР.

28 лютага 1998 г. Андрэй разам са сваімі сябрамі, Алесем Мухіным і Паўлам Мурашкам, вяртаючыся з канцэрту беларускага рок-гурта «NRM», напісалі ў Менску па вуліцы Арлоўскай на сьценах дамоў і на агароджах лёзунгі «Жыве Беларусь», «Луку на муку», «Свабоду палітвязьням!». Побач з надпісамі намалявалі нацыянальныя бел-чырвона-белыя сьцягі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Усе тры студэнты адразу ж пасьля нанясеньня графіці былі затрыманыя міліцэйскім патрулём. Хлопцаў даставілі ў РАУС Цэнтральнага раёну г. Менску, дзе да раніцы ішлі допыты.

Была заведзеная крымінальная справа паводле трох артыкулаў Крымінальнага Кодэксу РБ: 201, ч. 2 (злоснае хуліганства), арт. 96 (нанясеньне страты маёмасьці) і арт. 205 (прыцягненьне непаўналетніх да злачынных дзеяньняў), (Паўлу Мурашку на той момант было 17 гадоў, Андрэю Гілевічу і Алесю Мухіну – па 18).

8 траўня 1998 г. суд Цэнтральнага раёну г. Менску разгледзеў справу і прызнаў усіх трох вінаватымі. Андрэй Гілевіч быў асуджаны на 1 год пазбаўленьня волі ўмоўна з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на 1 год.

Андрэя Гілевіча яшчэ падчас сьледзтва – 23 сакавіка 1998 г. – выключылі зь Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі. Афіцыйна прычынай выключэньня называлася «парушэньне нормаў паводзінаў у грамадзкіх месцах».



FOT. JULIA DARASHKEVICH

OLEG GNIEDCZYK

Oleg Gniedczyk urodził się 22 listopada 1986 r. Był działaczem „Młodego Frontu". W związku z aktywną działalnością w tej organizacji był w latach 2003–2005 kilkakrotnie zatrzymywany przez funkcjonariuszy milicji i skazywany na areszty administracyjne. Podczas wyborów prezydenckich 2010 roku pracował w sztabie kandydata na prezydenta Białorusi, Uladzimira Niaklajeua.

KRONIKA REPRESJI

W lipcu 2003 roku, gdy Oleg Gniedczyk był jeszcze niepełnoletni, zatrzymano go za rozpowszechnianie materiałów informacyjnych „Młodego Frontu" w Mińsku, został pobity, i od 2:00 do 19:00 był przetrzymywany na posterunku milicji. W związku z tym zdarzeniem, rodzice Gniedczyka zwrócili się do prokuratury z żądaniem ukarania winnych milicjantów.

W 2006 r. skazano go na 12 dni aresztu za udział w powyborczej akcji w miasteczku namiotowym na Placu Październikowym w Mińsku.

6 stycznia 2011 r. Gniedczyk został zatrzymany jako podejrzany o udział w masowych zamieszkach. Do 9 stycznia (3 dni) przebywał w areszcie, po czym wypuszczono go z zakazem opuszczania miejsca zamieszkania.

25 marca Gniedczykowi zmieniono środek zapobiegawczy po tym, jak przedstawiono mu oficjalne zarzuty udziału w masowych zamieszkach. Do rozprawy przebywał w areszcie śledczym na Wołodarce. 14 maja 2011 r. miński sąd skazał go na 3,5 roku kolonii o zaostrzonym rygorze. Wyrok odbywał w Kolonii nr 17 we wsi Młodzieżnyj rejonu szkłowskiego, w obwodzie mohylewskim. Gniedczyk spędził tam 3 dni w karcerze, rzekomo za to, że się nie ogolił. Z jego relacji wynika, że po tym, jak w lipcu 2011 r. szkłowską kolonię odwiedził prezydent, administracja kolonii zaczęła zaczepiać go i organizować prowokacje.

Ułaskawiono go 2 września 2011 r. na mocy dekretu Łukaszenki.

АЛЕГ ГНЕДЧЫК

Нарадзіўся 22 лістапада 1986 году. Быў актывістам «Маладога Фронту».

У 2003–2005 гг. за сваю палітычную актыўнасьць як сябра «Маладога Фронту» затрымліваўся праваахоўнымі органамі і караўся адміністратыўнымі арыштамі.

Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. працаваў у штабе кандыдата ў прэзыдэнты Беларусі Ўладзімера Някляева.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У ліпені 2003 г. яшчэ непаўнагадовым хлапчуком Алег быў затрыманы за распаўсюд інфармацыйных матэрыялаў «Маладога Фронту» у Менску, зьбіты і з 2:00 да 19:00 знаходзіўся ў аддзяленьні міліцыі Савецкага раёну. Пасьля гэтага выпадку бацькі хлопца зьвярталіся ў пракуратуру з патрабаваньнем пакараць вінаватых міліцыянтаў.

У 2006 г. быў асуджаны на 12 сутак арышту за ўдзел у намётавым гарадку – пасьлявыбарчай акцыі пратэсту на Кастрычніцкай плошчы Менску.

Па крымінальнай справе Алег Гнедчык быў затрыманы 6 студзеня 2011 г. як падазраваны ва ўдзеле ў масавых беспарадках. Да 9 студзеня (трое сутак) знаходзіўся пад вартай і быў адпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе. Але 25 сакавіка 2011 г. мера стрыманьня была зьмененая – пасьля таго, як Алегу прад'явілі абвінавачваньне ва ўдзеле ў масавых беспарадках. Знаходзіўся пад вартай у менскім СІЗА № 1 па вул. Валадарскага.

14 траўня 2011 г. у Партызанскім раённым судзе Менску быў асуджаны на 3,5 гады зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму.

Адбываў пакараньне ў калёніі № 17 у пасёлку Маладзёжны Шклоўскага раёну Магілёўскай вобласьці. Там палітвязень правёў трое сутак у штрафным ізалятары нібыта за тое, што быў непаголены. Кажа, што пасьля наведваньня ў ліпені 2011 г. Шклова кіраўніком дзяржавы пачаліся прыдзіркі і правакацыі з боку наглядчыкаў.

Памілаваны Лукашэнкам і вызвалены 2 верасьня 2011 г.

WIACZESŁAW GOCZ

Obywatel Ukrainy, Wiaczesław Gocz, oskarżony został w sprawie UNA-UNSO (Ukraińskie Zgromadzenie Narodowe – Ukraińska Samoobrona Narodowa).

KRONIKA REPRESJI

Aresztowano go 26 kwietnia 1996 r. w Mińsku, podczas pacyfikacji akcji „Czarnobylski Szlak". Przetrzymywano go w areszcie na Wołodarce. Pod koniec sierpnia 1996 r. został skazany na rok kolonii karnej. Wyrok wydał sędzia Grigorij Kozorickij, prokuratorem był Siergiej Teleżewicz.

Ani Gocz, ani czterech innych obywateli Ukrainy nie dotarło do kolonii karnej – w grudniu 1996 roku, przed katolickim Bożym Narodzeniem objęła ich amnestia. Uwolnionych Ukraińców do ojczyzny sprowadził deputowany Rady Najwyższej. W więzieniu pozostało (do 1997 roku) jeszcze dwóch obywateli Ukrainy: Andrej Szeptycki i Siergiej Potapow.

ВЯЧАСЛАЎ ГОЧ

Грамадзянін Украіны, фігурант «справы УНА-УНСО» 1996 году.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Арыштаваны падчас разгону акцыі «Чарнобыльскі Шлях» 26 красавіка 1996 г. у Менску. Утрымліваўся ў менскім СІЗА па вул. Валадарскага.

Асуджаны ў канцы жніўня 1996 г. Менскім гарадзкім судом на 1 год пазбаўленьня волі ў калёніі агульнага рэжыму.

У часе судовага працэсу некаторыя сьведкі зь ліку супрацоўнікаў МУС называлі падсудных «асобы ўкраінскай нацыянальнасьці». Прысуд вынес судзьдзя Рыгор Казарыцкі, пракурор – Сяргей Целяжэвіч.

Пераводу ў калёнію для Вячаслава Гоча і яшчэ чатырох украінскіх палітвязьняў так і не адбылося – напярэдадні каталіцкіх Каляд у сьнежні 1996 г. яны былі вызваленыя паводле амністыі. У іх ліку апынуўся і Слава Гоч. Вызваленых суайчыньнікаў забраў на Радзіму дэпутат Вярхоўнай Рады. За кратамі засталіся (да ліпеня 1997 г.) толькі двое ўкраінскіх асуджаных: Андрэй Шапціцкі і Сяргей Патапаў.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

BORYS GORIECKI

Białoruski niezależny dziennikarz i działacz społeczny, Borys Goriecki, urodził się 13 września 1987 r. w Mińsku. Ukończył Szkołę Średnią nr 121. Studiował na Politechnice na Wydziale Mikroelektroniki. Za udział w akcji protestu przed wyborami 2006 r. został relegowany z uczelni. Później studiował na Uniwersytecie w Białymstoku (UwB) na Wydziale Informatyki (2006 r.) i na Wileńskim Uniwersytecie Pedagogicznym (2007 r.).

Od 2000 r. był członkiem Partyzanckiej Rejonowej Rady Młodzieżowego Ruchu „Młody Front", od lutego 2002 r. – członkiem rady „Młodego Frontu" i sekretarzem organizacji „Białoruś – do Europy!", od 2004 r. – sekretarzem rady „Młodego Frontu" oraz przewodniczącym oddziału techniczno-administracyjnego. Od stycznia 2005 r. pełnił obowiązki rzecznika prasowego „Młodego Frontu" i przewodniczącego działu informacji. Aktywnie uczestniczył w wyborach w 2006 r. – był członkiem sztabu Aleksandra Milinkiewicza. Od lutego 2007 r. był koordynatorem „Show Belarushchyny". Od września 2007 r. jest dziennikarzem białostockiego Radia Racja.

Wielokrotnie był zatrzymywany za organizację akcji i mityngów oraz udział w nich. Kilka razy skazano go na areszt administracyjny.

KRONIKA REPRESJI

Po kampanii wyborczej w 2006 r. przeciwko Borysowi Gorieckiemu i innym liderom „Młodego Frontu" – Dzmitrijowi Daszkiewiczowi, Siergiejowi Lisiczence i Olegowi Korbanowi – wszczęto sprawę karną z artykułu 193.1 – „Działalność w imieniu organizacji niezarejestrowanej przez Ministerstwo Sprawiedliwości". Do sądu jednak przekazano jedynie sprawę Dzmitrija Daszkiewicza. Latem 2006 r. Goriecki wziął udział w programie stypendialnym im. Konstantego Kalinowskiego. Początkowo studiował w Białymstoku, ale po kilku miesiącach zrezygnował z nauki i wyjechał na Białoruś. W marcu 2007 r. Goriecki ponownie został oskarżony o udział w działalności niezarejestrowanej organizacji „Młody Front". 29 maja 2008 r. skazano go na karę grzywny w wysokości 30 płac minimalnych z artykułu 193.1 KK RB.

БАРЫС ГАРЭЦКІ

Беларускі незалежны журналіст і грамадзкі актывіст. Нарадзіўся 13 верасьня 1987 г. у Менску. Скончыў сярэднюю школу № 121. Навучаўся ў Дзяржаўным палітэхнічным каледжы на факультэце мікраэлектронікі. Адлічаны напярэдадні выбараў 2006 г. за ўдзел у акцыі пратэсту. Навучаўся ў Беластоцкім ўнівэрсытэце на факультэце інфарматыкі (2006 г.), у Віленскім пэдагагічным унівэрсытэце (з 2007 г.).

Ад восені 2000 году – сябра Партызанскай раённай рады моладзевага руху «Малады Фронт», ад лютага 2002 г. – сябра Ўправы «Маладога Фронту», сакратар па кампаніі «Беларусь – у Эўропу!», ад 2004 г. – адказны сакратар Управы «Маладога Фронту», старшыня арганізацыйна-тэхнічнага аддзелу. Ад студзеня 2005 г. – прэс-сакратар «Маладога Фронту», кіраўнік інфармацыйнага аддзелу.

Актыўна браў удзел у выбарах 2006 году – быў сябрам ініцыятыўнай групы А. Мілінкевіча. Зь лютага 2007 г. – каардынатар кампаніі «Шоў Беларушчыны».

Зь верасьня 2007 г. – журналіст радыёстанцыі «Радыё Рацыя» (Беласток).

Шмат разоў затрымліваўся за праваздзеньне і ўдзел у апазыцыйных акцыях і мітынгах. Некалькі разоў быў прысуджаны да адміністратыўнага арышту.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Пасьля прэзыдэнцкай кампаніі 2006 году на Барыса Гарэцкага, як і іншых лідэраў «МФ» – Зьмітра Дашкевіча, Сержука Лісічонка і Алега Корбана, – была заведзеная крымінальная справа па артыкуле 193.1 (дзейнасьць незарэгістраванай Мін'юстам арганізацыі). Але тады ў суд была перададзеная справа на аднаго Зьмітра Дашкевіча.

Летам 2006 году патрапіў на Стыпэндыяльную праграму імя Кастуся Каліноўскага. Спачатку вучыўся ў Беластоку, але пасьля некалькіх месяцаў адмовіўся ад вучобы і зьехаў у Беларусь.

У сакавіку 2007 Барыс Гарэцкі зноў стаў абвінавачаным па справе аб удзеле ў дзейнасьці незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Малады Фронт».

29 траўня 2008 г. паводле арт. 193.1 КК РБ прысуджаны да штрафу ў памеры 30 базавых велічыняў.

NADIEŻDA GRECZUCHA

Nadieżda Greczucha jest działaczką opozycji z Borysowa w obwodzie mińskim.

KRONIKA REPRESJI

Po raz pierwszy Greczucha była sądzona w sprawie motywowanej politycznie jeszcze jako 17-letnia uczennica.

14 lutego 2000 r. miński sąd uznał ją winną przestępstwa z artykułu 186.2 KK RB – „Znieważenie symboli państwowych".

21 lipca 1999 r. podczas akcji opozycji, organizowanej w związku z zakończeniem 5-letniej kadencji prezydenta Łukaszenki na Placu Październikowym w Mińsku, Greczucha spaliła materiał czerwono-zielonego koloru. Milicjanci sfilmowali to zdarzenie, a mińska prokuratura wszczęła w tej sprawie postępowanie. Podczas procesu Greczucha oświadczyła, że spalona została tkanina czerwono-zielonego koloru, symbolizująca tyranię w kraju.

Nadieżda Greczucha podczas rozprawy nie wyparła się swoich poglądów i przekonań. Sędzia skazał ją na karę grzywny w wysokości 22 tysięcy rubli (około 15 dolarów).

16 stycznia 2001 r. działaczka „Młodej Hramady", Nadieżda Greczucha, razem z innymi aktywistami wzięła udział w pikiecie na głównym Placu Borysowa, żądając niezwłocznego przeprowadzenia ekspertyzy medycznej i zbadania zdrowia psychicznego Aleksandra Łukaszenki.

Zatrzymano wszystkich jej uczestników. Początkowo na posterunku milicji sporządzono tylko protokoły o naruszenie prawa administracyjnego z artykułu 167.1, pkt 2 KA RB – „Naruszenie porządku organizacji i przeprowadzenia masowych imprez". Jednak w sądzie materiały sprawy administracyjnej skierowano do dodatkowego rozpatrzenia, w wyniku czego wszczęto sprawę karną z artykułu 368 nowego KK RB – „Publiczne znieważenie prezydenta Republiki Białoruś". Zgodnie z artykułem 368 KK RB za publiczne znieważenie prezydenta Białorusi grozi kara grzywny, do 2 lat robót przymusowych lub do 6 miesięcy aresztu, bądź ograniczenie czy też pozbawienie wolności do 2 lat. Na Białorusi był to pierwszy przypadek pociągnięcia do odpowiedzialności karnej na podstawie tego artykułu, wprowadzonego zaledwie dwa tygodnie wcześniej.

10 maja 2001 r. sprawa przeciwko Nadieżdzie Greczusze i dwóm innym mieszkańcom Borysowa – Alesiowi Abramowiczowi i Alesi Jasiuk – została zamknięta z powodu braku znamion przestępstwa. Za udział w pikiecie sądzono ich potem jedynie na podstawie Kodeksu Administracyjnego.

НАДЗЕЯ ГРАЧУХА

Надзея Грачуха – актывістка апазыцыі з г. Барысаву Менскай вобласьці.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Першы раз была асуджаная па палітычнай крымінальнай справе яшчэ 17-гадовай школьніцай.

14 лютага 2000 г. ў будынку Менскага гарадзкога суду яна была прызнаная вінаватай па арт. 186.2 КК РБ (зьнявага дзяржаўных сымбаляў).

21 ліпеня 1999 г. падчас акцыі апазыцыі, прымеркаванай да заканчэньня легітымнага пяцігадовага тэрміну прэзыдэнцтва А. Лукашэнкі, на Кастрычніцкай плошчы г. Менску Надзея Грачуха спаліла тканіну чырвона-зялёнага колеру. Гэтае спаленьне міліцыянты зьнялі на відэа. Паводле факту спаленьня Менскай гарадзкой пракуратурай і была ўзбуджаная крымінальная справа. На працэсе і адвакат, і сама Надзея Грачуха заявілі, што была спаленая тканіна чырвона-зялёнага колеру, якая сымбалізавала тыранію ў краіне. Надзея Грачуха трымалася на судзе годна і ад сваіх перакананьняў і дзеяньняў не адмовілася. Судзьдзя вынесла прысуд – штраф у 22 мільёны рублёў (прыблізна 15 даляраў ЗША).

16 студзеня 2001 г. актывістка «Маладой Грамады» Надзея Грачуха разам са сваімі землякамі выйшла на цэнтральную плошчу г. Барысаву на пікет з патрабаваньнямі неадкладнай мэдычнай экспэртызы стану псыхічнага здароўя Аляксандра Лукашэнкі. Акцыя была несанкцыянаванай, усе яе ўдзельнікі былі затрыманыя. Спачатку ў аддзяленьні міліцыі на іх былі складзеныя пратаколы адміністратыўнага правапарушэньня па арт. 167.1 ч. 2 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі ці правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Але ў судзе матэрыялы адміністратыўнай справы былі накіраваныя ў пракуратуру на дадатковае дасьледаваньне, у выніку чаго ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 368 новага Крымінальнага кодэксу РБ: «Зьнявага прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь». Згодна з арт. 368 КК РБ, публічная зьнявага прэзыдэнта РБ караецца штрафам ці папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, ці арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў, ці абмежаваньнем волі на тэрмін да двух гадоў, ці пазбаўленьнем волі на той жа тэрмін. Гэта быў першы прэцэдэнт у краіне прыцягненьня грамадзян да адказнасьці па гэтым уведзеным 2 тыдні перад гэтым артыкуле.

10 траўня 2001 г. справа супраць Надзеі Грачухі і яшчэ двух жыхароў Барысава – Алеся Абрамовіча і Алесі Ясюк – была спыненая за адсутнасьцю складу злачынства. За пікет іх судзілі пазьней, чым за адміністратыўнае правапарушэньне.

ARTIOM GRIBKOW


FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

Artiom Gribkow urodził się 6 stycznia 1989 r. we wsi Sawoszi w obwodzie grodzieńskim. Ukończył szkołę podstawową, gdzie uczył się dobrze i pisał humorystyczne wiersze i scenariusze na szkolne uroczystości. Potem uczył się w mińskim Kolegium Przemysłu Lekkiego, ale zawsze czuł skłonności do przedstawień teatralnych, literatury i sztuki. Po powrocie do domu ukończył jeszcze szkołę budowlaną w Koreliczach. Ponieważ w regionie, w którym mieszkał trudno było znaleźć pracę, wyjechał do Mińska. Pracował jako operator koparki i walca. Pomagał swoim bliskim i rodzicom, którzy pozostali na wsi i wychowywali jego młodszą siostrę.

KRONIKA REPRESJI

19 grudnia 2010 r. Gribkow poszedł po pracy na Plac Niepodległości i przyłączył się do demonstrantów. Zatrzymano go w pobliżu dworca kolejowego. Spędził 10 dni w areszcie za udział w akcji protestu. 12 stycznia 2011 r. został znowu zatrzymany i oskarżony o udział w masowych zamieszkach. Był przetrzymywany w areszcie śledczym na Wołodarce. 26 maja 2011 r. miński sąd skazał go na 4 lata pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Karę odbywał w kolonii w Bobrujsku. 11 sierpnia 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Łukaszenki.

13 grudnia 2012 zginął w wypadku samochodowym.

АРЦЁМ ГРЫБКОЎ

Нарадзіўся 6 студзеня 1989 году ў вёсцы Савашы Карэліцкага раёну Гарадзенскай вобласьці. Скончыў базавую Палужскую школу, добра вучыўся, пісаў гумарыстычныя вершы і сцэнары для школьных сьвятаў (цікавіўся іх правядзеньнем, нават калі ўжо скончыў навучаньне). Вучыўся таксама ў менскім каледжы лёгкай прамысловасьці, але заўсёды яго цягнула да тэатральных пастановак, літаратуры і мастацтва. Вярнуўся дахаты і скончыў будаўнічую СПТВ у Карэлічах. Паколькі ў райцэнтры было цяжка ўладкавацца на працу, зьехаў у Менск. Працаваў грузчыкам і прэсоўшчыкам. Дапамагаў сваім родным, якія засталіся на малой радзіме, гадаваць яго маленькую сястру.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

19 сьнежня 2010 г. пасьля працы аказаўся ў раёне менскай Плошчы Незалежнасьці і далучыўся да мітынгоўцаў. Быў затрыманы каля чыгуначнага вакзалу, адбыў 10 сутак адміністратыўнага арышту за ўдзел у акцыі пратэсту. 12 студзеня 2011 г. быў затрыманы ізноў і абвінавачаны ва ўдзеле ў масавых беспарадках. Знаходзіўся пад вартай у СІЗА № 1 на вул. Валадарскага ў Менску.

26 траўня 2011 году асуджаны ў Ленінскім судзе Менску на 4 гады пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываў прызначаны судом тэрмін у калёніі г. Бабруйску.

11 жніўня 2011 г. памілаваны ўказам кіраўніка дзяржавы і вызвалены.

13 сьнежня 2012 году загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Пахаваны ў Карэлічах.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

JAROSŁAW GRYSZCZENIA

Jarosław Gryszczenia to działacz młodzieżowy z miasta Baranowicze, w obwodzie brzeskim. Za udział w akcjach opozycji był kilkakrotnie zatrzymywany i skazywany na areszty administracyjne. Był uczestnikiem protestów na Placu Konstantego Kalinowskiego[6] w Mińsku po wyborach prezydenckich 2006 r.

KRONIKA REPRESJI

Oskarżano go o dopuszczenie się przestępstwa z artykułu 193.1 KK RB – „Organizacja działalności stowarzyszenia, fundacji lub organizacji religijnej, która nie przeszła rejestracji państwowej, lub udział w niej".

Zgodnie z postanowieniem o wszczęciu sprawy karnej, które wydał prokurator miasta Baranowicze, A.P. Smal, „niepełnoletni Gryszczenia po oświadczeniu o dobrowolnym zaprzestaniu udziału w działalności organizacji młodzieżowej «Młody Front», która nie przeszła rejestracji państwowej w ustanowionym porządku, jakie 20 kwietnia 2007 r. złożył na posterunku milicji w Baranowiczach, faktycznie kontynuował udział w działalności tej niezarejestrowanej organizacji podczas «Czarnobylskiego Szlaku» 26 kwietnia 2007 roku, o czym świadczą materiały wideo".

Proces w sprawie Jarosława Gryszczenia rozpoczął się 10 września 2007 r. w sądzie w Baranowiczach. Podczas śledztwa, prokurator domagał się dla działacza kary 1 roku pozbawienia wolności w zawieszeniu. Sędzia Wasilij Pietriw uznał Gryszczenię winnym zarzucanego mu przestępstwa i skazał go na karę grzywny w wysokości 30 płac minimalnych (930 tysięcy rubli białoruskich). Potem Gryszczenia przyłączył się do „Europejskiej Białorusi" Andreja Sannikaua. 15 lutego 2012 r., razem z dwoma działaczami, został pobity w Mińsku przez funkcjonariuszy służb siłowych.

6. Oficjalnie Plac Październikowy, w samym centrum Mińska. Nazwa Plac Kalinowskiego używana jest przez ugrupowania opozycyjne od czasu demonstracji wyborczych w marcu 2006 roku. Konstanty Kalinowski jest bohaterem narodowym Białorusinów. Żył w latach 1838–1864, zginął czasie powstania styczniowego. Domagał się odłączenia Litwy od Rosji i stworzenia na nowo Wielkiego Księstwa, w którym Białorusini mieliby zagwarantowaną ochronę własnego języka i własnej kultury. W czasie powstania styczniowego był dowódcą komitetów na dzisiejszych kresach, za co został aresztowany i skazany na karę śmierci przez powieszenie. Wyrok wykonano w Wilnie.

Plac Kalinowskiego to miejsce protestów opozycji w trakcie trwania i po zakończeniu wyborów prezydenckich. Największe z nich miały miejsce w 2006 i 2010 roku. Na plac przychodziło wówczas nawet po 50 tys. ludzi. Organizowali oni miasteczka namiotowe, które otaczane były kordonami milicji.

Plac Kalinowskiego dla Białorusinów jest symbolem walki o wolność i wiary w przyszłość. Dziś wszelkie zgromadzenia na Placu Październikowym w Mińsku narażone są na kontrole milicji (http://bialorus-instrukcja.blogspot.com/2011/08/plac-kalinowskiego.html).

ЯРАСЛАЎ ГРЫШЧЭНЯ

Яраслаў Грышчэня – моладзевы актывіст з гораду Баранавічы Берасьцейскай вобласьці. За ўдзел у акцыях апазыцыі затрымліваўся і асуджаўся па адміністратыўных справах.

Удзельнік «Плошчы Каліноўскага пасьля выбараў прэзыдэнта 2006 году.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Абвінавачваўся ва ўчыненьні злачынства, прадугледжанага арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя дзейнасьці аб'яднаньня, фонду ці рэлігійнай арганізацыі, якая не прайшла дзяржаўнай рэгістрацыі, ці ўдзел у ёй).

Паводле пастановы аб узбуджэньні крымінальнай справы, якую вынес пракурор г. Баранавічы, старшы дарадца юстыцыі А. П. Смаль, «непаўнагадовы Грышчэня Я. С. пасьля заявы ў Баранавіцкі ГАУС, якую ён зрабіў 20 красавіка 2007 году аб добраахвотным спыненьні ўдзелу ў дзейнасьці моладзевага грамадзкага аб'яднаньня «Малады Фронт», якое не прайшло ва ўстаноўленым парадку дзяржаўнай рэгістрацыі, фактычна працягнуў удзел у дзейнасьці гэтага незарэгістраванага грамадзкага аб'яднаньня пры правядзеньні шэсьця «Чарнобыльскі шлях» 26 красавіка 2007 году, пра што сьведчаць адзьнятыя відэаматэрыялы».

Суд над Яраславам Грышчэнем пачаўся 10 верасьня 2007 г. у судзе Баранавіцкага раёну Берасьцейскай вобласьці. Падчас судовага разьбіральніцтва пракурор, які падтрымліваў дзяржаўнае абвінавачаньне, прапанаваў пакараць актывіста годам пазбаўленьня волі ўмоўна. Судзьдзя Васіль Петрыў прызнаў Яраслава Грышчэню вінаватым у інкрымінуемым злачынстве і прыняў рашэньне аб пакараньні яго штрафам у памеры 30 базавых велічын (930 тысячаў рублёў).

Потым далучыўся да «Эўрапейскай Беларусі» Андрэя Саньнікава. 15 лютага 2012 г. разам з двума іншымі актывістамі быў зьбіты ў Менску супрацоўнікамі сілавых структураў у цывільным.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

SIARHIEJ GUMINSKIJ

Siarhiej Guminskij jest działaczem „Młodego Frontu" z Orszy (obwód witebski).

KRONIKA REPRESJI

22 stycznia 2007 r. działacz młodzieżowy Siarhiej Guminskij otrzymał postanowienie o przyznaniu mu statusu podejrzanego w sprawie karnej, wszczętej z art. 341 KK – „Profanacja i niszczenie mienia" w związku z namalowaniem graffiti o treściach politycznych. Wcześniej Gumiński był kilka razy przesłuchiwany w tej sprawie, a w jego mieszkaniu przeprowadzane były rewizje. Jednak po trzech dniach, 25 stycznia, Siarhiej Guminskij został wezwany na posterunek milicji, gdzie okazało się, że sprawa karna została zamknięta w związku z brakiem dowodów udziału w przestępstwie.

W pierwszych dniach stycznia 2007 r. Guminskij został zatrzymany i pobity przez milicję w Orszy. Skazano go na 3 dni aresztu. Jedną z przyczyn pobicia było to, że milicjantom nie spodobało się, że Guminskij mówi po białorusku. Po tym zdarzeniu miały miejsce jeszcze 2 przypadki zatrzymania i skazania tego członka Młodego Frontu.

Na początku lipca 2011 roku na domowy adres Siarhieja Guminskiego została wysłana wiadomość z lokalnego komisariatu wojskowego, że ma on zakaz opuszczania Białorusi. Guminskij studiował na jednej z polskich uczelni, gdzie miał w tym czasie sesję egzaminacyjną. Według oficjalnej wersji, przyczyną zakazu wyjazdu za granicę stał się brak wszystkich niezbędnych dokumentów, które student miał przekazać do komisariatu wojskowego. Guminskij jednak zaprzecza tej wersji.

СЯРГЕЙ ГУМІНСКІ

Сяргей Гумінскі – актывіст «Маладога Фронту» з г. Ворша (Віцебская вобласьць).

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

22 студзеня 2007 г. актывісту Сяргею Гумінскаму сьледчыя Аршанскага ГАУС уручылі пастанову аб прызнаньні яго падазраваным па крымінальнай справе, узбуджанай па факце нанясеньня графіці палітычнага зьместу па арт. 341 Крымінальнага кодэксу.

Аднак праз тры дні, 25 студзеня, Сяргей Гумінскі быў азнаёмлены з дакумэнтам аб спыненьні супраць яго крымінальнага перасьледу «ў сувязі зь недаказанасьцю датычнасьці да ўчыненага злачынства».

У студзені 2007 г. актывіст апазыцыі быў затрыманы і зьбіты міліцыяй (за тое, што прынцыпова карыстаўся беларускай мовай), асуджаны на трое сутак. Пасьля гэтага выпадку мелі месца іншыя факты затрыманьня і адміністратыўнага пакараньня актывіста.

Напачатку ліпеня 2011 г. Сяргей Гумінскі атрымаў паведамленьне зь мясцовага ваенкамату, яму было забаронена выяжджаць зь Беларусі. Маладафронтавец вучыўся ў польскай ВНУ і ў той час якраз здаваў экзамэнацыйную сэсію.

Паводле афіцыйнай вэрсіі, прычынай забароны на выезд за межы краіны стала адсутнасьць усіх патрэбных дакумэнтаў, якія студэнт мусіў падаць у ваенкамат. Сяргей Гумінскі гэтыя заявы зьняпраўджвае.

ANDREJ HAJDUKOU

Andrej Hajdukou urodził się w 1990 r. w Nowopołocku w okręgu witebskim. Został zatrzymany 8 listopada 2012 r. w Witebsku, w trakcie „umieszczania w skrytce danych mogących interesować zagraniczne służby wywiadowcze", jak podają oficjalne dane. Hajdukoua przetrzymywano w mińskim areszcie śledczym KGB (tzw. „amerykance") oraz w areszcie tymczasowym KGB w Witebsku przez okres 9 miesięcy.



FOT. ANDREJ HAJDUKOU

KRONIKA REPRESJI

W chwili aresztowania Hajdukou pracował jako operator w zakładzie petrochemicznym „Naftan" oraz studiował zaocznie na Uniwersytecie Połockim. Krewni i przyjaciele od początku określali podstawy aresztowania Andreja jako formę nacisku ze strony służb specjalnych w związku z jego opozycyjnymi poglądami. Oprócz tego Andrej, wraz z kolegami podzielającymi jego poglądy, usiłował zarejestrować organizację międzynarodową „Stowarzyszenie Młodych Intelektualistów", które w swym statucie promowało nowatorskie idee, m.in. możliwość utworzenia własnej partii politycznej.

12 czerwca 2013 r. w witebskim sądzie okręgowym rozpoczął się proces Hajdukoua za zamkniętymi drzwiami. 20 czerwca wezwano w charakterze świadka matkę oskarżonego, Wolgę Hajdukouą, która nie widziała się z synem ani razu, od dnia aresztowania.

Artykuł, na którym oparto oskarżenie został zamieniony na łagodniejszy. Wiemy, że początkowo Hajdukou oskarżony był z dwóch artykułów: art. 14, pkt 1 – „Usiłowanie przestępstwa" i art. 356, pkt 1 – „Zdrada państwa". Niemniej jednak 19 czerwca przewodniczący Komitetu Bezpieczeństwa, Walery Wakulczyk, ogłosił w prasie, że nowopołocki aktywista może być sądzony z innego paragrafu. 27 czerwca prokurator w trakcie procesu sądowego zażądał dla Andreja Hajdukoua 2 lat pozbawienia wolności.

1 lipca 2013 r. Andrej Hajdukou został uznany winnym usiłowania nawiązania kontaktów z zagranicznym wywiadem bez znamion zdrady państwa. Sąd na posiedzeniu zamkniętym skazał Adreja Hajdukoua na półtora roku kolonii karnej o normalnym rygorze.

АНДРЭЙ ГАЙДУКОЎ

Андрэй Гайдукоў нарадзіўся ў г. Наваполацку Віцебскай вобласьці 21 кастрычніка 1989 году.

На момант арышту працаваў апэратарам на нафтаперапрацоўчым аб'яднаньні «Нафтан» і завочна вучыўся ў Полацкім унівэрсытэце.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы 8 лістапада 2012 году ў Віцебску – паводле афіцыйнай інфармацыі, нібыта «падчас закладкі схованкі са зьвесткамі, якія могуць цікавіць замежныя спэцслужбы». На працягу амаль 9 месяцаў Гайдукова ўтрымлівалі то ў менскім сьледчым ізалятары КДБ «амэрыканцы», то ў СІЗА КДБ у Віцебску.

Родныя і сябры з самага пачатку тлумачылі арышт Андрэя ціскам спэцслужбаў з-за апазыцыйных поглядаў хлопца. Акрамя таго, Андрэй разам з аднадумцамі спрабаваў зарэгістраваць міжнародную арганізацыю «Саюз маладых інтэлектуалаў», якая дэкляравала ў сваім Статуце прасоўваньне наватарскіх ідэяў у розных сфэрах і нават магчымае стварэньне ўласнай палітычнай партыі.

Судовыя слуханьні па справе Гайдукова праходзілі з 12 чэрвеня 2013 г. у Віцебскім абласным судзе пры зачыненых дзьвярах. 20 чэрвеня ў якасьці сьведкі была дапытаная маці падсуднага Вольга Гайдукова, якая ня бачыла сына з дня арышту.

Артыкул абвінавачваньня быў перакваліфікаваны на больш мяккі. Вядома, што першапачаткова Гайдукова абвінавачвалі па двух артыкулах: ч. 1 арт. 14 – (замах на злачынства) і ч. 1 арт. 356 – (здрада дзяржаве). Аднак 19 чэрвеня старшыня Камітэту дзяржбясьпекі Валер Вакульчык заявіў журналістам, што наваполацкага актывіста апазыцыі могуць асудзіць і паводле іншага артыкулу. 27 чэрвеня дзяржабвінаваўца ў судовым працэсе запрасіў для А. Гайдукова 2 гады зьняволеньня.

1 ліпеня 2013 году Андрэя Гайдукова прызналі вінаватым у спробе ўстанаўленьня кантактаў з супрацоўнікам замежнай спэцслужбы без прыкметаў здрады дзяржаве. Рашэньнем закрытага суду Андрэй Гайдукоў быў асуджаны на паўтары гады калёніі агульнага рэжыму.

WIKTAR IWASZKIEWICZ

Wiktar Iwaszkiewicz (21.09.1959 – 03.10.2013) to znany białoruski polityk, działacz związkowy, dziennikarz, członek Białoruskiego Frontu Ludowego i Białoruskiego Kongresu Demokratycznych Związków Zawodowych. Urodził się i zmarł w Mińsku.

Ukończył zaocznie studia na Wydziale Dziennikarstwa Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego im. Włodzimierza Lenina. W latach 80. był pracownikiem mińskiej kolei oraz członkiem organizacji „Majstrouni" i „Tutejsi".

W 1987 organizował białorusko-łotewski protest przeciw budowie elektrowni wodnej na Dźwinie oraz akcję na rzecz ratowania Prypeci. W 1989 zorganizował strajk kierowców autobusów miejskich w Mińsku, a w 1991 był koordynatorem komitetów strajkowych w mińskich zakładach.

W latach 1990–1995 był sekretarzem generalnym Białoruskiego Frontu Ludowego „Odrodzenie". Pracował jako dyrektor Społecznego Centrum Naukowo-Badawczego „Białoruska perspektywa" (1995–1999) oraz jako redaktor naczelny pisma „Raboczy" (1997–2002). W latach 2003–2007 ponownie pełnił obowiązki sekretarza generalnego BFL, a w 2007 został wybrany wiceprzewodniczącym Frontu.

Był jednym z organizatorów niezależnego centrum analitycznego „Białoruska perspektywa".

W 2009 był wymieniany wśród kandydatów na prezesa partii. Brał udział w tzw. wyborach parlamentarnych na Białorusi 2008 r. W marcu 2010 r. zarejestrowano jego kandydaturę do Rady Miejskiej w Mińsku.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

KRONIKA REPRESJI

Od 1998 r. Wiktar Iwaszkiewicz był co najmniej 10-krotnie skazywany na areszty administracyjne i kary grzywny. Dwukrotnie prowadził głodówkę. 16 grudnia 2002 r. Iwaszkiewicz został aresztowany i skazany na 1 rok pozbawienia wolności za zniesławienie prezydenta i jego otoczenia. Wyrok odbył w zakładzie karnym w Baranowiczach. Iwaszkiewicz miał się dopuścić zniesławienia w artykule „Miejsce złodzieja jest w więzieniu" (ros. „Вор должен сидеть в тюрьме"), będącym komentarzem do prezydenckiej kampanii wyborczej 2001, opublikowanym w gazecie „Raboczy". Czytelnicy gazety nie mieli okazji zapoznać się z artykułem Iwaszkiewcza – służby specjalne skonfiskowały cały nakład gazety jeszcze w drukarni.

ВІКТАР ІВАШКЕВІЧ

Віктар Івашкевіч – вядомы палітычны дзяяч і журналіст.

21 верасьня 1959 г. – 3 кастрычніка 2013 г. Нарадзіўся і памёр у Менску.

Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Быў галоўным рэдактарам газэты «Рабочы» (1997–2002 гг.). На пачатку 1980-х гг. – актыўны ўдзельнік моладзевых нефармальных аб'яднаньняў «Майстроўня», «Талака», адзін з найбольш таленавітых арганізатараў розных акцыяў і мерапрыемстваў, у тым ліку экалягічнага маршу па Прыпяці ў 1988 г. – адной зь першых чарнобыльскіх акцыяў пратэсту. Ініцыятар стварэньня страйкамаў на менскіх прадпрыемствах у 1991 г.

Ад 1988 г. – актывіст БНФ, да 1996 г. – сакратар Управы БНФ. Уваходзіў у групу лідэраў БНФ, якія выступілі з крытыкай Зянона Пазьняка. Восеньню 1996 г. пакінуў пасаду сакратара Ўправы БНФ, але не спыніў сяброўства ў партыі.

Адзін з арганізатараў незалежнага аналітычнага цэнтру «Беларуская пэрспэктыва». Намесьнік старшыні Партыі БНФ, адказны сакратар Управы Партыі БНФ.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Ад 1998 г. Віктар Івашкевіч больш за 10 разоў быў пакараны адміністрацыйнымі арыштамі, шмат разоў – штрафамі. Двойчы трымаў галадоўку.

16 сьнежня 2002 г. Віктар Івашкевіч быў арыштаваны, а праз некаторы час – асуджаны да аднаго году абмежаваньня волі за паклёп на прэзыдэнта і яго атачэньне. Нагодай для крымінальнай справы стаў артыкул «Злачынца павінен сядзець у вязьніцы», надрукаваны ў газэце «Рабочы» падчас прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі. Да чытачоў газэта не дайшла: прадстаўнікі спэцслужбаў канфіскавалі яе наклад непасрэдна ў друкарні.

Адбываў пакараньне ў Баранавічах. Апынуўся на волі 16 сьнежня 2003 году.

ALIEKSIEJ JANUSZEWSKI



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Alieksiej Januszewski urodził się 29 maja 1987 r. Ukończył Szkołę Średnią nr 200 w Mińsku. Podjął studia na Białoruskim Pedagogicznym Uniwersytecie Państwowym na Wydziale Filologii i Kultury. Oskarżony w sprawie „Młodego Frontu" w 2007 r. Został relegowany z uczelni za aktywną działalność w organizacji „Młody Front" oraz udział w akcjach białoruskiej opozycji. Obecnie jest studentem slawistyki na Wileńskim Uniwersytecie Pedagogicznym. Interesuje się białoruską historią i kulturą.

KRONIKA REPRESJI

Aktywny uczestnik ulicznych akcji opozycji. Niejednokrotnie był zatrzymywany przez funkcjonariuszy KGB, milicji i służb specjalnych. Dołączył do „Młodego Frontu" w 2004 r. Na początku 2006 r. miał status podejrzanego w sprawie karnej dotyczącej innego działacza „Młodego Frontu", Artura Finkiewicza. Spędził kilka dni w areszcie, potem sprawa przeciwko niemu została zakończona. Latem 2006 r. brał udział w młodzieżowym proteście głodowym.

4 lutego 2007 r. razem z innymi młodymi ludźmi został zatrzymany podczas zebrania niezarejestrowanej akcji „Młodego Frontu", które odbywało się w prywatnym mieszkaniu w Mińsku. Po ok. miesiącu od tego zdarzenia został oskarżony z artykułu 193.1 – „Działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji". Na całej Białorusi odbywały się wtedy rewizje i zatrzymania młodofrontowców. Januszewskiego oskarżano o kierowanie Radą „Młodego Frontu" w rejonie zawodskim Mińska. 29 maja 2007 r. sąd skazał go na karę grzywny w wysokości 30 płac minimalnych (930 tysięcy rubli). Wyrok wydał sędzia Rusłan Aniskiewicz.

We wrześniu 2007 r. razem z malarzem Alesiem Puszkinem został skazany na 7 dni aresztu administracyjnego za kradzież flagi państwowej z orszańskiego posterunku milicji.

АЛЯКСЕЙ ЯНУШЭЎСКІ

Фігурант «справы Маладога Фронту» 2007 году.

Нарадзіўся 29 траўня 1987 г. Скончыў сярэднюю школу № 200 г. Менску. Паступіў у Беларускі дзяржаўны пэдагагічны ўнівэрсытэт на факультэт беларускай філялёгіі і культуры. Выключаны з ВНУ за актыўны ўдзел у дзейнасьці «Маладога Фронту», акцыях і мерапрыемствах беларускай апазыцыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Актыўны ўдзельнік вулічных акцыяў апазыцыі. Неаднаразова затрымліваўся супрацоўнікамі КДБ, міліцыі і байцамі спэцназу.

Далучыўся да «Маладога Фронту» ў 2004 г. У пачатку 2006 году праходзіў як падазраваны па крымінальнай справе ў дачыненьні да сябра «Маладога Фронту» Артура Фінькевіча. Правёў некалькі дзён у ізалятары часовага ўтрыманьня. Аднак тады справа супраць Янушэўскага была спыненая.

Улетку 2006 г. браў удзел у моладзевай галадоўцы пратэсту.

4 лютага 2007 году разам зь іншымі маладымі людзьмі быў затрыманы падчас разгону сходу незарэгістраванага «Маладога фронту» на прыватнай кватэры ў Менску. Абвінавачаны праз месяц пасьля тых падзеяў па крымінальным артыкуле 193.1 (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Па ўсёй Беларусі адбываліся ператрусы і затрыманьні маладафронтаўцаў. Янушэўскага вінавацілі ў кіраваньні Радай МФ Заводзкага раёну Менску.

29 траўня 2007 г. асуджаны ў Савецкім судзе Менску. Пакараны штрафам у памеры 30 базавых велічыняў (930 тысяч рублёў). Прысуд вынес судзьдзя Руслан Аніскевіч.

У верасьні 2007 г. разам з мастаком Алесем Пушкіным быў пакараны адміністрацыйным арыштам па абвінавачваньні ў крадзяжы дзяржаўнага сьцягу з будынку Аршанскага райаддзелу міліцыі. Атрымаў 7 сутак арышту.

ULADZIMIR JAROMIENAK

Uladzimir Jaromienak urodził się w mieście Miory 4 września 1990 r. Po ukończeniu szkoły średniej podjął studia na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym na Wydziale Informatyki i Radioelektroniki. Kiedy go aresztowano, był studentem drugiego roku. Jest członkiem „Młodego Frontu" i działaczem Białoruskiej Chrześcijańskiej Demokracji (BCHD).

KRONIKA REPRESJI

Uczestnik „Płoszczy 2010". Został zatrzymany przez funkcjonariuszy służb specjalnych przed gmachem rządu. Skazano go na 15 dni aresztu. Karę odbył w areszcie śledczym w Żodinie. Po wyjściu z aresztu został wezwany na przesłuchanie do KGB w charakterze „świadka". Przesłuchanie zakończyło się kolejnym 7-dniowym aresztem na Okrestinie.

28 stycznia 2011 zatrzymano go po raz trzeci, teraz już jako podejrzanego w sprawie o „masowych zamieszkach". Został umieszczony w areszcie śledczym KGB. Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 293, pkt 1 i 2 KK RB – „Masowe zamieszki". 14 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 3 lata pozbawienia wolności. Wyrok odbywał w kolonii karnej „Witba" pod Witebskiem.

11 sierpnia 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Łukaszenki.

20 sierpnia 2013 miński Sąd Okręgu Pierwomajskiego uznał go winnym naruszenia zasad prewencyjnego nadzoru (art. 421 KK). Sędzia Leonid Jermolenkow skazał Jaromienaka na 3 miesiące aresztu.

УЛАДЗІМЕР ЯРОМЕНАК

Нарадзіўся ў горадзе Мёры 4 верасьня 1990 г. Пасьля сканчэньня сярэдняй школы паступіў у Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. На момант арышту быў студэнтам 2-га курсу. Сябра «Маладога Фронту» і аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» (БХД).


FOT. JULIA DARASHKEVICH

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Удзельнік Плошчы-2010. Затрыманы супрацоўнікамі спэцслужбаў на наступны дзень, 20 сьнежня 2010 г., пасьля пікету салідарнасьці з палітзьняволенымі насупраць Дому ўраду. За гэта быў асуджаны на 15 сутак арышту, які ён адбыў у Жодзінскім СІЗА. Пасьля выхаду адтуль быў выкліканы ў якасьці сьведкі на допыт у КДБ, які скончыўся 7-суткавым арыштам на Акрэсьціна. 28 студзеня 2011 г. арыштаваны ў трэці раз, цяпер ужо як падазраваны па справе аб масавых беспарадках. Зьмешчаны пад варту ў СІЗА КДБ.

Прад'яўлена абвінавачваньне па частках 1 і 2 арт. 293 КК (масавыя беспарадкі). 14 траўня 2011 г. судом Партызанскага раёну Менску асуджаны на 3 гады зьняволеньня. Адбываў пакараньне ў калёніі «Віцьба» пад Віцебскам.

11 жніўня 2011 г. памілаваны Лукашэнкам і вызвалены.

20 жніўня 2013 г. прызнаны судом Першамайскага раёну Менска вінаватым у парушэньні ўмоваў міліцэйскага прэвэнтыўнага нагляду (артыкул 421 Крымінальнага кодэксу РБ). Асуджаны на 3 месяцы арышту. Прысуд вынес судзьдзя Леанід Ярмоленкаў.

MIECZYSŁAW JAŚKIEWICZ

Mieczysław Jaśkiewicz jest przewodniczącym grodzieńskiego oddziału „Związku Polaków na Białorusi".

KRONIKA REPRESJI

Mieczysław Jaśkiewicz został zatrzymany 5 listopada 2006 r. pod zarzutem wszczęcia bójki na przystanku trolejbusowym. Sprawa karna została wszczęta z artykułu 339, pkt 1 KK – „Chuligaństwo".

Rozprawa odbyła się 9 lutego w sądzie w Grodnie. Mieczysław Jaśkiewicz nie przyznał się do winy, jednak sędzia Żanna Wierchaś uznała go winnym i skazała na karę grzywny w wysokości 40 płac minimalnych (1 milion 240 tysięcy rubli białoruskich) i zobowiązała go do wypłacenia poszkodowanemu 500 tysięcy rubli białoruskich zadośćuczynienia. Związek Polaków na Białorusi oświadczył, że doszło do prowokacji i politycznie motywowanego prześladowania członka organizacji.

W marcu 2008 Mieczysław Jaśkiewicz został zatrzymany przez milicję, funkcjonariusze przeprowadzili rewizję w samochodzie Jaśkiewicza, szukali w nim wydań i publikacji niezarejestrowanego Związku Polaków na Białorusi. Kilkakrotnie był skazywany na areszty administracyjne.

МЕЧЫСЛАЎ ЯСЬКЕВІЧ

Мечыслаў Яськевіч – кіраўнік гарадзенскага Гарадзкога аддзяленьня «Саюзу палякаў на Беларусі».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Мечыслаў Яськевіч быў затрыманы 5 лістапада 2006 году па абвінавачаньні нібыта ў разьвязваньні бойкі на тралейбусным прыпынку. Крымінальная справа была ўзбуджаная па ч. 1 арт. 339 Крымінальнага кодэксу (хуліганства).

Разгляд справы адбыўся 9 лютага ў судзе Кастрычніцкага раёну Гародні. Мечыслаў Яськевіч сваю віну адмаўляў, аднак судзьдзя Жана Верхась прызнала яго вінаватым і асудзіла да штрафу ў памеры 40 базавых велічыняў (1 млн. 240 тыс. руб.), абавязаўшы аплаціць пацярпеламу 500 тыс. рублёў шкоды. «Саюз палякаў на Беларусі» заявіў аб праваправакацыі і палітычна матываваным перасьледзе сябра арганізацыі.

Мечыслаў Яськевіч затрымліваўся міліцыяй, якая абшуквала ягоны аўтамабіль у пошуках выданьняў незарэгістраванага ўладамі Саюзу палякаў, некалькі разоў быў асуджаны па адміністратыўных артыкулах на «суткі».



FOT. JULIA DARASHKEVICH

TATIANA JEŁOWA

Tatiana Jełowa to znana białoruska blogerka. Jest jedną z organizatorek i uczestniczek miasteczka namiotowego, akcji protestu przeciwko fałszerstwom podczas wyborów 2006 r. Akcja ta miała miejsce na Placu Październikowym („Plac Kalinowskiego") i trwała ponad 3 dni, aż do aresztowania wszystkich jej uczestników. Po trzech miesiącach od tej akcji część jej uczestników zrzeszyła się i utworzyła w Wilnie ruch oporu „Bunt", który uległ potem samolikwidacji.

KRONIKA REPRESJI

Sprawa karna przeciwko działaczom młodzieżowym – Denisowi Denisowowi i Tatianie Jełowej – została wszczęta z artykułu 14, pkt 1 oraz 342, pkt 1 KK – „Organizacja i przygotowanie działań w poważny sposób naruszających porządek publiczny, bądź aktywny w nich udział". Zdaniem naczelnika oddziału ds. nadzoru nad śledztwem, W.A. Zabawskiego, „D.W. Denisow razem z ponad 25 osobami, mającymi przy sobie ponad 1000 ulotek, 17 czerwca 2006 r. został zatrzymany przez funkcjonariuszy milicji podczas próby przeprowadzenia nielegalnej akcji «Bunt» w Letnim Amfiteatrze w Witebsku".

19 czerwca 2006 roku w związku z tymi wydarzeniami wszczęto sprawę karną, a w październiku wydano postanowienie o nadaniu Denisowowi i Jełowej statusu oskarżonych.

Tatiana Jełowa opuściła Białoruś, wyrwawszy się z rąk milicji i służb specjalnych w jej domu. Udało się jej wyjść z mieszkania w bloku na 7. piętrze – opuściła się w dół po linie.

Ukończyła uniwersytet w Wilnie. Mieszka i pracuje poza Białorusią.

30 maja 2007 r. sprawa karna przeciwko Denisowowi i Jełowej została zamknięta z powodu braku znamion przestępstwa karnego.

W lipcu 2009 r. rosyjscy nacjonaliści grozili Tatianie Jełowej, która w blogosferze jest znana pod pseudonimem Zmagarka, za publikację na blogu Live Journal filmu z egzekucji młodego rosyjskiego jeńca w Czeczenii w 1999 r. „Chciałabym

wszystkich ostrzec. Nie popieram przemocy w Groznym, jednak dopóki w Czeczenii stacjonują rosyjskie wojska, dopóty zbrodnie będą się powtarzać" – napisała Jełowa. Wpis pobił rekordy popularności na rosyjskim portalu Yandex. Blogerka otrzymała ponad 2 tysiące komentarzy.

ТАЦЯНА ЕЛАВАЯ

Тацяна Елавая – вядомая беларуская блогерка. Адна з арганізатарак і ўдзельніцаў намётавага мястэчка пратэсту супраць фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году, якая больш за трое сутак, да арышту ўсіх удзельнікаў, прыходзіла на Кастрычніцкую плошчу Менску «Плошча Каліноўскага». Праз 3 месяцы пасьля гэтай акцыі частка яе ўдзельнікаў аб'ядналася і ўтварыла ў Вільні рух супраціву «Бунт», які потым самаліквідаваўся.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Крымінальная справа супраць моладзевых актывістаў Дзяніса Дзянісава і Тацяны Елавой была ўзбуджаная па ч. 1 арт. 14, ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх).

Паводле начальніка аддзелу па наглядзе за сьледзтвам у органах унутраных справаў пракуратуры Віцебскай вобласьці, дарадцы юстыцыі В.А. Забаўскага, «Дзянісаў Д.В. сумесна зь іншымі асобамі ў колькасьці ня менш за 25 чалавек, якія мелі пры сабе больш за 1000 улётак, 17.06.2006 г. у вячэрні час былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі пры замаху на правядзеньне незаконнай акцыі «БУНТ» у Летнім амфітэатры ў г. Віцебску».

19 чэрвеня 2006 году была ўзбуджаная крымінальная справа, а ў кастрычніку вынесеная пастанова аб прызнаньні Д. Дзянісава і Т. Елавой абвінавачваемымі.

Тацяна Елавая пакінула Беларусь, вырваўшыся з аблогі міліцыі і спэцслужбаў яе дому ў Менску. Яна здолела выйсьці з кватэры, што знаходзіцца на 8-м паверсе шматпавярховіка, спусьціўшыся па скінутай у вакно вяроўцы. Скончыла ўнівэрсытэт у Вільні. Жыве і працуе ў Эўропе.

30 траўня 2007 г. крымінальная справа супраць Дзяніса Дзянісава і Тацяны Елавой была спыненая з-за адсутнасьці складу крымінальнага злачынства.

У ліпені 2009 г. Тацяне Елавой, вядомай у блогасфэры пад нікам Zmagarka, пагражалі забойствам расейскія нацысты – за зьмяшчэньне ў сваім блогу на ЖЖ відэароліка аб зьверскім забойстве чачэнскімі баевікамі расейскага палоннага. Елавая заклікала расейскія ўлады спыніць вайну на Каўказе, ад якой цярпяць абодва ваюючыя бакі.

WADIM KABANCZUK


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Wadim Kabanczuk urodził się w Bobrujsku. W latach 90. był działaczem „Młodego Frontu". Ukończył Białoruską Akademię Politechniczną. 27 marca 1998 r. został skazany na 3 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu na 2 lata.

KRONIKA REPRESJI

Kabanczuk został zatrzymany w październiku 1997 r. i umieszczony w areszcie śledczym na Wołodarce, gdzie spędził 6 miesięcy i gdzie torturami starano się go zmusić do rozpoczęcia współpracy z KGB.

Za udział w akcjach opozycji 10 i 23 marca 1997 r. Kabanczukowi przedstawiono zarzuty z artykułu 186, pkt 3 – „Organizacja lub udział w grupowych działaniach, w poważny sposób naruszających porządek publiczny" i artykułu 187, pkt 2 – „Stawianie oporu funkcjonariuszowi milicji podczas pełnienia przez niego obowiązków służbowych, związanych z przemocą lub groźbą jej zastosowania".

Wadim Kabanczuk wyrokiem sądu został uwolniony 27 marca 1998 r. Po uwolnieniu dalej zajmował się działalnością polityczną, brał udział w akcjach opozycji. Kilkakrotnie skazywano go na areszty administracyjne. W 2001 r. Kabanczuk wyjechał do Belgii, a po kilku latach wrócił. W czasie wyborów 2006 r. wspierał Milinkiewicza, a podczas wyborów 2010 roku był członkiem sztabu kandydata na prezydenta, Witala Rymaszeuskiego. Był uczestnikiem „Płoszczy 2010". Dwa miesiące po wydarzeniach z Placu Niepodległości został zatrzymany i skazany. Kabanczuka zatrzymano na białorusko-litewskiej granicy wieczorem 13 lutego 2011 r. za to, że wiózł gazety z informacjami o wydarzeniach w kraju po wyborach prezydenckich. Powinien zostać zwolniony jeszcze 23 lutego, ale nie zaliczono mu na poczet aresztu dnia, w którym przetrzymywano go na posterunku w Orszy, starając się go oskarżyć o stawianie oporu pracownikom służby celnej. Potem przewieziono go do Mińska, do aresztu na Okrestinie. Sąd skazał go na 10 dni aresztu administracyjnego za udział w wydarzeniach z 19 grudnia. W trakcie odbywania kary kilkakrotnie wożono go na przesłuchania do KGB w sprawie o „masowe zamieszki".

ВАДЗІМ КАБАНЧУК

Нарадзіўся ў г. Бабруйску. У 90-я гады – актывіст «Маладога Фронту». Скончыў Беларускую політэхнічную акадэмію. 27 сакавіка 1998 г. асуджаны на 3 гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай на 2 гады.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы ў кастрычніку 1997 г. і зьмешчаны ў менскі СІЗА па вул. Валадарскага, дзе правёў да суду амаль 6 месяцаў. Яго спрабавалі схіліць да супрацоўніцтва з КДБ катаваньнямі.

За ўдзел у акцыях апазыцыі 10 і 23 сакавіка 1997 г. Вадзіму прад'явілі абвінавачваньні па двух крымінальных артыкулах: арт. 186.3 – «арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак», і арт. 187 ч. 2 – «супраціў супрацоўніку міліцыі пры выкананьні ім службовых абавязкаў, зьвязаны з гвалтам альбо пагрозай прымяненьня гвалту».

Вадзім Кабанчук быў вызвалены з-пад варты ў зале суду 27 сакавіка 1998 г.

Пасьля свайго вызваленьня працягваў займацца палітычнай дзейнасьцю, браў удзел у акцыях апазыцыі. Караўся адміністратыўнымі арыштамі.

У 2001 годзе Вадзім Кабанчук зьехаў у Бэльгію, празь некалькі гадоў вярнуўся. Падчас выбараў 2006 году падтрымліваў Мілінкевіча.

У часе выбараў 2010 г. быў актывістам штабу кандыдата на прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі Віталя Рымашэўскага. Удзельнік Плошчы-2010, праз 2 месяцы пасьля якой быў затрыманы і асуджаны. Вадзім Кабанчук быў затрыманы на беларуска-літоўскай мяжы ўвечары 13 лютага за тое, што вёз з сабой газэты аб падзеях у краіне пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. Яго павінны былі вызваліць яшчэ 23 лютага. Але суткі, якія Вадзіма трымалі ў Ашмянскім РАУС, спрабуючы абвінаваціць у супраціве супрацоўнікам мытні, падчас арышту яму не залічыліся. Пазьней яго перавезьлі ў Менск у ізалятар на Акрэсьціна. Маскоўскі суд Менску асудзіў Вадзіма на 10 сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел у падзеях 19 сьнежня ў Менску. Падчас арышту яго некалькі разоў вазілі на допыты ў КДБ па справе аб «масавых беспарадках», узяўшы падпіску аб неразгалошваньні.

OLEG KAJDOW

Oleg Kajdow to żołnierz z jednostki wojskowej Borowucha pod Połockiem (okręg witebski). Nie uczestniczył nigdy w żadnych ruchach ani nie był członkiem partii politycznych. Studiował na Państwowym Uniwersytecie Połockim.

KRONIKA REPRESJI

W drugiej połowie lat 90. Oleg Kajdow wraz z dwójką innych mieszkańców Połocka – Siarhiejem Lawiejkinem i Anatolem Blizniecowem – kilkakrotnie zrywał flagi państwowe z budynków urzędów na znak protestu wobec zakazu używania biało-czerwono-białej flagi narodowej. Sam Oleg nazywał te czyny aktami desperacji.

Początkowo zatrzymano wszystkich trzech, zostali oni jednak wkrótce wypuszczeni. Jednakże 10 kwietnia 1999 roku, chłopcy zostali zatrzymani i pobici. Wszczęta została sprawa karna. Kajdowa, Lawiejkina i Blizniecowa oskarżono o to, że 9 kwietnia 1998 r. zrywali czerwono-zielone flagi państwowe z dachów budynków połockiego Komitetu Rejonowego i Miejskiego, co powtórzyli rok później na dachu Komitetu Rejonowego.

Oskarżeni o umyślny wandalizm studenci i wojskowy, przyznali się do swoich czynów. Oskarżeni wyjaśnili, że był to ich protest oraz że kierowali się poczuciem sprawiedliwości. Oświadczyli, że ich zdaniem, symbolem Białorusi jest biało-czerowono-biała flaga.

Sprawa karna rozpatrywana była przez Sąd Wojskowy Witebska w lipcu 1999. Oskarżony w świetle artykułu 186, pkt 2 – „Bezczeszczenie symboli państwowych", Oleg Kajdow został ukarany karą grzywny w wysokości 200 milionów rubli białoruskich – co na tamte czasy było równowartością ok. 450 dolarów USA.

АЛЕГ КАЙДАЎ

Алег Кайдаў – жыхар ваеннага гарадку Баравуха непадалёк ад г. Полацку (Віцебская вобласьць). У палітычныя партыі і рухі не ўваходзіў. Вучыўся ў Полацкім дзяржаўным унівэрсытэце.

У другой палове 1990-х гадоў Алег Кайдаў разам з двума іншымі жыхарамі Полаччыны – Сяргеем Лавейкіным і Анатолем Блізьняцовым – некалькі разоў зрывалі дзяржаўныя сьцягі з будынкаў афіцыйных установаў на знак пратэсту супраць забароны нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцягу. Сам Алег называў гэтыя ўчынкі «крокамі адчаю».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Некалькі разоў усе трое былі затрыманыя, але спачатку іх адпускалі. Аднак 10 красавіка 1999 г. хлопцаў затрымалі і зьбілі. Была распачатая крымінальная справа. Кайдава, Лавейкіна і Блізьняцова вінавацілі ў тым, што 9 красавіка 1998 г. яны сарвалі чырвона-зялёны дзяржаўны сьцяг з дахаў Полацкага райвыканкаму і гарвыканкаму, а праз год вярнуліся на дах райвыканкаму і паўтарылі гэта ізноў.

Абвінавачаныя ў злосным хуліганстве студэнты і вайсковец прызналіся ў сваіх учынках, патлумачыўшы, што яны зрабілі гэта ў знак пратэсту і з пачуцьця справядлівасьці. Яны заявілі, што лічаць сымбалем Беларусі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг.

Крымінальную справу разглядаў вайсковы суд Віцебску ў ліпені 1999 году. Абвінавачаньне па артыкуле «Злоснае хуліганства» было перакваліфікаванае на арт. 186 ч. 2 (зьнявага дзяржаўных сымбаляў). Алега Кайдава пакаралі штрафам у 200 мільёнаў беларускіх рублёў – на той час гэтая сума адпавядала прыкладна 450 далярам ЗША.



FOT. ZMICER KASPAROVICH

DZMITRIJ KASPIEROWICZ

Dzmitrij Kaspierowicz, urodzony w 1983 roku, to działacz młodzieżowy z Mińska, od 15 roku życia członek Białoruskiego Frontu Ludowego, jeden z założycieli „Młodego Frontu". Od 2009 r. był liderem „Młodej Białorusi".

KRONIKA REPRESJI

Sprawa karna wobec Kaspierowicza, zatrzymanego w nocy z 17 na 18 stycznia 2006 roku, została wszczęta w związku z podejrzeniami o znieważenie symboli państwowych. Kaspierowicz starał się zdjąć oficjalną flagę z budynku Komitetu Wykonawczego Mińska, gdyż uważał ją za flagę stalinowską.

Artykuł 370 KK – „Znieważenie symboli państwowych" nie przewiduje pozbawienia wolności (maksymalna kara to 1 rok ograniczenia wolności), ani środka zapobiegawczego w postaci aresztu. Jednakże Kaspierowiczowi przedstawiono zarzuty z artykułu 339, pkt 1 Kodeksu Karnego – „Chuligaństwo"), a kara przewidziana z tego artykułu to 3 lata pozbawienia wolności.

Do czasu rozprawy Dzmitrij Kaspierowicz był przetrzymywany w areszcie śledczym w Mińsku. W związku z tą samą sprawą zatrzymano jeszcze Pawła Batujewa i Dzmitrija Gawrusika, jednak po przeprowadzeniu czynności śledczych (przesłuchania, rewizje) zostali oni wypuszczeni na wolność i oczyszczono ich z zarzutów.

27 lutego sąd w Mińsku wydał wyrok w sprawie Dzmitrija Kaspierowicza – 5 miesięcy aresztu. Działacz nie zgodził się z zarzutami i oświadczył, że jest gotów odpowiadać za znieważenie flagi państwowej, ale nie za chuligaństwo. Wyrok został zaskarżony przez adwokata, sędzia jednak odrzucił apelację i pozostawił wyrok bez zmian.

Kaspierowicz odbył karę w więzieniu w Żodinie, a 28 kwietnia 2006 r. został warunkowo zwolniony.

ЗЬМІЦЕР КАСЬПЯРОВІЧ

Зьміцер Касьпяровіч – моладзевы актывіст зь Менску, сябра БНФ. Нарадзіўся 25 лютага 1982 году ў Менску. Пасьля сканчэньня школы № 65 г. Менску атрымаў вышэйшую адукацыю ў Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце культуры і мастацтваў па спэцыяльнасьці «Музэйная справа, ахова помнікаў гісторыі і культуры».

Яшчэ са школьнага ўзросту (з 15 гадоў) Зьміцер стаў актывістам моладзевай фракцыі БНФ, пазьней – адным з заснавальнікаў «Маладога Фронту». Абіраўся сябрам Рады гэтай арганізацыі. З 2009 году – лідэр «Маладой Беларусі». У 2001 г. быў адным з абаронцаў мэмарыяльнага комплексу Курапатах, калі ўлады плянавалі пракласьці шашу праз месца масавых сталінскіх расстрэлаў.

Зьміцер Касьпяровіч шмат гадоў бярэ актыўны ўдзел у адраджэньні культурнай і архітэктурнай спадчыны Беларусі. Так, да 2010 г. ён зьяўляўся старшынём менскай гарадзкой арганізацыі Таварыства аховы помнікаў Беларусі. Затым быў абраны сябрам яго рэспубліканскай рады.

Балятаваўся ў дэпутаты мясцовых саветаў, але абраны ня быў (паводле афіцыйных дадзеных, апынуўся на 2-м месцы пасьля пераможцы). У 2012 г. браў удзел у парлямэнцкіх выбарах, але зьняў сваю кандыдатуру і заклікаў выбарцаў да байкоту.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Крымінальная справа супраць Зьмітра Касьпяровіча, затрыманага ў ноч з 17 на 18 студзеня 2006 г., была ўзбуджаная па падазрэньні ў зьнявазе дзяржаўных сымбаляў. Зьміцер Касьпяровіч спрабаваў зьняць афіцыйны сьцяг з будынку Менгарвыканкаму, бо лічыць яго сталінскім.

Па арт. 370 Крымінальнага кодэксу «Зьнявага дзяржаўных сымбаляў» не прадугледжваецца пазбаўленьне волі (максымальнае пакараньне – 1 год абмежаваньня волі), а таксама ўтрыманьне пад вартай да суду. Аднак абвінавачваньне З. Касьпяровічу было прад'яўленае па ч. 1 арт. 339 КК (хуліганства), і пакараньне, прадугледжанае па гэтым артыкуле – 3 гады пазбаўленьня волі. Мерай стрыманьня пракуратура абрала ўтрыманьне пад вартай, да суду Зьміцер Касьпяровіч знаходзіўся ў СІЗА г. Менску.

Затрыманыя ў межах гэтай справы Павал Батуеў і Зьміцер Гаўрусік пасьля праведзеных сьледчых дзеяньняў (допыты, вобшукі) былі адпушчаныя на свабоду без прад'яўленьня абвінавачаньня, справа супраць іх была спыненая.

27 лютага суд Маскоўскага раёну Менску вынес рашэньне па справе Зьмітра Касьпяровіча – арышт тэрмінам на пяць месяцаў. Актывіст не пагадзіўся з абвінавачваньнем і заявіў, што гатовы адказваць за зьнявагу дзяржаўнага сьцягу, але не за хуліганства. Прысуд быў абскарджаны адвакатам у касацыйным парадку ў судовай калегіі па крымінальных справах Менскага гарадзкога суду, аднак скарга была пакінутая без задавальненьня, а прысуд бязь зьменаў.

Пакараньне Зьміцер адбываў у турме г. Жодзіна. 28 красавіка 2006 г. быў вызвалены ўмоўна-датэрмінова.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

SIARHIEJ KAWALENKA

Siarhiej Kawalenka to białoruski działacz społeczny, członek opozycyjnej Partii Konserwatywno-Chrześcijańskiej „Białoruski Front Ludowy". Urodził się 16 stycznia 1976 roku, mieszka w Witebsku. Z wykształcenia jest technikiem programistą i prywatnym przedsiębiorcą – zajmuje się remontem mieszkań. Jest ojcem dwójki dzieci – Walancina i Wiki.

KRONIKA REPRESJI

W prawosławne Boże Narodzenie, 7 stycznia 2011 r. Siarhiej Kawalenka wywiesił narodową biało-czerwono-białą białoruską flagę na 40-metrowej choince w Witebsku. Od tej pory Siarhiej Kawalenka i jego najbliżsi są stale prześladowani przez władze.

Kawalenka został zatrzymany tego samego dnia ok. godz. 13:00 na Placu Zwycięstwa w Witebsku. Decyzją prokuratora miasta Witebsk 10 stycznia Kawalenka został aresztowany na 2 miesiące. 13 marca 2011 r. zmieniono wobec niego środek zapobiegawczy – uwolniono go z aresztu, ale otrzymał zakaz opuszczania miasta.

Wyrok w sprawie Siarhieja Kawalenki został wydany przez Sąd Oktiabrski w Witebsku. Oskarżyciel z urzędu, Dzmitrij Rudkow, żądał 3 lat „chemii" dla Siarhieja Kawalenki. Sędzia Jewgienij Burunow skazał go właśnie na taką karę – karę 3 lat „chemii" w miejscu zamieszkania. Sąd zobowiązał również Kawalenkę do wypłacenia rekompensat w wysokości 1 mln rubli białoruskich milicjantom Iwanowowi i Polityce, 1,5 mln milicjantowi Maksimowowi, 1,222 mln rubli przedsiębiorstwu „Gorsvet" za zniszczone oświetlenie i 62 tys. rubli przedsiębiorstwu „Zielienastroj".

Sędzia chciał zakończyć proces 13 maja, jednak ze względu na zły stan zdrowia Kawalenki ogłoszenie wyroku zostało przeniesione na kolejny dzień. Lekarze z pogotowia ratunkowego wezwani do oskarżonego stwierdzili u niego bardzo wysokie ciśnienie i udzielili mu pomocy.

Działacze praw człowieka od samego początku podkreślali, że sprawa karna przeciwko Kawalence jest motywowana politycznie i podejmowali szereg działań w celu oczyszczenia go z zarzutów i uwolnienia.

Za złamanie zasad odbywania kary Kawalenka został aresztowany 19 grudnia 2011 r., a 24 lutego 2012 r. Sąd Pierwomajski skazał go na 25 miesięcy więzienia. Od chwili zatrzymania Kawalenka rozpoczął strajk głodowy, który po wielu tygodniach został przerwany przymusowym karmieniem. Głodówka doprowadziła do nieodwracalnych zmian w jego organizmie. W czasie głodówki Kawalenka schudł 30 kilogramów.

Stan zdrowia Kawalenki był niezwykle poważny, a białoruskie władze odmówiły opozycjoniście opieki medycznej i dostępu do niezależnego lekarza specjalisty. 10 kwietnia sąd w Witebsku zdecydował o przeniesieniu Kawalenki do cywilnego szpitala psychiatrycznego w Mińsku. Nie dano mu jednak szansy na zregenerowanie sił – już na początku maja opozycjonista został ponownie umieszczony w więzieniu i wznowił głodówkę. 18 maja sąd w Witebsku odrzucił apelację Kawalenki. Niedługo potem został on przeniesiony do oddziału kwarantanny Kolonii Karnej nr 19 w Mohylewie, a zaraz później, bez uprzedniego badania lekarskiego, do zwykłego oddziału kolonii. Kawalenka wyszedł na wolność 26 września, jednak informacja o tym dotarła do mediów dopiero rano 27 września. Siarhiej Kawalenka został uwolniony na podstawie prośby o ułaskawienie.

СЯРГЕЙ КАВАЛЕНКА

Сяргей Каваленка – сябра Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ (КХП-БНФ).

Нарадзіўся 16 студзеня 1975 году. Жыхар Віцебску. Прыватны прадпрымальнік, займаўся рамонтам памяшканьняў на замову. Бацька дваіх малалетніх дзяцей.

Пасьля хвалі рэпрэсіяў за Плошчу-2010 ўзьняў многім людзям настрой – якраз на Каляды вывесіў на вершаліне 40-мэтровай навагодняй елкі на цэнтральнай плошчы Віцебску нацыянальны беларускі сьцяг, які лічыцца сьцягам супраціву. Гэта здарылася прыкладна апоўдні 7 студзеня 2010 г.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Сяргей быў затрыманы у той жа дзень каля 13 гадзінаў на плошчы Перамогі ў Віцебску. Пра 3 дні, 10 студзеня, згодна з пастановай пракурора Віцебску, Каваленка быў зьмешчаны ў СІЗА на два месяцы. 13 сакавіка 2011 г. быў вызвалены пад падпіску аб нявыезьдзе.

Прысуд Сяргею Каваленку вынесены ў Кастрычніцкім судзе Віцебску. Дзяржабвінаваўца Зьміцер Рудакоў запрасіў для Сяргея Каваленкі тры гады «хіміі». Судзьдзя Яўген Буруноў прысудзіў тры гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Таксама суд абавязаў Каваленку сплаціць маральную кампэнсацыю: міліцыянтам Іванову і Палітыку – па мільёне, а таксама Максімаву – 1,5 мільёна; прадпрыемству «Гарсьвятло» за пашкоджаную ілюмінацыю – 1 мільён 222 тысячы рублёў і 62 тысячы рублёў – «Зелянбуду».

Судзьдзя намагаўся завяршыць працэс 13 траўня, аднак па прычыне кепскага стану здароўя падсуднага пагадзіўся перанесьці суд на наступны дзень. Выкліканыя ў суд лекары хуткай дапамогі дыягнаставалі ў Каваленкі высокі ціск і зрабілі яму неабходныя ўколы.

Праваабаронцы з самага пачатку адзначалі, што крымінальная справа, ўзбуджаная за вывешваньне нацыянальнага сьцяга, – палітычна матываваная, і прымалі захады да вызваленьня Сяргея Каваленкі з-пад варты. Перад пачаткам судовага пасяджэньня Праваабарончы цэнтар «Вясна» прыняў заяву ў сувязі з палітычна матываваным крымінальным перасьледам С. Каваленкі.

Другі раз Сяргей быў затрыманы па абвінавачаньні ў парушэньні рэжыму адбыцьця пакараньня, прысуджанага яму за вывешваньне сьцягу. З 22 сьнежня 2011 г. актывіст КХП утрымліваўся ў СІЗА г. Віцебску. Яшчэ раней, 19 сьнежня, ён абвесьціў галадоўку пратэсту.

12 студзеня 2012 г. суд Кастрычніцкага раёну Віцебску пакараў Сяргея штрафам у 140 тысяч рублёў, прызнаўшы вінаватым у хуліганстве – абразе інспэктару па выкананьні пакараньняў, у якога яму патрэбна было адзначацца.

24 лютага 2012 г. судзьдзя Першамайскага райсуду г. Віцебску Алена Жук пакарала Сяргея Каваленку зьняволеньнем у калёніі агульнага рэжыму тэрмінам 2 гады 1 месяц. Працэсуальныя дзеяньні доўга не маглі распачацца з-за кепскага фізычнага стану падсуднага, які два месяцы галадаў за кратамі, а таксама з-за пратэстаў прысутных людзей, якіх на наступны дзень не пусьцілі ў будынак.

Пасьля прысуду Каваленка ізноў распачаў ужо спыненую ім днямі галадоўку. Перад тым, як вязьня перавялі ў Магілёўскую калёнію, ён пасьпеў патрапіць у Рэспубліканскі турэмны шпіталь і псыхіятрычную лякарню ў Навінках. Галадоўкі Сяргея Каваленкі агулам доўжыліся каля 3 месяцаў, за час якіх ён схуднеў на 40 кілаграмаў.

Увечары 26 верасьня 2012 г. Сяргей Каваленка вызвалены з калёніі № 19 г. Магілёву.

Палітвязень быў памілаваны кіраўніком дзяржавы. Прашэньне аб памілаваньні Сяргей напісаў пад ціскам, які доўжыўся некалькі месяцаў. Яго некалькі разоў кідалі ў карцар, а таксама шантажавалі сынам.

JURIJ KAZAK

Jurij Kazak to działacz Białoruskiej Chrześcijańskiej Demokracji w Nowogródku w obwodzie grodzieńskim.

KRONIKA REPRESJI

12 listopada 2009 r. Jurij Kazak został przesłuchany w sprawie karnej, wszczętej w związku z akcją w rocznicę Rewolucji Październikowej w Nowogródku, gdzie w nocy z 6 na 7 listopada pomnik Lenina został oblany zieloną farbą. W związku z tym zdarzeniem zatrzymano kilkoro działaczy BCHD.

Kazaka bronił adwokat Paweł Sapiełka. Śledczy poinformował Jurija Kazaka, że przeciwko niemu została wszczęta sprawa karna z artykułu 339 KK, pkt 1 – „Chuligaństwo".

11 stycznia 2010 r. sąd w Nowogródku skazał Kazaka na karę grzywny w wysokości 250 płac minimalnych (8 mln 750 tys. rubli) i zobowiązał skazanego do uiszczenia tej kwoty w ciągu miesiąca. 3 dni po wydaniu wyroku, 14 stycznia, do mieszkania, w którym mieszkał Kazak z rodziną przyszedł komornik. W domu była żona działacza z niemowlakiem – Jurij Kazak zaledwie dzień wcześniej zabrał ich z porodówki. Kazakowi zarekwirowano część majątku.

ЮРЫ КАЗАК

Юры Казак – актывіст Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі з г. Наваградку Гарадзенскай вобласьці.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

12 лістапада 2009 г. Юры Казак быў дапытаны па крымінальнай справе, заведзенай у сувязі з акцыяй на гадавіну кастрычніцкага перавароту ў Наваградку: у ноч з 6 на 7 лістапада помнік Леніну быў абліты зялёнай фарбай. З гэтай нагоды тады ж былі затрыманыя моладзевыя актывісты БХД.

Актывіста БХД абараняў адвакат Павал Сапелка. Сьледчы паведаміў Юрыю Казаку, што супраць яго ўзбуджаная крымінальная справа па частцы 1-й артыкулу 339 КК – «хуліганства».

11 студзеня 2010 г. наваградзкі суд пакараў Юрыя Казака штрафам у памеры 250 базавых велічыняў (8 млн. 750 тысячаў рублёў), абавязаўшы выплаціць іх за адзін месяц.

Праз тры дні пасьля вынясеньня прысуду, 14 студзеня, на кватэру Юрыя, дзе ён пражываў разам зь сям'ёй, прыйшлі апісваць маёмасьць судовыя прыставы. Пры гэтым у хаце знаходзіліся жонка актывіста і немаўля, якіх Юрый толькі за дзень да прыходу прыставаў – 13 студзеня – забраў з радзільні. У Казака апісалі частку маёмасьці.

ALEKSANDER KAZAKAU

Aleksander Kazakau jest działaczem młodzieżowego ruch „Żubr". Do organizacji wstąpił, będąc jeszcze w 9 klasie. Urodził się w 1986 roku w Borysowie, w obwodzie mińskim. Studiował zaocznie informatykę i radioelektronikę na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. Był również aktywnym uczestnikiem ruchu skautów w Krupkach, w obwodzie mińskim.

KRONIKA REPRESJI

Razem z innym członkiem organizacji „Żubr", Dzmitrijem Zubrem, został zatrzymany w centrum Mińska w nocy z 27 na 28 grudnia 2005 r. Młodzi ludzie pisali na murach liczbę „16" – symbol solidarności z więźniami politycznymi na Białorusi. Było to także wezwanie do udziału w Dniach Solidarności, które odbywają się 16-go każdego miesiąca w wielu miastach na Białorusi, a także poza jej granicami. Podczas zatrzymania mężczyźni próbowali uciec, jednak nie udało im się to. Aleksander Kazakau został dotkliwie pobity, później lekarze stwierdzili u niego złamanie przegrody nosowej. Ponad 2 dni był przetrzymywany w areszcie tymczasowym, skąd wypuszczono go z zakazem opuszczania miejsca zamieszkania.

Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 363, pkt 2 KK – „Stawianie oporu funkcjonariuszom milicji". 7 kwietnia 2006 r. sędzia Walerij Jesman uznał Kazakaua winnym i wydał wyrok 2 lat ograniczenia wolności. 9 maja 2006 r. Aleksander Kazakau opuścił Białoruś. Studiował informatykę na Uniwersytecie Warszawskim.

АЛЯКСАНДАР КАЗАКОЎ

Аляксандар Казакоў – актывіст моладзевага руху «Зубр», у які прыйшоў яшчэ ў 9-м клясе сярэдняй школы. Нарадзіўся ў г. Барысаве Менскай вобласьці ў 1986 годзе. Навучаўся завочна ў Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце інфарматыкі і радыёэлектронікі (БДУІР). Быў таксама актыўным удзельнікам скаўцкага руху ў Крупках Менскай вобласьці.



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN


ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Разам зь іншым «зуброўцам», Зьмітром Зубро, быў затрыманы ў цэнтры Менску ў ноч на 28 сьнежня 2005 году за палітычныя графіці – напісаньне лічбы «16», якая заклікае да ўдзелу ў Дні салідарнасьці з палітвязьнямі. Пры затрыманьні Аляксандар быў зьбіты, пазьней дактары знайшлі ў 20-гадовага хлопца пералом носа.

Больш за двое сутак Аляксандар правёў у ізалятары часовага ўтрыманьня, пасьля быў адпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе. Балёнчыкаў з фарбай пры затрыманых не знайшлі.

Быў абвінавачаны па ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодэксу – «аказаньне супраціву супрацоўніку міліцыі». Справа ў тым, што перад затрыманьнем маладыя людзі спачатку зьбеглі ад міліцыі за рог бліжэйшага дому. Але калі пайшлі пехам, думаючы, што пагоня скончылася, міліцыянты іх дагналі. Спачатку Зьмітра, а потым і Аляксандра зьбілі з ног, і лежачы на зямлі, яны не аказвалі ніякага супраціву. Тым больш, што абодвум закавалі рукі ў кайданкі.

7 красавіка 2006 г. судзьдзя суда Цэнтральнага р-ну г. Менску Валеры Есьман асудзіў Аляксандра Казакова да 2 гадоў абмежаваньня волі. Неўзабаве (9 траўня 2006 г.) Аляксандар зьехаў за межы Рэспублікі Беларусь. Пасьля гэтага ён вучыўся ў Варшаўскім унівэрсытэце па спэцыяльнасьці «інфарматыка».



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

SIARHIEJ KAZAKAU

Siarhiej Kazakau, działacz kampanii obywatelskiej „Europejska Białoruś", urodził się 12 lutego 1992 r. w Leninogorsku w Rosji. Po rozwodzie rodziców mieszkał w Mińsku, w ojczyźnie matki. Ukończył Szkołę Średnią nr 85 w Mińsku. Jeszcze w młodszych klasach starał się napisać książkę. Pasjonował się muzyką, brał udział w konkursach muzycznych. Samodzielnie nauczył się grać na gitarze zwykłej i basowej, był gitarzystą w grupach rockowych (w jednej z nich grał w 2010 r. aż do aresztowania). Twórczość muzyczna to jego ulubione zajęcie, któremu niezwykle się poświęcał. Pracował w różnych miejscach, by pomóc matce, która wychowywała go sama. Planował rozpoczęcie studiów na Akademii Muzycznej. Po odzyskaniu wolności kontynuował swoją przygodę z muzyką. Wraz z kolegami muzykami organizował koncerty.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany 27 stycznia 2011 r. w charakterze podejrzanego w sprawie „o masowe zamieszki". Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 293 Kodeksu Karnego. Kazakau został umieszczony w areszcie śledczym na Wołodarce w Mińsku. 12 maja 2011 r. sąd skazał Kazakaua na 3 lata pozbawienia wolności. W czerwcu 2011 r. został przeniesiony do kolonii karnej w Bobrujsku w obwodzie mohylewskim. 11 sierpnia 2011 r. został ułaskawiony na mocy rozporządzenia Łukaszenki. Wyszedł na wolność 13 sierpnia.

СЯРГЕЙ КАЗАКОЎ

Актывіст грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь». Нарадзіўся 12 лютага 1992 году ў г. Ленінагорску ў Расеі. З гадавалага ўзросту пасьля разводу бацькоў жыў у Менску, на радзіме маці. Скончыў менскую сярэднюю школу № 85. Яшчэ ў малодшых класах школы спрабаваў напісаць сваю кнігу. Захапіўся музыкай, быў удзельнікам КВЗ і музычных конкурсаў. Граць на гітары і бас-гітары навучыўся самастойна, быў гітарыстам у рок-гуртах (у адным зь іх граў і ў 2010 г. ажно да свайго арышту). Музычная творчасьць – яго любімы занятак, у які ён укладае душу. Працаваў у розных месцах, каб дапамагаць маці, якая выгадавала яго адна. Зьбіраўся паступаць вучыцца ў музычную навучальную ўстанову. Пасьля вызваленьня працягнуў занятки музыкай, зладзіў зь сябрамі-музыкамі канцэрт.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы 27 студзеня 2011 г. у якасьці падазраванага па справе аб масавых беспарадках. Сяргею было прад'яўленае абвінавачаньне па арт. 293 КК. Малады чалавек быў зьмешчаны пад варту ў СІЗА № 1 на вул. Валадарскага ў Менску.

12 траўня 2011 г. у судзе Маскоўскага раёну Менску Сяргей Казакоў асуджаны на 3 гады пазбаўленьня волі. У чэрвені 2011 г. пераведзены для адбыцьця пакараньня ў калёнію г. Бабруйску Магілёўскай вобласьці.

11 жніўня 2011 г. быў памілаваны ўказам А. Лукашэнкі. 13 жніўня выйшаў на волю.

ALEKSANDER KAZULIN



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Aleksander Kazulin był kandydatem na prezydenta Republiki Białoruś w wyborach 19 marca 2006 r. i rektorem Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego.

Urodził się 25 listopada 1955 r. w Mińsku. Służył w piechocie morskiej Floty Bałtyckiej, po demobilizacji pracował w MTW. Ukończył z wyróżnieniem studia na Wydziale Mechaniki i Matematyki Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Pracował jako wykładowca na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym, w latach 1996–2003 pełnił funkcję dziekana, a następnie rozpoczął pracę w Ministerstwie Edukacji.

W kwietniu 2005 r. został przewodniczącym Białoruskiej Partii Socjaldemokratycznej „Hramada". W tym samym roku, założył inicjatywę obywatelską „Wola ludu". W wyborach prezydenckich w 2006 r. był kandydatem na prezydenta.

KRONIKA REPRESJI

Aleksander Kazulin został aresztowany 25 marca 2006 r. w czasie rozpędzania manifestacji na Alei Dzierżyńskiego w Mińsku. Został uwięziony za organizowanie protestów przeciwko sfałszowanym wyborom prezydenckim oraz obchodów „Dnia Woli".

13 lipca 2006 r. sąd w Mińsku skazał Kazulina na 5,5 roku więzienia za chuligaństwo (art. 339, pkt 2 KK RB) i „organizowanie zgromadzeń, które łamią porządek publiczny lub udział w takich zgromadzeniach" (art. 342, pkt 1. białoruskiego KK).

W więzieniu, Aleksander Kazulin rozpoczął strajk głodowy, domagał się, by sprawa wydarzeń na Białorusi została podniesiona na forum Rady Bezpieczeństwa ONZ. Więzień kontynuował strajk głodowy 53 dni, w czasie których stracił ponad 40 kilogramów, a jego zdrowie zostało bezpowrotnie zniszczone. Kazulin osiągnął swój cel – przedstawiciel Stanów Zjednoczonych podniósł kwestię białoruską podczas Rady Bezpieczeństwa ONZ.

Wyrok odbywał w więzieniu „Witba-3" 9 km od Witebska. Został uwolniony 16 sierpnia 2008 r. na mocy prezydenckiego aktu o ułaskawieniu.

Аляксандар Казулін

Кандыдат на пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь падчас выбараў 19 сакавіка 2006 году. Былы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.

Аляксандар Казулін нарадзіўся 25 лістапада 1955 г. у Менску. Прафэсар, доктар навук. Служыў на Балтыйскім флёце ў марской пяхоце, пасьля дэмабілізацыі працаваў на МТЗ. Скончыў з чырвоным дыплёмам мэханіка-матэматычны факультэт БДУ. Быў сакратаром камітэту камсамолу БДУ. Працаваў у БДУ выкладчыкам, дэканам факультэту, потым – у Міністэрстве адукацыі начальнікам аддзелу, намесьнікам і першым намесьнікам міністра.

У 1996–2003 гг. – рэктар Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. У красавіку 2005 г. абраны старшынём Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Грамада». У тым жа годзе стаў заснавальнікам і каардынатарам грамадзянскай ініцыятывы «Воля народу». На прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. быў кандыдатам на пасаду прэзыдэнта Беларусі.

Храналёгія перасьледу

Аляксандар Казулін быў затрыманы 25 сакавіка 2006 г. падчас разгону шэсьця на праспэкце Дзяржынскага ў Менску. Трапіў у вязьніцу за арганізацыю акцый пратэсту супраць фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў і адзначэньне Дня Волі.

13 ліпеня 2006 г. Маскоўскі райсуд Менску прысудзіў Аляксандра Казуліна да 5,5 гадоў турэмнага зьняволеньня.

У турме Аляксандар Казулін абвясьціў галадоўку, патрабуючы разгляду беларускага пытаньня ў Радзе бясьпекі ААН. Палітвязень галадаў 53 дні, страціўшы больш за 40 кіляграмаў вагі, беззваротна падарваў здароўе. Мужны палітык дамогся сваёй мэты – прадстаўнік ЗША падняў беларускай пытаньне ў Радзе бясьпекі ААН.

Адбываў тэрмін пакараньня ў калёніі «Віцьба-3» у 9 км ад Віцебску. Выйшаў на волю 16 жніўня 2008 г. паводле ўказу Лукашэнкі аб памілаваньні.

21 сьнежня 2008 г. Казулін заявіў аб выхадзе з БСДП(Г).

У часе зьняволеньня 23 лютага 2008 г. памерла ад сьмяротнай хваробы яго жонка Ірына Казуліна, разьвітацца зь якой пры жыцьці Аляксандру Казуліну не давялося – яго адпусьцілі з турмы 26 лютага, літаральна ў апошні момант, на яе пахаваньне.

15 жніўня 2008 г. пад ціскам эканамічных санкцыяў кіраўніком Беларусі А. Лукашэнкам быў падпісаны ўказ аб памілаваньні Аляксандра Казуліна. На наступны дзень Казуліна выклікала адміністрацыя калёніі «Віцьба-3». Падпісаць дакумэнт аб уласным памілаваньні ён адмовіўся, бо не прызнаваў сваёй віны. 17 жніўня Аляксандар Казулін выйшаў на волю.

Ryhor Kijko

Ryhor Kijko to artysta malarz, weteran Białoruskiego Frontu Ludowego, jeden z inicjatorów budowy pomnika w Kuropatach. Urodził się 27 czerwca 1951 r. we wsi Celujkowo, w obwodzie ługańskim na Ukrainie, w rodzinie nauczycieli. Jego rodzina z czasem przeprowadziła się na Białoruś, do Bobrujska, skąd pochodziła jego matka. W 1980 r. Ryhor Kijko ukończył Białoruski Instytut Artystyczny jako artysta ceramik. Jest członkiem Białoruskiego Związku Artystów, bierze udział w pracach zrzeszenia Pogoń. Działa w Białoruskim Froncie Ludowym od momentu założenia ruchu i partii. Po podziale partii w 1999 r. został członkiem Konserwatywno-Chrześcijańskiej Partii BFL. Brał udział w wielu ulicznych akcjach. Wykłada, zajmuje się pracą twórczą.

Kronika represji

Ryhor Kijko był wielokrotnie zatrzymywany przez milicję. Wiosną 1996 r. został skazany na 8 dni aresztu za udział w pikiecie solidarności z ukraińskimi przyjaciółmi, zatrzymanymi w Mińsku w czasie „Czarnobylskiego Szlaku".

1 kwietnia 1997 r. Ryhor Kijko został aresztowany i oskarżony o chuligaństwo podczas Dnia Woli, 25 marca. Tego dnia doszło do wielu starć demonstrantów z milicją. Wtedy też zatrzymany został Aleksander Bondariew. W sprawie „Dnia Woli 97" było oskarżonych 5 osób.

Kijko przetrzymywany był przez 3 miesiące w areszcie na Wołodarce, a w lipcu zmieniono mu środek zapobiegawczy – zwolniono go z aresztu z zakazem opuszczania miejsca zamieszkania. Skazano go na 2 lata pozbawienia wolności i skierowano go na roboty przymusowe. 26 kwietnia 1999 r. wyszedł na wolność. Kontynuował działalność polityczną. W Dniu Woli 2000 został zatrzymany w centrum Mińska z żoną i córką. W 2001 r. uczestniczył w obronie Kuropat przed próbami zburzenia pomnika i poprowadzenia przez tamtejszy las drogi.

Рыгор Кійко

Рыгор Кійко – мастак, вэтэран БНФ, адзін зь ініцыятараў стварэньня мэмарыялу ў Курапатах. Нарадзіўся 27 чэрвеня 1951 г. у вёсцы Цалуйкава Луганскай вобласьці Ўкраіны ў настаўніцкай сям'і. Неўзабаве сям'я пераехала на радзіму маці ў Бабруйск. У 1980 г. Рыгор скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут па спэцыяльнасьці мастак-кераміст. Сябра Беларускага саюзу мастакоў, удзельнік суполкі «Пагоня». У Беларускім Народным Фронце ад моманту ўтварэньня руху і партыі. Пасьля расколу БНФ у 1999 г. – сябра Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ.

Удзельнік шматлікіх вулічных акцыяў. Займаецца творчай і выкладчыцкай працай.

Храналёгія перасьледу

Увесну 1996 г. Рыгор Кійко быў асуджаны да васьмі сутак зьняволеньня за ўдзел у пікеце ў падтрымку ўкраінскіх сяброў, затрыманых у Менску падчас Чарнобыльскага шляху.

1 красавіка 1997 г. Рыгор Кійко быў зьняволены і абвінавачаны ў хуліганскіх дзеяньнях падчас сьвяткаваньня Дня Волі 25 сакавіка, якое вылілася ў той дзень у сутычкі зь міліцыяй. Агулам па «справе Дня Волі-97» праходзілі ў якасьці абвінавачаных 5 чалавек.

Утрымліваўся ў менскім СІЗА на вул. Валадарскага тры месяцы, у ліпені 1997 г. быў адпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе.

Асуджаны да двух гадоў абмежаваньня волі з прымусовымі працамі. Адбываў пакараньне ў Зэмбінскай спэцкамэндатуры. 26 студзеня 1999 г. выйшаў на волю. Працягваў палітычную дзейнасьць. На Дзень Волі ў 2000 годзе быў жорстка затрыманы ў цэнтры Менску разам з жонкай і адной з дачок. У 2001 г. быў удзельнікам лягеру абароны Курапатаў ад спробаў зьнесьці мэмарыял.


FOT. JULIA DARASHKEVICH

ANDREJ KIM

Andrej Kim urodził się 26 lutego 1986 r. w Mińsku. Ukończył Liceum Humanistyczne im. Jakuba Kolasy, potem studiował historię na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. Działacz ruchu młodzieżowego i chrześcijańskiego.

KRONIKA REPRESJI

W stosunku do Andreja Kima, jednego z uczestników akcji przedsiębiorców z 21 stycznia 2008 r., wszczęto sprawę karną z artykułu 364 KK RB – „Przemoc, lub groźba jej użycia w stosunku do funkcjonariusza milicji". Artykuł ten przewiduje pozbawienie wolności od 1 roku do 6 lat.

Do tego czasu Andrej Kim był już sądzony na podstawie Kodeksu Administracyjnego. Za każdym razem oskarżany był o drobne chuligaństwo lub niecenzuralne wyrażanie się. Za pierwszym razem – podczas udziału w kampanii wyborczej Andreja Kazulina w 2006 roku – Kim otrzymał 12 dni aresztu. Drugi raz – w 2007 r. po świętowaniu Halloween otrzymał 7 dni aresztu.

22 stycznia 2008 r. sędzia Tatiana Pawluczak uznała Kima winnym dokonania zarzucanego mu przestępstwa i wydała wyrok 10 dni aresztu oraz grzywny w wysokości 1 miliona i 50 tysięcy rubli. 31 stycznia, kiedy skończył się jego areszt, prosto z Okrestiny został przewieziony na przesłuchanie do prokuratury. Jako środek zapobiegawczy zastosowano wobec niego areszt. Był przetrzymywany na Wołodarce.

22 kwietnia 2008 r. sędzia Jeliena Ilina uznała Andreja Kima winnym popełnienia przestępstwa z artykułu 342, pkt 1 – „Organizacja lub aktywny udział w działaniach w poważny sposób naruszających porządek społeczny" i z art. 364 – „Przemoc lub groźba jej użycia w stosunku do funkcjonariuszy organów porządkowych" i wydała wyrok 1,5 roku pozbawienia wolności w kolonii karnej.

21 maja 2008 pojawiły się informacje, że Andrej Kim został przeniesiony do kolonii w Bobrujsku. 20 sierpnia 2008 r. został zwolniony z kolonii na mocy dekretu Łukaszenki.

W grudniu 2010 r. brał udział w wydarzeniach na Placu Niepodległości w Mińsku. Uciekł z Białorusi po 19 grudnia, kiedy w jego mieszkaniu i w pracy rozpoczęły się rewizje. Przebywał w Rosji, Polsce, na Litwie i Ukrainie.

АНДРЭЙ КІМ

Андрэй Кім нарадзіўся 26 лютага 1986 г. у Менску. Скончыў Нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа, пасьля вучыўся на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Актывіст моладзевага і хрысьціянскага руху.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У дачыненьні да моладзевага актывіста Андрэя Кіма, аднаго з удзельнікаў акцыі прадпрымальнікаў 21 студзеня, заведзеная крымінальная справа па арт. 364 КК РБ (гвалт альбо пагроза ўжываньня гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі), які прадугледжвае максымальнае пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі на тэрмін да шасьці гадоў.

Варта адзначыць, што перад тым Андрэй Кім тройчы быў асуджаны паводле Адміністратыўнага кодэксу. Штоche разу яго абвінавачвалі ў дробным хуліганстве і нецэнзурнай лаянцы. Першы раз – у часе ўдзелу ў выбарчай кампаніі Аляксандра Казуліна ў 2006 г., калі Андрэй атрымаў 12 сутак арышту. Другі раз – у 2007 г. пасьля сьвяткаваньня «Хэлоўіну» (7 сутак арышту). Так што затрыманьне 21 студзеня 2008 г. пасьля мітынгу прадпрымальнікаў было ўжо трэцім. Але пасьля гэтых «сутак» Андрэя Кіма абвінавацілі ў «гвалце альбо пагрозе гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі». Спачатку 22 студзеня 2008 г. судзьдзя Цэнтральнага суду Менску Тацяна Паўлючук прызнала Андрэя Кіма вінаватым па двух артыкулах КаАП і вынесла пакараньне ў выглядзе 10 сутак адміністрацыйнага арышту і штрафу ў памеры 30 б.в. (1 млн. 50 тыс. рублёў). А пасьля заканчэньня тэрміну арышту, 31 студзеня, актывіст з «Акрэсьціна» быў дастаўлены на допыт у пракуратуру Цэнтральнага раёну сталіцы. Мерай стрыманьня абранае ўтрыманьне пад вартай, знаходзіўся ў СІЗА на вул. Валадарскага ў Менску.

22 красавіка 2008 г. судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Алена Ільіна прызнала Андрэя Кіма вінаватым па ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак) і арт. 364 КК (гвалт альбо пагроза ўчыненьня гвалту ў адносінах да супрацоўніка праваахоўных органаў) і вынесла прысуд у выглядзе пазбаўленьня волі на тэрмін паўтара года з адбыцьцём пакараньня ў калёніі агульнага рэжыму.

21 траўня 2008 г. стала вядома пра перавод Андрэя Кіма ў бабруйскую калёнію. Вызвалены згодна з указам Аляксандра Лукашэнкі 20 жніўня 2008 г.

У сьнежні 2010 г. – удзельнік Плошчы. Таемна пакінуў Беларусь пасьля акцыі пратэсту 19 сьнежня 2010 году, калі ў яго дома і на працы маці пачалісяператрусы. Хаваўся ў Расеі, Польшчы, Нямеччыне, Летуве і Ўкраіне. Адзін зь нямногіх, хто вярнуўся.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ALEŚ KIRKIEWICZ

Aleś Kirkiewicz jest zastępcą przewodniczącego „Młodego Frontu" i przewodniczącym grodzieńskiej filii organizacji. Urodził się w 1989 r. w Grodnie, w rodzinie historyków. Jego dziadek, Aleksander był znanym w Grodnie krajoznawcą. Po ukończeniu szkoły średniej rozpoczął studia na Wydziale Historycznym Uniwersytetu w Grodnie, na kierunku archeologia. Podjął jednak decyzję o odłożeniu studiów, bowiem za ważniejszą uważał wtedy działalność polityczną.

KRONIKA REPRESJI

Uczestnik akcji protestu 19 grudnia 2010 r. Zatrzymano go 5 dni po Płoszczy za udział w akcji solidarności z więźniami politycznymi 24 grudnia 2010 r. Skazano go na 10 dni aresztu. W tym czasie na Okrestinie przetrzymywano jego przyszłą żonę, studentkę Uniwersytetu w Lublinie, Nadieżdę Krapiwinę, z którą 22 stycznia Kirkiewicz wziął ślub, między jednym a drugim zatrzymaniem. Na wolność wyszedł 3 stycznia, jednak już 3 dni później skazano go na karę grzywny – za organizację wyborczego spotkania kandydata na prezydenta, Mykoły Statkiewicza.

28 stycznia 2011 roku, po rewizji w domu i przesłuchaniu w grodzieńskim oddziale KGB, aresztowano go w związku ze sprawą karną o „masowe zamieszki". Przewieziono go do Mińska i umieszczono w areszcie śledczym KGB. Przedstawiono mu zarzuty z art. 293, pkt 2 KK – „Aktywny udział w masowych zamieszkach". 5 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 4 lata pozbawienia wolności. Po wydaniu wyroku, został osadzony w więzieniu na Wołodarce. Po rozpatrzeniu przez sąd jego apelacji i uprawomocnieniu się wyroku, przeniesiono go do kolonii karnej w Nowopołocku.

1 września 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Aleksandra Łukaszenki.

АЛЕСЬ КІРКЕВІЧ

Намесьнік старшыні «Маладога Фронту», кіраўнік яго Гарадзенскай філіі. Нарадзіўся ў 1989 г. ў Гародні ў сям'і гісторыкаў. Ягоны дзед Аляксандар быў вядомым у Гародні краязнаўцам.

Пасьля школы паступіў на гістарычны факультэт Гарадзенскага ўнівэрсытэту на спэцыяльнасьць «археалёгія». Самастойна вырашыў адкласьці вучобу, бо лічыў больш важнай палітычную дзейнасьць.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Удзельнік акцыі пратэсту 19 сьнежня 2010 г. Быў затрыманы празь пяць дзён пасьля Плошчы – за ўдзел у акцыі салідарнасьці з палітвязьнямі 24 сьнежня 2010 г. пад сьценамі ізалятару ў менскім завулку Акрэсьціна. Асуджаны на 10 сутак арышту. У той час пад арыштам у тым жа ізалятары знаходзілася і яго будучая жонка, студэнтка Люблінскага ўнівэрсытэту (Польшча) Надзея Крапівіна, шлюб зь якой адбыўся 22 студзеня паміж двума зьняволеньнямі. На волю выйшаў 3 студзеня, а праз 3 дні быў пакараны штрафам – за арганізацыю перадвыбарчай сустрэчы кандыдата на прэзыдэнта Міколы Статкевіча.

Арыштаваны па крымінальнай справе 28 студзеня 2011 г. пасьляператрусу ў яго на кватэры і допыту ў Гарадзенскім КДБ па справе аб масавых беспарадках. Перавезены ў Менск і зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Было прад'яўлена абвінавачаньне паводле ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэксу – актыўны ўдзел у масавых беспарадках.

5 траўня 2011 г. у судзе Кастрычніцкага раёну Менску асуджаны на 4 гады пазбаўленьня волі. Пасьля прысуду пераведзены зь СІЗА КДБ ў турму на Валадарскага – туды, дзе ў СІЗА месьцяцца камэры для ўжо асуджаных. Пасьля разгляду касацыйнай скаргі быў накіраваны ў калёнію г. Наваполацку.

Памілаваны ўказам кіраўніка дзяржавы Лукашэнкі 1 верасьня 2011 г. і вызвалены.



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

ALEKSANDER KLASKOUSKI

Urodził się 26 września 1978 r. Ukończył Szkołę Średnią nr 55 w Mińsku, rozpoczął studia na kierunku dziennikarskim Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego, potem uzyskał wyższe wykształcenie prawnicze. W 1999 r. po ukończeniu służby wojskowej ożenił się z Natalią – dziewczyną, z którą poznał się dzięki swoim wyjazdom do babci w Biełyniczy. Obecnie wychowują trójkę dzieci.

W 1999 r. rozpoczął służbę w milicji, w drogówce leninskiego rejonu Mińska. Aleksander nie był zwykłym milicjantem, wyróżniał się spośród kolegów, rozmawiał po białorusku, starał się sporządzać protokoły w swoim ojczystym języku, przynosił niezależną prasę, co nie podobało się szefostwu. Podczas służby (w latach 1999–2005) zatrzymał uzbrojonych złodziei, za co otrzymał nagrodę. Zajmował pierwsze miejsca na zawodach sportowych. W 2005 r. nieoczekiwanie porzucił pracę w milicji.

KRONIKA REPRESJI

Cały świat obiegły kadry, na których widać, jak Aleksander w milicyjnym mundurze stara się powstrzymać funkcjonariuszy Specnazu podczas pacyfikacji Płoszczy 2010. Zatrzymany noc później, 21 grudnia, został dotkliwie pobity. Umieszczono go w areszcie KGB, przedstawiono mu zarzuty z trzech artykułów Kodeksu Karnego.

26 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 5 lat kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. Wyrok odbywał w kolonii w Szkłowie. Został ułaskawiony i zwolniony z kolonii 14 września 2011 r. Jest synem i bratem znanych dziennikarzy – Aleksandra, Ludmiły i Olgi Klaskouskich. Siostra Olga, która już wcześniej otrzymała azyl polityczny w jednym z europejskich krajów, próbowała wrócić na Białoruś, by wesprzeć brata, jednakże pod presją prześladowań milicji opuściła kraj latem 2011 r.

АЛЯКСАНДАР КЛАСКОЎСКІ

Нарадзіўся 26 верасьня 1978 году. Скончыў Менскую сярэднюю школу № 55, паступіў на факультэт журналістыкі БДУ, потым атрымаў вышэйшую юрыдычную адукацыю. У 1999 г. пасьля войска ажаніўся з Натальляй – дзяўчынай, зь якой пазнаёміўся дзякуючы паездкам у Бялынічы да сваёй бабулі. Зараз у іх сям'і гадуецца трое дзяцей.

У 1999 годзе паступіў на службу ў ДАІ Ленінскага раёну Менску ў якасьці інспэктара ДПС. Аляксандар быў нязвыклым міліцыянтам, бо вельмі вылучаўся сярод іншых супрацоўнікаў РУУС. На працы часта размаўляў па-беларуску, імкнуўся складаць пратаколы на роднай мове, прыносіў незалежную прэсу, што не падабалася кіраўніцтву. Падчас службы (у 1999–2005 гг.) затрымаў узброеных угоншчыкаў і быў узнагароджаны за гэта дзяржаўнай прэміяй. Займаў першыя месцы на спартовых спаборніцтвах, выступаючы за гонар свайго райаддзелу. У 2005 г. вымушана пакінуў МУС у чыне лейтэнанта міліцыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Увесь сьвет абляцелі кадры, на якіх Аляксандар у міліцэйскай форме спрабуе спыніць разьюшаны спэцназ падчас разгону Плошчы-2010. Ён быў затрыманы ў сябе дома наступнай ноччу – на 21 сьнежня 2010 г. Пры гэтым быў моцна зьбіты. Зьмешчаны пад варту ў СІЗА КДБ, абвінавачаны па трох крымінальных артыкулах.

26 траўня 2011 г. у Ленінскім судзе Менску асуджаны да 5 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываў пакараньне ў Шклове. Быў памілаваны і вызвалены з шклоўскай калёніі 14 верасьня 2011 г.

Сын і брат вядомых журналістаў Аляксандра, Людмілы, Вольгі Класкоўскіх. Сястра Вольга, якая раней атрымала палітычны прытулак у адной з краін Эўропы, спрабавала вярнуцца на Бацькаўшчыну, каб падтрымаць брата, але пад ціскам новага перасьледу з боку міліцыі зноў пакінула краіну ўлетку 2011 г.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ANDREJ KLIMAU

Andrej Klimau to znany biznesmen, deputowany Najwyższej Rady Republiki Białoruś XIII Kadencji, członek specjalnej Komisji Parlamentarnej Do Spraw Naruszeń Prawnych Prezydenta RB Aleksandra Łukaszenki, Konstytucji i Prawa RB. Jest jednym z inicjatorów impeachmentu wobec prezydenta Łukaszenki w listopadzie 1996 r. i członkiem Zjednoczonej Partii Obywatelskiej.

Z powodów politycznych Andrej Klimau był aresztowany trzy razy.

Urodził się 17 września 1965 r. w Mińsku. Ukończył Lwowskie Techniczne Kolegium MSW (1986). Służył w organach spraw wewnętrznych (1983–1991), był dyrektorem małego przedsiębiorstwa (Mińsk), prezesem zarządu spółki akcyjnej (1991–1996).

W połowie lat 90. Andrej Klimau był w pierwszej piątce najbardziej znanych białoruskich przedsiębiorców, kierował spółką akcyjną Andrej Klimow & Co., która zajmowała się budownictwem, wykonywała duże zamówienia publiczne. Został wybrany deputowanym do Najwyższej Rady XIII Kadencji (był członkiem Komisji Polityki Gospodarczej i Reform).

KRONIKA REPRESJI

Po referendum w 1996 r. rozpoczęły się masowe kontrole działalności firmy. Aby odnaleźć dowody obciążające zaangażowano pracowników KGB, MSW, Rady Bezpieczeństwa RB i administracji prezydenta.

11 lutego 1998 r. Andrej Klimau został aresztowany i oskarżony na podstawie dwóch artykułów karnych: 91, pkt 4 KK RB – „Kradzież na dużą skalę" i 151, pkt 2 KK RB – „Naruszenie porządku związanego z działalnością gospodarczą, dokonane po wcześniejszym uzgodnieniu". W areszcie śledczym Klimau ogłosił strajk głodowy w proteście przeciwko naruszeniom Konstytucji z 1994 r., zgodnie z którą miał prawo do immunitetu poselskiego. Rada XIII Kadencji kilka razy nalegała na to, by zwolnić radnego Klimaua z nielegalnego aresztu.

Na krótko przed aresztowaniem, Andrej Klimau jako poseł, napisał i rozesłał pismo – odezwę do przywódców różnych stopni z informacją o naruszeniach, których dopuścił się Aleksander Łukaszenka wobec Konstytucji i prawa Republiki Białoruś. Pismo zawiera uprzedzenie o odpowiedzialności i wezwanie do niewypełniania rozkazów Łukaszenki, który w listopadzie 1996 r. dokonał zamachu stanu. W liście Klimau przypominał o tym, że referendum w 1996 r. nie zostało legitymizowane. Aresztowano go następnego dnia po posiedzeniu komisji, która poinformowała, że istnieją wystarczające podstawy prawne do rozpoczęcia nowej procedury impeachmentu. W trakcie śledztwa Klimau odmówił zeznań, powołując się na bezprawne zatrzymanie.

Po roku i 5 miesiącach śledztwa, w sierpniu 1999 r. rozpoczęło się postępowanie sądowe. Do oskarżenia doszły jeszcze dwa artykuły: art. 171 KK RB – „Fałszerstwo" i art. 150, pkt 2 – „Wyłudzenie kredytu lub dotacji". 13 grudnia 1999 r. Klimau został brutalnie pobity i siłą zabrany na przesłuchanie do Leninskiego Sądu Rejonowego w Mińsku. Wstępne orzeczenie lekarzy ujawniło uraz czaszkowo-mózgowy i urazy brzucha. 24 grudnia Prokuratura RB odmówiła wszczęcia w tej sprawie postępowania karnego.

17 marca 2000 r. Andrej Klimau został skazany na 6 lat pozbawienia wolności. 25 marca 2002 r. wyszedł na wolność na warunkowe przedterminowe zwolnienie.

Drugi raz został aresztowany w grudniu 2005 r. za akcję „Rewolucja" przed Dniem Woli na Placu Październikowym w Mińsku. Po zwycięstwie Pomarańczowej Rewolucji na Ukrainie Andrej Klimau ogłosił, że białoruska rewolucja odbędzie się 25 marca 2005 r. Władze spacyfikowały zorganizowany przez niego 25 marca protest na Placu Październikowym w Mińsku. 10 czerwca 2005 r. sąd uznał Klimaua winnym organizacji grupowych działań zakłócających porządek publiczny i skazał go na rok i sześć miesięcy pozbawienia wolności. Został zwolniony 22 grudnia 2006 r.

Po raz trzeci Klimau został aresztowany 3 kwietnia 2007 r. za „podżeganie do obalenia ustroju państwowego", które rzekomo pojawiło się w artykule opublikowanym na stronie internetowej charter97.org (art. 361 KK RB). W sierpniu 2007 r. Główny Sąd w Mińsku wydał utajniony wyrok: 2 lata pozbawienia wolności w kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. Dziennikarze dowiedzieli się o tym wyroku po upływie miesiąca. Do tej pory informowano ich, że sprawa Klimaua jest nadal w toku. Wyrok odbywał się w mozyrskiej kolonii o zaostrzonym rygorze. Zwolniony 15 lutego 2008 r. na podstawie dekretu Aleksandra Łukaszenki.

АНДРЭЙ КЛІМАЎ

Андрэй Клімаў – вядомы бізнэсовец, дэпутат Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь 13-га скліканьня, сябра адмысловай парлямэнцкай «Камісіі па прававой ацэнцы парушэньняў Прэзыдэнтам РБ А. Лукашэнкам Канстытуцыі і законаў РБ». Адзін зь ініцыятараў імпічмэнту прэзыдэнту Лукашэнку ў лістападзе 1996 г. Сябра АГП.

Па палітычных матывах Андрэй Клімаў быў зьняволены тройчы.

Нарадзіўся 17 верасьня 1965 году ў Менску. Скончыў Львоўскую пажарна-тэхнічную вучэльню МУС (1986 г.). Служыў у органах унутраных справаў (1983–1991 гг.), быў дырэктарам малога прадпрыемства (Менск), старшынём праўленьня акцыянэрнага таварыства «Андрэй Клімаў і К°» (1991–1996 гг.).

У сярэдзіне 1990-х гадоў Андрэй Клімаў уваходзіў у пяцёрку самых вядомых беларускіх прадпрымальнікаў. Андрэй Клімаў узначальваў акцыянэрнае таварыства «Андрэй Клімаў і К°», якое займалася будаўніцтвам, выконвала буйныя дзяржаўныя замовы, а таксама банк і газэту. Быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня (быў сябрам Камісыі па эканамічнай палітыцы і рэформах).

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Пасьля рэфэрэндуму 1996 г. пачаліся масіраваныя праверкі прадпрымальніцкай дзейнасьці фірмы. Дзеля таго, каб знайсьці кампрамат, былі задзейнічаныя супрацоўнікі КДБ, МУС, Савету бясьпекі РБ, Адміністрацыі прэзыдэнта.

11 лютага 1998 г. Андрэй Клімаў быў арыштаваны і абвінавачаны па двух крымінальных артыкулах: 91 ч. 4 КК РБ – «крадзеж у асабліва буйных памерах» і 151 ч. 2 КК РБ – «парушэньне парадку ажыцьцяўленьня прадпрымальніцкай дзейнасьці, учыненае па папярэдняй змове». У СІЗА Клімаў абвесьціў галадоўку на знак пратэсту супраць парушэньня Канстытуцыі 1994 году, згодна зь якой ён меў права дэпутацкай недатыкальнасьці. У адпаведнасьці з Законам РБ «Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь» ад 21 сьнежня 1994 г., арт. 106, «дэпутат Вярхоўнага Савету ня можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці, арыштаваны, іншым спосабам пазбаўлены асабістай свабоды бяз згоды Вярхоўнага Савету, акрамя выпадкаў затрыманьня на месцы ўчыненьня злачынства. Крымінальная справа супраць дэпутата ВС можа быць узбуджаная

Генэральным пракурорам са згоды ВС, а ў пэрыяд паміж сэсіямі – са згоды Прэзыдыюма ВС». Вярхоўны Савет 13-га скліканьня некалькі разоў патрабаваў, наадварот, вызваліць дэпутата Клімава з-пад незаконнага арышту.

Незадоўга да свайго арышту Андрэй Клімаў як дэпутат напісаў і размножыў ліст-зварот да кіраўнікоў рознага рангу зь інфармацыяй аб парушэньнях прэзыдэнтам Аляксандрам Лукашэнкам Канстытуцыі і законаў РБ. Ліст таксама зьмяшчаў папярэджаньне аб адказнасьці і заклік не выконваць указаў Лукашэнкі, які ў лістападзе 1996 г. учыніў дзяржаўны пераварот. У лісьце Клімаў нагадваў пра нелегітымнасьць рэфэрэндуму 1996 г. Яго арыштавалі на наступны дзень пасьля паседжаньня камісыі, якая абвесьціла, што існуюць дастатковыя юрыдычныя падставы для пачатку новай працэдуры імпічмэнту. У часе сьледства Клімаў адмаўляўся ад паказаньняў, матывуючы гэта незаконнасьцю свайго ўтрыманьня пад вартай.

Пасьля году і 5 месяцаў сьледзтва ў жніўні 1999 г. пачаўся суд. Да абвінавачваньняў даданіся яшчэ два артыкулы: арт. 171 КК РБ – «службовы падлог» і арт. 150-2 – «выманьваньне крэдыту альбо датацый». 13 сьнежня 1999 г. Клімаў быў жорстка зьбіты і сілай дастаўлены ў Ленінскі райсуд Менску на слуханьне яго справы. Папярэдняе мэдычнае заключэньне лекараў «хуткай дапамогі» выявіла чэрапна-мазгавую траўму і траўму жывата. 24 сьнежня Пракуратура РБ адмовілася ўзбуджаць па гэтым факце крымінальную справу.

17 сакавіка 2000 г. Андрэю Клімаву вынесены прысуд у 6 гадоў пазбаўленьня волі. 25 сакавіка 2002 году выйшаў на волю па ўмоўна-датэрміновым вызваленьні.

Другі раз быў арыштаваны ў сакавіку 2005 г. за акцыю «Рэвалюцыя» перад Днём Волі на Кастрычніцкай Плошчы Менску. Пасьля перамогі «памаранчавай» рэвалюцыі ва Ўкраіне Андрэй Клімаў абвясьціў, што беларуская рэвалюцыя адбудзецца 25 сакавіка 2005 г. Улады разагналі арганізаваную ім 25 сакавіка акцыю пратэсту на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. 10 чэрвеня 2005 г. суд прызнаў Клімава вінаватым у арганізацыі групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак, і пакараў яго абмежаваньнем волі на адзін год і шэсьць месяцаў. Вызвалены 22 сьнежня 2006 г.

Трэці раз Клімаў быў зьняволены 3 красавіка 2007 г. за «заклікі да зьвяржэньня дзяржаўнага ладу», якія нібыта ўтрымліваў ягоны артыкул, апублікаваны на сайце «Хартыя-97» (арт. 361 КК РБ, па якім у Беларусі судзілі ўпершыню). Прысуд таемна вынесены ў жніўні 2007 г. Цэнтральны судом Менску: 2 гады пазбаўленьня волі ў калёніі строгага рэжыму. Журналістам стала вядома пра прысуд толькі праз месяц, дагэтуль ім хлусілі, што справа Клімава ўсё яшчэ расьледуецца. Адбываў пакараньне ў Мазырскай калёніі ўзмоцненага рэжыму. Вызвалены 15 лютага 2008 г. згодна з указам Аляксандра Лукашэнкі.

WŁAD KOBEC



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Wład Kobec urodził się w 1971 r. W 1989 r. ukończył geografię na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. Pracował m.in. w Ministerstwie Ochrony Środowiska. W 2000 r. skończył z wyróżnieniem Akademię Zarządzania przy Prezydencie Republiki Białoruś ze specjalnością ekonomista. W 2000 r. porzucił pracę urzędową i został jednym z koordynatorów i inicjatorów ruchu „Żubr".

Uczestnik pierwszego Forum Społeczeństwa Obywatelskiego Partnerstwa Wschodniego w Brukseli w 2009 r.

KRONIKA REPRESJI

Podczas wyborów 2010 r. kierował sztabem kandydata na prezydenta, Andreja Sannikaua.

21 grudnia, po wydarzeniach na Placu Niepodległości, zatrzymali go funkcjonariusze służb bezpieczeństwa. Zarzucono mu uczestnictwo w masowych zamieszkach. 27 stycznia zwolniono go, otrzymał jednak zakaz opuszczania miejsca zamieszkania.

We wrześniu 2011 r. poinformował media, że opuścił Białoruś. Jako przyczynę podał prześladowania i groźby ze strony władz. W liście do mediów poinformował o torturach w więzieniu i próbach zwerbowania go przez służby specjalne. Obecnie przebywa w Polsce.

УЛАДЗІМЕР КОБЕЦ

Нарадзіўся 7 лістапада 1971 г. у Слоніме. Пасьля школы ў 1989 г. скончыў БДУ па спэцыяльнасьці «географ-эколяг». Дзеючы сябра Беларускага геаграфічнага таварыства. Працаваў у Менскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя, у 1999 г. быў пераведзены ў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя.

У 2000 г. скончыў Акадэмію кіраваньня пры прэзыдэнце Рэспублікі Беларусь па спэцыяльнасьці «мэнэджэр-эканаміст». У тым жа годзе пакінуў дзяржаўную службу і стаў адным з заснавальнікаў і каардынатараў руху «Зубр». Удзельнік першага Форуму грамадзянскай супольнасьці «Усходняга партнэрства» ў Брусэлі ў 2009 г.

Падчас выбараў 2010 г. – кіраўнік ініцыятыўнай групы кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь Андрэя Саньнікава.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы апэратыўнікамі КДБ 21 сьнежня 2010 г. Уладзіміру было прад'яўленае абвінавачаньне па 1 і 2 частках артыкулу «Масавыя беспарадкі». Утрымліваўся ў СІЗА КДБ. У ноч на 27 студзеня 2011 г. адпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе. Суду над ім так і не адбылося. 29 жніўня Ўладзімер атрымаў па пошце пастанову пра закрыцьцё супраць яго крымінальнай справы, а таксама дазвол зноў выяжджаць за межы краіны.

У верасьні 2011 г. напісаў ліст у СМІ, у якім паведамлялася, што Уладзімер пакінуў Беларусь, прычынамі гэтага сталі ціск і катаваньні падчас знаходжаньня ў СІЗА, а пазьней – пагрозы яго сям'і пасьля вызваленьня пад падпіску. Кобец заявіў пра спробы яго вярбоўкі.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ANTON KOJPISZ

Anton Kojpisz jest jednym ze skazanych w „Sprawie czternastu", która miała miejsce w Mińsku w 2008 r. Miał wtedy 20 lat. W związku ze wszczęciem przeciwko niemu sprawy karnej został relegowany z Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Jako oficjalną przyczynę podano zaległości w nauce, jakie rzekomo miał mieć Kojpisz. Relegowanie nastąpiło dokładnie tego samego dnia, którego przedstawiono mu zarzuty.

KRONIKA REPRESJI

Po zatrzymaniu podczas akcji, która odbyła się w centrum Mińska 10 stycznia 2008 r., Kojpiszowi przedstawiono zarzuty z artykułu 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja i aktywny udział w działaniach grupowych, w poważny sposób naruszających porządek społeczny".

W tym czasie Kojpisz był sekretarzem „Młodzieży BFL" i członkiem ruchu „Bunt", który został utworzony po wydarzeniach marcowych w 2006 r. na Placu Kalinowskiego w Mińsku. Podczas rozprawy Kojpisz przez 32 minuty wygłaszał ostatnie słowo, cytując wersety Koranu, co wywołało burzliwą reakcję zebranych.

Podczas procesu Kojpisz źle się poczuł, gdy sędzia ogłaszał wyrok. Półprzytomnego opozycjonistę przewieziono do szpitala. 22 kwietnia sędzia Jeliena Ilina uznała działacza Antona Kojpisza winnym przestępstwa z art. 342, pkt 1 KK – „Organizacja i aktywny udział w działaniach grupowych, w poważny sposób naruszających porządek społeczny" i skazała go na karę grzywny w wysokości 100 płac minimalnych (3 mln 500 tys. rubli).

Po skazaniu w „Sprawie czternastu", Kojpisz wstąpił do partii BFL (Białoruski Front Ludowy).

АНТОН КОЙПІШ

Антон Койпіш – адзін з асуджаных па крымінальнай «справе 14-ці» ў Менску ў 2008 годзе. Тады ў 20 год з прычыны ўзбуджэньня супраць Антона крымінальнай справы за ўдзел у акцыі прадпрымальнікаў ён быў адлічаны з мэхмату БДУ нібыта за акадэмічную непасьпяховасьць. Выключэньне, аднак, адбылося ў той самы дзень, калі Антон стаў абвінавачаным.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ


Пасьля затрыманьня на акцыі, што прайшла ў цэнтры Менску 10 студзеня 2008 г., маладому чалавеку было прад'яўленае абвінавачваньне па па ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак).

Антон быў на той час адказным сакратаром «Моладзі БНФ» і сябрам руху «Бунт», які аформіўся стыхійна пасьля сакавіцкіх падзей 2006 г. на менскай «Плошчы Каліноўскага».

На судовым паседжаньні 32 хвіліны доўжылася апошняе слова моладзевага актывіста, падчас якога ён зачытваў радкі сьвяшчэннай кнігі мусульман «Каран», што выклікала бурную рэакцыю прысутных. На судзе хлопцу стала кепска, у момант вынясеньня судзьдзёй прысуду Антон быў шпіталізаваны ў напаўпрытомным стане.

22 красавіка судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Алена Ільіна прызнала моладзевага актывіста Антона Койпіша вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак) і вынесла пакараньне ў выглядзе штрафу ў памеры 100 базавых велічыняў (3 млн 500 тыс. руб).

Пасьля асуджэньня па «справе 14-ці» Антон Койпіш прынцыпова ўступіў у Партыю БНФ.


FOT. JULIA DARASHKEVICH

OLEG KORBAN

Oleg Korban urodził się 4 lutego 1985 r. Jest członkiem Narodowego Komitetu Zjednoczonej Partii Obywatelskiej, zastępcą przewodniczącego mińskiej filii tej organizacji i przewodniczącym mińskiego oddziału „Młodych demokratów" – młodzieżowego skrzydła Zjednoczonej Partii Obywatelskiej. Podczas wyborów prezydenckich w 2010 r. był przewodniczącym mińskiego sztabu Jarosława Romańczuka.

KRONIKA REPRESJI

W 2007 roku, będąc członkiem „Młodego Frontu", był podejrzany o przestępstwo z artykułu 193, pkt 1 – „Działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji", spędził 3 dni w więzieniu KGB, po czym sąd skazał go na karę grzywny.

W nocy z 19 na 20 grudnia został zatrzymany w centrum Mińska po akcji protestu. Przedstawiono mu zarzuty z art. 293, pkt 1 i 2 KK – „Organizacja masowych zamieszek lub udział w nich"). Był przetrzymywany w areszcie KGB. 7 stycznia 2011 r. zmieniono mu środek zapobiegawczy – zwolniono go z aresztu, zakazując opuszczania miejsca zamieszkania.

31 stycznia 2011 r. został po raz kolejny zatrzymany na jednej z ulic Mińska i po dwóch godzinach przesłuchania w KGB wypuszczono go. 23 sierpnia 2011 r. sprawa karna przeciwko niemu została zamknięta z powodu braku znamion przestępstwa.

АЛЕГ КОРБАН

Нарадзіўся 4 лютага 1985 году. Сябра Нацыянальнага камітэту АГП. Намеснік старшыні Менскай гарадзкой арганізацыі АГП. Займаў пасаду старшыні менскага гарадзкога аддзяленьня арганізацыі «Маладыя дэмакраты» – моладзевага крыла АГП.

На прэзыдэнцкіх выбарах 2010 г. быў кіраўніком штабу Яраслава Раманчука па г. Менску.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2007 годзе, будучы сябрам «Маладога Фронту», праходзіў па крымінальнай справе па арт. 193-1 (удзел у незарэгістраванай арганізацыі), правёў трое сутак у турме КДБ, быў пакараны ў Савецкім судзе Менску штрафам.

Затрыманы ў ноч з 19 на 20 сьнежня 2010 г. пасьля акцыі пратэсту ў цэнтры Менску. Абвінавачаны па чч. 1 і 2 арт. 293 КК (арганізацыя масавых беспарадкаў і ўдзел у іх). Утрымліваўся ў сьледым ізалятары КДБ. 7 студзеня 2011 г. вызвалены з-пад варты пад падпіску аб нявыезьдзе.

31 студзеня 2011 г. на вуліцы ў Менску быў затрыманы паўторна, але адпушчаны празь 2 гадзіны пасьля допыту ў КДБ.

23 жніўня 2011 г. крымінальная справа супраць яго была закрытая «за адсутнасьцю складу злачынства».

IGOR KORSAK

Igor Korsak urodził się w 1974 r. Studiował na Akademii Sztuk Pięknych. W latach 90. był jednym z działaczy „Białego Legionu"[7] – patriotycznej organizacji białoruskich żołnierzy, która w późniejszym czasie uległa samoistnemu rozwiązaniu.

KRONIKA REPRESJI

31 sierpnia 1998 r. sąd w Mińsku wydał wyrok w sprawie Igora Korsaka i Pawła Siliwonczika.

Korsak i Siliwonczik zostali zatrzymani przez funkcjonariuszy milicji 2 czerwca 1998 r. o godz. 5 rano, kiedy rozklejali na osiedlu Sieriebrianka opozycyjne ulotki i malowali farbą symbole nieformalnej organizacji „Biały Legion". Symbol ten jest szeroko wykorzystywany w narodowej ornamentyce.

Po zatrzymaniu Korsak i Siliwonczik spędzili 6 godzin na posterunku milicji. W ich mieszkaniach przeprowadzono rewizje. Po miesiącu od ich zatrzymania przedstawiono im zarzuty. Otrzymali także zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Początkowo ich sprawy miały charakter administracyjny, później zostały przekwalifikowane na sprawy karne.

Korsak i Siliwonczik zostali oskarżeni o popełnienie przestępstwa z artykułu 201, pkt 2 KK – „Chuligaństwo". Prokurator Słuka żądał dla oskarżonych 1 roku pozbawienia wolności w zawieszeniu. W sądzie oskarżeni przyznali się częściowo do winy i zostali skazani na karę grzywny w wysokości 10 płac minimalnych (2,5 miliona rubli białoruskich).

W lipcu 2008 roku, po wybuchu bomby domowej roboty podczas koncertu 4 lipca z okazji Dnia Niepodległości Białorusi, na którym gościem był prezydent Aleksander Łukaszenka, Korsak został zatrzymany przez funkcjonariuszy KGB jako podejrzany o „złośliwe chuligaństwo". Wtedy Igor Korsak nie brał udziału w życiu politycznym, jednakże w jego mieszkaniu przeprowadzono rewizję. Korsak spędził 10 dni na Okrestinie, gdzie prowadził protest głodowy. Zwolniono go 18 lipca.

---

7. Biały Legion – istniejąca i działająca w latach 90. organizacja patriotów i żołnierzy.

ІГАР КОРСАК

Ігар Корсак нарадзіўся ў 1974 годзе. Вучыўся ў мастацкай вучэльні. У 90-я гады быў адным з актывістаў «Белага легіёну» – патрыятычнай арганізацыі беларускіх вайскоўцаў, якая пазьней фактычна самараспусьцілася.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

31 жніўня 1998 г. суд Ленінскага раёну г. Менску вынес прысуд па справе Ігара Корсака і Паўла Сілівончыка. Навучэнцы Ігар Корсак (23 гады) і Павал Сілівончык (18 гадоў) былі затрыманыя міліцэйскім патрулём 2 чэрвеня а 5-й гадзіне раніцы. Яны расклейвалі ў менскім мікраёне Серабранка ўлёткі апазыцыйнага зьместу, акрамя таго, малявалі фарбай сымбаль (эмблема нефармальнай арганізацыі «Белы легіён»), які мае назву «спарыш» і шырока выкарыстоўвасцца ў беларускіх нацыянальных арнамэнтах.

Пасьля затрыманьня І. Корсак і П. Сілівончык былі дастаўленыя ў РАУС Ленінскага раёну г. Менску, дзе іх пратрымалі 6 гадзінаў. На кватэрах І. Корсака і П. Сілівончыка быў праведзены ператрус, падчас якога ў кватэры І. Корсака былі знойдзеныя ўлёткі апазыцыйнага зьместу, клей і трафарэт са «знакам складанай канфігурацыі» (геамэтрычны малюнак «спарыша»). Абвінавачваньне было прад'яўленае І. Корсаку і П. Сілівончыку амаль праз месяц пасьля затрыманьня, і толькі тады былі ўзятыя падпіскі аб нявыезьдзе.

Спачатку справа І. Корсака і П. Сілівончыка мела адміністратыўны характар, але падчас сьледзтва была перакваліфікаваная ў крымінальную. І. Корсак і П. Сілівончык абвінавачваліся па артыкуле 201, ч. 2 КК РБ – «хуліганскія дзеяньні з асаблівым цынізмам і дзёрзкасьцю». У якасьці сьведкаў выступалі супрацоўнікі міліцыі, якія праводзілі затрыманьне. Пракурор Слука прасіў пакараць Корсака і Сілівончыка адным годам пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай прысуду. Акрамя таго, у выяве «спарыша» сьледзтва ўбачыла аналёгію з фашыстоўскай свастыкай. Адвакаты і грамадзкі абаронца (прадстаўнік праваабарончага цэнтру «Вясна-96» Любоў Лунёва) настойвалі, каб з падсудных было зьнятае абвінавачваньне ў распаўсюджваньні фашыстоўскай сымболікі. Суду было прадстаўленае заключэньне экспэртаў-мастацтвазнаўцаў, зь якога вынікала, што знак «спарыша» зьяўляцца часткай беларускага арнамэнту. Дарэчы, гэты самы арнамэнт выкарыстаны ў аздабленьні афіцыйна прынятага пры Лукашэнку сьцяга РБ. На судзе І. Корсак і П. Сілівончык «прызналі сваю віну часткова».

Суд прыйшоў да высновы, што «знак складанай канфігурацыі чырвонага колеру», які падсудныя наносілі з дапамогай трафарэту на сьцены ў менскім раёне Серабранка, «не зьяўляецца свастыкай». І. Корсаку і П. Сілівончыку быў вынесены прысуд – штраф у памеры 10 мінімальных заробкаў (2,5 млн. беларускіх рублёў). Трафарэт «знаку складанай канфігурацыі» і ўлёткі апазыцыйнага зьместу было вырашана зьнішчыць.

У ліпені 2008 г. пасьля выбуху на канцэрце 4 ліпеня затрымліваўся супрацоўнікамі КДБ як падазраваны ў злосным хуліганстве. На той час у палітыцы Ігар ужо некалькі гадоў не ўдзельнічаў. Аднак у яго хаце быў праведзены ператрус, падчас якога былі знойдзеныя гайкі і балты, а таксама часткі пакетаў з-пад соку, у якіх сваякі вырошчвалі расаду. Тое ж самае адбылося яшчэ з 12 менскімі апазыцыянерамі, якія таксама аказаліся «занадта» гаспадарлівымі. Ігар Корсак знаходзіўся пад вартай у ізалятары ў Менску па вуліцы Акрэсьціна, трымаў за кратамі галадоўку пратэсту і праз 10 дзён (18 ліпеня) быў вызвалены.

ALEŚ KOWAL

Aleś Kowal w latach 90-tych był pracownikiem mińskiego metra. Był jedną z pierwszych osób skazanych na Białorusi z powodów politycznych.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany po Dniu Woli w 1997 r. w Mińsku. W tym roku marsz z okazji Dnia Woli zakończył się starciami demonstrantów z milicją. Funkcjonariusze starali się nie przepuścić kolumny do centrum miasta. Podczas aresztowań kilkoro demonstrantów stawiało opór funkcjonariuszom milicji, starając się uratować innych przez pobiciem i zatrzymaniem.

30 października 1997 r. w mińskim sądzie rozpoczął się proces w sprawie Dnia Woli. Oskarżonych było 5 osób. W połowie listopada wszyscy, w tym i Aleś Kowal, zostali skazani na 2 lata robót przymusowych. Aleś Kowal otrzymał 2 lata tak zwanej „domowej chemii", bez pozbawienia wolności, ale z potrąceniem 20 procent wypłaty na rzecz skarbu państwa.

АЛЕСЬ КОВАЛЬ

Алесь Коваль – у 1990-я гады працаўнік менскага мэтро, адзін зь першых асуджаных па палітычнай справе ў незалежнай Беларусі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы пасьля сьвяткаваньня ў Менску Дня Волі ў 1997 годзе. У той год сьвяточнае шэсьце, зладжанае апазыцыяй, адбылося 23 сакавіка і скончылася сутыкненьнямі дэманстрантаў зь міліцыяй, якая некалькі разоў спрабавала не пусьціць калёну ў цэнтар сталіцы. Падчас арыштаў удзельнкаў шэсьця некалькі чалавек далі міліцыянтам адпор і ўратавалі іншых ад затрыманьня і зьбіцьця. Такім чынам Алесь Коваль і аказаўся абвінавачаным у хуліганскіх дзеяньнях.

30 кастрычніка 1997 г. у Менскім гарадзкім судзе распачаўся судовы працэс па справе Дня Волі. Усяго абвінавачанымі па справе праходзілі пяцёра чалавек. У сярэдзіне лістапада ўсе яны, уключна з Алесем Ковалем, былі прызнаныя вінаватымі і асуджаныя на 2-гадовыя папраўчыя работы з рознымі ўмовамі адбыцьця пакараньня. Алесь Коваль атрымаў 2 гады так званай «хатняй хіміі» – без зьмяшчэньня ў месцы пазбаўленьня волі, але з адлічэньнем з ягонага заробку 20% у бюджэт дзяржавы.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

PAWEŁ KRASOUSKI

Paweł Krasouski urodził się w 1983 r. Mieszka w mieście Żodino w obwodzie mińskim.

KRONIKA REPRESJI

Na początku 2006 r. w Żodinie wobec Pawła Krasouskiego, działacza młodzieżowego ruchu demokratycznego, wszczęto sprawę karną z artykułu 369 KK – „Publiczne znieważenie urzędników". Przyczyną prześladowania stał się fakt, że w biuletynie „Nabljudatel" opublikowano karykatury przedstawicieli władz miasta. Karykatury zostały odnalezione podczas rewizji w mieszkaniu Krasouskiego w grudniu 2005 r.

Sprawa została wycofana, jednak w dalszym ciągu prześladowano młodego działacza, wszczęto przeciwko niemu kolejne sprawy, przedstawiono mu kolejne zarzuty.

4 października 2006 r. w mieszkaniu Pawła Krasouskiego znowu odbyła się rewizja, podczas której zarekwirowano komputer, płyty CD, materiały, które drukował. Krasouskiego przewieziono na posterunek milicji do Witebska, gdzie przesłuchiwano go w związku ze sprawą wybuchów w Witebsku, do których doszło 14 i 22 września 2005 r., choć kiedy do tych wybuchów doszło, Pawła nie było na Białorusi.

Śledczy oświadczyli, że aktywista młodzieżowy jest podobny do poszukiwanego przestępcy, którego zdjęciami dysponowali. Otrzymał status podejrzanego – oskarżono go o przygotowanie przestępstwa – próby zabójstwa (art. 139.2, pkt 2 KK).

Krasouskiego przeniesiono do aresztu tymczasowego w Witebsku.

11 października główny śledczy prokuratury do spraw specjalnych, Aleksander Rassolko, przedstawił mu kolejne zarzuty. Krasouskiego oskarżono o dokonanie w 1999 r. szeregu gwałtów i zabójstw nieletnich dziewczyn w różnych miastach Białorusi. 15 października Krasouski został wypuszczony z aresztu, gdyż nie zebrano żadnych dowodów, świadczących o jego udziale w zarzucanych mu czynach. Później sprawa dotycząca gwałtów i zabójstw nieletnich dziewczyn została zamknięta. W sprawie dotyczącej wybuchów w Witebsku Krasouski cały czas występował jako podejrzany.

1 lutego 2011 r. Krasouskiego wezwano do KGB na przesłuchanie w „sprawie 19 grudnia". Paweł studiował na politechnice w Żodino, jednak w 2005 r został relegowany za swą działalność polityczną.

ПАВАЛ КРАСОЎСКІ

Павал Красоўскі нарадзіўся ў 1983 годзе. Жыхар гораду Жодзіна Менскай вобласьці.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Напачатку 2006 году ў г. Жодзіна была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 369 Крымінальнага кодэксу (публічная абраза службовых асобаў) у адносінах да актывіста моладзевага дэмакратычнага руху Паўла Красоўскага. Падставай для перасьледу стала публікацыя ў бюлетэні «Назіральнік» сатырычных карыкатураў на кіраўніцтва гораду. Карыкатуры былі знойдзеныя падчас вобшуку ў кватэры Паўла Красоўскага ў сьнежні 2005 г.

Дадзеная справа была спыненая, аднак у далейшым супраць 23-гадовага моладзевага актывіста былі высунутыя новыя крымінальныя абвінавачаньні.

4 кастрычніка 2006 г. ў кватэры Паўла Красоўскага зноў адбыўсяператрус, падчас якога быў канфіскаваны кампутарны блок, дыскі і друкаваная прадукцыя. Затым Красоўскага на міліцэйскай машыне даставілі ў Віцебск, дзе дапытвалі па справе аб выбухах у Віцебску 14 і 22 верасьня 2005 году.

Сьледчыя заявілі, што моладзевы актывіст падобны да фотаробата злачынцы. У выніку ён быў прызнаны падазраваным у падрыхтоўцы злачынства, скіраванага на забойства асабліва небясьпечным спосабам у адпаведнасьці з ч. 2 арт. 139 Крымінальнага кодэксу.

У гэты ж дзень Красоўскага накіравалі ў ізалятар часовага ўтрыманьня г. Віцебску.

Па ягоным прызнаньні ў інтэрвію пасьля вызваленьня, калі даведаўся, што яго вінавацяць па «расстрэльным артыкуле», то «глеба пачала плысьці з-пад ног», але потым стала ясна, што гэта проста спроба ўплываць на яго. Падчас выбухаў Паўла ўвогуле не было на тэрыторыі Беларусі.

11 кастрычніка галоўны сьледчы Рэспубліканскай пракуратуры па асабліва важных справах Аляксандар Расолька дадаткова вынес пастанову аб прызнаньні Паўла Красоўскага падазраваным ва ўчыненьні шэрагу згвалтаваньняў і забойстваў няпоўнагадовых дзяўчынак у розных гарадах Беларусі ў 1999 годзе. Паколькі 15 кастрычніка скончыўся тэрмін утрыманьня Красоўскага пад вартай без прад'яўленьня абвінавачаньня, а доказаў, якія б сьведчылі пра ягоную датычнасьць да названых злачынстваў, не было выяўлена, малады чалавек быў выпушчаны зь ізалятару часовага ўтрыманьня. Пазьней крымінальная справа адносна датычнасьці Красоўскага да забойстваў і згвалтаваньняў непаўнагадовых дзяўчат была спыненая, а па справе, узбуджанай у сувязі з выбухамі ў Віцебску, ён працягваў праходзіць у якасьці падазраванага, аднак актыўных сьледчых мерапрыемстваў у дачыненьні да яго не праводзілася.

1 лютага 2011 г. Паўла Красоўскага выклікалі ў КДБ на допыт па «справе 19 сьнежня».

Павал вучыўся ў жодзінскім політэхнікуме, але ў траўні 2005 г. быў выключаны з вучобы за сваю палітычную дзейнасьць.

ALIEKSIEJ KRIWINCOJ

Alieksiej Kriwincoj jest działaczem opozycyjnym z Grodna.

KRONIKA REPRESJI

Sprawa karna przeciwko mieszkańcom Grodna, Wadimowi Lohinau i Alieksiejowi Kriwincojowi, wszczęto w związku z namalowaniem 22 września 2006 roku graffiti przeciwko Białoruskiemu Republikańskiemu Związkowi Młodzieży. Zgodnie z postanowieniem naczelnika posterunku milicji, podpułkownika Zinowika, zostały im przedstawione zarzuty z artykułu 341 Kodeksu Karnego – „Uszkodzenie mienia".

Szkoda została wyceniona na 51 420 i 300 000 białoruskich rubli. Lohinau i Kriwincoj musieli zapłacić za odnowienie murów.

9 stycznia 2007 r. sąd w Grodnie skazał Alieksieja Kriwincoja na karę grzywny w wysokości 30 płac minimalnych (930 tys. rubli).

АЛЯКСЕЙ КРЫВІНЦОЎ

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Крымінальная справа супраць гарадзенцаў Вадзіма Логінава і Аляксея Крывінцова была ўзбуджаная па факце напісаньня 22 верасьня 2006 г. графіці супраць БРСМ. Абодвум прад'явілі абвінавачваньне па арт. 341 Крымінальнага кодэксу (апаганьваньне будынкаў і псаваньне маёмасьці) паводле пастановы начальніка РАУС адміністрацыі Ленінскага раёну г. Горадні падпалкоўніка міліцыі А.Н. Зіновіка.

Матэрыяльныя страты дазнавальнік міліцыі старшы лейтэнант Д.Н. Шкулепа ацаніў у суму 51420 і 300000 беларускіх рублёў. Выдаткі на рамонт сьценаў маладымі людзьмі былі выплачаныя.

9 студзеня 2007 г. суд Ленінскага раёну г. Горадні пакараў Аляксея Крывінцова штрафам у памеры 30 базавых велічыняў (930 тыс. рублёў).

IWAN KRUK

Iwan Kruk urodził się 27 października 1944 r. we wsi Kożan-Gorodok w obwodzie brzeskim. Ukończył mińską szkołę milicyjną, a później Kaliningradzki Uniwersytet Państwowy. Jest prawnikiem, 30 lat pracował w organach ścigania. Pod koniec lat 80. przez pewien czas pracował razem z Gdlianem i Iwanowem. Był deputowanym do Rady Rejonu Ostrowieckiego. Jest członkiem Zjednoczonej Partii Obywatelskiej. W 2006 r. w czasie kampanii wyborczej zbierał podpisy dla dwóch demokratycznych kandydatów na prezydenta – Aleksandra Milinkiewicza i Aleksandra Kazulina. Aktywnie zajmował się działalnością na rzecz praw człowieka.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany 10 lipca 2006 r. W czasie rewizji w mieszkaniu Iwana Kruka milicjanci starali się skonfiskować komputer, ale Kruk, starając się zapobiec temu, rzucił go na podłogę i rozbił. Właśnie w związku z tym zdarzeniem wszczęto sprawę karną z artykułu o stawianie oporu milicji. 15 maja 2006 r. Iwan Kruk został skazany na 6 miesięcy pozbawienia wolności. Odbywał karę w kolonii karnej o zaostrzonym rygorze w mieście Głubokoje. 10 stycznia 2007 r. Kruk został uwolniony.

ІВАН КРУК

Іван Крук нарадзіўся 27 кастрычніка 1944 г. у вёсцы Кажан-Гарадок Берасьцейскай вобласьці. Скончыў менскую школу міліцыі, пазьней – Калінінградзкі дзяржаўны ўнівэрсытэт. Юрыст. Больш за 30 гадоў адпрацаваў у праваахоўных органах. Быў дэпутатам Астравецкага раённага савету. Сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

Падчас выбарчай кампаніі 2006 г. зьбіраў подпісы ў Астравецкім раёне за абодвух дэмакратычных кандыдатаў на прэзыдэнта: Аляксандра Мілінкевіча і Аляксандра Казуліна. Актыўна займаецца праваабарончай дзейнасьцю.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы 10 ліпеня 2006 г. Падчас ператрусу ў кватэры Івана Крука міліцыянты спрабавалі сканфіскаваць кампутар, але гаспадар прадухіліў гэта, кінуўшы яго на падлогу і разьбіўшы. Менавіта за гэта і была заведзеная крымінальная справа за супраціў міліцыі.

15 траўня 2006 г. Івана Крука асудзілі да 6 месяцаў пазбаўленьня волі. Адбываў пакараньне ў глыбоцкай калёніі ўзмоцненага рэжыму.

10 студзеня 2007 году Іван Крук быў вызвалены.

MICHAIŁ KRYWAU

Michaił Krywau jest działaczem Zjednoczonej Partii Obywatelskiej. Był sądzony w związku ze „Sprawą czternastu" za udział w mityngu solidarności z przedsiębiorcami 10 stycznia 2008 r. Na drugi dzień po akcji, 11 stycznia, został aresztowany na 15 dni. W lutym 2008 r. wezwano go na przesłuchanie w charakterze podejrzanego.

KRONIKA REPRESJI

22 kwietnia 2008 r. sędzia mińskiego sądu, Jeliena Ilina, uznała Michaiła Krywaua winnym popełnienia przestępstwa z artykułu 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w działaniach grupowych, w poważny sposób naruszających porządek społeczny" i wydała wyrok 2 lat ograniczenia wolności bez skierowania do zakładu karnego.

Ukończył dziennikarstwo na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. Dodatkowo zrobił studia magisterskie na Uniwersytecie w San Jose (USA) oraz na Moskiewskim Uniwersytecie Stosunków Międzynarodowych. Po ogłoszeniu wyroku Krywau opuścił Białoruś i obecnie mieszka za granicą.

МІХАСЬ КРЫВАЎ

Актывіст АГП. Быў асуджаны па «справе 14-ці» за ўдзел у мітынгу ў падтрымку прадпрымальнікаў 10 студзеня 2008 г. Спачатку на другі дзень пасьля акцыі, 11 студзеня, быў арыштаваны на 15 сутак. У лютым 2008 г. быў выкліканы на допыт як падазраваны.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

22 красавіка 2008 г. судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Алена Ільіна прызнала моладзевага актывіста Міхаіла Крывава вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ (Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак) і вынесла пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі тэрмінам на два гады без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.

Самы старэйшы сярод моладзевых актывістаў, прыцягнутых да суду. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ і дзьве магістратуры – МДІМА і Унівэрсытэта г. Сан-Хасэ (ЗША).

Праз нейкі час пасьля вынясеньня прысуду Міхась Крываў пакінуў Беларусь і зараз жыве ў замежжы.

ULADZIMIR KUDZINAU


FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Uladzimir Kudzinau jest deputowanym Rady Najwyższej XIII Kadencji, członkiem Zjednoczonej Partii Obywatelskiej i biznesmenem. W parlamencie współpracował z organizacją społeczną „Działanie obywatelskie", był jednym z inicjatorów impeachmentu Łukaszenki w listopadzie 1996 r. Podczas referendum 1996 roku sporządził protokoły dotyczące wielu naruszeń, jakie miały miejsce w jego okręgu wyborczym. Materiały te wysłał do Prokuratury Generalnej RB oraz Prokuratury Obwodu Brzeskiego. Urodził się 11 czerwca 1959 r. we wsi Toneżicy w rejonie słuckim obwodu mińskiego. W 1981 r. ukończył Politechnikę Białoruską. Zanim zajął się biznesem, pracował w inspekcji podatkowej w rejonie iwacewickim obwodu brzeskiego. Od 1992 r. kierował stworzonym przez siebie małym handlowo-przemysłowym przedsiębiorstwem „Iwacewicze".

KRONIKA REPRESJI

Pod koniec 1995 roku, po tym jak Uladzimir Kudzinau podjął decyzję ubiegania się o stanowisko deputowanego, popadł w konflikt z administracją miasta. Do firmy skierowano 120 pracowników inspekcji podatkowej, by sprawdzili finanse przedsiębiorstwa. Sparaliżowało to na długi czas jego działalność. W 1996 r. miały miejsce kolejne inspekcje, w tym i inspekcje z KGB. W wyniku tego pod koniec 1996 r. budynek firmy stał się własnością państwa, a wszystkie jej sklepy zostały zamknięte. Uladzimir Kudzinau starał się uratować swoją firmę i rozpocząć eksport mięsa do Rosji.

4 lutego 1997 r. Uladzimir Kudzinau został aresztowany. Oskarżono go o próbę przekupienia urzędnika. 4 sierpnia 1997 r. sąd uznał go winnym zarzucanego mu czynu i wydał wyrok 7 lat pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze i konfiskatę własności. Uladzimir Kudzinau nie przyznał się do winy. Zgodnie z białoruskim ustawodawstwem, Kudzinau jako deputowany Rady Najwyższej nie mógł zostać aresztowany bez zgody Rady, a więc Prokuratura Generalna wszczęciem sprawy przeciwko Kudzinauowi naruszyła ustawę „O Radzie Najwyższej".

1 lutego 2001 r. sąd ponownie rozpatrzył sprawę w związku z tym, że przyjęto nowy Kodeks Karny, który za łapówkę przewiduje łagodniejszą karę. Kudzinauowi zmniejszono karę do 5 lat. 5 lutego 2001 r. Uladzimir Kudzinau został zwolniony z kolonii w Mińsku. W tym samym roku wraz z rodziną wyjechał na Krym, gdzie prowadzi swój biznes.

УЛАДЗІМЕР КУДЗІНАЎ

Дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, бізнэсовец. У парлямэнце супрацоўнічаў з грамадзкім аб'яднаньнем «Грамадзянскае дзеяньне», быў адным зь ініцыятараў імпічмэнту А. Лукашэнку ў лістападзе 1996 г. Сябра АГП.

Падчас рэфэрэндуму 1996 г. зафіксаваў і склаў пратаколы на мноства парушэньняў пры яго правядзеньні ў сваёй выбарчай акрузе, матэрыялы пра гэта накіраваў у Берасьцейскую і Генеральную пракуратуру РБ.

Нарадзіўся 11 чэрвеня 1959 г. у вёсцы Танежыцы Слуцкага раёну Менскай вобласьці. У 1981 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Да прыходу ў бізнэс у 1992 г. працаваў у падатковай інспэкцыі Івацэвіцкага раёну Берасьцейскай вобласьці.

З 1992 г. кіраваў створанай ім гандлёвапрамысловым прыватным малым прадпрыемствам «Івацэвічы», якое гадавала буйную рагатую жывёлу, перапрацоўвала і прадавала мясныя вырабы. Каля 300 працаўнікоў прадпрыемства Кудзінава атрымлівалі самыя высокія заробкі ў раёне.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У канцы 1995 г., пасьля рашэньня Кудзінава балятавацца ў дэпутаты ВС, пачаўся канфлікт зь мясцовай адміністрацыяй. У фірму была накіраваная праверка з падатковай інспэкцыі ў колькасьці 120 чалавек. Дзейнасьць прадпрыемтва гэта надоўга паралізавала. У 1996 г. дадаліся іншыя праверкі, у тым ліку ад КДБ. У выніку, напрыканцы 1996 г. будынак фірмы перайшоў у дзяржаўную ўласнасьць, а ўсе яе крамы зачыненыя. Уладімер Кудзінаў паспрабаваў выратаваць сваю справу, пачаўшы экспарт мяса ў Расею.

4 лютага 1997 г. Уладзімер Кудзінаў быў арыштаваны па сфальсыфікаваным абвінавачваньні ў спробах дачы хабару службовай асобе. 4 жніўня 1997 г. суд Барысаўскаг раёну Менскай вобласьці прызнаў яго вінаватым ў неаднаразовай спробе хабару і на падставе арт. 15 ч. 2 і арт. 170 ч. 2 Крымінальнага кодэксу РБ прызначыў яму пакараньне: 7 гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці. Кудзінаў віны не прызнаў і назваў дзеяньні міліцыі загадзя справакаванымі. Паводле беларускага заканадаўства, як дэпутат ён ня мог быць зьняволены бяз згоды Вярхоўнага Савету, калі толькі яго не засьпелі непасрэдна пры ўчыненьні злачынства. Генэральная пракуратура РБ, якая ўзбудзіла справу супраць Кудзінава, такім чынам, парушыла Закон «Аб Вярхоўным Савеце». Працэс па справе дэпутата, да таго ж, падпадае пад юрысдыкцыю не Барысаўскага раённага, а Вярхоўнага суду. 1 лютага 2001 г. суд Барысаўскага раёну пераглядзеў справу Кудзінава ў сувязі з прыняцьцем новага Крымінальнага Кодэксу РБ, які за артыкул «дача хабару» (ч. 2 арт. 431) прадугледжвае больш мяккае пакараньне. Кудзінаву зьнізілі тэрмін пакараньня да 5 гадоў. З улікам амністыі атрымалася, што былы дэпутат адседзеў нават больш.

5 лютага 2001 г. Уладзімер Кудзінаў быў вызвалены зь Менскай калёніі УЖ-15/1, што па вул. Кальварыйскай. У той жа год разам зь сям'ёй зьехаў жыць у Крым (Украіна), дзе таксама займаецца бізнэсам, зьвязаным з вытворчасьцю прадуктаў харчаваньня.

ALEKSANDER KWIATKIEWICZ

Urodził się 4 lutego 1987 r. w rodzinie robotniczej. Od dzieciństwa pomagał matce w gospodarstwie. Ukończył Szkołę Podstawową nr 168 w Mińsku, a potem szkołę zawodową i zdobył profesję stolarza. Pracował na produkcji – przygotowywał kompresory do samochodów. Interesował się techniką, grał w piłkę nożną.

KRONIKA REPRESJI

Na Plac Niepodległości w Mińsku 19 grudnia 2010 r. przyszedł przypadkowo, chciał zobaczyć, co będzie się działo i jak rozwinie się sytuacja. Został zatrzymany. Odsiedział 12 dni w areszcie za udział w akcji protestu. 4 stycznia 2011 r. został ponownie zatrzymany jako podejrzany w sprawie karnej. Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 293, pkt 1 i 2 – „Masowe zamieszki". Przetrzymywano go w areszcie śledczym KGB.

26 maja 2011 r. sąd skazał go na 3,5 roku pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Wyrok odbywał w kolonii w Iwacewiczach.

11 sierpnia 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Aleksandra Łukaszenki i po dwóch dniach uwolniony.

АЛЯКСАНДАР КВЯТКЕВІЧ

Нарадзіўся 4 лютага 1987 году ў працоўнай сям'і. Зь дзяцінства дапамагаў маці па працы і гаспадарцы. Скончыў базавую 168-ю менскую школу, потым прафэсійна-тэхнічную вучэльню па спэцыяльнасьці «сталяр-станочнік». Працаваў на вытворчасьці – вырабляў кампрэсары для машын. Цікавіцца тэхнікай, любіць футбол, якім раней займаўся.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

На Плошчу ў Менску 19 сьнежня 2010 г. прыйшоў выпадкова, пажадаўшы паглядзець, як будуць разгортвацца падзеі. Быў затрыманы, адбыў 12-сутачны арышт за ўдзел у акцыі пратэсту. 4 студзеня 2011 г. быў затрыманы як падазраваны па крымінальнай справе. Яму было прад'яўленае абвінавачаньне па частках 1 і 2 артыкулу 293 КК РБ (масавыя беспарадкі). Знаходзіўся пад вартай у СІЗА КДБ.

26 траўня 2011 г. у Ленінскім судзе Менску асуджаны да 3,5 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываў пакараньне ў калёніі г. Івацэвічы.

11 жніўня 2011 г. памілаваны ўказам А. Лукашэнкі. Праз два дні вызвалены.


FOT. JULIA DARASHKEVICH

ANATOL LABIEDŹKA

Urodził się 27 czerwca 1961 r. we wsi Tryles.

W latach 1979–1980 pracował w kołchozie w rejonie stołpeckim. W 1980 r. rozpoczął studia na Wydziale Historii i Języka Francuskiego Mińskiego Państwowego Instytutu Pedagogicznego. Ukończył je w 1985 roku. W latach 1985–1987 służył w Armii Radzieckiej. W latach 1987–1990 pełnił funkcję wicedyrektora szkoły z internatem w Oszmianie. W 1990 r. został wybrany do Rady Najwyższej ZSRR XII Kadencji.

W 1992 r. stworzył Białoruskie Stowarzyszenie Młodych Polityków i został wybrany jej liderem.

W 1993 r. ukończył Wydział Prawa Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego.

W 1994 r. aktywnie działał w sztabie wyborczym kandydata na urząd prezydenta, Aleksandra Łukaszenki. Wkrótce potem dołączył do Zjednoczonej Partii Obywatelskiej. W 1995 r. został wybrany na deputowanego Rady Najwyższej XIII Kadencji.

W 1996 był jednym z inicjatorów próby impeachmentu Łukaszenki po tym, jak opozycja nie uznała wyników zainicjowanego przez prezydenta referendum konstytucyjnego przewidującego likwidację Rady Najwyższej i utworzenie Zgromadzenia Narodowego.

Podczas wyborów prezydenckich w 2010 r., pracował w sztabie wyborczym kandydata Zjednoczonej Partii Obywatelskiej – Jarosława Romańczuka.

KRONIKA REPRESJI

W związku ze swoją działalnością polityczną Labiedźka wielokrotnie był represjonowany przez władze. Na rok 1990 przypada rekordowa ilość aresztowań administracyjnych zastosowanych wobec Labiedźki.

Kilka razy został oskarżony o zniesławienie obecnego prezydenta, został pobity przed swoim domem przez niezidentyfikowanego sprawcę.

19 października 2004 r. wraz z Mikołą Statkiewiczem i Pawłem Siewiaryńcem został aresztowany za udział w protestach przeciwko referendum, które pozwoliło Aleksandrowi Łukaszence kandydować na trzecią kadencję. Podczas zatrzymania został ciężko pobity przez milicję (był hospitalizowany, stwierdzono uszkodzenie mózgu, połamane żebra i liczne obrażenia wewnętrzne).

W nocy z 19 na 20 grudnia 2010 r., został aresztowany przez siły bezpieczeństwa w swoim własnym mieszkaniu. Został umieszczony w więzieniu KGB. Oskarżono go o organizację masowych zamieszek.

6 marca 2011 r. Anatol Labiedźka został zwolniony z więzienia za kaucją.

23 sierpnia 2011 r. sprawa karna przeciwko Labiedźce została zakończona w związku z „brakiem znamion przestępstwa".

АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА

Лідэр АГП. Нарадзіўся 27 чэрвеня 1961 года ў вёсцы Трылес Стаўбцоўскага раёну Менскай вобласьці. Скончыў там школу, тры гады працаваў мэханізатарам у калгасе імя Суворава ў сваім раёне. Пасьля паступіў у Менскі пэдагагічны інстытут на факультэт гісторыі і француская мовы, які пасьпяхова скончыў у 1985 г.

З 1985 па 1987 гг. служыў у Савецкай Арміі. Затым працаваў намесьнікам дырэктара Ашмянскай школы-інтэрната на Гарадзеншчыне. У 1990 г. абраны дэпутатам Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня, займаў пасаду намесьніка старшыні Камісіі ВС па справах моладзі. У 1992 г. стварыў Беларускую асацыяцыю маладых палітыкаў і быў абраны яе кіраўніком. У 1993 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ. Падчас выбараў прэзыдэнта 1994 г. працаваў у камандзе А. Лукашэнкі, сыйшоў з-за канфлікту, уступіў у Аб'яднаную грамадзянскую партыю (АГП). У 1995 г. пераабраны ў ВС 13-га скліканьня, быў намесьнікам старшыні Камісыі па міжнародных справах. У лістападзе 1996 г. рэфэрэндум не прызнаў і пры роспуску Вярхоўнага Савету ў Нацыянальны Сход перайсьці адмовіўся.

На Кангрэсе дэмакратычных сілаў у 2005 г. саступіў усяго на некалькі галасоў А. Мілінкевічу, ледзь ня стаў адзіным кандыдатам ад апазыцыі на выбарах прэзыдэнта 2006 г. Балятаваўся ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на выбарах 2008 г., але прайграў.

У часе прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. працаваў у камандзе кандыдата ад АГП – свайго намесьніка Яраслава Раманчука.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Шмат разоў трапляў пад рэпрэсіі ўладаў за сваю палітычную дзейнасьць, і пад канец 1990-х гадоў стаў свайго кшталту рэкардсмэнам па працягласьці адбытых па палітычных матывах адміністратыўных арыштаў. Некалькі разоў быў абвінавачаны ў паклёпе на дзеючага прэзыдэнта, быў зьбіты каля свайго дома невядомымі ў масках. 19 кастрычніка 2004 г. разам зь Міколам Статкевічам і Паўлам Севярынцам быў арыштаваны за ўдзел у пратэстных акцыях супраць рэфэрэндуму, які дазволіў А. Лукашэнку балятавацца на трэці тэрмін. Пры затрыманьні быў моцна зьбіты міліцыяй (трапіў у шпіталь з чэрапна-мазгавой траўмай, пераломамі рэбраў і пашкоджаньнямі ўнутраных органаў).

Пасьля Плошчы-2010 у ноч на 20 сьнежня затрыманы сіламі дзяржбясьпекі ў сябе дома. Зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Абвінавачаны ў арганізацыі масавых беспарадкаў.

6 сакавіка 2011 г. Анатоль Лябедзька быў вызвалены зь СІЗА пад падпіску аб нявыезьдзе.

23 жніўня 2011 г. крымінальная справа супраць А. Лябедзькі была спыненая «ў сувязі з адсутнасьцю ў дзеяньнях складу злачынства».

SIARHIEJ LAWIEJKIN

Siarhiej Lawiejkin był zawodowym żołnierzem w randze sierżanta. Służył w jednostce wojskowej pod Połockiem, w okręgu witebskim. Po szeregu zatrzymań przez milicję w latach 1998–1999 został zwolniony ze służby za zrywanie flag państwowych z budynków urzędowych miasta Połock (początkowo przeniesiony z kontraktu na służbę okresową).

KRONIKA REPRESJI

Siarhiej Lawiejkin z przyjaciółmi – studentami Państwowego Uniwersytetu Połockiego, Anatolem Blizniecowem i Olegiem Kajdowem – pociągnięci zostali do odpowiedzialności karnej w świetle artykułu o „Umyślnym wandalizmie" (obrona wnosiła o zmianę kwalifikacji czynu na „Bezczeszczenie symboli państwowych"). 10 kwietnia 1999 r. zatrzymano ich i ciężko pobito. Mężczyźni przyznali się do popełnionych czynów, wyjaśniając jednakże, że ich celem nie był wandalizm, a raczej przeświadczenie, że zerwane flagi nie odpowiadają historycznej tradycji narodu białoruskiego. Wszyscy trzej oświadczyli, że za symbol Białorusi uważają flagę biało-czerwono-białą, ponieważ tak byli uczeni w szkole.

Proces trzech młodych Połocczan odbywał się przed sądem wojskowym w Witebsku w czerwcu 1999 r. Oskarżeni zostali z art. 186, pkt 2 – „Bezczeszczenie symboli państwowych". Siarhiej Lawiejkin skazany został na karę grzywny w wysokości 200 milionów rubli białoruskich (ówczesna równowartość ok. 450 dolarów USA) oraz degradację do stopnia szeregowego.

СЯРГЕЙ ЛАВЕЙКІН

Прафэсійны вайсковец, сяржант. Жыхар вайсковага гарадку каля Полацку Віцебскай вобласьці. Быў звольнены з войску (напачатку пераведзены з кантрактнай на тэрміновую службу) пасьля шэрагу затрыманьняў міліцыяй у 1998–1999 гг. за зрываньне з афіцыйных будынкаў у г. Полацку дзяржаўных сьцягоў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Сяргей Лавейкін разам зь сябрамі – студэнтамі Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту Анатолем Блізьняцовым і Алегам Кайдавым – быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці па артыкуле «Злоснае хуліганства» (абарона патрабавала перакваліфікацыі артыкулу на «ганьбаваньне дзяржаўнай сымболікі».

Сьледзтва, а потым і суд, разглядалі два эпізоды справы: 9 красавіка 1998 г., калі ўсе трое сарвалі чырвона-зялёны сьцягі з дахаў Полацкага райвыканкаму і гарвыканкаму, і 10 красавіка 1999 г., калі дзяржаўны сьцяг ізноў зьнялі з райвыканкаму. Тады ж вайсковец і студэнты былі затрыманыя з ужываньнем грубага зьбіцьця.

Маладзёны прызналіся ў зьдзейсьненых імі ўчынках, але патлумачылі іх не хуліганцкімі памкненьнямі, а тым, што сарваныя сьцягі не адпавядаюць гістарычнаму мінуламу беларускага народу. Усе трое сказалі, што лічаць сымбалем Беларусі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг, што гэтак вучылі настаўнікі падчас вучобы ў школе.

Справу трох маладых палачан разглядаў вайсковы суд у Віцебску ў ліпені 1999 году. Абвінавачаньне было перакваліфікавана на арт. 186 ч. 2 (зьнявага дзяржаўных сымбаляў). Сяргей Лавейкін быў асуджаны на штраф у памеры 200 мільёнаў рублёў (на той час гэта складала ў эквіваленце каля 450 даляраў ЗША) і быў паніжаны ў вайсковай годнасьці да шарагавага жаўнера.

ANTON LAZARAU

W 1999 r. Anton Lazarau miał 18 lat i pracował jako pomocnik handlarza na Czerwieńskim Targu w Mińsku.

KRONIKA REPRESJI

21 października 1999 roku Anton Lazarau został zatrzymany w pracy za udział w Marszu Wolności 17 października. Lazarau został doprowadzony na posterunek policji w Mińsku. Późnym wieczorem 22 października Anton Lazarau został przewieziony do aresztu tymczasowego, a po przedstawieniu mu zarzutów z artykułu 186.3 KK – do aresztu śledczego na Wołodarce. Potem środek zapobiegawczy został zmieniony, Anton Lazarau otrzymał zakaz opuszczania miejsca zamieszkania.

Oskarżonymi w tej sprawie byli również: Gleb Dogil, Herman Suszkiewicz i Andrej Walabujeu. Zostali oni oskarżeni o to, że rzekomo rzucali kamienie w kierunku żołnierzy wojsk wewnętrznych, których zadaniem było spacyfikowanie akcji. Wszyscy oni otrzymali azyl polityczny w Polsce. W grudniu 2001 roku, Antona Lazarau, ani innych oskarżonych w sprawie nie było na Białorusi, dlatego zaczęto ich sądzić zaocznie. Prokurator zażądał dla każdego 3 miesiące aresztu. 2 stycznia 2002 r. uczestnicy Marszu Wolności zostali skazani przez sąd w Mińsku. Anton Lazarau i jego koledzy zostali uznani za winnych dopuszczenia się „chuligaństwa" i skazani na karę grzywny 50 minimalnych płac.

АНТОН ЛАЗАРАЎ

Антону Лазараву ў 1999 годзе было 18 гадоў, ён працаваў на Чэрвеньскім рынку Менску памочнікам гандляра.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

21 кастрычніка 1999 г. за ўдзел у «Маршы Свабоды», які прайшоў 17 кастрычніка, Антон быў затрыманы на месцы працы. Удзень на рынку да яго падышоў міліцыянт і папрасіў прайсьці зь ім.

Антон Лазараў быў дастаўлены ў Цэнтральны РАУС Менску, адкуль ягоным родным паведамілі пра затрыманьне. Позна ўвечары або ў ноч на 22 кастрычніка А. Лазараў быў перавезены ў ізалятар часовага ўтрыманьня, а пасьля прад'яўленьня абвінавачаньня па арт. 186.3 КК РБ – у сьледчы ізалятар на вул. Валадарскага. Пасьля мера стрыманьня была зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе.

Таксама па гэтай справе праходзілі Глеб Догіль, Герман Сушкевіч і Андрэй Валабуеў. Іх вінавацілі ў тым, што падчас акцыі яны быццам бы кідалі камяні ў жаўнераў унутраных войскаў, прысланых яе разагнаць.

Усе фігуранты справы, уключна з Антонам Лазаравым, атрымалі палітычны прытулак у Польшчы. У сьнежні 2001 г. нягледзячы на адсутнасьць Антона і іншых абвінавачаных на тэрыторыі Беларусі, іх пачалі завочна судзіць па крымінальным артыкуле. Пракурор прасіў для кожнага зь іх па тры месяцы арышту.

2 студзеня 2002 году ўдзельнікі «Маршу Свабоды» былі асуджаныя Менскім гарадзкім судом. Антон Лазараў, як і іншыя падсудныя, быў прызнаны вінаватым у хуліганстве і пакараны штрафам у 50 мінімальных заробкаў.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

WALERIJ LEWONIEWSKIJ

Walerij Lewoniewskij urodził się w Grodnie 15 sierpnia 1963 r. Ukończył grodzieńską szkołę zawodową, potem uczył się w Białoruskim Instytucie Gospodarstwa Narodowego. Pracował jako ślusarz, kierował grodzieńskim obwodowym zrzeszeniem ochrony praw podatników i grodzieńskim centrum ochrony praw konsumentów.

KRONIKA REPRESJI

1 maja 2004 r. Walerij Lewoniewskij został aresztowany w Grodnie podczas mityngu. Uczestnicy tej akcji żądali dymisji Aleksandra Łukaszenki. Skazano go na 2 lata pozbawienia wolności razem z Aleksandrem Wasiliewem, z którym zarządzał niezarejestrowanym ogólnonarodowym komitetem strajkowym przedsiębiorców kraju.

Sąd uznał ich za winnych publicznego znieważenia prezydenta Aleksandra Łukaszenki. Oskarżenie wykorzystało tekst ulotki, która wzywała mieszkańców Grodna do przyjścia na pierwszomajowy mityng. Ulotka zawierała też wiersz, w którym śledczy dopatrzyli się znamion znieważenia prezydenta.

Walerij Lewoniewskij odbywał karę w więzieniu w Grodnie, w koloniach karnych w Iwacewiczach i Mohylewie, areszcie śledczym w Baranowiczach, przebywał również w więziennym szpitalu.

Został zwolniony 15 maja 2006 r. po odbyciu całej kary.

ВАЛЕРЫ ЛЕВАНЕЎСКІ

Валеры Леванеўскі нарадзіўся ў Гародні 15 жніўня 1963 г. Скончыў гарадзенскую ПТВ-49 хімікаў, вучыўся ў Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі. Працаваў сьлесарам, рэгуліроўшчыкам радыёапаратуры, кіраваў Гарадзенскім абласным аб'яднаньнем у абарону правоў падаткаплатнікаў, Гарадзенскім гарадзкім цэнтрам абароны правоў спажыўцоў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

1 траўня 2004 г. Валеры Леванеўскі быў арыштаваны ў Гародні на мітынгу, удзельнікі якога патрабавалі адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі.

Асуджаны да 2 гадоў зьняволеньня разам з Аляксандрам Васільевым, зь якім разам кіравалі незарэгістраваным агульнанацыянальным страйкам прадпрымальнікаў краіны. Суд прызнаў іх вінаватымі ў нанясеньні публічнай абразы прэзыдэнту Аляксандру Лукашэнку. Абвінавачаньне выкарыстала тэкст улёткі, якая заклікала гарадзенцаў прыйсьці на першатравеньскі мітынг, тамсама ж быў надрукаваны верш, у якім сьледства выявіла нібыта абразу прэзыдэнта.

Адбываў пакараньне ў розных турэмных установах: гарадзенскай турме, івацэвіцкай папраўчай калёніі, баранавіцкім сьледчым ізалятары, магілёўскай папраўчай калёніі, быў таксама і ў рэспубліканскім турэмным шпіталі.

Цалкам адбыў двухгадовы тэрмін зьняволеньня і вызваліўся 15 траўня 2006 году.

JURIJ LIAWONAU

Jurij Liawonau urodził się 23 sierpnia 1961 r. w mieście Kalinino w obwodzie moskiewskim. Ukończył Moskiewski Instytut Awiacji, 2 lata służył w armii, a także na lotnisku w Rosji. W 1991 r. zwolnił się, jest kapitanem w stanie spoczynku. Był przedsiębiorcą, stworzył w Wołkowysku firmę transportową „Nika-Trans". Prowadzi aktywną działalność społeczno-polityczną. Od 2001 roku jest przewodniczącym komitetu organizacyjnego ruchu „Za nową Białoruś".

KRONIKA REPRESJI

7 lipca 2006 r. Jurij Liawonau został skazany na 3 lata i 5 miesięcy pozbawienia wolności. Sąd uznał, że wykorzystując swoją pozycję zawodową, pomógł koledze, przedsiębiorcy Mikole Autuchowiczowi, zataić podatki. Wyrok odbywał w Kolonii Karnej nr 2 w Bobrujsku. Na wolność wyszedł 25 stycznia 2008 r. (karę zmniejszono mu do 1,5 roku). Amnesty International uznało Jurija Liawonaua za więźnia sumienia.

8 lutego 2009 r. Liawonau został aresztowany razem z przedsiębiorcami – Mikołą Autuchowiczem i Uladzimirem Asipienko. Przeciwko nim wysuwane były oskarżenia dotyczące organizowania szeregu ciężkich przestępstw. Jurij Liawonau otrzymał decyzję o zamknięciu jego sprawy karnej, gdyż zaliczono mu prawie pół roku aresztu w areszcie śledczym w Mińsku. Oskarżany był także o podpalenie wraz z Autuchowiczem i Asipienką domu milicjanta. Autuchowicz i Asipienko byli później za ten czyn sądzeni.

ЮРЫЙ ЛЯВОНАЎ

Юрый Лявонаў нарадзіўся 23 жніўня 1961 г. у горадзе Калініне Маскоўскай вобласьці. Скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут, два гады адслужыў у войску. Пасьля служыў на аэрадроме ў Расіі, у 1991 г. звольніўся, капітан запасу. Быў прадпрымальнікам, стварыў у Ваўкавыску сваю транспартную фірму «Ніка-Транс».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Актыўна займаецца грамадзка-палітычнай дзейнасьцю. Старшыня аргкамітэту руху «За новую Беларусь» (з 2001 г.).

7 ліпеня 2006 г. Юрый Лявонаў быў асуджаны да пазбаўленьня волі на 3 гады і 5 месяцаў. Суд прызнаў яго вінаватым у тым, што, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, дапамог калегу-прадпрымальніку Мікалаю Аўтуховічу схаваць ад дзяржавы падаткі.

Адбываў пакараньне ў Бабруйску ў папраўчай калёніі № 2 строгага рэжыму. Прэзыдыюм Гарадзенскага абласнога суду задаволіў пратэст старшыні гэтага суду, які прасіў зьменшыць тэрмін пакараньня Юрыя Лявонава да паўтара года.

Выйшаў на свабоду 25 студзеня 2008 г.

Праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя» прызнала Юрыя Лявонава вязьнем сумленьня. 8 лютага 2009 г. Юрый Лявонаў зьняволены разам з прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам і Ўладзімерам Асіпенкам. Іх абвінавацілі ў арганізацыі і зьдзяйсьненьні шэрагу цяжкіх злачынстваў. Прадпрымальнік з Ваўкавыску Юрый Лявонаў атрымаў пастанову аб спыненьні супраць яго крымінальнай справы, з-за якой ён адбыў амаль паўгода за кратамі ў Менскім сьледчым ізалятары. Яго абвінавачвалі ў падпале дому міліцыянта разам зь Мікалаем Аўтуховічам і Ўладзімерам Асіпенкам, якіх пазьней асудзілі.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

WASYL LIAWONAU

Wasyl Liawonau to były minister rolnictwa i gospodarki żywnościowej. Przed objęciem stanowiska ministra był przedstawicielem handlowym Białorusi w Niemczech, kierował komitetem obwodu mohylewskiego partii. Od tego czasu Wasyl Liawonau zna się z prezydentem Białorusi, Aleksandrem Łukaszenką, który w tym czasie kierował sowchozem „Gorodiec". W czasie wyborów na pierwszego prezydenta Białorusi, Wasyl Liawonau otwarcie wspierał Kebicza, jednak mimo to przyjął ofertę Aleksandra Łukaszenki i zajął stanowisko ministra rolnictwa i gospodarki żywnościowej. Liawonau nie poparł w 1996 roku idei listopadowego referendum. Po tym wydarzeniu, w ministerstwie rozpoczęły się zmasowane kontrole.

Wasyl Liawonau konsekwentnie wysuwał propozycje reform rolnictwa, co stało się główną przyczyną jego aresztowania. Reformy te dotyczyły wspólnej własności, powiązania rolnictwa z gospodarką rynkową, zlikwidowania odgórnego sterowania.

KRONIKA REPRESJI

Wasyl Liawonau został aresztowany 11 listopada 1997 r. w swoim biurze. Jego aresztowanie nagrywała grupa operatorów białoruskiej telewizji. Materiał był wielokrotnie emitowany w telewizji, co zostało ocenione przez Centrum Praw Człowieka Wiasna jako nacisk na śledczych i sąd. Za nacisk na sąd można uznać również wiele publicznych wypowiedzi Łukaszenki. W przemówieniu na spotkaniu S.A. „Świt", trzy dni po aresztowaniu Liawonaua (przemówienie transmitowała białoruska telewizja), Łukaszenka powiedział: „Uprzejmie proszę aby Głuchowski prowadził śledztwo w najbardziej surowy sposób! Działajcie mimo wszystko!". Na tym samym zgromadzeniu Łukaszenka publicznie oskarżył Wasyla Liawonaua o udział w zabójstwie E. Mikołuckiego. Należy zauważyć, że prokuratura nie postawiła zarzutów więźniowi co do ostatniej „zbrodni".

Eks-ministrowi postawiono zarzuty na podstawie trzech artykułów KK RB: art. 91, pkt 1 – „Kradzież mienia w bardzo dużych rozmiarach", art. 169 – „Łapówki" i art. 213 – „Nielegalne posiadanie amunicji i broni".

W czasie procesu, który rozpoczął się 17 sierpnia 1999 roku, Wasyl Liawonau nie przyznał się do winy. Już w pierwszej wypowiedzi stwierdził, że uważa swoje aresztowanie za sprawę motywowaną politycznie, nie wierzy w sprawiedliwość sądu ponieważ, jego zdaniem, wyrok nie zostanie wydany przez sąd, ale przez Łukaszenkę.

14 stycznia 2000 r. Wasyl Liawonau został uznany przez Sąd Najwyższy winnym przekupstwa i kradzieży mienia państwowego, za co został skazany na karę 4 lat więzienia i konfiskatę mienia. Wyrok wydał sędzia Sądu Najwyższego Białorusi, Wiktor Czertowicz.

Liawonau został zwolniony w dniu 5 października 2000 r. na mocy amnestii. Od 2001 r. jest przewodniczącym komitetu organizacyjnego ruchu „Za nową Białoruś".

ВАСІЛЬ ЛЯВОНАЎ

Васіль Лявонаў – былы міністар сельскай гаспадаркі і харчаваньня. Перад тым, як заняць пост міністра, ён зьяўляўся гандлёвым прадстаўніком Беларусі ў Нямеччыне, узначальваў Магілёўскі абкам партыі. З таго часу Васіль Лявонаў знаёмы з прэзыдэнтам РБ Аляксандрам Лукашэнкам, які ў той час кіраваў саўгасам «Гарадзец». Падчас выбараў першага прэзыдэнта Беларусі Васіль Лявонаў адкрыта падтрымліваў В. Кебіча, аднак нягледзячы на гэта, прыняў прапанову А. Лукашэнкі заняць пасаду міністра сельскай гаспадаркі і харчаваньня. В. Лявонаў не падтрымаў ідэю лістападаўскага рэфэрэндуму 1996 году, пасьля чаго ў міністэрстве пачаліся масіраваныя праверкі.

Васіль Лявонаў пасьлядоўна выступаў з прапановамі аб рэфармаваньні сельскай гаспадаркі, накіраванай на рэфармаваньне калектыўнай уласнасьці, далучэньне сельскай гаспадаркі да рынкавай эканомікі, яе вызваленьне ад камандна-адміністрацыйных мэтадаў, што і сталася асноўнай прычынай ягонага арышту.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Васіль Лявонаў быў арыштаваны 11 лістапада 1997 году ў працоўным кабінэце. Яго арышт здымала група апэратараў беларускага тэлебачаньня, і сюжэт пра гэта некалькі разоў трансьлявалі па беларускім тэлебачаньні, што расцэньваецца ПЦ «Вясна» як ціск на сьледзтва і суд. Як ціск на сьледзтва можна разглядаць і публічныя выказваньні А. Лукашэнкі, напрыклад, падчас выступленьня на сходзе АТ «Рассвет» праз тры дні пасьля арышту В. Лявонава (выступленьне трансьлявалася па беларускім тэлебачаньні): «Я пераканаўча прашу Глухоўскага – самым жорсткім чынам весьці сьледзтва! Дзейнічайце ня гледзячы ні на што!» На гэтым жа сходзе А. Лукашэнка публічна абвінаваціў В. Лявонава ў дачыненьні да забойства Я. Мікалуцкага. Трэба адзначыць, што абвінавачаньне ў апошнім «злачынстве» так і не было прад'яўлена зьняволенаму.

Эксміністру прад'яўленыя абвінавачаньні па трох артыкулах Крымінальнага кодэксу РБ: арт. 91.1 – «крадзеж маёмасьці ў асабліва буйных памерах», арт. 169 – «атрыманьне хабару» і арт. 213 – «незаконнае захоўваньне баявых прыпасаў і зброі».

На судзе, які пачаўся 17 жніўня 1999 году, сваёй віны Васіль Лявонаў не прызнаў. Ужо ў першай сваёй прамове ён заявіў, што лічыць сваё зьняволеньне палітычнай справай, ня верыць у справядлівасьць суду, бо, па яго меркаваньні, яго будзе судзіць ня суд, а асабіста А. Лукашэнка.

61-гадовы В. Лявонаў пакутуе на шэраг цяжкіх хранічных захворваньняў. Стан яго здароўя падчас зьняволеньня ў СІЗА значна пагоршыўся, ён перанёс некалькі сардэчных прыступаў.

14 студзеня 2000 г. Васіль Лявонаў прызнаны Вярхоўным судом вінаватым у хабарніцтве і крадзяжы дзяржаўнай маёмасьці ды пакараны 4 гадамі калёніі з канфіскацыяй маёмасьці. Прысуд вынес судзьдзя Вярхоўнага суду Беларусі Віктар Чартовіч.

Вызвалены 5 кастрычніка 2000 г. паводле амністыі.

З 2001 г. – старшыня аргкамітэта руху «За новую Беларусь».



FOT. JULIA DARASHKEVICH

NIKITA LICHAWID

Nikita Lichawid jest działaczem ruchu „Za wolność". Urodził się 27 maja 1990 r. w Mińsku. Po ukończeniu Szkoły Średniej nr 177 rozpoczął studia prawnicze w Mińskim Instytucie Zarządzania. Po wydarzeniach z 19 grudnia został relegowany z uczelni.

KRONIKA REPRESJI

Nikita Lichawid został zatrzymany 19 grudnia 2010 r. na Placu Niepodległości w Mińsku i skazany na 15 dni aresztu. 28 grudnia okazało się, że Nikita ma status oskarżonego w sprawie o „masowe zamieszki". Z żodińskiego aresztu został przeniesiony na Wołodarkę, a dzień przed procesem przeniesiono go do celi dla oskarżonych o ciężkie przestępstwa. 29 marca 2011 r. Nikita Lichawid został skazany na 3,5 roku pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Przeciwko niesprawiedliwemu wyrokowi prowadził protest głodowy. Wyrok odbywał w kolonii w Nowopołocku. Został tu przeniesiony 7 maja 2011 roku, a już 2 dni później znalazł się w karcerze, gdzie spędził 10 dni. Zaledwie dzień po odbyciu tej kary został skazany na kolejne 15 dni w karcerze. Tam właśnie spędził dzień swoich 21. urodzin. W Nowopołocku Lichawid łącznie 5 razy trafiał do karceru. 14 września 2011 r. Lichawid został ułaskawiony na mocy dekretu Łukaszenki.

МІКІТА ЛІХАВІД

Актывіст Руху «За свабоду». Нарадзіўся 27 траўня 1990 г. у Менску. Навучаўся завочна на юрыдычным факультэце Менскага інстытуту кіраваньня. Пасьля падзей 19 сьнежня, па словах кіраўніцтва факультэта, выключаны ня быў, але аўтаматычна патрапіў у акадэмічны адпачынак, аднаўленьне зь якога ў бліжэйшыя час не магчыма.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 19 сьнежня 2010 г. на Плошчы Незалежнасьці ў Менску, асуджаны на 15 сутак. Але 28 сьнежня стала вядома, што пастанова аб адміністратыўным арышце адмененая і Мікіта пераведзены ў статус абвінавачанага па справе аб масавых беспарадках. З Жодзінскага СІЗА яго перавялі ў менскую «Валадарку».

29 сакавіка 2011 г. Мікіта Ліхавід асуджаны Партызанскім судом Менску да 3,5 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Трымаў галадоўку супраць несправядлівага прысуду. Адбываў пакараньне ў Наваполацкай калёніі. Туды яго этапавалі 7 траўня 2011 г., а ўжо праз два дні ён патрапіў на 10 сутак у штрафны ізалятар. Адбыўшы гэта пакараньне, праз суткі зноў патрапіў у ШІЗА – на 15 сутак. Там ён сустрэў свой 21-ы дзень народзінаў. Такі «падарунак» адміністрацыя калёніі паднесла хлопцу за яго пратэст супраць несправядлівага судовага прысуду. У калёніі г. Наваполацку ён 5 разоў трапляў у карцэр, правёўшы ў ім агулам каля месяцу за адмову называць сябе падчас паверак «асуджаны Ліхавід» (замест гэтага казаў «незаконна асуджаны»). За гэта яго таксама зьмясцілі на 3 месяцы ў камэру крытай турмы.

У ліпені 2011 г. маці палітвязьня Алена Ліхавід была затрыманая і асуджаная на 10 сутак арышту за ўдзел у маўклівых акцыях пратэсту ў Менску.

Памілаваны ў ліку іншых указам Лукашэнкі і вызвалены 14 верасьня 2011 г.

SIARHIEJ LISICZENOK

Siarhiej Lisiczenok, działacz „Młodego Frontu" był wiceprzewodniczącym tej młodzieżowej organizacji.

KRONIKA REPRESJI

20 września 2006 r. został wezwany do Prokuratury Generalnej Republiki Białoruś na przesłuchanie w sprawie wszczętej w marcu 2006 r. z artykułu „Działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji" (art. 193, pkt 1 KK RB).

Siarhiej otrzymywał już wcześniej wezwania na przesłuchania, ale ignorował je i ukrywał się. Pojawił się w Prokuraturze dopiero po nacisku na swojego ojca i adwokata. Był podejrzanym w sprawie „Młodego Frontu".

Na początku października 2006 r. sprawa karna przeciwko Siarhiejowi Lisiczenokowi została zamknięta.

СЯРЖУК ЛІСІЧОНАК

Актывіст «Маладога Фронту». Быў намесьнікам старшыні гэтай моладзевай арганізацыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

20 верасьня 2006 г. быў выкліканы ў Генпракуратуру Рэспублікі Беларусь на допыт па справе, узбуджанай па артыкуле «Дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі» (арт. 193–1 Крымінальнага кодэксу РБ). Справа была заведзеная ў сакавіку 2006 году.

Выклікі на допыт былі і раней, але Сяржук ігнараваў іх і хаваўся. Зьявіўся ў пракуратуру пасьля ціску сьледзтва на яго бацьку і адваката. Праходзіў па справе «Маладога Фронту» як падазраваны.

Напачатку кастрычніка 2006 г. крымінальная справа супраць С. Лісічонка была зачыненая.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

SIARHIEJ LJASZKIEWICZ

Siarhiej Ljaszkiewicz urodził się 13 września 1978 r. w Lidzie. Ukończył Państwowy Uniwersytet Rolniczy w Grodnie. Od 1977 r. był członkiem Białoruskiego Frontu Ludowego. Podczas wyborów prezydenckich 2006 roku był szefem sztabu kandydata na prezydenta, Aleksandra Milinkiewicza, w Szczucinie. Ukończył studia magisterskie na Europejskim Uniwersytecie Humanistycznym na kierunku Politologia.

KRONIKA REPRESJI

2 marca 2006 w Szczucinie odbyły się rewizje w mieszkaniach lokalnych aktywistów, Wasilija Biezmiena i Siarhieja Ljaszkiewicza. Skonfiskowano komputery i dokumenty. 14 marca 2006 roku, 5 dni przed wyborami prezydenckimi, Siarhiej Ljaszkiewicz został zatrzymany w Mińsku i oskarżony o popełnienie przestępstwa z artykułu 293, pkt 3 KK – „Przygotowania do udziału w masowych zamieszkach". Był przetrzymywany w areszcie śledczym w Szczucinie. Podczas procesu zeznania przeciwko niemu składały nikomu nieznane osoby (wśród nich był m.in. trzykrotnie sądzony Aleksander Burdiej, który przebywał w więzieniu za kradzież mienia). Zgodnie z ich zeznaniami, Ljaszkiewicz miał pokazywać filmy, na których wskazywano sposób w jaki demonstranci mają stawiać opór podczas masowych zamieszek. Główny świadek oskarżenia podkreślał, że właśnie w taki sposób oskarżony przygotowywał go do udziału w demonstracji po wyborach (były to kadry z dokumentalnego filmu Jurija Chaszczewatskiego „Zwyczajny prezydent"). 29 maja sąd w Szczucinie skazał Ljaszkiewicza na 5 miesięcy pozbawienia wolności. 27 lipca 2006 roku, po odbyciu pełnej kary, Siarhiej Ljaszkiewicz został zwolniony z więzienia w Głubokoje.

СЯРГЕЙ ЛЯШКЕВІЧ

Сяргей Ляшкевіч нарадзіўся 13 верасьня 1978 г. у Лідзе. Скончыў Гарадзенскі дзяржаўны аграрны ўнівэрсытэт. З 1997 г. – сябра Беларускага Народнага Фронту.

Падчас прэзыдэнцкіх выбараў у 2006 г. быў кіраўніком ініцыятыўнай групы кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Мілінкевіча ў Шчучыне. Скончыў магістратуру ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце па спэцыяльнасьці «паліталёгія».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

2 сакавіка ў Шчучыне адбылісяператрусы ў кватэрах мясцовых актывістаў Васіля Бязьмена і Сяргея Ляшкевіча. У абодвух пасьля вобшуку былі забраныя кампутарныя носьбіты інфармацыі, а таксама некаторыя друкаваныя выданьні, паперы з асабістага архіву.

14 сакавіка 2006 г. за 5 дзён да прэзыдэнцкіх выбараў Сяргей Ляшкевіч быў арыштаваны і абвінавачаны па ч. 3 арт. 293 Крымінальнага кодэксу – у падрыхтоўцы аднаго са шчучынскіх юнакоў да ўдзелу ў масавых беспарадках у Менску ў дзень выбараў. Утрымліваўся ў Шчучынскім сьледчым ізалятары.

Падчас судовага працэсу паказаньні супраць С. Ляшкевіча давалі раней нікому не вядомыя грамадзяне (сярод іх – тройчы судзімы Аляксандар Бурдзей, які знаходзіўся пад вартай за крадзеж маёмасьці. Паводле іх паказаньняў, Ляшкевіч нібыта дэманстраваў фільмы, у якіх паказвалася, як дэманстранты супрацьдзейнічаюць міліцыі падчас масавых мерапрыемстваў. Галоўны сьведка абвінавачваньня адзначаў, што такім чынам актывіст рыхтаваў яго да ўдзелу ў пасьлявыбарчых дэманстрацыях (гэта былі кадры з дакументальнага фільму Ю. Хашчавацкага «Звычайны прэзыдэнт»).

Шчучынскі раённы суд палічыў віну Сяргея Ляшкевіча даказанай, паклаўшы ў асновы прысуду гэтыя цьмяныя і сумнеўныя доказы, і 29 траўня асудзіў 28-гадовага актывіста на 5 месяцаў пазбаўленьня волі.

27 ліпеня 2006 г. Сяргей Ляшкевіч быў вызвалены з Глыбоцкай турмы ў сувязі з адбыцьцём тэрміну пакараньня.



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

ULADZIMIR LOBAN

Uladzimir Loban urodził się 16 stycznia 1978 r. w Chojnikach, w obwodzie homelskim. Po katastrofie w Czarnobylu jego rodzina przeprowadziła się do obwodu witebskiego, do Wierchniedwińska. Tam też Loban rozpoczął pracę po ukończeniu Mińskiego Białoruskiego Technologicznego Uniwersytetu Państwowego. Od kwietnia 2010 r. mieszkał i pracował w stolicy. Nie zajmował się polityką, nie był członkiem żadnej partii ani ruchu.

Pojawił się na Płoszczy, gdyż 19 grudnia 2010 r. w lokalu wyborczym w Mińsku odmówiono mu prawa zagłosowania i odesłano do Wierchniedwińska na granicy z Łotwą.

KRONIKA REPRESJI

Zatrzymano go 19 grudnia podczas pacyfikacji akcji protestu, odbył 10-dniowy areszt na Okrestinie. Potem zatrzymano go jeszcze jako podejrzanego w sprawie karnej o masowe zamieszki. Przedstawiono mu zarzuty z art. 293 KK. Został umieszczony na Wołodarce. 12 maja 2011 r. został skazany na 3 lata pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Wyrok odbywał w kolonii w Szkłowie. 14 września 2011 r. został ułaskawiony na mocy rozporządzenia prezydenta Łukaszenki.

УЛАДЗІМЕР ЛОБАН

Нарадзіўся 16 студзеня 1978 году ў г. Хойнікі на Гомельшчыне. Пасьля Чарнобыльскай катастрофы сям'я пераехала ў Віцебскую вобласьць, горад Верхнядзьвінск, дзе ён скончыў сярэднюю школу і куды вярнуўся працаваць пасьля сканчэньня ў Менску Беларускага дзяржаўнага тэхналягічнага ўнівэрсытэту. З красавіка 2010 г. жыў і працаваў у сталіцы. Палітыкай не займаўся, ні ў якія партыі і рухі не ўваходзіў.

На Плошчы апынуўся з-за адмовы яму на выбарчым участку ў праве прагаласаваць 19 сьнежня ў Менску – Уладзімера адпраўлялі ў Верхнядзьвінск. Гэта апошні горад на тэрыторыі Беларусі перад мяжой з Латвіяй.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы пры разгоне акцыі 19 сьнежня, адбыў 10-суткавы адміністратыўны арышт у ізалятары на Акрэсьціна, а потым затрыманы як падазраваны па крымінальнай справе аб масавых беспарадках. Прад'яўлена абвінавачаньне па арт. 293 КК. Зьмешчаны пад варту ў СІЗА №1 на вул. Валадарскага.

12 траўня 2011 г. асуджаны на 3 гады зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываць тэрмін быў пераведзены на Магілёўшчыну, у Шклоўскі раён.

14 верасьня 2011 г. памілаваны і вызвалены са шклоўскай папраўчай калёніі № 17.

EDUARD LOBAU



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Eduard Lobau jest działaczem „Młodego Frontu". Urodził się w Wilnie 1 grudnia 1988 r. Już w 8 klasie szkoły średniej zdecydował się związać swoje życie z armią. Czytał specjalną literaturę, uprawiał sport. Na służbę trafił do witebskiego desantu. Po powrocie z wojska, rozpoczął działalność w organizacji „Młody Front" i bardzo szybko został szefem mińskiego oddziału organizacji.

KRONIKA REPRESJI

Eduard Lobau został skazany na cztery lata kolonii karnej o zaostrzonym reżimie. Taką decyzję podjęła sędzia Helena Szilko 24 marca 2011 r. 22-letni aktywista został uznany winnym popełnienia przestępstwa z artykułu 339, pkt 3 KK – „Szczególnie złośliwe chuligaństwo". Został zatrzymany razem z szefem organizacji Dzmitrijem Daszkiewiczem na dzień przed wyborami prezydenckimi, czyli 18 grudnia 2010 r.

Oskarżono go o pobicie przypadkowych przechodniów – Konstantina Sawickiego i Olega Malyszewa. Obrońcy praw człowieka uznali sprawę za polityczne prześladowanie działaczy opozycyjnych. Amnesty International ogłosiło Eduarda Lobaua i Dzmitrija Daszkiewicza więźniami sumienia. Lobau przebywa w Kolonii Karnej nr 22 w Iwacewiczach.

ЭДУАРД ЛОБАЎ

Актывіст «Маладога Фронту». Нарадзіўся ў Вільні 1 сьнежня 1988 году. Ужо ў 8-й клясе сярэдняй школы вырашыў зьвязаць сваё жыцьцё з войскам. Чытаў адмысловую літаратуру, займаўся спортам. На службу трапіў у Віцебскі дэсант. Па вяртаньні з войска Эдуард актыўна ўключыўся ў працу «Маладога Фронту», неўзабаве стаў кіраўніком Менскай гарадзкой арганізацыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Эдуард Лобаў быў асуджаны да чатырох гадоў зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Такое рашэньне абвясьціла 24 сакавіка 2011 г. у судзе Маскоўскага раёну Менску судзьдзя Алена Шылько. 22-гадовы актывіст «МФ» быў прызнаны вінаватым на падставе часткі 3 артыкулу 339 Крымінальнага кодэксу – «асабліва злоснае хуліганства».

Эдуард Лобаў разам са старшынём «Маладога Фронту» Зьмітром Дашкевічам быў затрыманы ў Менску 18 сьнежня 2010 году. Паводле інфармацыі ГУУС Менгарвыканкаму, у двары жылога дому па вуліцы Янкі Брыля яны нібыта зьбівалі мінакоў – Канстанціна Савіцкага і Алега Малышава. Затрыманьне Лобава і Дашкевіча было прэвэнтыўнай мерай спэцслужбаў і міліцыі напярэдадні выбараў прэзыдэнта, якія адбываліся на наступны дзень.

Да суду Эдуард утрымліваўся ў Жодзінскім СІЗА, з пачатку сакавіка 2011 г. – у Менскім СІЗА па вул. Валадарскага.

З 7 красавіка 2011 г. адбывае прысуд у Івацэвіцкай калёніі № 22 (так званых «Ваўчыных норах»). У адным зь лістоў напачатку 2012 г. вязень напісаў, што сячэ дровы, і што ў калёніі, якая знаходзіцца ў лесе, ня вельмі добра з радыяцыйным фонам: яна знаходзіцца на месцы былой вайсковай часткі.

WADIM LOHINAU

Wadim Lohinau jest działaczem opozycji z Grodna.

KRONIKA REPRESJI

Pod koniec 2006 r. Wadim Lohinau i jego kolega, Alieksiej Kriwincoj, zostali zatrzymani. Przeciwko nim została wszczęta sprawa w związku z namalowaniem 22 września 2006 r. graffiti przeciwko Białoruskiemu Republikańskiemu Związkowi Młodzieży. Zgodnie z postanowieniem naczelnika posterunku milicji, podpułkownika Zinowika, zostały im przedstawione zarzuty z artykułu 341 KK – „Uszkodzenie mienia". Szkoda została wyceniona na 51 420 i 300 000 białoruskich rubli. Wadim Lohinau i Alieksiej Kriwincoj musieli pokryć z własnej kieszeni koszty odnowienia murów. 9 stycznia 2007 r. sąd w Grodnie skazał Wadima Lohinaua na karę grzywny w wysokości 30 płac minimalnych (930 tys. rubli).

ВАДЗІМ ЛОГІНАЎ

Вадзім Логінаў – актывіст апазыцыі з Горадні.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Напрыканцы 2006 году супраць Вадзіма і ягонага таварыша Аляксея Крывінцова была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 341 Крымінальнага кодэксу («апаганьваньне будынкаў і псаваньне маёмасьці»). Падставай стала напісаньне маладымі людзьмі ў ноч на 22 верасьня 2006 году графіці супраць БРСМ. Справа распачатая паводле пастановы начальніка РАУС адміністрацыі Ленінскага раёну г. Горадні падпалкоўніка міліцыі А.Н. Зіновіка.

Абвінавачанымі былі выплачаныя выдаткі на рамонт; матэрыяльныя страты дазнавальнік міліцыі старэйшы лейтэнант Д.Н. Шкулепа ацаніў у суму 51420 і 300000 беларускіх рублёў.

9 студзеня 2007 г. судом Ленінскага раёну Горадні вынесены прысуд, паводле якога Вадзім Логінаў быў аштрафаваны на 30 базавых велічыняў (930 тысяч рублёў).

WADIM ŁABKOWICZ



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Wadim Łabkowicz urodził się w 1981 r. w Mińsku. Od 1996 r. brał udział w akcjach „Młodego Frontu", potem opuścił tę organizację z powodu różnic zdań z ówczesnym kierownictwem. Współpracował z biurem prasowym partii Białoruski Front Ludowy. Obecnie bierze udział w niektórych akcjach opozycji. Pracuje w firmie meblowej, zaocznie studiuje na Uniwersytecie Ekonomicznym. Był pierwszym niepełnoletnim więźniem politycznym – stanął przed sądem, kiedy miał jeszcze 16 lat.

KRONIKA REPRESJI

Wadim Łabkowicz został aresztowany w Stołpcach 25 sierpnia 1997 r. za graffiti o treści politycznej. Spędził w więzieniu ponad pół roku. Najpierw przebywał w areszcie tymczasowym w Stołpcach, potem w areszcie śledczym na Wołodarce. 24 lutego 1998 r. miński sąd wydał wyrok – półtora roku pozbawienia wolności w zawieszeniu na 2 lata.

ВАДЗІМ ЛАБКОВІЧ

Вадзім Лабковіч нарадзіўся ў 1981 г. у Менску. З 1996 г. браў удзел у акцыях «Маладога Фронту», пасьля пакінуў арганізацыю з прычыны рознагалосьсяў з тагачасным кіраўніцтвам.

Супрацоўнічаў з прэсавай службай Партыі БНФ. Цяпер бярэ ўдзел у апазыцыйных акцыях выбарачна. Працуе ў фірме па вырабе мэблі, завочна вучыцца ў эканамічным унівэрсытэце.

Першы непаўнагадовы беларускі палітвязень: прадстаў перад судом, калі яму не было і 16 гадоў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Вадзім Лабковіч быў арыштаваны ў Стоўбцах 25 жніўня 1997 г. за графіці палітычнага зьместу. Яму патэлефанавала знаёмая Аляксея Шыдлоўскага і папрасіла прыехаць зь Менску ў Стоўбцы (сам Шыдлоўскі ўжо быў за кратамі). Правёў у зьняволеньні болей за паўгоду. Пасьля Стаўбцоўскага ізалятару часовага ўтрыманьня Вадзім быў пад вартай у менскай «Валадарцы» і ў Жодзінскім СІЗА.

24 лютага 1998 г. у Менскім гарадзкім судзе быў абвешчаны прысуд – паўтара году зьняволеньня з адтэрміноўкай на два гады. Вадзіма адразу вызвалілі ў зале суду.

Зараз працуе і вучыцца, судзімасьць была зь яго зьнятая паводле амністыі.


FOT. KASTUS LUKASHOU

KASTUŚ ŁUKASZOU

Brat znanego polityka Wiaczesława Siwczika.

KRONIKA REPRESJI

Wobec Kastusia Łukaszoua wszczęto sprawę karną z artykułu 364 KK – „Przemoc lub groźba użycia przemocy wobec funkcjonariusza milicji". Oskarżano go o potrącenie samochodem funkcjonariusza milicji 28 marca 2006 roku, kiedy odbierał brata z kliniki chirurgicznej w Mińsku. Funkcjonariusze w cywilu starali się zatrzymać brata Łukaszoua w dzień wypisu. Kastusia Łukaszoua zatrzymano, ale nie od razu – dopiero 19 grudnia. Zabrano go z Instytutu Geochemii i Geofizyki Narodowej Akademii Nauk, gdzie pracował. Przeniesiono go do aresztu śledczego w Mińsku. 20 lutego 2007 r. sąd w Mińsku uznał Kastusia Łukaszoua winnym popełnienia zarzucanego mu przestępstwa, sędzia Zinaida Krasowskaja skazała go na 2 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu na 2 lata. Sędzia również zobowiązała Łukaszoua do wypłacenia poszkodowanemu milicjantowi zadośćuczynienia w wysokości 1 miliona rubli. Od wyroku Łukaszou się odwołał i 3 kwietnia kolegium mińskiego sądu skierowało sprawę do ponownego rozpatrzenia. 9 lipca zastępca przewodniczącego sądu, Tatiana Żułkowskaja, wydała taki sam wyrok: 2 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu na 2 lata.

КАСТУСЬ ЛУКАШОЎ

Брат вядомага палітыка Вячаслава Сіўчыка. Нарадзіўся 15 лістапада 1970 г. у Менску. Працаваў у Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Крымінальная справа ў адносінах да Канстанціна Лукашова была ўзбуджаная па арт. 364 Крымінальнага кодэксу – «гвалт ці пагроза гвалту ў адносінах да супрацоўніка міліцыі». Ён абвінавачваўся ў наезьдзе на аўтамабілі на супрацоўніка міліцыі 28 сакавіка 2006 г., калі забіраў брата з 3-й клінічнай бальніцы Менску, якога ў дзень выпіскі намагаліся затрымаць невядомыя асобы ў цывільным.

Затрыманы Канстанцін Лукашоў быў толькі 19 сьнежня на працы ў Інстытуце геахіміі і геафізікі Нацыянальнай акадэміі навук і зьмешчаны ў Менскі СІЗА. Утрыманьне пад вартай было матывавана тым, што Лукашоў нібыта ўхіляўся ад сьледзтва і ў сувязі з гэтым знаходзіўся ў вышуку.

20 лютага 2007 г. суд Ленінскага р-ну г. Менску прызнаў Канстанціна Лукашова вінаватым у інкрымінуемым злачынстве, і прысудзіў два гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на два гады. Судзьдзя Зінаіда Красоўская абавязала Канстанціна выплаціць пацярпеламу міліцыянту кампэнсацыю і аплаціць судовыя выдаткі. Канстанцін Лукашоў быў вызвалены з-пад варты ў зале суду.

Прысуд быў абскарджаны, і 3 красавіка калегія Менскага гарадзкога суда адмяніла прысуд раённага суду, накіраваўшы справу Канстанціна Лукашова на новы разгляд іншаму судзьдзю. 9 ліпеня намесьнік старшыні суду Ленінскага раёну Тацяна Жулкоўская пры паўторным разглядзе вынесла аналягічны прысуд: два гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на два гады.

ULADZIMIR ŁYSKO

Uladzimir Łysko urodził się 20 lipca 1957 r. w Borysowie. Po ukończeniu szkoły średniej rozpoczął studia politechniczne na wydziale geodezji. W 1975 r. został powołany do wojska, 3 lata służył we flocie bałtyckiej. Po zakończeniu służby wojskowej i ukończeniu technikum, przeniósł się do Mińska, gdzie rozpoczął pracę w przedsiębiorstwie geodezyjnym przy Radzie Ministrów ZSRR. Ponad 30 lat pracował jako geodeta. Od 1989 r. brał udział w akcjach białoruskiej opozycji.

KRONIKA REPRESJI

Uladzimir Łysko został aresztowany w Dzień Woli 1997 roku. 25 marca 1997 r. uczestnicy akcji, którzy świętowali kolejną rocznicę Białoruskiej Republiki Ludowej, zgromadzili się na Placu Niepodległości. Zaplanowano marsz do Placu Jakuba Kołasy zakończony mityngiem. Milicja od samego początku zachowywała się prowokacyjnie. Funkcjonariusze Specnazu wyłapywali osoby z tłumu, rozpoczęły się bójki. Na skrzyżowaniu Prospektu Skoriny i ulicy Kozłowa rozpoczęła się bójka. Ostatecznie mityng na Placu Jakuba Kolasy odbył się, a po jego zakończeniu ludzie zaczęli się rozchodzić. Uladzimir wsiadł do trolejbusu nr 2 i pojechał do domu, na ulicę Sławińskiego. Jednakże na przystanku niedaleko parku Czeljuskince do trolejbusu wskoczyło sześciu funkcjonariuszy w cywilu, złapało Łysko i zabrało go do samochodu. Przewieziono go do aresztu śledczego na Wołodarce, gdzie spędził miesiąc. Potem środek zapobiegawczy został zmieniony, Łysko otrzymał zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. W listopadzie 1997 r. Łysko został skazany na 2 lata ograniczenia wolności. 8 marca 1998 r. został wysłany do Homla, gdzie miał odbyć karę „chemii". Objęto go nią po roku, a 12 marca 1999 r. został zwolniony.

W listopadzie 2000 r. został zatrzymany i skazany na karę grzywny za udział w młodzieżowej akcji „Przemiany!".

УЛАДЗІМЕР ЛЫСКО

Уладзімер Лыско нарадзіўся 20 ліпеня 1957 г. у Барысаве. У 1975 г. прызваны ў войска, служыў тры гады на Балтыйскім флоце. Пасьля службы і заканчэньня тэхнікуму быў разьмеркаваны ў Менск, у тагачаснае 5-е геадэзічнае прадпрыемства пры Савеце міністраў СССР.

Ад 1989 г. бярэ ўдзел у акцыях беларускай апазыцыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

На Дзень Волі 1997 году было заплянаванае шэсьце ад плошчы Незалежнасьці да плошчы Якуба Коласа і мітынг БНР. Міліцыя ад пачатку паводзіла сябе правакацыйна: адной зь першых пацягнулі ў «варанок» маці Славаміра Адамовіча, але жанчыну абаранілі. Потым спэцназаўцы пачалі выхопліваць людзей проста з натоўпу, дэманстранты «высыпалі» на праезную частку. На скрыжаваньні праспэкту Скарыны і вуліцы Казлова пачалася бойка. Калі мітынг на плошчы Якуба Коласа ўрэшце адбыўся, людзі пачалі разыходзіцца.

Уладзімер сеў у тралейбус №2 і паехаў дадому, аднак на прыпынку ля парку Чалюскінцаў у тралейбус заскочылі шэсьць чалавек у цывільным, скруцілі яго і закінулі ў машыну. У РАУС Савецкага раёну, як злачынцу, паставілі на «расьцяжку». Гэта было ягонае першае затрыманьне. Пасьля трох сутак на Акрэсьціна Лыско перавялі ў СІЗА на вул. Валадарская, дзе ён правёў месяц, пакуль не выпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе.

У лістападзе 1997 г. Уладзімера Лыско асудзілі да двух гадоў абмежаваньня волі.

У Гомель на «хімію» адпраўлены 8 сакавіка 1998 г. праз год трапіў пад амністыю. 12 сакавіка 1999 г. вызвалены.

У лістападзе 2000 г. быў затрыманы і прысуджаны да штрафу за ўдзел у моладзевай акцыі «Пераменаў!».



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

WITAL MACUKIEWICZ

Wital Macukiewicz urodził się 2 maja 1987 r. Ukończył Szkołę nr 138 w Mińsku. Studiował ekonomię i prawo w Białoruskim Instytucie Prawoznawstwa, który powinien był ukończyć w 2010 r. Nie relegowano go, jednak nie zdążył obronić dyplomu. Kierownictwo Instytutu pozwoliło Witalowi zrobić to później. Nie brał udziału w żadnych ruchach politycznych.

KRONIKA REPRESJI

Wital Macukiewicz, uczestnik akcji protestu 19 grudnia w Mińsku, przyszedł na akcję by wyrazić swoją obywatelską postawę. Był ostatnim oskarżonym w sprawie o masowe zamieszki, która została zamknięta po jego aresztowaniu. Zatrzymano go w marcu 2011 r. po przesłuchaniach jego znajomych i przyjaciół, a także na podstawie materiałów wideo z Płoszczy 2010. Był przetrzymywany w areszcie śledczym na Wołodarce. 12 maja 2011 r. został skazany na 3 lata pozbawienia wolności. Wyrok odbywał w kolonii karnej w Nowopołocku. 13 sierpnia został zwolniony na podstawie dekretu o ułaskawieniu, wydanego przez Aleksandra Łukaszenkę.

ВІТАЛЬ МАЦУКЕВІЧ

Нарадзіўся 2 траўня 1987 году ў сям'і штурмана дальняга плаваньня і інжынэра. Скончыў менскую школу № 138. Вучыўся ў Менскім інстытуце кіраваньня, вывучаў эканоміку і правы ў Беларускім інстытуце правазнаўства, які ў 2010 годзе павінен быў скончыць. Выключаны ня быў, аднак абараніць дыплём не пасьпеў. Кіраўніцтва інстытуту дазволіла Віталю зрабіць гэта пазьней. У палітычных рухах малады чалавек ня ўдзельнічаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Удзельнік акцыі пратэсту 19 сьнежня 2010 г. у Менску: прыйшоў на акцыю, каб выказаць сваю грамадзянскую пазыцыю. Стаў апошнім фігурантам «справы аб масавых беспарадках», якая пасьля яго арышту была зачыненая.

Быў затрыманы ў сакавіку 2011 г. пасьля допытаў яго знаёмых і сяброў, а таксама на падставе аналізу відэакадраў з Плошчы-2010. Утрымліваўся ў СІЗА г. Менску па вул. Валадарскага.

12 траўня 2011 г. асуджаны ў судзе Маскоўскага раёну Менску на 3 гады пазбаўленьня волі. Адбываць тэрмін Віталя адправілі ў папраўчую калёнію г. Наваполацку.

13 жніўня 2011 г. выйшаў на волю на падставе памілаваньня яго, у ліку іншых палітвязьняў, дзеючым кіраўніком дзяржавы.

SIARHIEJ MARCALIEU



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Urodził się 29 kwietnia 1977 r. w Mińsku w rodzinie naukowców. Jest wnukiem Stanisława Marcalieu, dyrektora Instytutu Sztuki, Etnografii i Folkloru Akademii Nauk. Po ukończeniu szkoły średniej studiował na Wydziale Stosunków Międzynarodowych Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego, z którego usunięto go za działalność polityczną, kiedy rektorem był Aleksander Kazulin. W połowie lat 90. został przewodniczącym „Młodej Hramady" (frakcji młodzieżowej Partii Socjaldemokratycznej Mikoły Statkiewicza). Studia w Moskwie poświęcił na rzecz działalności politycznej. Później wyjechał do Polski i kontynuował naukę na Uniwersytecie Poznańskim, gdzie ukończył kierunek politologii.

KRONIKA REPRESJI

Podczas kampanii prezydenckiej w 2010 roku, kierował sztabem Mikoły Statkiewicza. 19 grudnia 2010 r. Siarhiej nie uczestniczył w protestach na Placu Niepodległości. Został zatrzymany po czterech dniach, w drodze do Warszawy, gdzie miał wziąć udział w programie telewizji „Biełsat". Przebywał w areszcie KGB. Oskarżono go o organizację masowych zamieszek. 4 kwietnia 2011 r. oskarżenie zmieniono, zarzucając mu działania kwalifikujące się pod art. 342, pkt 1 KK – „Organizacja lub udział w działalności naruszającej porządek publiczny". 16 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 2 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu.

СЯРГЕЙ МАРЦАЛЕЎ

Нарадзіўся 29 красавіка 1977 году ў Менску ў сям'і патомных навукоўцаў. Унук Станіслава Марцалева, кіраўніка Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру Акадэміі навук, і акадэміка-філёзафа Леаніда Яўменава.

Пасьля сканчэньня сярэдняй школы вучыўся на факультэце міжнародных адносінаў БДУ, але быў адлічаны за палітычную дзейнасьць, калі рэктарам быў Казулін. Тым ня менш, пасьля пераходу Аляксандра Казуліна ў апазыцыю яны працавалі разам.

У сярэдзіне 1990-х Сяргей быў абраны старшынём «Маладой Грамады» (моладзевай арганізацыі пры БСДП Міколы Статкевіча). У гэты час дзеля палітычнай дзейнасьці ён адмовіўся ад вучобы ў Маскве. Пазьней зьехаў вучыцца ў Польшчу і скончыў Пазнаньскі ўнівэрсытэт па спэцыяльнасьці «паліталёгія».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Падчас прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі 2010 году кіраваў передвыбарчым штабам Міколы Статкевіча. 19 сьнежня 2010 г., калі ў Менску адбывалася акцыя пратэсту, на плошчы Незалежнасьці Сяргей амаль не прысутнічаў. Ён быў затрыманы праз тры дні: уначы на 23 сьнежня зьняты зь цягніка, на якім ехаў у Варшаву ўдзельнічаць у здымках перадачы тэлеканалу «Белсат».

Утрымліваўся пад вартай ў СІЗА КДБ. Абвінавачваўся ў арганізацыі масавых беспарадкаў. 4 красавіка 2011 г. гэта абвінавачваньне было зьменена на арт. 342 КК (арганізацыя дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак).

16 траўня 2011 г. у судзе Заводзкага раёну Менску асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі ўмоўна.



FOT. SIARHIEJ MARCHYK

SIARHIEJ MARCZYK

Siarhiej Marczyk jest młodzieżowym aktywistą z Baranowiczów.

KRONIKA REPRESJI

10 kwietnia 2006 r. przeciwko aktywiście wszczęto sprawę karną z artykułu 193.1 Kodeksu Karnego – „Działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji «Młody Front»". 13 kwietnia w mieszkaniach Marczyka i jego kolegów, Andreja Jurata i Wiktora Kisliuka, śledczy przeprowadzili rewizje, zabrali materiały i publikacje organizacji oraz sprzęt komputerowy. Sprawę karną wszczęto tylko przeciwko Marczykowi, pozostali mieli status świadków. Siarhiej Marczyk wyjechał z Białorusi.

СЯРГЕЙ МАРЧЫК

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

10 красавіка 2006 году супраць моладзевага актывіста з Баранавічаў Сяргея Марчыка была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 193-1 КК РБ – за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады Фронт».

13 красавіка на кватэрах Сяргея Марчыка і ягоных паплечнікаў Андрэя Юруця і Віктара Кісьлюка сьледчыя органы правялі ператрусы, канфіскавалі маладафронтаўскія матэрыялы і выданьні дэмакратычнага руху, а таксама прыватную аргтэхніку. Крымінальная справа была заведзеная толькі супраць Сяржука Марчыка, астатнія праходзілі па ёй у якасьці сьведкаў.

Сяргея Марчык зьехаў за межы Беларусі.

MICHAIŁ MARINICZ

Michaił Marinicz urodził się 13 stycznia 1940 r. we wsi Staryje Gołowczicy w obwodzie homelskim. Ukończył białoruską politechnikę, miński Instytut Języków Obcych oraz mińską Szkołę Partyjną. W latach 1990–1991 był merem Mińska, w latach 1990–1994 deputowanym do Rady Najwyższej Białorusi XII Kadencji. Był także ministrem kontaktów gospodarczych z zagranicą, a także ambasadorem Białorusi na Łotwie, w Estonii i Finlandii. W 1994 r. został ambasadorem w Czechach oraz (w niepełnym wymiarze) pełnomocnym ambasadorem na Słowacji i Węgrzech. W 2001 r. napisał podanie o dymisję, gdyż chciał kandydować w wyborach prezydenckich, jednakże nie zarejestrowano jego kandydatury. Kierował organizacją społeczną „Białoruskie Stowarzyszenie Dziełowaja Inicjatywa".

KRONIKA REPRESJI

26 kwietnia 2004 r. Marinicz został aresztowany przez białoruskie KGB. Skazano go na 5 lat więzienia i konfiskatę mienia. Sąd uznał go winnym kradzieży sprzętu komputerowego, który w rzeczywistości został przekazany organizacji „Dziełowaja Inicjatywa" przez ambasadę USA na Białorusi. Od kwietnia 2004 r. do kwietnia 2006 r. był więźniem specjalnego więzienia KGB oraz kolonii karnych w Orszy i Mińsku. Zwolniono go z więzienia 14 kwietnia 2006 r.

МІХАІЛ МАРЫНІЧ

Міхаіл Марыніч нарадзіўся 13 студзеня 1940 г. у вёсцы Старыя Галоўчыцы Петрыкаўскага раёну Гомельскай вобласьці. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, Менскі інстытут замежных моваў, Менскую вышэйшую партыйную школу. Ганаровы доктар эканамічных навук.

Працаваў у будаўніцтве 16 гадоў, у тым ліку каля трох гадоў – у Аўганістане.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

З 1990 па 1991 г. – старшыня гарвыканкаму Менску, у 1990–1994 гг. – дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня. У 1994 г. прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным паслом у Чэхіі і па сумяшчальніцтве – у Славаччыне і Вугоршчыне.

З 1994 па 1998 г. – міністар замежнаэканамічных сувязяў Беларусі. У 1999–2001 гг. – Надзвычайны і Паўнамоцны пасол у Латвіі і па сумяшчальніцтве – у Эстоніі і Фінляндыі.

У 2001 г. напісаў заяву аб адстаўцы і выставіў сваю кандыдатуру для ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах, аднак кандыдатам у прэзыдэнты зарэгістраваны ня быў. Узначаліў грамадзкую арганізацыю «Беларуская асацыяцыя «Дзелавая ініцыятыва».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

26 красавіка 2004 г. Міхаіл Марыніч быў арыштаваны і неўзабаве асуджаны да 5 гадоў турмы з канфіскацыяй маёмасьці. Суд прызнаў яго вінаватым у аваладаньні аргтэхнікай, якая насамрэч была бязвыплатна перададзеная арганізацыі «Дзелавая ініцыятыва» амбасадай ЗША ў Беларусі.

З красавіка 2004 да красавіка 2006 г. – вязень спэцтурмы КДБ, аршанскай і менскай папраўчых калёніяў. 14 красавіка 2006 г. вызвалены датэрмінова паводле амністыі.



FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

DZMITRIJ MIADZWIEDZ

Dzmitrij Miadzwiedz urodził się 16 stycznia 1960 w Mińsku. Ukończył studia na Narodowym Uniwersytecie Technicznym jako inżynier elektryk. Przez jakiś czas pracował w katedrze naukowej, następnie w branży budowlanej. Z jego udziałem zbudowano wiele znanych obiektów w stolicy Białorusi. Był m.in. generalnym wykonawcą parku rozrywki „Słoneczna Dolina". Później prowadził swój biznes. Nie jest zaangażowany w politykę, nie ma żadnych powiązań z partiami czy ruchami politycznymi. Gdy przebywał w areszcie, w domu czekała na niego żona z noworodkiem.

KRONIKA REPRESJI

19 grudnia 2010 r. uczestniczył wraz z najstarszym synem z pierwszego małżeństwa w protestach na Placu Niepodległości. W rezultacie zostali aresztowani w nocy z 19 na 20 grudnia. Skazano ich na 10 dni aresztu. Po zakończeniu kary Dzmitrij Miadzwiedz został ponownie aresztowany i umieszczony w ośrodku zatrzymań w Mińsku przy ulicy Wołodarskiego – tym razem na podstawie otwartego dochodzenia w sprawie zamieszek. 6 stycznia 2011 został oskarżony na podstawie art. 293 KK. 10 marca 2011 r. Moskiewski Sąd Rejonowy w Mińsku skazał go na 3 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu.

ЗЬМІЦЕР МЯДЗЬВЕДЗЬ

Нарадзіўся 16 студзеня 1960 году ў Менску. Скончыў БНТУ (у той час – Менскі політэхнічны інстытут). Па спэцыяльнасьці інжынэр-энэргетык. Працаваў на катэдры роднага інстытуту, потым – у сфэры будаўніцтва. Многія вядомыя аб'екты беларускай сталіцы пабудаваныя зь ягоным удзелам – напрыклад, Зьміцер Мядзьведзь быў намесьнікам дырэктара генпадраднай арганізацыі пры будаўніцтве парку адпачынку «Сонечная даліна» ў мікрараёне Курасоўшчына.

Не займаўся палітыкай, ня мае дачыненьня да палітычных партыяў і рухаў. Падчас зьняволеньня дома яго чакалі жонка з нованароджаным дзіцем.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

На плошчы Незалежнасьці 19 сьнежня 2010 году прысутнічаў разам са старэйшым сынам ад першага шлюбу, каб быць упэўненым у яго бясьпецы. І ён сам, і ягоны сын былі затрыманыя ўначы з 19 на 20 сьнежня і асуджаныя на 10-суткавыя арышты на Акрэсьціна.

Пасьля адбыцьця адміністратыўнага тэрміну Зьміцер быў паўторна арыштаваны і зьмешчаны ў менскі сьледчы ізалятар на вул. Валадарскага – гэтым разам у межах крымінальнай справы аб масавых беспарадках. 6 студзеня 2011 г. яму было прад'яўленае абвінавачваньне па чч. 1 і 2 арт. 293 Крымінальнага кодэксу РБ.

Асуджаны 10 сакавіка 2011 г. у Маскоўскім райсудзе Менску на 3 гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчую ўстанову.

MIKOŁA MARKIEWICZ



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Mikoła Markiewicz urodził się 29 czerwca 1962 r. we wsi Czerniczi, w obwodzie homelskim. Jest dziennikarzem z Grodna i członkiem Białoruskiego Stowarzyszenia Dziennikarzy. Ukończył filologię na Uniwersytecie Kaliningradzkim. Pracował w grodzieńskich gazetach „Wysota" i „Grodzieńska prawda". Był deputowanym Rady Najwyższej. W 1991 r. stworzył fundację kulturalno-oświatową „Batkiwszczyna", w kolejnym roku zarejestrował gazetę fundacji „Pogoń" i został jej redaktorem naczelnym. Brał udział w proteście głodowym deputowanych w 1995 r.

KRONIKA REPRESJI

2 września 2002 r. Markiewicz został aresztowany i oskarżony o zniesławienie prezydenta. Sąd w Grodnie skazał go na 2,5 roku ograniczenia wolności. Za pretekst wyroku posłużyła informacja opublikowana w „Pogoni" w czasie kampanii prezydenckiej 2001 roku. Przez pół roku Markiewicz odbywał karę w Osipowiczach w obwodzie mohylewskim, później wykonywał roboty przymusowe w Grodnie. Został zwolniony 5 marca 2003 r.

W 2003 r. zainicjował wznowienie gazety „Dzień" i był jej redaktorem naczelnym do maja 2004 roku, kiedy to decyzją sądu wydawanie gazety zostało zabronione. W 2005 r. został dyrektorem programowym „Radia Racja". Obecnie Mikoła Markiewicz jest redaktorem portalu internetowego gazety pahonia.org i doradcą zarządu „Radia Racji" ds. programu i rozwoju rozgłośni.

МІКОЛА МАРКЕВІЧ

Мікола Маркевіч – журналіст з Гародні, сябра БАЖ. Нарадзіўся 29 чэрвеня 1962 г. у вёсцы Чэрнічы Жыткавіцкага раёну Гомельскай вобласьці. Скончыў філялягічны факультэт Калінінградзкага ўнівэрсытэту. Працаваў у гарадзенскіх газэтах «Высота», «Гродзенская праўда».

Дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня. У 1991 г. стварыў культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына», праз год зарэгістраваў пры фондзе газэту «Пагоня» і стаў яе галоўным рэдактарам. Браў удзел у галадоўцы дэпутатаў Вярхоўнага Савету ў 1995 г.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

2 верасьня 2002 г. быў арыштаваны і абвінавачаны ў паклёпе на прэзыдэнта краіны.

У 2002 г. Мікола Маркевіч асуджаны судом Ленінскага раёну Горадні да двух з паловай гадоў абмежаваньня волі. Падставай паслужыла нататка ў «Пагоні» падчас прэзыдэнцкай кампаніі 2001 г. Паўгода адбываў пакараньне ў Асіповічах Магілёўскай вобласьці, пасьля чаго быў пераведзены на папраўчыя работы па месцы жыхарства, у Горадню.

5 сакавіка 2003 г. вызвалены.

У 2003 г. ініцыяваў аднаўленьне газэты «День» і быў яе рэдактарам да траўня 2004 г., калі рашэньнем Гаспадарчага суду выхад газэты быў забаронены. У 2005 г. разам з аднадумцамі аднавіў Радыё Рацыя і стаў яго праграмным дырэктарам. Цяпер Мікола Маркевіч – рэдактар інтэрнэт-газэты pahonia.org і дарадца праўленьня Радыё Рацыя ў справах праграмы і разьвіцьця.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

PAWEŁ MAŻEJKA

Paweł Mażejka urodził się 25 maja 1978 r. w Grodnie. Ukończył historię i kulturoznawstwo na Grodzieńskim Uniwersytecie im. Janki Kupały. Jeszcze podczas studiów zaczął publikować w gazecie „Pogoń". Kierował sztabem wyborczym Aleksandra Milinkiewicza podczas wyborów prezydenckich 2006 roku. Jest działaczem ruchów „Za wolność" i „Uratujmy Grodno od zniszczenia". Był jednym z organizatorów kampanii „Rok państwowości białoruskiej – 2008" w Grodnie i koordynatorem serii „Grodzieńska biblioteka".

KRONIKA REPRESJI

1 września 2002 r. został aresztowany i oskarżony o zniesławienie prezydenta. 24 czerwca 2002 r. Mażejka został skazany przez Sąd Rejonowy Grodna na 2 lata ograniczenia wolności za „zniesławienie prezydenta Republiki Białoruś z oskarżeniem go o popełnienie szczególnie ciężkich przestępstw". Pretekstem do tego oskarżenia stała się publikacja w „Pogoni" z okresu kampanii wyborczej 2001 r. Karę odbywał w zakładzie karnym w Żłobinie. Po amnestii zmniejszono mu karę do jednego roku. Został zwolniony warunkowo 22 marca 2003 r. za dobre zachowanie i do 1 września tego roku musiał jeszcze meldować się na posterunku milicji. Obecnie pracuje w niezależnych mediach. Szczególnie ściśle współpracuje z Biełsat TV.

ПАВАЛ МАЖЭЙКА

Павал Мажэйка нарадзіўся 25 траўня 1978 г. у Гародні. Скончыў факультэт гісторыі і культуралёгіі Гарадзенскага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы. Яшчэ студэнтам пачаў друкавацца ў газэце «Пагоня».

Падчас выбараў 2006 году быў прэс-сакратаром А. Мілінкевіча. Актывіст рухаў «За свабоду», «Выратуем Гародню ад разбурэньняў», адзін з арганізатараў кампаніі «Год беларускай дзяржаўнасьці-2008» у Гародні. Каардынатар сэрыі «Гарадзенская бібліятэка».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

1 верасьня 2002 г. быў арыштаваны і абвінавачаны ў паклёпе на кіраўніка дзяржавы.

24 чэрвеня 2002 г. Павал Мажэйка быў асуджаны Ленінскім раённым судом Гародні да двух гадоў абмежаваньня волі за «паклёп на прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі з абвінавачаньнем яго ў зьдзяйсьненьні асабліва цяжкіх злачынстваў». Падставай паслужыла нататка ў «Пагоні» падчас прэзыдэнцкай кампаніі 2001 г.

Адбываў пакараньне ў папраўчай установе Жлобіну. Паводле амністыі тэрмін пакараньня быў зьменшаны на год. Вызвалены ўмоўна-датэрмінова 22 сакавіка 2003 г. за добрыя паводзіны, і да 1 верасьня таго ж году мусіў адзначацца ў міліцэйскай установе.

Працуе на тэлеканале «Белсат».

ALEŚ MICHALEWICZ

Urodził się 15 maja 1975 r. w Mińsku, w rodzinie naukowców. W 1997 r. ukończył studia na Wydziale Prawa Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego, podczas studiów udzielał się w Stowarzyszeniu Białoruskich Studentów. Studiował również w Warszawie i Oxfordzie. Od 1997 r. zaangażowany w międzynarodową wymianę młodzieży. Od 2000 r. piastował wysokie stanowiska w firmie turystycznej „Arcadia". Zrezygnował z funkcji prezesa spółki po siedmiu kontrolach dokonanych przez władze z powodu jego udziału w wyborach parlamentarnych w 2004 r.

W latach 2003–2007 był posłem Puchowickiej Rady Rejonowej w obwodzie mińskim i koordynatorem Zgromadzenia Posłów Rad Lokalnych. W tym samym czasie był również wydawcą gazety „Region" i inicjatorem szeregu decyzji w zakresie rozszerzenia uprawnień organów samorządu lokalnego. W latach 2004–2008 był zastępcą przewodniczącego partii Białoruski Front Ludowy. 14 czerwca 2008, po objęciu stanowiska przewodniczącego partii i zaproponowaniu programu reformy wewnętrznej, został wykluczony z organizacji za publiczną krytykę kierownictwa.

W 2010 r. zainicjował stworzenie ruchu społecznego „Za modernizację". Startował w wyborach prezydenckich 2010.

KRONIKA REPRESJI

19 grudnia 2010 uczestniczył w demonstracji w Mińsku przeciwko fałszerstwom wyników wyborów prezydenckich. W nocy z 19 na 20 grudnia 2010 został aresztowany. Wypuszczono go z aresztu wieczorem 19 lutego 2011, po tym, jak podpisał zobowiązanie do nieopuszczania Białorusi. 28 lutego w czasie konferencji prasowej Michalewicz oświadczył, że wyszedł na wolność tylko dzięki temu, że podpisał zgodę na współpracę z KGB, którą jednak zrywa poprzez publiczne oświadczenie. Był torturowany, więc złożył powiadomienie o torturach do Prokuratury Generalnej Białorusi oraz Komisji ds. Tortur ONZ. 14 marca z obawy o życie, potajemnie opuścił Białoruś. 24 marca 2011 r. czeskie MSW poinformowało, że Michalewicz otrzymał azyl polityczny w Republice Czeskiej.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ

Нарадзіўся 15 траўня 1975 г. у Менску ў сям'і навукоўцаў. Вучыўся ў школе № 19 г. Менску (з матэматычным ухілам), Беларускім гуманітарным ліцэі. У 1997 годзе скончыў юрыдычны факультэт БДУ па спэцыяльнасьці «палітоляг-юрыст», падчас вучобы ўзначальваў «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў» – грамадзкую арганізацыю, якая абараняе правы студэнтаў беларускіх ВНУ. Праходзіў стажыроўкі ў Варшаўскім і Оксфардзкім унівэрсытэтах. З 1997 г. займаўся моладзевымі абменамі і турызмам, з 2000 г. працаваў на кіруючых пасадах у турыстычным СП «Аркадыя». Пакінуў пасаду генэральнага дырэктара гэтай кампаніі пасьля сямі праверак, учыненых уладамі з-за ўдзелу яе кіраўніка ў парлямэнцкіх выбарах 2004 году.

З 2005 г. мае акрэдытацыю Міністэрства эканомікі РБ у якасьці антыкрызіснага кіраўніка. У 2007–2008 гг. працаваў юрысконсультам Асацыяцыі інвалідаў вайны ў Аўганістане, у 2008–2010 гг. – юрыстам Беларускага незалежнага прафсаюзу. Свабодна валодае чатырма мовамі. З 2003 па 2007 гг. быў дэпутатам Пухавіцкага раённага савету і каардынатарам Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў. Выдаваў незалежную газету «Рэгіён» у г. Мар'іна Горка Менскай вобласьці. Ініцыяваў шэраг крокаў па пашырэньні паўнамоцтваў органаў мясцовага самакіраваньня.

У 2004–2008 гг. – намесьнік старшыні Партыі БНФ. Балятаваўся на пасаду старшыні партыі ў 2008 г., аднак быў выключаны за публічную крытыку яе кіраўніцтва.

У 2010 г. заснаваў новы грамадзкі рух – «За мадэрнізацыю». Кандыдат на прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь на выбарах-2010.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы супрацоўнікамі КДБ пасьля акцыі пратэсту ў Менску ў ноч на 20 сьнежня 2010 г. ў сябе дома. Зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Абвінавачаны па артыкуле 293 – «Масавыя беспарадкі».

19 лютага 2011 г. быў выпушчаны зь СІЗА пад падпіску аб нявыезьдзе.

Праз некалькі дзён, 28 лютага 2011 г., зладзіў шакуючую грамадзкасьць прэс-канфэрэнцыю, на якой заявіў пра катаваньні вязьняў СІЗА КДБ. Пасьля гэтай заявы Міхалевіча выклікалі на допыт у КДБ, на які, аднак, Алесь не прыйшоў, таемна пакінуўшы Беларусь. Быў абвешчаны ўладамі Беларусі ў міжнародны вышук.

23 сакавіка 2011 г. атрымаў палітычны прытулак і жыве ў Чэхіі. Сям'я застаецца ў Беларусі.

OLEG MINICZ

Oleg Minicz to białoruski programista, twórca filmów animowanych z Grodna, twórca „Multklubu" w Internecie.

KRONIKA REPRESJI

16 sierpnia 2005 r. funkcjonariusze KGB zadzwonili do mieszkania Minicza, przedstawiając się jako osoby od naprawy telewizorów. W mieszkaniu przeprowadzono rewizję, po zakończeniu której Minicza przewieziono do siedziby KGB i poinformowano go o wszczęciu sprawy karnej. Oskarżono go o stworzenie filmu animowanego, którego główny bohater przypominał prezydenta. Minicz otrzymał zakaz opuszczania miasta, wszczęto przeciwko niemu sprawę karną z art. 368, pkt 2 – „Znieważenie prezydenta Republiki Białoruś". Na początku 2006 r. Minicz opuścił Białoruś, obawiając się dalszych prześladowań politycznych. Obecnie mieszka w Niemczech, pracuje jako ekspert od efektów specjalnych w filmie. Nadal tworzy satyryczne animacje na temat białoruskiej polityki.

АЛЕГ МІНІЧ

Алег Мініч – беларускі праграміст і мультыплікатар з Горадні, стваральнік «Мультклюбу» у інтэрнэце.

ХРАНАЛОГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

16 жніўня 2005 г. супрацоўнікі КДБ пазванілі ў кватэру Алега Мініча і прадставіліся тэлемайстрамі. Быў праведзеныператрус, пасьля якога Алега Мініча даставілі ва ўпраўленьне КДБ і паведамілі пра ўбуджэньне крымінальнай справы. Гарадзенцу ставілася ў віну стварэньне мультфільмаў, галоўны герой якіх нагадваў кіраўніка дзяржавы.

У гаспадара ўзялі падпіску аб нявыезьдзе. Крымінальная справа была ўзбуджана па арт. 368 ч.2 – «абраза прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь».

Напачатку 2006 г. пакінуў Беларусь, ратуючыся ад палітычнага перасьледу. Жыве ў Нямеччыне, праца звязаная са стварэннем спэцэфэктаў для фільмаў. Працягвае ствараць і сатырычныя анімацыі на тэмы беларускай палітыкі.

ANDREJ MIRONIUK

Andrej Mironiuk, obywatel Ukrainy, uczestnik „Czarnobylskiego Szlaku" 1996 roku, urodził się w 1975 r. Pochodzi z Tamania.

KRONIKA REPRESJI

26 kwietnia 1996 r. został zatrzymany w Mińsku podczas pacyfikacji akcji i przetrzymywany w mińskim areszcie na Wołodarce. Skazano go pod koniec sierpnia 1996 r. na rok kolonii karnej. Sędzią był Grigorij Kozyrickij, prokuratorem – Siergiej Teleżewicz. Został uwolniony na mocy amnestii 24 grudnia 1996 r. Z czterema innymi Ukraińcami skazanymi za udział w „Czarnobylskim Szlaku", Mironiuk wyjechał do swego kraju pod opieką jednego z deputowanych Rady Najwyższej Ukrainy.

АНДРЭЙ МІРАНЮК

Грамадзянін Украіны, удзельнік «Чарнобыльскага шляху» 1996 году. Нарадзіўся ў 1975 годзе. Родам з гораду Тамань.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 26 красавіка 1996 г. у Менску падчас разгону акцыі, утрымліваўся ў менскім СІЗА па вул. Валадарскага.

Асуджаны ў канцы жніўня 1996 г. Менскім гарадзкім судом на 1 год зьняволеньня ў калёніі агульнага рэжыму. Судзьдзя – Рыгор Казырыцкі, пракурор – Сяргей Целяжэвіч.

Вызвалены паводле амністыі 24 сьнежня 1996 г. зь менскага СІЗА на Валадарскага. Разам з чатырма іншымі асуджанымі за «Чарнобыльскі шлях» суайчыньнікамі Андрэя забраў зь Менску адзін з дэпутатаў Вярхоўнай Рады Ўкраіны і адвёз на Бацькаўшчыну.

FIODAR MIRZAJANAU


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Fiodar Mirzajanau urodził się 9 grudnia 1990 r. w Baranowiczach, w obwodzie brzeskim. Ukończył gimnazjum. Podczas nauki był aktywnym uczestnikiem olimpiad naukowych w mieście, obwodzie i kraju – brał udział w olimpiadach z historii, informatyki i geografii. W 2008 r. rozpoczął studia na Wydziale Zarządzania Białoruskiego Państwowego Uniwersytetu Ekonomicznego w specjalności „cybernetyka ekonomiczna". Jeszcze jako student pasjonował się modelami gospodarczego rozwoju kraju, próbował swoich sił w nauce – został uczestnikiem międzynarodowej studenckiej konferencji naukowo-praktycznej. Pasjonuje się turystyką, kolarstwem, literaturą.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany 19 grudnia 2010 roku, odbył 15-dniowy areszt w Żodinie. Już 25 stycznia 2011 r. został kolejny raz zatrzymany. Po 3 dniach w areszcie na Okrestinie, 1 lutego przedstawiono mu zarzuty z art. 293, pkt 1 i 2 KK RB – „Masowe zamieszki". Przetrzymywano go w areszcie śledczym na Wołodarce w Mińsku. 14 maja sąd w Mińsku skazał go na 3 lata pozbawienia wolności w kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. 28 lipca przeniesiono go z Wołodarki do kolonii karnej w Iwacewiczach. Został ułaskawiony na mocy dekretu Aleksandra Łukaszenki. Zwolniono go z kolonii 14 września 2011 r.

ФЁДАР МІРЗАЯНАЎ

Нарадзіўся 9 сьнежня 1990 году ў г. Баранавічы Берасьцейскай вобласьці. Скончыў гімназію, у часе вучобы быў актыўным удзельнікам алімпіяднага руху ў горадзе, вобласьці і рэспубліцы: браў удзел у алімпіядах па гісторыі, інфарматыцы і геаграфіі. У 2008 г. паступіў на факультэт мэнэджмэнту Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту па спэцыяльнасьці «эканамічная кібэрнэтыка». Студэнтам захапіўся мадэлямі эканамічнага разьвіцьця краіны, паспрабаваў сілы ў навуцы, стаўшы ўдзельнікам міжнароднай студэнцкай навукова-практычнай канфэрэнцыі. Захапляецца турызмам, веласпортам, літаратурай.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 19 сьнежня 2010 г., быў асуджаны, адбыў адміністратыўны арышт тэрмінам 15 сутак у сьледчым ізалятары г. Жодзіна. Аднак ізноў быў арыштаваны 25 студзеня 2011 г., і пасьля трох сутак у ізалятары на Акрэсьціна 1 лютага яму было прад'яўленае абвінавачваньне па арт. 293, ч. 1 і 2 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь («масавыя беспарадкі»). Быў пад вартай у СІЗА па вул. Валадарскага ў Менску.

14 траўня 2011 г. судом Партызанскага раёну Менску быў асуджаны на 3 гады зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. 28 ліпеня этапаваны з «Валадаркі» ў Івацэвіцкую папраўчую калёнію «Ваўчыныя норы».

Памілаваны дзеючым кіраўніком дзяржавы пад ціскам міжнароднай супольнасьці. Вызвалены 14 верасьня 2011 г.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ALEKSANDER MOŁCZANAU

Aleksander Mołczanau urodził się 22 czerwca 1988 r. w Borysowie i przez całe życie mieszkał w tym mieście. Uczył się w Szkole nr 22 w Borysowie. Był działaczem młodzieżowej organizacji „Żubr". Jego działalność polityczna stale interesowała milicję. Jego aktywność była przyczyną prześladowań bliskich – matce, Galinie Andriejewnie, nie przedłużono umowy w pracy. Wtedy to Aleksander postanowił, że będzie się uczył w trybie wieczorowym, a w ciągu dnia będzie pracował jako malarz, żeby pomóc finansowo rodzinie. Później rozpoczął studia w Międzynarodowym Instytucie Humanistyczno-Ekonomicznym w Mińsku, jednak, gdy przebywał w areszcie w latach 2010–2011 został relegowany z uczelni.

KRONIKA REPRESJI

Po raz pierwszy został zatrzymany w związku ze sprawą karną za Płoszczę 2010. Zatrzymano go 6 stycznia 2011 w jego domu w Borysowie. Przedstawiono mu zarzuty dotyczące sprawy o masowe zamieszki: udział w nich, a także znieważenie symboli państwowych podczas akcji. Został umieszczony w areszcie śledczym KGB. 2 marca 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 3 lata pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Karę odbywał w Kolonii nr 15 w Mohylewie. Został zwolniony 14 września 2011 r. na podstawie dekretu Aleksandra Łukaszenki o ułaskawieniu.

Wkrótce przeciwko Aleksandrowi Mołczanauowi została wszczęta kolejna sprawa karna. W listopadzie 2011 r. został aresztowany po raz drugi w Borysowie. Tym razem opozycjonista został oskarżony o kradzież złomu. Po aresztowaniu w grudniu 2010 r. Mołczanau stracił pracę ślusarza w fabryce wyposażenia traktorów w Borysowie (BATE). Fakt, że został skazany w sprawie politycznej uniemożliwił mu podjęcie pracy – wszędzie odprawiano go z kwitkiem. Mołczanau zaczął zajmować się zbieraniem złomu by zdobyć jakiekolwiek środki na życie i pomóc ciężko chorym rodzicom. 9 kwietnia 2012 r. stanął przed sądem oskarżony o kradzież złomu na sumę ok. 9 dolarów – jak mówi, z niedokończonej i opuszczonej 20 lat temu fabryki – za co otrzymał 1,5 roku kolonii o zaostrzonym rygorze. Opozycjonista podkreśla, że został zatrzymany choć wcześniej milicjanci nie interesowali się losem obiektu. Jego zdaniem, jest to zemsta służb.

Wolność odzyskał 13 lipca 2013 r.

АЛЯКСАНДАР МАЛЧАНАЎ

Нарадзіўся 22 чэрвеня 1988 году ў Барысаве. Вучыўся ў Барысаўскай школе № 22. У першай палове 2000-х гадоў быў актывістам моладзевага руху «Зубр». Менавіта ў той час палітычная актыўнасьць хлопца стала прычынай пастаяннай увагі да яго з боку міліцыі. Акрамя таго, пацярпелі блізкія людзі: з-за сына ягонай маці Галіне Андрэеўне не працягнулі кантракт на працы. Тады Саша перайшоў вучыцца ў вечаровую школу і пайшоў на курсы муляраў, каб карміць сям'ю. Пазьней ён паступіў у Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут у Менску, аднак за час зьняволеньня ў 2010–2011 гг. з ВНУ яго адлічылі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЛЕДУ

Першы раз быў затрыманы па крымінальнай справе за Плошчу-2010 у сябе дома ў Барысаве 6 студзеня 2011 г. Аляксандру былі прад'яўленыя два абвінавачаньні па справе аб масавых беспарадках: ва ўдзеле ў іх, а таксама ў зьнявазе падчас акцыі дзяржаўных сымбаляў. Зьмешчаны пад варту ў СІЗА КДБ.

2 сакавіка 2011 г. асуджаны ў Фрунзенскім судзе Менску на 3 гады зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываў пакараньне ў калёніі № 15 г. Магілёву, адкуль быў вызвалены 14 верасьня 2011 г. на падставе памілаваньня Лукашэнкам у ліку іншых палітычных вязьняў.

Аднак неўзабаве супраць Аляксандра была заведзеная другая крымінальная справа. У лістападзе 2011 г. ён быў арыштаваны другі раз у Барысаве і зьмешчаны пад варту ў ІЧУ. Гэтым разам апазыцыянера абвінавацілі ў крадзяжы мэталалому разам з групай асобаў. Аляксандар ня мог уладкавацца на працу, бо яго нікуды не бралі пасьля палітычнага суду, і ён зарабляў на жыцьцё сабе і бацькам-пэнсіянерам зборам мэталалому. Ён кажа, што на тэрыторыю завода, якая не ахоўвалася, жыхары горада звычайна заходзілі па мэталічныя адкіды вытворчасьці.

Другая крымінальная справа (супраць Аляксандра Малчанава і іншага жыхара Барысава – Андрэя Мікалаеўскага) была заведзеная па падазрэньні ў зьнявазе дзяржаўных сымбаляў, зьдзейсьненае яшчэ 26 кастрычніка 2010 г. У сярэдзіне лютага 2012 г. тое абвінавачваньне з хлопцаў было зьнятае, справа закрытая, але 29 лютага стала вядома, што пастанова аб гэтым ужо адмененая. Знаходзіўся ў Жодзінскім сьледчым ізалятары.

9 красавіка 2012 г. асуджаны на 1 год 6 месяцаў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбыў тэрмін і быў вызвалены 13 ліпеня 2013 года. Частка праваабаронцаў ня лічыць другую крымінальную справу палітычна матываванай.


FOT. PAVEL MOROZOV

PAWEŁ MOROZOW

Paweł Morozow był jednym z podejrzanych w sprawie karnej dotyczącej rozpowszechniania w Internecie satyrycznych kreskówek, wszczętej w sierpniu 2005 r. przez Prokuraturę w Mińsku. Paweł Morozow w tym czasie był koordynatorem projektu inicjatywy społecznej „Trzecia droga".

KRONIKA REPRESJI

Pawła Morozowa oskarżono o rozpowszechnianie w Internecie satyrycznych kreskówek „krytykujących honor i godność prezydenta Białorusi" (art. 367, pkt 1).

W ramach postępowania karnego Paweł Morozow, a także administrator strony inicjatywy społecznej „Trzecia droga", Andrzej Abozau, byli przesłuchani w charakterze świadków. Pracownicy KGB przeprowadzili w ich mieszkaniach rewizje i zabrali sprzęt komputerowy.

Po pewnym czasie Paweł Morozow opuścił Białoruś, nie czekając na rozprawę sądową oraz na prawdopodobną zmianę statusu w postępowaniu karnym.

Dwaj podejrzani w tej sprawie – Andrej Abozau i Oleg Minicz, również wyemigrowali.

ПАВАЛ МАРОЗАЎ

Павал – адзін з падазраваных па крымінальнай справе аб мультфільмах, заведзенай у жніўні 2005 году пракуратурай г. Менску. Павал Марозаў у той час быў каардынатарам праекту грамадзкай ініцыятывы «Трэці Шлях».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Паўлу Марозаву інкрымінаваўся распаўсюд ў інтэрнэце сатырычных мультфільмаў, якія «зьневажаюць гонар і годнасьць прэзыдэнта Беларусі» (арт. 367 ч. 1).

У межах крымінальнай справы Павал Марозаў, а таксама адміністратар сайту грамадзкай ініцыятывы «Трэці шлях» Андрэй Абозаў, былі дапытаныя ў якасьці сьведак. Супрацоўнікі КДБ правялі ў іх кватэрахператрусы і вывезьлі кампутарную тэхніку.

Празь некаторы час Павал Марозаў пакінуў Беларусь, не чакаючы верагоднай зьмены статусу ў крымінальнай справе і суда.

Эміgravалі і два іншыя падазраваныя па справе – Андрэй Абозаў і Алег Мініч.

ALEŚ MUCHIN

Aleś Muchin, były student mińskiego Uniwersytetu Państwowego Radioelektroniki i Informatyki, 2 września 1998 r. poprosił o udzielenie azylu politycznego w Polsce.

KRONIKA REPRESJI

28 lutego 1998 r. Aleś Muchin wraz ze swoimi przyjaciółmi – Andrejem Giliewiczem i Pawłem Muraszką, wracając z koncertu białoruskiej grupy rockowej „NRM", napisali na murach domów i płotach przy ulicy Orłowskiej hasło „Żywie Biełaruś" (Niech żyje Białoruś), „Wolność dla więźniów politycznych" oraz hasło dotyczące białoruskiego prezydenta – „Łuku na muku" (Łukę «Łukaszenkę» na mąkę). Obok haseł narysowali narodowe biało-czerwono-białe flagi. Wszystkich trzech studentów zatrzymał milicyjny patrol zaraz po wykonaniu graffiti. Zostali oni doprowadzeni na posterunek milicji, gdzie do rana odbywały się przesłuchania. Wszczęto sprawę karną z trzech artykułów KK RB: 201, pkt 2 – „Złośliwe chuligaństwo", 96 – „Uszkodzenie mienia" i 205 – „Wciągnięcie osób niepełnoletnich do działań przestępczych" (Paweł Muraszka miał wtedy 17 lat, Andrej Giliewicz i Aleś Muchin – po 18).

18 maja 1998 r. sąd w Mińsku rozpatrzył sprawę i uznał całą trójkę winną zarzucanych im czynów. Wszyscy zostali skazani na rok pozbawienia wolności w zawieszeniu.

АЛЕСЬ МУХІН

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

28 лютага 1998 г. Алесь Мухін разам са сваімі сябрамі – Андрэем Гілевічам і Паўлам Мурашкам, – вяртаючыся з канцэрту беларускага рок-гурту «NRM», напісалі на сьценах дамоў і на агароджах лёзунгі кшталту: «Жыве Беларусь» і «Луку на муку». Каля надпісаў яны зьмяшчалі выявы нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцягу. Студэнты былі затрыманыя міліцэйскім патрулём. Допыты ў РАУС Цэнтральнага раёну г. Менска доўжыліся да раніцы. У адносінах да паўналетніх А. Мухіна і А. Гілевіча была ўзбуджаная крымінальная справа паводле трох артыкулаў Крымінальнага кодэксу РБ – 201, ч. 2 «злоснае хуліганства», 96 – «нанясеньне страты маёмасьці» і 205 – «прыцягненьне непаўналетніх да злачынных дзеяньняў».

8 мая 1998 г. суд Цэнтральнага раёну г. Менску разгледзеў справу А. Мухіна, А. Гілевіча і непаўналетняга П. Мурашкі. Суд прызнаў усіх трох вінаватымі. Прысуд – пазбаўленьне волі на год умоўна з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на год. 2 верасьня 1998 г. былы студэнт менскага Дзяржаўнага ўнівэрсытэту радыёэлектронікі і інфарматыкі Алесь Мухін папрасіў палітычнага прытулку ў Польшчы. 28 сакавіка 1998 г. Алесь Мухін быў выключаны з унівэрсытэту за свае палітычныя погляды.

PAWEŁ MURASZKA

KRONIKA REPRESJI

28 lutego 1998 r. Paweł Muraszka wraz ze swoimi przyjaciółmi – Andrejem Giliewiczem i Alesiem Muchinem, wracając z koncertu białoruskiej grupy rockowej „NRM", napisali na murach domów i płotach przy ulicy Orłowskiej hasło „Żywie Biełaruś" (Niech żyje Białoruś), „Wolność dla więźniów politycznych" oraz hasło dotyczące białoruskiego prezydenta – „Łuku na muku" (Łukę «Łukaszenkę» na mąkę). Obok haseł narysowali narodowe biało-czerwono-białe flagi.

Wszystkich trzech studentów zatrzymał milicyjny patrol zaraz po wykonaniu graffiti. Zostali oni doprowadzeni na posterunek milicji, gdzie do rana odbywały się przesłuchania. Wszczęto sprawę karną z trzech artykułów KK RB: 201, pkt 2 – „Złośliwe chuligaństwo", 96 – „Uszkodzenie mienia" i 205 – „Wciągnięcie osób niepełnoletnich do działań przestępczych" (Paweł Muraszka miał wtedy 17 lat, Andrej Giliewicz i Aleś Muchin – po 18).

18 maja 1998 r. sąd w Mińsku rozpatrzył sprawę i uznał całą trójkę winną zarzucanych im czynów. Wszyscy zostali skazani na rok pozbawienia wolności w zawieszeniu.

ПАВАЛ МУРАШКА

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

28 лютага 1998 г. Павал Мурашка разам са сваімі сябрамі – Андрэем Гілевічам і Алесем Мухіным – на шляху з канцэрту беларускага рок-гурту «NRM» напісалі на сьценах дамоў і на агароджах пратэстныя лёзунгі кшталту: «Жыве Беларусь» і «Луку на муку». Каля надпісаў яны зьмяшчалі выявы нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцягу.

Усе трое на той час былі студэнтамі менскіх ВНУ. Былі затрыманыя міліцэйскім патрулём. Допыты ў РАУС Цэнтральнага раёну г. Менску доўжыліся да раніцы. Паўлу Мурашку тады яшчэ не было 18 гадоў.

Была ўзбуджаная крымінальная справа паводле арт. 201 ч. 2 Крымінальнага кодэксу РБ (злоснае хуліганства), арт. 96 (пашкоджаньне маёмасьці).

18 траўня 1998 г. суд Цэнтральнага раёну г. Менску прызнаў усіх трох студэнтаў, у тым ліку Паўла Мурашку, вінаватымі. Прысуд – пазбаўленьне волі на год умоўна з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на год.

OKSANA NOWIKOWA

Oksana Nowikowa jest aktywistką społeczną i prywatnym przedsiębiorcą z Mińska. Urodziła się w 1973 r. we wsi Kłypowszczina w obwodzie mińskim. Zajmowała się hurtowymi dostawami produktów. Półtora roku mieszkała we Francji, gdzie w 2001 r. urodziła córkę Rijannę. Oksanę Nowikową często porównuje się z radzieckimi dysydentkami. Jest znana z indywidualnych akcji protestu i sprzeciwu wobec systemu. Ulotki, które rozpowszechniała zawsze były bardzo emocjonalne i zawsze poruszały czytelników.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

KRONIKA REPRESJI

4 kwietnia 2003 r. sąd w Mińsku skazał Oksanę Nowikową za znieważenie prezydenta. Została oskarżona o to, że 17 października 2002 r. rozdawała ulotki na Placu Październikowym. Ulotki głosiły, że Aleksander Łukaszenka i szefowie ministerstw siłowych są odpowiedzialni za porwania ludzi. Oksana spędziła w areszcie dobę i wieczorem 18 października została zwolniona, otrzymawszy zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Śledczy z prokuratury, Maksim Podieriej, wszczął sprawę karną z artykułu 367, pkt 2 KK – „Zniesławienie prezydenta Republiki Białoruś", za co Nowikowej groziło nawet 5 lat pozbawienia wolności. Sąd nie przesłuchał ani jednego świadka spośród osób, które proponowała obrona i skazał Oksanę Nowikową na 2 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu na 2 lata. Oksana Nowikowa mimo wyroku nadal brała udział w ulicznych akcjach protestu. Dwukrotnie sama organizowała pikiety i poniosła za to odpowiedzialność administracyjną. Za naruszenia Kodeksu Administracyjnego Oksanie Nowikowej groziło przeniesienie do kolonii żeńskiej, jednak władze wzięły pod uwagę, że ma małe dziecko.

W 2004 r. została członkiem Zjednoczonej Partii Obywatelskiej.

Dzień przed Dniem Zwycięstwa w 2006 r. Oksana Nowikowa wywiesiła przed swoim domem w Mińsku plakat z napisem w języku rosyjskim „Wolność dla więźniów politycznych". Plakat ten wisiał tydzień w bardzo widocznym miejscu.

АКСАНА НОВІКАВА

Аксана Новікава – прыватная прадпрымальніца зь Менску, грамадзкая актывістка. Нарадзілася ў 1973 годзе ў вёсцы Клыпаўшчына Дзяржынскага раёну Менскай вобласьці. Займалася аптовымі пастаўкамі прадуктаў. Паўтара года жыла ў Францыі, дзе ў 2001 годзе нарадзілася яе дачка Рыяна.

Аксану Новікаву часта параўноўваюць з савецкімі дысыдэнтамі. Яна вядомая як чалавек адзіночнага пратэсту, індывідуальнага супраціву сістэме. Яе ўлёткі заўсёды кранalі эмацыйнымі тэкстамі і шляхетным зваротам да чытача.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

4 красавіка 2003 году Цэнтральны суд Менску пакараў жыхарку сталіцы Аксану Новікаву за абразу прэзыдэнта. Аксане ставілася ў віну тое, што 17 кастрычніка 2002 году яна раздавала мінакам улёткі на Кастрычніцкай плошчы. Ва ўлётках было напісана, што Аляксандар Лукашэнка і кіраўнікі сілавых ведамстваў мелі дачыненьне да выкраданьня людзей.

Амаль суткі Аксана праседзела ў ізалятары і ўвечары 18 кастрычніка была выпушчаная пад падпіску пра нявыезд. Сьледчы пракуратуры Цэнтральнага раёну Максім Падзярэй пачаў крымінальную справу, зьвінаваціўшы А. Новікаву ў парушэньні артыкулу 367 ч. 2 КК (паклёп на прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі). За гэта маладой жанчыне пагражала абмежаваньне ці пазбаўленьне волі на тэрмін да 5 гадоў.

Суд не выклікаў ніводнага сьведкі, якіх прапанавала абарона, і пакараў Аксану Новікаву за абразу прэзыдэнта двума гадамі пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай на два гады.

Аксана Новікава, нягледзячы на пакараньне, і далей удзельнічала ў вулічных апазыцыйных акцыях. Двойчы яна самастойна правяла пікеты і панесла за гэта адміністратыўную адказнасьць. За парушэньні Адміністратыўнага кодэксу Аксану маглі накіраваць адбываць пакараньне ў жаночую калёнію, але ўсё ж было ўлічана тое, што яна мае маленькае дзіця.

11 лютага 2004 г. Камітэт выкананьня пакараньняў амніставаў Аксану Новікаву.

У 2005–2006 гг. пракуратура Дзяржынску спрабавала завесьці на Аксану Новікаву крымінальную справу за махлярства. Сутнасьць справы палягала ў тым, што ў 2005 г. супрацоўнікі пашпартнага аддзелу гораду выявілі, што нейкая жанчына атрымала фальшывы пашпарт з фатаздымкам А. Новікавай. Аднак закідам пракуратуры папярэднічала спроба грамадзкай актывісткі прыцягнуць да адказнасьці вядучага тэлепраграмы «Паліттэхналёгіі» Яўгена Новікава, які, на думку Аксаны, у адной са сваіх тэлеперадачаў дапусьціў выказваньні, зьвязаныя з прапагандай вайны.

У 2004 г. стала сябрам Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

Напярэдадні Дня перамогі ў 2006 годзе Аксана Новікава вывесіла на сваёй хаце ў прыватным сэктары Менску плякат з расейскамоўным надпісам «Свободу политзаключенным», які правісеў больш за тыдзень на ўзроўні гарышча і быў добра бачны ўсім, хто рухаўся вуліцай ці наведваў прадуктовую крамы ў менскім раёне, вядомай як «сельгаспасёлак».

Аксана таксама арганізоўвала акцыю ў падтрымку грамадзкага аб'яднаньня «Прававая дапамога насельніцтву», зачыненага ўладамі. Яна зьвярталася і да ўладаў Расеі, заклікаючы іх спыніць вайну ў Чачэніі, якая цягне за сабой выбухі ў мірных расейскіх гарадах. У студзені 2005 г. Аксана зладзіла акцыю-пэрформанс «Збор сродкаў на «Памаранчавую рэвалюцыю ў Беларусі».



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ULADZIMIR NIAKLAJEU

Uladzimir Niaklajeu, poeta, kompozytor, pisarz, eseista urodził się 9 lipca 1946 r. w miejscowości Smargoń. Dzieciństwo spędził w Krewie. W Mińsku uczęszczał do technikum elektronicznego (1962–1966), studiował poezję w Instytucie Literackim (1971, Moskwa), ukończył studia na Wydziale Filologicznym Państwowego Instytutu Pedagogicznego w Mińsku (1973). Pracował jako korespondent na północy Syberii i na Dalekim Wschodzie jako technik radiowy w mińskiej telewizji. Zajął się publicystyką, był współredaktorem gazety „Sztandar Młodzieży", redaktorem biuletynu „Teatr Mińsk", redaktorem naczelnym redakcji programów literackich i dramatycznych białoruskiej telewizji, redaktorem naczelnym „Krynicy" i tygodnika „Sztuka i Literatura", a w latach 1998–2001 przewodniczącym Związku Pisarzy Białoruskich. 17 lutego 2011 Walne Zgromadzenie Pen Clubu postanowiło nominować go do Nagrody Nobla.

KRONIKA REPRESJI

W 2010 r. zainicjował powstanie kampanii społecznej „Mów prawdę", której władze odmówiły później rejestracji. Był jednym z liderów kampanii prezydenckiej w 2010 r. Wieczorem 19 grudnia 2010 został pobity do nieprzytomności w centrum Mińska, w drodze na protest pokojowy. Przyjęty na izbę przyjęć ze wstrząśnieniem mózgu, kilka godzin później został uprowadzony przez służby bezpieczeństwa (pod kroplówką, bez ubrania). Przewieziono go do więzienia KGB i został oskarżony na podstawie artykułu o „masowe zamieszki". Od pobicia 19 grudnia 2010 r. do przeniesienia do aresztu domowego 29 stycznia 2011 przeszedł cztery przełomy nadciśnieniowe. Nie mógł także spotkać się z prawnikiem. 30 marca 2011 r. przedstawiono mu zarzuty z art. 342 KK – „Organizacja lub udział w działaniach naruszających porządek publiczny".

20 maja 2011 został skazany na dwa lata więzienia w zawieszeniu.

УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

Паэт-песеньнік, празаік, эсэіст. Нарадзіўся 9 ліпеня 1946 году ў горадзе Смаргонь Гарадзенскай вобласьці. Бацька – Някляеў Пракоп Мікалаевіч, рускі, – Магер Анастасія Іванаўна, беларуска. Пражыў дзіцячыя гады ў Крэве – знакавым месцы беларускай гісторыі.

Вучыўся ў Менскім электратэхнікуме сувязі (1962–1966 гг.), на аддзяленьні паэзіі Літаратурнага інстытуту (1971, г. Масква), скончыў філялягічны факультэт Менскага пэдагагічнага інстытуту (1973 г.).

Працаваў сувязістам на Поўначы, у Сыбіры, на Далёкім Усходзе, радыёмэханікам у менскім тэлевізійным атэлье. Заняўся журналістыкай, супрацоўнічаў з газэтай «Знамя юности», рэдагаваў бюлетэнь «Тэатральны Менск», быў старэйшым рэдактарам галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграмаў Беларускага тэлебачаньня, галоўным рэдактарам часопісу «Крыніца», штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». З 1998 па 2001 гг. – старшыня «Саюзу беларускіх пісьменьнікаў».

У 1999 выехаў у Польшчу. На прэс-канфэрэнцыі ў Варшаве (20.07.1999 г.) выступіў з заявай супраць палітыкі беларускіх уладаў.

17 лютага 2011 г. агульны сход ПЭН-цэнтру прыняў рашэньне вылучыць яго на Нобэлеўскую прэмію.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2010 г. ініцыяваў стварэньне грамадскай кампаніі «Гавары праўду!», якой улады пазьней адмовілі ў рэгістрацыі. Адзін зь лідэраў прэзыдэнцкай кампаніі 2010 году.


Увечары 19 сьнежня 2010 г. быў зьбіты да непрытомнага стану ў цэнтры Менску па шляху на мірную акцыю пратэсту. З чэрапна-мазгавой траўмай патрапіў у шпіталь хуткай дапамогі. Празь некалькі гадзінаў быў адтуль выкрадзены супрацоўнікамі спэцслужбаў (проста з-пад кропельніцы і ў мароз бяз вопраткі). Гэтае гвалтоўнае затрыманьне было жорсткім: ён ня мог хадзіць пасьля траўмы, таму яго на коўдры выцягнулі з будынку да машыны. Апынуўся ў СІЗА КДБ, быў абвінавачаны па артыкуле «Масавыя беспарадкі». З моманту зьбіцьця 19 сьнежня 2010 г. да свайго пераводу пад хатні арышт 29 студзеня 2011 г. перанёс чатыры гіпэртанічныя крызы, пры гэтым ня меў магчымасьці сустрэцца з адвакатам.

30 сакавіка 2011 г. абвінавачваньне было перафармуляванае на ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя дзеяньняў, што груба парушаюць гарамадзкі парадак, ці ўдзел у іх).

20 траўня 2011 г. ў судзе Фрунзенскага раёну Менску асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай на 2 гады.

23 ліпеня 2013 г. рашэньнем суду Ленінскага раёну Менску вызвалены ад далейшага адбыцьця пакараньня. Суд адбыўся без удзелу ў ім і Някляева, і ягонага адваката, якіх запрасілі на дадзены працэс на 2 дні пазьней, 25 ліпеня.

DZMITRIJ NOWIK


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Dzmitrij Nowik urodził się 16 września 1981 r. w Baranowiczach. Ukończył Szkołę nr 13, potem studiował na AWF w Mińsku. Pracował jako pracownik ochrony w restauracji, potem zaś w służbie bezpieczeństwa w ambasadzie Zjednoczonych Emiratów Arabskich na Białorusi. Całe życie uprawiał sporty, polityką nigdy się nie interesował.

KRONIKA REPRESJI

Dzmitrij Nowik został zatrzymany późnym wieczorem 23 grudnia 2010 r. w swoim domu w Baranowiczach jako podejrzany w sprawie karnej o masowe zamieszki. 30 grudnia 2010 r. przedstawiono mu zarzuty z artykułu 293, pkt 2 KK – „Udział w masowych zamieszkach". Był przetrzymywany w areszcie śledczym KGB (w tzw. „amerykance"). 2 marca 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 3,5 roku pozbawienia wolności. Karę odbywał w kolonii karnej w Szkłowie. 14 września 2011 r. został zwolniony i ułaskawiony przez Łukaszenkę.

ЗЬМІЦЕР НОВІК

Нарадзіўся 16 верасьня 1981 году ў горадзе Баранавічы. Скончыў школу № 13, потым вучыўся ў Менску ў Акадэміі фізычнай культуры, служыў у войску. На момант арышту зь сям'і ў яго былі толькі хворыя маці і бабуля, для якіх ён быў адзінай апорай, ды малодшы брат.

Працаваў у ахове: спачатку ахоўнікам у рэстарацыі, затым – у службе бясьпекі амбасады Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у Беларусі. (Паводле яго словаў на судзе, працаваў у амбасадзе кіроўцам).

Усё жыцьцё захапляўся спортам. Палітыка, наадварот, ня была ў сфэры ягоных інтарэсаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Зьміцер Новік затрыманы позна ўвечары 23 сьнежня 2010 г. дома, у Баранавічах, як падазраваны па крымінальнай справе аб масавых беспарадках. Абвінавачаньне яму прад'яўленае 30 сьнежня 2010 г. па ч. 2 арт. 293 КК – удзел у масавых беспарадках. Знаходзіўся пад вартай у СІЗА КДБ «Амерыканцы».

2 сакавіка 2011 г. асуджаны Фрунзенскім судом Менску на 3,5 гады зьняволеньня. Адбываць тэрмін пакараньня яго этапавалі ў Шклоўскі раён Магілёўскай вобласьці.

Вызвалены са шклоўскай калёніі 14 верасьня 2011 г. – быў памілаваны ўказам кіраўніка дзяржавы.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

WASYL PARFIANKOU

Wasyl Parfiankou urodził się 30 sierpnia 1983 r. w Mińsku, ukończył 9 klas mińskiej Szkoły nr 163, pracował jako ślusarz w mińskim warsztacie nr 7. Był działaczem niezarejestrowanej Partii Wolności. Aktywnie brał udział w obronie Kuropat w 2002 roku, gdy władze Mińska planowały zburzenie krzyży – pomników ofiar stalinizmu, w ramach rozbudowy obwodnicy. Brał udział w akcjach protestu razem z „Młodym Frontem" i ruchem „Żubr". Był wielokrotnie zatrzymywany przez milicję i skazywany na areszty administracyjne. Podczas wyborów 2010 roku był aktywistą sztabu wyborczego Uladzimira Niaklajeua, prowadził agitację, zbierał dla niego podpisy. Brał udział w demonstracji na Palcu Niepodległości.

KRONIKA REPRESJI

4 stycznia 2011 r. w Mińsku w procesie demonstrantów po wyborach prezydenckich 19 grudnia 2010 r. oskarżono go o organizację „masowych zamieszek". Po trzech dobach trafił do aresztu śledczego przy ul. Wołodarskiego, jako oskarżony z art. 293. 17 lutego 2011 r. sąd rejonu frunzeńskiego w Mińsku skazał Wasyla na 4 lata kolonii karnej. Karę odbywał w Kolonii Orsza. Od 17 do 27 lipca przebywał w karcerze „za łamanie regulaminu w zakresie stroju więziennego". 11 sierpnia 2011 został ułaskawiony przez prezydenta. 5 stycznia 2012 r. nad Wasylem ustanowiono nadzór prewencyjny na okres jednego roku z powodu jego uczestnictwa w życiu polityczno-społecznym i działalności opozycyjnej. 29 maja Wasyl Parfiankou został skazany przez sędziego sądu rejonu pierwszomajowego, Siarhieja Bondarenkę, z art. 421 KK RB – „Złamanie zasad nadzoru prewencyjnego" (Siarhiej Bondarenka wcześniej skazał na karę więzienia obrońcę praw człowieka, Alesia Bialackiego). 24 lipca Sąd Miejski w Mińsku odrzucił skargę kasacyjną Parfiankoua przeciwko wyrokowi aresztu na okres 6 miesięcy za nieprzestrzeganie warunków nadzoru prewencyjnego.

9 sierpnia 2012 został aresztowany. Karę odbywał w kolonii karnej w Baranowiczach.

12 lipca 2013 r. Wasyla ponownie oskarżono z art. 421 KK RB – „Złamanie zasad nadzoru prewencyjnego". Sprawę przekazano do sądu. Do procesu jednak nie doszło, ze względu na zastosowanie innej metody nacisku na opozycjonistę. 21 września 2013 r., po odbyciu 5 dób aresztu administracyjnego, na który skazano go w trybie zaocznym, Wasyl Parfiankou został nieoczekiwanie skierowany na jeden rok do jednostki leczniczo-korekcyjnej w Swietogorsku dokąd odsyłane są m.in. osoby uzależnione, poddane przymusowej terapii odwykowej.

ВАСІЛЬ ПАРФЯНКОЎ

Нарадзіўся 30 жніўня 1983 году ў Менску, скончыў 9 клясаў менскай школы № 163, працаваў аўтасьлесарам у менскім аўтапарку № 7. Быў актывістам незарэгістраванай Партыі Свабоды. Актыўна ўдзельнічаў у абароне Курапатаў у 2002 годзе, калі менскія ўлады мелі пляны зруйнаваць крыжы-помнікі ахвярам сталінізму дзеля пашырэньня МКАД. Падчас абароны Курапатаў невядомыя падпалілі намёт абаронцаў, Васіль змог выратаваўць ад пажару двух чалавек, а падчас нападу правакатараў на намётавае мястэчка абараняючы сваіх сяброў атрымаў пералом рукі.

Браў удзел у акцыях пратэсту разам з «Маладым Фронтам» і «Зубром». Затрымліваўся міліцыяй і адбываў адміністратыўныя тэрміны ў ізалятары на Акрэсьціна за грамадзкую актыўнасьць.

Падчас выбараў 2010 году Васіль актыўна ўдзельнічаў у грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!», быў актывістам штабу Ўладзімера Някляева, зьбіраў подпісы за яго, праводзіў агітацыю. Удзельнік Плошчы-2010.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы ў Менску 4 студзеня 2011 г. па падазрэньні ў датычнасьці да «масавых беспарадкаў» 19 сьнежня 2010 г. Праз трое сутак апынуўся ў менскім СІЗА па вул. Валадарскага як фігурант крымінальнай справы па арт. 293.

Ягоны прысуд стаў самым першым па «справе 19 сьнежня»: 17 лютага 2011 г. Фрунзэнскі суд Менску асудзіў Васіля на 4 гады калёніі строгага рэжыму. Адбываў пакараньне ў калёніі г. Ворша. З 17 па 27 ліпеня прабыў у штрафным ізалятары «за парушэньне формы вопраткі».

11 жніўня 2011 г. памілаваны Лукашэнкам і вызвалены.

29 траўня 2012 году Васіль Парфянкоў быў асуджаны паводле артыкулу 421 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь судзьдзём Першамайскага раёну Менску Сяргеем Бандарэнкам. Прэвэнтыўны нагляд тэрмінам на адзін год, у парушэньні якога прызнаны вінаватым былы палітвязень, быў устаноўлены за ім зь 5 студзеня 2012 году. Падставай для гэтага стаў ўдзел Парфянкова ў грамадзка-палітычным жыцьці пасьля таго, як ён у ліку іншых вязьняў Плошчы-2010 быў вызвалены ў жніўні 2011 году ў адпаведнасьці з указам прэзыдэнта аб памілаваньні.

24 ліпеня Менскі гарадзкі суд не задаволіў касацыйную скаргу Парфянкова на прысуд аб арышце на 6 месяцаў за невыкананьне умоваў прэвэнтыўнага нагляду, усталяванага судом.

9 жніўня 2012 г. Васіль Парфянкоў быў узяты пад варту ізноў. Адбываў пакараньне ў калёніі г. Баранавічы. Вызвалены 9 лютага 2013 году. Узяты пад прэвэнтыўны нагляд міліцыі.

12 ліпеня 2013 г. Васілю ізноў было прад'яўленае абвінавачваньне па артыкуле 421 Крымінальнага кодэксу РБ – «Парушэньне ўмоваў прэвэнтыўнага нагляду». Справа была перададзеная ў суд, але судовага працэсу па ёй не адбылося, бо быў прыдуманы іншы спосаб узьдзеяньня на іншадумца. 21 верасьня 2013 г. пасьля адбыцьця 5-суткавага адміністратыўнага арышту, да якога ён быў прыгавораны «завочна», Васіль Парфянкоў нечакана для ўсіх быў адпраўлены на 1 год у лячэбна-працоўны прафілякторый (ЛПП) у г. Сьветлагорск.

Як высьветлілі праваабаронцы, рашэньне аб накіраваньні Васіля Парфянкова ў ЛПП было прынятае судом Першамайскага раёну Менску яшчэ 4 верасьня.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

SIARHIEJ PARSIUKIEWICZ

Podczas wyborów prezydenckich 2006 r. Siarhiej Parsiukiewicz był obserwatorem powołanym przez sztab wyborczy Aleksandra Milinkiewicza. Wielokrotnie był zatrzymywany i aresztowany. W 2008 r. został ciężko pobity. Obecnie związany jest z kampanią „Mów prawdę".

Emerytowany dowódca milicji, na emeryturę odszedł w 2004 roku, w randze naczelnika wydziału kryminalistyki sądowej. Później zajmował się prowadzeniem działalności gospodarczej. Był przewodniczącym związku prywatnych przedsiębiorców w Witebsku. 10 stycznia 2008 r. był jednym z uczestników protestu przeciwko nowemu dekretowi prezydenckiemu nr 760 – „O warunkach zatrudnienia w sektorze drobnej przedsiębiorczości". 13 stycznia został zatrzymany przez milicję za udział w nielegalnej demonstracji. 14 stycznia został skazany na 15 dni aresztu i w jego trakcie ogłosił strajk głodowy.

KRONIKA REPRESJI

28 kwietnia 2008 r. Sąd Okręgowy w Mińsku, skazał Siarhieja Parsiukiewicza. Sędzia Vladimir Avdeenko uznał go winnym na podstawie art. 364 KK – „Przemoc lub groźba przemocy wobec milicjanta" i skazał na 2,5 roku kolonii karnej. Musiał także zapłacić grzywnę w wysokości 1,1 mln rubli za straty moralne. Adwokat Parsiukiewicza – Wiera Striemkowska – po widzeniu z więźniem złożyła oświadczenie o złym stanie jego zdrowia. 21 maja Siarhiej Parsiukiewicz został przeniesiony do więziennego szpitala, gdzie znajdowali się więźniowie chorzy psychicznie. Po operacji został przeniesiony do kolonii karnej w Szkłowsku a następnie do więzienia w Mińsku. 20 sierpnia 2008 r. Siarhiej Parsiukiewicz został niespodziewanie uwolniony na mocy aktu łaski prezydenta Łukaszenki. Po uwolnieniu Parsiukiewicz kontynuował działalność polityczną.

СЯРГЕЙ ПАРСЮКЕВІЧ

Сяргей Парсюкевіч – маёр міліцыі ў адстаўцы, выйшаў на пэнсію ў 2004 годзе ў рангу начальніка судова-крыміналістычнага аддзелу, пасьля чаго заняўся прадпрымальніцкай дзейнасьцю. Быў старшынём Рады індывідуальных прадпрымальнікаў Смаленскага рынку ў г. Віцебску.

Парсюкевіч быў адным з удзельнікаў акцыі пратэсту прадпрымальнікаў супраць прэзыдэнцкага дэкрэту № 760, якая адбылася ў Менску 10 студзеня 2008 году. 13 студзеня ён быў затрыманы ў Віцебску міліцыяй, абвінавачаны ва ўдзеле ў несанкцыянаванай дэманстрацыі 10 студзеня і перавезены ў Менск. 14 студзеня яму былі прысуджаны 15 сутак арышту, падчас якіх ён трымаў галадоўку.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

23 красавіка 2008 г. суд Маскоўскага раёну сталіцы вынес прысуд лідэру віцебскіх прадпрымальнікаў Сяргею Парсюкевічу. Судзьдзя Ўладзімер Аўдзеенка прызнаў яго вінаватым у зьдзяйсьненьні крымінальнага злачынства, прадугледжанага арт. 364 КК (Гвалт альбо пагроза ўжываньня гвалту ў адносінах да супрацоўніка міліцыі) і вызначыў меру пакараньня – два з паловай гады калёніі агульнага рэжыму. Таксама Сяргей Парсюкевіч быў абавязаны выплаціць міліцыянту Дулубу 1 мільён 100 тыс. рублёў кампэнсацыі за маральныя пакуты.

2 траўня 2008 г. асуджанага віцебскага прадпрымальніка Сяргея Парсюкевіча перавялі ў сьледчы ізалятар Жодзіна (Смалявіцкі раён), што зьвязана з рамонтам сталічнага СІЗА. На наступны дзень адбылася сустрэча палітвязьня зь ягонай адвакаткай Верай Страмкоўскай. Яна адзначыла, што Сяргей Парсюкевіч дрэнна сябе адчувае, яму неабходная апэрацыя ў сувязі з паліпозам. Па словах адвакаткі, асуджаны напісаў заяву пра датэрміновы перавод са сьледчага ізалятару ў калёнію, бо толькі адтуль яго могуць накіраваць на апэрацыю ў рэспубліканскі турэмны шпіталь. 21 траўня Сяргея Парсюкевіча зьмясьцілі ў санчастку Жодзінскай калёніі, у палаце з палітвязьнем апынуліся псыхічна хворыя людзі.

Пазьней Сяргея Парсюкевіча перавялі адбываць пакараньне ў Шклоўскую калёнію, а затым – у менскую турму на вуліцы Кальварыйскай.

20 жніўня 2008 г. памілаваны кіраўніком дзяржавы, вызвалены.

Працягваў займацца палітычнай дзейнасьцю. Падчас выбараў прэзыдэнта 2006 году быў назіральнікам на выбарчых участках ад штабу кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Мілінкевіча. Затрымліваўся і караўся адміністратыўнымі арыштамі, у 2008 г. быў моцна зьбіты на Акрэсьціна. Зараз – актывіст кампаніі «Гавары праўду!».



FOT. JULIA DARASHKEVICH

MICHAŚ PASZKIEWICZ

Michaś Paszkiewicz to jeden z oskarżonych w „Sprawie czternastu".

Paszkiewicz urodził się w 1986 r. w Republice Komi (Federacja Rosyjska). Jego ojciec pracował jako lekarz wojskowy, matka była ekonomistką. Kilka lat po narodzinach Michasia Paszkiewicza rodzina wróciła na rodzimą Białoruś. Paszkiewicz uczył się w szkole podstawowej w Berezie, następnie w liceum przy Białoruskim Uniwersytecie Państwowym, po czym studiował historię na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. W trakcie ostatniego semestru został wydalony z uczelni za udział w „Placu Kalinowskiego" (miasteczko namiotowe w centrum Mińska) w marcu 2006 r. Pod koniec tego roku wstąpił w szeregi Zjednoczonej Partii Obywatelskiej Białorusi, a wkrótce został wiceprzewodniczącym młodzieżowego skrzydła partii. Uczestniczył również w wielu innych akcjach protestacyjnych. 10 stycznia 2008 brał udział w proteście przedsiębiorców, w czasie którego został pobity i aresztowany. Następnego dnia zapadł wyrok skazujący go na 15 dni pozbawienia wolności.

KRONIKA REPRESJI

22 kwietnia 2008 r. sędzia Sądu Rejonowego w Mińsku, Jeliena Ilina, na podstawie art. 342 Kodeksu Karnego – „Organizacja lub udział w działalności naruszającej porządek publiczny" uznała Michasia Paszkiewicza winnym. Został skazany na dwa lata pozbawienia wolności w zawieszeniu. 11 czerwca 2009 r. Michaś Paszkiewicz został ułaskawiony. Od tego czasu był wielokrotnie zatrzymywany z powodów politycznych. Podczas wyborów prezydenckich w 2010 r. brał udział w kampanii „Mów prawdę". W 2010 r. po raz kolejny skazano go na 15 dni pozbawienia wolności za udział w akcji solidarności z więźniami politycznymi.

МІХАІЛ ПАШКЕВІЧ

Адзін з фігурантаў «справы чатырнаццаці» – крымінальнай справы па арт. 342 КК Рэспублікі Беларусь, заведзенай супраць удзельнікаў мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у Менску, якая адбылася 10 студзеня 2008 году.

Міхаіл Пашкевіч нарадзіўся ў 1986 годзе ў Комі АССР (Расея). У той час ягоны бацька працаваў там вайсковым лекарам, а маці – эканамістам. Празь некалькі гадоў сям'я вярнулася на радзіму, у Беларусь, у вёску Спорава Бярозаўскага раёну Берасьцейскай вобласьці. У 1991 годзе Пашкевічы перабраліся ў Бярозу. Спачатку Міхаіл вучыўся ў школе там, а потым паступіў у Ліцэй БДУ, а пасьля – на гістфак Белдзяржунівэрсытэту. Быў выключаны адтуль з апошняга курсу пасьля яго ўдзелу ў «Плошчы Каліноўскага» ў сакавіку 2006 году. У канцы таго ж году ўступіў у АГП, неўзабаве стаў намесьнікам старшыні маладзевага крыла партыі.

Удзельнічаў у іншых акцыях пратэсту, у тым ліку і ў акцыі прадпрымальнікаў 10 студзеня 2008 г., быў затрыманы і зьбіты, а на наступны дзень асуджаны на арышт тэрмінам у 15 сутак (судзьдзя Самасейка).

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

22 красавіка 2008 году судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Алена Ільіна прызнала маладзёвага лідэра Міхаіла Пашкевіча вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ (Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак) і вынесла пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі тэрмінам на два гады без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.

11 чэрвеня 2009 г. быў амніставаны.

Неаднаразова караўся па адміністратыўных артыкулах па палітычных матывах. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. – актывіст кампаніі «Гавары праўду!». 27 сьнежня 2010 г. быў асуджаны на 15 сутак арышту за ўдзел у акцыі салідарнасьці з палітвязьнямі Плошчы-2010.

ANATOL PAULAU

Anatol Paulau to przewodniczący mińskiego oddziału organizacji Zjednoczona Partia Obywatelska (ZPO), członek rady politycznej i narodowego komitetu ZPO. Urodził się 18 czerwca 1949 r. w Wyborgu w obwodzie leningradzkim, w rodzinie wojskowego. Część dzieciństwa spędził na archipelagu Nowa Ziemia. W 1965 r. jego ojciec został zdemobilizowany ze względu na stan zdrowia i rodzina przeniosła się do Mińska. Ukończył mińską Szkołę nr 4 (1966), a potem Wydział Chemiczny na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym (1971). Pracował jako nauczyciel w szkole w rejonie logojskim, a w latach 1973–2000 pracował na uniwersytecie. Na początku 2000 r. został wybrany przewodniczącym miejskiego związku zawodowego pracowników naukowych i nauczycieli (struktury, która została zlikwidowana w późniejszym czasie). W wyborach w 2001 roku kierował sztabem Michaiła Czigira, razem z którym wstąpił do ZPO. W czasie wyborów prezydenckich 2010 r. był osobą zaufania kandydata na prezydenta z ZPO, Jarosława Romańczuka.

KRONIKA REPRESJI

Anatol Paulau został zatrzymany w swoim domu 20 grudnia 2010 r. o 7:00 rano. Został oskarżony na podstawie art. 293, pkt 1 i 2 KK RB – „Organizacja masowych zamieszek lub udział w nich". Był przetrzymywany w areszcie śledczym KGB do 7 stycznia 2011 roku. Wtedy to zwolniono go, otrzymał jednak zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Pod koniec sierpnia 2011 r. zamknięto toczące się wobec niego postępowanie.

АНАТОЛЬ ПАЎЛАЎ

АНАТОЛЬ ПАЎЛАЎ

Старшыня Менскай гарадзкой арганізацыі АГП, сябра Палітсавету і Нацыянальнага камітэту АГП. Нарадзіўся 18 чэрвеня 1949 году ў Выбаргу Ленінградзкай вобласьці ў сям'і вайскоўца. Частка дзяцінства прайшла на архіпелагу Новая Зямля. Ад 1965 г., калі бацька дэмабілізаваўся па стане здароўя, жыве ў Менску. Скончыў менскую САШ № 4 (1966 г.), хімічны факультэт БДУ (1971 г.). Працаваў настаўнікам у школе ў Лагойскім раёне, у 1973–2000 гг. – на розных пасадах у БДУ. Напачатку 2000 г. абраны чальцом гаркаму прафсаюзу работнікаў адукацыі і навукі (структуру, якая пазьней была ліквідаваная).

На выбарах 2001 г. кіраваў штабам Міхаіла Чыгіра, разам зь якім уступіў у АГП.

Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. быў даверанай асобай кандыдата на прэзыдэнта ад АГП Яраслава Раманчука.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Анатоль Паўлаў быў затрыманы ў сябе дома а 7-й раніцы 20 сьнежня 2010 г. Ён быў абвінавачаны па чч. 1 і 2 арт. 293 КК РБ – «арганізацыя масавых беспарадкаў і ўдзел ў іх». Утрымліваўся ў СІЗА КДБ да 7 студзеня 2011 г., калі быў вызвалены пад падпіску аб нявыезьдзе.

У канцы жніўня 2011 г. крымінальная справа супраць яго была спыненая.

ANDREJ PAŹNIAK


FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

Andrej Paźniak, urodził się 20 maja 1977 r. w miejscowości Żodino w powiecie mińskim. Ukończył technikum zawodowe i przez 14 lat pracował jako elektromonter. Nie zajmował się polityką, nie należał do żadnej partii czy organizacji politycznej. Od młodzieńczych lat interesował się piłką nożną. Jego ojciec był znanym w kraju trenerem.

KRONIKA REPRESJI

Andrej Paźniak został zatrzymany 19 grudnia 2010 roku na Placu Niepodległości w Mińsku. Dostał mandat w wysokości 30 płac minimalnych. Kiedy po Nowym Roku nie przyszedł do pracy, okazało się, że został aresztowany i toczy się przeciwko niemu postępowanie karne. Oskarżono go na podstawie art. 239, pkt 1 KK – „Masowe zamieszki". Przetrzymywany w Areszcie Śledczym nr 1 przy ul. Wołodarskiego w Mińsku. 26 maja 2011 sąd w Mińsku skazał go na dwa lata ograniczenia wolności. Wyrok został zmieniony później na prace przymusową. 21 lutego 2013 r. Andrej został warunkowo zwolniony.

АНДРЭЙ ПАЗЬНЯК

Нарадзіўся 20 траўня 1977 году ў г. Жодзіна Менскай вобласьці. Скончыў Жодзінскі прафэсійны ліцэй, на працягу 14 гадоў працаваў у родным горадзе электрамантэрам на БелАЗе. Палітыкай не займаўся. Ня быў сябрам ніякіх партыяў і арганізацыяў. Вырас у спартовай сям'і, заўсёды захапляўся футболам, займаўся ім, быў заўзятарам футбольнага клюбу БАТЭ. Ягоны бацька – вядомы ў краіне футбольны трэнер.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 19 сьнежня 2010 г. на плошчы Незалежнасьці ў Менску. Пакараны штрафам у памеры 30 базавых велічынь. Але калі пасьля навагодніх сьвятаў Андрэй не зьявіўся на працу, аказалася, што ён затрыманы ў межах крымінальнай справы і ўзяты пад варту. Прад'яўлена абвінавачаньне па ч. 1 і 2 арт. 293 КК – «масавыя беспарадкі». Утрымліваўся пад вартай у СІЗА № 1 на вул. Валадарскага ў Менску.

26 траўня 2011 г. ў Ленінскім судзе Менску асуджаны да 2 гадоў абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы, якое пазьней было замененае на папраўчыя працы з вылічэньнем 15% заробку.

21 лютага 2013 году рашэньнем суду Фрунзенскага раёну Менску ўмоўна-датэрмінова вызвалены ад адбыцьця пакараньня.

ULADZIMIR PŁESZCZENKO

Uladzimir Płeszczenko był przewodniczącym Witebskiej Rady Białoruskiego Frontu Ludowego „Wybór". Po rozłamie w partii był członkiem Konserwatywno Chrześcijańskiej Partii Białoruski Front Ludowy (KCHP-BFL). Urodził się 26 czerwca 1948 r. we wsi Worony w obwodzie witebskim. Zmarł również w tej miejscowości 10 maja 2006 r. na chorobę serca.

KRONIKA REPRESJI

Uladzimir Płeszczenko został zatrzymany 2 września 1998 r. podejrzany o demontaż popiersia rosyjskiego pułkownika Suworowa w Witebsku. Wszczęto przeciwko niemu sprawę karną z artykułów 225 – „Zniszczenie lub uszkodzenie przedmiotów o wartości kulturalno-historycznej" i 87 – „Kradzież mienia". Później oskarżenia zmieniono na artykuł 201, pkt 2 KK – „Złośliwe chuligaństwo". Płeszczenko prawie 8 miesięcy spędził w areszcie śledczym w Witebsku. 29 marca 1999 r. rozpoczął się proces sądowy. Sprawę skierowano do dodatkowego rozpatrzenia, a Płeszczence zmieniono środek zapobiegawczy na zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. 26 marca 1999 r. Płeszczenko wyszedł na wolność. Spędził za kratkami 267 dni zanim sąd go uniewinnił.

УЛАДЗІМЕР ПЛЕШЧАНКА

Уладзімер Плешчанка – старшыня Віцебскай рады БНФ «Выбар», пасьля расколу партыі – сябра КХП-БНФ.

Нарадзіўся 26 ліпеня 1948 году ў вёсцы Вароны Віцебскага раёну.

Памёр там жа 20 траўня 2006 году ад сардэчнай хваробы.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы 2 верасьня 1998 году па падазрэньні ў дэмантажы бюсту расейскага палкаводца А. Суворава ў Віцебску. Супраць яго была ўзбуджаная крымінальная справа па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу РБ: 225 – «зьнішчэньне ці пашкоджаньне гісторыка-культурных каштоўнасьцяў» і 87 – «крадзеж маёмасьці». У хуткім часе артыкул 87 КК РБ быў адменены з-за таго, што бюст аказаўся вырабленым не з каштоўнага мэталу, але Ўл. Плешчанку прад'явілі абвінавачаньне па арт. 201 ч. 2 КК РБ – «злоснае хуліганства». Уладзімер Плешчанка амаль восем месяцаў, пакуль ішло сьледзтва, знаходзіўся ў СІЗА г. Віцебску.

29 сакавіка 1999 году адбыўся суд, у ходзе якога былі разбураныя ўсе пункты абвінавачаньня. Судовая справа была адпраўленая на дарасьсьледаваньне, а Ўладзімеру Плешчанку была зьмененая мера стрыманьня – арышт на падпіску аб нявыезьдзе. Нягледзячы на тое, што час для сьледзтва страчаны, а шэраг сьледчых працэдур зробленыя незаконна, што пацьвердзіў суд, ціск на Ўл. Плешчанку працягваўся. Выйшаў на свабоду 26 траўня 1999 году. Быў за кратамі 267 дзён. Суд прызнаў яго невінаватым.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ANDRZEJ POCZOBUT

Andrzej Poczobut to urodzony 16 kwietnia 1973 r. w Brzostowicy Wielkiej dziennikarz, publicysta i bloger, działacz mniejszości polskiej na Białorusi. Pracował w grodzieńskich gazetach „Pahonia", „Dień", „Miestnoje Wriemia", w polskiej gazecie „Głos znad Niemna". Był korespondentem mińskiej niezależnej gazety „Narodnaja Wolja". Pełnił funkcję redaktora naczelnego „Magazynu Polskiego na uchodźstwie" – czasopisma Związku Polaków na Białorusi.

Jest aktywnym działaczem ZPB od lat 90. XX w. Zawsze opowiadał się za zachowaniem pełnej niezależności organizacji od władz w Mińsku, ale w ramach białoruskiego ustawodawstwa. Obecnie pełni obowiązki przewodniczącego Rady Naczelnej ZPB nieuznawanej przez władze w Mińsku.

Za działalność społeczną i dziennikarską był wielokrotnie zatrzymywany, aresztowany i karany grzywną. Od 2006 r. jest korespondentem „Gazety Wyborczej" w Grodnie. Jest ekspertem w sprawach dotyczących historii sowieckich służb wywiadowczych i antysowieckiego zbrojnego oporu na zachodniej Białorusi, zwłaszcza w odniesieniu do działalności Armii Krajowej.

KRONIKA REPRESJI

Andrzej Poczobut relacjonował wydarzenia 19 grudnia 2010 r., za co został skazany na 15 dni aresztu. Był to już drugi wyrok w tej samej sprawie o rzekome uczestnictwo w nielegalnej demonstracji. Pierwszy raz został ukarany grzywną 1 750 000 rubli, lecz prokuratura złożyła apelację, uznając wyrok za zbyt łagodny.

18 marca 2011 r. prokuratura obwodu grodzieńskiego postawiła mu zarzut o znieważenie prezydenta Aleksandra Łukaszenki. 6 kwietnia 2011 został zatrzymany w drodze do Mińska, gdzie zamierzał wziąć udział w telekonferencji z członkami delegacji Parlamentu Europejskiego ds. Białorusi. W czasie procesu dziennikarz przebywał w więzieniu w Grodnie. Przeciwko niemu wszczęto kolejną sprawę karną – za zniesławienie Łukaszenki (KK art. 367, pkt 1).

Dochodzenie przeciwko dziennikarzowi polskiej „Gazety Wyborczej" prowadziła prokuratura okręgowa. Poczobut odparł wszystkie przedstawione przez nią dowody. Ubiegał się o zakończenie procesu w związku z brakiem dowodów. Apelował także o wezwanie poszkodowanego Aleksandra Łukaszenki oraz Lidii Jarmoszyny

(szefowej Centralnej Komisji Wyborczej), w roli świadków. Sąd nie uznał także jego akredytacji, którą dostał w ubiegłym roku od Białoruskiego Ministerstwa Spraw Zagranicznych.

Proces rozpoczął się 14 czerwca w sądzie rejonu leninowskiego miasta Grodno. Rozprawy odbywały się rzadko, były wielokrotnie przerywane. Proces miał charakter zamknięty.

5 lipca 2011 r. Andrzej Poczobut został skazany na 3 lata więzienia w zawieszeniu na okres 2 lat.

21 czerwca 2012 prokuratura obwodu grodzieńskiego po raz kolejny postawiła Andrzejowi Poczobutowi zarzut zniesławienia Aleksandra Łukaszenki, którego miał się dopuścić w artykułach, na swoim blogu i na białoruskich stronach internetowych „Biełorusskij Partizan" oraz „Karta 97".

30 czerwca został wypuszczony na wolność z zakazem opuszczania Grodna. 15 marca 2013 r. sprawa karna wobec dziennikarza została zamknięta z powodu braku dowodów.

23 września 2013, zgodnie z decyzją sądu rejonu leninowskiego miasta Grodno, Andrzej Poczobut zozstał zwolniony z obowiązku odbywania kary za zniesławienie prezydenta Białorusi, Aleksandra Łukaszenki.

АНДРЭЙ ПАЧОБУТ

Нарадзіўся 16 красавіка 1973 году ў мястэчку Вялікая Бераставіца на Берасьцейшчыне. Журналіст, публіцыст і блогер, актывіст «Саюзу Палякаў на Беларусі» (СПБ). Працаваў у гарадзенскіх газетах «Пагоня», «Дзень», «Мясцовы час», польскамоўнай «Glos z-nad Niemna», быў карэспандэнтам менскай незалежнай газэты «Народная Воля». Займаў пасаду галоўнага рэдактара «Magazynu Polskiego na uchodźstwie» – часопісу СПБ. Зьяўляецца актыўным сябрам СПБ, да якога належыць з пачатку 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя. Заўжды выказваўся аб неабходнасьці ўтрыманьня незалежнасьці арганізацыі ў межах беларускага заканадаўства. Зараз займае пасаду кіраўніка Галоўнага Савету СПБ, які не прызнаецца беларускімі ўладамі.

За грамадзка-палітычную і журналісцкую дзейнасьць Андрэя Пачобута неаднаразова затрымлівалі, каралі штрафам, а таксама адміністрацыйным арыштам.

З 2006 г. зьяўляецца карэспандэнтам буйнога польскага выданьня «Gazeta Wyborcza» ў Беларусі.

Належыць да апанэнтаў Аляксандра Лукашэнкі, якога неаднаразова крытыкаваў у сваіх артыкулах.

Зьяўляецца экспэртам у справах, зьвязаных з гісторыяй спэцслужбаў СССР і польскага антысавецкага ўзброенага супраціву на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

ХРАНАЛОГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Асьвятляў падзеі ў Менску 19 сьнежня 2010 г., за гэта быў асуджаны судзьдзёй Кастрычніцкага суду Менску Натальляй Пратасавіцкай на 15 сутак арышту. Гэта быў ужо другі прысуд журналісту па адной і той жа справе – нібыта за ўдзел у несанкцыянаванай дэманстрацыі. Першы раз Пачобута аштрафавалі на 1 млн. 750 тыс. рублёў, але пракуратура апратэставала пастанову суда як занадта мяккую.

18 сакавіка 2011 г. Гарадзенская абласная пракуратура ўзбудзіла справу супраць Андрэя Пачобута за абразу Прэзыдэнта Беларусі (частка 1 артыкулу 368 Крымінальнага кодэксу РБ). 6 красавіка 2011 г. Андрэй Пачобут быў затрыманы, калі ён накіроўваўся ў Менск для ўдзелу у тэлемасьце з прадстаўнікамі Эўрапарлямэнту. Першапачаткова быў затрыманы на 72 гадзіны, аднак пазьней быў ўзяты пад варту на два месяцы. На працягу ўсяго тэрміну журналіст утрымліваўся ў сьледчым ізалятары Гарадзенскай турмы. Супраць яго была ўзбуджаная яшчэ адна крымінальная справа – за паклёп на Аляксандра Лукашэнку (частка 1 артыкулу 367 Крымінальнага кодэксу РБ).

Сьледзтва па справе супраць журналіста «Gazeta Wyborcza» Андрэя Пачобута праводзіла Гарадзенская абласная пракуратура. Усе ягоныя хадайніцтвы, якія ён падаў пасьля азнаямленьня з матэрыяламі справы, былі адхіленыя. Ён прасіў спыніць крымінальную справу праз адсутнасьць складу злачынства, запрасіць у суд «пацярпелага» Аляксандра Лукашэнку і Лідзію Ярмошыну – як сьведак. Журналіст таксама прасіў далучыць да справы адмову ў акрэдытацыі, якую ён атрымаў летась зь Міністэрства замежных справаў Беларусі, і тэксты інтэрвію Лукашэнкі ўкраінскім (за 2008 г.) і расейскім (за 2010 г.) СМІ са словамі пра «фальсыфікацыю выбараў».

Працэс пачаўся 14 чэрвеня ў судзе Ленінскіга раёну Гародні, праходзіў зь перапынкамі і неаднаразова перарываўся. Суд праходзіў ў закрытым рэжыме.

5 ліпеня 2011 г. А. Пачобут быў асуджаны на 3 гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на 2 гады. Суд апраўдаў журналіста па артыкуле «Абраза Прэзыдэнта РБ», але прызнаў вінаватым у паклёпе.

21 чэрвеня 2012 г. быў арыштаваны дома ў Гародні, супраць яго заведзеная крымінальная справа па артыкуле «Паклёп на Прэзыдэнта». Падставай сталі нататкі Андрэя ў блогу і ягоныя артыкулы на сайтах «Хартыя-97» і «Беларускі партызан».

30 чэрвеня Андрэй Пачобут быў вызвалены пад падпіску аб нявыезьдзе.

15 сакавіка 2013 г. другая крымінальная справа супраць журналіста была закрытая за адсутнасьцю складу злачынства.

23 верасьня 2013 г. ён быў вызвалены ад адбыцьця пакараньня з адтэрміноўкай па першай справе. Вызваленьне адбылося пасьля таго, як скончыўся тэрмін двухгадовай адтэрміноўкі.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

ULADZIMIR PODHOL

Uladzimir Podhol to politolog, dziennikarz, urodzony 22 grudnia 1952 r. w Witebsku. Skończył Kolegium Wychowania Fizycznego oraz Fakultet Filozofii Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Absolwent wydziału filozofii, docent, członek partii BNF.

W roku 1990 Uladzimir Podhol (wraz z Borysem Chamajdą, Uladzimirem Płeszczenką i Siarhiejem Naumyczkiem) założył w Witebsku klub „O demokratyczne wybory" oraz gazetę „Wybór".

KRONIKA REPRESJI

15 sierpnia 1997 roku, zastępca prokuratora Okręgu Witebskiego, Żygalenka, w związku z publikacją w gazecie „Wybór" fragmentu książki Uladzimira Podhola „Kula dla prezydenta", wszczął postępowanie karne (art. KK „Zniewaga wyższego urzędnika państwowego"). Pierwszy fragment, autorstwa Borysa Chamajdy, opublikowała w czerwcu 1997 r. witebska gazeta „Wybór". Nosił on tytuł „Czółno rozpaczy w Santa-Bagnie, czyli kochać Prezydenta". Cały nakład został zatrzymany i przekazany KGB. 20 października 1997 r. na wniosek prokuratury wezwano córkę Uladzimira Podhola, Alenę. Szukano wówczas jej ojca, córka jednak odmówiła podania miejsca jego przebywania. 30 sierpnia 1998 kapitan KGB W. Dementiej i kapitan A. Liebiediew znaleźli Uladzimira Podhola w Witebsku i wręczyli mu wezwanie do prokuratury. Następnego dnia odbyło się jego przesłuchanie. 16 listopada 1998 roku śledczy Prokuratury Okręgu Witebskiego, S. Sawczenko, wstrzymał postępowanie karne. Postępowanie to wznowiono jednak po dwóch miesiącach.

Mińska prokuratura również wszczęła wobec Uladzimira Podhola postępowanie karne po opublikowaniu w 2004 r. w Sankt Petersburgu w Rosji drugiej części powieści pt. „Kula dla Prezydenta". W styczniu 2005 roku, Podhol został wezwany do prokuratury w Mińsku.

W 2012 roku została wysunięta kandydatura Podhola na stanowisko deputowanego Parlamentu z ramienia BNF. Niedługo później jego nazwisko zostało usunięte z listy wyborczej. Przyczyną było wystąpienie Podhola w państwowej telewizji białoruskiej i w radiu.

Toczące się sprawy karne przeciw Podholowi zawieszono na czas nieokreślony.

УЛАДЗІМЕР ПАДГОЛ

Уладзімер Падгол – палітоляг, журналіст. Нарадзіўся 22 сьнежня 1952 г. у Віцебску. Скончыў тэхнікум фізычнай культуры, затым філязофскі факультэт БДУ. Дацэнт, кандыдат філязофскіх навук. Сябра Партыі БНФ.

У 1990-м стварыў у Віцебску (разам з Барысам Хамайдам, Уладзімерам Плешчанкам, Сяргеем Навумчыкам) клюб «За дэмакратычныя выбары» і газэту «Выбар».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

15 жніўня 1997 г. намесьнікам пракурора Віцебскай вобласьці Жыгаленкам была ўзбуджаная крымінальная справа (артыкул «Абраза асобы, якая займае вышэйшую пасаду») па факце публікацыі ў газэце «Выбар» урыўку з кнігі Ўладзімера Падгола «Куля для прэзыдэнта».

Першы ўрывак кнігі пад назвай «Ладзьдзя роспачы ў Санта-Балоце, альбо Як любіць Прэзыдэнта» была надрукаваная ў віцебскай газэце «Выбар» у чэрвені 1997 г. Барысам Хамайдам. Увесь наклад быў арыштаваны і перададзены ў КДБ.

20 кастрычніка 1997 г. на допыт у пракуратуру была выкліканая дачка Ўладзімера Падгола Алена. Шукалі яе бацьку, але дачка паказала, што нічога ня ведае. 30 кастрычніка 1998 г. капітан КДБ В. Дземяньцей і капітан А. Лебедзеў высачылі Ўл. Падгола ў Віцебску і ўручылі яму позву ў пракуратуру. На наступны дзень быў праведзены допыт Уладзімера Падгола.

16 лістапада 1998 году крымінальная справа была прыпыненая сьледчым пракуратуры Віцебскай вобласьці С. Саўчанкам па артыкуле 5 ч. 1 п. 3 КПК Рэспублікі Беларусь. Аднак праз 2 месяцы, 16 студзеня 1999 году, расьсьледаваньне па крымінальнай справе было працягнутае.

Пракуратура Менску таксама распачала крымінальную справу пасьля таго, як другая вэрсія раману «Куля для прэзыдэнта» у 2004 годзе выйшла ў Расеі, у Санкт-Пецярбургу. У студзені 2005 г. Падгол дапытаны ў пракуратуры Менску сьледчым А. Пікаравым.

У 2012 годзе быў вылучаны ад БНФ кандыдатам у дэпутаты парлямэнту і пасьля выступу па радыё і тэлебачаньні зьняўся з выбараў.

Да сёньняшняга дня крымінальныя справы супраць У. Падгола зьяўляюцца не зачыненымі, а прыпыненымі на няпэўны час.

JANA POLJAKOWA

Jana Poljakowa urodziła się w 1973 r. na Ukrainie. Wraz z rodzicami przeprowadziła się do Soligorska w okręgu mińskim (Białoruś).

Jana Poljakowa skończyła Wydział Prawa Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Pracowała jako prawnik w soligorskim przedsiębiorstwie „Nadzieja", po czym rozpoczęła współpracę z Białoruskim Komitetem Helsińskim, a od roku 2000 – z organizacją broniącą praw człowieka „Pomoc prawna dla społeczeństwa" Olega Wouczaka.

KRONIKA REPRESJI

3 marca 2009 r. Sąd Rejonowy w Soligorsku wszczął przeciw Janie Poljakowej postępowanie karne i – uznając ją (w myśl art. 400, pkt 2 KK RB) winną świadomego składania fałszywych zeznań przeciwko funkcjonariuszowi milicji – wydał wyrok skazujący na 2,5 roku ograniczenia wolności. Była ona dodatkowo zobowiązana do zapłacenia 1 mln rubli posterunkowemu Pugaczowowi, uznanemu za pokrzywdzonego w sprawie.

W listopadzie 2008 roku, obrończyni praw człowieka ogłosiła, że Jana Poljakowa była wielokrotnie zatrzymywana przez milicję za swoją działalność na rzecz praw człowieka. Podawano również, że działaczka była na posterunku bita i że raz prawie złamano jej rękę.

Represje wobec Jany Poljakowej rozpoczęły się po tym, jak została ona członkiem sztabu Wolgi Kozulinej – córki byłego kandydata na prezydenta, Aleksandra Kozulina – w trakcie wyborów parlamentarnych roku 2008.

Jana Poljakowa nie przyznała się do winy. Opowiedziała, że inspektor na posterunku pobił ją po tym, jak odmówiła podpisania dokumentu stwierdzającego, że nie brała udziału w zbieraniu podpisów pod kandydaturą Wolgi Kozulinej (czym miała zaprzeczyć swojej działalności politycznej).

Oprócz tego od sierpnia 2008 roku do Jany Poljakowej dzwoniono z KGB z wezwaniami stawienia się na posterunku, czego aktywistka jednak odmawiała.

6 marca 2009 r. w gazecie „Radziecka Białoruś" pojawił się felieton zawierający oszczercze treści pod adresem Jany Poljakowej.

Jana Poljakowa popełniła samobójstwo. Kobieta powiesiła się. Matka Jany Poljakowej znalazła ciało córki w ich domu 7 marca 2009 roku, dzień po publikacji oszczerczego felietonu.

Według naocznych świadków, po wydaniu wyroku Jana wielokrotnie powtarzała, że „nie zostanie skazańcem".

ЯНА ПАЛЯКОВА

Яна Палякова нарадзілася ў 1973 годзе ва Ўкраіне. Пазьней сям'я яе бацькоў пераехала ў Салігорск Менскай вобласьці (Беларусь).

Яна Палякова скончыла юрыдычны факультэт БДУ. Працавала юрыстам на салігорскім прадпрыемстве «Надзея», затым супрацоўнічала зь Беларускім Хельсінкскім камітэтам, а з 2000 году – з праваабарончай арганізацый «Прававая дапамога насельніцтву» Алега Волчака.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

3 сакавіка 2009 году суд Салігорскага раёну вынес прысуд па крымінальнай справе ў дачыненьні да праваабаронцы Яны Паляковай, якая была прызнаная вінаватай па ч. 2 арт. 400 КК РБ – «загадзя непраўдзівы данос». Яе абвінавацілі ў ілжывым даносе на супрацоўніка міліцыі і асудзілі на 2,5 гады абмежаваньня волі (судзьдзя – Аляксандар Бураўцоў). Да таго ж, Яна павінна была выплаціць 1 мільён рублёў участковаму Пугачову, якога суд прызнаў пацярпелым.

У лістападзе 2008 году праваабаронца паведамляла, што за апазыцыйную дзейнасьць яе некалькі разоў затрымлівалі супрацоўнікі міліцыі. Таксама паведамлялася, што ў пастарунку жанчыну зьбівалі і нават аднойчы ледзь не зламалі ёй руку.

Перасьлед Яны Паляковай распачаўся пасьля таго, як яна стала сябрам ініцыятыўнай групы Вольгі Казулінай – дачкі былога кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Казуліна – на выбарах у парлямеэнт увосень 2008 году.

Яна Палякова лічыла сябе невінаватай. Яна распавядала, што ўчастковы інспэктар нанёс ёй пабоі пасьля яе адмовы падпісваць паперы пра тое, што Яна не зьбірала подпісы за вылучэньне Вольгі Казулінай (то бок, ня мае дачыненьня да палітычнай дзейнасьці).

Акрамя таго, ад жніўня 2008 г. Яне Паляковай тэлефанавалі з КДБ з просьбамі зьявіцца туды, але актывістка адмаўлялася.

6 сакавіка 2009 г. у афіцыйнай газэце «Советская Белоруссия» выйшаў фэльетон, які зьмяшчаў абразьлівыя выказваньні ў бок Яны Паляковай. Раніцай наступнага дня (7 сакавіка 2009 г.) маці Яны Паляковай знайшла дачку павешанай у іх дома.

Па сьведчаньнях відавочцаў, пасьля вынясеньня прысуду Яна некалькі разоў казала, што «ня будзе зэчкай».

SIERGIEJ POTAPOW

Siergiej Potapow to pochodzący z Charkowa obywatel Ukrainy, który wraz ze swoimi rodakami przyjechał na Białoruś, by wziąć udział w akcji opozycji „Czarnobylski Szlak".

KRONIKA REPRESJI

Siergiej Potapow został zatrzymany w Mińsku 26 kwietnia 1996 r. podczas pacyfikacji wielotysięcznej akcji „Czarnobylski Szlak". Umieszczono go w areszcie śledczym na Wołodarce, oskarżono go o „organizację i udział w akcjach w poważny sposób naruszających porządek publiczny". W sierpniu 1996 r. w mińskim sądzie rozpoczął się proces, podczas którego Siergiej Potapow nie ukrywał, że jest ukraińskim nacjonalistą i zwolennikiem UNA-UNSO (UNA – Ukraińskie Zgromadzenie Narodowe, UNSO – Ukraińska Samoobrona Narodowa). Oświadczył, że przyjechał do Mińska, żeby wziąć udział w „Czarnobylskim Szlaku" i wesprzeć walkę białoruskiej opozycji o demokrację. Inni podsądni mówili, że widzieli podczas marszu ukraińskie flagi i po prostu podeszli do Ukraińców. Na pytanie, czy jest członkiem UNSA, Potapow odpowiedział żartem: „Ostatnią partią, której byłem członkiem było KPZR" (Komunistyczna Partia Związku Radzieckiego).

Pod koniec sierpnia 1996 r. Potapow został skazany na 2 lata i 3 miesiące kolonii karnej. Karę odbywał w kolonii w Mohylewie. Zwolniono go warunkowo jesienią 1997 r.

СЯРГЕЙ ПАТАПАЎ

Грамадзянін Украіны, які разам зь некалькімі суайчыньнікамі наведаў Беларусь для ўдзелу ў акцыі апазыцыі «Чарнобыльскі Шлях» з матываў салідарнасьці. Жыве ў г. Харкаве.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы міліцыяй падчас разгону шматтысячнай акцыі «Чарнобыльскі Шлях» 26 красавіка 1996 г. у Менску. Зьмешчаны пад варту ў СІЗА па вул. Валадарскага, абвінавачаны па артыкуле «Арганізацыя і ўдзел у дзеяньнях, што груба парушаюць грамадзкі парадак».

У жніўні 1996 г. у Менскім гарадзкім судзе распачаўся судовы працэс, падчас якога Сяргей Патапаў не хаваў, што ён, расеец паводле свайго паходжаньня, зьяўляецца ўкраінскім нацыяналістам і прыхільнікам УНА-УНСО. Ён наўпрост абвясьціў падчас суду, што прыехаў у Менск, каб узяць удзел у «Чарнобыльскім Шляху» дзеля падтрымкі барацьбы беларускай апазыцыі за дэмакратыю ў краіне. Іншыя падсудныя казалі, што пабачылі на шэсьці ўкраінскія сьцягі і проста падышлі да прысутных там украінцаў. Аднак на пытаньне, ці ён сябра УНСО, Патапаў адказаў паўжартам: «Апошняя партыя, у якую я ўваходзіў, была КПСС».

Напрыканцы жніўня 1996 году Сяргей Патапаў быў асуджаны Менскім гарадзкім судом на 2 гады і 3 месяцы калёніі агульнага рэжыму. Адбываў пакараньне ў адной з калёніяў г. Магілёву. Вызвалены ўмоўна-датэрмінова ўвосень 1997 г.

ARTIOM PRAKAPIENKA



FOT. ARCIOM PRAKAPENKA

Artiom Prakapienka z Grodna urodził się 27 lipca 1990 r. Uczył się w Bobrujsku i nie ukrywa swojej przynależności do ruchu anarchistycznego.

KRONIKA REPRESJI

Atiom Prakapienka, Jauhien Waśkowicz i Paweł Syramolatau byli sądzeni za próbę podpalenia budynku KGB w Bobrujsku. Oskarżono ich o „złośliwe chuligaństwo" i „umyślne uszkodzenie mienia w dużym rozmiarze". Prokurator Tołstik żądał dla nich od 7,5 do 8 lat pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Zdaniem oskarżyciela z urzędu, śledztwo wykazało winę oskarżonych. Zdaniem prokuratora, mężczyźni mogli zniszczyć budynek KGB. Zniszczenia w takim wypadku wyniosłyby ok. 2 mld rubli (ok. 0,44 mln dolarów). Tołstik oświadczył, że „atak na KGB był jawnym wyzwaniem rzuconym społeczeństwu i demonstracją bezkarności".

Adwokaci podkreślali, że podsądni składali zeznania pod presją i nie zamierzali spalić budynku, a jedynie go uszkodzić. Zdaniem obrony, dowody prokuratora opierają się tylko na wyobrażeniach tego, co mogłoby się zdarzyć, podczas gdy rzeczywista szkoda spowodowana przez mężczyzn wyniosła 253 tysiące rubli (56,2 dolarów), które już zostały wypłacone. Według adwokatów, białoruska telewizja nielegalnie wykorzystała zapisy wideo z ataku oskarżonych na budynek KGB, a młodzi ludzie zostali w nim przedstawieni jako osoby, które, nie mając własnych zainteresowań, pasji, celów, chcą jedynie niszczyć wszystko wokół.

18 maja 2011 r. Artiom Prakapienka został skazany przez sąd w Bobrujsku na 7 lat kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. Karę odbywa w Kolonii Karnej nr 17 w Szkłowie, w obwodzie mohylewskim.

АРЦЁМ ПРАКАПЕНКА

Арцём Пракапенка родам з Гародні. Нарадзіўся 27 ліпеня 1990 году. Пасьля сканчэньня школы вучыўся ў Бабруйску. Не хаваў сваёй прыхільнасьці да анархісцкага руху.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Арцёма Пракапенку, Яўгена Васьковіча і Паўла Сырамолатава судзілі па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу – «Злоснае хуліганства» і «Наўмыснае прычыненьне шкоды ў асабліва буйных памерах».

Пракурор Тоўсьцік прасіла суд асудзіць маладых людзей да пазбаўленьня волі на тэрмін ад 7,5 да 8 гадоў з адбыцьцём пакараньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Па словах дзяржабвінаваўцы, папярэдняе сьледзтва цалкам даказала віну падсудных. На думку пракурора, яны маглі проста зьнішчыць будынак КДБ, нанесеная шкода ў такім выпадку склала б каля двух мільярдаў рублёў (444,44 тыс. даляраў па курсе камэрцыйных банкаў).

Акрамя таго, заявіла Тоўсьцік, «напад на КДБ быў відавочным выклікам грамадзтву з дэманстрацыяй сваёй беспакаранасьці».


Адвакаты адзначалі, што іх падабаронныя давалі паказаньні пад ціскам і зьбіраліся не спаліць будынак, а толькі яго пашкодзіць. На думку абароны, довады абвінаваўцы грунтуюцца толькі на ўяўленьні таго, што магло б здарыцца, тады як рэальная шкода ад дзеяньняў маладых людзей складае 253 тыс. рублёў (56,2 даляра), якія ўжо выплачаныя.

Акрамя таго, заявілі адвакаты, Беларускае тэлебачаньне неправамерна выкарыстала відэазапісы папярэдняга сьледзтва аб нападзе падсудных на будынак КДБ для свайго фільму. Маладых людзей там паказалі як асобаў, што ня маюць уласных жыцьцёвых перакананьняў, якія гатовыя зьнішчыць усё, што толькі бачаць.

Павал Сырамолатаў і Арцём Пракапенка ў сваім апошнім слове заявілі, што раскайваюцца. Яны таксама прасілі суд аб літасьці ў вынясеньні прысуду.

18 траўня 2011 г. Арцём Пракапенка асуджаны судом г. Бабруйска на 7 гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Пакараньне адбываў у калёніі № 17 у г.Шклове Магілёўскай вобласьці. У траўні 2012 г. пераведзены ў калёнію № 15 г. Магілёву.

ANDREJ PRATASIENIA



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Andrej Pratasienia urodził się 12 grudnia 1981 r. Po ukończeniu szkoły średniej rozpoczął studia na Wydziale Matematyki Stosowanej Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Pracował jako programista. Zajmował się działalnością dobroczynną – pomagał chorym w zbiórce środków finansowych na operacje.

Do listopada 2010 r. nie był członkiem żadnych ruchów, organizacji czy partii politycznych. Miesiąc przed wydarzeniami na Placu Niepodległości napisał oświadczenie o przyłączeniu się do Zjednoczonej Partii Obywatelskiej (nie został jednak jej członkiem). Był wolontariuszem podczas kampanii wyborczej Jarosława Romańczuka. 19 grudnia był na Placu Niepodległości, jednak jeszcze przed pacyfikacją demonstracji poszedł do domu.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany 9 lutego 2011 r. Tego samego dnia w jego mieszkaniu przeprowadzono rewizję. Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 293, pkt 2 KK – „Aktywny udział w masowych zamieszkach". Dopiero 16 marca 2011 r. jego rodzice i bliscy dowiedzieli się, że Pratasienia przebywa w areszcie i ma status oskarżonego. 5 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 3 lata pozbawienia wolności. Karę odbywał w kolonii w Bobrujsku. 1 września 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Łukaszenki.

АНДРЭЙ ПРАТАСЕНЯ

Нарадзіўся 12 сьнежня 1981 году. Пасьля школы скончыў факультэт прыкладной матэматыкі Белдзяржунівэрсытэту. Працаваў праграмістам. Займаўся дабрачыннасьцю – дапамагаў хворым людзям зьбіраць сродкі на апэрацыі.

У палітычных партыях і рухах ня быў да лістападу 2010 г., але за месяц да падзей на Плошчы Незалежнасьці напісаў заяву на ўступленьне ў АГП (праўда, пазьней зразумеў, што палітыка – гэта не ягоная сфэра, і ня стаў уступаць у партыю). Быў валянтэрам у агітацыйнай кампаніі Яраслава Раманчука. 19 сьнежня 2010 г. быў на Плошчы, але пад яе разгон не патрапіў і сышоў дахаты.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 9 лютага 2011 г. Пад вечар таго самага дня ў Менску ў доме яго бацькоў прайшоўператрус, пасьля якога Андрэя арыштавалі. Яму прад'яўлена абвінавачаньне па ч. 2 арт. 293 КК – «актыўны ўдзел у масавых беспарадках». Пра тое, што гэты чалавек знаходзіцца пад вартай у СІЗА КДБ і праходзіць па справе аб масавых беспарадках, стала вядома толькі 16 сакавіка 2011 г.

5 траўня 2011 г. у судзе Кастрычніцкага раёну Менску быў асуджаны на 3 гады пазбаўленьня волі. Адбываў тэрмін пакараньня ў калёніі г. Бабруйску.

1 верасьня 2011 г. памілаваны Лукашэнкам у ліку некалькіх іншых палітвязьняў і вызвалены.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ALEŚ PUSZKIN

Aleś Puszkin to artysta malarz, performer i działacz opozycyjny. Jego obrazy zdobią wiele kościołów na Białorusi.

Urodził się 6 sierpnia 1965 oku w mieście Bobr (rejon krupski obwodu mińskiego). Uczęszczał do miejscowej szkoły, uczył się w Państwowej Wyższej Szkole Sztuki po czym studiował w Białoruskim Państwowym Instytucie Artystyczno-Teatralnym. Po raz pierwszy zorganizował performance w 1989 r. w Mińsku, na schodach Instytutu Sztuk Teatralnych (obecnie Akademia Sztuk Pięknych), gdzie studiował. W czasie performance'u wywiesił plakat, na którym widniała przekreślona flaga Białoruskiej Socjalistycznej Republiki Radzieckiej a obok biało-czerwono-biała narodowa flaga białoruska. Była to forma sprzeciwu wobec władz uczelni w związku z zakazem zorganizowania wystawy poświęconej Białoruskiej Republice Ludowej.

Jest pacyfistą, jednak w czasie wojny w Afganistanie został wcielony do wojska i wysłany na front.

W czasie wojny prowadził pamiętnik w języku białoruskim, opisując frontową rzeczywistość. Zawarte w nim poglądy zostały uznane za antysowieckie.

KRONIKA REPRESJI

Wielokrotnie był zatrzymywany i aresztowany za udział w opozycyjnych akcjach politycznych. W roku 1988 po raz pierwszy aresztowano go za rozpowszechnianie ulotek zachęcających do udziału w „Dziadach" na Cmentarzu Wschodnim w Mińsku. W lipcu 1989 r. miński sąd skazał go na dwa lata pozbawienia wolności w zawieszeniu za przygotowanie happeningu z okazji 71 rocznicy powstania Białoruskiej Republiki Ludowej. Po odbyciu kary nie mógł wyjechać za granicę.

W 1999 r. zorganizował happening „Wdzięczność prezydentowi" z okazji formalnego zakończenia pierwszej kadencji Aleksandra Łukaszenki. Puszkin przywiózł pod siedzibę prezydenta pomalowaną na czerwono taczkę gnoju, na którym leżały zdenominowane białoruskie pieniądze napis na taczce głosił: „Dla Prezydenta Łukaszenki". Zatrzymany na Placu Centralnym nie podał swojego imienia – przedstawił się jako człowiek z narodu. Po kilku minutach został jednak rozpoznany i aresztowany. Zwolniono go z aresztu po tym, jak podpisał dokument zakazujący opuszczania miejsca zamieszkania.

Przed wyborami prezydenckimi 2006 r. Puszkina aresztowano na 3 dni za rzekomą rozmowę telefoniczną, w której krytykował szefa KGB. Został ukarany grzywną i wypuszczony. W 2006 r. był także sądzony za oblanie czarną farbą pomnika bohatera ZSRR – Czebotawiera. Z powodu braku dowodów śledztwo zostało umorzone. 9 grudnia 2010 r., 10 dni przed akcjami protestacyjnymi w centrum Mińska, Puszkin został aresztowany za chuligaństwo. Będąc w więzieniu ogłosił strajk głodowy. Jak się później okazało zatrzymanie miało charakter prewencyjny. Z aresztu został wypuszczony po 13 dniach. W chwili obecnej Aleś mieszka w rodzimym miasteczku Bobr i zajmuje się działalnością artystyczną.

АЛЕСЬ ПУШКІН

Алесь Пушкін – мастак, вядомы росьпісам храмаў у розных кутках Беларусі, а таксама пэрфомансамі з палітычным падтэкстам. Упершыню зладзіў такі пэрформанс у 1989 годзе ў Менску, на ганку Тэатральна-мастацкага інстытуту (цяпер Акадэмія мастацтваў), дзе ён вучыўся. Мастак выставіў плякат, на якім былі намялаваныя закрэсьлены сьцяг тагачаснай БССР і побач – бел-чырвона-белы нацыянальны беларускі сьцяг. Такім быў адказ Алеся на забарону кіраўніцтва інстытуту зладзіць выставу, прысьвечаную БНР.

Алесь Пушкін нарадзіўся 6 жніўня 1965 году ў мястэчку Бобр у Крупскім раёне Менскай вобласьці. Вучыўся ў мясцовай школе, потым у Рэспубліканскім мастацкім каледжы, пасьля якога паступіў у Тэатральна-мастацкі інстытут. З 1986 г. яго працы ўдзельнічалі ў выставах. Паводле поглядаў пацыфіст, але быў прызваны на вайсковую службу і адпраўлены ў Аўганістан. Там вёў дзёньнік па-беларуску, апісваючы праўду, пакуль яго не прачытаў і ня выдаў саслужбовец-беларус. Дзёньнік Пушкіна быў прызнаны антысавецкім.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Шмат разоў затрымліваўся за ўдзел у палітычных акцыях, адбываў арышты. Першы раз быў асуджаны на 5 сутак у 1988 г. за заклікі прыйсьці на першыя «Дзяды». У 1989 г. за выставу і шэсьце ў Дзень Волі па праспэкце Леніна (цяпер Незалежнасьці) у Менску Пушкіна асудзілі на 2 гады зьняволеньня ўмоўна. Нават пасьля гэтага ён фактычна некалькі гадоў быў невыязным.

У 1999 годзе Алесь быў асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі ўмоўна за акцыю-пэрформанс «Падзяка прэзыдэнту». 21 ліпеня 1999 г., калі скончыўся канстытуцыйны тэрмін праўленьня першага прэзыдэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, Пушкін, рызыкуючы быць абстраляным прэзыдэнцкай аховай, прыкаціў да пад'езду прэзыдэнцкай управы ў цэнтры Менску пафарбаваную ў чырвоны колер тачку гною, на якім ляжалі дэнамінаваныя беларускія грошы і шыльда з падзякай Лукашэнку за працу. Быў адразу затрыманы, не назваў сваё імя, прадставіўся «чалавекам з народу», але празь некалькі гадзінаў супрацоўнікі міліцыі самі апазналі яго. Пушкіна выпусьцілі з пастарунку пад падпіску аб нявыезьдзе.

Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. Алеся Пушкіна на 3 дні зьмясьцілі ў СІЗА нібыта за тое, што ў тэлефоннай размове мастак кепска казаў пра тагачаснага старшыню КДБ Сухарэнку – нібыта пра гэта данесьлі невядомыя «рыбакі». Алеся аштрафавалі і адпусьцілі. У тым жа годзе яго спрабавалі асудзіць па абвінавачваньні ў абліваньні чорнай фарбай помніку расейскаму «сьмершаўцу», Герою Савецкага Саюзу Чабатарову. Але справа была адпраўленая на дасьледаваньне і закрытая.

9 сьнежня, за 10 дзён да разгону акцыі пратэсту ў Менску, Пушкін быў затрыманы ў сябе дома і абвінавачаны ў хуліганстве. Пад вартай у Крупскім СІЗА абвясьціў галадоўку і «маўчанку». Затрыманьне аказалася прэвэнтыўным. Каб палітычна актыўны мастак не арганізаваў акцыю пратэсту, яму далі 13 сутак і пасьля іх вызвалілі. Цяпер Алесь, як і раней, жыве ў мястэчку Бобр і займаецца мастацкай творчасьцю.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

NATALIA RADZINA

Natalia Radzina, dziennikarka i redaktor opozycyjnego portalu charter97.org, urodziła się 3 maja 1979 r. w Korbinie (obwód brzeski), w rodzinie wojskowego. Dziennikarstwem zajmuje się od 1997 r. Ukończyła dziennikarstwo na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym, pracując równocześnie w niezależnych mediach. Pracowała w gazecie „Imia", „Narodnaja Wolia", „Nowosti", „Nasza swaboda". Wielokrotnie otrzymywała karę aresztu, była bita podczas komentowania akcji protestu opozycji. 16 marca 2010 r. podczas rewizji w biurze redakcji portalu charter97.org funkcjonariusze struktur siłowych w cywilu bili ją po twarzy. W 2010 r. znana brytyjska organizacja na rzecz praw człowieka, Index on Censorship, nominowała ją do nagrody „Wolność słowa" za walkę przeciwko represjom i za działalność, której celem była zmiana sytuacji politycznej.

KRONIKA REPRESJI

19 grudnia 2010 roku, podczas pacyfikacji akcji opozycji na Placu Niepodległości, Natalia Radzina została silnie uderzona w głowę. Zatrzymano ją w redakcji portalu charter97.org i przewieziono do aresztu KGB. Pod koniec grudnia 2010 r. przedstawiono jej zarzuty z artykułu 293 KK, pkt 1 i 2 – „Masowe zamieszki" i wręczono zakaz opuszczania miejsca zamieszkania (mieszkała w domu rodzinnym w Korbinie). 1 kwietnia 2011 r. uciekła z Białorusi, zaś we wrześniu otrzymała azyl polityczny na Litwie. Niedługo po jej ucieczce zawieszono postępowanie przeciwko niej, jednakże według ekspertów, gdyby Radzina zdecydowała się wrócić do kraju i kontynuować działalność jako dziennikarz, władze mogłyby szybko sformułować nowe oskarżenie.

W październiku 2011 r. Natalia Radzina została laureatką nagrody za wolność prasy Międzynarodowego Komitetu Ochrony Dziennikarzy. Obecnie mieszka i pracuje w Warszawie.

НАТАЛЬЛЯ РАДЗІНА

Журналістка і рэдактарка апазыцыйнага сайту charter97.org. Нарадзілася 3 траўня 1979 году ў г. Кобрыне (Берасьцейская вобласьць) у сям'і вайскоўца. У журналістыцы з 1997 году. Скончыла журфак БДУ паралельна з працай у незалежных СМІ. Працавала ў газэтах «Имя», «Народная воля», «Навіны», «Наша Свабода». Неаднаразова падвяргалася арыштам і зьбіцьцю ў часе асьвятленьня акцый апазыцыі. 16 сакавіка 2010 году падчасператрусу ў офісе сайта charter97.org атрымала ўдар у твар ад супрацоўнікаў сілавых структураў у цывільным. У 2010 годзе намінаваная вядучай брытанскай праваабарончай арганізацыяй «Індэкс цэнзуры» на прэмію «Свабода слова» ў намінацыі «За барацьбу супраць рэпрэсіяў і за дзейнасьць, накіраваную на зьмяненьне палітычнага клімату».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Падчас сілавога разгону Плошчы-2010 Натальлі разьбілі галаву. У ноч з 19 на 20 сьнежня 2010 году, пасьля прэзыдэнцкіх выбараў і акцыі пратэсту ў цэнтры Менску, была затрымана ў рэдакцыі сайту charter97.org і зьмешчаная пад варту ў СІЗА КДБ. Пры канцы сьнежня 2010 г. ёй прад'яўленае абвінавачаньне па крымінальнай справе, узбуджанай сьледчым упраўленьнем папярэдняга расьсьледаваньня ГУУС Мінгарвыканкама па чч. 1 і 2 арт. 293 КК (масавыя беспарадкі).

28 сьнежня мера стрыманьня зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе, пасьля гэтага Натальля жыла ў бацькоўскім доме ў г. Кобрыне. 1 красавіка 2011 г. яна таемна зьехала зь Беларусі. У верасьні 2011 г. атрымала палітычны прытулак у Літве. Незадоўга да гэтага крымінальная справа супраць яе па артыкуле «масавыя беспарадкі» была спыненая, але, на думку экспэртаў, артыкул абвінавачаньня Натальлі маглі перафармуляваць на іншы ў выпадку яе вяртаньня і працягу працы ў якасьці журналіста.

У кастрычніку 2011 г. Натальля Радзіна стала ляўрэатам прэміі Міжнароднага камітэту абароны журналістаў за свабоду прэсы. Цяпер журналістка жыве і працуе ў Варшаве.

JURIJ RADZIWIŁ

Jurij Radziwił był kierowcą kandydata na prezydenta Republiki Białoruś, Aleksandra Kazulina.

KRONIKA REPRESJI

2 marca 2006 r. został zatrzymany przez funkcjonariuszy w cywilu. Samochód Jurija Radziwiła, z którego filmowano masowe zatrzymania i pobicia dziennikarzy oraz zwykłych obywateli przed posterunkiem milicji w Mińsku, został ostrzelany przez funkcjonariuszy specjalnego oddziału antyterrorystycznego „Ałmaz" Ministerstwa Spraw Wewnętrznych. Jurij Radziwił skierował do prokuratura Mińska N.N. Kulika żądanie wszczęcia sprawy karnej przeciwko osobom, które użyły wobec niego broni palnej. Prokurator zdecydował jednak o niewszczynaniu takiej sprawy. Radziwiłowi przedstawiono zarzuty z art. 363, pkt 2 KK RB – „Stawianie oporu funkcjonariuszowi milicji lub innej osobie strzegącej porządku publicznego". W czasie śledztwa przygotowawczego był przetrzymywany w areszcie śledczym w Mińsku.

18 maja 2006 r. Jurij Radziwił został skazany przez miński sąd na karę 3 miesięcy aresztu.

ЮРЫЙ РАДЗІВІЛ

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Юрый Радзівіл, кіроўца кандыдата ў прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра Казуліна, быў затрыманы асобамі ў цывільным 2 сакавіка. Машына Юрыя Радзівіла, зь якой вяліся відэаздымкі масавага затрыманьня і зьбіцьця журналістаў і людзей каля РУУС Кастрычніцкага р-ну Менску, была абстраляная супрацоўнікамі спэцпадразьдзяленьня МУС па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» (камандзір – палкоўнік міліцыі Мікалай Карпянкоў).

Юрый Радзівіл накіраваў заяву пракурору гораду Менску Н. Н. Куліку з патрабаваньнем узбудзіць крымінальную справу ў адносінах да неўстаноўленых цывільных асобаў, якія выкарысталі супраць яго пальную зброю, аднак пракурор даў згоду на ўзбуджэньне крымінальнай справы супраць яго самога.

Супраць Юрыя Радзівіла было вылучана абвінавачаньне па ч. 2 арт. 363 КК РБ (супраціў супрацоўніку міліцыі ці іншай асобе, якая ахоўвае грамадзкі парадак). На працягу ўсяго часу правядзеньня папярэдняга сьледзтва па справе ён знаходзіўся ў СІЗА г. Менску.

18 траўня Юрый Радзівіл быў асуджаны судом Маскоўскага р-ну г. Менску да трох месяцаў арышту. 2 ліпеня ў сувязі з адбыцьцём тэрміну пакараньня ён быў вызвалены.

MIKOŁA RAZUMOW

Mikoła Razumow, mieszkaniec Orszy w obwodzie witebskim, był jednym z liderów orszańskiego komitetu strajkowego pierwszej połowy lat 90.

KRONIKA REPRESJI

Na początku kwietnia 2006 r. przeciwko Mikole Razumowowi wszczęto sprawę karną z artykułu 367, pkt 2 KK RB o zniesławienie prezydenta Aleksandra Łukaszenki. Razumow został oskarżony o to, że 24 marca 2006 r., podczas spotkania Aleksandra Milinkiewicza z wyborcami, w obecności ponad 100 osób oświadczył, że Aleksander Łukaszenka jest odpowiedzialny za zabójstwo Zacharenki i Ganczara. Jako środek zapobiegawczy zastosowano areszt. Szpital psychiatryczny, do którego przewieziono Razumowa, po przeprowadzeniu ekspertyz uznał go za zdrowego psychicznie, wobec czego wrócił do aresztu śledczego.

16 czerwca 2006 r. sąd skazał Razumowa na karę trzyletniego ograniczenia wolności. Kara ta (tzw. kara „chemii") nie została jednak wykonana natychmiast – władze przypomniały sobie o opozycjoniście dopiero po 4 latach. 9 listopada 2010 roku, niedługo przed kolejnymi wyborami prezydenckimi, do mieszkania Razumowa przyszli funkcjonariusze milicji i aresztowali go. Uwolniony został 1 lutego 2012 roku z powodu przedawnienia.

МІКАЛАЙ РАЗУМАЎ

Мікалай Разумаў – жыхар г. Ворша (Віцебская вобласьць), адзін зь лідэраў Аршанскага стачкаму першай паловы 1990-х гадоў, які арганізоўваў масавыя пратэсты працоўных, у тым ліку перакрыцьцё чыгункі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Напачатку красавіка 2006 году супраць апазыцыйнага актывіста Мікалая Разумава ў Воршы была ўзбуджаная крымінальная справа за паклёп на кіраўніка дзяржавы А. Лукашэнку.

Мікалаю Разумаву ставілася ў віну тое, што 24 сакавіка 2006 г. падчас сустрэчы Аляксандра Мілінкевіча з выбаршчыкамі ў прысутнасьці ня менш за 100 чалавек ён заявіў пра датычнасьць Лукашэнкі да забойства Захаранкі і Ганчара.

Справа ўзбуджаная старэйшым сьледчым Філіповічам Е. па ч. 2 арт. 367 КК Рэспублікі Беларусь. Мерай стрыманьня абранае ўтрыманьне пад вартай. Потым М. Разумаў дастаўлены ў Менск для правядзеньня псыхіятрычнай экспэртызы. Быў прызнаны псыхічна здаровым. Тым ня менш, яго трымалі ў СІЗА зь інваліднасьцю па іншых хваробах.

16 чэрвеня 2006 г. суд пакараў Разумава абмежаваньнем волі на тры гады. Але накіроўваць на «хімію» яго не сьпяшаліся. Прайшло больш за чатыры гады, калі ўлады раптам успомнілі пра актывіста.

9 лістапада 2010 г., незадоўга да чарговых выбараў прэзыдэнта, на кватэру Мікалая прыйшлі супрацоўнікі міліцыі і прапанавалі яму прайсьці разам зь імі. Мікалай Разумаў прабыў на «хіміі» да 1 лютага 2012 году. У гэты дзень яго вызвалілі, патлумачыўшы, што па гэтай справе ўжо скончыўся тэрмін даўніны.

ANDREJ ROMASZEWSKI

Andrej Romaszewski urodził się 18 lipca 1970 r. w Mińsku. Po ukończeniu szkoły studiował chemię na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. W 1993 r. utworzył Partię Miłośników Piwa, która zrzeszała twórców z Mińska, poetów, muzyków. Partia ta w 1997 roku, została zlikwidowana przez władze. Jeszcze za czasów ZSRR brał udział w wielu politycznych akcjach opozycji, nie tylko na Białorusi, ale również poza jej granicami: w Rosji i na Litwie. Zajmował się wydawaniem i propagowaniem antyradzieckiego wydawnictwa podziemnego. Przez pewien czas pracował w sekretariacie redakcji gazet „Wiadomości BFL" i „Swaboda".

KRONIKA REPRESJI

Był jednym z zatrzymanych 24 maja 1995 roku, 10 dni po pozytywnych wynikach w referendum dotyczącego zmiany symboliki państwowej i sojuszu z Rosją, kiedy to studenci Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego przeprowadzili w centrum Mińska akcję protestu pod oknami budynku administracji prezydenta. Na początku chodzili oni wokół budynku administracji z rękami założonymi na głowach, miało to symbolizować kraj policyjny. Nieśli również czerwono-zieloną flagę, którą wywiesili na toalecie publicznej na pobliskim skwerze (tak zwanej „Panikowkie"). Flaga uległa rozerwaniu, omonowcy spacyfikowali akcję i zatrzymali 20 osób. Prawie rok później, 29 kwietnia 1996 r., 3 dni po„Czarnobylskim Szlaku", Romaszewskiego aresztowano za udział w akcji protestu 24 maja 1995 r. Oskarżono go o to, że rozerwał na kawałki czerwono-zieloną flagę, co zostało uznane za znieważenie symboliki państwowej.

Romaszewski spędził 3 miesiące w areszcie śledczym na Wołodarce. 1 lipca 1996 r. sąd uznał go winnym popełnienia przestępstwa z artykułu 201, pkt 2 – „Złośliwe chuligaństwo". Skazano go na 2 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu na rok. W drugiej połowie lat 90. Romaszewski wyemigrował do Czech, gdzie żyje do dzisiaj z rodziną.

АНДРЭЙ РАМАШЭЎСКІ

Андрэй Рамашэўскі нарадзіўся ў Менску 18 ліпеня 1970 г. Пасьля школы вучыўся ў РТІ, потым на хімічным факультэце БДУ.

У 1993 г. стварыў «Партыю аматараў піва» – аб'яднаньне аднадумцаў, у асноўным зь менскага творчага асяродку, у якое ўваходзілі сярод іншых і некалькі вядомых музыкаў і паэтаў (існавала да 1997 г., калі было зачыненае ўладамі).

У першай палове 1990-х гадоў удзельнічаў у многіх пэрформансах. Яшчэ з часоў позьняга СССР браў удзел і ў мностве палітычных апазыцыйных акцыяў, і ня толькі ў Беларусі, але і за яе межамі: у Расеі, Літве і г.д. Займаўся распаўсюдам і стварэньнем антысавецкага самвыдату. Некаторы час працаваў у сакратарыяце рэдакцый газэтаў «Навіны БНФ» і «Свабода».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў адным з затрыманых 24 траўня 1995 г. празь 10 дзён пасьля станоўчых вынікаў рэфэрэндуму па зьмене дзяржаўнай сымболікі і саюзу з Расеяй, калі студэнты БДУ зладзілі ў цэнтры Менску акцыю пратэсту пад вокнамі прэзыдэнцкай адміністрацыі. Напачатку яны хадзілі вакол будынку адміністрацыі з закладзенымі за галаву рукамі, сымбалізуючы паліцэйскую краіну, і трымалі долу чырвона-зялёны сьцяг, які пасьля быў вывешаны на грамадзкую прыбіральню ў бліжэйшым скверы (на так званай «панікоўцы»), а напрыканцы акцыі быў падраны на шматкі. Амонаўцы разагналі акцыю дубінкамі і арыштавалі 20 чалавек.

Амаль праз год, 29 красавіка 1996 г., праз тры дні пасьля разагнанага ўладамі «Чарнобыльскага Шляху-96», Андрэй быў арыштаваны за ўдзел у акцыі пратэсту 24 траўня 1995 г. Яго абвінавацілі ў тым, што менавіта ён разьдзёр на шматкі чырвона-зялёны сьцяг, што трактавалася як «зьдзек зь дзяржаўнай сымболікі», хоць той сьцяг і быў старога, БССРаўскага, а не новага ўзору. Тры месяцы Рамашэўскі правёў у сьледчым ізалятары МУС па вул. Валадарскага ў Менску. 1 ліпеня 1996 г. абвясціў на «Валадарцы» галадоўку пратэсту.

19 ліпеня 1996 г. судом Ленінскага раёну Менску прызнаны вінаватым па арт. 201 ч. 2 (злоснае хуліганства) і асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі ўмоўна з адтэрміноўкай на 1 год. Прысуд вынес судзьдзя Курыловіч Н. В. Андрэя Рамашэўскага вызвалілі ў зале суду.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

WITAL RYMASZEUSKI

Wital Rymaszeuski, współprzewodniczący partii „Białoruska Chrześcijańska Demokracja", urodził się 3 marca 1975 r. w Mińsku. Ukończył Białoruski Narodowy Uniwersytet Techniczny uzyskując tytuł inżyniera budownictwa. Pracował w budownictwie na Białorusi, stopniowo awansując od szeregowego pracownika do kierownika działu technicznego. Następnie zajął się prywatnym biznesem. Profesjonalnie zajmuje się polityką od 1996 roku.

Jest członkiem Rady Koordynacyjnej Białoruskiego Zjednoczenia Młodych Polityków od 1996 r. W latach 2002–2004 był członkiem Prezydium Białoruskiej Narodowej Rady Młodzieżowych i Dziecięcych Organizacji Społecznych „Rada". Współtworzył koncepcję nowej młodzieżowej polityki Białorusi. W 1999 r. studiował w Niemczech analizę struktury gospodarczej i politycznej Niemiec na kursach Wyższej Szkoły Administracji Państwowej w Instytucie „Union of Public Management". Wital Rymaszeuski zajmuje się w partii edukacją oraz sprawami międzynarodowymi. Nadzoruje pracę młodzieżówki Młodzi Chadecy i jest szefem oddziału BCHD w Mińsku.

KRONIKA REPRESJI

W wyborach 2010 r. Wital Rymaszeuski był kandydatem na urząd prezydenta Białorusi. 19 grudnia został pobity przez Specnaz na Placu Niepodległości. Zatrzymano go w czasie pacyfikacji akcji i umieszczono go w izolatce śledczej KGB. Został oskarżony na podstawie art. 293 KK.

31 grudnia Rymaszeuski został zwolniony po podpisaniu dokumentu, w którym zobowiązał się do nieopuszczania Białorusi. 30 marca 2011 r. sformułowano przeciwko niemu oskarżenie na podstawie art. 342 KK – „Organizacja lub aktywny udział w masowych działaniach poważnie naruszających porządek publiczny". 20 maja 2011 r. został skazany przez Frunzeński Sąd w Mińsku na 2 lata pozbawienia wolności w zawieszeniu.

ВІТАЛЬ РЫМАШЭЎСКІ

Сустаршыня «Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі». Нарадзіўся 3 сакавіка 1975 году ў Менску. Адукацыя вышэйшая, інжынэр-будаўнік. Працаваў па спэцыяльнасьці, пачынаючы ад шараговага супрацоўніка і скончваючы начальнікам тэхнічнага аддзелу. Затым пачаў займацца прыватным бізнэсам. Прафэсійна займаецца палітыкай з 1996 году.

З 1996 году – сябра Каардынацыйнай Рады «Беларускага аб'яднаньня маладых палітыкаў». У 2002–2004 гадах – сябра Прэзыдыюму Беларускай нацыянальнай рады маладзевых і дзіцячых грамадзкіх арганізацыяў «Рада». Адзін з распрацоўшчыкаў канцэпцыі новай моладзевай палітыкі Беларусі.

У 1999 годзе навучаўся ў Нямеччыне на курсах Вышэйшай школы дзяржаўнага кіраваньня ў інстытуце «Саюз грамадзкага кіраваньня», вывучаў эканамічнае і палітычнае ўладкаваньне ФРГ.

Праваслаўны хрысьціянін. Адзін з кіраўнікоў кампаніі «У абарону свабоды сумленьня і веравызнаньня ў Беларусі», у межах якой было сабрана больш за 50 тыс. подпісаў у абарону хрысьціянаў.

У партыі Віталь Рымашэўскі ўзначальвае працу міжнароднага і адукацыйнага аддзелу, курыруе працу моладзевай арганізацыі «Маладыя Хрысьціянскія Дэмакраты», зьяўляецца кіраўніком Менскай арганізацыі БХД.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Адзін з кандыдатаў на прэзыдэнта на выбарах 2010 г. Падчас акцыі 19 сьнежня на плошчы Незалежнасьці быў зьбіты спэцназам (расьсечана галава). Затрыманы падчас разгону акцыі, зьмешчаны ў СІЗА КДБ, абвінавачаны па арт. 293 КК РБ.

З 31 сьнежня 2010 г. знаходзіўся пад падпіскай аб нявыезьдзе. 30 сакавіка абвінавачваньне перафармуляванае на ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя дзеяньняў, што груба парушаюць гарамадзкі парадак, альбо ўдзел у іх).

20 траўня 2011 г. ў судзе Фрунзенскага раёну Менску (судзьдзя – Жанна Жукоўская, пракурор – Кажэўнікаў) асуджаны да 2 гадоў пазбаўленьня волі ўмоўна.

KATARINA SADOUSKAJA

Katarina Piotrowna Sadouskaja urodziła się 28 stycznia 1946 w Homlu. Po ukończeniu szkoły wyjechała do pracy do Swietłogorska. Po roku przeprowadziła się do Mińska. Pracowała w gospodarstwie komunalnym, w fabryce i jako motorniczy tramwaju. Od 1988 r. zajęła się działalnością na rzecz praw człowieka. W połowie lat 90. współpracowała z Partią Zdrowego Rozsądku, przy siedzibie której stworzyła specjalne centrum ochrony praw człowieka. Katarina starała się nieść pomoc osobom najbardziej bezbronnym. Znajdowała dla nich prawników, pomagała im pisać skargi dotyczące bezprawia konkretnych urzędników i niesprawiedliwych decyzji. Katarina Sadouskaja była w stanie pomóc każdemu, nawet jeśli mieszkał daleko od Mińska, dla niej prawa człowieka były najważniejsze. Polityką się nie interesowała.

KRONIKA REPRESJI

W czerwcu 2005 r. przeciwko Katarinie Sadouskiej wszczęto sprawę karną, oskarżając ją o znieważenie sędziego. Wysunięto również oskarżenie o znieważenie głowy państwa: KGB przechwyciło list Katariny Sadouskiej do rosyjskiego kolegi.

Z powodu choroby sprawa została czasowo wstrzymana. Sadouskaja przeszła operację, po czym 25 czerwca 2006 r. śledczy KGB odwieźli ją do szpitala psychiatrycznego. Później przeniesiono ją do aresztu śledczego. 23 października 2006 r. Katarina Sadouskaja została skazana na 2 lata pozbawienia wolności za znieważenie prezydenta Aleksandra Łukaszenki i sędziego. Karę odbywała w żeńskiej kolonii karnej w Homlu. Zgodnie z decyzją administracji kolonii i postanowieniem sądu, Sadouskaja wyszła na wolność 25 maja 2007 r.

КАЦЯРЫНА САДОЎСКАЯ

Кацярына Пятроўна Садоўская нарадзілася 28 студзеня 1946 г. у Гомелі. Ад 1988 г. займаецца праваабарончай дзейнасьцю.

У сярэдзіне 1990-х гг. супрацоўнічала з Партыяй здаровага сэнсу, пры якой стварыла грамадзкую прыёмную па абароне правоў чалавека. Спадарыня Кацярына імкнулася дапамагчы сацыяльна неабароненым прадстаўнікам грамадзтва, знаходзіла для іх юрыстаў, дапамагала пісаць скаргі на свавольства чыноўнікаў і несправядлівыя рашэньні ў адносінах да канкрэтных людзей. Кацярына Садоўская магла прыйсьці на дапамогу любому чалавеку, яна лічыла правы чалавека самым каштоўным. Палітыкай як такой Садоўская ніколі не займалася.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У чэрвені 2005 г. супраць Кацярыны Садоўскай распачалі крымінальную справу, абвінавачваючы яе ў зьнявазе і пагрозе судзьдзю, а пазьней і ў зьнявазе кіраўніка дзяржавы: КДБ перахапіла ліст Кацярыны Садоўскай, які распавядаў пра дыягназ, пастаўлены напачатку 2000-х зьбеглым у замежжа псыхіятрам – доктарам Шчыгельскім. З прычыны хваробы падсьледнай справу часова прыпынілі, але ўжо 25 ліпеня 2006 г. сьледчыя КДБ адвезьлі жанчыну ў псыхіятрычны шпіталь. Пазьней яе перавялі ў сьледчы ізалятар. 23 кастрычніка 2006 году Кацярына Садоўская была асуджаная да двух гадоў зьняволеньня. Адбывала пакараньне ў Гомельскай жаночай калёніі.

Выйшла на волю 25 траўня 2007 г. згодна з рашэньнем адміністрацыі жаночай калёніі і пастановай суду.

KATARINA SALAUJOWA

Katarina Salaujowa to aktywistka „Młodego frontu". Urodziła się w 1988 r. w Veszprém (Węgry) nad Balatonem, w rodzinie wojskowego. Na początku lat 90. jej rodzina mieszkała w mieście Lepel w obwodzie witebskim. Ukończyła Szkołę nr 1 w Lepelu, rozpoczęła studia na fakultecie historyczno-politologicznym Połockiego Uniwersytetu Państwowego. Na drugim roku została relegowana z uczelni za działalność w niezarejestrowanej organizacji „Młody Front".

KRONIKA REPRESJI

8 kwietnia 2008 r. sędzia Morozowa uznała aktywistkę „Młodego frontu", Katarinę Salaujową, winną popełnienia przestępstwa z art. 193.1 KK – „Nielegalna organizacja działalności lub działalność w imieniu niezarejestrowanego stowarzyszenia społecznego" i ukarała ją mandatem w wysokości 50 płac minimalnych (1,75 mln rubli). Salaujowa w ostatnim słowie podczas procesu powiedziała:

„Co się tyczy tego, czy przyznaję się do winy – jeśli chęć odrodzenia białoruskiego języka i kultury, stworzenie w kraju gospodarki rynkowej, wprowadzenie uczciwych wyborów można nazwać przestępstwem karnym, to ja rzeczywiście jestem winna i przyznaję się do winy".



FOT. JULIA DARASHKEVICH

КАЦЯРЫНА САЛАЎЁВА

Кацярына Салаўёва – актывістка «Маладога Фронту». Яна нарадзілася ў 1988 годзе ў г. Вэспрэм (Вугоршчына), на ўзьбярэжжы возера Балатон, ў сям'і вайскоўца. Напачатку 1990-х гадоў сям'я яе жыла ў г. Лепель Віцебскай вобласьці. Скончыла Лепельскую школу № 1, паступіла на гісторыка-філялягічны факультэт Полацкага ўнівэрсытэту, зь якога на 2-м курсе была адлічаная за ўдзел у незарэгістраваным уладамі «Маладым Фронце».

Па словах Кацярыны, яна цікавіцца нацыянальным рухам з 13 гадоў, і на яе мелі вялікі ўплыў падзеі на менскай Плошчы Каліноўскага ў сакавіку 2006 году.

У траўні 2009 году 21-гадовая Кацярына Салаўёва трымала галадоўку на знак салідарнасьці з арыштаванымі ваўкавыскімі прадпрымальнікамі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

8 красавіка 2008 г. судзьдзя Марозава прызнала рэгіянальную актывістку «Маладога Фронту» Кацярыну Салаўёву вінаватай ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па арт. 193.1 КК РБ (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) і пакарала штрафам у памеры 50 базавых велічыняў (1 млн. 750 тыс. руб.).

Кацярына Салаўёва сярод іншага адзначыла на судзе:

«Што да таго, ці прызнаю я сваю віну, то калі жаданьне адрадзіць беларускую мову, культуру, стварыць у краіне рынкавую эканоміку і каб праходзілі сумленныя выбары, лічыць крымінальным парушэньнем, то я сапраўды вінаватая і прызнаю сваю віну».



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ANDREJ SANNIKAU

Kandydat na prezydenta w wyborach w 2010 r., koordynator kampanii obywatelskiej „Europejska Białoruś".

Urodził się 8 marca 1954 r. w Mińsku. Wnuk Konstantina Sannikaua – białoruskiego reżysera, artysty ludowego, jednego z założycieli Teatru Narodowego im. Janki Kupały.

W 1977 r. ukończył Miński Państwowy Pedagogiczny Instytut Języków Obcych.

W 1989 r. ukończył studia w Akademii Dyplomatycznej Ministerstwa Spraw Zagranicznych ZSRR w Moskwie. Poza rodzimymi językami – białoruskim i rosyjskim, zna jeszcze biegle francuski i angielski.

W latach 1982–1987, pracował w Sekretariacie ONZ w Nowym Jorku. W latach 1992–1995 stał na czele delegacji białoruskiej podczas rozmów na temat rozbrojenia nuklearnego i konwencjonalnego, miał prawo do podpisywania dokumentów w imieniu głowy państwa.

W latach 1993–1995 pracował jako doradca Misji Dyplomatycznej Republiki Białoruś w Szwajcarii. W latach 1995–1996 pełnił funkcję wiceministra spraw zagranicznych Białorusi. Ma stopień Ambasadora Nadzwyczajnego i Pełnomocnego. W listopadzie 1996 r., w przededniu antykonstytucyjnego referendum, dzięki któremu Łukaszenka przedłużył swoją władzę, Sannikau na znak protestu podał się do dymisji.

W listopadzie 1997 r. Andrej Sannikau powołał inicjatywę „Charter'97" i stał się jej międzynarodowym koordynatorem. W 1998 r. wraz z Giennadijem Karpenko stworzył zarząd Białoruskich Sił Demokratycznych.

Był jednym z organizatorów marszów protestu „Zmiażdżymy faszystowskie robactwo!", „Tak się nie da żyć", „Za lepsze życie" i kampanii przeciw fałszerstwom wyborczym w 2001, 2004, 2006 i 2008 r.

W 2008 r., wraz z Wiktorem Iwaszkiewiczem, Michaiłem Maryniczem i innymi politykami, rozpoczął kampanię obywatelską „Europejska Białoruś", której celem jest przystąpienie Białorusi do UE.

W latach 1998–2002 był rektorem Uniwersytetu Ludowego przy Społecznym Centrum Naukowo-Analitycznym.

W 2005 r. został laureatem międzynarodowej nagrody im. Brunona Kreisky'ego, za walkę w obronie praw człowieka.

Jest żonaty i ma dwóch synów. Żona – znana białoruska dziennikarka, korespondentka rosyjskiej „Nowej Gazety", Irina Chalip, została również skazana za udział w wydarzeniach w grudniu 2010 r.

KRONIKA REPRESJI

19 grudnia 2010 r. podczas pokojowej demonstracji przeciwko fałszerstwom wyborczym, Sannikau został brutalnie pobity i umieszczony w areszcie KGB. Podczas dochodzenia, rodzinę Sannikaua poddano dużej presji. Żona polityka została aresztowana, władze usiłowały uprowadzić ich trzyletniego syna Dannika z przedszkola. Grożono także, że malec zostanie umieszczony w sierocińcu.

14 maja 2011 r. Sannikau został skazany na pięć lat pozbawienia wolności w więzieniu o zaostrzonym rygorze za organizację „masowych zamieszek".

Odsiadywał wyrok w więzieniu w Nowopołocku, a następnie 29 września 2011 r. został przeniesiony do Kolonii nr 2 w Bobrujsku, gdzie był przetrzymywany w izolatce.

W listopadzie 2011 r. Sannikau został przeniesiony z Bobrujska do kolonii niedaleko Witebska – „Witba-3".

Według polityka, władze wielokrotnie groziły mu, że zamordują jego żonę i syna. 14 kwietnia 2012 r. został przedterminowo zwolniony na mocy amnestii.

АНДРЭЙ САНЬНІКАЎ

Прэтэндэнт на пасаду прэзыдэнта Беларусі на выбарах 2010 году, каардынатар грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь».

Нарадзіўся ў Менску 8 сакавіка 1954 году. Унук Канстанціна Саньнікава – беларускага рэжысэра, народнага артыста БССР, аднаго з заснавальнікаў Нацыянальнага Купалаўскага тэатра.

У 1971 годзе Андрэй Саньнікаў скончыў 42-ю менскую школу, у 1977 – перакладчыцкі факультэт Менскага Дзяржаўнага інстытуту замежных моваў. Працаваў у Пакістане і Эгіпце ў нафтавай кампаніі і на будаўніцтве алюмініевага заводу, у таварыстве Дружбы з замежнымі краінамі (у 1980–1981 гадах).

У 1989 годзе скончыў Дыпляматычную акадэмію Міністэрства замежных справаў СССР у Маскве. Акрамя роднай беларускай, свабодна валодае рускай і дзьвюма замежнымі мовамі (ангельскай і францускай).

У 1982–1987 гадах працаваў у Нью-Ёрку ў сакратарыяце ААН. У 1992–1995 гг. узначальваў беларускую дэлегацыю на перамовах па звычайным і ядзерным раззбраеньні з правам подпісу ад імя краіны.

У 1993–1995 гадах Андрэй Саньнікаў працаваў дарадцам прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь у Швайцарыі. У 1995–1996 гадах займаў пасаду намесьніка міністра замежных справаў Беларусі. Мае ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла. У лістападзе 1996 г., напярэдадні антыканстытуцыйнага рэфэрэндуму, з дапамогай якога Лукашэнка ўзурпаваў уладу, падаў у адстаўку ў знак пратэсту.

У лістападзе 1997 г. Андрэй Саньнікаў выступіў ініцыятарам стварэньня «Хартыі'97», стаў міжнародным каардынатарам гэтай грамадзянскай ініцыятывы. У 1998 г. разам з Генадзем Карпенкам стварыў Каардынацыйную Раду дэмакратычных сілаў Беларусі.

Андрэй Саньнікаў быў адным з арганізатараў маршаў пратэсту «Раздавім фашыстоўскую гадзіну!», «Так жыць нельга!», «За лепшае жыцьцё», акцый супраць фальсыфікацыі выбараў у 2001, 2004, 2006, 2008 гадах.

У 2008 годзе разам зь Віктарам Івашкевічам, Міхаілам Марынічам і іншымі палітыкамі стаў ініцыятарам грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь», якая ставіць сваёй мэтай ўступленьне Беларусі ў Эўразьвяз.

У 1998–2002 гг. – рэктар Народнага ўнівэрсытэту, нефармальнага адукацыйна-асьветніцкага праэкту. У 2005 г. стаў ляўрэатам міжнароднай прэміі імя Бруна Крайскага ў галіне абароны правоў чалавека.

Жанаты, мае двух сыноў. Жонка – вядомая беларуская журналістка, карэспандэнт расейскай «Новой газеты» Ірына Халіп, таксама асуджаная за Плошчу-2010.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

19 сьнежня 2010 г. затрыманы падчас мірнай маніфэстацыі супраць фальсыфікацыі выбараў. Пры гэтым жорстка зьбіты (была пашкоджаная нага) і зьмешчаны пад варту ў СІЗА КДБ. Падчас сьледзтва сям'я Саньнікава зазнала моцны ціск. Жонка палітыка таксама была арыштаваная, а трохгадовага сына Даніка ўлады спрабавалі выкрасьці зь дзіцячага садку і адправіць у дзіцячы дом.

14 траўня 2011 г. асуджаны на 5 гадоў зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму за арганізацыю «масавых беспарадкаў».

Адбываў пакараньне ў Наваполацкай калёніі, затым 29 верасьня 2011 г. быў этапаваны ў калёнію № 2 г. Бабруйску, дзе яго трымалі ў ШІЗА. Прычынай пераводу сталі, па словах адміністрацыі, публікацыі ў СМІ жонкі палітвязьня – журналісткі Ірыны Халіп. Некаторы час месцазнаходжаньне Андрэя Саньнікава было абсалютна невядомым, але 17 лістапада высьветлілася, што этап у Бабруйск пралягае праз турму г. Магілёва.

Пасьля Бабруйску напрыканцы лістападу 2011 г. Саньнікава перавялі ў калёнію пад Віцебскам – «Віцьба-3». Некаторы час перабываў таксама ў Віцебскім СІЗА.

Па словах палітыка і ягоных сваякоў, некалькі разоў прадстаўнікі ўладаў пагражалі Саньнікаву забойствам яго самога, а таксама ягонай жонкі і сына.

14 красавіка 2012 г. Андрэй Саньнікаў быў вызвалены паводле ўказу аб памілаваньні, пад ціскам санкцый ЭЗ і ЗША.

NIKITA SASIM



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Nikita Sasim urodził się w Baranowiczach, w obwodzie brzeskim. Po ukończeniu szkoły uczył się w Kolegium Przemysłu Lekkiego. Był członkiem ruchu „Żubr". Po tym, jak oddział Białoruskiego Republikańskiego Związku Młodzieży, któremu przewodniczył Sasim, przyłączył się do ruchu „Żubr", Nikita po raz pierwszy został skazany na 10 dni aresztu za rozpowszechnianie niezależnych gazet. Po miesiącu, w maju 2004 r., został relegowany z kolegium. Za udział w akcjach był wielokrotnie skazywany na areszty administracyjne. 16 września 2005 r. został pobity w Mińsku przez omonowców podczas akcji organizacji „Pamiętamy!". Skończyło się urazem głowy i pobytem w szpitalu.

W latach 2001–2002 był jednym z obrońców Kuropat, przez które władze w tym czasie miały zamiar poprowadzić drogę. W latach 2005–2006 brał udział w młodzieżowej akcji „Jeans".

Kiedy podczas jednej z akcji omonowcy zabrali Nikicie Sasimowi białoruską flagę narodową, zawiesił na kiju swoją dżinsową koszulę, co stało się symbolem nadziei na przemiany.

KRONIKA REPRESJI

W 2005 r. przeciwko Sasimowi wszczęto sprawę karną. Funkcjonariusze milicji zatrzymali go 8 stycznia i oskarżyli o to, że napisał na budynkach wzdłuż Prospektu Franciszka Skoriny i ulicy Wołodarskiego w Mińsku hasła „Wolność dla Marinicza!". Po zatrzymaniu spędził w areszcie tymczasowym 3 dni, po czym przedstawiono mu zarzuty z artykułu 218, pkt 1 KK – „Umyślne zniszczenie lub uszkodzenie mienia". 5 kwietnia 2005 r. sprawa została zakończona z powodu małej szkodliwości czynu.

14 marca 2006 r. Nikita Sasim został zatrzymany w Mińsku i oskarżony o uchylanie się od obowiązku służby wojskowej. Na proces czekał dwa miesiące w areszcie śledczym w Baranowiczach. 12 maja 2006 r. został skazany na 3 miesiące aresztu. Po zwolnieniu kilkakrotnie próbowano go zwerbować do wojska. Z tego powodu Sasim opuścił Białoruś.

МІКІТА САСІМ

Калі на адной з акцыяў амапаўцы адабралі ў Мікіты Сасіма нацыянальны беларускі сьцяг, ён падвесіў на вуду зьнятую зь сябе джынсавую кашулю, якая стала новым сымбалем супраціву.

Мікіта Сасім нарадзіўся ў г. Баранавічы Берасьцейскай вобласьці. Пасьля школы вучыўся ў каледжы лёгкай прамысловасьці, дзе некаторы час зьяўляўся старшынём суполкі БРСМ (якая пазьней у поўным складзе на добраахвотнай аснове далучылася да моладзевага руху «Зубр»). Праз некалькі дзён пасьля зьвязанага з гэтым скандалам у каледжы Мікіта першы раз быў асуджаны на 10 сутак за распаўсюд незалежных выданьняў. Прыкладна праз месяц, у траўні 2004 быў выключаны з каледжу.

У далейшым малады чалавек неаднаразова караўся адміністратыўнымі арыштамі за ўдзел у апазыцыйных акцыях. 16 верасьня 2005 г. на акцыі «Мы памятаем!» у Менску быў зьбіты АМАПаўцамі і патрапіў у шпіталь з чэрапна-мазгавой траўмай.

У 2001–2002 гг. быў адным з абаронцаў Курапатаў – мэмарыялу сталінскіх рэпрэсій пад Менскам, праз які ўлады ў той час намераваліся пракласьці аўтатрасу. У 2005–2006 гг. браў удзел у моладзевай кампаніі «Джынс».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2005 годзе супраць Мікіты Сасіма была ўзбуджаная крымінальная справа. Ён быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі 8 студзеня і абвінавачаны ў тым, што зрабіў графіці «Свабоду Марынічу» на будынках па праспекце Францыска Сакрыны і вуліцы Валадарскага ў Менску. Пасьля затрыманьня трое сутак знаходзіўся ў ізалятары часовага ўтрыманьня, пасьля чаго яму было прад'яўленае абвінавачаньне па ч. 1 арт. 218 Крымінальнага кодэксу (наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці). 5 красавіка 2005 г. справа была спыненая з прычыны нязначнасьці нанесенай шкоды.

14 сакавіка 2006 г. Мікіта Сасім быў затрыманы ў Менску і абвінавачаны ва ўхіленьні ад прызыву на вайсковую службу. Да суду два месяцы знаходзіўся ў сьледчым ізалятары ў Баранавічах. 12 траўня 2006 г. быў асуджаны да трох месяцаў арышту. Пасьля вызваленьня, нягледзячы на судзімасьць, яго некалькі разоў спрабавалі забраць у войска. Праз гэта Мікіта Сасім пакінуў Рэспубліку Беларусь.

JEWGIENIJ SEKRIET


FOT. SIARHIEJ HUDZILIN

Jewgienij Sekriet urodził się 3 października 1966 r. w Mińsku. Po ukończeniu Szkoły nr 110 służył w wojsku. Ukończył leśnictwo w Instytucie Technologicznym im. Kirowa w Mińsku (obecnie Białoruski Państwowy Uniwersytet Technologiczny). Pasjonuje się projektowaniem krajobrazu. Zajmuje się tym zawodowo. Kolejną jego pasją jest literatura. Sekriet jest autorem wierszy i prozy, jego utwory były publikowane w periodykach. Nie ma informacji na temat tego, czy należał do jakichś partii czy ruchów, natomiast nie krył nigdy swoich poglądów demokratycznych. Podczas wyborów prezydenckich 2010 r. został członkiem sztabu Andreja Sannikaua.

KRONIKA REPRESJI

Sekriet został zatrzymany 19 grudnia 2010 roku po akcji protestu w Mińsku. Za udział w niej został skazany na 10 dni aresztu. Karę odbył, ale wkrótce (17 stycznia) doszło do kolejnego aresztowania. Bliscy zaczęli szukać Jewgienija Sekrieta, kiedy nie wrócił na noc. Po trzech dniach do mieszkania przyszli funkcjonariusze struktur siłowych i przeprowadzili rewizję. Przedstawiono mu zarzuty o udział w masowych zamieszkach (art. 293 KK). Był przetrzymywany w areszcie na Wołodarce. 12 maja sąd w Mińsku skazał go na 3 lata pozbawienia wolności. Karę odbywał w Kolonii nr 15 niedaleko Mohylewa. 11 sierpnia 2011 r. został ułaskawiony na mocy dekretu Łukaszenki.

ЯЎГЕН САКРЭТ

Нарадзіўся ў Менску 3 кастрычніка 1966 году. Пасьля сканчэньня сярэдняй школы № 110 служыў у войску. Выпускнік лесагаспадарчага факультэту тэхналягічнага інстытуту імя Кірава ў Менску (зараз – Беларускі дзяржаўны тэхналягічны ўнівэрсытэт). Захапляецца ландшафтным дызайнам, якім стаў займацца прафэсійна, скончыўшы адпаведныя курсы. Яшчэ адно яго захапленьне – літаратура. Яўген сам зьяўляецца аўтарам вершаў і прозы, яго творы друкаваліся ў пэрыядычных выданьнях. Зьвестак пра яго сяброўства ў партыях ці рухах няма, але гэта чалавек, які ніколі не хаваў сваіх дэмакратычных поглядаў. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2010 году быў сябрам ініцыятыўнай групы Андрэя Саньнікава.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы 19 сьнежня 2010 г. пасьля акцыі пратэсту ў Менску, за ўдзел у якой адбыў 10-суткавы арышт. Паўторнае затрыманьне адбылося, калі ён выйшаў на волю, 17 студзеня 2011 г. Родныя пачалі шукаць Яўгена, калі ён без папярэджаньня не прыйшоў начаваць. Праз тры дні ў іх дом прыйшлі сілавікі зь ператрусам. Яўгену прад'явілі абвінавачаньне ва ўдзеле ў масавых беспарадках па арт. 293 КК РБ.

Утрымліваўся пад вартай у менскім СІЗА па вул. Валадарскага.

12 траўня 2011 г. у судзе Маскоўскага раёну Менску асуджаны на 3 гады зьняволеньня. Тэрмін пакараньня адбываў у калёніі № 15 побач з Магілёвам.

Памілаваны Лукашэнкам і вызвалены 11 жніўня 2011 г.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

IVAN SHYLA

Ivan Shyla urodził się 25 listopada 1990 r. w Soligorsku w obwodzie mińskim. Będąc jeszcze w liceum, wstąpił do organizacji „Młody Front". Razem z ojcem Uladzimirem i bratem Ilyą był uczestnikiem „Placu Kalinowskiego" w Mińsku w 2006 r. Wszyscy trzej zostali zatrzymani na 24 godziny.

KRONIKA REPRESJI

Sprawę karną przeciwko nieletniemu działaczowi „Młodego Frontu" z Soligorska wszczął prokurator Obwodu Mińskiego 10 maja 2007 r. na podstawie art. 193, pkt 1 KK – „Działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji społecznej, religijnej czy fundacji albo udział w ich działalności". Ivan Shyla usłyszał następujące zarzuty: „Pomimo świadomości, że Ministerstwo Sprawiedliwości dnia 26 listopada 2006 r. odmówiło rejestracji organizacji «Młody Front» ze względu na jej nielegalną działalność, kierował w Soligorsku jednostką strukturalną pozarządowej organizacji «Młody Front» w celu osiągnięcia celów zawartych w jej konstytucji, a także brał czynny udział w jej rozwoju".

4 września 2007 r. Sąd Rejonowy w Soligorsku rozpatrzył sprawę Ivana Shyli w trakcie jawnego procesu sądowego. Sędzia W. Lapin uznał oskarżonego Ivana Shylę winnym zarzucanego mu czynu, za który na podstawie art. 193 KK RB sąd postanowił ukarać go pouczeniem.

Ivan Shyla był uczestnikiem „miasteczka namiotowego" – akcji protestu przeciwko fałszerstwom podczas wyborów prezydenckich 2006 r. na Placu Kalinowskiego w Mińsku, za co z bratem i ojcem zostali aresztowani. W lutym 2012 r. Iwan został zatrzymany na 22 dni za akcję solidarności z bezpodstawnie aresztowanym Dzmitrijem Daszkiewiczem, liderem „Młodego Frontu" oraz za udział w demonstracji przed kolonią karną w Gorkach i w milczącym proteście w Soligorsku.

W chwili obecnej Ivan mieszka w Polsce. W 2008 r. za działalność społeczną został wydalony z 11 klasy Szkoły Średniej nr 4 w Soligorsku. Zdarzenie to miało miejsce w czasie egzaminów końcowych, gdy Ivanowi pozostał do zdania tylko egzamin z języka angielskiego. Dyrektor szkoły, Olga Sieńkowa, na znak protestu odeszła ze szkoły.

ІВАН ШЫЛА

Моладзевы актывіст Іван Шыла нарадзіўся ў г. Салігорску Менскай вобласьці 25 лістапада 1990 году. Яшчэ падчас навучаньня ў сярэдняй школе ўступіў у «Малады Фронт». Быў (разам з бацькам Уладзімерам і братам Ільлём) удзельнікам намётавага мястэчка на Плошчы Каліноўскага ў Менску ў 2006 г. – за гэта ўсе трое патрапілі ў Жодзінскі СІЗА і былі асуджаныя на «суткі».

Пасьля сканчэньня школы ў Салігорску паступіў ва ўнівэрсытэт у Польшчы, пасьпяхова абараніў дыплём бакаляўра і працягвае адукацыю.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Крымінальная справа ў дачыненьні да непаўнагадовага Івана была ўзбуджаная 10 траўня 2007 г. пракуратурай Менскай вобласьці па арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя дзейнасьці аб'яднаньня, фонду ці рэлігійнай арганізацыі, якая не прайшла дзяржаўнай рэгістрацыі, ці ўдзел у ёй).

Іван Шыла абвінавачваўся ў тым, што «дакладна ведаючы аб тым, што Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь моладзеваму грамадзкаму аб'яднаньню «Малады Фронт» адмоўлена ў дзяржаўнай рэгістрацыі, з 26 лістапада 2006 году ажыцьцяўляў незаконную арганізацыю дзейнасьці дадзенага аб'яднаньня і ўдзельнічаў у яго дзейнасьці пры наступных абставінах. Так, ён, зьяўляючыся кіраўніком структурнага падразьдзяленьня (суполкі) моладзевага грамадзкага аб'яднаньня «Малады Фронт» у г. Салігорску Менскай вобласьці і яго актывістам, для дасягненьня мэтаў, вызначаных статутам аб'яднаньня, прымаў актыўны ўдзел у мерапрыемствах аб'яднаньня, шэраг якіх былі арганізаваныя зь ягоным непасрэдным удзелам:

па месцы свайго жыхарства не пазьней 11 траўня 2007 г. з дапамогай кампутарнай тэхнікі склаў і вырабіў ад імя аб'яднаньня «Малады Фронт» брашуры з назвай «Свабоду палітычным вязьням» з указаньнем нумару свайго мабільнага тэлефону з мэтай уцягваньня ў аб'яднаньне новых сяброў і распаўсюджваў указаныя брашуры сярод жыхароў гораду Салігорску;

па месцы свайго жыхарства 30 траўня 2007 г. склаў «План дзейнасьці Салігорскага «Маладога Фронту» на чэрвень-сьнежань 2007 г.»;

на цэнтральнай плошчы ў г. Салігорску Менскай вобласьці 20 студзеня 2007 г. каля 16 гадзінаў арганізаваў і правёў пікет ад імя МГА «Малады Фронт», дэманструючы плакат «Свабоду Дашкевічу».

4 верасьня суд Салігорскага раёну з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы пракурора А. І. Чарнышэвіча разгледзеў крымінальную справу адносна Івана Шылы ў адкрытым судовым паседжаньні. Судзьдзя В. Н. Лапіна прызнала моладзевага актывіста вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства, прадугледжанага арт. 193.1 КК Рэспублікі Беларусь, і вынесла Івану Шылу судовую перасьцярогу.

Іван Шыла быў удзельнікам «Плошчы Каліноўскага» – пратэсту ў Менску пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у сакавіку 2006 г. Быў затрыманы, асуджаны на адміністратыўны арышт, які адбываў у Жодзінскім СІЗА разам з бацькам і братам. У лютым 2012 г. адбыў 22 дні арышту за пікет у падтрымку зьняволенага Зьмітра Дашкевіча і ўдзел у летніх «маўклівых рэвалюцыях».

У 2008 г. за актыўную грамадзкую дзейнасьць Івана выключылі з 11-й клясы сярэдняй школы № 4 г. Салігорску. Гэта было зроблена ў часе выпускных іспытаў, калі яму заставалася здаць адзін іспыт па ангельскай мове. У знак пратэсту супраць такога загаду звольнілася дырэктарка школы Вольга Сянькова.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ULADZIMIR SIARHIEJEU

Uladzimir Siarhiejeu to działacz „Młodego Frontu", jeden z oskarżonych w „Sprawie czternastu" z 2008 r. Uczył się w Mińsku w Gimnazjum nr 24 o profilu językowym, w Kolegium Budowy Maszyn, a także studiował zaocznie na Wydziale Prawa Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Od pierwszych lat kolegium brał udział w różnych akcjach opozycji.

KRONIKA REPRESJI

Kilka razy był zatrzymywany w czasie akcji opozycyjnych. W 2006 r. został skazany za udział w akcji solidarności z Aleksandrem Kazulinem.

10 stycznia 2008 r. po udziale w akcji solidarności z przedsiębiorcami, Siarhiejeu został zatrzymany i aresztowany na 15 dni z artykułu 23, pkt 34 KA RB – „Naruszenie porządku organizacji i przeprowadzenia imprez masowych". Później przedstawiono mu zarzuty z artykułu 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w grupowych działaniach, w poważny sposób naruszających porządek społeczny".

22 kwietnia 2008 r. w „Sprawie czternastu" został wydany wyrok. Uladzimir Siarhiejeu został skazany na karę grzywny w wysokości 100 płac minimalnych (3 mln 500 tys. rubli). Jeszcze przed uprawomocnieniem się wyroku władze starały się wcielić Siarhiejeua do wojska.

УЛАДЗІМЕР СЯРГЕЕЎ

Уладзімер Сяргееў – актывіст «Маладога Фронту», адзін зь фігурантаў крымінальнай «справы 14-ці» 2008 году.

Вучыўся ў 24-й гімназіі Менску з паглыбленым вывучэньнем замежных моваў, у машынабудаўнічым каледжы, на завочным аддзяленьні гістарычнага факультэту БДУ. Зь першых курсаў каледжу пачаў удзельнічаць у розных акцыях апазыцыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Некалькі разоў затрымліваўся падчас акцыяў апазыцыі, у прыватнасьці, быў асуджаны па адміністратыўнай справе ў 2006 годзе за ўдзел у акцыі салідарнасьці са зьняволеным у той час Аляксандрам Казуліным. Гэта было не апошняе пакараньне актывіста за яго палітычныя погляды.

Пасьля ўдзелу ў акцыі ў падтрымку прадпрымальнікаў 10 студзеня 2008 г. у Менску Уладзімер Сяргееў быў затрыманы і арыштаваны на 15 сутак па арт. 23:34 КаАП – «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў». Затым яму было прад'яўленае абвінавачваньне па па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэксу РБ – «арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак».

22 красавіка 2008 г. судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Алена Ільіна прызнала маладзевага актывіста Ўладзімера Сяргеева вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ («арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак») і вынесла пакараньне ў выглядзе штрафу ў памеры 100 базавых велічыняў (3 млн. 500 тыс. руб). Калі прысуд яшчэ не пасьпеў па тэрміну ўступіць у законную сілу, Уладзімера Сяргеева спрабавалі забраць на тэрміновую службу ў войска.

WALERIJ SIEDOW

Walerij Siedow to białoruski działacz, znany ze swojego udziału w akcjach protestu na przełomie lat 80. i 90. Urodził się w Gruzji w latach 60. w rosyjskiej rodzinie, jego dziadek pochodził z rodu Kozaków, których Katarzyna II wysłała na Kaukaz.

Siedow był współpracownikiem gazety „Nowosti Wozrożdienia" („Aktualności Renesansu"), pracował w Instytucie Filozofii Akademii Nauk, robił doktorat. Kiedy w 1989 r. powstał Białoruski Front Ludowy, Siedow wstąpił do niego. Wkrótce został członkiem Zarządu BFL. Siedowa nazywa się ostatnim dysydentem ZSRR.

KRONIKA REPRESJI

7 listopada 1990 r. Siedow brał udział w antykomunistycznym mityngu, został zatrzymany i umieszczony na Wołodarce. Sprawa karna przeciwko niemu została wszczęta w związku z tym, że podczas mityngu Siedow wszedł na pomnik Lenina przed budynkiem parlamentu i wywiesił na nim antykomunistyczny symbol – krzyż owinięty drutem kolczastym, na którym wisiała kurtka więźnia politycznego z Gułagu. Siedow postawił ten krzyż „w imieniu dziesiątków milionów represjonowanych osób, w tym i Białorusinów" (cytat z wywiadu Siedowa dla Radia Swaboda).



FOT. VYTOKI.NET

Walerij Siedow był pierwszą osobą, która ogłosiła na Białorusi polityczny protest głodowy. W areszcie spędził 70 dni, przez 32 dni prowadził głodówkę.

Po 20 latach ponownie wrócił do polityki i działalności opozycyjnej. 20 stycznia 2011 r. wyszedł na pikietę solidarności z więźniami politycznymi, skazanymi za udział w demonstracji na Placu Niepodległości 19 grudnia 2010 r. Za to, że trzymał w rękach ikonę i portret Mykoły Statkiewicza został skazany na 12 dni aresztu.

ВАЛЕР СЯДОЎ

Валер Сядоў – беларускі актывіст, вядомы сваім удзелам у акцыях пратэсту яшчэ з канца 80-х – пачатку 90-х гадоў XX стагодзьдзя. Гэтага чалавека часам называюць апошнім дысыдэнтам СССР. Нарадзіўся ў Грузіі ў 1960-я гады ў расейскай сям'і, ягоны дзед паходзіў з казакоў, высланых на Каўказ імпэратрыцай Кацярынай II.

Валер Сядоў быў супрацоўнікам газэты «Навіны Адраджэньня», працаваў у Інстытуце філязофіі Акадэміі навук, вучыўся ў асьпірантуры. Калі ў 1989 годзе ўтварыўся Беларускі Народны Фронт, Сядоў стаў сябрам арганізацыі. Неўзабаве быў абраны сябрам Управы БНФ.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

7 лістапада 1990 году Валер Сядоў удзельнічаў у антыкамуністычным мітынгу, праз паўгода яго затрымалі і пасадзілі на «Валадарку». Крымінальная справа была заведзеная па эпізодзе, калі падчас мітынгу Сядоў узьлез на помнік Леніну перад будынкам парлямэнту і вывесіў там антыкамуністычны сымбаль: абвязаны калючым дротам крыж, на які была апранутая душагрэйка зэка ГУЛАГу. Ён усталяваў гэты знак «ад імя дзясяткаў мільёнаў рэпрэсаваных, і беларусаў у тым ліку» (цытата зь інтэрвію В. Сядова «Радыё Свабода»).

Менавіта Валер Сядоў быў першым, хто абвесьціў у Беларусі палітычную галадоўку. У СІЗА ён правёў 70 дзён, амаль палову зь якіх – 32 дні – галадаў.

Роўна праз 20 гадоў ён ізноў вярнуўся ў вулічную палітыку. 20 студзеня 2011 г. Валер Сядоў выйшаў да менскага Чырвонага касьцёлу на пікет салідарнасьці з палітвязьнямі, якіх пасьля разгону Плошчы 19 сьнежня 2010 было мноства. За тое, што трымаў у руках ікону і партрэт Міколы Статкевіча, дысыдэнт-ветэран быў асуджаны на 12 сутак арышту.

PAWEŁ SIEWIARYNIEC


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Paweł Siewiaryniec jest działaczem społecznym, członkiem rady Białoruskiego Stowarzyszenia Dziennikarzy. Urodził się 30 grudnia 1976 r. w Orszy. Ukończył z wyróżnieniem Szkołę Plastyczną nr 25. Zainteresował się polityką, kiedy w x. klasie został wybrany do Dziecięcego Parlamentu Republikańskiego. Interesował się geografią i geologią.

Ukończył geografię na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. W latach 1994–1999 pracował jako dziennikarz w kilku komercyjnych gazetach. Od 1998 r. pracuje jako publicysta w niezależnej prasie. Jest laureatem nagrody im. Alesia Adamowicza i nagrody im. Wasilija Bykowa „Za wolność myśli".

W latach 1999–2003 był wiceprzewodniczącym partii Białoruski Front Ludowy, w latach 1999–2004 przewodniczącym „Młodego Frontu". Obecnie jest przewodniczącym komitetu organizacyjnego Białoruskiej Chrześcijańskiej Demokracji (BCHD).

KRONIKA REPRESJI

Po raz pierwszy Paweł Siewiaryniec został skazany 31 maja 2005 r. na 3 lata tzw. „chemii" za organizację masowych protestów na Placu Październikowym w 2004 roku, kiedy to Łukaszenka przeprowadził nielegalne referendum i zalegalizował swoją trzecią kadencję prezydencką. Siewiaryniec został uznany winnym złamania artykułu 342 KK RB – „Organizacja i przygotowanie działań, które w poważny sposób naruszają porządek publiczny i udział w nich"). Karę odbywał we wsi Małoje Sitno w obwodzie witebskim, przy granicy z Rosją, gdzie pracował przy wyrębie lasu.

Na mocy ustawy o amnestii z 5 maja 2007 roku, wyrok dla Pawła Siewiaryńca został skrócony do 1 roku. 22 maja 2007 r. Siewiaryniec został warunkowo zwolniony. Tym samym karę zmniejszono jeszcze dodatkowo o 2 miesiące i 24 dni.

Opozycjonista był członkiem sztabu kandydata na prezydenta z ramienia BCHD, Witala Rymaszeuskiego. Został aresztowany po demonstracji opozycyjnej po wyborach prezydenckich w grudniu 2010 r.

W nocy z 19 na 20 grudnia 2010 roku, po kilku godzinach od pacyfikacji pokojowej demonstracji na mińskim Placu Niepodległości, Paweł Siewiaryniec został aresztowany i przewieziony do aresztu śledczego KGB. Pod koniec grudnia 2010 roku przedstawiono mu zarzut z artykułu 293, pkt 1 i 2 KK – „Masowe zamieszki". 4 kwietnia 2011 roku przedstawiono mu nowy zarzut z artykułu 342 KK – „Działania w poważny sposób naruszające porządek publiczny").

16 maja 2011 r. Siewiaryniec został skazany przez Sąd Zawodski w Mińsku na 3 lata ograniczenia wolności (3 lata tzw. „chemii"). Odbywał karę w gospodarstwie rolnym w Kuplinach, w obwodzie brzeskim. 19 października 2013 r. został uwolniony.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Грамадзкі актывіст, сябра Рады ГА «БАЖ». Нарадзіўся 30 сьнежня 1976 г. у Воршы. Скончыў з залатым мэдалём віцебскую школу № 25 (з мастацкім ухілам). Пачаткам цікавасьці да палітыкі стала ягонае абраньне ў 10-й клясе школы ў Дзіцячы рэспубліканскі парлямэнт. Захапляўся геаграфіяй і геалёгіяй.

Скончыў геафак БДУ. У 1994–1999г. працаваў журналістам у шэрагу недзяржаўных выданьняў. З 1998 г. друкуецца ў незалежнай прэсе як публіцыст. Ляўрэат літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча і прэміі імя Васіля Быкава «За свабоду думкі».

У 1999–2003 гг. быў намесьнікам старшыні Партыі БНФ, з 1999 да 2004 гг. – старшынём «Маладога Фронту». Зараз зьяўляецца сустаршынём аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Першы раз Павал Севярынец быў асуджаны 31 траўня 2005 году судом Цэнтральнага раёну Менску на 3 гады «хіміі» – за арганізацыю масавых пратэстаў на Кастрычніцкай плошчы ў 2004 годзе, калі Лукашэнка правёў незаконны рэфэрэндум і легалізаваў свой трэці тэрмін прэзыдэнцтва. Паўла прызналі вінаватым у парушэньні арт. 342 КК Рэспублікі Беларусь (арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, альбо ўдзел у іх). Тэрмін пакараньня адбываў у вёсцы Малое Сітна на Віцебшчыне, на мяжы з Расеяй, працаваў на высечцы лесу.

Паводле закону аб амністыі ад 5 траўня 2007 г., тэрмін зьняволеньня Паўлу быў скарочаны на 1 год. 22 траўня 2007 г. ён быў умоўна-датэрмінова вызвалены, і тэрмін скарацііўся яшчэ на 2 месяцы і 24 дні.

У часе прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. Павал быў актывістам штабу кандыдата ў прэзыдэнты ад ствараемай партыі БХД Віталя Рымашэўскага.

У ноч на 20 сьнежня 2010 г., праз некалькі гадзінаў пасьля разгону акцыі пратэсту на менскай Плошчы Незалежнасьці, Павал Севярынец быў арыштаваны дома і зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Пры канцы сьнежня 2010 г. яму прад'яўленае абвінавачаньне па крымінальнай справе, узбуджанай сьледчым упраўленьнем папярэдняга рассьледаваньня ГУУС Менгарвыканкаму па чч. 1 і 2 арт. 293 КК (масавыя беспарадкі). 4 красавіка 2011 г. замест гэтага было прад'яўленае іншае абвінавачаньне – па ч. 1 арт. 342 КК (дзеяньні, што груба парушаюць грамадзкі парадак).

16 траўня 2011 г. у судзе Заводскага раёну Менску П. Севярынец асуджаны на 3 гады «хіміі».

Адбываў пакараньне ў вёсцы Куплін Пружанскага раёну Берасьцейскай вобласьці. Працаваў у фэрмэрскай гаспадарцы каля спэцкамэндатуры.

У зьняволеньні, як і ў першы раз, Павал Севярынец працягвае публіцыстычную дзейнасьць – піша артыкулы і нарысы ў газэту «Наша Ніва».

У ноч на 19 кастрычніка 2013 года Паўла Севярынца вызвалілі. Каб не дапусьціць сустрэчы палітвязьня роднымі, сябрамі і журналістамі ля брамы спэцкамэндатуры, адміністрацыя папраўчай установы ўночы вывезла яго да станцыі і пасадзіла на цягнік, які ідзе да Менску.

PAWEŁ SILIWONCZIK

Paweł Siliwonczik to działacz „Białego Legionu". Urodził się w 1980 r. 31 sierpnia 1998 r. został skazany przez sąd w Mińsku razem z Igorem Korsakiem. Miał wtedy 18 lat.

KRONIKA REPRESJI

Obaj oskarżeni zostali zatrzymani przez funkcjonariuszy milicji 2 czerwca 1998 roku, o 5:00 rano, kiedy rozklejali na osiedlu Sieriebrianka opozycyjne ulotki i malowali farbą symbol nieformalnej organizacji „Biały Legion". Symbol ten jest szeroko wykorzystywany w narodowej symbolice.

Po zatrzymaniu, Korsak i Siliwonczik spędzili 6 godzin na posterunku milicji. W ich mieszkaniach przeprowadzono rewizje. Po miesiącu od zatrzymania przedstawiono im zarzuty, a także otrzymali zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Początkowo ich sprawy miały charakter administracyjny, później zostały przekwalifikowane na sprawy karne.

Korsak i Siliwonczik zostali oskarżeni o popełnienie przestępstwa z artykułu 201, pkt 2 KK – „Chuligaństwo". Prokurator Słuka żądał dla oskarżonych 1 roku pozbawienia wolności w zawieszeniu. W sądzie oskarżeni przyznali się częściowo do winy. Zostali skazani na karę grzywny w wysokości 10 płac minimalnych (2,5 mln rubli białoruskich).

ПАВАЛ СІЛІВОНЧЫК

Павал Сілівончык – актывіст «Белага Легіёну», арганізацыі маладых патрыётаў і вайскоўцаў, якая існавала ў 1990-я гг. Нарадзіўся ў 1980 годзе. 31 жніўня 1998 г. асуджаны ў судзе Ленінскага раену г. Менску па крымінальнай справе разам з Ігарам Корсакам. Паўлу тады было 18 гадоў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Абодва фігуранты справы былі затрыманыя міліцэйскім патрулём 2 чэрвеня 1998 г., калі расклейвалі ў менскім мікрараёне «Серабранка» ўлёткі апазыцыйнага зьместу і малявалі фарбай эмблему нефармальнай арганізацыі «Белы легіён».

Пасьля затрыманьня І. Корсака і П. Сілівончыка напрацягу 6 гадзінаў трымалі ў РАУС Ленінскага раёну г. Менску. У іх на кватэрах былі праведзеныя ператрусы. Амаль праз месяц пасьля затрыманьня абодвум актывістам прад'явілі абвінавачваньне, былі ўзятыя падпіскі аб нявыезьдзе.Спачатку справа мела адміністратыўны характар, але падчас сьледзтва была перакваліфікаваная ў крымінальную.

І. Корсак і П. Сілівончык абвінавачваліся па артыкуле 201, ч. 2 КК РБ – «хуліганскія дзеяньні з асаблівым цынізмам і дзёрзкасьцю». Пракурор Слука прасіў пакараць Корсака і Сілівончыка адным годам пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай прысуду. У выяве «спарыша» сьледзтва ўбачыла аналёгію з фашыстоўскай свастыкай. Суду было прадстаўленае заключэньне экспэртаў-мастацтвазнаўцаў, зь якога вынікала, што знак «спарыша» зьяўляецца часткай беларускага арнамэнту. Дарэчы, гэты самы арнамэнт выкарыстаны ў аздабленьні афіцыйна прынятага пры Лукашэнку сьцягу РБ.

На судзе І. Корсак і П. Сілівончык «прызналі сваю віну часткова». Суд прыйшоў да высновы, што «знак складанай канфігурацыі чырвонага колеру», які падсудныя наносілі з дапамогай трафарэту на сьцены ў менскім раёне Серабранка, «не зьяўляецца свастыкай».

Тым ня менш, І. Корсаку і П. Сілівончыку быў вынесены прысуд – штраф у памеры 10 мінімальных заробкаў (2,5 млн. беларускіх рублёў). Трафарэт «знаку складанай канфігурацыі» і ўлёткі было вырашана зьнішчыць.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

WIACZESŁAW SIWCZYK

Wiaczesław Siwczyk urodził się 18 grudnia 1962 r. w rodzinie naukowców w Mińsku. W dzieciństwie 10 lat żył z rodzicami w Abchazji, potem rodzina wróciła na Białoruś. W 1984 r. Siwczyk ukończył geografię na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym, pewien czas pracował w Abchazji. W 1988 r. wrócił by mieszkać i pracować w swojej ojczyźnie. Pracował m.in. w Narodowej Akademii Nauk Białorusi. Zajmował się problemami ekologii i skutkami katastrofy w Czarnobylu. W 1989 r. został członkiem Białoruskiego Frontu Ludowego. Gdy 26 kwietnia 1996 r. Siwczyk został zatrzymany w Mińsku po „Czarnobylskim Szlaku", był sekretarzem Zarządu Białoruskiego Frontu Ludowego.

Wiaczesław Siwczyk i Jurij Chadyka to pierwsi więźniowie polityczni czasów poradzieckich.

KRONIKA REPRESJI

Oskarżono go o „organizację działań w poważny sposób naruszających porządek publiczny, bądź udział w nich". Sprawa karna przeciwko niemu został wszczęta wiosną 1996 r. Był przetrzymywany na Wołodarce. By uratować przed aresztowaniami innych członków BFL, rozpoczął bezterminowy protest głodowy. Pod wpływem nacisków międzynarodowej społeczności i protestów na ulicach Mińska, Siwczyk został zwolniony po 21 dniach aresztu. Wcześniej przez trzy dni przebywał na oddziale intensywnej terapii. 17 maja 1996 r. Siwczyk został zwolniony, otrzymał jednak zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Sprawa została całkowicie zamknięta dopiero po kilku latach.

Był jednym z organizatorów zamknięcia mińskiego Prospektu Franciszka Skaryny w 1998 i 1999 roku, kiedy to Łukaszenka i Jelcyn podpisali porozumienie o stworzeniu państwa związkowego. W latach 2001–2002 brał udział w obronie Kuropat.

11 stycznia 2003 r. decyzją rady BFL Siwczyk został wykluczony z partii „za działalność destrukcyjną i nie podporządkowanie się decyzjom kierownictwa". Do tego czasu zajmował w partii różne stanowiska, kierował jej młodzieżowym skrzydłem (w 1998 r. został utworzony pod przewodnictwem Pawła Siewiaryńca „Młody Front").

W Dzień Woli 2004 roku Siwczyk wraz z trzema innymi działaczami opozycji przykuli się łańcuchami do słupa na Placu Październikowym w Mińsku, protestując w ten sposób przeciwko zakazowi masowego świętowania uroczystości.

W listopadzie 2004 r. na ukraińskim Majdanie podczas Pomarańczowej Rewolucji był szefem białoruskiego oddziału.

Siwczyk zaczął tworzyć Ruch Solidarności „Razem!" i wsparł walkę przedsiębiorców o swoje prawa. W marcu 2006 roku, po wyborach prezydenckich, Siwczyk był jednym z organizatorów miasteczka namiotowego na Placu Październikowym w Mińsku (uczestnicy tej 4-dniowej akcji nazwali ją „Placem Kalinowskiego"). Siwczyk był jedynym przedstawicielem „starej" opozycji. Przez 4 doby protestował z młodzieżą. Wszyscy politycy, którzy byli by wtedy zdolni do podejmowania jakichkolwiek działań, tacy jak Siewiaryniec, Statkiewicz, Labiedźka, zostali przez władze odizolowani i znaleźli się za kratkami. Kilka godzin przed pacyfikacją miasteczka namiotowego, 23 marca ok. 20:00, służby specjalne porwały Siwczyka i całą noc przetrzymywały w autobusie, bijąc i inscenizując rozstrzelanie.

Dopiero rankiem osoby zatrzymane na Placu mogły zobaczyć pobitego Siwczyka na korytarzach Okrestiny. Trafił do szpitala, skąd po 4 dniach jego przyjaciele wywieźli go i ukryli. Wiaczesław Siwczyk wyjechał na Ukrainę. Na Białorusi odbyło się posiedzenie sądu bez jego udziału. Został na nim zaocznie skazany na 15 dni aresztu. Areszt ten odbył we wrześniu 2006 r., po powrocie z Ukrainy

W 2010 r. po pacyfikacji akcji na Placu Niepodległości w Mińsku Siwczyk opuścił Białoruś. Kieruje Białoruskim Centrum na Ukrainie. Celem tego Centrum jest organizacja akcji solidarności z więźniami politycznymi i pomoc uchodźcom politycznym z Białorusi.

ВЯЧАСЛАЎ СІЎЧЫК

Вячаслаў Сіўчык, разам зь Юрыем Хадыкам, зьяўляецца першым беларускім палітвязьнем постсавецкага пэрыяду.

Нарадзіўся ў Менску 18 сьнежня 1962 году ў сям'і навукоўцаў. У дзяцінстве каля дзесяці гадоў пражыў з бацькамі ў Абхазіі, потым сям'я вярнулася ў Беларусь. Вячаслаў фармаваўся ў асяродзьдзі, дзе немагчыма было не адчуваць сваёй нацыянальнай прыналежнасьці.

У 1984 г. скончыў геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, некаторы час працаваў у Абхазіі. У 1988 годзе вярнуўся жыць і працаваць на радзіму. Працаваў у ВА «Беларусьгеалёгія» і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Займаўся пытаньнямі экалёгіі і наступстваў Чарнобыльскай катастрофы.

У 1989 г. стаў сябрам Беларускага Народнага Фронту. На момант свайго арышту 26 красавіка 1996 г., пасьля правядзеньня ў Менску «Чарнобыльскага шляху», Вячаслаў Сіўчык быў адказным сакратаром Управы БНФ.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў абвінавачаным у межах крымінальнай справы па артыкуле «Арганізацыя дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, альбо ўдзел у іх», узбуджанай супраць БНФ увесну 1996 г. (гэта тая самая справа, калі пад пагрозай арышту і правакацый быў вымушаны эміграваць лідэр БНФ Зянон Пазьняк).

Утрымліваўся ў менскім СІЗА на вул. Валадарскага, амаль адразу абвесьціў бестэрміновую галадоўку пратэсту, каб уратаваць ад арыштаў іншых сяброў БНФ. Галадоўка працягнулася 21 дзень, да ягонага вызваленьня пад ціскам міжнароднай супольнасьці і пратэстаў на вуліцах Менску. 17 траўня 1996 г. Сіўчык быў вызвалены пад падпіску аб нявыезьдзе. Напярэдадні ён тры дні правёў у рэанімацыі. Справа была канчаткова закрытая толькі празь некалькі гадоў.

Быў арганізатарам перакрыцьця менскага праспэкту імя Францішка Скарыны ў 1998 і 1999 гадох, калі Лукашэнка і Ельцын падпісвалі пагадненьні аб стварэньні саюзнай дзяржавы. У 2001–2002 гады браў удзел у абароне Курапатаў.

11 студзеня 2003-га рашэньнем Сойму БНФ выключаны з Партыі БНФ «за дэструктыўную дзейнасьць… і непадпарадкаваньне рашэньням Сойму». Да гэтага моманту ён займаў у партыі розныя пасады і курыраваў яе моладзевае крыло (у 1998 г. аформілася ў «Малады Фронт" пад старшынствам Паўла Севярынца). Шмат разоў Вячаслаў Сіўчык мэтанакіравана затрымліваўся і быў неаднаразова моцна зьбіты, трапляў у шпіталь з траўмамі, страсеньнем мазгоў. Супраць яго былі ўчынены таксама шэраг правакацыяў.

Ініцыятар стварэньня шэрагу грамадзкіх арганізацыяў («Малады Фронт», Беларускі жаночы рух «За адраджэньне Айчыны» ды іншых).

На Дзень Волі ў 2004 г., пратэстуючы супраць забароны масавага сьвяткаваньня, Сіўчык разам з трыма іншымі актывістамі апазыцыі прыкуў сябе ланцугом да слупу на Кастрычніцкай плошчы Менску.

У лістападзе 2004 г. быў кіраўніком беларускай суполкі на ўкраінскім Майдане, у намётавым лягеры пратэстоўцаў супраць сфальсыфікаваных выбараў прэзыдэнта Ўкраіны. Усяго ва ўкраінскай Памаранчавай рэвалюцыі ўзялі ўдзел каля 200 беларускіх актывістаў.

У сярэдзіне 2000-х Вячаслаў Сіўчык пачаў ствараць Рух салідарнасьці «Разам!», падтрымаў барацьбу прадпрымальнікаў за іхнія правы.

У сакавіку 2006 г., пасьля праведзеных у няроўных для ўлады і апазыцыі ўмовах прэзыдэнцкіх выбараў, Вячаслаў Сіўчык стаў адным з арганізатараў намётавага мястэчка пратэсту на Кастрычніцкай плошчы Менска (удзельнікі 4-сутачнай акцыі далі ёй сваю назву – Плошча Каліноўскага). Гэта быў адзіны прадстаўнік пакаленьня «старой» апазыцыі, які правёў 3 дні і 4 ночы разам з пратэстуючай моладзьдзю. Усе палітыкі, здольныя ў той сітуацыі да рэальнага дзеяньня, як Севярынец, Статкевіч альбо Лябедзька, былі ізаляваныя ўладамі і знаходзіліся за кратамі. За некалькі гадзін да разгону намётавага мястэчка, прыкладна каля 20:00 23 сакавіка, спэцслужбы знайшлі спосаб выманіць Вячаслава за межы жывога ланцугу, які пратэстоўцы трымалі вакол лягеру. Яго схапілі невядомыя ў масках і ўсю ноч пратрымалі ў аўтобусе, зьбіваючы і інсцэніруючы расстрэл.

Толькі раніцай затрыманыя на Плошчы змаглі мімаходзь пабачыць зьбітага Вячаслава ў калідорах ізалятара на Акрэсьціна – твар у натхняльніка вулічных пратэстаў быў сіні ад зьбіцьця. Ён трапіў у шпіталь, адкуль праз чатыры дні проста з-пад носу варты – сілавікоў у цывільным – Сіўчыка вывезьлі і схавалі сябры (за інцыдэнт, які нібыта меў дачыненьне да гэтых уцёкаў, у сьнежні 2006 г. быў арыштаваны і правёў некалькі месяцаў у СІЗА яго брат Кастусь Лукашоў). Вячаслаў таемна зьехаў ва Ўкраіну. На радзіме тым часам яго завочна асудзілі на 15-суткавы арышт, які ён адбыў пазьней, ужо пасьля вяртаньня з Украіны ў верасьні 2006 г.

У 2006–2007 г. Сіўчык стаў на чале Мэмарыяльнай сэкцыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГК). Мэмарыяльная сэкцыя ўвекавечвала памяць аб ахвярах сталінскіх рэпрэсіяў на тэрыторыі Беларусі, аб беларускім нацыянальным супраціве таталітарным рэжымам, усталёўваючы на месцы забойстваў беларусаў памятныя крыжы. У 2009 г. кіраўнік арганізацыі Антон Астаповіч абвінаваціў Сіўчыка і ягоных паплечнікаў у палітызацыі іхняй дзейнасьці, што супярэчыць Статуту і выклікае папярэджаньні Мінюсту. Увесну 2009 г. Сіўчык быў асуджаны да адміністратыўнага арышту за ўсталяваньне памятнага крыжа ў Старадарожскім раёне Менскай вобласьці, які давялося адбываць ў ізалятары г. Старыя Дарогі ва ўмовах катаваньняў. Гэта вельмі падарвала ягонае здароўе.

У 2010 г. пасьля сьнежаньскага разгону акцыі на Плошчы Незалежнасьці ў Менску Вячаслаў Сіўчык пакінуў Беларусь. Ён стварыў і ўзначальвае Беларускі цэнтр ва Ўкраіне, адным з напрамкаў дзейнасьці якога стала правядзеньне акцый салідарнасьці зь беларускімі палітвязьнямі і дапамога палітычным уцекачам зь Беларусі. Жыве ў Польшчы.

JEWGIENIJ SKOCZKO

Jewgienij Skoczko urodził się 7 października 1976 r. w Homlu. Po ukończeniu szkoły średniej studiował na Wydziale Reżyserskim Akademii Teatralnej w Mińsku. Podczas studiów przyłączył się do młodzieżowego skrzydła Białoruskiego Frontu Ludowego, które w 1997 r. przekształciło się w organizację „Młody Front".

KRONIKA REPRESJI

25 lutego 1999 r. przeciwko zastępcy przewodniczącego „Młodego Frontu", Jewgienijowi Skoczko, wszczęto sprawę karną. Tego dnia Skoczko skończył karę 10 dni aresztu administracyjnego za udział w młodzieżowej akcji protestu „Białoruś do Europy", która miała miejsce 14 lutego.

Podczas aresztu Skoczko przez 5 dni prowadził suchą głodówkę mimo poważnych problemów ze zdrowiem (niedługo przed aresztowaniem przebywał w szpitalu, z powodu wrzodów żołądka). 23 lutego funkcjonariusze aresztu umieścili go w tzw. „tramwaju"[8]. Zdaniem Skoczko karę wymierzyli mu pijani funkcjonariusze świętujący 23 lutego Dzień Armii Radzieckiej. 25 lutego, zaraz po zwolnieniu z aresztu, Skoczko odwieziono do prokuratury na przesłuchanie. Oskarżono go o popełnienie przestępstwa z artykułu 186, pkt 3 KK RB „Organizacja i udział w grupowych działaniach, które doprowadziły do utrudnień w transporcie".

20 maja 1999 r. w mińskim sądzie rozpoczął się proces w sprawie Jewgienija Skoczko. 14 czerwca 1999 r. skazano go na rok pozbawienia wolności w zawieszeniu na 1 rok.

Po odbyciu kary wrócił do rodzinnego Homla, założył rodzinę, ma dzieci, pracuje i nie zajmuje się polityką.

8. Tramwaj – karcer. Długa ciemna cela z betonowymi ścianami, rozbitym oknem i podłogą zalaną wodą.

ЯЎГЕН СКОЧКА

Яўген Скочка нарадзіўся 7 кастрычніка 1976 г. у Гомелі. Вучыўся на рэжысэрскім аддзяленьні тэатральна-мастацкага інстытуту ў Менску. У студэнцкія гады далучыўся да моладзевага крыла БНФ, якое ў верасьні 1997 г. ператварылася ў «Малады Фронт».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

25 лютага 1999 г. супраць намесьніка старшыні «Маладога Фронту» Яўгена Скочкі была ўзбуджаная крымінальная справа. У гэты дзень Яўген быў вызвалены са спэцпрыёмніку, дзе адбываў адміністратыўны арышт за ўдзел у моладзевай акцыі «Беларусь у Эўропу».

Падчас знаходжаньня ў спэцразьмеркавальніку Яўген Скочка 5 дзён трымаў сухую галадоўку. 23 лютага супрацоўнікі спэцразьмеркавальніку зьмясьцілі маладафронтаўца ў штрафны ізалятар, у якім было выбітае вакно, а падлога залітая вадой. Па словах Скочкі, пакараньне было зьвязанае з тым, што супрацоўнікі спэцразьмеркавальніку сьвяткавалі 23 лютага – Дзень Савецкай Арміі і былі п'яныя. 25 лютага, адразу пасьля вызваленьня, Яўгена адвезьлі ў Менскую гарадзкую пракуратуру і правялі допыт. Яго абвінавачвалі у парушэньні арт. 186.3 Крымінальнага кодэксу РБ – «арганізацыя і ўдзел у групавых дзеяньнях, якія пацягнулі за сабой перашкоду працы траспарту і іншыя нязручнасьці».

20 траўня 1999 г. у Менскім гарадзскім судзе пачаўся разгляд справы Яўгена Скочкі. 14 чэрвеня 1999 г. Яўген Скочка быў асуджаны на адзін год пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай прысуду на адзін год.

У 2000-я гады вярнуўся ў родны Гомель. Цяпер Яўген шматдзетны бацька, працуе і палітыкай не займаецца.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

SIARHIEJ SKRABEC

Siarhiej Skrabec urodził się 25 października 1963 r. w Lidzie, w obwodzie grodzieńskim. Ukończył politechnikę, pracował jako technolog, a w latach 90. w przedsiębiorstwach komercyjnych. W latach 1997–2001 był dyrektorem generalnym domu handlowego „BiełBabajewskoje".

Skrabec był deputowanym Zgromadzenia Narodowego Republiki Białoruś (lata 2000–2004), przez pewien czas kierował nieformalną grupą deputowanych „Respublika". Latem 2004 r. razem z deputowanymi tej właśnie grupy – Władimirem Parfienowiczem i Walerijem Frolowym – przeprowadził protest głodowy przeciwko trzeciej kadencji Aleksandra Łukaszenki i przeciwko wniesieniu poprawek do kodeksu wyborczego. Poprzez ten protest deputowani domagali się uwolnienia więźnia politycznego, Michaiła Marinicza. Później Siarhiej Skrabec brał aktywny udział w akcjach na rzecz uwolnienia Aleksandra Kazulina i innych więźniów politycznych. Był jednym z organizatorów akcji protestu w związku z 10. rocznicą prezydentury Łukaszenki.

KRONIKA REPRESJI

15 maja 2005 r. Siarhiej Skrabec został aresztowany i oskarżony o defraudację kredytów, a w lutym 2006 r. został skazany na 2,5 roku kolonii karnej. Karę odbywał w kolonii w Witebsku, gdzie razem z Aleksandrem Kazulinem prowadził protest głodowy.

Decyzją prokuratury karę skrócono do roku. Skrabec został uwolniony 15 listopada 2006 r.

СЯРГЕЙ СКРАБЕЦ

Сяргей Скрабец нарадзіўся 25 кастрычніка 1963 г. у г. Ліда Гарадзенскай вобласьці. Скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут, працаваў інжынэрам-тэхнолягам, у 1990-х гг. – у камэрцыйных структурах, ад 1997 да 2001 г. – гэнэральным дырэктарам гандлёвага дому «Бел-Бабаеўскае».

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі 2-га скліканьня (2000–2004 гг.), дзе некаторы час узначальваў нефармальную дэпутацкую групу «Рэспубліка». Летам 2004 г. разам з дэпутатамі з гэтай групы Ўладзімірам Парфяновічам і Валерыем Фраловым правеў галадоўку пратэсту супраць трэцяга тэрміну Аляксандра Лукашэнкі і супраць унясеньня папravak у выбарчае заканадаўства, а таксама за вызваленьне палітвязьня Міхаіла Марыніча.

Пазьней Сяргей Скрабец актыўна ўдзельнічаў у грамадзкіх акцыях з патрабаваньнем вызваленьня Аляксандра Казуліна і іншых палітвязьняў. Быў адным з арганізатараў акцыі пратэсту, прымеркаванай да 10-гадзьдзя прэзыдэнцтва Лукашэнкі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

15 траўня 2005 г. Сяргей Скрабец быў арыштаваны і абвінавачаны ў вымантачваньні крэдытаў. У лютым 2006 г. асуджаны да двух з паловай гадоў папраўчай калёніі.

Адбываў пакараньне ў Віцебскай калёніі, дзе разам з Аляксандрам Казуліным трымаў галадоўку.

Рашэньнем пракуратуры тэрмін зьняволеньня Сяргея Скрабца быў скарочаны на адзін год. Вызвалены 15 лістапада 2006 году.

WŁADIMIR SOŁOWIEJ

Władimir Gieorgijewicz Sołowiej, obywatel Ukrainy, uczestnik „Czarnobylskiego Szlaku 96", urodził się w 1943 r. w miasteczku pod Saratowem w Rosji. Zawodowy wojskowy, uczestnik wojny w Afganistanie i Gruzji, likwidator skutków katastrofy w czarnobylskiej elektrowni. Od 1991 r. był jednym z przewodniczących kijowskiej organizacji UNA-UNSO.

KRONIKA REPRESJI

Został aresztowany 26 kwietnia 1996 r. w centrum Mińska podczas pacyfikacji akcji „Czarnobylski Szlak". Przewieziono go do aresztu śledczego na Wołodarce. Został oskarżony wraz z innymi obywatelami Ukrainy o „działania w poważny sposób naruszające porządek publiczny". W areszcie śledczym pozbawiono go niezbędnych mu lekarstw, co w poważny sposób wpłynęło na jego stan zdrowia. Przez pewien czas Sołowiej przebywał w celi z białoruskim więźniem politycznym, Wiaczesławem Siwczykiem, który starał się mu pomóc. W procesie Sołowiej był jedynym z dwóch oskarżonych (drugim był Szeptycki), który mówił po ukraińsku. Pod koniec sierpnia 1996 r. sąd w Mińsku skazał Sołowieja na 2,5 roku kolonii karnej. 24 grudnia 1996 r. objęła go amnestia. 22 stycznia 2007 r. zmarł w wieku 61 lat po długiej i ciężkiej chorobie. Został pochowany na cmentarzu Bajkowskim w Kijowie.

УЛАДЗІМЕР САЛАВЕЙ

Уладзімер Георгіевіч Салавей – грамадзянін Украіны, удзельнік «Чарнобыльскага Шляху-96». Нарадзіўся ў 1943 годзе ў мястэчку пад Саратавам у Расіі. Прафэсійны вайсковец, удзельнік вайны ў Аўганістане і Грузіі, ліквідатар катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Лічыў сябе ўкраінскім нацыяналістам, спачуваў беларусам. З 1991 г. быў адным з кіраўнікоў кіеўскай арганізацыі УНА-УНСО, ўзнагароджаны ордэнам гэтай арганізацыі «Пустэльны хрэст» за выбітныя заслугі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Арыштаваны 26 красавіка 1996 г. у цэнтры Менску пры разгоне акцыі «Чарнобыльскі Шлях», зьмешчаны пад варту ў менскі СІЗА «Валадарку». Абвінавачаны разам зь іншымі грамадзянамі Ўкраіны па артыкуле «Дзеяньні, якія груба парушаюць грамадзкі парадак». Быў пазбаўлены ў СІЗА неабходных яму лекаў, што вельмі моцна падарвала стан ягонага здароўя. Адзін час сядзеў у адной камэры зь беларускім палітвязьнем Вячаславам Сіўчыкам, які трымаў галадоўку, і стараўся яму дапамагчы.

На судзе быў адным з падсудных (другі – Шапціцкі), хто гаварыў па-ўкраінску.

У канцы жніўня 1996 г. асуджаны ў Менскім гарадзкім судзе на 2 гады і 6 месяцаў пазбаўленьня волі ў калёніі агульнага рэжыму. Присуд вынесены судзьдзём Рыгорам Казырыцкім пры ўдзеле ў працэсе пракурора Сяргея Целяжэвіча.

24 сьнежня 1996 г. вызвалены па амністыі, пад якую падпаў з прычыны сталага ўзросту.

22 студзеня 2007 г. на 61-м годзе памёр пасьля цяжкай і працяглай хваробы. Пахаваны на Байкавых могілках у Кіеве.

ANATOL SOROKIN

Anatol Sorokin to jeden z aktywistów skazanych za udział w Dniu Woli w Mińsku w 1997 r. Dzień Woli świętowano 23 marca. Akcje zostały brutalnie spacyfikowane przez funkcjonariuszy milicji i Specnazu. Funkcjonariusze struktur siłowych kilkakrotnie zatrzymywali marsz, który podążał w stronę Placu Jakuba Kolasy. Miński geolog Anatol Sorokin, znalazł się wśród tych nielicznych osób, które zdecydowały się, stawiać opór milicji.

KRONIKA REPRESJI

Miesiąc po akcji Anatol Sorokin został zatrzymany jako jedna z 5 osób. Proces rozpoczął się 30 października 1997 r. w Mińsku. W połowie 1997 r., Anatol Sorokin, Aleś Bondariew i Aleś Kowal zostali skazani na 2 lata prac przymusowych z potrąceniem 20 procent wypłaty na rzecz skarbu państwa. Inni oskarżeni, Ryhor Kijko i Uladzimir Łysko, otrzymali 2 lata „chemii".

АНАТОЛЬ САРОКІН

Анатоль Сарокін – адзін з асуджаных па справе Дня Волі ў Менску ў 1997 годзе. У той год сьвяткаваньне Дня Волі адбылося 23 сакавіка і вылілася ў жорсткае супрацьстаяньне міліцыі, спэцназу і ўдзельнікаў апазыцыйнай акцыі. Супрацоўнікі сілавых структураў некалькі разоў спынялі шэсьце, якое кіравалася да плошчы Якуба Коласа. Менскі геоляг Анатоль Сарокін быў сярод тых нешмат людзей, якія далі адпор міліцыі.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Прыкладна праз месяц пасьля акцыі Анатоль быў затрыманы. Усяго па дадзенай справе былі абвінавачаныя 5 чалавек.

Судовы працэс пачаўся 30 кастрычніка 1997 г. у Менскім гарадзкім судзе.

У сярэдзіне лістападу 1997 г. Анатоля Сарокіна, а таксама Алеся Бондарава і Алеся Коваля, што праходзілі па той жа самай справе, асудзілі да папраўчых работ па месцы працы з утрыманьнем 20 працэнтаў заробку на карысьць дзяржавы тэрмінам на 2 гады. Іншыя фігуранты справы, Рыгор Кійко і Ўладзімер Лыско, атрымалі па 2 гады «хіміі» ў месцах зьняволеньня.

WASILIJ STAROWOJTOW


FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Wasilij Starowojtow urodził się 13 czerwca 1924 r. we wsi Borok, w rejonie bieliniczeskim. Jeszcze przed wybuchem II wojny światowej ukończył szkołę dla położników. Nie zdążył jednak podjąć pracy – zaczęła się wojna. Po wyzwoleniu Białorusi pozostał na mohylewszczyźnie, działając w partii. Pracował na stanowiskach kierowniczych w Komunistycznym Związku Młodzieży Republiki Białoruś Lenina oraz w Komunistycznej Partii Białorusi. Prawie 30 lat kierował kołchozem „Rasswiet" w rejonie kirowskim, w obwodzie mohylewskim. Za sukcesy w pracy jeszcze za czasów ZSRR dwukrotnie został Bohaterem Pracy Socjalistycznej. Kiedy rozpoczęły się reformy, kołchoz „Rasswiet" został przekształcony w spółkę akcyjną. W 1994 r. Starowojtow nie poparł w wyborach prezydenckich Aleksandra Łukaszenki – publicznie wyraził swoje wątpliwości co do umiejętności byłego dyrektora sowchozu „Gorodiec".

KRONIKA REPRESJI

11 listopada 1997 r. Starowojtow został aresztowany i oskarżony o popełnienie przestępstw z kilku artykułów KK RB dotyczących kradzieży i nadużyć. W tym czasie aresztowano wiele osób, w tym ministra rolnictwa, Wasilija Lieskowa. Sprawa kołchozu „Rasswiet" była powodem wszczęcia setek różnych spraw karnych, a kirowski sąd stał się centrum najbardziej sensacyjnych wydarzeń na Białorusi. Sądzono tam i uznano winnym Starowojtowa. On sam nie przyznał się do winy.

W 1997 r. Starowojtow został skazany za kradzież mienia na 2 lata kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. Uwolniono go 11 listopada 1999 r.

ВАСІЛЬ СТАРАВОЙТАЎ

Васіль Старавойтаў нарадзіўся ў вёсцы Барок Бялыніцкага раёну 13 чэрвеня 1924 г.

Памёр 19 лютага 2013 году ў вёсцы Мышкавічы таго ж раёну.

Да Другой сусьветнай вайны скончыў Магілёўскую фэльдшарска-акушэрскую школу. Але ўрачом папрацаваць не пасьпеў: пачалася вайна, пайшоў у партызаны. Пасьля вызваленьня Беларусі застаўся на Магілёўшчыне на партыйнай працы. Працаваў на кіраўнічых пасадах у ЛКСМБ і КПБ. Амаль 30 гадоў кіраваў калгасам «Рассвет» Кіраўскага раёну Магілёўскай вобласьці. За посьпехі ў працы яшчэ ў часы СССР стаў двойчы Героем сацыялістычнай працы.

З пачаткам рэформаў калгас «Рассвет» быў пераўтвораны ў акцыянэрнае таварыства. У 1994 г. Васіль Старавойтаў не падтрымаў на прэзыдэнцкіх выбарах Аляксандра Лукашэнку – на ўсю краіну ўсумніўся ў дзелавых якасьцях былога дырэктара саўгасу «Гарадзец».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

11 лістапада 1997 г. знакаміты кіраўнік і Двойчы Герой быў арыштаваны і абвінавачаны па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэксу РБ у крадзяжах і розных злоўжываньнях. У той перыяд было арыштавана шмат людзей, у тым ліку Старавойтаў і, са скандальнай дэманстрацыяй на беларускім тэлебачаньні, міністар сельскай гаспадаркі Васіль Лявонаў. Усяго ў межах крымінальнага рассьледаваньня ў дачыненьні да «Рассвету» было заведзена каля сотні розных крымінальных справаў.

Кіраўскі раённы суд стаў на шмат месяцаў цэнтрам самых сэнсацыйных падзеяў у Беларусі. Там судзілі – і прызналі вінаватым – Васіля Старавойтава. Сам ён сваю віну катэгарычна адмаўляў.

У 1997 г. Васіль Старавойтаў быў асуджаны за крадзеж маёмасьці да двух гадоў зьняволеньня з адбываньнем пакараньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Вызвалены 11 лістапада 1999 году. Жыў у вёсцы Мышкавічы Кіраўскага раёну Магілёўскай вобласьці.

MYKOŁA STATKIEWICZ


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Urodził się 12 sierpnia 1956 we wsi Ladno w rejonie słuckim, w obwodzie mińskim. Tam ukończył szkołę średnią. W 1978 ukończył studia na Wyższej Inżynieryjnej Uczelni Przeciwlotniczo-Rakietowej w Mińsku (WIUPR), otrzymując tytuł inżyniera radioelektroniki.

W latach 1978–1982 służył w Armii Czerwonej w obwodzie murmańskim na północy ZSRR. Tam też został członkiem KPZR, którą opuścił w 1991 r. na znak protestu przeciwko pacyfikacji Wilna. Jest doktorem nauk technicznych i podpułkownikiem rezerwy. Był założycielem Białoruskiego Zjednoczenia Wojskowych, którym kierował do 1995 r.

W 1991 r. wstąpił do Białoruskiej Partii Socjaldemokratycznej Narodnaja Hramada.

W lipcu 1995 r. został przewodniczącym Białoruskiej Socjaldemokratycznej Hramady, na miejsce odwołanego Aleha Trusaua. Po zjednoczeniu BSDH z Partią Zgody Ludowej został przewodniczącym powstałej w jego wyniku Białoruskiej Socjaldemokratycznej Partii Ludowa Hramada. W 1999 r. został przewodniczącym Wschodnioeuropejskiego Forum Socjaldemokratycznego. W roku 2000 kandydował do Izby Reprezentantów, nie został jednak wybrany. Od 2003 r. był liderem „Europejskiej koalicji". W 2009 r. decyzją kongresu „Europejskiej Koalicji" został nominowany na kandydata do wyborów prezydenckich 2010.

W 2006 r. Amnesty International uznała go za więźnia sumienia.

KRONIKA REPRESJI

31 maja 2005 r. Centralny Sąd Okręgowy w Mińsku na podstawie art. 342 KK skazał go wraz z Pawłem Siewaryńcem na trzy lata pozbawienia wolności za organizację protestów opozycji po październikowym referendum w sprawie wyborów parlamentarnych.

19 grudnia 2010 r. brał udział w wiecu na Placu Październikowym oraz Placu Niepodległości. Po brutalnym rozpędzeniu protestujących został zatrzymany przez Specnaz.

W dniach 19.12.2010 – 12.01.2011 r. prowadził głodówkę protestacyjną w izolatce śledczej białoruskiego KGB.

26 maja 2011 r. został skazany na 6 lat koloni karnej. Początkowo odbywał karę w Zakładzie Karnym w Szkłowie, gdzie doznał kontuzji ręki podczas pracy w tartaku. Administracja kolonii zataiła jednak ten fakt i odmówiła Statkiewiczowi widzenia z krewnymi oraz korzystania z telefonu.

13 grudnia 2011 r. okazało się, że Mykoła Statkiewicz przebywał 5 dni w karcerze. Powodem było opublikowanie przez media nieocenzurowanych przez administrację kolonii listów, które Mykoła przesyłał z zesłania. 12 stycznia 2012 r. Szkłowski Sąd Okręgowy zadecydował przenieść Statkiewicza do kolonii o zaostrzonym rygorze, nadając mu status „osoby złośliwie naruszającej reżim kolonii". 17 stycznia 2012 r. z niewiadomych powodów znalazł się w izolatce, trafił tam również pod koniec czerwca 2012 r.

МІКОЛА СТАТКЕВІЧ

Нарадзіўся 12 жніўня 1956 г. у вёсцы Лядна Слуцкага раёну ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Менскае вышэйшае інжынэрнае зэнітна-ракетнае вучылішча па спэцыяльнасьці «вайсковы інжынэр па радыёэлектроніцы».

У 1978–1982 гг. служыў у Мурманскай вобласьці старэйшым інжынэрам аўтаматызаванага каманднага пункту зэнітнай ракетнай брыгады часткі СПА. У 1986 г. абараніў кандыдацкую дысэртацыю, у 1993 г. – доктарскую. Мае больш за 60 працаў у галіне АСК, эрганомікі, інжынэрнай і сацыяльнай псыхалёгіі. Атрымаў вайсковае званьне падпалкоўніка.

З 1985 па 1990 год выкладаў у роднай вайсковай вучэльні на кафэдры АСК. У 1990 г. стаў адным з аўтараў канцэпцыі беларускай арміі, рэалізаванай пасьля распаду СССР. У 1991 г. на знак пратэсту супраць падзей у Вільні выйшаў з КПСС.

20 жніўня 1991 г. адзіны з вайскоўцаў у Беларусі публічна выступіў супраць путчу ў Маскве. Тады ж абвясьціў аб стварэньні Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў (БЗВ) і да 1995 г. кіраваў ім.

У 1991 г. увайшоў у Цэнтральную раду і выканаўчы камітэт Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада).

У 1992 г. выступіў зь ініцыятывай прывядзеньня да прысягі Беларусі афіцэраў запасу на галоўнай плошчы Менску.

З 1995 г. – старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада).

З 1999 г. – старшыня Ўсходнеэўрапейскага сацыял-дэмакратычнага форуму. У 2000 г. балятаваўся ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, але абраны ня быў. З 2003 году – лідэр «Эўрапейскай кааліцыі».

Узнагароджаны мэдалём «За бездакорную службу». Кандыдат тэхнічных навук, падпалкоўнік запасу. Выгадаваў двух дачок.

У 2009 годзе кангрэсам «Эўрапейскай кааліцыі» вылучаны кандыдатам на прэзыдэнта на выбарах 2010 году.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2005 г. быў асуджаны да 3 гадоў абмежаваньня волі за арганізацыю ў кастрычніку 2004 г. у Менску вулічнай акцыі супраць афіцыйных вынікаў парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму.

19 сьнежня 2010 г. браў удзел у акцыі на плошчах Кастрычніцкай і Незалежнасьці. Пасьля жорсткага разгону мітынгу быў затрыманы спэцназам.

Зь 19 сьнежня 2010 г. па 12 студзеня 2011 г. трымаў галадоўку пратэсту ў СІЗА КДБ.

26 траўня 2011 г. у Ленінскім судзе г. Менску судзьдзя Людміла Грачова агучыла ягоны прысуд: 6 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму (пракурор – Кірыл Чубкавец).

Спачатку адбываў тэрмін пакараньня ў калёніі г. Шклову, дзе атрымаў траўму рукі, працуючы на лесапілцы. Адміністрацыя калёніі замоўчвала гэты факт і адмаўляла сваякам у спатканьнях. Міколе Статкевічу тады аказваўся маральны ціск.

13 сьнежня 2011 г. стала вядома, што Мікола Статкевіч знаходзіцца ў штрафным ізалятары ў шклоўскай ПК № 17. Падставай зьмяшчэньня вязьня ў ШІЗА на 5 сутак стала публікацыя ў СМІ ягоных лістоў, неадцэнзураваных адміністрацыяй калёніі.

12 студзеня 2012 году на закрытым пасяджаньні Шклоўскі раённы суд асудзіў Статкевіча да больш строгага рэжыму ўтрыманьня – 3 гады зьняволеньня ў крытай турме (судзьдзя – Віталь Волкаў). Прычынай было названае «злоснае парушэньне рэжыму». Ужо праз 4 дні стала вядома аб знаходжаньні палітыка ў турме № 4 г. Магілёву, дзе нашмат больш жорсткія ўмовы ўтрыманьня. 17 студзеня 2012 г. ён быў пакараны 10 суткамі карцэру. Знаходзіўся ў камэры-адзіночцы магілёўскай турмы. У канцы чэрвеня 2012 г. зноў быў пераведзены ў штрафны ізалятар.

ALEŚ STRALCOU


FOT. JULIA DARASHKEVICH

Aleś Stralcou jest jednym z oskarżonych w „Sprawie czternastu".

Socjaldemokrata Aleś Stralcou był zastępcą przewodniczącego Białoruskiej Partii Socjaldemokratycznej. Wielokrotnie był zatrzymywany i sądzony w sprawach administracyjnych za udział w akcjach opozycyjnych, wystąpieniach podczas mityngów przedsiębiorców i wyrażanie solidarności z więźniami politycznymi. Po wyborach w 2006 r. był uczestnikiem demonstracji (miasteczka namiotowego) na Placu Kalinowskiego. W nocy 24 marca 2006 r. zatrzymano go i skazano na 10 dni aresztu.

KRONIKA REPRESJI

10 stycznia 2008 r. Aleś Stralcou brał udział w akcji protestu przedsiębiorców w centrum Mińska, spacyfikowanej przez władze. Po paru dniach od tych wydarzeń, 21 stycznia Alesiowi Stralcouowi i 13 innym uczestnikom akcji przedstawiono zarzuty z artykułu 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w grupowych działaniach, w poważny sposób naruszających porządek społeczny".

Stralcou został skazany na karę 2 lat pozbawienia wolności. Wyrok wydano 22 kwietnia 2008 r.

Postanowieniem mińskiego Sądu Okręgu Centralnego z 15 czerwca 2009 r. Stralcouowi zamieniono część kary z 1 roku 2 miesięcy i 15 dni na prace przymusowe z potrąceniem 15 procent zarobków na rzecz skarbu państwa (z tego powodu więźnia politycznego nie objęła amnestia). Jednakże Miejski Sąd w Mińsku ostatecznie nie zgodził się na złagodzenie kary.

Po pacyfikacji demonstracji na Placu Niepodległości 19 grudnia 2010 r. i masowych aresztowaniach, przedstawiciele służb siłowych próbowali skontaktować się ze Stralcouem i porozmawiać z nim o osobach oskarżonych w „Sprawie czternastu".

Obecnie Aleś Stralcou pracuje w prywatnej firmie handlowej.

АЛЕСЬ СТРАЛЬЦОЎ

Алесь Стральцоў – адзін з асуджаных па «справе 14-ці» ў 2008 годзе, калі на 14 моладзевых актывістаў былі заведзеныя крымінальныя справы за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў 10 студзеня ў Менску.

Алесь Стральцоў – сацыял-дэмакрат, у сярэдзіне 2000-х быў намесьнікам старшыні БСДП. Неаднаразова затрымліваўся і асуджаўся па адміністратыўных справах за ўдзел у апазыцыйных акцыях, выступах на мітынгах прадпрымальнікаў, праяўвы салідарнасьці з палітвязьнямі. Удзельнік Плошчы Каліноўскага – намётавага мястэчка пратэсту пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. У ноч на 24 сакавіка 2006 г. быў затрыманы і асуджаны на 10 сутак арышту.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

10 студзеня 2008 г. браў удзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у цэнтры Менску, разагнанай уладамі. Празь некалькі дзён пасьля гэтых падзеяў, 21 студзеня, Алесю Стральцову і яшчэ 13 удзельнікам акцыі было прад'яўленае абвінавачваньне па па ч. 1 арт. 342 КК РБ – «Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак».

Асуджаны да абмежаваньня волі тэрмінам на 2 гады. Прысуд вынесены 22 красавіка 2008 г. у судзе Цэнтральнага раёну Менску судзьдзёй Аленай Ільиной.

Пастановай суду Цэнтральнага раёну Менску ад 15 чэрвеня 2009 году А. Стральцову замянілі неадбытую частку пакараньня тэрмінам у 1 год, 2 месяцы і 15 дзён на папраўчыя работы на такі ж тэрмін з утрыманьнем 15 адсоткаў заробку на карысьць дзяржавы. З-за гэтага палітвязень не падпаў пад амністыю. Аднак потым зьмякчэньне пакараньня, ад якога Алеся павінны былі вызваліць, адмяніў Менскі гарадзкі суд.

Пасьля разгону Плошчы-2010 і масавых арыштаў з Алесем Стральцовым зьвязваліся праз тэлефон прадстаўнікі сілавых ведамстваў, выказваючы жаданьне пагутарыць пра «справу 14-ці» і яе фігурантаў.

Зараз Алесь Стральцоў працуе ў прыватнай гандлёвай фірме, якая займаецца зьнешнеэканамічнай дзейнасьцю.

MICHAŚ SUBACZ



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Michaś Subacz, mieszkaniec rejonu mińskiego, przedsiębiorca, był jednym z oskarżonych w „Sprawie czternastu" w 2008 r., kiedy to setki osób protestowały na ulicach Mińska przeciwko wydanemu przez prezydenta Łukaszenkę dekretowi, który znacznie komplikował warunki pracy przedsiębiorców. 10 stycznia 2008 r. zatrzymano setki osób – niektóre z nich zostały mocno pobite, wiele skazano na areszty administracyjne.

KRONIKA REPRESJI

W styczniu 2008 r. Subacz był sądzony dwukrotnie za udział w akcjach 10 i 21 stycznia, i został skazany na karę grzywny w wysokości 1,4 mln rubli. Później wszczęto przeciwko niemu kolejną sprawę karną z art. 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w masowych akcjach, w poważny sposób naruszających porządek publiczny".

27 maja 2008 r. sędzia Walerij Jeśman uznał Subacza winnym zarzucanego mu przestępstwa i skazał go na 2 lata ograniczenia wolności bez kierowania go do zakładu poprawczego.

Michaś Subacz brał udział również w innych akcjach – był jednym z zatrzymanych podczas akcji 24 marca 2006 roku podczas pacyfikacji miasteczka namiotowego na Placu Październikowym w Mińsku.

МІХАСЬ СУБАЧ


Міхась Субач – жыхар Менскага раёну, прадпрымальнік, адзін з асуджаных па крымінальнай «справе 14-ці» ў 2008 г. Тады сотні чалавек пратэставалі на вуліцах Менску супраць прыняцьця ўказу кіраўніка дзяржавы, згодна зь якім умовы працы прадпрымальнікаў моцна ўскладняліся і пагаршаліся. Дзясяткі людзей ў той дзень (10 студзеня 2008 г.) былі затрыманыя, некаторыя зь іх – моцна зьбітыя, многія былі асуджаныя па адміністратыўных справах.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Міхася Субача ў студзені 2008 году судзілі двойчы: па двух пратаколах за ўдзел у акцыях 10 і 21 студзеня ён быў аштрафаваны на 1 400 000 рублёў. Аднак пазьней прадпрымальніку было ў дадатак прад'яўленае і крымінальнае абвінавачваньне – па па ч. 1 арт. 342 КК РБ («арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак»).

27 траўня 2008 г. судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Валеры Есьман прызнаў маладзёвага актывіста Міхаіла Субача вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ («арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак») і вынес пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі тэрмінам на два гады без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.

Міхась Субач прымаў удзел і ў іншых апазыцыйных акцыях – у прыватнасьці, ён быў адным з затрыманых уначы на 24 сакавіка 2006 г. падчас разгону намётавага мястэчка пратэсту на Кастрычніцкай плошчы ў Менску.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

ANTON SURAPIN

Anton Surapin urodził się 28 lutego 1990 r. w Słucku, w obwodzie Mińskim. Jest studentem Instytutu Dziennikarstwa Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego, fotoreporterem, twórcą strony „Belarusian News Photos" (www.bnp.by), członkiem Białoruskiego Stowarzyszenia Dziennikarzy.

KRONIKA REPRESJI

Zatrzymano go 13 lipca 2012 r. w jego mieszkaniu w Mińsku i przeprowadzono rewizję. Surapin został umieszczony w areszcie śledczym KGB, w tzw. „amerykance". Zatrzymano go, gdyż na swojej stronie internetowej Belarusian News Photos zamieścił jako pierwszy fotografie pluszowych misiów zrzuconych nad Białorusią przez szwedzkich pilotów. Przez parę tygodni nie było żadnych oficjalnych informacji na temat tego, co konkretnie zarzuca się Surapinowi. Obrońcy praw człowieka powtarzali, że najprawdopodobniej zostanie on oskarżony o pomoc w nielegalnym przekroczeniu granicy. 7 sierpnia oficjalnie przedstawiono mu właśnie taki zarzut – pomoc w nielegalnym przekroczeniu granicy Republiki Białoruś (art. 16, pkt 6 oraz art. 371, pkt 3 KK RB).

4 lipca awionetka z dwoma obywatelami Szwecji na pokładzie przekroczyła granicę Białorusi, przeleciała nad Iwieńcem i południowo-zachodnimi częściami Mińska i rozrzuciła setki pluszowych misiów. Akcję tę zorganizowała szwedzka agencja Studio Total na znak solidarności ze społeczeństwem obywatelskim na Białorusi i w obronie wolności słowa w tym kraju.

Na początku Mińsk nie traktował tego jako naruszenia granic, jednak 26 czerwca sytuację skomentował Aleksander Łukaszenka, obiecując ukarać winnych. 31 lipca odwołani zostali przewodniczący Państwowej Służby Granicznej i dowódca obrony przeciwlotniczej. Media podały, że białoruskie władze nie przedłużyły akredytacji dla ambasadora Szwecji Stefana Erikssona, natomiast 8 sierpnia Białoruś ogłosiła, że odwołała wszystkich pracowników swojej ambasady w Sztokholmie i tego samego zażądała od strony szwedzkiej.

Pod koniec 2012 r. przez kilka dni adwokat Surapina nie mógł otrzymać zgody na spotkanie ze swoim klientem. Surapin został uznany przez Amnesty International za więźnia sumienia.

17 sierpnia KGB poinformowało o zmianie środka zapobiegawczego dla Antona Surapina i Siarhieja Baszarymaua – z tymczasowego aresztu na zakaz opuszczaniu miejsca zamieszkania.

Jak podało biuro prasowe KGB, Baszarymau i Surapin mieli status oskarżonych. Ponieważ nie przeprowadzono śledztwa ani konfrontacji, gdyż obywatele Szwecji odmówili zjawienia się w Wydziale Śledczym, ostateczne decyzje w sprawie Białorusinów miały zostać podjęte po wyjaśnieniu wszelkich okoliczności przestępstwa.

28 czerwca 2013 r. pierwszy zastępca KGB Igor Siarhienka wydał decyzję o zamknięciu dochodzenia w sprawie „pluszowego desantu".

АНТОН СУРАПІН

Антон Сурапін нарадзіўся 28 лютага 1992 г. у горадзе Слуцку Менскай вобласьці.

З 2009 г. – студэнт Інстытуту журналістыкі БДУ. Фотажурналіст, стваральнік сайту bnp.by – «Belarus News Photo». Сябра БАЖ.

Антон быў першым журналістам, які разьмясьціў на сваім сайце фотаздымак «плюшавага дэсанту» – знойдзенага ў Гарадзенскай вобласьці цацачнага мядзьведзя з прычэпленымі да яго антыдыктатарскімі лёзунгамі. 4 ліпеня 2012 г. некалькі соцень такіх цацак скінулі з самалёту трое грамадзянаў Швэцыі на знак салідарнасьці зь беларусамі. Мяжу зь Беларусьсю швэды перасяклі нелегальна. На скінутыя імі над Івянцом і ўскраінай Менску цацкі зь лёзунгамі палявалі міліцыя і спэцслужбы, а афіцыйныя асобы абвесьцілі, што ніякага самалёту зь мядзьведзікамі не было. І тут у інтэрнэце зьявіўся здымак мядзьведзіка – доказ таго, што самалёт са Швэцыі быў… Улады былі разьюшаныя. Пачаліся арышты.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЛЕДУ

Антон Сурапін быў затрыманы 13 ліпеня 2012 году ў менскай кватэры, у якой пражываў. Папярэдне ў яго быў праведзены ператрус. Малады журналіст зьмешчаны ў СІЗА КДБ – «амэрыканку».

Афіцыйных зьвестак пра тое, што Антону было прад'яўленае абвінавачваньне, не было некалькі тыдняў. Тым ня менш, праваабаронцы агучвалі думку, што яму інкрымінуюць спрыяньне незаконнаму перасячэньню мяжы, але ўлады па нейкіх прычынах хаваюць факт прад'яўленьня журналісту абвінавачваньня.

7 жніўня 2012 г. абвінавачваньне А. Сурапіну было ў рэшце рэшт прад'яўлена афіцыйна.

У канцы ліпеня 2012 году некалькі дзён запар адвакат Сурапіна ня мог дабіцца сустрэчы з падабаронным у СІЗА КДБ, што нагадвала брутальную сытуацыю зь нядопускам адвакатаў да вязьняў Плошчы-2010.

17 жніўня ўвечары стала вядома, што Антон Сурапін, як і другі абвінавачаны па гэтай справе Сяргей Башарымаў, вызвалены пад падпіску аб нявыезьдзе. Абвінавачаньне пры гэтым засталося ў сіле.

Прызнаны «Міжнароднай Амністыяй» вязьнем сумленьня. Акрамя таго, паводле гэтай арганізацыі, арышт Сурапіна стаў самым абсурдным арыштам у сьвеце па выніках 2012 году.

28 чэрвеня 2013 г. першы намесьнік старшыні КДБ Ігар Сяргеенка паведаміў аб закрыцьці крымінальнай справы аб «плюшавым дэсанце».

OLEG SURGAN

Oleg Surgan to opozycyjny działacz z Witebska.

KRONIKA REPRESJI

3 września 2009 r. Oleg Surgan wraz z młodszym bratem Tarasem został zatrzymany na przystanku niedaleko Witebskiej Akademii Medycznej. Chwilę wcześniej na budynku akademii ktoś wywiesił biało-czerwono-białą flagę narodową.

Na posterunku spisano protokół i oskarżono Olega o wywieszenie flagi, jednakże bardzo szybko protokół ten zniszczono, a zamiast niego pojawił się inny. W ostatecznej wersji protokołu napisano, że Oleg był w miejscu publicznym w stanie nietrzeźwym, wyrażał się niecenzuralnie, a podczas próby zatrzymania ugryzł milicjanta w palec. Sam Surgan twierdził, że na posterunku milicji torturowano go, co potwierdziło badanie lekarskie. Po zatrzymaniu przewieziono go do szpitala z rozbitą głową.

19 lutego 2010 r. Surgan został skazany na 6 miesięcy aresztu. Oskarżono go o stawianie oporu milicji. Oprócz tego, zgodnie z wyrokiem, Surgan miał wypłacić 2,5 mln rubli zadośćuczynienia funkcjonariuszowi milicji, Siergiejowi Dudkiewiczowi. 27 lipca 2010 r. Surgan został zwolniony z Kolonii Głubokoje.

АЛЕГ СУРГАН

Алег Сурган – апазыцыйны актывіст зь Віцебску.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

3 верасьня 2009 году Алег Сурган разам са сваім малодшым братам Тарасам быў затрыманы на прыпынку грамадзкага транспарту каля Віцебскага мэдычнага ўнівэрсытэту, на будынку якога перад гэтым нехта вывесіў забаронены ў Беларусі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг.

На Алега Сургана ў Кастрычніцкім РУУС склалі пратакол, у якім ён быў абвінавачаны ў вывешваньні сьцягу. Аднак неўзабаве той пратакол быў зьнішчаны, а замест яго зьявіўся іншы. У апошняй вэрсыі пратаколу сьцьвярджалася, што Алег знаходзіўся ў грамадзкім месцы нецьвярозым, нецэнзурна лаяўся, а пры спробе затрыманьня ўкусіў за палец міліцыянта.

Сам Сурган сьцьвярджаў, што ў аддзяленьні міліцыі да яго былі ўжытыя катаваньні, і гэта было зафіксавана мэдычным аглядам. Пасьля затрыманьня з Кастрычніцкага РУУС Андрэй быў дастаўлены ў шпіталь з разьбітай галавой.

19 лютага 2010 г. суд Кастрычніцкага раёну г. Віцебску асудзіў Алега Сургана на 6 месяцаў арышту, прызнаўшы яго вінаватым у супраціве міліцыі. Акрамя таго, Алег Сурган павінен, згодна з прысудам, выплаціць 2,5 мільёна рублёў кампэнсацыі маральнай шкоды супрацоўніку міліцыі Сяргею Дудкевічу. Вынес прысуд судзьдзя Яўген Буруноў.

Вызвалены з калёніі г. Глыбокае 27 ліпеня 2010 году.

HERMAN SUSZKIEWICZ

Herman Suszkiewicz jest jednym z oskarżonych o udział w Marszu Wolności, który odbył się w Mińsku 17 października 1999 r. Suszkiewicz miał wtedy 19 lat, studiował wieczorowo na trzecim roku informatyki i radioelektroniki Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Był działaczem „Młodego Frontu".

KRONIKA REPRESJI

Herman Suszkiewicz został zatrzymany niedługo po „Marszu Wolności" 17 października ok. godz. 17:00, niedaleko przejścia do metra przy Placu Zwycięstwa (Plac Pobiedy). Razem z nim zatrzymano również jego kuzyna, Gleba Dogila i Andreja Wołobujewa. Pięcioro funkcjonariuszy w cywilu podeszło do młodych ludzi gdy ci rozmawiali i zatrzymało ich. Z posterunku milicji, na który przewieziono chłopców, Suszkiewicz trafił do aresztu tymczasowego, a potem do aresztu śledczego na Wołodarce.

27 października przedstawiono mu zarzuty z art. 186, pkt 3 KK RB. Zastosowano areszt zapobiegawczy, który potem zmieniono na zakaz opuszczania miejsca zamieszkania. Groziło mu od roku do 5 lat pozbawienia wolności.

Po pewnym czasie Herman Suszkiewicz wystąpił o przyznanie mu statusu uchodźcy w Polsce. Otrzymał tutaj azyl i rozpoczął studia na jednym z uniwersytetów. Inni oskarżeni w tej sprawie jeszcze przed procesem także opuścili Białoruś. Mimo to miński sąd skazał Hermana Suszkiewicza i pozostałych oskarżonych na karę grzywny w wysokości 50 płac minimalnych. Wyrok zapadł 2 stycznia 2002 r. – dwa lata po wydarzeniach z jesieni 1999 r.

ГЕРМАН СУШКЕВІЧ

Герман Сушкевіч – адзін з абвінавачаных і асуджаных за ўдзел у «Маршы Свабоды», які прайшоў у Менску 17 кастрычніка 1999 году. Герману было тады 19 гадоў, ён вучыўся на 3-м курсе Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі на вячэрнім аддзяленьні. Быў актывістам «Маладога Фронту».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Герман Сушкевіч быў затрыманы неўзабаве пасьля «Маршу свабоды» 17 кастрычніка каля 17:00 у пераходзе станцыі метро «Плошча Перамогі». Разам зь ім былі таксама затрыманыя яго стрыечны брат Глеб Догіль і сябра Андрэй Валабуеў. Паколькі асобы (пяцёра мужчынаў), якія затрымлівалі маладых людзей, былі ў цывільным, Г. Сушкевіч аказаў супраціўленьне, але яго моцна ўдарылі і пацягнулі ў машыну.

Спачатку Г. Сушкевіч, як і яго сябры, быў накіраваны ў Савецкі РАУС, затым пераведзены ў ізалятар часовага ўтрыманьня, а адтуль – у сьледчы ізалятар на вуліцы Валадарскага.

Абвінавачаньне Герману Сушкевічу было прад'яўленае 27 кастрычніка (арт. 186.3 КК РБ). Мерай стрыманьня абранае знаходжаньне пад арыштам, зьмененае пасьля на падпіску аб нявыезьдзе. Яму і яшчэ тром абвінавачаным пагражала ад 1 да 5 гадоў зьняволеньня.

Праз некаторы час Герман папрасіў і атрымаў палітычны прытулак у Польшчы, дзе стаў студэнтам аднаго з унівэрсытэтаў. Гэткім жа самым чынам – пакінуўшы краіну – не дачакаліся суду і іншыя фігуранты справы.

Нягледзячы на эміграцыю, Менскі гарадзкі суд прызнаў Германа і яшчэ трох маладых людзей вінаватымі і асудзіў да штрафу ў памеры 50 мінімальных заробкаў. Праўда, адбылося гэта толькі 2 студзеня 2002 году, больш чым праз 2 гады пасьля падзеяў восені 1999-га.


FOT. EVGENI SUVOROU

JEWGIENIJ SUWOROW

KRONIKA REPRESJI

Jewgienij Suworow to działacz młodzieżowego ruchu „Żubr". Został zatrzymany przez funkcjonariuszy milicji 14 lutego 2006 r. w Mohylewie za wywieszenie transparentu z hasłem wzywającym do udziału w Dniu Białoruskiej Solidarności.

Najpierw został oskarżony o naruszenie artykułu 156 KA – „Drobne chuligaństwo". Potem przeciwko Suworowowi wszczęto sprawę z art. 435, pkt 1 KK – „Uchylanie się od obowiązku służby wojskowej". Był to jedynie pretekst do pozbawienia wolności młodego człowieka zaangażowanego w działalność polityczną, bowiem komisja poborowa stwierdziła, że Suworow nie nadaje się do służby z powodu poważnych kłopotów ze wzrokiem.

Podczas śledztwa Suworow przebywał w areszcie śledczym w Mohylewie. Ostatecznie sąd skazał go na karę grzywny w wysokości 20 płac minimalnych.

ЯЎГЕН СУВОРАЎ

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Актывіст моладзевай арганізацыі «Зубр» Яўген Сувораў быў затрыманы міліцыяй 14 лютага 2006 г. у Магілёве за вывешваньне расьцяжкі-віншаваньня з Днём усіх закаханых. Спачатку ён быў абвінавачаны ў парушэньні арт. 156 Адміністратыўнага кодэксу (дробнае хуліганства), аднак затрыманьне было выкарыстанае толькі як нагода для ўтрыманьня маладога чалавека пад вартай. Адміністратыўны пратакол пры гэтым нават не разглядаўся.

Супраць Яўгена Суворава была ўзбуджаная справа па арт. 435 ч. 1 Крымінальнага кодэксу (ухіленьне ад мерапрыемстваў, зьвязаных з усеагульным вайсковым абавязкам). Крымінальны перасьлед зьяўляўся толькі падставай дзеля ўзяцьця актыўнага маладога чалавека пад варту. Гэта пацьвярджаецца тым, што паводле заключэньня прызыўной камісіі, Яўген Сувораў прызнаны непрыдатным да праходжаньня вайсковай службы ў мірны час з-за праблемаў са зрокам. Хлопец ніколі не хаваўся ад уладаў, зьяўляўся па позвах у ваенкамат.

На працягу ўсяга папярэдняга сьледзтва Яўген Сувораў утрымліваўся ў Магілёўскім СІЗА. У выніку судовага разгляду справы Яўген Сувораў быў прыгавораны да штрафу ў памеры 20 базавых адзінак.

LEANID SWECIK

Leanid Swecik jest witebskim obrońcą praw człowieka. W roku 2009 wszczęto przeciwko niemu postępowanie karne za domniemane rozpowszechnianie w imieniu Rosyjskiego Zjednoczenia Narodowego (RZN) materiałów zawierających treści podżegające do nienawiści narodowej i religijnej.

KRONIKA REPRESJI

Przeciwko Leanidowi Swecikowi wystosowano oskarżenie o podżeganie do nienawiści narodowej i religijnej.

W latach 2006–2007 Leanid Swecik udzielał pomocy witebskim aktywistom, którzy otrzymywali listowne pogróżki od nieformalnej faszystowskiej organizacji „Rosyjskie Zjednoczenie Narodowe". Sprawę karną przeciwko RZN wszczęto dopiero 20 maja 2008 r., opierając się na art. 130 pkt 1 KK. Leanid Swecik został wezwany w tej sprawie w charakterze świadka, później jednak odkrył, że został uznany za podejrzanego.

We wrześniu 2008 r. sprawę Leanida Swecika zawieszono. 31 marca 2009 r. Swecik został oskarżony o podżeganie do nienawiści na tle narodowym i religijnym (art. 130 KK) i o szkalowanie imienia prezydenta Białorusi (art. 367 KK). Aktywiście zakazano opuszczać kraj. Leanid Swecik nie przyznał się do winy, uważając, że padł ofiarą zemsty za działalność w dziedzinie praw człowieka. Sprawa karna obejmuje 11 tomów akt.

Prokurator Siarhiej Selichanow zażądał dla aktywisty dwóch lat kolonii karnej.

16 lipca sąd uznał, że Leanid był bezpośrednio powiązany z pisaniem i rozpowszechnianiem pogróżek. Zgodnie z opinią sędzi Urbanowicz, Swecik realizował w ten sposób osobiste sprawy.

Opozycyjni aktywiści poszkodowani w sprawie „listów RZN" w trakcie procesu sądowego twierdzili, że Leanid Swecik jest niewinny. Ich zdaniem Swecik aktywnie pomagał im w poszukiwaniach osób wysyłających im i innym znanym osobom listy z pogróżkami. W latach 2006–2007 Swecika oskarżano o wszczynanie niesnasek międzynarodowych w celu zdyskredytowania jego działalności na rzecz praw człowieka.

W trakcie procesu adwokat Leanida Swecika, Paweł Sopiałka, nazwał oskarżenie swego klienta „potworną prowokacją". W swoim wystąpieniu wyliczył on naruszenia, których dopuszczono się w trakcie śledztwa i procesu. Zaproponował również, by sędzia Galina Urbanowicz przyznała, że obrońcy praw człowieka nie udowodniono żadnej winy.

Na początku kwietnia międzynarodowy fundusz praw człowieka Frontline wysłał do Aleksandra Łukaszenki list z żądaniem umorzenia sprawy będącej formą prześladowania Leanida Swecika.

Obrońca praw człowieka Leanid Swecik został skazany na ogromną grzywnę. Sędzia okręgowego sądu w Witebsku uznała go winnym „podżegania do nienawiści etnicznej i religijnej". 16 lipca 2009 r. Leanid Swecik został skazany na 31 milionów rubli białoruskich (10 890 USD) grzywny.

ЛЕАНІД СЬВЕЦІК

Праваабаронца зь Віцебску. У 2009 годзе супраць яго была ўзбуджаная крымінальная справа нібыта за распаўсюд пісьмовых матэрыялаў ад імя РНЕ – «Русского национального единства» – з экстрэмісцкім зьместам.

У 2006–2007 гадах Леанід Сьвецік кансультаваў віцебскіх актывістаў, якія атрымлівалі лісты з пагрозамі ад імя незарэгістраванай прафашыстоўскай арганізацыі «Русское национальное единство», дапамагаў складаць скаргі ў пракуратуру.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Крымінальная справа па фактах пагрозаў з боку РНЕ была распачатая УКДБ па Віцебскай вобласці па арт. 130.1 КК толькі 20 мая 2008 года. Леанід Свецік быў згаданы спачатку ў якасьці сьведкі па справе, аднак са здзіўленьнем даведаўся, што ён зьяўляецца ўжо падазраваным. Супраць Леаніда Сьвецика высунутыя абвінавачваньні ў распальваньні міжнацыянальнай і рэлігійнай варожасьці.

У верасьні 2008 году крымінальная справа супраць Леаніда Сьвецика была прыпыненая, а 31 сакавіка 2009 году праваабаронцу было прад'яўленае абвінавачваньне адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: распальваньне расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасьці (арт. 130) і паклёп у адносінах да прэзыдэнта Беларусі (арт. 367). У праваабаронцы ўзятая падпіска аб нявыезьдзе. Сваёй віны Леанід Сьвецік не прызнаў і заявіў, што такім чынам яму помсьцяць за праваабарончую дзейнасьць. Крымінальная справа Сьвеціка налічае 11 тамоў.

Пракурор Сяргей Селіханаў запатрабаваў для праваабаронцы два гады калёніі агульнага рэжыму.

16 ліпеня суд прызнаў, што Леанід Сьвецік нібыта меў непасрэднае дачыненьне да напісаньня і распаўсюджваньня гэтых лістоў. Паводле высноваў судзьдзі Ўрбановіч, такім чынам Сьвецік вырашаў асабістыя справы.

Актывісты апазыцыі, якія ў справе «лістоў ад РНЕ» фігуравалі як пацярпелыя, заявілі падчас судовых спрэчак, што ня вераць у віну Леаніда Сьвеціка. Па іх меркаваньні, праваабаронца, які разам зь імі патрабаваў знайсьці тых, хто на працягу 2006–2007 гадоў рассылаў ім і іншым вядомым у горадзе людзям лісты з пагрозамі, сьвядома вінаваціць у распальваньні міжнацыянальнай варожасьці, каб дыскрэдытаваць увесь праваабарончы рух.

Падчас суду адвакат Леаніда Сьвеціка Павал Сапелка назваў справу супраць свайго падабароннага «страшнай правакацыяй». У сваім выступленьні ён адзначыў парушэньні, якія дапушчаліся падчас папярэдняга сьледзтва і судовага працэсу. Ён таксама прапанаваў, каб судзьдзя Галіна Ўрбановіч апраўдала праваабаронцу на той падставе, што ягоная віна судом не даказаная.

Таксама ў пачатку красавіка міжнародны фонд па абароне праваабаронцаў «Front Line» накіраваў ліст Аляксандру Лукашэнку з патрабаваньнем спыніць крымінальны перасьлед праваабаронцы Леаніда Сьвеціка.

Праваабаронцу Леаніду Сьвеціку вынеслі прысуд – велізарны штраф. Судзьдзя Віцебскага абласнога суду прызнала яго вінаватым у «распальваньні рэлігійнай і нацыянальнай варожасьці». 16 ліпеня 2009 году Леанід Сьвецік быў аштрафаваны на 31 мільён беларускіх рублёў (10 890 даляраў ЗША).

PAWEŁ SYRAMOLATAU

Paweł Syramolatau urodził się w kwietniu 1991 r. w Bobrujsku, w obwodzie mohylewskim. Ukończył szkołę zawodową. Nie miał określonych poglądów politycznych, nie należał do żadnej partii. Pracował jako tokarz w zakładzie metalowym, ucząc się jednocześnie w trybie zaocznym w technikum technologiczno-chemicznym. Interesował się informatyką, muzyką, sam komponował i grał z przyjaciółmi w zespole rockowym.

KRONIKA REPRESJI

17 stycznia 2011 r. Paweł Syramolatau został aresztowany pod zarzutem próby podpalenia budynku KGB w Bobrujsku. W nocy z 16 na 17 października 2010 roku, na znak protestu przeciwko zatrzymaniu anarchistów oskarżonych o podpalenia w Mińsku, nieznani sprawcy obrzucili ten budynek koktajlem Mołotowa. Skazano go za to 18 maja 2011 r. (wraz z Artiomem Prakapienką i Jauhienem Waśkowiczem) na 7 lat pozbawienia wolności. Sąd uznał, że Syramolatau jest winny „złośliwego chuligaństwa i zniszczenia mienia".

Karę odbywał w Kolonii nr 19 w Mohylewie. 27 września 2012 r. został ułaskawiony przez prezydenta Łukaszenkę.

ПАВАЛ СЫРАМОЛАТАЎ

Нарадзіўся ў красавіку 1991 году ў Бабруйску Магілёўскай вобласьці. Пасьля школы скончыў прафэсійна-тэхнічную вучэльню. Не адносіўся сябе ні да якіх палітычных партыяў. Працаваў на мэталюргічным заводзе токарам-станочнікам, адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленьні хіміка-тэхналягічнага тэхнікуму. Захапляўся кампутарам і музыкай, якую спрабаваў пісаць сам, пэўны час разам зь сябрамі граў у рок-гурце.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

17 студзеня 2011 году арыштаваны па падазрэньні ў спробе падпалу будынку КДБ у г. Бабруйску (16 кастрычніка 2010 г. дзьве бутэлькі запальнай сумесі «кактэйль Молатава» былі кінутыя невядомымі ў будынак КДБ на знак пратэсту супраць затрыманьня анархістаў, абвінавачаных у падпалах у Менску). Утрымліваўся пад вартай у бабруйскім СІЗА.

18 траўня 2011 г. Павал Сырамолатаў быў асуджаны на 7 гадоў пазбаўленьня волі за падпал будынку Бабруйскага КДБ (разам з Арцёмам Пракапенкам і Яўгенам Васьковічам). Суд прызнаў яго вінаватым у злосным хуліганстве і пашкоджаньні маёмасьці ў асабліва буйным памеры.

Адбываў пакараньне ў калёніі № 19 у г. Магілёве.

27 верасьня 2012 г. вызвалены – быў памілаваны дзеючым кіраўніком дзяржавы.

ALEKSANDER SZAŁAJKO

Aleksander Szałajko urodził się 17 stycznia 1977 r. w Mińsku. Ukończył z wyróżnieniem szkołę średnią, a potem Stosunki Międzynarodowe na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym. W 2001 r. ukończył dodatkowo prawo na tej samej uczelni. Pracował w Państwowej Akademii Nauk jako specjalista centrum koordynacyjnego ds. współpracy z UNESCO.

KRONIKA REPRESJI

21 lutego 2006 roku, prawie miesiąc przed wyborami prezydenckimi został aresztowany i wraz z Mikołą Astriejką, Enirą Bronicką i Cimafiejem Dranczukiem oskarżony o działalność w niezarejestrowanym stowarzyszeniu „Partnerstwo", które miało zajmować się monitoringiem wyborów.

4 sierpnia 2006 r. Centralny Sąd Mińska skazał Szałajkę na 6 miesięcy pozbawienia wolności. Na wolność wyszedł 21 sierpnia 2006 r. – okres, który spędził w areszcie zaliczono mu do orzeczonej kary.

АЛЯКСАНДАР ШАЛАЙКА

Аляксандар Шалайка нарадзіўся 17 студзеня 1977 г. у Менску. Скончыў з залатым мэдалём сярэднюю школу, затым – з адзнакай факультэт міжнародных адносінаў Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. У 2001 г. таксама скончыў юрыдычны факультэт БДУ. Працаваў у Нацыянальнай Акадэміі навук спэцыялістам Каардынацыйнага цэнтру па супрацоўніцтве зь ЮНЭСКА.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

21 лютага 2006 г., амаль за месяц да прэзыдэнцкіх выбараў, быў арыштаваны, а пасьля разам зь Міколам Астрэйкам, Энірай Браніцкай і Цімафеем Дранчуком абвінавачаны ў дзейнасьці ад імя незаконнай арганізацыі – незарэгістраванага грамадзкага аб'яднаньня па назіраньні за выбарамі «Партнэрства».

4 жніўня 2006 г. суд Цэнтральнага раёну Менску пакараў Аляксандра Шалайку пазбаўленьнем волі на шэсьць месяцаў. Выйшаў на свабоду 21 жніўня 2006 г., адбыўшы ўвесь тэрмін пакараньня, вызначаны судом.

WALERIJ SZCZUKIN



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Walerij Szczukin jest dziennikarzem – reporterem niezależnej gazety „Narodnaja Wolja", obrońcą praw człowieka i deputowanym do Rady Najwyższej XIII Kadencji. Urodził się 22 marca 1942 r. we Władywostoku. Po ukończeniu szkoły w Mińsku został powołany do służby wojskowej. Następnie ukończył Wyższą Szkołę Inżynierii Morskiej w Leningradzie. 27 lat służył w marynarce wojennej, uzyskując stopień kapitana. W chwili obecnej przebywa na emeryturze. W latach 1996–2003 mieszkał w Połocku.

Walerij Szczukin został wykluczony z Partii Komunistów Białorusi. Jest członkiem Białoruskiego Komitetu Helsińskiego i honorowym członkiem Białoruskiego Stowarzyszenia Dziennikarzy. Zajmuje się obroną praw człowieka.

KRONIKA REPRESJI

Walerij Szczukin był wielokrotnie zatrzymywany przez milicję, karany grzywną oraz aresztowany za udział w akcjach opozycyjnych. Pierwszy raz aresztowano go pod koniec 1998 r. Od tego czasu był aresztowany kilkadziesiąt razy i trzykrotnie skazany prawomocnym wyrokiem sądowym. Walerij najgorzej wspomina dzień, w którym w żodińskim więzieniu został zmuszony do zgolenia brody.

W październiku 1999 r. w czasie Marszu Wolności miał być jednym z przedstawicieli władz. Gdy władze miejskie zabroniły mu tego, zrezygnował ze stanowiska i poszedł na Marsz jako zwykły uczestnik. 19 października został wezwany na komisariat, gdzie został zatrzymany za naruszenie art. 119 Kodeksu Cywilnego. W czasie zatrzymania Walerij Szczukin został brutalnie pobity. Trzy dni spędził w celi przesłuchań, po czym 22 października oskarżono go na podstawie art. 186, pkt 3 KK i przeniesiono do więzienia przy ul. Wołodarskiego. Wyrok został zmieniony na areszt domowy. Wobec Szczukina złamano immunitet parlamentarny. W 2001 roku, po próbie dostania się na konferencję prasową ministra spraw wewnętrznych Władimira Naumowa, Walerij Szczukin został skazany na trzy miesiące więzienia za nieposłuszeństwo wobec służb bezpieczeństwa i rozbicie szyby w budynku Ministerstwa Spraw Wewnętrznych. Po zwolnieniu z więzienia (13 sierpnia 2001 r.) kontynuował działalność dziennikarską i działalność w obronie praw człowieka.

Jako członek Białoruskiego Stowarzyszenia Dziennikarzy został oskarżony na podstawie art. 189 KK („obraza") o kolportaż ulotek informujących o naruszaniu prawa w okręgowych komisjach wyborczych przed wyborami samorządowymi w 2007 r. Po raz kolejny wezwano go na komisariat 26 marca 2007 r. Został ponownie oskarżony na podstawie art. 189 KK o kolportaż ulotek w przededniu wyborów. Sędzia śledczy zaproponował areszt domowy, na który jednak Szczukin się nie zgodził. Publicznie oświadczył, że jako polityk i dziennikarz woli pozostać w więzieniu.

ВАЛЕРЫ ШЧУКІН

Валеры Аляксеевіч Шчукін – дэпутат Вярхоўнага Савету РБ 13-га скліканьня, праваабаронца, журналіст (шмат гадоў быў карэспандэнтам незалежнай газэты «Народная Воля»). «Тройчы палітвязень» – супраць яго былі заведзеныя тры палітычныя крымінальныя справы.

Валеры Шчукін нарадзіўся 22 сакавіка 1942 г. ва Ўладзівастоку. Скончыў школу ў Менску,

служыў у войску, пасьля дэмабілізацыі вярнуўся ў Менск. Скончыў Ленінградзкую вышэйшую вайскова-марскую інжынэрную вучэльню. 27 гадоў адслужыў у флёце, капітан другога рангу ў адстаўцы. Дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня. Ад 1996 па 2003 г. жыў у Полацку, ад 2003 г. ня мае ўласнага жыльля.

Быў выключаны з Партыі камуністаў Беларусі. Сябра «Беларускага Хэльсынкскага камітэту», ганаровы сябра «Беларускай асацыяцыі журналістаў». Займаецца праваабарончай дзейнасьцю.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Валеры Шчукін шмат разоў затрымліваўся міліцыяй, быў караны штрафамі і арыштамі за ўдзел у апазыцыйных акцыях.

Першы раз трапіў за краты напрыканцы 1998 году. На турэмным рахунку капітана другога рангу ў адстаўцы і дэпутата Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня – некалькі дзясяткаў адміністрацыйных арыштаў і тры крымінальныя прысуды. З усіх адсідак Шчукіну найбольш востра згадваецца адзін дзень у жодзінскай турме. Дзень, калі яму гвалтам пагалілі бараду.

У кастрычніку 1999 г. быў адным з заяўляльнікаў мітынгу і шэсьця «Марш Свабоды». Але калі гарадзкімі ўладамі шэсьце было забароненае, ён адмовіўся ад свайго подпісу і пайшоў на «Марш» у якасьці звычайнага ўдзельніка. На 19 кастрычніка В. Шчукін быў выкліканы ў Савецкі РАУС па позве, дзе быў затрыманы паводле арт. 119 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу РБ. Пры затрыманьні В. Шчукін быў моцна зьбіты (ім пададзеная скарга ў пракуратуру Савецкага раёну г. Менску). Тры дні В. Шчукін знаходзіўся ў ізалятары часовага ўтрыманьня, а пасьля прад'яўленьня яму абвінавачаньня (22 кастрычніка) па арт. 186.3 КК РБ накіраваны ў сьледчы ізалятар на вуліцы Валадарскага. Абраная для В. Шчукіна мера стрыманьня, арышт, потым была зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе. Адносна В. Шчукіна парушаная дэпутацкая недатыкальнасьць. На яго арышт легітымны Вярхоўны Савет РБ дазволу не даваў, як таго патрабуе заканадаўства.

У 2001 г. пасьля спробы трапіць на прэсавую канфэрэнцыю міністра ўнутраных справаў Уладзімера Навумава, Валеры Шчукін адседзеў тры месяцы ў жодзінскай турме за непадпарадкаваньне ахоўнікам і пабітае шкло ў будынку Міністэрства ўнутраных справаў. 12 чэрвеня 2001 г. быў зьняволены, 13 верасьня 2001 г. – вызвалены.

Пасьля вызваленьня працягваў актыўную праваабарончую і журналісцкую дзейнасьць. Сябра БАЖ, журналіст і праваабаронца Валеры Шчукін быў абвінавачаны па арт. 189 («Зьнявага») Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь за распаўсюд улётак падчас выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы 2007 года. У іх распавядалася, што супрацоўнікі акружных выбарчых камісыяў Віцебску ў часе датэрміновага галасаваньня парушаюць заканадаўства.

26 сакавіка 2007 г. Валерыя Шчукіна чарговы раз выклікалі на допыт у Першамайскі РУУС г. Віцебску. Яму прад'явілі абвінавачаньне паводле арт. 189 ч. 2 Крымінальнага кодэксу – «зьнявага, нанесеная ў друкаваным творы», выкліканае тым, што напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы Валеры Шчукін вырабіў і распаўсюдзіў улёткі з крытыкай аб парушэньні заканадаўства супрацоўнікамі акружных выбарчых камісій гораду.

У сувязі з гэтым сьледчы Гердаў вынес пастанову пра ўжыцьцё да Шчукіна падпіскі аб нявыезьдзе. Аднак Шчукін такой падпіскі ня даў. Ён заявіў сьледчаму, што для яго, як для палітыка і журналіста, лепей сядзець у СІЗА, чым быць пад падпіскай пра нявыезд. Валеры Шчукін быў прызнаны вінаватым і аштрафаваны.

ANDREJ SZEPTYCKI

Andrej Szeptycki jest uczestnikiem „Czarnobylskiego Szlaku" 1996 r. Potomek znanego szlacheckiego polsko-ukraińskiego rodu Szeptyckich, dalszy krewny i imiennik słynnego ukraińskiego metropolity unickiego (co ciekawe, z tego powodu w więzieniu zwany był przez więźniów i administrację Hrabią).

Urodził się 8 sierpnia 1967 r. w mieście Podwołoczyska (obwód tarnopolski na Ukrainie). Ukończył akademię wojskową. Służył w różnych miejscach poza granicami kraju. Po rozpadzie ZSRR wrócił na Ukrainę. Był działaczem UNA-UNSO (UNA – Ukraińskie Zgromadzenie Narodowe, UNSO – Ukraińska Samoobrona Narodowa), asystentem deputowanego do Rady Najwyższej. Pasjonuje się historią, muzyką, pisze wiersze, gra na gitarze.

KRONIKA REPRESJI

26 kwietnia 1996 r., w czasie rozgromienia akcji „Czarnobylski Szlak", Szeptycki został aresztowany w centrum Mińska. Oskarżono go o „działania w poważny sposób naruszające porządek publiczny". Przebywał w mińskim areszcie śledczym na Wołodarce, dzieląc przez kilka dni celę z Wiaczesławem Siwczykiem, który prowadził protest głodowy.

Podczas procesu kategorycznie odmówił używania języka rosyjskiego, cały czas mówił po ukraińsku, zachowywał się pewnie, śmiało wytykał wszystkie naruszenia prawa i wyśmiewał działania białoruskich władz.

Pod koniec sierpnia 1996 r. sąd w Mińsku skazał go na 2 lata i 3 miesiące kolonii karnej. Karę odbywał w Kolonii Karnej nr 19 w Mohylewie. Tam uznano go za więźnia „ze skłonnościami do ucieczki i stawiania oporu". Uwolniony 26 lipca 1997 r. przyjechał do Mińska, by wziąć udział w marszu z okazji Dnia Niepodległości Białorusi.

Był uczestnikiem „Pomarańczowej rewolucji" w Kijowie jesienią 2004 r. Po zwycięstwie Majdanu Szeptycki pracował w milicji w jednym z miast zachodniej Ukrainy.

АНДРЭЙ ШАПЦІЦКІ

Удзельнік «Чарнобыльскага Шляху» 1996 г. Нашчадак знакамітага ўкраінска-польскага графскага роду Шапціцкіх, далёкі сваяк і поўны цёзка знакамітага ўкраінскага ўніяцкага мітрапаліта. (Цікава, што з-за гэтага ў турме ня толькі зьняволеныя, але і адміністрацыя называлі яго «Графам»).

Нарадзіўся 8 жніўня 1967 году ў горадзе Падвалачыску (Цярнопальская вобласьць Украіны). Скончыў пасьля школы вайсковую вучэльню. Служыў у розных месцах за межамі Ўкраіны. Пасьля распаду СССР неўзабаве вярнуўся на радзіму. Быў актывістам УНА-УНСО, памочнікам дэпутата Вярхоўнай Рады. Захапляецца гісторыяй, музыкай, піша вершы, грае на гітары.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Арыштаваны ў Менску ў часе разгону «Чарнобыльскага Шляху» 26 красавіка 1996 г. Абвінавачаны ў дзеяньнях, што груба парушаюць грамадзкі парадак. Зьмешчаны пад варту ў менскі СІЗА па вул. Валадарскага. Некалькі дзён сядзеў у адной камэры з галадаючым Вячаславам Сіўчыкам.

На судзе прынцыпова гаварыў толькі паўкраінску і паводзіў сябе сьмела і нават дзёрзка, выкрываючы парушэньні і высьмейваючы дзеяньні беларускіх уладаў.

Асуджаны Менскім гарадзкім судом у канцы жніўня 1996 г. на 2 гады і 3 месяцы калёніі агульнага рэжыму.

Пакараньне адбываў у калёніі № 19 г. Магілёву. У асабістай справе меў пазнаку, што «схільны да ўцёкаў і супраціву». Вызвалены 26 ліпеня 1997 г., пасьля чаго адразу прыехаў у Менск, каб узяць удзел у масавым шэсьці і мітынгу ў гонар Дня Незалежнасьці Беларусі.

Удзельнік «Памаранчавай рэвалюцыі» на Майдане Незалежнасьці ў Кіеве ўвосень 2004 г. Пасьля перамогі Майдану Андрэй Шапціцкі працаваў у міліцыі ў адным з гарадоў Заходняй Украіны.


FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

PAWEŁ SZEREMET

Paweł Szeremet jest znanym białoruskim i rosyjskim dziennikarzem. Urodził się 28 listopada 1971 r. w Mińsku. Po ukończeniu szkoły średniej studiował na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym na Wydziale Historii. Po otrzymaniu tytułu licencjata kontynuował naukę na Wydziale Międzynarodowych Stosunków Gospodarczych, uzyskując tytuł magistra. Do roku 1992 pracował w banku jako konsultant do spraw programów gospodarczych. W telewizji BDG prowadził program publicystyczny „Prospekt". W latach 1996–1998 sprawował funkcję dyrektora Biura Białoruskiego Korespondenta Rosyjskiej Telewizji Publicznej na Białorusi. W 1998 r. pracował jako specjalny korespondent dla kanału ORT. W tym samym roku został laureatem Nagrody Wolności Prasy, przyznawanej przez nowojorski Komitet Ochrony Dziennikarzy.

Jest autorem filmów dokumentalnych: „Czeczeński dziennik", „Dzikie Polowanie", „Ostatni rok imperium". W 2002 r. otrzymał nagrodę OBWE za działalność dziennikarską i demokratyczną. Obecnie Paweł Szeremet jest rosyjskim komentatorem telewizyjnym oraz dyrektorem oddziału do spraw informacji specjalnych.

KRONIKA REPRESJI

26 lipca 1997 r. wraz z kolegą, Dzmitrijem Zawadzkim, kamerzystą programu ORT, został zatrzymany w pobliżu granicy białorusko-litewskiej tuż po zdjęciach do reportażu o sytuacji na granicy. Obaj zostali oskarżeni o nielegalne przekroczenie granicy. 7 października 1997 r. został warunkowo zwolniony. Proces trwał od 17 grudnia 1997 do 28 stycznia 1998 roku. Zakończył się wyrokiem dwóch lat pozbawienia wolności w zawieszeniu za „umyślne przekroczenie granicy państwowej" oraz za „nadużycie przywileju dziennikarskiego w celu działania na niekorzyść". Organizacja Amnesty International uznała Pawła Szeremeta za więźnia sumienia.

Obecnie dziennikarz mieszka i pracuje w Moskwie. Na początku 2000 r. podczas wizyty w Mińsku został zaatakowany i pobity przez nieznane mu osoby. W 2006 r. został aresztowany za udział w miasteczku namiotowym na Placu Kalinowskiego w Mińsku. W roku 2010 Szeremet został pozbawiony białoruskiego obywatelstwa.

W książce „Jeden dzień więźnia politycznego" można przeczytać: „Do Moskwy Paweł Szeremet wyjechał na początku roku 1998, zaraz po zakończeniu procesu sądowego. – Była to wymuszona emigracja pisarska nie mająca żadnego związku z polityką – wyjaśnia Paweł. – Zawsze byłem dziennikarzem, nigdy politykiem czy dysydentem. Inną rzeczą jest fakt, że bardzo lubiłem pisać o politykach. Po zakończeniu procesu nie mogłem dłużej zajmować się dziennikarstwem na Białorusi, gdzie zostałem pozbawiony akredytacji. Nie chciałem zajmować się polityką, choć wielokrotnie mnie do tego namawiano".

ПАВАЛ ШАРАМЕТ

Павал Шарамет – вядомы беларускі і расейскі журналіст. Нарадзіўся 28 лістапада 1971 г. у Менску. Пасьля заканчэньня сярэдняй школы паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэта. Скончыўшы тры курсы, сыйшоў з гэтай ВНУ і паступіў на факультэт міжнародных эканамічных адносінаў Беларускага эканамічнага ўнівэрсытэта (тэма дыпломнай працы – «Афшорны бізнэс»).

Скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі па спэцыяльнасьці міжнародных эканамічных адносінаў. Да 1992 г. працаваў у аддзеле валютных апэрацыяў у адным з банкаў. Быў кансультантам эканамічных праграмаў і вядоўцам аналітычнай праграмы «Праспэкт» беларускага тэлебачаньня, галоўным рэдактарам «Белорусской деловой газеты». Ад 1996 па 1998 г. – дырэктар Беларускага бюро, уласны карэспандэнт ОРТ (Грамадзкая расейская тэлевізія) у Беларусі. У 1998 г. працаваў спэцыяльным карэспандэнтам праграмаў «Новости» і «Время» каналу ОРТ.

Уганараваны Міжнароднай прэміяй Камітэту абароны журналістаў. Аўтар дакумэнтальных фільмаў «Чачэнскі дзёньнік», «Дзікае паляваньне», «Апошні год імпэрыі». У 2002 г. атрымаў прэмію АБСЭ за журналістыку і дэмакратыю. Цяпер Павал Шарамет – камэнтатар расейскага тэлебачаньня, кіраўнік аддзелу спэцыяльных інфармацыйных праэктаў Першага каналу.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

26 ліпеня 1997 г. разам з калегам, апэратарам ОРТ Зьмітром Завадзкім, затрыманы каля беларуска-літоўскай мяжы пасьля здымкаў у Гарадзенскай вобласьці рэпартажу аб становішчы на мяжы. Абвінавачаны ў незаконным пераходзе мяжы. Зьмешчаны пад варту ў турму Гародні.

Павал Шарамет быў вызвалены 7 кастрычніка 1997 году пад падпіску аб нявыезьдзе. Суд над ім пачаўся 17 сьнежня 1997 году і скончыўся 28 студзеня 1998 г. Паўла Шарамета пакаралі на два гады пазбаўленьня волі ўмоўна «за наўмыснае групавое парушэньне дзяржаўнай мяжы» і «перавышэньне журналісцкіх паўнамоцтваў, якое нанесла ўрон інтарэсам дзяржавы». Правёў за кратамі два з паловай месяцы. Праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя» прызнала Паўла Шарамета вязьнем сумленьня.

Цяпер журналіст жыве і працуе ў Маскве. Напачатку 2000-х гадоў падчас прыездаў у Менск Павал падвяргаўся нападам невядомых і зьбіцьцю. У 2006 г. быў арыштаваны ў часе падзеяў на Плошчы Каліноўскага – намётавага мястэчка пратэсту супраць афіцыйных вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў. У 2010 г. Шарамет быў пазбаўлены беларускага грамадзянства.

З кнігі «Радыё Свабода» «Адзін дзень палітвязьня»:

«У Маскву Павал Шарамет зьехаў на пачатку 1998 году, хутка пасьля судовага працэсу.

– Гэта была вымушаная творчая, аднак ніяк не палітычная эміграцыя, – тлумачыць Павал. – Я заўсёды быў журналістам і ніколі – палітыкам ці дысыдэнтам. Іншая справа, мне падабалася пісаць пра палітыкаў і выкрываць іх. Аднак пасьля суду афіцыйна займацца журналістыкай у Беларусі, дзе мяне пазбавілі акрэдытацыі, я больш ня мог. У палітыку ісьці не хацеў, хоць туды неаднаразова клікалі…»



FOT. JULIA DARASHKEVICH

ANATOL SZUMCZANKA

Anatol Szumczanka jest liderem przedsiębiorców, przewodniczącym społecznego stowarzyszenia przedsiębiorców „Perspektywa".

KRONIKA REPRESJI

Anatol Szumczanka został aresztowany 1 marca 2005 r. za udział w akcji protestu przedsiębiorców. Skazano go na 10 dni aresztu administracyjnego. 11 marca Szumczanka został przeniesiony do aresztu śledczego w Mińsku, oskarżono go bowiem o pobicie współwięźnia.

Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 339, pkt 1 KK – „Chuligaństwo". 31 marca 2005 r. decyzją prokuratury Szumczanka został zwolniony z mińskiego aresztu śledczego. Prokuratura zamknęła sprawę ze względu na małą szkodliwość czynu.

Na początku stycznia 2008 r. Ministerstwo Sprawiedliwości zwróciło się do Sądu Najwyższego z poleceniem zlikwidowania stowarzyszenia „Perspektywa". W informacji, zamieszczonej na stronie ministerstwa zauważono, że „10 stycznia 2008 roku odbył się w Mińsku mityng przedsiębiorców, w którym obok innych osób aktywny udział wziął lider republikańskiego stowarzyszenia społecznego «Perspektywa», Anatol Szumczanka". Ministerstwo tak uzasadniało swoją decyzję: „Z części drugiej artykułu nr 15 «O akcjach masowych» wynika, że stowarzyszenia społeczne mogą zostać zlikwidowane, jeśli osoby odpowiedzialne za ich działalność nie zapewniły odpowiedniego porządku zebrania, mityngu, marszu ulicznego, demonstracji, pikiety, co doprowadziło do wyrządzenia szkody o dużej wartości lub w istotny sposób zaszkodziło prawom i interesom obywateli, organizacji lub interesom państwowym i społecznym".

18 stycznia Ministerstwo Sprawiedliwości podjęło decyzję o wycofaniu swojego pozwu z Sądu Najwyższego, po tym, jak liderzy organizacji „Perspektywa" złożyli wyjaśnienia, że kierownictwo stowarzyszenia nie podejmowało decyzji o udziale jej przewodniczącego w akcji protestu przedsiębiorców, a on sam nie miał żadnych pełnomocnictw, by reprezentować stowarzyszenie podczas masowych akcji.

АНАТОЛЬ ШУМЧАНКА

Анатоль Шумчанка – лідэр прадпрымальнікаў, старшыня прадпрымальніцкага грамадзкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Анатоль Шумчанка быў арыштаваны 1 сакавіка 2005 году за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў і асуджаны на 10 сутак адміністратыўнага арышту. 11 сакавіка А. Шумчанка быў пераведзены ў СІЗА г. Менску ў сувязі з тым, што яго абвінавацілі ў зьбіцці сукамерніка. Абвінавачаньне прад'яўлена па арт. 339 ч. 1 Крымінальнага кодэксу – хуліганства.

18 сакавіка 2005 г. Анатолю Шумчанку прад'яўлена абвінавачаньне па арт. 331 КК РБ – хуліганства.

31 сакавіка 2005 г. Анатоль Шумчанка вызвалены зь Менскага сьледчага ізалятару паводле пастановы Менскай пракуратуры, якая спыніла крымінальную справу супраць яго з прычыны «малой значнасьці злачынства».

Напачатку студзеня 2008 г. Міністэрства юстыцыі падало ў Вярхоўны суд пазоў аб ліквідацыі Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва». У паведамленьні, разьмешчаным на сайце міністэрства, адзначалася, што «10 студзеня 2008 году ў Менску прайшоў несанкцыянаваны мітынг прадпрымальнікаў, у якім нараўне зь іншымі асобамі прыняў актыўны ўдзел лідэр Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва» Анатоль Шумчанка». Далей мінюст выказваў намер ліквідаваць арганізацыю: «З часткі другой артыкулу 15 закона «Аб масавых мерапрыемствах» вынікае, што грамадзкія аб'яднаньні, адказныя асобы якіх не забясьпечылі належнага парадку арганізацыі і правядзеньня сходу, мітынгу, вулічнага шэсьця, дэманстрацыі і пікетаваньня, што пацягнула прычыненьне шкоды ў буйным памеры або істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзян, арганізацый альбо дзяржаўным або грамадзкім інтарэсам, могуць быць ліквідаваныя». Аднак 18 студзеня Міністэрства юстыцыі прыняло рашэньне аб адзове зь Вярхоўнага суду іскавай заявы аб ліквідацыі «Пэрспэктывы» пасьля тлумачэньняў лідэраў арганізацыі, кіраўніцтва якой не прымала рашэньне аб ўдзеле ў несанкцыянаваным мітынгу яе кіраўніка, а ён «не надзяляўся якімі-небудзь паўнамоцтвамі прадстаўляць грамадзкае аб'яднаньне на ўдзел у правядзеньні якіх-небудзь масавых мерапрыемстваў». Зыск мінюсту, пададзены ў Вярхоўны Суд, быў адкліканы.

FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

ALEKSIEJ SZYDŁOWSKI

Aleksiej Szydłowski jest młodzieżowym działaczem demokratycznym. Urodził się 27 grudnia 1978 r. w mieście Stołpce w obwodzie mińskim. Był członkiem „Młodego Frontu" i jednym z założycieli młodzieżowego ruchu „Żubr". Po ukończeniu szkoły średniej rozpoczął studia dziennikarskie na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym, jednak z powodu aresztowania nie ukończył ich.

KRONIKA REPRESJI

Szydłowski został zatrzymany 25 sierpnia 1997 r. w Stołpcach. 24 lutego 1998 r. 19-letni wówczas Aleksiej Szydłowski został skazany na 1,5 roku pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Sąd w Mińsku uznał Szydłowskiego oraz innego członka „Młodego Frontu", Wadima Łabkowicza, za winnych dopuszczenia się „złośliwego chuligaństwa, zbezczeszczenia symboli państwowych i umyślnego uszkodzenia dóbr historyczno-kulturowych". W sierpniu 1996 r. w miejscowości Stołpce napisali na ścianach domów oraz na pomnikach Lenina i Dzierżyńskiego, między innymi: „Paźniak nasz prezydent" i „Niech żyje Białoruś!", pokryli je także białoruskimi symbolami narodowymi, a także podmienili czerwono-zieloną flagę na biało-czerwono-białą i wywiesili w mieście kilkanaście flag narodowych.

Do zakończenia procesu, Szydłowski przetrzymywany był 6 miesięcy najpierw w areszcie śledczym w Żodinie, a później na Wołodarce.

Aleksiej Szydłowski skorzystał z amnestii 2 dni przed końcem swojej kary – 23 lutego 1999 r. Przyjaciele, bliscy i koledzy z „Młodego Frontu" zamierzali 25 lutego powitać Szydłowskiego przed więzieniem na ul. Kalwaryjskiej. Zgodnie z białoruskim ustawodawstwem, osoba, która skorzystała z amnestii, w przypadku kolejnego wyroku nie może być nią objęta przez okres kolejnych 10 lat.

Pod koniec 2007 r. (5 grudnia) w jednym ze sklepów w Mińsku doszło do incydentu – pomiędzy Szydłowskim i zupełnie obcymi ludźmi wywiązała się kłótnia dotycząca portretu Łukaszenki, który wisiał nad kasą w sklepie. Nieznajomi sprowokowali bójkę i wezwali milicję. Funkcjonariusze pojawili się bardzo szybko. Nie było wątpliwości, że całe zajście było prowokacją. Aleksiej Szydłowski uczestniczył w wielu akcjach opozycji i niejednokrotnie otrzymywał areszty administracyjne, jednak dopiero po bójce w sklepie wszczęto przeciwko niemu sprawę karną o rzekome chuligaństwo. Wtedy Szydłowski zdecydował się na opuszczenie Białorusi. Obecnie mieszka wraz z rodziną w Czechach.

АЛЯКСЕЙ ШЫДЛОЎСКІ

Маладзевы дэмакратычны актывіст. Нарадзіўся 27 сьнежня 1978 году ў г. Стоўбцы Менскай вобласьці. Быў сябрам «Маладога Фронту», адным са стваральнікаў моладзевага руху «Зубр». Пасьля школы паступіў у БДУ на факультэт журналістыкі, аднак скончыць яго не ўдалося з-за арышту.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманьне Аляксея адбылося 25 жніўня 1997 г. ў Стоўбцах. 24 лютага 1998 года 19-гадовы Аляксей Шыдлоўскі быў асуджаны на 1 год і 6 месяцаў пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму.

Прысуд вынес Менскі абласны суд, які прызнаў Аляксея Шыдлоўскага, разам зь іншым маладафронтаўцам, 16-гадовым менчуком Вадзімам Лабковічам, вінаватым у нанясеньні ў Стоўбцах палітычных графіці: на будынку райвыканкаму актывісты напісалі «Жыве Беларусь», «Пазьняк – наш прэзыдэнт», а таксама замянілі чырвона-зялёны сьцяг на бел-чырвона-белы і вывесілі ў горадзе каля дзясятка нацыянальных сьцягоў. Гэты ўчынак быў кваліфікаваны як хуліганства.

Да вынясеньня прысуду Аляксей правёў 6 месяцаў у зьняволеньні: спачатку ў Жодзінскім СІЗА, потым яго перавялі ў Менск на «Валадарку».

Аляксей Шыдлоўскі быў амніставаны ўладамі за 2 дні да афіцыйнага сканчэньня ягонага турэмнага тэрміну – 23 лютага 1999 г. Зроблена гэта было адмыслова з дзьвюх прычынаў. Па-першае, сябры, родныя і паплечнікі па МФ зьбіраліся сустракаць Аляксея пад сьценамі менскай турмы на вул. Кальварыйскай 25 лютага. Па-другое, згодна зь беларускім заканадаўствам, асоба, якая была амніставаная, у выпадку новага асуджэньня ня можа ізноў трапіць пад амністыю на працягу 10 гадоў.

Верагодна, менавіта апошняя акалічнасьць і адыграла галоўную ролю ў далейшым лёсе Аляксея. Напрыканцы 2007 г. (5 сьнежня) у адной з крамаў Менску зь ім адбыўся інцыдэнт, калі паміж ім і незнаёмымі людзьмі разгарэлася спрэчка наконт партрэту Лукашэнкі, які вісеў над касаю крамы. Невядомыя справакавалі бойку і выклікалі міліцыю, якая зьявілася імгненна. Было ўражаньне, што ўся гэтая «выпадковасьць» падстроена адмыслова. Аляксей шмат удзельнічаў у акцыях апазыцыі і неаднаразова патрапляў пад адміністратыўны арышт у ізалятары на вул. Акрэсьціна. Аднак пасьля сутычкі ў краме супраць Шыдлоўскага была ўзбуджаная новая крымінальная справа нібыта за хуліганства, і ён прыняў рашэньне пакінуць Беларусь. Зараз жыве і працуе ў Чэхіі, мае там сям'ю.



FOT. JULIA DARASHKEVICH

TATIANA TYSZKIEWICZ

Tatiana Tyszkiewcz, działaczka ruchu „JEANS – za wolność" i kampanii „Europejskiej Białorusi", jest jedną z działaczek skazanych w „Sprawie czternastu".

KRONIKA REPRESJI

10 stycznia 2008 r. Tatianę Tyszkiewcz zatrzymano za udział w akcji przedsiębiorców. Została pobita przez funkcjonariuszy OMON-u w autobusie milicyjnym w czasie przewożenia na posterunek milicji. Tego dnia kilka tysięcy osób wzięło udział w akcji protestu przedsiębiorców przeciwko dekretowi nr 760 wydanemu przez prezydenta. Podczas akcji zatrzymano kilkadziesiąt osób, wielu demonstrantów zostało dotkliwie pobitych przez milicję.

Początkowo Tatiana Tyszkiewicz została skazana na 20 dni aresztu administracyjnego. Po zwolnieniu z aresztu na Okrestinie relegowano ją z uczelni. Tatiana Tyszkiewicz była wtedy studentką 1. roku Akademii Wychowania Fizycznego, na kierunku „trener jeździectwa". O relegowaniu poinformowali ją dziekan wydziału, Aleksander Michajłowicz Szachłaj, prorektor ds. studenckich Alieksiej Gieniatowicz Gatatullin i rektor Michaił Jefimowicz Kobryński, podając jako przyczynę relegowania naruszenie prawa administracyjnego.

Przedstawiono jej zarzuty z art. 342, pkt 1 KK RB – „Organizacja lub aktywny udział w grupowych działaniach w poważny sposób naruszających porządek publiczny".

22 kwietnia sędzia sądu w Mińsku, Jeliena Ilina, skazała Tyszkiewicz na 2 lata ograniczenia wolności bez skierowania do zakładu poprawczego. Wkrótce po wydaniu wyroku Tyszkiewicz opuściła Białoruś i wyjechała do Polski na studia.

W kwietniu 2009 r. białoruskie władze zamierzały wydać list gończy za młodą aktywistką. Jeszcze przed procesem, w sierpniu 2007 roku, Tatiana Tyszkiewicz została pobita przez funkcjonariuszy w cywilu, podczas gdy próbowała zapobiec aresztowaniu swojego kolegi z „Europejskiej Białorusi", Nikity Sasima. Dziewczyna trafiła do szpitala z diagnozą „lekki uraz głowy". 23 maja 2007 r. na Tyszkiewicz napadli funkcjonariusze w cywilu podczas młodzieżowej akcji protestu „Nie – zniesieniu ulg!" w centrum Mińska.

ТАЦЯНА ЦІШКЕВІЧ

Тацяна Цішкевіч – актывістка руху «JEANS – за Свабоду!» і кампаніі «Эўрапейская Беларусь», адна з асуджаных па «справе 14-ці».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 2008 годзе за ўдзел у акцыі прадпрымальнікаў 10 студзеня была затрыманая і зьбітая АМАПаўцамі ў аўтазаку падчас дастаўкі ў Цэнтральны РАУС. (10 студзеня 2008 году некалькі тысяч чалавек бралі ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў супраць прэзыдэнцкага ўказу № 760. У той дзень было затрымана некалькі дзясяткаў грамадзянаў, многія зь якіх пры гэтым былі моцна зьбітыя).

Спачатку Тацяну асудзілі на адміністратыўны тэрмін, больша за звычайны, вызначаны Кодэксам аб адміністратыўных праваапарушэньнях – 20 сутак арышту. Пасьля вызваленьня зь ізалятару на Акрэсьціна яе адлічылі з ВНУ. Тацяна Цішкевіч вучылася на 1-м курсе Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту фізычнай культуры на факультэце спартовых гульняў і адзінаборстваў па спэцыяльнасьці «трэнер коннага спорту». Пра адлічэньне ёй паведамілі дэкан Шахлай Аляксандар Міхайлавіч, прарэктар па навучальна-выхаваўчай працы Гататулін Аляксей Геньятавіч і рэктар Кобрынскі Міхаіл Яўхімавіч. Прычына адлічэньня – адміністрацыйнае правапарушэньне, накіраванае супраць грамадзкай маралі і маральнасьці.

Дзяўчыне было прад'яўлена абвінавачваньне па па ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак).

22 красавіка судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Алена Ільіна вынесла, у ліку іншых, прысуд Тацяне Цішкевіч: два гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.

Неўзабаве пасьля прысуду Тацяна пакінула Беларусь, зьехаўшы вучыцца ў Польшчу.

У красавіку 2009 г. беларускія ўлады спрабавалі абвесьціць актывістку ў вышук.

Яшчэ перад сваім асуджэньнем, у жніўні 2007 г., Тацяна Цішквіч была зьбітая «асобамі ў цывільным» пры спробе прадухіліць затрыманьне паплечніка па «Эўрапейскай Беларусі» Мікіты Сасіма. Тады дзяўчына патрапіла ў шпіталь з дыягназам «лёгкая чэрапна-мазгавая траўма». А 23 траўня 2007 г. на Тацяну Цішкевіч напалі невядомыя ў цывільнай вопратцы падчас акцыі пратэсту моладзі «Не – адмене ільготаў!» у цэнтры Менску.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

DZMITRIJ US

Dzmitrij Us to białoruski polityk, prawnik, przedsiębiorca, kandydat na prezydenta Republiki Białoruś w wyborach prezydenckich 2010 r. Urodził się 10 czerwca 1971 r. w Mińsku. Studiował zaocznie prawo na Uniwersytecie Grodzieńskim. Pracował w fabryce „Intehrał" jako budowniczy. W 1992 r. został dyrektorem wydawnictwa „Trywium". W latach 1999–2003 był radnym mińskiej Rady Miejskiej. W 2003 i 2007 r. również miał zamiar kandydować do Rady, jednak nie zarejestrowano jego kandydatury.

W 2010 r. brał udział w wyborach do lokalnych rad poselskich, w których uzyskał wynik 33% i nie dostał się do Rady. Jego wyborcy zwracali się do CKW z prośbą o ponowne liczenie głosów oddanych na Usa.

Był jednym z kandydatów w wyborach prezydenckich 19 grudnia 2010 r.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany w Mińsku w nocy z 19 na 20 grudnia po masowej akcji protestu na Placu Niepodległości. Spędził w areszcie śledczym KGB całą dobę. 20 grudnia został wypuszczony, otrzymał jednak zakaz opuszczania miejsca zamieszkania.

Przez długi czas miał status podejrzanego w sprawie karnej o „masowe zamieszki". 18 marca 2011 r. przedstawiono mu zarzuty z artykułu 293 KK RB (oskarżono go o organizację masowych zamieszek). Śledczy nakłaniali Dzmitrija Usa, by zeznawał przeciwko swojemu przyjacielowi Mykole Statkiewiczowi i grozili, że jeśli odmówi, otrzyma karę pozbawienia wolności. Odmówił.

26 maja 2011 r. sąd w Mińsku skazał go na 5,5 roku pozbawienia wolności w kolonii karnej o zaostrzonym rygorze. Karę odbywał w Kolonii Karnej nr 19 w Mohylewie.

1 października 2011 r. został zwolniony na podstawie dekretu Łukaszenki o ułaskawieniu.

ЗЬМІЦЕР УС

Нарадзіўся ў 1971 годзе ў Менску. Скончыў юрыдычны факультэт Гарадзенскага ўнівэрсытэту. Беспартыйны. Жанаты, выхоўвае сына.

Працаваў рабочым на заводзе «Інтэграл» у Менску, пазьней – у сфэры будаўніцтва. З 1992 г. – дырэктар выдавецтва «Трывіюм».

У 1999–2003 гг. зьяўляўся дэпутатам Менскага гарадскога савету, зьбіраўся балятавацца туды таксама на выбарах у 2003 і 2007 гг., але яго не зарэгістравалі.

У 2010 г. браў удзел ў выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, але прайграў, набраўшы 33 адсоткі галасоў выбаршчыкаў.

Адзін з кандыдатаў на прэзыдэнта на выбарах 19 сьнежня 2010 г.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Затрыманы ў Менску ў ноч з 19 на 20 сьнежня 2010 г. пасьля масавай акцыі пратэсту. Першыя суткі ўтрымліваўся ў СІЗА КДБ, але ўдзень 20 сьнежня быў выпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе.

Доўгі час зьяўляўся падазраваным па справе аб масавых беспарадках, абвінавачаньне па арт. 293 КК РБ прад'яўленае толькі 18 сакавіка 2011 г. (яго вінавацілі ў арганізацыі масавых беспарадкаў). Зьміцер Ус заяўляў пра ціск на яго з боку органаў сьледства з мэтай атрыманьня абвінаваўчых паказаньняў на яго сябра Міколу Статкевіча. У выпадку адмовы даць гэткія паказаньні Усу пагражалі турэмным тэрмінам. Ён адмовіўся.

26 траўня 2011 г. у Ленінскім судзе Менску Зьміцер Ус быў асуджаны да 5,5 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Адбываў тэрмін у магілёўскай калёніі № 19. Вызвалены (на падставе ўказу кіраўніка дзяржавы аб памілаваньні) 1 кастрычніка 2011 г.

ANDREJ WALABUJEU

Andrej Walabujeu był oskarżony w sprawie Marszu Wolności 1999. W chwili zatrzymania miał 17 lat, był po szkole wieczorowej i jako najstarszy syn (w wielodzietnej rodzinie) rozpoczął pracę, by wesprzeć finansowo rodziców.

KRONIKA REPRESJI

Andrej Walabujeu został zatrzymany razem z przyjaciółmi – Hermanem Suszkiewiczem i Glebem Dogilem – po Marszu Wolności w przejściu metra przy Placu Zwycięstwa (Plac Pobiedy). Młodzi ludzie rozmawiali, kiedy podeszło do nich pięciu funkcjonariuszy w cywilu. Milicjanci zabrali chłopców samochodem na posterunek. Stamtąd przewieziono Walabujeua do aresztu, gdzie przetrzymywano go 3 dni. Przedstawiono mu zarzuty z art. 186, pkt 3 KK RB. Otrzymał zakaz opuszczania miejsca zamieszkania.

Andrej Walabujeu opuścił Białoruś i wkrótce otrzymał status uchodźcy w Polsce, gdzie też rozpoczął studia. Los jego przyjaciół był podobny – zostali skazani w tej samej sprawie. Proces sądowy rozpoczął się 12 grudnia 2001 roku, w przededniu Marszu Wolności. Sprawę rozpatrywał miński sąd. Młodzi ludzie byli oskarżeni z artykułu 186, pkt 3 – „Organizacja lub udział w grupowych działaniach, w poważny sposób naruszających porządek publiczny” oraz z artykułu 201, pkt 2 – „Złośliwe chuligaństwo”. Zarzucano im, że podczas starć demonstrantów z milicjantami rzucali w milicjantów płytami chodnikowymi, które były składowane w remontowanym parku Gorkiego. 2 stycznia 2002 r. Andrej Walabujeu wraz z trójką innych oskarżonych, został skazany przez miński sąd na karę grzywny w wysokości 50 płac minimalnych.

АНДРЭЙ ВАЛАБУЕЎ

Андрэй Валабуеў – фігурант крымінальнай «справы Маршу Свабоды-1999». На момант затрыманьня яму было 17 гадоў, ён уладкоўваўся на ВА «Гарызонт» пасьля вячэрняй школы. Як старэйшы сын у сям'і, якая мае чацьвёра дзяцей, пайшоў працаваць.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Андрэй Валабуеў быў затрыманы разам зь сябрамі – Германам Сушкевічам і Глебам Догілем – пасьля «Маршу Свабоды» ў пераходзе мэтро «Плошча Перамогі». Маладыя людзі размаўлялі паміж сабою, калі да іх падыйшлі пяцёра чалавек у цывільным, заламалі хлопцам рукі і пацягнулі ў машыны. З Савецкага РАУСу, куды былі завезеныя затрыманыя, А. Валабуева ў ліку іншых перавезьлі ў ізалятар часовага ўтрыманьня, дзе пратрымалі трое сутак. Яму было прад'яўленае абвінавачаньне па арт. 186.3 КК РБ і вызначаная мера стрыманьня – падпіска аб нявыезьдзе.

Андрэй Валабуеў пакінуў Беларусь і неўзабаве атрымаў палітычны прытулак у Польшчы, дзе паступіў вучыцца ва ўнівэрсытэт. Такі самы быў і лёс яго сяброў – «падзельнікаў» па крымінальнай справе.

Судовы працэс распачаўся толькі 12 сьнежня 2001 году, напярэдадні маючага адбыцца «Маршу Свабоды-2». Справу разглядаў Менскі гарадзкі суд. Адсутнасьць падсудных у краіне не спыніла перасьледу. Маладыя людзі абвінавачваліся па двух крымінальных артыкулах: 186.3 – «арганізацыя ці ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак», і 201 ч. 2 – «злоснае хуліганства». Ім ставілася ў віну тое, што падчас сутычкі зь міліцыяй хлопцы кідалі ў жаўнераў унутраных войскаў тратуарнай брукоўкай, якая была прызначаная для рамонту ў парку Горкага.

2 студзеня 2002 году Андрэй Валабуеў і яшчэ трое падсудных былі прысуджаныя Менскім гарадзкім судом да штрафу ў 50 мінімальных заробкаў.

ALEKSANDER WASILJEW



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Aleksander Wasiljew urodził się 18 marca 1946 r. we wsi Golicyno w obwodzie penzeńskim w Rosji. Po szkole wojskowej ukończył akademię artyleryjską w Leningradzie, służył w wojskach rakietowych i lądowych. W latach 1964–1991 służył w armii radzieckiej. Służbę zakończył w Osipowiczach w randze podpułkownika. Dwukrotnie służył w Niemieckiej Republice Demokratycznej, był świadkiem zburzenia muru berlińskiego. Razem z Walerijem Lewoniewskijem dowodził ogólnonarodowym komitetem strajkowym przedsiębiorców.

KRONIKA REPRESJI

7 września 2004 r. Wasiljew został aresztowany. Sąd uznał go winnym publicznego znieważenia prezydenta Aleksandra Łukaszenki, a także winnym zorganizowania mityngu przedsiębiorców 1 maja 2004 r. Skazano go na 2 lata pozbawienia wolności (w tej samej sprawie ten sam wyrok otrzymał Walerij Lewoniewskij). Oskarżenie jako dowód w sprawie, wykorzystało tekst ulotki pierwszomajowej, która była rozpowszechniana przez komitet strajkowy. W tekście wiersza widniejącego na ulotce sąd dopatrzył się znieważenia prezydenta. 7 lipca 2005 r. Wasiljew wyszedł na wolność w wyniku amnestii. Był przetrzymywany w więzieniu w Grodnie, w orszańskiej kolonii karnej, a następnie przebywał w więziennym szpitalu.

АЛЯКСАНДАР ВАСІЛЬЕЎ

Аляксандар Васільеў нарадзіўся 18 сакавіка 1946 г. у сяле Галіцына Пензенскай вобласьці Расеі. Пасьля вайсковай вучэльні скончыў артылерыйскую акадэмію ў Ленінградзе, служыў у ракетных частках сухапутных войскаў. З 1964 па 1991 г. – у Савецкай арміі, скончыў службу ў Асіповічах, падпалкоўнік. Двойчы служыў у ГДР, быў сьведкам разбурэньня Бэрлінскага муру.

Разам з Валерыем Леванеўскім кіраваў агульнанацыянальным страйкам прадпрымальнікаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

7 верасьня 2004 г. быў арыштаваны. Суд прызнаў Аляксандра Васільева вінаватым у нанясеньні публічнай абразы прэзыдэнту Аляксандру Лукашэнку, злучанай з абвінавачаньнем яго ў цяжкім злачынстве, а таксама ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу прадпрымальнікаў 1 траўня 2004 г.

Быў асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі (па гэтай жа справе такі самы тэрмін прысудзілі і Валерыю Леванеўскаму). Абвінавачаньне выкарыстала тэкст першатравеньскай улёткі, распаўсюджанай лідэрамі страйкаму, зь вершам, у якім суд убачыў абразу прэзыдэнта.

7 ліпеня 2005 г. Аляксандар Васільеў выйшаў на волю паводле амністыі. Апроч гарадзенскай турмы, сядзеў у аршанскай папраўчай калёніі, а пасьля знаходзіўся ў рэспубліканскім турэмным шпіталі.

ILJA WASILJEWICZ

Ilja Wasiljewicz urodził się 6 sierpnia 1991 r. w Baranowiczach w obwodzie brzeskim. Wykształcenie podstawowe uzyskał w Gimnazjum nr 4 w Baranowiczach. Dostał się na mińską politechnikę. Uczył się bardzo dobrze, był starostą grupy.

KRONIKA REPRESJI

W nocy z 19 na 20 grudnia 2010 o godz. 1:15 Ilja został zatrzymany i aresztowany na 10 dni. Dopiero po dwóch dniach rodzicom udało się ustalić miejsce pobytu syna. Okazało się, że jest on w areszcie w Żodinie, w którym spędził 10 dni za udział w akcji protestu w Mińsku 19 grudnia 2010 r., po czym zwolniono go do domu. Okazało się też, że został relegowany z uczelni. 5 stycznia 2011 r. zaproszono go do kancelarii kolegium, by podpisał dokumenty o relegowaniu z politechniki. Tam czekali już na niego funkcjonariusze KGB. Zatrzymali go, by przeprowadzić działania śledcze w sprawie masowych zamieszek. Wasiljewiczowi powiedziano, że ma status podejrzanego w tej sprawie i przewieziono go najpierw na Okrestinę, a później Wasiljewicz siedział na Wołodarce. 14 maja 2011 r. skazano go na 3 lata pozbawienia wolności. 14 września 2011 roku, został ułaskawiony przez Łukaszenkę. Karę odbywał w Kolonii nr 19 w Mohylewie.

ІЛЬЛЯ ВАСІЛЕВІЧ

Нарадзіўся 6 жніўня 1991 году ў горадзе Баранавічы Берасьцейскай вобласьці. Атрымаў базавую адукацыю ў гімназіі № 4 г. Баранавічы. Паступіў у Менскі політэхнічны каледж. Выдатна вучыўся ў каледжы, быў старастам групы.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У 1:15 ночы зь 19 на 20 сьнежня 2010 г. з хлопцам пасьпела пагаварыць яго сястра перад незаконным 10-сутачным арыштам. Праз двое сутак сям'я знайшла Ільлю ў Жодзінскім СІЗА.

Ільля адседзеў 10 сутак арышту за ўдзел у акцыі пратэсту ў Менску 19 сьнежня і быў адпушчаны дадому. Яму паведамілі, што адміністрацыя Менскага політэхнічнага каледжа выключае яго з навучальнай установы.

5 студзеня 2011 г. малады чалавек быў запрошаны ў адміністрацыю каледжа для падпісаньня папераў пра выключэньне з вучобы, але ў навучальнай установе Ільлю чакалі супрацоўнікі КДБ. Яны затрымалі маладога чалавека для правядзеньня сьледчых дзеяньняў па крымінальнай справе аб масавых беспарадках. Ільлю Васілевічу паведамілі, што ён зьяўляецца падазраваным па дадзенай крымінальнай справе, і зьмясьцілі спачатку ў ІЧУ на Акрэсьціна, а потым – у СІЗА на вул. Валадарскага.

14 траўня 2011 г. ён быў асуджаны на 3 гады зьняволеньня. 14 верасьня 2011 г. – выйшаў на волю. Памілаваны Лукашэнкам. Адбываў пакараньне ў калёніі №19 г. Магілёву.

JAUHIEN WAŚKOWICZ

Jauhien Waśkowicz urodził się w Bobrujsku 26 lutego 1990 r. w rodzinie robotników. Po ukończeniu szkoły studiował w trybie zaocznym dziennikarstwo na Wydziale Filologicznym Uniwersytetu Państwowego im. Kuleszowa w Mohylewie. Pracował w redakcji gazety „Bobrujski Kurier".

Był zwolennikiem Białoruskiej Chrześcijańskiej Demokracji. Wziął udział w akcji na Placu Niepodległości w 2010 roku, za co został skazany na 12 dni aresztu. Karę odbył na Okrestinie.

KRONIKA REPRESJI

Został zatrzymany 17 stycznia w Mohylewie, dzień po akcji solidarności z białoruskimi więźniami politycznymi, w której wziął udział. Do Mohylewa przyjechał na sesję egzaminacyjną.

W maju 2011 r. Waśkowicz został skazany wraz z Artiomem Prakapienką i Pawłem Syramolatauem na 7 lat pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze za próbę podpalenia budynku KGB w Bobrujsku. Oskarżano ich o „złośliwe chuligaństwo" i „umyślne uszkodzenie mienia w dużym rozmiarze". Tymczasem w nocy z 16 na 17 października 2010 r. budynek KGB został obrzucony koktajlem Mołotowa przez nieznanych sprawców.

Prokurator Tołstik żądał dla nich od 7,5 do 8 lat pozbawienia wolności w kolonii o zaostrzonym rygorze. Zdaniem oskarżyciela z urzędu, śledztwo wykazało winę oskarżonych, a straty mogłyby sięgać ok. 2 mld rubli (ok. 0,45 mln dolarów).

Tołstik oświadczył, że „atak na KGB był jawnym wyzwaniem rzuconym społeczeństwu i demonstracją bezkarności".

Adwokaci podkreślali, że podsądni składali zeznania pod presją i nie zamierzali spalić budynku, a jedynie go uszkodzić. Zdaniem obrony, dowody prokuratora opierają się tylko na wyobrażeniach tego, co mogłoby się zdarzyć, podczas gdy rzeczywista szkoda spowodowana przez mężczyzn wyniosła 253 tysiące rubli (56,2 dolarów), które już zostały wypłacone.

Oprócz tego, jak oświadczyli adwokaci, białoruska telewizja nielegalnie wykorzystała na potrzeby swojego filmu zapisy wideo śledztwa przygotowawczego w sprawie ataku oskarżonych na budynek KGB. Młodzi ludzie zostali w nim przedstawieni jako osoby, które nie mają własnych zainteresowań, pasji, celów, chcą tylko niszczyć wszystko wokół.

Paweł Syramolatau i Artiom Prakapienka w swoim ostatnim słowie oświadczyli, że żałują popełnionego czynu. Prosili również o łagodny wyrok.

18 maja 2011 r. Waśkowicz został skazany przez sąd na 7 lat kolonii karnej o zaostrzonym rygorze.

Karę odbywał pierwotnie w Kolonii nr 15 w Mohylewie, a 12 października 2011 r. został przeniesiony do zamkniętego więzienia nr 4 w Mohylewie (zaostrzono mu rygor odbywania kary). Kilkakrotnie był przenoszony do karceru.

ЯЎГЕН ВАСЬКОВІЧ

Яўген Васьковіч нарадзіўся ў Бабруйску 26 лютага 1990 году ў сям'і рабочых. Пасьля школы вучыўся завочна на журналісцкім аддзяленьні філялягічнага факультэту Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Куляшова. Працаваў у газэце «Бобруйский курьер».

Прыхільнік партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя», якая актыўна ствараецца. Удзельнік Плошчы-2010, за якую быў пакараны – адседзеў 12 сутак на «Акрэсьціна».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Яго затрымалі 17 студзеня ў Магілёве на наступны дзень пасьля яго ўдзелу ў акцыі салідарнасьці зь беларускімі палітвязьнямі. У Магілёў ён прыехаў здаваць сэсію.

У траўні 2011 году Яўген Васьковіч быў асуджаны разам з Арцёмам Пракапенкам і Паўлам Сырамолатавым на 7 гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму за спробу падпалу ў ноч на 17 кастрычніка 2010 году будынку Бабруйскага КДБ, у які былі кінутыя бутэлькі з запальнай сумесьсю.

Яўгена Васьковіча, Арцёма Пракапенку і Паўла Сырамолатава судзілі па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу – «Злоснае хуліганства» і «Наўмыснае прычыненьне шкоды ў асабліва буйных памерах».

Пракурор Тоўсьцік прасіла суд прысудзіць маладых людзей да пазбаўленьня волі на тэрмін ад 7,5 да 8 гадоў з адбываньнем пакараньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Па словах дзяржабвінавачаньня, папярэдняе сьледзтва цалкам даказала віну падсудных. На думку пракурора, яны маглі проста зьнішчыць будынак КДБ, нанесеная шкода ў такім выпадку склала б каля двух мільярдаў рублёў (на той час – 444,44 тыс. даляраў).

Акрамя таго, заявіла Тоўсьцік, «напад на КДБ быў відавочным выклікам грамадзтву з дэманстрацыяй сваёй беспакаранасьці».

Адвакаты, у сваю чаргу, заўважылі, што іх падабаронныя давалі паказаньні пад ціскам і зьбіраліся не спаліць будынак, а толькі яго пашкодзіць. На думку абароны, довады абвінаваўцы грунтуюцца толькі на ўяўленьні таго, што магло б здарыцца, тады як рэальная шкода ад дзеяньняў маладых людзей складае 253 тыс. рублёў (56,2 даляра), якія ўжо выплачаныя.

Акрамя таго, заявілі адвакаты, Беларускае тэлебачаньне неправамерна выкарыстала відэазапісы папярэдняга сьледзтва аб нападзе падсудных на будынак КДБ для свайго фільму. Маладых людзей там паказалі як асобаў, што ня маюць уласных жыцьцёвых перакананьняў, якія гатовыя зьнішчыць усё, што толькі бачаць.

Адвакат Яўгена Васьковіча адзначыў, што малады чалавек растлумачыў матывы свайго ўчынку жаданьнем адказаць супрацоўнікам праваахоўных органаў, якія ўжываюць непрапарцыйныя дзеяньні ў дачыненьні да дэмакратаў. Абарона прасіла суд пакараць юнакоў, не пазбаўляючы іх волі.

Павал Сырамолатаў і Арцём Пракапенка у сваім апошнім слове заявілі, што раскайваюцца. Яны таксама прасілі суд аб літасьці ў вынясеньні прысуду. Яўген Васьковіч жа заявіў, што не шкадуе аб зробленым. Ён сказаў, што лічыць сябе ліцьвінам, а сваім абавязкам – абараняць нацыянальныя беларускія каштоўнасьці.

«За іх я памерці гатовы, таму што жыцьцё кароткае, а Радзіма вечная», – сказаў апазыцыянэр, дадаўшы, што ён не баіцца цяжкасьцяў і з годнасьцю іх пройдзе. Яўген Васьковіч скончыў свой выступ словамі «Жыве Беларусь!».

Спачатку адбываў пакараньне ў Магілёўскай калёніі № 15, а 12 кастрычніка 2011 году пераведзены на больш жорсткі рэжым – у памяшканьне крытага тыпу (ПКТ), у Магілёўскую турму № 4. Там ён некалькі разоў трапляў у штрафны ізалятар за непадпарадкаваньне.

SIARHIEJ WAŹNIAK



FOT. JULIA DARASHKEVICH

Siarhiej Waźniak to dziennikarz, społecznik i działacz polityczny, członek zarządu Białoruskiego Stowarzyszenia Dziennikarzy, członek Prezydium Komitetu Centralnego Białoruskiej Partii Lewicowej „Sprawiedliwy Świat".

Urodzony 14 kwietnia 1962 r. w Korostyszewie w obwodzie żytomierskim na Ukrainie. Ukończył Swierdłowską Wyższą Szkołę Wojskowo-Polityczną im. Leonida Breżniewa (1984). Jest oficerem, komisarzem politycznym sił zbrojnych. W cywilu jest nauczycielem historii i nauk społecznych.

W latach 1980–1991 służył w Siłach Zbrojnych ZSRR w Uralskim Okręgu Wojskowym, w Grupie Wojsk Radzieckich w Niemczech i w Białoruskim Okręgu Wojskowym, pełniąc funkcje zastępcy dowódcy kompanii samochodowej ds. politycznych, sekretarza komitetu Komsomołu w dywizji rakietowej, pomocnika kierownika wydziału politycznego pułku pancernego ds. komsomolskich, starszego instruktora w dziale komsomolskim zarządu politycznego okręgu, starszego instruktora Młodej Ligii Komunistycznej departamentu politycznego okręgu wojskowego. Służbę wojskową zakończył w stopniu majora.

Od 1992 r. zajmuje się dziennikarstwem. Pracował jako korespondent, a z czasem jako redaktor naczelny gazety wojskowej „Ku chwale ojczyzny" (1992–1993), był kierownikiem obsługi prasowego Ruchu Ludowej Białorusi (1993), zastępcą redaktora naczelnego gazety „My i Wremja" (1994–1995), redaktorem naczelnym gazety „Towariszcz" (od 1996).

Od 1982 r. był członkiem Komunistycznej Partii Związku Radzieckiego, od 1992 – członkiem partii Białoruskich Komunistów. Był pierwszym sekretarzem Centralnej Komisji Leninowskiej Młodej Ligii Komunistycznej Białorusi (1992–1997). Jest członkiem Centralnej Komisji Partii Białoruskich Komunistów (od 1993), która obecnie nazywa się „Sprawiedliwy Świat".

Gdy ogłoszono depolityzację armii, zakończył służbę wojskową w obawie opuszczenia szeregów partii. Był jednym z 14 delegatów XXII Nadzwyczajnego Zjazdu Wszechzwiązkowego Leninowskiego Komunistycznego Związku Młodzieży głosujących przeciwko likwidacji Komsomołu (1991). Założył organizację „Odrodzenie Leninowskiej Młodej Ligi Komunistycznej" i kierował jej komitetem organizacyjnym, który w lutym 1992 r. w lesie w pobliżu Pińska reaktywował kongres białoruskiego Komsomołu. Był wśród tych, którzy byli aktywnie zaangażowani w tworzenie Białoruskiej Partii Komunistycznej.

KRONIKA REPRESJI

W czasie wyborów prezydenckich w 2010 r. Siarhiej Waźniak pracował w sztabie kandydata na prezydenta, Uladzimira Niaklajeua. 20 grudnia został aresztowany w swoim mieszkaniu i osadzony w areszcie śledczym KGB. Pod koniec grudnia usłyszał zarzut organizacji lub udziału w działalności naruszającej porządek publiczny (art. 342, pkt 1 RB). 29 grudnia został zwolniony z aresztu, otrzymawszy zakaz opuszczaniu kraju.

20 maja 2011 r. zapadł wyrok – pozbawienie wolności na 2 lata w zawieszeniu.

СЯРГЕЙ ВАЗЬНЯК

Журналіст, грамадзкі і палітычны дзяяч. Сябра праўленьня БАЖ. Сябра Бюро ЦК Беларускай партыі левых «Справядлівы Сьвет».

Нарадзіўся 14 красавіка 1962 году ў горадзе Карастышаў Жытомірскай вобласьці (Украіна). Пасьля школы скончыў Сьвярдлоўскую вышэйшую вайскова-палітычную танкава-артылерыйскую вучэльню імя Л. Брэжнева (у 1984 г.). Афіцэр-палітработнік танкавых войскаў, цывільная спэцыяльнасьць – настаўнік гісторыі і грамадазнаўства.

У 1980–1991 гадах служыў ва Ўзброеных Сілах СССР (Уральская вайсковая акруга, Група савецкіх войскаў у Нямеччыне, Беларуская вайсковая акруга) на пасадах: намесьнік камандзіра аўтамабільнай роты па палітычнай частцы, сакратар камітэту камсамолу асобнага ракетнага дывізыёну, памочнік начальніка палітаддзелу асобнага танкавага палку па камсамольскай рабоце, старшы інструктар аддзяленьня камсамольскай работы палітаддзелу танкавай арміі, старшы інструктар аддзелу камсамольскай работы палітупраўленьня вайсковай акругі. Службу скончыў у званьні маёра.

З 1992 году займаецца журналістыкай. Працаваў карэспандэнтам, начальнікам аддзелу вайсковай газэты «Во славу Родины» (1992–1993 гг.), кіраўніком прэс-службы Народнага руху Беларусі (1993 г.), карэспандэнтам, намесьнікам галоўнага рэдактара газэты «Мы и время» (1994–1995 гг.). Галоўны рэдактар газэты «Товарищ» (з 1996 г.).

Член КПСС (з 1982 г.), Партыі камуністаў Беларускай (з 1992 г.). Быў першым сакратаром ЦК ЛКСМБ (1992–1997 гг.). Сябра ЦК ПКБ (з 1993 г.). Цяпер яна мае назву «Справядлівы Сьвет».

Звольніўся з войска, калі была абвешчаная яго дэпалітызацыя, каб не пакідаць партыйныя шэрагі. Быў у ліку 14 дэлегатаў XXII (надзвычайнага) зьезду ВЛКСМ, якія прагаласавалі супраць самаліквідацыі Камсамолу (1991 г.), хоць яшчэ знаходзіўся на вайсковай службе. Стварыў і ўзначаліў аргкамітэт «За адраджэньне ЛКСМБ», які ў лютым 1992 правёў у лесе пад Пінскам аднаўленчы зьезд беларускага камсамолу. Быў у ліку тых, хто актыўна займаўся стварэньнем Партыі камуністаў Беларускай.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У часе прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. працаваў у штабе кандыдата на прэзыдэнта Ўладзімера Някляева. Быў арыштаваны 20 сьнежня ва ўласнай кватэры і зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Пры канцы сьнежня яму прад'яўленае абвінавачаньне па крымінальнай справе, узбуджанай сьледчым упраўленьнем папярэдняга расьсьледаваньня ГУУС Менгарвыканкаму па чч. 1 і 2 арт. 293 КК (арганізацыя масавых беспарадкаў і ўдзел у іх).

З 29 сьнежня 2010 г. мера стрыманьня зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе.

30 сакавіка 2011 г. абвінавачваньне было перафармуляванае на ч. 1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак, ці ўдзел у іх).

20 траўня 2011 г. судом Фрунзенскага раёну Менску асуджаны на 2 гады пазбаўленьня волі ўмоўна.



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

WINCUK WIACZORKA

Wincuk Wiaczorka jest znanym białoruskim działaczem społecznym i politycznym, wykładowcą, naukowcem i filologiem, jednym z założycieli Białoruskiego Frontu Narodowego „Odrodzenie" (BNF) i jego przewodniczącym w latach 1999–2007.

Urodził się 7 lipca 1961 r. w Brześciu. W roku 1983 ukończył Wydział Filologiczny Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego, w 1986 r. – studia podyplomowe na Wydziale Językoznawstwa Akademii Nauk. W roku 1990 wykładał w Mińskim Państwowym Instytucie Pedagogicznym (obecnie Białoruski Państwowy Uniwersytet Pedagogiczny). Od roku 1990 pracował jako wykładowca w Białoruskim Liceum Humanistycznym i wydawnictwie historycznym „Spadczyna" (Dziedzictwo).

W 1979 r. Wincuk Wiaczorka był jednym z założycieli „Majsterni" – nieformalnego stowarzyszenia twórców, działającego do roku 1984. W latach 1979–1985 działał w wydawnictwie „Białoruska Talerancijna Gramada". W roku 1985 był jednym z założycieli Klubu im. W. Korotkiewicza. W latach 1986–1989 brał udział w słynnej inicjatywie „Talaka", z której wywodzi się wielu znanych białoruskich opozycjonistów i przedstawiciele świata kultury. W latach 1986–1990 był członkiem grupy „Nezależnaść", w latach 1988–1989 należał do Konfederacji Białoruskich Organizacji Młodzieżowych.

W 1988 r. był jednym z założycieli Białoruskiego Frontu Narodowego (BNF) oraz autorem jego założeń programowych. W 1980 wraz z Siarhiejem Dubowcem i Siarżukiem Sokołowem redagował periodyk literacko-polityczny „Żyrandol dni" (wydano 4 numery), którego wydawcą była „Białoruska Talerancijna Gramada". W latach 1986–1987 wraz z Siarhiejem Dubowcem i Alesiem Bialackim wydawał czasopismo „Buraczok", które przyciągnęło uwagę KGB. W latach 1990–1993 wchodził w skład redakcji „Wiadomości Białoruskiego Frontu Narodowego «Odrodzenie»".

KRONIKA REPRESJI

Represje wobec Wincuka Wiaczorki rozpoczęły się już w czasach Związku Radzieckiego. 13 czerwca 1984 został zatrzymany za uczestnictwo w mityngu protestacyjnym przeciwko wyburzeniu mińskiego dziewiętnastowiecznego teatru obok Konserwatorium.

Przeciw Wincukowi Wiaczorce wszczęto sprawę karną w związku z wydarzeniami 25 marca 1996, kiedy to rozpędzono demonstrację w Dniu Woli. Wiaczorka został oskarżony o wywieranie nacisku na urzędnika Centrali Rejonowego Oddziału Milicji w Mińsku. Oprócz tego, rankiem 27 kwietnia, po rozpędzeniu demonstracji „Czarnobylskiego Szlaku", Wincuk został zatrzymany przez milicję, przed własnym domem. Przetrzymywano go w areszcie cztery dni i wypuszczono gdy rozpoczął strajk głodowy. Po ok. półtora roku umorzono sprawę karną.

Wincuka często zatrzymywano podczas akcji opozycji. Był skazywany w procesach administracyjnych na kary grzywny i aresztu do 15 dni.

Rodzina Wincuka Wiaczorki również była represjonowana, a najbardziej jego syn.

2 września 2004 Wiaczorka złożył skargę do Prokuratury Rejonu Centralnego w Mińsku na bezprawne działania funkcjonariuszy milicji, którzy 1 września zatrzymali go wraz z niepełnoletnim wówczas synem Franakiem, podczas akcji „Chcemy uczyć się po białorusku!". W skardze mówi on m.in., że wbrew prawu, nie poinformowano go o miejscu przetrzymywania jego syna.

W roku 2009 syn Wincuka Wiaczorki, Franak, został wcielony do wojska, wprost ze szpitala, w którym był operowany. Funkcjonariusze służb specjalnych wtargnęli do szpitala, wykręcili ręce Franakowi, skuli go i wyprowadzili w celu doprowadzenia na komisję wojskową. Krzyki syna Wincuk mógł słyszeć przez telefon. Pojawił się wraz z żoną Ariną w komisji wojskowej, nie wpuszczono go jednak za bramę. Franaka zwolniono z wojska ze względu na stan zdrowia, na trzy miesiące przed końcem służby. Grożono mu sprawą karną za prowadzenie i publikowanie pamiętnika w trakcie odbywania służby.

ВІНЦУК ВЯЧОРКА

Вядомы беларускі палітычны і грамадзкі дзяяч, выкладчык, навуковец-філёляг. Адзін з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне» (БНФ) у 1988 годзе, з 1999 па 2007 гг. – ягоны кіраўнік.

Нарадзіўся 7 ліпеня 1961 г. у Берасьці. У 1983 скончыў філялягічны факультэт БДУ, у 1986 – асьпірантуру пры інстытуце мовазнаўства Акадэміі Навук. З 1990 выкладаў у Менскім дзяржаўным пэдагагічным інстытуце (зараз – Беларускі дзяржаўны пэдагагічны ўнівэрсытэт). З 1990 працаваў выкладчыкам у Беларускім гуманітарным ліцэі і ў гістарычным часопісе «Спадчына».

У 1979 г. Вінцук Вячорка стаў адным з заснавальнікаў «Майстроўні» – нефармальнай творчай суполкі, якая дзейнічала да 1984. У 1979–1985 гг. браў удзел у дзейнасьці самвыдавецкай суполкі «Беларуская Талерантцыйная Грамада». У 1985 г. быў адным з заснавальнікаў Клюбу імя Ўл. Караткевіча. У 1986–1989 уваходзіў у знакамітую «Талаку», якая дала Беларусі шмат вядомых актывістаў апазыцыі і дзеячаў культуры. У 1986–1990 гг. уваходзіў у групу «Незалежнасьць», у 1988–1989 – у Канфэдэрацыю Беларускіх Моладзевых Суполак.

Браў актыўны ўдзел ва ўтварэньні Беларускага Народнага Фронту (БНФ) у 1988 годзе. Адзін з аўтараў тэксту праграмы БНФ.

У 1980 разам зь Сяргеем Дубаўцом і Сяржуком Сокалавым выдаваў пазацэнзурны літаратурны і палітычны часопіс «Люстра дзён» (выйшла 4 нумары), які падпісваўся калектыўным псэўданімам «Беларуская Талерантцыйная Грамада». У 1986–1987 разам зь Сяргеем Дубаўцом і Алесем Бяляцкім выдаваў самвыдавецкі часопіс «Бурачок», які выклікаў пільную ўвагу КДБ. З 1990 па 1993 уваходзіў у склад рэдакцыі «Навінаў Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Вінцук Вячорка адчуў на сабе прэсінг з боку недэмакратычных уладаў яшчэ за савецкім часам: 13 чэрвеня 1984 г. ён быў затрыманы за ўдзел у мітынгу пратэсту супраць зноса будынку тэатра 19 стагоддзьдзя ў Менску ў раёне кансэрваторыі.

Супраць Вінцука Вячоркі была распачата крымінальная справа ў сувязі з падзеямі 25 сакавіка 1996 г., калі было разагнанае сьвяточнае шэсьце ў гонар Дня Волі. Вячорка быў абвінавачаны ў ціску на супрацоўніка Цэнтральнага райаддзела міліцыі Менска падпалкоўніка. Акрамя таго, раніцай 27 красавіка, пасьля разагнанага напярэдадні «Чарнобыльскага Шляху», сп. Вінцука затрымала міліцыя ў двары дома, дзе ён жыў. Чацьвёра сутак палітык правёў пад арыштам і быў вызвалены толькі таму, што адразу ж пачаў галадоўку пратэсту. Прайшло прыблізна паўтары гады, перш чым крымінальная справа была спынена. Аднак і перад ёю, і пасьля спадар Вінцук неаднойчы быў затрыманы падчас акцый апазыцыі. Яго асуджалі па адміністратыўных справах на штрафы альбо арышты тэрмінам у 15 сутак.

Вінцук Вячорка стаў адным з тых беларусаў, у каго пад рэпрэсіі рэжыма патрапіла сям'я. Найбольшы ціск выпаў на долю сына вядомага палітыка.

2 верасьня 2004 г. В. Вячорка падаў скаргу ў пракуратуру Цэнтральнага раёну г. Менска на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі, якія затрымлівалі і зьбівалі ягонага непаўнагадовага сына Франака падчас акцыі 1 верасьня «Хочам вучыцца па-беларуску!». У скарзе сярод іншага адзначалася, што, насуперак патрабаваньням закону, аб месцазнаходжаньні сына не было паведамлена ягоным бацькам.

У 2009 г. сына Вінцука Вячоркі Франака забралі ў войска, не даўшы яму скончыць мэдычнае абследаваньне пасьля нядаўняй апэрацыі. Супрацоўнікі спэцслужбаў у цывільным уварваліся ў бальнічную палату, выкруцілі Франаку рукі, надзелі кайданкі і вывалаклі хлопца, каб даставіць у ваенкамат. Крыкі сына Вінцуку чуў праз тэлефон. Разам з жонкай Арынай ён прыбыў да ваенкамату, але ахова нават не пусьціла іх за браму. Пазьней Франак быў дэмабілізаваны па стане здароўя за тры месяцы да канца службы. Яму пагражалі крымінальнай справай за вядзеньне дзённікаў падчас службы і іх апублікаваньне.

ALEŚ WIECZER

Aleś Wieczer, białoruski uczony, dorastał w Mińsku, w rodzinie biologów. Przyjaźnił się z synami premiera Białorusi, Michaiła Czigira, co przypłacił więzieniem.

KRONIKA REPRESJI

Aleś Wieczer trafił do więzienia w 1996 r. na podstawie sfabrykowanych zarzutów o kradzież części zapasowych do samochodu. Stało się to, gdy zmieniono status Alesia Wieczera ze świadka na oskarżonego po tym, jak Wieczer nawet pod groźbą tortur odmówił składania fałszywych zeznań przeciwko swojemu przyjacielowi z dzieciństwa – Aleksandrowi Czigirowi – jednemu z synów byłego premiera Białorusi, Michaiła Czigira.

Aleś Wieczer mógł opowiedzieć o tych zdarzeniach dopiero po 3 latach, które spędził w więzieniu (skazano go na 5 lat pozbawienia wolności). Gdy odbywał karę w kolonii, funkcjonariusze milicji organizowali prowokacje przeciwko jego żonie, Wierze, która pozostała w domu sama z maleńkim dzieckiem. Próbowano również napaści na mieszkanie. Wieczer został uwolniony w 1999 r. i wyemigrował do USA, zabrał tam żonę i syna. Wiadomo również, że Wieczer próbował kontynuować swoje badania naukowe, jednak już nie na Białorusi.

АЛЕСЬ ВЕЧАР

Алесь Вечар – беларускі навуковец, вырас у Менску ў сям'і патомных навукоўцаў-біёлягаў у некалькіх пакаленьнях. Сябра дзяцінства сыноў прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Чыгіра, за што фактычна і пацярпеў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Патрапіў у турму ў 1996 г. па сфабрыкаванай справе аб крадзяжы аўтамабільных запчастак. Фактычна сьледчыя перавялі Алеся ў абвінавачаныя са сьведкаў пасьля таго, як ён нават пад катаваньнямі адмовіўся даваць ілжывыя паказаньні супраць свайго сябра дзяцінства Аляксандра Чыгіра – аднаго з сыноў на той час ужо апальнага былога прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Чыгіра.

Алесь Вечар змог распавесьці пра абставіны гэтай справы толькі пасьля трох гадоў, якія ён правёў у зьняволеньні (увесь тэрмін, да якога яго асудзілі, складаў 5 гадоў).

Падчас знаходжаньня А. Вечара ў калёніі супрацоўнікамі спэцслужбаў таксама праводзіліся правакацыі супраць яго жонкі Веры, якая заставалася дома адна з маленькім дзіцём, таксама былі спробы нападу на кватэру сям'і.

Пасьля вызваленьня ў 1999 годзе Алесь Вечар эміграваў у Злучаныя Штаты Амэрыкі, неўзабаве забраўшы туды жонку і сына. Вядома толькі, што ён зьбіраўся і надалей працягваць свае навуковыя дасьледаваньні, але цяпер не ў Беларусі.

PAWEŁ WINOGRADAU



FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Paweł Winogradau urodził się 24 kwietnia 1988 r. w Mińsku. Ukończył Szkołę Zawodową nr 4, zdobywając zawód fryzjera, a także szkołę muzyczną w klasie fortepianu.

Przez kilka lat był działaczem kampanii obywatelskiej „Europejska Białoruś". W związku ze swoją działalnością polityczną był kilkakrotnie zatrzymywany przez milicję. Do pierwszego zatrzymania doszło w 2007 r. podczas akcji przeciwko zniesieniu ulg socjalnych: Winogradau trafił na posterunek, gdy próbował wyrwać z rąk milicjanta swoją dziewczynę, Swietłanę. Wtedy skazano go na 5 dni aresztu. W 2008 r. został oskarżony w „Sprawie czternastu" z artykułu 342 KK. Sprawę wszczęto z powodu jego udziału w mityngu przedsiębiorców 10 stycznia 2008 r. i skazano na 2 lata ograniczenia wolności bez skierowania do zakładu poprawczego. Po roku objęła go amnestia. W tym czasie pracował jako ślusarz. Od 2010 r. był działaczem kampanii „Mów prawdę!" i brał udział w wielu jej akcjach. Podczas wyborów w 2010 r. był jednym z najbardziej aktywnych członków sztabu Uladzimira Niaklajeua.

KRONIKA REPRESJI

Winogradau został zatrzymany w nocy z 4 na 5 stycznia 2011 r. Dokonano rewizji w jego mieszkaniu i przestawiono mu zarzuty z art. 293, pkt 1 i 2 KK RB – „Organizacja i udział w masowych zamieszkach". Był przetrzymywany w Areszcie Śledczym nr 1 w Mińsku. 5 maja 2011 r. skazano go na 4 lata pozbawienia wolności. Karę odbywał w kolonii karnej w Iwacewiczach. 22 lipca 2011 roku, przebywając jeszcze w kolonii, Winogradau ożenił się z narzeczoną Swietłaną. 14 września 2011 r. został uwolniony na mocy dekretu Aleksandra Łukaszenki o ułaskawieniu. Kontynuował swoją działalność polityczną i 30 grudnia 2011 r. został zatrzymany za rzekome drobne chuligaństwo. Nowy Rok 2012 Winogradau spędził w areszcie (skazano go na 7 dni), prowadząc protest głodowy przeciwko nielegalnemu zatrzymaniu i aresztowaniu.

ПАВАЛ ВІНАГРАДАЎ

Нарадзіўся 24 красавіка 1988 году ў Менску. Выхоўваўся бабуляю. Скончыў прафэсійна-тэхнічны ліцэй № 4 па спэцыяльнасьці «цырульнік», а таксама музычную школу па клясе фартэпіяна. З 18 гадоў Павал жыве самастойна. Некаторы час ён вучыўся на гісторыка-геаграфічным факультэце Менскага пэдагагічнага ўнівэрсытэту.

Некалькі гадоў быў актывістам кампаніі «Эўрапейская Беларусь». У зьвязку з гэтым за сваю палітычную дзейнасьць затрымліваўся міліцыяй. Першае затрыманьне адбылося ў 2007 г. на акцыі супраць адмены сацыяльных ільготаў: Павал патрапіў у пастарунак, калі адбіў ад міліцыянтаў сваю дзяўчыну Сьвятлану. Тады яго асудзілі на 5 сутак арышту.

У 2008 г. зьяўляўся фігурантам так званай «справы 14-ці» па арт. 342 КК, заведзенай за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў 10 студзеня 2008 г. За гэта быў асуджаны на 2 гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы. Праз год амніставаны. Працаваў у той час сьлесарам.

Зь лета 2010 г. – актывіст кампаніі «Гавары праўду!», браў удзел у многіх яе акцыях. На выбарах-2010 быў адным з самых актыўных сяброў ініцыятыўнай групы Ўладзімера Някляева.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Арыштаваны ў ноч на 5 студзеня 2011 г. Пасьля арышту ў адсутнасьць Паўла ў яго дома да 5-й гадзіны раніцы праходзіўператрус. Прад'яўлена абвінавачаньне па чч. 1 і 2 арт. 293 КК РБ (арганізацыя і ўдзел у масавых беспарадках). Утрымліваўся пад вартай ў СІЗА № 1 Менску.

5 траўня 2011 г. Павал асуджаны на 4 гады зьняволеньня. Для адбываньня гэтага тэрміну яго перавялі ў калёнію г. Івацэвічы, вядомую пад назвай «Воўчыя норы». 22 ліпеня 2011 г. перабываючы ў калёніі, малады чалавек ажаніўся з сваёй нявестай Сьвятланай.

14 верасьня 2011 г. вызвалены паводле ўказу аб памілаваньні, падпісанага дзеючым кіраўніком дзяржавы.

Працягвае палітычную дзейнасьць. 30 сьнежня 2011 г. быў затрыманы нібыта за дробнае хуліганства ў міліцэйскім пастарунку, куды яго запрасілі на «прафіляктычную гутарку». Таму Павал сустрэў Новы 2012 год пад адміністратыўным арыштам у 7 сутак (цікава, аднак, што гэты прысуд яму афіцыйна вынесены толькі ў Новым годзе – 2 студзеня). У ізалятары актывіст трымаў галадоўку пратэсту супраць незаконнага затрыманьня і зьняволеньня.

OLEG WOUCZAK


FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

Oleg Wouczak jest obrońcą praw człowieka i przewodniczącym organizacji Pomoc Prawna dla Społeczeństwa. Od roku 1998 jest członkiem Centralnego Komitetu Białoruskiej Partii Socjaldemokratycznej Hramada.

Urodził się w Mińsku 2 sierpnia 1967 r. W latach 1985–1988 r. służył w wojskach ochrony pogranicza na granicy afgańsko-tadżyckiej oraz w Afganistanie. Po powrocie do Mińska skończył wydział prawa na BPU i rozpoczął pracę w prokuraturze rejonowej w Mińsku na stanowisku starszego śledczego (1994–1998). W 1995 r. został deputowanym do Rady Miasta Mińsk i stanął na czele komisji sprawiedliwości.

W maju 1998 Oleg Wouczak zwolnił się z prokuratury, a po kilku miesiącach stworzył organizację społeczną „Pomoc Prawna dla Społeczeństwa" i stanął na jej czele. Organizacja ta udzielała bezpłatnej pomocy doradczej i reprezentowała przed sądami interesy ludzi.

W 1999 r. Oleg Wouczak stanął na czele komisji społecznej, która wyjaśniała okoliczności zaginięcia byłego ministra spraw wewnętrznych Białorusi, Jurija Zacharenki, i która rezultaty śledztwa przekazała prokuraturze. Odtąd Wouczak jest oficjalnym przedstawicielem interesów rodziny Zacharenki na Białorusi.

We wrześniu 2003 r. zakazano działalności organizacji Pomoc Prawna dla Społeczeństwa. Niedługo potem Oleg Wouczak wraz z innymi prawnikami założył fundację dobroczynną „Dobrostan", która zajmowała się bezpłatną pomocą prawną ludziom w trudnej sytuacji materialnej. W roku 2007 fundacja została zlikwidowana decyzją sądu. Po dwóch latach, w roku 2009, prawnikom udało się odtworzyć „Pomoc Prawną dla Społeczeństwa" jako białoruską organizację obrony praw człowieka działającą na Ukrainie.

W roku 2005 Oleg Wouczak został jednym z założycieli ruchu „Obrońcy Ojczyzny" im. Jurija Zacharenki, zrzeszającego byłych pracowników organów ścigania, sądowych, celnych i pracowników innych organów administracji państwowej, będących zwolennikami demokracji. Od 2008 r. Wouczak wchodzi w skład komitetu organizacyjnego Stowarzyszenia Weteranów Wojennych, którego celem jest obrona praw uczestników wojen z czasów byłego ZSRR.

Oleg Wouczak jest laureatem wielu nagród, m.in. nagrody Rady Najwyższej ZSRR „Za męstwo i odwagę przejawione podczas realizacji międzynarodowego obowiązku obrony pokoju w Afganistanie" (1988), nagrody Międzynarodowej Ligi Praw Człowieka za działalność w obszarze obrony praw człowieka (1999), nagrody „Cena odwagi" organizacji społecznej „Courage price" z Niemiec (2004). Wouczak jest też honorowym obywatelem miasta Pensacola (USA) i Radeboil (Niemcy) za pomoc prawną okazywaną obywatelom mimo presji wywieranej przez władze.

KRONIKA REPRESJI

Pierwszą sprawę przeciw Olegowi Wouczakowi wszczęto w roku 1999 po mityngu „Ostatni dzień prezydenta Łukaszenki", gdy wystąpił na Placu Październikowym wraz z Wiktorem Gonczarem. Po zakończeniu mityngu zatrzymano około 15 osób, wraz z deputowanym Znawcem i byłym premierem Czigirem. Milicja użyła gazu, a Olega Wouczaka wraz z innymi zatrzymanymi odtransportowano do aresztu rejonu moskiewskiego MSW w Mińsku. Tam został pobity do utraty przytomności. Po pobiciu długo odmawiano wezwania pogotowia. Wouczak nieprzytomny przeleżał na podłodze 3 godziny, zanim przewieziono go do szpitala. W nocy umieszczono go ponownie w celi – tzw. „małpiej klatce".

Następnego dnia wszczęto kolejną sprawę karną, w której Wouczak był podejrzany o pobicie milicjanta. Prokurator nie zdążył mu jednak przedstawić aktu oskarżenia, głównie dzięki ówczesnemu szefowi rządu, Semenowi Szareckiemu, który podał do publicznej wiadomości informację o dochodzeniu przeciw Wouczakowi, jako jednemu z członków Centralnej Komisji Wyborczej, której szefem był Wiktor Gonczar.

Mimo to odbyło się kilka przesłuchań, zanim sprawę umorzono z braku dowodów.

Po tych wydarzeniach Oleg Wouczak ma trwale uszkodzone plecy. Odmówiono mu wszczęcia sprawy karnej przeciw osobom, które dopuściły się jego skatowania. Odmówiono mu także po 4 latach, gdy dziennikarz gazety „Radziecka Białoruś" pobił Olega Wouczaka i potrącił go samochodem.

W roku 2004, Oleg Wouczak kandydował w wyborach do Izby Przedstawicieli Zgromadzenia Narodowego RB. Sfałszowano jego ulotki wyborcze i na ich podstawie oskarżono go o szkalowanie imienia prezydenta Łukaszenki. 1 lutego 2005 r. wszczęto przeciw niemu sprawę karną, którą szybko umorzono, pozbawiono go jednak prawa do kandydowania do organów państwowych.

W roku 2006 Olega Wouczaka i Aleksandra Kazulina, kandydata na prezydenta, oskarżono o pobicie milicjanta w cywilu Jakimowicza, co rzekomo miało miejsce przy wejściu do centrum prasowego w Mińsku, do którego Kazulina nie chciała wpuścić ochrona (Wouczak był zaufanym człowiekiem Kazulina i szefem jego doradców prawnych). Użyto wówczas wobec grupy zwolenników Kazulina gazu łzawiącego. Udało się zatrzymać kilku „cywili", którzy odmawiali podania nazwisk i u których znaleziono w kieszeniach naboje z gazem. Za bezprawne użycie gazu, nikogo nie pociągnięto do odpowiedzialności. Postępowanie prowadził znany wówczas prokurator Stuk, pracujący w rejonie leninowskim.

W 2007 roku, po akcji przeciwko zniesieniu ulg dla weteranów z Afganistanu, Wouczak otrzymał wiele e-maili z groźbami. Grożono mu między innymi pobiciem na Wyspie Łez.

Po przyjeździe na Wyspę Łez, 15 lutego, Wouczak został odseparowany od innych weteranów. Sprawę karną na wniosek Olega Wouczaka tym razem wszczęto, nie znaleziono jednak sprawców.

W roku 2012 był dwukrotnie aresztowany na podstawie sfabrykowanych dowodów i przetrzymywany w znanym ze złych warunków więzieniu na Okrestinie.

АЛЕГ ВОЛЧАК

Алег Волчак – праваабаронца, кіраўнік арганізацыі «Прававая дапамога насельніцтву». З 1998 года да цяперашняга часу – сябра Цэнтральнага Камітэта Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада).

Нарадзіўся ў Менску 2 жніўня 1967 года. З 1985 по 1988 гг. служыў у памежных войсках на аўгана-таджыкскай мяжы, а таксама непасрэдна ў Аўганістане. Па вяртаньні ў Менск скончыў юрыдычны факультэт БДУ і працаваў у пракуратуры Фрунзенскага раёну Менску старэйшым сьледчым (1994 – 1998 гг.). У 1995 г. быў абраны дэпутатам Менскага гарсавету, узначальваў камісыю па законнасьці і правапарадку.

У траўні 1998 г. Алег Волчак звольніўся з пракуратуры, паколькі быў нязгодны з выкарыстаньнем праваахоўных органаў у пераследзе апазіцыі. Праз некалькі месяцаў ён стварыў грамадзкую арганізацыю «Прававая дапамога насельніцтву», якая бясплатна кансультавала людзей і прадстаўляла іх інтарэсы ў судах, і стаў кіравацць ёю.

У 1999 г. Алег Волчак узначаліў грамадзкую камісыю па высьвятленьні абставінаў зьнікненьня былога міністра ўнутраных справаў Беларусі Юрыя Захаранкі. Вынікі расьсьледаваньня камісыя перадала ў пракуратуру. З таго часу А.Волчак зьяўляецца афіцыйнай асобай, якая прадстаўляе інтарэсы сям'і Захаранкі ў Беларусі.

У верасьні 2003 г. «Прававая дапамога насельніцтву» была зачынена ўладамі. Неўзабаве Алег Волчак разам зь іншымі юрыстамі арганізавалі дабрачынны фонд «Дабраслаў», які стаў аказваць бясплатна прававую дапамогу малазабясьпечаным людзям. У 2007 г. фонд быў ліквідаваны па рашэньню суда. Праз два гады, у 2009 годзе, юрыстам удалося адрадзіць «Прававую дапамогу насельніцтву», зарэгістраваўшы яе як Праваабарончы цэнтр ва Ўкраіне, у Кіеве.

З 2005 г. Алег Волчак зьяўляецца адным з заснавальнікаў Руху імя Юрыя Захаранкі «Абаронцы Айчыны», якое аб'ядноўвае былых супрацоўнікаў праваахоўных, судовых, мытных і іншых дзяржаўных органаў – прыхільнікаў дэмакратыі. З 2008 г. А.Волчак ўваходзіць у аргкамітэт па стварэньню незалежнага грамадзкага аб'яднаньня ветэранаў баявых дзеяньняў – арганізацыі, якая абараняе правы ўдзельнікаў войнаў часоў СССР.

Алег Волчак мае ўзнагароды. Сярод іх – грамата Вярхоўнага Савета СССР «За мужнасьць і доблесьць, праяўленыя пры выкананьні інтэрнацыянальнага абавязку ў Аўганістане» (1988 г.), прэмія «Дзень Абаронцы» Міжнароднай Лігі правоў чалавека за абарону правоў чалавека (1999 г.), прэмія «Кошт храбрасьці» грамадзкага аб'яднаньня «Кураж-прайс» з Германіі (2004 г.). Ганаровы грамадзянін гарадоў Пенсакола (ЗША) і Радэбойль (Германія) – за юрыдычную дапамогу грамадзянам, нягледзячы на ціск з боку ўладаў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Першая крымінальная справа супраць Алега Волчака была ўзбуджана ў 1999 годзе, пасьля мітынгу «Апошні дзень прэзыдэнта Лукашэнкі», калі выступіў на Кастрычніцкай плошчы разам зь Віктарам Ганчаром. Пасьля сканчэньня мітынгу было затрымана з прымяненьнем сілы каля 15 чалавек, у тым ліку дэпутат Знавец і былы прэм'ер-міністар Чыгір. Пасьля таго, як пры затрыманьні сілавыя структуры прымянілі газ, Алега Волчака разам зь іншымі затрыманымі адвезьлі ў Маскоўскі РУУС Менска. Затым яго моцна, да страты прытомнасьці, зьбілі. Пасьля зьбіцьця доўга не выклікалі «хуткую дапамогу», і Алегу Волчаку давялося ў паўпрытомным стане праляжаць на падлозе 3 гадзіны пад зьдзеклівыя камэнтары так званых супрацоўнікаў сілаў правапарадку. Потым пад канвоем затрыманага звазілі ў бальніцу і назад, памясьціўшы на ноч у клетку-«абязьяньнік». На наступны дзень аказалася заведзенай крымінальная справа, у якой Волчак фігураваў як пада-

зраваны ў зьбіцьці міліцыянта. Прад'явіць абвінавачваньне яму, хутчэй за ўсё, не пасьпелі дзякуючы тагачаснаму кіраўніку ўрада Сямёну Шарэцкаму, які абвясьціў пра перасьлед А. Волчака як аднаго з сяброў Цэнтрвыбаркаму В. Ганчара. Тым ня менш, некалькі допытаў і вочных ставак усё ж адбылося. Справа была спынена за адсутнасьцю доказаў віны. На памяць пра гэтыя падзеі Алегу Волчаку засталася на ўсё жыцьцё траўма сьпіны. Ва ўзбуджэньні крымінальнай справы супраць тых, хто яго зьбіваў, Волчаку адмовілі. Адмова паўтарылася і праз 4 гады, калі беларуская Фэміда ня стала перасьледаваць пазаштатнага аўтара газэты «Советская Белоруссия», які зьбіў Алега Волчака, падрэзаўшы яго на машыне і агрэсіўна адрэдагаваўшы на заўвагу.

У 2004 г. Алег Волчак вылучаўся кандыдатам у дэпутаты Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу РБ. Ягоныя ўлёткі былі падроблены невядомымі, у выніку чаго Волчака абвінавацілі ў паклёпе на прэзыдэнта Лукашэнку. 1 лютага 2005 г. супраць кандыдата, які рэальна мог перамагчы, узбудзілі крымінальную справу па адпаведным артыкуле. Справу хутка спынілі, але права абрацца ў дзяржаўны орган Волчак быў такім чынам пазбаўлены.

У 2006 г. Алега Волчака, разам з кандыдатам на прэзыдэнта Аляксандрам Казуліным, абвінавацілі ў зьбіцьці міліцыянта ў цывільным Якімовіча пры ўваходзе ў Нацыянальны прэс-цэнтр у Менску, кудыахова не пускала Казуліна. (А.Волчак быў падчас выбараў яго даверанай асобай і кіраўніком юрыдычнай службы). Насамрэч мела месца выкарыстаньне слезацечнага газу супраць каманды Казуліна. Удалося затрымаць некалькі «людзей у цывільным», якія адмаўляліся назваць сябе і хавалі ў кішэнях балёнчыкі з газам. А.Волчак атрымаў апёк вока, але да адказнасьці ізноў нікога не прыцягнулі. Справу супраць апазыцыянэраў распачаў вядомы цяпер пракурор Стук, які працаваў тады ўсяго толькі ў Ленінскім раёне сталіцы.

У 2007 г. пасьля акцыяў супраць адмены ільготаў «аўганцам» атрымліваў электронныя лісты з пагрозамі фізычнай расправы на Востраве Сьлёз, а пасьля прыезду туды 15 лютага быў ачэплены і адсечаны ад астатніх воінаў-інтэрнацыяналістаў супрацоўнікамі спэцслужбаў у чорным. Крымінальная справа па заяве Алега Волчака на гэты раз была ўзбуджаная, але злачынцаў не знайшлі.

У 2012 г. адбыў два адміністратыўных арышты ў знакамітай турме ў завулку Акрэсьціна, якая славіцца сваімі кепскімі ўмовамі. Абодва разы абвінавачваньні супраць праваабаронцы былі сфабрыкаваныя.

DZMITRIJ ZAWADZKI

Dzmitrij Zawadzki, białoruski dziennikarz i operator telewizyjny, urodził się 28 sierpnia 1972 r. Zaginął bez wieści 7 lipca 2000 r. Studiował w Instytucie Kultury. Od 1989 r. pracował w białoruskiej telewizji. W latach 1994–1997 był osobistym kamerzystą prezydenta Białorusi, Aleksandra Łukaszenki, następnie do 1997 r. pracował w rosyjskiej stacji telewizyjnej ORT. Od października do maja 2000 r. pracował dla ORT w Czeczenii, gdzie wraz z Pawłem Szeremetem realizował dokument „Dzienniki czeczeńskie".


FOT. PHOTO.BYMEDIA.NET

KRONIKA REPRESJI

26 lipca 1997 r. Zawadzki i Paweł Szeremet, dziennikarz ORT, zostali aresztowani za reportaż, który przeprowadzali na granicy białorusko-litewskiej. Zawadzki kilka miesięcy spędził w więzieniu w Grodnie. Skazano go na 1,5 roku pozbawienia wolności w zawieszeniu za nielegalne przekroczenie granicy. Na wolność wyszedł 5 września 1997 r.

7 lipca 2000 r. Zawadzki zaginął w drodze na lotnisko Mińsk-2. W 2001 r. prokuratura postawiła zarzut porwania dziennikarza czterem osobom: dwóm byłym funkcjonariuszom oddziału specjalnego, byłemu kursantowi akademii MSW oraz kryminaliście.

14 marca 2002 r. sąd w Mińsku wydał wyrok w tej sprawie. Trzech oskarżonych dostało wyrok dożywotniego pozbawienia wolności w kolonii karnej, a czwarty – 12 lat kolonii karnej. Prokurator wnioskował o karę śmierci przez rozstrzelanie dla wszystkich oskarżonych, sąd jednak zadecydował inaczej. W toku procesu nie udało się wyjaśnić losu dziennikarza, nie odnaleziono również jego ciała.

W 2002 r. zaniepokojenie sposobem prowadzenia śledztwa w tej sprawie wyraził Komitet ds. Białoruskich Zgromadzenia Parlamentarnego Rady Europy, przedstawiciel OBWE ds. wolnych mediów oraz Komitet ds. Ochrony Dziennikarzy.

W 2005 r. organizacja „Reporterzy bez Granic" domagała się odtajnienia materiałów w opisywanej sprawie.

Z inicjatywy Pawła Szeremeta Białoruskie Stowarzyszenie Dziennikarzy i stacja ORT ufundowały nagrodę im. Dzmitrija Zawadzkiego, która rokrocznie przyznawana jest dziennikarzom mediów niezależnych.

ЗЬМІЦЕР ЗАВАДСКІ

Журналіст Зьміцер Завадзкі нарадзіўся 28 жніўня 1972 г.

7 ліпеня 2000 г. быў выкрадзены, а затым забіты.

Вучыўся ў Інстытуце культуры. З 1989 г. працаваў на беларускім тэлебачаньні. Са студзеня 1997 г. – апэратар на ОРТ (Грамадзкая расейская тэлевізія) у Беларусі. З кастрычніка 1999 г. па травень 2000 г. разам з Паўлам Шараметам здымаў у Чачэніі для ОРТ фільм «Чачэнскі дзёньнік».

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

26 ліпеня 1997 г. Зьміцер Завадзкі быў арыштаваны разам з журналістам ОРТ Паўлам Шараметам за рэпартаж аб беларуска-літоўскай мяжы. Некалькі месяцаў правёў у зьняволеньні ў Гарадзенскай турме. Асуджаны ўмоўна да паўтара году пазбаўленьня волі за незаконны пераход мяжы. Выйшаў на свабоду 5 верасьня 1997 г.

7 ліпеня 2000 г. Зьміцер Завадзкі зьнік пры нявысьветленых абставінах па дарозе ў аэрапорт «Менск-2». Судом ён прызнаны памерлым, аднак цела Завадзкага сьледзтвам ня знойдзенае. За выкраданьне Зьмітра Завадзкага ў 2002 г. былі асуджаныя да вялікіх тэрмінаў зьняволеньня былыя афіцэры спэцпадразьдзяленьня МУС «Алмаз» Валеры Ігнатовіч і Максім Малік, былы курсант Акадэміі

міліцыі Аляксей Гуз і Сяргей Савушкін.

Праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя» прызнала Зьмітра Завадзкага вязьнем сумленьня.

ОНТ і Беларуская асацыяцыя журналістаў заснавалі зь ініцыятывы Паўла Шарамета прэмію імя Зьмітра Завадзкага і штогод ганаруюць ёй журналістаў незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

ALEKSANDER ZDWIŻKOW

Aleksander Zdwiżkow, białoruski dziennikarz, urodził się w 1959 r. w NRD, w rodzinie wojskowej. W 1981 r. ukończył studia językoznawcze ze specjalizacją język hiszpański. Uczył języka hiszpańskiego w liceum w Borysowie. W latach 1985–1988 służył w oddziałach przygranicznych. Od 1990 r. współpracował z wydawnictwami „Sovetskaja Belarusija" i „Narodnaja gazeta", był korespondentem gazety „Femida". W latach 1995–2006 był redaktorem naczelnym gazety „Zgoda". 17 lutego 2006 r. w kolejnym numerze „Femidy" ukazał się artykuł, który mówił o reakcji świata na karykatury Mahometa pokazywane przez środki masowego przekazu. Artykuł publikował te karykatury. 21 lutego 2006 r. Ministerstwo Spraw Zagranicznych stanowczo potępiło publikację.

KRONIKA REPRESJI

22 lutego nad ranem, na wniosek zastępcy prokuratora generalnego, funkcjonariusze KGB wtargnęli do biura redakcji „Zgoda". Wynieśli dyski twarde oraz wszelkie inne nośniki informacji. Skonfiskowali także dokumenty księgowe. Założyciele „Zgody" Aleksiej Korol i Aleksander Zdwiżkow zostali przesłuchani przez KGB. Dodatkowo przeszukane zostało mieszkanie Korola.

W tym samym dniu wszczęto postępowanie karne na podstawie art. 130 KK – „Podżeganie do nienawiści rasowej, narodowej oraz religijnej", a Białoruskie Ministerstwo Informacji zadecydowało o zawieszeniu niezależnej gazety „Zgoda". W związku z publikacją karykatur Mahometa wysłano również upomnienie na podstawie art. 5 ustawy „O prasie oraz innych środkach masowego przekazu". Było to drugie upomnienie w ciągu roku (pierwsze wysłano 9 listopada). 6 marca Najwyższy Sąd Gospodarczy wszczął postępowanie o zamknięcie gazety, na wniosek Ministerstwa Informacji. 17 marca zapadł wyrok natychmiastowej likwidacji gazety. Wkrótce prokuratura wszczęła także postępowanie karne przeciwko jej redaktorowi naczelnemu, Aleksandrowi Zdwiżkowowi. Proces został zawieszony na pół roku w związku z brakiem informacji o miejscu pobytu oskarżonego. Rozpoczęto jego poszukiwania. Okazało się, że Zdwiżkow wyjechał do Rosji. 18 listopada 2007 r. zatrzymano go na dworcu w Borysowie (przyjechał do matki w rocznicę śmierci ojca) i umieszczono w areszcie śledczym KGB. Nikt nie został poinformowany o jego zatrzymaniu, dopiero 30 grudnia w sprawie Zdwiżkowa został wezwany do sądu jego przyjaciel. W ciągu kilku miesięcy aresztu Aleksander praktycznie stracił wzrok.

Prokuratura zmieniła oskarżenie z art. 130, pkt 1 (od grzywny do pięciu lat więzienia) na art. 130, pkt 2 (3–10 lat więzienia). 18 stycznia 2008 r. Aleksander Zdwiżkow został skazany na trzy lata pozbawienia wolności. Jest to najostrzejszy wyrok w sprawie karykatur.

Po raz pierwszy zostały one wydrukowane w duńskiej gazecie 30 września 2005 r., a następnie w 22 krajach. Żaden z redaktorów naczelnych nie został pozbawiony wolności ponieważ zdjęcia są chronione przez ustawę o wolności słowa i w żaden sposób nie szkodzą islamowi. Jedynie w Malezji, w lutym 2006 r., trzy gazety zostały chwilowo zawieszone. W 2006 r. w Rosji z powodu karykatur została zamknięta gazeta „Gorodskie vesti". Wszczęto postępowanie karne wobec redaktor naczelnej, Anny Smirnowej, która została jednak uniewinniona. Na Ukrainie społeczność islamska zażądała jedynie przeprosin od redakcji gazety „Sevodnja", która opublikowała artykuł pt. „Trzecią wojnę światową wywołują karykatury". Natomiast w Jordanii i w Jemenie najsroższe werdykty skazywały na 2 miesiące pozbawienia wolności, skazani zostali jednak wypuszczeni za kaucją.

Po odbyciu kary Zdwiżkow opuścił Białoruś. 25 lutego 2008 r., na pierwszej od opuszczenia więzienia konferencji prasowej, Zdwiżkow powiedział: „Nie chcę być dłużej obywatelem TEJ Republiki Białoruś, w której są TAKIE sądy, TAKA prokuratora i przede wszystkim TAKIE więzienia. Doskonale zdaję sobie sprawę, że w dalszym ciągu nie jestem tu bezpieczny. Uspokoję się dopiero gdy opuszczę granicę Republiki Białoruś".

Аляксандар Зьдзьвіжкоў

Аляксандар Зьдзьвіжкоў – беларускі журналіст. Нарадзіўся ў 1959 г. у ГДР, у сям'і вайскоўцаў. Скончыў Менскі інстытут замежных моваў. Працаваў настаўнікам гішпанскай мовы, у 1985–88 гг. служыў у памежных войсках. З 1990 г. супрацоўнічаў з выданьнямі «Советская Белоруссия», «Народная газета», «Фемида». Аглядальнік, выпускаючы рэдактар газэты «Згода» (1995 2006).

17 лютага 2006 г. выйшаў чарговы нумар газэты «Згода» з артыкулам «Палітычны крэатыў». У ім распавядалася пра тое, які рэзананс у сьвеце выклікала публікацыя ў СМІ карыкатураў на прарока Мухамэда, прыводзіліся некаторыя з гэтых карыкатураў. Наклад яшчэ не пачалі распаўсюджваць. Але 21 лютага 2006 году МЗС Беларусі выступіў з заявай з нагоды публікацыі: «Міністэрства замежных справаў рашуча асуджае любыя наўмысныя дзеяньні, якія могуць пацягнуць распальваньне міжрэлігійнай варожасьці, распаўсюд… недаверу паміж нацыянальнымі і рэлігійнымі супольнасьцямі, якія жывуць у Беларусі».

Храналёгія пераследу

22 лютага з санкцыі намесьніка Генеральнага пракурора супрацоўнікі КДБ правялі ператрус у рэдакцыі «Згоды», канфіскавалі ўсе носьбіты інфармацыі і фінансавыя дакумэнты выданьня. Заснавальнік газэты Аляксей Кароль і Аляксандар Зьдзьвіжкоў былі дапытаныя КДБ.

У той жа дзень была ўзбуджаная крымінальная справа па ч. 1 арт. 130 КК РБ (распальваньне расавай, нацыянальнай альбо рэлігійнай варожасьці). З падачы Пракуратуры Міністэрства інфармацыі вынесла недзяржаўнай газэце «Згода» папярэджаньне за публікацыю карыкатураў на прарока Мухамэда, а 17 сакавіка быў задаволены зыск аб спыненьні дзейнасьці газэты.

Аляксандру Зьдзьвіжкову было прад'яўлена абвінавачаньне па крымінальнай справе аб перадруку карыкатураў. Аднак справа была прыпынена амаль на паўтара года, бо сьледчым органам не ўдалося высьветліць месцазнаходжаньне абвінавачанага (журналіст зьехаў у Расею).

18 лістапада 2007 г. Аляксандар быў затрыманы вакзале ў Барысаве, куды ён прыехаў да маці на гадавіну сьмерці бацькі, і зьмешчаны ў СІЗА КДБ. Ніхто з грамадзкасьці ня ведаў пра ягонны арышт, пакуль калегі журналіста не атрымалі позвы ў суд. Падчас утрыманьня пад вартай Аляксандар на 30 адсоткаў страціў зрок.

З пракуратуры ў суд справа прыйшла зь перакваліфікацыяй: з ч. 1 арт. 130 (ад штрафу да 5 гадоў абмежаваньня волі) на ч. 2 – ад 3 да 10 гадоў зьняволеньня.

18 студзеня 2008 г. Зьдзьвіжкоў быў асуджаны на 3 гады пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму па ч. 2 арт. 130 КК РБ (наўмысныя дзеяньні, скіраваныя на ўзбуджэньне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасьці ці розьні, на прыніжэньне нацыянальнага гонару і годнасьці, зьдзейсьненыя службовай асобай з выкарыстаньнем сваіх паўнамоцтваў). Такое рашэньне прыняў судзьдзя Менскага гарадзкога суду Руслан Аніськевіч.

Гэта быў самы жорсткі прысуд, які быў вынесены за гэтыя карыкатуры.

Карыкатуры на прарока Мухамеда былі ўпершыню надрукаваныя ў дацкай газэце Jyllands-Posten 30 верасьня 2005 г. Агулам перадрукаваны ў 22 краінах. Мусульманскія суполкі ў Эўропе падавалі на выданьні судовыя зыскі ў сувязі з тым, што карыкатуры «абразілі іх рэлігійныя пачуцьці». Аднак суды выносілі апраўдальныя прысуды, бо «малюнкі абараняюцца законам аб свабодзе самавыяўленьня і не наносяць шкоду ісламу».

Пасьля вызваленьня А. Зьдзьвіжкоў пакінуў Беларусь.

Eduard Zjeliankou

Eduard Zjeliankou jest młodzieżowym opozycyjnym działaczem z miasta Żłobin w obwodzie homelskim.

Kronika represji

Eduard Zjeliankou został zatrzymany 13 marca 2006 r. za namalowanie graffiti. Sprawę karną przeciwko niemu wszczęto z artykułów 193.1 – „Działalność w imieniu niezarejestrowanej organizacji" i 339 – „Chuligaństwo" KK RB. Śledztwo prowadził Wydział Spraw Wewnętrznych Homla. Na początku czerwca 2006 r. Zjeliankoua oczyszczono z zarzutu chuligaństwa z powodu braku znamion przestępstwa, pozostawiając jedynie zarzut działalności z ramienia niezarejestrowanej organizacji „Młody Front". Decyzją sądu w Żłobinie Zjeliankou został skazany na karę grzywny.

Эдуард Зелянкоў

Эдуард Зелянкоў – моладзевы апазыцыйны актывіст са Жлобіну (Гомельская вобласьць).

Храналёгія пераследу

Эдуард Зелянкоў быў затрыманы 13 сакавіка 2006 году за нанясеньне графіці. Крымінальная справа супраць яго была ўзбуджаная па артыкулах 193.1 (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) і 339 (хуліганства) Крымінальнага кодэксу. Сьледзтва вялося аддзелам унутраных справаў Цэнтральнага раёну г. Гомеля.

На пачатку чэрвеня 2006 году абвінавачаньне ў хуліганстве зь Зелянкова было зьнятае за адсутнасьцю складу злачынства і пакінутае абвінавачаньне ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады Фронт». Паводле рашэньня суду Жлобінскага р-ну, Эдуард Зелянкоў быў прыгавораны да штрафу.



FOT. ZMICER ZUBRO

DZMITRIJ ZUBRO

Dzmitrij Zubro urodził się w Borysowie, w obwodzie mińskim. Na początku 2000 r. został działaczem młodzieżowego ruchu „Żubr". Aktywnie zajmował się polityką od 17 roku życia. Ukończył borysowskie Kolegium Politechniczne jako inżynier – mechanik samochodowy.

KRONIKA REPRESJI

W nocy z 27 na 28 grudnia 2005 r. 19-letni Dzmitrij Zubro wraz z przyjacielem, 20-letnim Aleksandrem Kazakauem, zostali zatrzymani w Mińsku, niedaleko Placu Październikowego. Młodzi ludzie naklejali naklejki z liczbą „16" – symbolem solidarności z więźniami politycznymi na Białorusi. Było to także wezwanie do udziału w Dniach Solidarności, które odbywają się 16-go każdego miesiąca w wielu miastach Białorusi, a także poza jej granicami. Zatrzymani mężczyźni próbowali uciec, co im się jednak nie udało. Zubro został powalony na ziemię przez funkcjonariuszy, założono mu kajdanki. Ponad 2 dni był przetrzymywany w areszcie tymczasowym, skąd wypuszczono go z zakazem opuszczania miejsca zamieszkania.

Przedstawiono mu zarzuty z artykułu 363, pkt 2 KK – „Stawianie oporu funkcjonariuszom milicji". 7 kwietnia 2006 r. sędzia Walerij Jesman uznał Zubro winnym i wydał wyrok 2 lat ograniczenia wolności. Wkrótce Zubro opuścił Białoruś. Początkowo mieszkał w Kijowie, potem w Warszawie, gdzie rozpoczął studia na Politechnice Warszawskiej na kierunku „Zarządzanie i Marketing".

ЗЬМІЦЕР ЗУБРО

Зьміцер Зубро нарадзіўся ў г. Барысаве Менскай вобласьці. У першай палове 2000-х быў актывістам моладзевага руху «Зубр». Актыўна займаўся палітыкай з 17 гадоў. Скончыў Барысаўскі палітэхнічны каледж па спэцыяльнасьці інжынэр-аўтамэханік.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

У ноч на 28 сьнежня 2005 г. 19-гадовы Зьміцер разам са сваім сябрам – 20-гадовым Аляксандрам Казаковым – быў затрыманы недалёка ад Кастрычніцкай плошчы ў Менску за палітычныя графіці. Сутнасьцю парушэньня была прымацаваная налепка зь лічбай «16» – сымбаль салідарнасьці з палітвязьнямі Беларусі. Гэта таксама быў заклік да ўдзелу ў Днях салідарнасьці, якія праводзіліся 16 чысла кожнага месяца ў многіх гарадах Беларусі і за яе межамі.

Пры затрыманьні хлопцы спачатку спрабавалі ўцячы і зьбеглі за рог вуліцы, але іх дагналі. Зьмітра Зубро першага павалілі на зямлю і надзелі кайданкі. Больш за двое сутак, як і яго таварыш, Зьміцер знаходзіўся пад вартай у ізалятары часовага ўтрыманьня, адкуль яго выпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе.

Было прад'яўлена абвінавачаньне па ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодэксу (аказаньне супраціву супрацоўніку міліцыі).

7 красавіка 2006 г. судзьдзя суду Цэнтральнага р-ну г. Менску Валеры Есьман прызнаў Зьмітра Зубро вінаватым і вынес прысуд у 2 гады абмежаваньня волі.

Неўзабаве Зьміцер Зубро пакінуў Беларусь. Спачатку ён жыў у Кіеве, пазьней – у Варшаве, дзе паступіў у Варшаўскі палітэхнічны ўнівэрсытэт на факультэт кіраўніцтва і мэнэджмэнту.

ANDREJ ŻUKAWIEC

Andrej Żukawiec to białoruski biznesmen, działacz opozycyjny, uchodźca polityczny. Urodził się 12 września 1972 r. W 1993 r. założył spółkę „Trajs". Był członkiem „Młodego Frontu". Od 1994 r. finansował budowę prawosławnej świątyni Ikony Matki Boskiej Mińskiej oraz przekazywał fundusze na niepełnosprawne dzieci. Wspierał materialnie i technicznie Mohylewskie Centrum Praw Człowieka, młodzieżową komisję BFL oraz „Młody Front". W spółce Żukawca wytwarzano również materiały agitacyjne szeregu białoruskich partii i organizacji pozarządowych.



FOT. ANDREJ ZHUKAVEC

KRONIKA REPRESJI

Andrej Żukawiec został zatrzymany podczas „Czarnobylskiego Szlaku 96" i skazany na 10 dni aresztu. Po jego zatrzymaniu, przeprowadzono kontrole w firmie „Trejs" i na podstawie sfabrykowanych dowodów wszczęto sprawę karną. W marcu 1999 r. Żukawiec był zmuszony starać się w Polsce o azyl polityczny. Zamieszkał w Białymstoku, by być bliżej Białorusi. W 2001 r. był jednym z założycieli związku białoruskich politycznych uchodźców w Polsce. W 2002 r. założył informacyjno-analityczne centrum „Białoruś – NATO". W latach 2003–2005 był organizatorem spotkań białoruskich polityków z posłami Sejmu RP i prezydentem Warszawy Lechem Kaczyńskim. W Polsce zajmował się działalnością na rzecz praw człowieka, ochroną praw człowieka na Białorusi i pomocą białoruskim uchodźcom w Polsce.

Białoruskie władze kilka lat starały się o wydanie im Żukawca. W tym celu fabrykowano szereg dokumentów i tłumaczeń. Swoją solidarność z Żukawcem deklarowali między innymi Zianon Paźniak, Aleś Bialacki i inni.

АНДРЭЙ ЖУКАВЕЦ

Андрэй Жукавец – беларускі бізнэсовец, апазыцыйны актывіст і палітычны эмігрант. Нарадзіўся 12 верасьня 1970 году. У 1993 г. стварыў ТАА «Трайс». Быў сябрам «Маладога Фронту».

Ад 1994 году выступаў фундатарам, фінансаваў будаўніцтва праваслаўнага храму ў гонар Іконы Божай Маці Менскай (прыход вялікамучаніка Георгія Пераможцы, г. Менск), аздараўленьне дзяцей-інвалідаў. Падтрымліваў матэрыяльна і тэхнічна ГА «Магілёўскі праваабарончы цэнтар», моладзевую камісыю БНФ, «Малады Фронт». На друкарскіх плошчах ТАА «Трэйс» выдавалася агітацыйная прадукцыя беларускіх партыяў і недзяржаўных арганізацыяў.

ХРАНАЛЁГІЯ ПЕРАСЬЛЕДУ

Быў затрыманы ў часе «Чарнобыльскага шляху-96» і асуджаны на 10 сутак арышту. Пасьля затрыманьня на фірму «Трэйс» былі накіраваныя праверкі УБЭЗ ГУУС Менгарвыканкаму і КДБ. На падставе сфабрыкаваных фактаў была ўзбуджаная крымінальная справа.

У сакавіку 1999 году быў вымушаны выехаць у Польшчу і прасіць палітычны прытулак. У 2001 быў адным з заснавальнікаў «Зьвязу беларускіх палітычных уцекачоў у Польшчы». У 2002 годзе заснаваў інфармацыйна-аналітычны цэнтар «Беларусь-NATO». Арганізатар сустрэч беларускіх палітыкаў з дэпутатамі Сэйму Польшчы і прэзыдэнтам Варшавы Лехам Качыньскім (2003–2005 гг.). З моманту прыезду ў Польшчу займаўся праваабарончай дзейнасьцю, дапамогай беларускім уцекачам у Польшчы.

Беларускія праваахоўныя органы дамагаюцца выдачы Андрэя, з гэтай мэтай нават былі сфабрыкаваныя дакумэнты і іх пераклады. У падтрымку Андрэя Жукаўца і супраць яго выдачы спэцслужбам выказаліся такія аўтарытэтныя асобы, як Зянон Пазьняк, Алесь Бяляцкі і шэраг іншых.

W imieniu redakcji Palitviazni.info chcemy serdecznie podziękować wszystkim osobom, które przyczyniły się do wydania tej książki.

Dziękujemy Fundacji Solidarności Międzynarodowej za wsparcie merytoryczne i finansowe.

Specjalne podziękowania kierujemy do wszystkich osób, które poświęcają się walce o prawa człowieka oraz o demokrację na Białorusi, w szczególności członkom organizacji pozarządowych, przedstawicielom demokratycznej opozycji i wszystkim tym, którym na sercu leży los Białorusinów.

Mamy nadzieję, że nigdy więcej nie zajdzie potrzeba pisania o białoruskich więźniach politycznych.

Zyve Belarus!

Ад імя рэдакцыі сайту Palitviazni.info мы хацелі б падзякаваць усім тым, хто спрычыніўся да выданьня гэтае кнігі.

Мы ўдзячныя фонду «Solidarity Fund PL» за тэхнічную і фінансавую падтрымку.

Асаблівую нашу падзяку мы адрасуем тым, хто адданы барацьбе за правы чалавека і дэмакратыю ў Беларусі, у прыватнасьці, сябрам недзяржаўных арганізацыяў, прадстаўнікам дэмакратычнай апазыцыі і ўсім, хто неабыякавы да лёсу беларусаў.

Спадзяемся, што ў будучыні ня будзе патрэбы пісаць аб палітычных вязьнях.

Жыве Беларусь!